ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ СТВАРАЕЦЦА ПАВОДЛЕ РАШЭННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



МАГІЛЁЎ

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
1998

УДК 947.62
ББК 63.3 (4 Бен)
П 15

Рэдакцыйная калегія:

Г.П.ПАШКОЎ (галоўны рэдактар БелЭн), Н.П.АЎДЗЕЕВА, Б.П.ГАРДЗЕЕЎ, Г.К.КІСЯЛЁЎ, З.І.МАЛЕЙКА, П.Ц.ПЕТРЫКАЎ, Г.А.ФАТЫХАВА, М.П.ХОБАТАЎ

Гарадская камісія па стварэнні гісторыка-дакументальнай хронікі:

Б.П.ГАРДЗЕЕЎ (старшыня), Ю.А.АФАНАСЬЕЎ, С.І.БЯСПАНСКІ, Г.І.ВАЛЧОК, А.П.КОСЦЕРАЎ, А.А.ЛЕЎСКІ, М.Г.ЛЫСЕНКА, Т.Ф.ПАЛАЖЭНЦАВА, В.І.САЛАШЭНКА, Я.І.ТРЫШЧАНОК, Т.Ю.ШЧАРБАКОВА

Укладальнікі: Б.П.ГАРДЗЕЕЎ, М.П.ХОБАТАЎ

Арганізацыйна-метадычны цэнтр Дзяржкамдруку Рэспублікі Беларусь па выданні гісторыка-дакументальных хронік «Памяць»:

А.Л.ПЕТРАШКЕВІЧ (кіраўнік), М.З.БАШЛАКОЎ, У.І.ЛЕМЯШОНАК

Рэдактары: Н.А.ДЗЯНІСАВА, Л.М.ДРАБОВІЧ, У.Я.КАЛАТКОЎ, І.В.КАМАРОЎ, Ф.І.КІТАЕВА, З.І.МАЛЕЙКА, Л.І.ПАЎЛОВІЧ, Н.П.РАКІЦКАЯ, Л.А.СУДНІК, Н.В.ШАЎРУК

Мастак Э.Э.ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В.А.РАГАЛЕВІЧА

9470620000 — 001
П ——————— 6 — 97
М 318 (03) — 98

ISBN 985-11-0104-4

© Дзяржаўнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі», 1998
© Афармленне. Э.Э.Жакевіч, 1998



Фрагмент размалёўкі касцёла кармелітаў.

1267 г.	Першыя пісьмовыя звесткі пра заснаванне Магілёва (паводле Магілёўскай хронікі).
14 ст.	Магілёў увайшоў у склад Вялікага княства Літоўскага, якое з 1569 г. разам з Польскім каралеўствам у адзінай федэратыўнай дзяржаве — Рэчы Паспалітай.
1575 г.	Горад атрымаў магдэбургскае права (дзейнічала да 1775 г.).



Мемарыяльная арка.

1708 г.	У час Паўночнай вайны 1700—21 гг. у горадзе знаходзіліся расійскія (сакавік — ліпень) і шведскія (ліпень — жнівень) войскі.
1772 г.	Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай Магілёў увайшоў у склад Расійскай імперыі.



Помнік А.С.Пушкіну.

Ліпень— ліс-тапад 1812 г.	Горад пацярпеў ад баёў 1812 г. паміж расійскімі і французскімі войскамі ў вайну 1812 г.
Май 1820 г.	Праз Магілёў у ссылку праязджаў расійскі паэт А.С.Пушкін (другі раз у 1824 г.).
1825 г.	У горадзе створана і дзейнічала арганізацыя дзекабрыстаў.



Драматычны тэатр

1863 г.	У Магілёве і ваколіцах дзейнічалі атрады паўстанцаў у час паўстання 1863—64 гг. у Польшчы, Беларусі і Літве.
1888 г.	Пабудаваны гарадскі тэатр.



Помнік змагарам за савецкую ўладу.

21.8.1915—25.2.1918 гг.	У Магілёве размяшчалася Стаўка расійскага Вярхоўнага галоўнакамандуючага.
Канец 1917 г.	У горадзе ўстаноўлена савецкая ўлада.
26.5.—31.12.1918 г.	Магілёў акупіраваны германскімі войскамі.



Помнік у гонар батальёна міліцыі, які вызначыўся пры абароне Магілёва.

3—26.7.1941 г.	Абарона горада ад наступаючых нямецка-фашысцкіх войск часцямі 13-й арміі Заходняга фронту і магілёўскага народнага апалчэння.
26.7.1941—28.6.1944 г.	Магілёў акупіраваны нямецка-фашысцкімі войскамі.



Мемарыял на Буйніцкім полі.

13—14.1941 г. Буйніцкае поле каля Магілёва — месца жорсткіх баёў на подступах да горада.

23—28.6.1944 г. Магілёўская наступальная аперацыя савецкіх войск.



Выгляд Магілёва з боку Дняпра.

28.6.1944 г.	Магілёў вызвалены часцямі 2-га Беларускага фронту.
1947—50.	Распрацаваны генеральны план аднаўлення і рэканструкцыі горада.
29.10.1954 г.	Адкрыты Магілёўскі абласны драматычны тэатр.



Станіславаўскі касцёл. Акварэль Ф.С.Кісялёва з серыі «Магілёўская даўніна». 1993 г.

16—17.9.1967 г.	Святкаванне 700-годдзя Магілёва.
1969 г.	Створаны гарадскі савет Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.



У дзіцячым садку № 100.

Верасень 1957 г.	На Магілёўскім металургічным заводзе імя А.Ф.Мяснікова выпушчаны першы беларускі пракат.
1960-я гады.	У Магілёве пачалося будаўніцтва мікрараёнаў.
1968 г.	У горадзе створаны дзіцячы ансамбль «Вясёлка».



У музычным ліцэі.

1977 г.	Адкрыты палац культуры і тэхнікі вытворчага аб'яднання «Хімвалакно».
1980 г.	У Магілёве 300 тыс. жыхароў.
1993 г.	Магілёў стаў месцам правядзення міжнароднага фестывалю духоўнай музыкі «Магутны Божа».



Свята 730-годдзя горада.

1960— 90-я гады	Уведзена ў строй дзеючых больш за 40 прамысловых прадпрыемстваў.
Май 1997 г.	Святкаванне 730-годдзя горада.

Да чытача

Гісторыка-дакументальная кніга-хроніка «Памяць. Магілёў» — вынік шматгадовай нястомнай працы дзесяткаў, соцень людзей, якія ў розныя часы і эпохі жылі, тварылі, змагаліся не толькі ў горадзе на Дняпры, а і ў блізкім і далёкім замежжы. Адшукаць, выбраць, скампанаваць найважнейшыя з матэрыялаў было задачай гарадской камісіі. Наколькі гэта ўдалося — меркаваць вам, паважаныя чытачы!

На старонках кнігі-хронікі змешчаны дакументальныя матэрыялы пра даўніну і сучаснасць Магілёва, яго знакамітых людзей, якія праславілі свой родны горад у розныя часы. Галоўная мэта выдання — увекавечанне памяці загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны. У кнізе змешчаны спісы абаронцаў і вызваліцеляў, воінаў-землякоў, партызан, падпольшчыкаў, мірных жыхароў, якія загінулі ў часы ваеннага ліхалецця.

На вялікі жаль, у нас не заўсёды клапаціліся аб беражлівым захаванні духоўнай спадчыны, праўдзівым адлюстраванні рэчаіснасці. Страчана нямала каштоўных дакументаў і матэрыялаў у гады вайны, палітычных рэпрэсій. Па гэтых прычынах стваральнікі кнігі не могуць гарантаваць поўную вычарпальнасць звестак пра землякоў, якія сталі ахвярамі рэпрэсій 1930—50-х гадоў, а таксама тых, хто загінуў у шматлікіх так званых «інтэрнацыянальных» канфліктах. На жаль, няпоўнымі могуць быць і спісы загінуўшых у першую сусветную, грамадзянскую і савецка-фінляндскую войны.

Кніга выйшла ў свет, але пошукавая работа працягваецца. Новыя звесткі стануць каштоўным матэрыялам для наступных выданняў.

Выканком Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў, камісія па стварэнні гісторыка-дакументальнай хронікі, выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі ўдзячныя прадстаўнікам грамадскасці, супрацоўнікам архіваў, музеяў, бібліятэк, арганізацыям і прыватным асобам — усім, хто прымаў удзел у пошуку, зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў, садзейнічаў выданню гэтай кнігі. Прозвішчы прадстаўнікоў грамадскасці горада, якія займаліся зборам матэрыялаў для хронікі «Памяць», змешчаны ў канцы кнігі.

2. Зак. 198.

Магілёў

Горад на ўсходзе Беларусі, адміністрацыйны цэнтр Магілёўскай вобласці, порт на р. Дняпро, якая падзяляе горад на 2 часткі. Знаходзіцца за 201 км ад Мінска. Займае плошчу 1287,3 тыс. га. 366 тыс. насельніцтва (1993). Падзяляецца на 3 адміністрацыйныя раёны: Ленінскі, Кастрычніцкі, Цэнтральны.

Рэльеф — узгорыстая раўніна, расчлянёная далінамі Дняпра і яго прытокам Дубровенкай, шматлікімі ярамі і лагчынамі глыбінёй да 20 м. Найбольшая вышыня 205 м (у паўночнай частцы Магілёва). Сярэдняя тэмпература паветра ў ліпені 18,2 °С, у студзені -7,5 °С, сярэднегадавая колькасць ападкаў 644 км. Агульная даўжыня вуліц 446,6 км, плошча вуліц, праездаў і набярэжных 8668,6 тыс. км^2. У горадзе каля 3 тыс. га зялёных насаджэнняў, у т.л. лясоў і лесапаркаў 947,7 га, на ўчастках індывідуальнай забудовы 890 га, 5 паркаў — 359 га, насаджэнняў плошчаў, вуліц 163 га, садоў, сквераў, зялёных масіваў 60 га.

Магілёў — буйны індустрыяльны цэнтр Беларусі і вобласці. На долю горада прыпадае больш за 45% кошту таварнай прадукцыі прамысловасці вобласці. У горадзе працуюць буйныя прамысловыя прадпрыемствы, якія вырабляюць хімічнае валакно тэкстыльнага і тэхнічнага прызначэння, пасажырскія ліфты, калёсныя цягачы, самаходныя скрэперы, электрарухавікі, тканіны, абутак і інш. Шырока развіты чыгуначны, аўтамабільны, паветраны (ёсць аэрапорт), рачны і трубаправодны транспарт.

Магілёў — цэнтр навукі і культуры вобласці. У 1997 г. ў горадзе 3 вышэйшыя, 8 сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, 13 прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, Інстытут удасканалення настаўнікаў, аддзяленні інстытутаў фізіка-тэхнічнага і фізікі Нацыянальнай АН Беларусі, дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. Працуюць музеі — Магілёўскі абласны краязнаўчы, гісторыі горада, дзекабрыстаў, этнаграфіі, Мастацкі музей імя В.К.Бялыніцкага-Бірулі, бібліятэкі — абласная, цэнтральныя гарадская і дзіцячая, каля 180 ведамасных, абласныя тэатры — драматычны і лялек, шматлікія самадзейныя калектывы. Існуюць абласныя аддзяленні і арганізацыі творчых саюзаў — пісьменнікаў, журналістаў, архітэктараў, мастакоў, тэатральных дзеячаў і інш. У горадзе абласныя радыёвяшчанне і тэлебачанне, выходзіць шэраг газет, у т.л. «Магілёўская праўда», «Могилевские ведомости», «Веснік Магілёва», «Вечерний Могилев», «Талака» і інш.

Магілёў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені. Ён падтрымлівае сувязі з гарадамі-пабрацімамі Вроцлаў і Торунь (Польшча), Габрава (Балгарыя), Вілёрбан (Францыя), г. Айзенах (Германія), г. Клайпеда (Літва), Смаленскай (Расія) і Ровенскай (Украіна) абласцямі.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Археалагічныя помнікі Магілёва ў розныя часы прыцягвалі да сябе ўвагу даследчыкаў З.Я.Даленгі-Хадакоўскага (1819), М.В.Фурсава, С.Ю.Чалоўскага (1880-я гады), Е.Р Раманава (канец 19 — пачатак 20 ст.), А.М.Ляўданскага, В.Р.Тарасенкі, К.М.Палікарповіча (1930-я гады), Г.І.Іоне, Я.Р.Рыера (1970-я гады), М.А.Ткачова, В.Ф.Капыціна, А.А.Трусава, І.М.Чарняўскага, А.А.Седзіна (1980-я гады). Матэрыялы, якія выявілі навукоўцы, сведчаць пра унікальнасць археалагічнай гісторыі горада і дазваляюць прасачыць непарыўнасць гістарычнага развіцця яго ад каменнага веку да сярэдневякоўя.

Упершыню чалавек з'явіўся на тэрыторыі сучаснага Магілёва ў познім палеаліце, больш за 10 тысяч гадоў назад, і ў раннім мезаліце (10—8-е тысячагоддзі да н.э.), пра што гавораць прылады працы і зброя, якія выяўлены на стаянках Хвойна і Магілёўская. У той час пасля раставання апошняга ледніковага покрыва ў гарах Скандынавіі і наступлення значнага пацяплення з паўднёвых раёнаў на поўнач для асваення новых тэрыторый па далінах рэк пачалі прасоўвацца паляўнічыя. Яны былі носьбітамі грэнскай культуры, характэрная асаблівасць якой — наяўнасць асіметрычных наканечнікаў стрэл так званага «грэнскага тыпу».

Помнікам ранняга этапу грэнскай культуры (10—12 тысяч гадоў назад) з'яўляецца стаянка Хвойна, якая размешчана на левым беразе Дняпра, за 3,5 км на ўсход ад Магілёва, вышэй вусця р. Хвоенка. Стаянку выявіў у 1975 г. і абследаваў у 1985—89 гг. на плошчы 500 м^2 В.Ф.Капыцін. Тут быў старажытны лагер паляўнічых, паўночная частка якога знішчана кар'ерам. Культурны пласт прадстаўлены гарызонтам цёмна-бурага пяску з попельнымі дамешкамі. На глыбіні 0,9—1,06 м выяўлены рэшткі расшчэпленага і апрацаванага крэменю, перакрытыя дзюннымі пясчанымі адкладамі, а таксама пласціны і адшчэпы для вырабу прылад працы, нуклеусы, скрабкі, разцы, праколкі. Магчыма, паселішча было размешчана тут у перыяд фарміравання глебавага покрыва, які працягваўся 200—300 гадоў і скончыўся ў сярэдзіне 9-га тысячагоддзя да н.э.

Стаянка Магілёўская эпохі ранняга мезаліту (10—8-е тысячагоддзі да н.э.) знаходзіцца на ўсходняй ускраіне горада, за 0,5 км на поўнач ад чыгуначнага моста цераз Дняпро. Выявіў у 1897 г. Е.Р.Раманаў, абследаваў у 1925 г. і 1927 г. К.М.Палікарповіч. У 1985—86 гг. у сувязі з узнікненнем небяспекі знішчэння помніка кар'ерам экспедыцыя Магілёўскага педінстытута на чале з В.Ф.Капыціным правяла тут раскопкі. На стаянцы прасочаны культурны пласт магутнасцю 0,3—0,6 м, абследавана 180 м^2 плошчы. Сярод знаходак наканечнікі стрэл грэнскага тыпу, вастрыі, нажы, канцавыя скрабкі, бакавыя разцы, пласціны, нуклеусы.

У эпоху мезаліту змяніліся прыродныя ўмовы, сфарміраваліся сучасныя кліматычныя зоны і ландшафт. Ішоў пошук новых спосабаў дабывання ежы, вырабу прылад працы і палявання.

У неаліце (канец 5 — пачатак 4-га тысячагоддзя да н.э.) сталі больш дасканалымі прыёмы апрацоўкі каменю — пілаванне, шліфоўка, свідраванне. Для неаліту характэрна вынаходства глінянага посуду. Яго з'яўленне дало магчымасць гатаваць, захоўваць і назапашваць ежу. Увесь комплекс неалітычных помнікаў, што вылучаны на тэрыторыі Магілёва і ў наваколлях, адносіцца да верхнедняпроўскай культуры, археалагічнай культуры неалітычных плямён, якія ў 4—3-м ты-

сячагоддзях да н.э. насялялі тэрыторыю паўднёва-ўсходняй Беларусі ў басейне Дняпра на паўночны ўсход ад вусцяў Бярэзіны і Іпуці. Верхнедняпроўцы займаліся пераважна паляваннем, рыбалоўствам і збіральніцтвам. Плямёны сяліліся ўздоўж карэнных берагоў рэк і азёр у наземных жытлах з агнішчамі ўсярэдзіне, выраблялі крамянёвыя прылады працы і зброю: скрабкі, скоблі, нажы, сякеры, ромбападобныя наканечнікі стрэл. Кераміка — вастрадонныя гаршкі, аздобленыя грабеньчатымі адбіткамі, ямкавымі, лапчастымі і накольчатымі ўзорамі.

Стаянку эпохі неаліту на ўсходняй ускраіне Магілёва на першай надпоймавай тэрасе Дняпра ва ўрочышчы Гарадчызна выявіў у 1897 г Е.Р.Раманаў. Ён памылкова датаваў яе часам палеаліту У 1926—27 гг. стаянку абследаваў К.М.Палікарповіч. У культурным пласце знойдзены фрагменты ляпной керамікі, косці жывёл, крамянёвыя прылады працы — скрабкі, нажы, праколкі. Другая неалітычная стаянка размешчана за 0,8 км ад в. Любуж на першай надпоймавай тэрасе левага берага Дняпра. Адкрыў і абследаваў у 1989 г. В.Ф.Капыцін. У шурфах і агаленнях берагавога абрыву знойдзены крамянёвыя канцавыя скрабкі, вастрыі, фрагменты керамікі з ямкава-грабеньчатым арнаментам.

Бронзавы век на тэрыторыі Магілёўшчыны пачаўся ў 2-м тысячагоддзі да н.э. Аддаленасць ад старажытных цэнтраў металургіі абумовіла панаванне там амаль на працягу ўсёй эпохі каменных прылад працы, пры апрацоўцы якіх выкарыстоўвалася свідраванне, пілаванне. Да таго часу адносяцца знаходкі на тэрыторыі горада каменных баявых сякер, дасканала адшліфаваных, з адтулінай для драўлянага дзяржання.

У бронзавым веку адбылося далейшае развіццё жывёлагадоўлі і земляробства і паступовае ператварэнне іх у пануючыя формы гаспадаркі, пашырыўся абмен паміж плямёнамі. Гэта садзейнічала станаўленню патрыярхальных адносін, хуткаму распаўсюджванню агульных прыкмет матэрыяльнай і духоўнай культуры. На мяжы 3—2-га тысячагоддзяў да н.э. ў верхняе Падняпроўе з



Крамянёвыя скрабкі, знойдзеныя пры раскопках археалагічнай стаянкі Магілёўская (эпоха ранняга мезаліту, 10—8-е тысячагоддзі да н. э.) на ўсходняй ускраіне горада.



Крамянёвыя прылады працы, знойдзеныя пры раскопках стаянкі Магілёўская: наканечнікі стрэл, пласціны з прытупленымі краямі, праколкі і інш

поўдня прасунуліся плямёны сярэднедняпроўскай культуры і асімілявалі мясцовае насельніцтва. Яны жылі на невялікіх паселішчах у наземных жытлах слупавой канструкцыі з агнішчамі, выраблялі гліняныя ляпныя гаршкі, арнаментаваныя адбіткамі перавітай вяровачкі, лінейнага і зубчастага штампа, наразнымі лініямі. Пахавальны абрад — трупапалажэнне ў мацерыковых ямах на курганных могільніках, на познім этапе — бескурганныя могільнікі з пахавальнымі абрадамі трупаспалення і трупапалажэння.

Адзін з помнікаў сярэднедняпроўскай культуры ў наваколлях Магілёва — грунтавы могільнік, які выявіў на ўсходняй ускраіне в. Вейна ў 1930 г. В.Р.Тарасенка. Пахаванні — трупапалажэнне на глыбіні 2,5 м. Каля аднаго знойдзена каменная свідраваная сякера, побач з другім — канцавы скрабок з рэтушаванымі краямі.

У канцы 8 — пачатку 7 стагоддзя да н.э. на тэрыторыі Магілёўшчыны пачаўся жалезны век. Жалеза дабывалі з бурых жалезнякоў (балотных, лугавых, азёрных) сыраднутным спосабам у печах-домніцах. Вытворчасць прылад працы з жалеза значна павялічвала прадукцыйнасць земляробства, удасканальваліся дрэваапрацоўка, будаўнічая справа, выраб зброі. У раннім жалезным веку на мысах высокіх і стромкіх берагоў рэк з'явіліся ўмацаваныя паселішчы — гарадзішчы.

Гарадзішчы ранняга жалезнага веку вядомы ў наваколлях Магілёва — за 1 км ад в. Палыкавічы, за 1 км ад в. Буйнічы, а таксама на тэрыторыі горада (Пелагееўскае гарадзішча ва ўрочышчы Змяёўка на правым беразе р. Дубровенка на праспекце Міру). Яны ўтвораны насельніцтвам мілаградскай культуры (7—3 ст. да н.э., назва ад гарадзішча каля в. Мілаград Рэчыцкага р-на Гомельскай вобласці), для якой уласціва кераміка з яйцападобным тулавам, з прамым адагнутым вонкі венчыкам або паўсферычныя пасудзіны без акрэсленага венчыка, упрыгожаныя ямкавымі або пазногцевымі ўцісканнямі на венчыку ці шыйцы, радзей у верхняй частцы тулава. Асноўнымі заняткамі насельніцтва былі земляробства і жывёлагадоўля, дапаможнымі —

паляўніцтва і рыбалоўства. Тып жылля пераважна паўзямлянкі, пазней — наземныя або злёгку заглыбленыя ў зямлю жытлы, прамавугольныя ў плане, слупавой канструкцыі. Пахавальныя абрады — трупапалажэнне на курганных і трупаспаленне на бескурганных могільніках. Пры абследаванні Пелагееўскага гарадзішча выяўлены рэшткі жытла слупавой канструкцыі, два бронзавыя бранзалеты з патоўшчанымі канцамі і геаметрычным арнаментам, якія адносяцца да часоў мілаградскай культуры. Адносна этнічнай прыналежнасці мілаградскіх плямён існуе думка (паводле В.М.Мельнікоўскай), што яны былі неўрамі. Пра іх пісаў Геродот, а краіну іх называў Неўрыдай.

У сярэдзіне 3 ст. да н.э. там, дзе раней жылі плямёны мілаградскай культуры, склалася зарубінецкая культура (назва па могільніку ў в. Зарубінцы Кіеўскай вобласці). У матэрыяльнай культуры зарубінцаў шырока прадстаўлены сякеры-кельты, сярпы, лістападобныя наканечнікі стрэл і дроцікаў скіфскага тыпу, грубаляпная кераміка. Для зарубінецкай культуры ўласцівы невялікія жытлы плошчай 10—24 м^2, квадратныя або прамавугольныя ў плане, слупавой канструкцыі. Унутры жытлаў размяшчаліся адкрытыя каменныя, радзей гліняныя агнішчы. Адносна этнічнай прыналежнасці зарубінецкіх плямён сярод даследчыкаў няма адзінай думкі. Адны лічаць яе праславянскай, іншыя — заходнябалцкай.

Паўднёва-заходняя частка тэрыторыі Магілёўскай вобласці, а таксама Магілёў уваходзілі ў арэал пашырэння штрыхаванай керамікі культуры (7 ст. да н.э. — 5 ст. н.э.), якая атрымала назву за своеасаблівы арнамент, што наносіўся звонку, а часам і знутры посуду пучком саломы або травы па неабпаленай гліне. Большасць даследчыкаў лічыць, што помнікі штрыхаванай керамікі культуры належалі балтам, якія пазней асімілявaліся са славянамі.

Гарадзіцча штрыхаванай керамікі культуры ва ўрочышчы Барсукова горка каля в. Па-



Крамянёвы інвентар са стаянкі Магілёўская.



Гарадзішча Змяёўка.

лыкавічы 1-я ў 1937 г. абследаваў В.Р.Тарасенка. Датуецца 3 ст. да н.э. — 8 ст. н.э., пабудавана на месцы селішча папярэдняга часу. Складаецца з 2 пляцовак агульнай даўжынёй 108 м, якія падзелены валам вышынёй 1,5 м. З паўночнага боку таксама прасочваецца вал, які аплыў. Культурны пласт магутнасцю 1,3—2,2 м. У час даследаванняў выяўлены рэшткі двух наземных, падоўжаных у плане жытлаў слупавой канструкцыі з асобнымі памяшканнямі, кожнае са сваім вогнішчам, абкладзеным камянямі; сярод знаходак фрагменты керамікі, жалезныя нажы, трохлопасцевы наканечнік стралы познасармацкага тыпу, прасліца, фрагменты сякеры, зерняцёркі, косці кароў і коней.

Гарадзішча штрыхаванай керамікі культуры на правым беразе Дняпра, за 0,5 км на паўночны ўсход ад в. Мікалаеўка ва ўрочышчы Гарадок выявіў у 1936 г. В.Р.Тарасенка. Авальнае ў плане, памерамі 23 × 32 м, з паўднёва-заходняга боку гарадзішча ўмацавана валам вышынёй 2,5—3 м, шырынёй 15—18 м. У культурным пласце таўшчынёй 0,2 м знойдзены фрагменты штрыхаванай керамікі і абпаленага каменю. Пелагееўскае гарадзішча, што знаходзіцца ва ўрочышчы Змяёўка на правым беразе р. Дубровенка на праспекце Міру, — шматслойны помнік. У ім прасочаны 3 гарызонты: ніжні з фрагментамі штрыхаванай керамікі (7 ст. да н.э. — 5 ст. н.э.), сярэдні з рэшткамі жытлаў слупавой канструкцыі, 2 бронзавымі бранзалетамі, фрагментамі грубаляпной керамікі 6—8 ст. н.э., верхні з рэшткамі керамікі 12—13 ст.

Паводле Баркулабаўскага летапісу і сведчанняў Е.Р.Раманава, на месцы сучаснага парку імя Горкага існавала гарадзішча «Магіла», якое было парушана пры будаўніцтве замка ў 1526 г. Тут у агаленнях берагавога абрыву р. Дубровенка Е.Р.Раманаў выявіў фрагменты штрыхаванай керамікі з дамешкамі тоўчанага кварцу ў цесце, падобныя на знойдзеныя на Пелагееўскім гарадзішчы. Побач з гарадзішчам «Магіла» знаходзілася селішча 5—7 ст.

Да штрыхаванай керамікі культуры адносіцца і гарадзішча за 0,8 км на поўдзень ад в. Буйнічы на мысе другой надпоймавай тэрасы правага берага Дняпра (выявіў у 1905 г. Е.Р.Раманаў). Помнік шматслойны, акрамя штрыхаванай керамікі прасочваюцца фрагменты ляпнога посуду мілаградскай і зарубінецкай культур. Пляцоўка гарадзішча мае авальную форму, выцягнута з поўначы на поўдзень, мае памеры 46 × 26 м, узвышаецца над Дняпром на 12—13 м. З паўднёвага боку абкружана валам вышынёй 4,5 м, шырынёй да 25 м і ярам глыбінёй 1 м і шырынёй 3 м Магутнасць культурнага пласта 0,35—1,4 м.

У раннім жалезным веку побач з гарадзішчамі існавалі селішчы — неўмацаваныя пасяленні. Адно з іх размешчана на ўзгорках першай надпоймавай тэрасы правага берага Дняпра, на ўсходняй ускраіне горада, плошчай 60 × 210 м.

У 2-й палавіне 1-га тысячагоддзя н.э. ў Верхнім Падняпроўі пачалося рассяленне славян, фарміраваліся саюзы плямён. Магілёўскае Падняпроўе было межавой зонай, дзе па-суседску жылі крывічы (паўночныя раёны), дрыгавічы (правабярэжжа Дняпра) і радзімічы (Пасожжа).

Мяжа паміж крывічамі і дрыгавічамі (паводле В.В.Сядова) праходзіла прыкладна па лініі Заслаўе—Барысаў—Шклоў і апускалася па Дняпры да Рагачова. Найбольш старажытныя помнікі крывічоў — падоўжаныя курганы, якія адначасова былі калектыўнымі магільнымі скляпамі. У 10 ст. ў крывічоў пашыраны пахавальны абрад трупапалажэння ў курганах паўсферычнай формы. Асновы курганоў звычайна абкружаны невялікімі канавамі, у якіх гарэлі пахавальныя агні.

У наваколлі Магілёва вядомы курганныя могільнікі крывічоў 11 ст. каля вёсак Княжыцы і Ямніца. Паводле звестак Е.Р.Раманава, вялікі курганны могільнік крывічоў да 1880-х гадоў захоўваўся паміж Дняпром і Дубровенкай і быў знішчаны ў час работ па нівеліраванні гарадскіх валоў. Там знойдзены шкляныя пазалочаныя пацеркі 11 ст.

У 6—9 ст. у асяроддзі ўсходнеславянскіх плямён ажыццяўляецца пераход ад першабытнаабшчыннага ладу да феадалізму. Пат-

рыярхальная радавая абшчына уступае месца суседскай абшчыне, у якой пераважалі ўжо не кроўнароднасныя, а эканамічныя і тэрытарыяльныя сувязі. Развіццё земляробства, рамёстваў, шырокія гандлёвыя сувязі і фарміраванне новых грамадскіх адносін у феадальным свеце прывялі да ўзнікнення гарадоў.

В.Ф.Капыцін

НАЙСТАРАЖЫТНЕЙШЫЯ ЗВЕСТКІ ПРА МАГІЛЁЎ

Адносна ўзнікнення назвы Магілёва і даты яго заснавання існуе некалькі процілеглых версій. Паводле адной з іх, Магілёўскі замак быў пабудаваны пры ўпадзенні Дубровенкі ў Дняпро. Час яго заснавання адносіцца да 1267 г. У польскай хроніцы Магілёў значыцца пад 1320 г.

Па другой версіі, у «Хроніцы беларускага горада Магілёва» паведамляецца, што ўпершыню замак у Магілёве быў пабудаваны рускім князем Львом Данілавічам у 1267 г. Іншыя даследчыкі лічаць, што замак у Магілёве мог быць пабудаваны ўнукам Льва Данілавіча — Львом Юр'евічам каля 1319 г., бо ёсць звесткі, што ён у той час ваяваў з літоўцамі ў наваколлі Магілёва .

Наступная версія тлумачыць, што «...годам яго заснавання прынята лічыць паведамленне летапісца Сурты аб закладцы Магілёўскага замка ў 1267 г. Ён быў пабудаваны пры ўпадзенні Дубровенкі ў Дняпро, дзе ў той час існаваў рыбацкі памялок» .

Яшчэ адна версія грунтуецца на тым, што першае ўпамінанне аб Магілёве ёсць у хроніцы А.Трубніцкага. У ёй паведамляецца, што паводле падання каля 1267 г. быў закладзены Магілёўскі замак. Прыблізна гэту ж дату заснавання замка — «за некалькі соцень гадоў перад 1526 г.» — адзначае хроніка Т.Р.Сурты і Ю.Трубніцкага. Паколькі крыніцы сведчаць пра «будаўніцтва ў 1267 г. Магілёўскага замка, ёсць усе падставы лічыць, што Магілёў як пасяленне існаваў раней гэтай даты» .

Нягледзячы на вядомыя адрозненні і супярэчнасці, усе версіі адносяць узнікненне горада да 1267 г., таму не здзіўляе прыняцце гэтай даты за канчатковую, з якой звязваліся ўсе святы і юбілеі. Яна трывала ўвайшла ў даведачную , навуковую і навукова-папулярную літаратуру. Спробы некаторых даследчыкаў звярнуць увагу на малую верагоднасць даных, што мелі дачыненне да 1267 г., на жаль, не атрымалі далейшага развіцця У гэтай сувязі цікава прасачыць шлях станаўлення версій, якія адносяцца да ўзнікнення Магілёва ў 1267 г., і дзеянні гістарычных асоб, звязаных з пабудовай горада. Аналіз літаратуры як савецкага, так і дарэвалюцыйнага перыядаў дазваляе прыйсці да высновы аб тым, што ўпершыню дата 1267 г. пачынае з'яўляцца ў «Хроніцы беларускага горада Магілёва», якую выдаў магілёўскі чыноўнік М.Гартынскі ў 1887 г. У «Хроніцы...» Гартынскага пра падзеі ў Магілёве гаворыцца літаральна ў храналагічным парадку: «...каля 1267 г. закладзены Магілёўскі замак з пасяленнем пры ім рыбакоў. 1320 г. Запісаны Магілёў з воласцю ў польскую Хроніку і сяго часу пачаў аддавацца на ўтрыманне старостам. Гэтыя запісы суправаджаюцца спасылкай на Памятную кніжку і на знамянальную працу Турчыновіча»

На арыгінал «Хронікі беларускага горада Магілёва», з якога Гартынскі рабіў пераклад, даследчыкі доўгі час не звярталі ўвагі (лічыўся згубленым), таму не дзіўна, што некалькі пакаленняў гісторыкаў мелі справу не з ім, а з перакладам Гартынскага, які і служыў асновай усіх версій узнікнення горада. У цяперашні час выяўлены два спісы хронікі — поўны (захоўваецца ў рукапісным аддзеле Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі імя М.Я.Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу) і скарочаны (захоўваецца ў рукапісным аддзеле Акадэміі навук Літвы ў Вільнюсе); самы старажытны з іх датуецца 40-мі гадамі 18 ст., пра што ёсць адпаведны запіс на 1-м лістку арыгінала «...гэта кніга яго міласці пана Аляксандра Трубніцкага, спісана Юрыем Трубніцкім, рэгентам Магілёўскай гарадской канцылярыі ў 1747 г. 30 ліпеня...» Далейшае вывучэнне арыгінала «Хронікі...» дазволіла выявіць яе сапраўдных аўтараў, а супастаўленне санкт-пецярбургскага спіса і «Хронікі...» Гартынскага 1887 г. паставіла пад сумненне ўсе звесткі 13—14 ст. пра Магілёў. Такім чынам, дата заснавання Магілёва ў 1267 г. сучаснымі навуковымі данымі не пацвярджаецца. Але нельга поўнасцю адмаўляць існаванне невядомай нам крыніцы, што звязвае ўзнікненне горада з гэтай датай. Трэ-

ба ўспомніць прамое указанне «Хронікі...» на існаванне замка ў Магілёве «... за некалькі соцень гадоў перад 1526 г. ...» або інфармацыю пра выдаўца «Хронікі горада Магілёва» Гартынскага, які актыўна ўдзельнічаў у камісіі Румянцава па выяўленні старажытных дакументаў і мог бачыць невядомыя нам крыніцы, а таксама пра колькасць дакументаў, што былі вывезены ў ходзе працяглых войнаў 16—18 ст. у Расію. *Б.І.Сідарэнка.*

Крывічы ці дрыгавічы?

На тэрыторыі магілёўскага Падняпроўя здаўна па-суседству жылі племянныя аб'яднанні ўсходніх славян: у паўночных раёнах — крывічы, на правабярэжжы — дрыгавічы, у Пасожжы — радзімічы. Межы іх рассялення вызначаны даўно. У 1991 г ў выдавецтве «Навука і тэхніка» выйшла кніга П.Ф Лысенкі «Дрыгавічы». Аўтар удакладняе межы рассялення дрыгавічоў і наводзіць на думку, што менавіта яны заснавалі на правым беразе Дняпра паселішча, якое пазней стала горадам. Пра гэта сведчаць і археалагічныя помнікі, якія выявілі археолагі ў навакольлі Магілёва — у вёсках Буйнічы, Дашкаўка, Салтанаўка, Сухары, Ямніца і інш.

З кнігі П.Ф.Лысенкі «Дрыгавічы».

Немногочисленные сообщения о дреговичах в древнейших письменных источниках не позволяют создать цельной картины о происхождении, расселении и образе жизни этой этнической группы восточного славянства. Первое упоминание дреговичей в древнейших летописях записано в недатированной части «Повести временных лет», сообщающей о расселении славянских племен на Восточно-Европейской равнине после их пришествия с Дуная... (с. 9).

В дальнейшем дреговичи упоминаются летописью в 1116 г., когда минский князь «Глеб бо бяще воевал дреговичы и Случеск пожег...» Запись свидетельствует, что Слуцк расположен на территории дреговичей, принадлежащей враждебному Туровскому княжеству. По-видимому, Слуцк находился на пограничье этого княжества, однако данная запись не содержит указаний на этническую границу дреговичей... (с. 10).

Из наблюдений в ходе массовых раскопок В.З. Завитневич сделал вывод, что этнически определяющим предметом для дреговичей можно считать крупные ажурные зерненые бочкообразные металлические бусы (так называемого «дреговичского типа»). Распространение этих бус позволило В.З.Завитневичу уточнить территорию расселения дреговичей. По его наблюдениям, южная граница расселения дреговичей проходит южнее Припяти, восточная — по Днепру и водоразделу Березины и Друти, северная — от верховьев Друти в направлении Борисов—Заславль, западная — по верховьям Щары и к Пинску (с 11).

Меньше расхождений возникает в определении восточной границы дреговичей. Выявленные археологическими исследованиями конца XIX в. расхождения в погребальном обряде по обе стороны Днепра позволили В.З.Завитневичу сделать вывод о прохождении по этой реке границы между дреговичами и радимичами. В дальнейшем эту точку зрения подтвердили последующие археологические исследования. Было выявлено, что отдельные группы дреговичского населения переходили на восточный берег Днепра (с. 97).

Время существования племенного княжения дреговичей неизвестно. Однако, несомненно, оно предшествует образованию феодального дреговичского княжения, выделившегося из состава Киевского великого княжества в конце X в. (с. 119).

В общих очертаниях границы дреговичского ареала определяются следующим образом. Восточная граница расселения дреговичей в основном проходила по Днепру до Нового Быхова, откуда поворачивала к Борисову. При этом отдельные поселения дреговичей известны на восточном берегу Днепра, радимичей — на западном... При этом следует учитывать, что резко очерченной границы расселения племен не существовало, а была широкая полоса контактов и проникновений, которую заселяло население как одной, так и другой соседней племенной группировки (с. 124)

Аб чым сведчаць раскопкі вуліцы Няфёдаўскай

Месцазнаходжанне асноўных вуліц у Магілёве не мянялася стагоддзямі. Гэта звязана як з устойлівасцю іх напрамкаў так і з недатыкальнасцю сядзібных межаў. Праўда, вядомы выпадкі, калі ў першай палавіне 17 ст. паводле спецыяльнай каралеўскай граматы ці ў выключных выпадках пад гарадскія ўмацаванні часам у гараджан адбіралі пэўныя пляцоўкі. Многія вуліцы па розных прычынах не захаваліся да нашага часу.

Так здарылася і з былой Няфёдаўскай вуліцай, якая злучала Спаскі манастыр (цяпер будтрэст № 12) з Каралеўскай брамай (стаяла перад драмтэатрам). Назва яе паходзіць, верагодна, ад асабістага імя ці прозвішча Няфёд і з'яўляецца рэгіянальнай формай кананічна-праваслаўнага імя Мяфодзій, даволі рэдкага, але неаднаразова зафіксаванага ў дакументах 16—18 ст. Напэўна, самым знакамітым і паважаным жыхаром горада быў Няфёд Іосіфавіч — першы магілёўскі войт, які ўзначальваў гарадское самакіраванне і прызначаўся вялікім князем. Пра яго высокі рэйтынг у горадзе сведчыць і справаздача каралеўскага шляхціца Карыцкага, якому было даручана ўвядзенне ў Магілёве магдэбургскага права. У прыватнасці, там гаворыцца пра пляц войтаўскі ў паркане (гарадскіх умацаваннях) на вуліцы Няфёдаўскай, недалёка ад царквы святых Казьмы і Дзям'яна. Адсюль вынікае, што вуліца абавязана сваёй назвай першаму гарадскому войту. Паводле разнастайных дакументаў і гарадскіх планаў канца 18 — пачатку 20 ст., якія маюць пераважна ўрывачны і фрагментарны характар, яна існавала ў 16 — першай палавіне 20 ст.

Узняць заслону невядомасці дапамаглі археалагічныя раскопкі ў 1989 г. ў дварах дамоў № 6, 8, 10 па вуліцы Ленінскай, у час якіх выяўлены частка Няфёдаўскай вуліцы, што праходзіла побач з тыльным мурам Богаяўленскага манастыра. Пад двухметровым цяжарам зямлі знаходзілася драўляная маставая, якой была выкладзена вуліца ў другой палавіне 16—17 ст. Усяго было ўскрыта 72 бервяны. Маставая аднародная, добра захавалася ў насычаным арганікай пласце. Сярод знаходак конскія і абутковыя падковы, скураны абутак і кераміка 15—17 ст. Трапляліся і наогул унікальныя для Магілёва і Беларусі знаходкі: цудоўны двухслаёвы скураны пояс-дзяга з прыгожым раслінна-геаметрычным малюнкам, паміж якім мацаваліся металічныя накладкі, прадметы ўзбраення, у тым ліку тыльная частка шлема, што закрывала патыліцу, і інш. Пад маставой знойдзены берасцяны кошык-вярэнька 16 ст. і інш. Усё гэта сведчыць пра тое, што на вуліцы жылі гарадскія майстры шматлікіх старостваў-цэхаў, адначасова яны з'яўляліся гарадскімі вайсковымі адзінкамі, мелі зброевую майстэрню, у час аблогі абаранялі пэўную частку вала, магчыма, той, да якога падыходзіла вуліца (у раёне драмтэатра). Сама маставая, відаць, была зроблена майстрамі цэха дойлідаў, што існаваў у Магілёве з 1590 г.

У 1990 г. на месцы старажытнай вуліцы пабудаваны гараж для асабістага аўтатранспарту. Шкада, што вуліца Няфёдаўская знікла з твару горада, але сёння, калі гарадскім вуліцам вяртаюцца спрадвечныя назвы, яна мае поўнае права ўваскрэснуць. *З.Яцкевіч.*

Лучын або Магілёў?

Афіцыйная гістарыяграфія лічыць годам заснавання Магілёва 1267 г. А.Паўлоўскі з Гомеля вылучае сваю версію паходжання горада і яго назвы. У нечым да яе можна прыслухацца, з нечым можна не пагадзіцца.

З артыкула А.Паўлоўскага ў газеце «Магілёўская праўда» ад 27 чэрвеня 1991 г.

Первоначально название города было «Лучин» О нем сообщается в Ипатьевской летописи под 1173 год: «Рюриков же, идущю из Новагорода и Смоленьска, а и бысть на Лучине вербноь недьль в пятокь, слнцю вьсходящю, родися оу него сынь и нарекоша и вь святемь крщенье дьдне имя Михайло, а княже Ростиславь (...) и дастъ ему отець его Лучин

городь — вь нем родился и поставиша на том мъстъ церковь святого Михаила, кде сяродилъ».

Локализация Лучина небесспорна. Одни видят за Рогачевом у д. Лучин, другие — на севере Смоленской области на Лучанском озере у д. Лучаны. Кроме вышеупомянутого текста для этой исторической задачки есть примечание: Лучин поставлял смоленскому князю рыбу (осетра). В списках о дани смоленскому князю он стоит рядом с названными там городами того же княжества. Это Копысь, Прупой (Пропойск), Кречут (Кричев), Лучин.

Есть много версий о месте нахождения этого города. Моя такая. Вербная неделя среди верующих в особенном почете. Поэтому из Смоленска князь с беременной женой мог выехать только в понедельник утром после соответствующей церковной церемонии в одном из храмов Смоленска. А это значит, что если они ехали на Красное, Горки, Копысь, Шклов, Княжее, то в четверг попадали в район Могилева. Если же ехали по Сожу, то обязательно должны были заночевать в Пропойске, что не соответствует летописи, тем более что города в древности располагались, как правило, на расстоянии одного дневного перехода. От исторически известной к тому времени Копыси по Днепру по летописям города не фиксируются конкретно. Следующая за Копысью первая же ночевка и перевоз есть Лучин—Могилев.

Исторически известно, что осетра ловили в Днепре очень давно. Еще при Петре I, когда тот на байдарах спускался от Смоленска в период войны со шведами (1708), ему в знак уважения преподнесли местные евреи осетра в лохани, пытаясь удивить. Но на того гораздо большее впечатление произвели палящие пушки и, сказав: «право, изрядно», тот отплыл в Быхов, долго в Могилеве не задерживаясь

Днепр издревна был обозначен для удобства на ладьях названиями характерных мест. К примеру, пороги: Рог (Рогачев), Луки и пр. Почему? Да потому, что в этих местах надо было менять способ передвижения. К примеру, на порогах идти берегом, на крутых излучинах (на Луках), при попутном ветре против течения идти на веслах, а на Роге еще возвращаться обратно, так как река на добрые 12 верст текла в противоположную сторону. Были, видимо, малые и большие, но Лука у Могилева самая большая. Город у этой Луки, как и Рогачев, носил имя по характерной особенности Днепра. То есть Лучин. Эту излучину, кстати, можно увидеть у Могилева на любой географической карте области и республики.

Разумеется, лучшим доказательством принадлежности Лучина к Могилеву будет нахождение остатков церкви Михаила. Но где? Вернемся к фактам. Где князь стал бы строить город, если бы сам сидел в Смоленске? Разумеется, так, чтобы была польза от этого строительства в части стратегической, т.е. оборонительной — на левом берегу Днепра или на правом? Разумеется, так чтобы зафиксировать территорию своего княжества, а это значит, на древнем пути: предположительно на левом берегу, в районе д. Новоселки, ну и, конечно же, на р. Дубровенке на Змеевке (городище у Дворца пионеров) — на правом. В общем, здесь много вариантов и много мнений. Почему город был переименован, ведь древние названия устойчивы, а в данном случае этого нет? Кстати, есть еще одно значение «Лучин» — что означает «Светлый».

Гора Могила-Мохила, место постройки церкви Михаила — Мохила? Конечно же, этимологи здесь могут больше принять версию могилы или князя Льва. Это все красиво, но неистинно. Ясно одно — город стал так именоваться позже, когда так где-то в это время Литва крестилась, а значит должны были фиксироваться и места, вспоминалось прошлое в другом свете.

Может быть и другая версия: есть такие названия тактических мест на Днепре: Дедлов, Гадлов, Гадиловичи, Быхлов — он же Быхов и др., откуда и Маглов (Моглов), Мохлов (Моглов). Первая часть слов смысловая: дед, Гать (Гадз), Бых, Мог (Мох), Мох-болото. Мог —?, но только не могила. Может, гиблое место, место зимовки рыбы, где она нередко задыхается подо льдом. Лов — место ловов. Заметим, что Сож, к примеру, был поделен на т.н. ловы, гоны. Например, бобровые гоны до Лобковского рубежа у Кричева и пр. А ловы по рыбе: у каждого ручья или речушки были зимние ловы, где выгодные для этого места во время зимовки рыбы у устьев этих рек. Большие и малые ловы.

За эти места держались и дрались издревле, и в первую очередь князья, прибирали к рукам ловы. Разумеется, выгодные по маршруту доставки рыбы к князю. Отсюда «моглый лов» — МОГЛОВ, т.е. место больших скоплений рыб и их замор к весне. Однако и эта версия не исключает строительство «Лу-

чина» смоленским князем на большой излучине Днепра в 1127 году. А по летописи в 1173 году. И эту дату следует, очевидно, считать датой основания Могилева — 1173 год...

Переименование города говорит о его пограничном положении в тот период. Как только он отошел под власть Литвы в 1267 году, фиксированному вниманию предстала другая часть, другое городище на удалении от прежнего, скажем, на 1,5 км, которое имело свое название к тому времени какого-то урочища, долины речки, скажем, принадлежащего церкви Михаила и звучащая не Михайловка посовременному, а Махилёвка или Магилёвка. Город Лучин исчез, а территория, где были церковь, урочище, стала отстраиваться заново, поскольку была удобна в коммуникационном отношении к Литве, а не к Смоленску. Возможно, если поискать в старых названиях урочищ Могилева и окрестностей, может, и отыщется древнее этимологическое «Лучин».

Сярэдневяковы Магілёў

Да апошняга часу пытанне аб існаванні Магілёва ў раннім сярэдневякоўі вельмі спрэчнае. Агульнапрынятая дата заснавання горада (1267) у аўтэнтычных крыніцах не сустракаецца. Найбольш ранняй пісьмовай крыніцай, дзе згаданы Магілёў, з'яўляецца «Спіс гарадоў рускіх далёкіх і блізкіх», які змешчаны ў Археаграфічным або Камісійным Спісе Наўгародскага летапісу малодшага зводу. Паводле гісторыка М.М.Ціхамірава, спіс узнік паміж 1387 г. і 1392 г.[1] Магілёў у ім названы ў групе Кіеўскіх гарадоў («...А се Киевские гроди... Чечерск, Тетерин, Попова Гора, Пропоишеск, Дроков, Гомин, Речица, Могилев, Быхов, Лучин...»[2] Магілёўскі краязнавец Б.І Сідарэнка выказаў меркаванне, што горад існаваў ужо паміж 1320 г. і 1359 г.[3] Чачэрск вядомы ў летапісах з 1159 г.[4], Прапойск (Прапойск, цяпер Слаўгарад) — пад 1136 г.[5], Гомель (Гомін, Гомля) — 1142 г.[6], Рэчыца — 1214 г.[7], Лучын — 1136 г.[8]. Такім чынам, з усіх пералічаных і дакладна лакалізаваных гарадоў толькі Магілёў і Быхаў згадваюцца ў 14 ст., усе астатнія трапляюцца ў крыніцах 12—13 ст. У канцы 14 ст. Магілёў з воласцю быў ва ўладанні вялікай княгіні Ядвігі, жонкі Ягайлы. Пра гэта сведчыць памятны запіс аб падатках Магілёва ў часы Ядвігі, Алены і Жыгімонта І. Паколькі гэты дакумент знаходзіўся ў метрыцы Літоўскай каля 1523 г., то трэба лічыць, што ён адносіцца да 20-х гадоў 16 ст.[9] Дакумент пачынаецца наступнымі словамі: «Напаметь, што хаживало платы з Магілева за набожчицы королевы ее милости Ядвиги 1384, Олены 1506, а за Жыгмонта першого[10]» Паколькі шлюб Ядвігі з Ягайлам адбыўся ў 1386 г., то ў 1384 г. яна не магла мець Магілёў ва ўладанні, а атрымала горад недзе ў 1390-х гадах[11].

Успаміны пра Магілёў сустракаюцца ў спісе замкаў і зямель, якія належалі вялікаму князю Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) Свідрыгайлу ў такім спалучэнні: Гомель, Крычаў, Магілёў, Цяцерын»[12]. Грамата вялікага князя ВКЛ Казіміра магілёўскім мяшчанам ад 11 сакавіка 1447 г. пацвярджала грамату Вітаўта на вызваленне магілёўскіх баяр Ільінічаў ад цягла[13].

Магілёў згадваецца і 30 лістапада 1481 г. ў памятным запісе аб раздачы каралём Казімірам намесніцтваў у Троках: «дано намесництьство Могилевское Мишку Стародубцу, королю дал шестьдесят золотых взгорских... От серебряного старчения Могилевского Юрию дал 13 коп.»[14]

Бязмытны ліст караля Казіміра менскаму мешчаніну Л.Церашкевічу, які датуецца 4.3.1488 г., таксама ўяўляе цікавасць. Сярод гарадоў, дзе дазволена гандляваць бязмытна Церашкевічу, пазначаны і Магілёў[15]. Пра магілёўскіх купцоў мы даведваемся і са скаргі 8 «мужей могилевцев», пададзенай вялікаму князю 15 студзеня 1498 г. на «свою братью данников» і на іншых «товарышов», якія кралі гаспадарскі воск[16]. Выклікае сумненне і выснова, што да 1526 г. не існавала Магілёўскага замка. У дакументах пад 1503 г. замак згадваецца[17].

Баркулабаўскі летапіс паведамляе, «што лета 1526 года большой замок Могилев зроблен и принято много горы Могилы, на которой теперя замок Могилев стоит»[18]. Яшчэ Ц.Сцяпанаў, прааналізаваўшы гэты запіс, лічыў, што да 1526 г. была нейкая іншая пабудова Магілёўскага замка, меншы замак, а пры пабудове новага замка была значна скапана гара Магіла і замак ахапіў цяпер значна большую плошчу ўзвышша[19]. У Магілёўскай хроніцы Сурты і Трубніцкіх таксама ёсць за-

піс, які паказвае на існаванне замка раней 1526 года[20].

Цікавыя звесткі пра Магілёў ёсць і ў працах М.К.Любаўскага, які паказаў, што Ягайла палічыў мэтазгодным «веповаць» сваю жонку менавіта ў Віцебскай зямлі, якая была яго спадчынным удзелам. На карысць прыналежнасці Магілёва да Віцебскай зямлі ён прыводзіў і такі факт, як збор падатку «Ялаўшчыны», які так называўся толькі ў Віцебскай зямлі[21]. А.Сапуноў і А.Кабанаў таксама сцвярджалі, што ў 12 ст. Магілёў быў пад уладай віцебскіх князёў, якія прызначалі сюды сваіх намеснікаў, і пазней быў далучаны да ВКЛ[22]. Аб прыналежнасці Магілёва да Віцебскага княства сцвярджаў у сваіх «Запісках» і ігумен Арэст[23]. На прыналежнасць Магілёва да Полацкага княства паказаў гісторык Т.Я Кіпрыяновіч. Магілёўская епархія першапачаткова ўваходзіла ў склад Полацкай епархіі, гэта працягвалася з пачатку 12 ст. да канца 16 ст.[24]

Немагчыма пагадзіцца з думкай, што толькі ў пачатку 16 ст. пачынае складвацца гарадскі комплекс. Параўнальны аналіз з прыбыткаў Магілёўскай і Менскай мытных камор пачатку 16 ст. сведчыць, што Магілёў дасягнуў большага гандлёвага развіцця, чым Менск. Як паказалі даследаванні М.В.Доўнар-Запольскага, у 1519—24 гг. (г. зн. яшчэ да пабудовы новага замка) прыбытак Магілёўскай мытнай каморы склаў 333 капы грошай, а Менскай — усяго 150 коп грошай[25]. Вядомы польскі гісторык Лаўмянскі пасля аналізу памераў падаткаў прыйшоў да высновы, што Магілёў у 1529—34 гг. быў самым буйным горадам Беларускага Падняпроўя[26].

Як бачым, пісьмовыя крыніцы, вядомыя сёння, не даюць станоўчага адказу на пытанне аб існаванні Магілёва ў 11—13 ст., а дакладна гавораць толькі пра 14—15 ст. Менавіта таму галоўнымі крыніцамі для нас павінны стаць вынікі археалагічных даследаванняў. У маі—лістападзе 1992 г. мне разам з магілёўскім краязнаўцам А.М.Бабакісам давялося ўдзельнічаць у археалагічных даследаваннях на тэрыторыі колішніх Задубравенскага і Траецкага пасадаў, а таксама на тэрыторыі Тэатральнага сквера, там, дзе раней праходзіў другі пояс гарадскіх умацаванняў, што аддзяляў Стары горад ад Новага. Быў сабраны матэрыял на тэрыторыі былога Пакроўскага пасада, на берагах Дубровенкі і Дняпра, праведзена шурфоўка на тэрыторыі Задубравенскага пасада. У выніку шурфоўкі атрыманы матэрыялы 11—13 ст. Збор матэрыялу на тэрыторыі былога Пакроўскага пасада сведчыць аб наяўнасці тут паселішча канца 10—13 ст. Знойдзены пацеркі, шыферныя прасвіцы, кераміка 11—13 ст. Цікавы і двухбаковы бронзавы крыж 14 ст. і бронзавы абразок 12—13 ст., якія былі знойдзены пры ўзворванні палеткаў на гэтых тэрыторыях восенню 1992 г.

Усё гэта дае падставы лічыць, што агульнапрынятая дата заснавання горада — 1267 г. з'яўляецца спрэчнай і патрабуе больш крытычнага падыходу.

Крыніцы:

1. Тихомиров М.Н. Русское летописание. М., 1979. С. 94.
2. Там жа. С. 95.
3. Сідарэнка Б.І. Магілёў па старажытных крыніцах. Магілёў, 1992. С. 33—34.
4. Очерки по археологии Белоруссии. Ч. 2. Мн., 1972. С. 130.
5. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Магілёўская вобласць. Мн., 1986. С. 322.
6. Очерки по археологии Белоруссии Ч. 2. Мн., 1972. С. 120.
7. Там жа. С. 130.
8. Там жа. С. 128.
9. Сцяпанаў Ц. Гісторыя места Магілёва да надання яму Майдэборскага права (1577 г.) // Запіскі аддзела гуманітарных навук Ін-та Беларус. культуры. 1928. Кн. 3. Працы класа гісторыі. Т. 2. С. 318.
10. Там жа. С. 318.
11. Там жа. С. 318.
12. Там жа. С. 318.
13. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России... Собранные и изданные археографической комиссиею. Т. 1 СПб., 1897. С. 19.
14. Акты Литовско-Русского государства. Вып. 1. М., 1899. С. 52.
15. Там жа. С. 52.
16. Русская историческая библиотека. Т. 37. СПб., 1910. С. 686—687.
17. Сцяпанаў Ц. Гісторыя места Магілёва да надання яму Майдэборскага права (1577 г.)... Кн. 3. Т. 2. Мн., 1928. С. 314.
18. Баркалабовская летопись. Вильно, 1910. С. 8.
19. Сцяпанаў Ц. Гісторыя места Магілёва да надання яму Майдэборскага права (1577 г.)... Кн. 3. Т. 2. Мн., 1928. С. 315.
20. Могилевская хроника Т.Р.Сурты и Ю.Трубницкого // Полное собрание русских летописей. М., 1980. Т. 35. С. 239.
21. Любавский М. Областное деление и местное самоуправление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского статута. М., 1892. С. 122.
22. Россия: Полное географическое описание нашего Отечества. Т. 9. СПб., 1905. С. 471.
23. Археографический сборник документов, от-

носящихся к истории Северо-Западной Руси. Т. 1. Вильно, 1867.

24. Киприанович Г.Я Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве с древнейшего до настоящего времени. Вильно, 1895. С. 214.

25. Сцяпанаў Ц. Гісторыя места Магілёва да надання яму Майдэборскага права (1577 г.)... Мн., 1928. С. 358.

26. Мелешко В.И. Могилев в 16 — середине 17 в. Мн., 1988. С. 13. *І.А.Марзалюк.*

Легенды і паданні пра Магілёў

Пра паходжанне назвы Магілёў існуе некалькі старажытных паданняў і легенд. Адны з іх зафіксаваны ва ўспамінах сучаснікаў і ў летапісах. Іншыя бытавалі стагоддзямі ў народзе і перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Найбольш вядомыя з іх прыводзяцца ніжэй.

По древнему преданию известно, что на оном месте, где ныне стоит город Могилев, в глубокой древности, по устроению места село от проложенных между непроходимыми местами дорог, был стан разбойников, для искоренения коих поселена жителями и названа Могилка или Могилянка; потому что место сие наполнено было многими могилками побитых людей от разбойников, коих главный атаман назывался Могилою. Оная деревня Могилка стала на берегу речки Днепра...

По тому же преданию известно, что оного главного атамана разбойнического Могилы другой товарищ назывался Гвоздем и имел жилище на том месте, где Богоугодное Заведение, от чего место оное в Могилеве до сего времени от всех жителей Могилевских называется Гвоздевкою...

З запісак ігумена Арэста (Вільня, 1867 г.)

Древнее предание гласит, что в непроходимых лесных чащах, где ныне стоит Могилев, житель села лесорубов и сплавщиков леса Машека, якийсь был обрученым женихом с невестою, каковую, когда Машека сплавлял лес у Киев-град, схватил князь Мстиславский, роду Витебских князей, и сделал ее своей женой. Машека стал разбойником и беспощадно грабил богатеев и купцов, возивших товары по Днепру Награбленое отдавал беднякам, за что те прозывали его смелым и добрым Львом...

Машека долго охотился за князем, каковой нанес ему обиду. И скоро схватил его с женой, былой своей невестой. Князя повесил, а его жену привел в свой стан. Тая кинжалом убила Машеку ибо привыкла до княжеской жизни...

Машеку с громким плачем хоронили множество бедняков и над могилою насыпали высокий курган, каковой стал называться Могилою Льва...

***

Древнее народное предание гласит, что на высокой горе по-над речками Днепр и Дубровнаю в 1267 годе был построен замок князем Львом Даниловичем по прозванию Могий. В последствии времени место сие вокруг замка было заселено жителями и стало называться по прозванию и имени князя — Могилев.

Замок просуществовал до 1775 года... и был фольварком королевским, откуда управляли жителями Могилева и всеми Чаусскими и Чериковскими крестьянами королевские экономы...

Паданне пра Магілёў: Легенды, паданні, сказы (з кнігі «Дрэва кахання». Мн., 1980).

Рамантычная гісторыя пра Машэку зацікавіла народнага песняра Беларусі Янку Купалу, які ў 1913 г. напісаў паэму «Магіла Льва». Ёсць там і такія радкі:

Яго высокую магілу —
Дзе лес ды вецер панаваў —
Знаць, што вялікую меў сілу,
«Магілай Льва» народ назваў.
Над ёю з часам дрэвы палі,
І горад вырас, як з зямлі,
Яго Магілевам назвалі,
Бо йнакш прыдумаць не маглі...

***

...Сядзіць пад заветным дубам добры моладзец Машэка, вытрашчыў чорныя свае вочы ў сярэбраную даль і думае думу пра сваю любу, пра сваю Прадславу. Запёрта бедная яна цяпер у душным цераме, за сям'ю замкамі і не выйсці ёй адтуль. Баліць у яе сэрцайка, рвецца да дружка сардэчнага, а не ведае яна, што сядзіць ён недалёчка ад яе церама і

думачку думае: «Ах, люба, люба мая, Прадслава мая, сонейка краснае, каб ты была тут каля мяне, каб прыйшла, уцешыла ты мяне, сіраціначку!»

Раптам, нібы светлая хмарачка на небе, выплыла з бліскучай імглы белая здань жанчыны. Ускочыў Машэка: пазнаў ён у гэтай здані сваю Прадславу, і крык захаплення гатоў быў ужо зляцець з яго вуснаў, але ў гэта імгненне з той жа імглы паказалася іншая постаць, чорная, з бліскучым шышаком на галаве. Пацямнела ў вачах у Машэкі. Нібы скрозь сон убачыў ён, як кінулася Прадслава ў абдымкі чорнаму рыцару і як вусны іх зліліся ў пацалунку. Нібы ў сне, кінуўся ён да здрадніцы і толькі тады схамянуўся, калі алая кроў саперніка пачырваніла зямлю. Бледная, дрыжучы, стаяла прад ім Прадслава і такою жаласнаю здалася яна яму ў той час, што ён не пажадаў нават забіць яе і, адвярнуўшыся, пайшоў куды вочы глядзяць. Ішоў ён доўга і чым далей ішоў, тым усё больш і больш накіпала ў ім злосці і супраць усяго роду чалавечага, тым мацней разгаралася ў ім прага да помсты.

І гатоў ён быў затапіць увесь свет кроўю людскою. Так дабрыў ён да правага берага Дняпра, да Гваздоўкі, страшнага логава разбойніка Гваздá, укленчыў ён прад ім і сказаў:

— Вазьмі мяне, Гвозд, к сабе ў памочнікі, не зганьбую цябе і твайго рамяства. Прывяла мяне да цябе злосць лютая і помста страшэнная, і даю я табе зарок вялікі не пашкадаваць ніводнай душы жывой, а калі пашкадую, дык няхай я ад яе і загіну.

— Добра, — сказаў Гвозд, — ідзі вон за роў і працуй.

Пайшоў Машэка на другі бераг рова, заснаваў там сваё логава, назваў яго Машэкаўкаю і зрабіўся гразою ўсяго краю

Мучыў і забіваў ён няшчасных падарожнікаў, рагатаў з іх просьбаў, здзекаваўся з іх слёз і не шкадаваў нікога: ні старых, ні дзяцей, ні мужчын, ні жанчын. Памёр даўно ўжо Гвозд, а Машэка за дваіх працягваў паліць і рабаваць, забіваць і мучыць. Але не мог Машэка кроўю затапіць сваіх пакут: любімы вобраз часта паўставаў перад ім у начной цішы, і плакаў тады страшны Машэка, як малое дзіця, і праклінаў свой злы лёс.

Раз была такая ж месячная ноч, як і тады, калі ў апошні раз ён бачыў сваю любую. Сядзеў Машэка на камні, журботна звесіўшы галаву на грудзі, лёгкі ветрык гуляў рана пасівеўшымі яго валасамі, і слёзы адна за другою буйным дыямантам падалі на зямлю і зліваліся з расою. Раптам пачуўся конскі тупат, гам і шум. Праз мінуту яго шайка прывяла яму двух новых палоннікаў.

— Як іх пакараць? — пытаюць яго малойцы.

Але Машэка маўчаў і шалёнымі вачамі пажыраў жанчыну, што стаяла перад ім. Гэта была яна, гэта была Прадслава. Нарэшце, нібы апрытомнеўшы, правёў рукою па лобе, махнуў рукой на спадарожніка Прадславы і, ухапіўшы за руку сваю любу, павёў яе ў свой курэнь. Тут, паваліўшыся перад ёю на калені, пачаў цалаваць яе рукі і плакаць, і смяяцца, і папракаць.

— Не палюбоўніка майго забіў ты, — сказала яна яму, — забіў брата майго, які быў у апале ў бацькі і патаемна са мною бачыўся, але я даравала табе, мой любы. Я доўга чакала цябе і вось, нарэшце, убачыліся. Кінь твой страшны занятак і ўцякаема, уцякаема туды, дзе ніхто не ведае нас.

— Бяжым, бяжым, мая люба, бяжым, але толькі заўтра, а сёння дай адпачыць на грудзях тваіх ад столькіх жахаў і пакут.

— Добра, — сказала Прадслава.

Але не доўга адпачываў Машэка. Толькі салодкі сон заплюшчыў яго вейкі, як каварная яго люба ўткнула яму, рагочучы, у горла востры нож.

— Памры, сабака, — прамовіла яна. — Хоць і загіну ад тваёй падлай чэлядзі, але я ведаю, што адпомсціла табе і за сябе і за ўсіх.

Прадслава не памылілася: шайка закапала яе жыўцом разам з забітым ёю Машэкам і, насыпаўшы над ім курган, назвала яго Магілаю Льва. Адсюль і ўзнікшы потым на гэтым месцы горад пачаў называцца Магілёвам.

Друкуецца па кн.: Легенды і паданні. Мн., 1983 г.

***

...Место Могилев заселили люди прихожие, которые сели за Дубровенкою, то буйничане и голынчане, селяне, а также из Рудивонкович. Бо первей было село Радивонковичи, а потом Буйничи, старые села давние...

...Лета 1267 г. большой замок зроблен и принято много горы Могилы, на которой теперь замок стоит по на горце Могиле назван Могилев. *З Баркулабаўскага летапісу.*

***

...Нет никакого известия, откуда мог быть назван Могилев названием. Исходя из моего разума, так необходимо объяснить это назва-

ние: могучий лев, по-славянски названный, объясняется крепкий, сильный, великий, ибо так и есть...

...О город, город Могилев! Первый летописец, не могущий взять никакого известия, откуда бы город назывался Могилевом, объяснял, что есть это могучий лев, однако в году 1708 Марс, заострivший свои клыки и зубы, содрал с тебя львиную шкуру и обволок тебя черным и грубым мешком, который и в будущие времена не забудут, что уже отсюда не можешь называться могучим львом, разве только могилами фортут своих горожан... *З «Магілёўскай хронікі» Т.Р.Сурты і Ю.Трубніцкага.*

***

...Название лев как существо появилось уже в исторически известное время. По моему мнению, в названии «Могилев» «льва» нет. Поищем норманские корни. Обратили на себя внимание слова МО-ОК— мох , вой — низина. Выходит: «Моквой. Со временем буква «к» заменилась на «г», возможно даже с наплывом нового населения. Поэтому Могилев, мне кажется, означает «низинный мох».

З артыкула П.Памехава ў газеце «Магілёўская праўда» ад 18 студзеня 1990 г.

...Название Могилева, лежащего на возвышенном правом берегу Днепра, означает усыпальницу какого-нибудь рода, и долгое время был мало известен...

З книги Барона Маейрберга «Записки путешественника». Вена, 1668 г.

Магілёў. Чаму так названы горад?

Паводле падання, у дрымучым лесе, што рос раней на месцы сучаснага горада, жыў асілак Машэка. Багаты князь адабраў у яго каханую дзяўчыну, і Машэка пакляўся ўсё жыццё помсціць багацеям. Ён нападаў на прыгнятальнікаў, якія праязджалі праз лес ці плылі па Дняпры, і забіваў іх. Так з'явілася шмат магіл, ад якіх і пайшла назва Магілёў. Гэта паданне ляжыць у аснове паэмы Янкі Купалы «Магіла Льва» і п'есы В.Вольскага «Машэка», многіх іншых твораў беларускага мастацтва. Імя горада звязваюць таксама з мянушкай Машэкі — «Леў».

Цікавую інфармацыю дае «Баркулабаўская хроніка», якая складзена прыкладна на мяжы 16—17 ст. З летапіснага дакумента вынікае, што мясцовасць, дзе размешчаны Магілёў, яшчэ да заснавання горада называлася Магілай: «Лет(а) 1526 болший замок зароблен и принято много горы Могилы, на которой теперя замок Могилев... стоит, по горце Могиле назван Могилев» (Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці. Мн., 1975, с. 114). І калі да падання можна адносіцца з пэўным недаверам, то паведамленне летапісу трэба ўважліва аналізаваць.

Слова «магіла» ў дыялектах усходніх славян — пагорак, асобная гара, насып, курган. Такія ці блізкія да іх значэнні захаваліся ў гаворках і ў наш час, а таксама ў іншых славянскіх мовах. Так, у балгарскай мове слова «магіла» значыць узгорак, курган, а ўтворацца ад яго прыметнік «магілесть» — «гарысты».

Відаць, назва Магілы, якая папярэднічала геаграфічнаму найменню Магілёў, адлюстравала гэтыя значэнні. Больш таго, другое найменне ўзнікла ад першага і мела амаль аднолькавы з ім першапачатковы сэнс. Рабіць такі вывад дазваляюць наступныя меркаванні.

Магілёў размешчаны на першай і другой надпоймавых тэрасах Дняпра. Дзве глыбокія рачныя даліны накшталт ірвоў падзяляюць горад на часткі. Выразна вылучаецца старая частка Магілёва, якая размешчана на стромкім правым беразе Дняпра і на рацэ Дубровенка, што ўпадае ў Дняпро ў межах горада. З боку больш нізкага задняпроўя гэтая частка здаецца высокай гарой над ракой.

Агульны малюнак магілёўскага ландшафту даказвае, што самая старажытная назва ў наваколлях горада — Магілы — спрадвеку азначала рэальныя ўзгоркі і берагавыя ўзвышшы, а не рукатворныя курганы і іншыя пахавальныя насыпы. Толькі чаму назва горада замацавалася ў форме Магілёў, а не Магілы?

Справа ў тым, што найменне Магілы вызначала пэўную колькасць узвышшаў, пагоркаў, што ўяўлялі сабой адзіную і найбольш выразную асаблівасць мясцовасці. А геаграфічная назва Магілёў мела дачыненне ўжо не да ўзгоркавага ўрочышча, а да паселішча. Та-

му змянілася і форма выражэння адпаведнага значэння. Слова «Магілёў» у адрозненне ад папярэдняга наймення Магілы стаіць у адзіночным ліку і з'яўляецца не назоўнікам, а старажытнарускім прыметнікам са значэннем «узгоркавы». На гэту важную акалічнасць мала звярталі ўвагу даследчыкі.

Большасць іх настойвала на паходжанні назвы Магілёў ад уласнага імя ці прозвішча тыпу Магіла. Выказвалася думка, што назва горада ўтварылася ад прозвішча ці мянушкі кіеўскага князя Льва Данілавіча Могія, што азначае «магутнага, моцнага». Магілёў пры такім тлумачэнні «той горад, што належыць Могію». У сапраўднасці яму належалі ўмацаваны замак і паселішча вакол яго. Але паселішча, перш чым завалодаў ім князь Могій, ужо існавала пад назвамі Магілы, Магілёў. Дарэчы, суфікс -ёў (-оў), з дапамогай якога ўтварылася назва, меў значэнне не толькі прыналежнасці, але і адноснае. Такі суфікс ёсць у складзе іншых старажытных найменняў па Дняпры — Рагачоў, Лоеў, Шклоў — і ніводнае з іх не тлумачыцца паходжаннем ад уласнага імя, мянушкі ці прозвішча.

Прозвішчы тыпу Магіла зафіксаваны ў пісьмовых крыніцах 17 ст. Назва ж Магілёў упершыню ўпамінаецца ў 14 ст. Моўныя формы, якія адпавядаюць прозвішчам у сучасным разуменні гэтага слова, з'яўляюцца ў 15 ст. Такім чынам, найменне Магілёў не магло ўтварыцца ад падобнага прозвішча, якое пачало ўжывацца пасля з'яўлення геаграфічнай назвы. Дапусцім, што назва горада магла ўтварыцца ад мянушкі Магіла, якая, верагодна, ужывалася яшчэ ў старажытнарускі перыяд (13—14 ст.). Але ў той час назвы гарадоў ад мянушак не ўзнікалі. Яны маглі ўтварацца на аснове асобных імёнаў князёў — Уладзімір-на-Клязьме, Яраслаўль, Барысаў, Браслаў, Заслаўе (Ізяслаўль) і іншыя З гэтага пункту гледжання назва Магілёў узнікла хутчэй за ўсё не ад імя, мянушкі ці прозвішча чалавека, а ад папярэдняга наймення Магілы, якое ў сваю чаргу ўзыходзіла да агульнага слова «магіла» ў значэнні «гара», «узвышша».

Геаграфічныя назвы Магіла, Магільна, Магільніца, Магільцы і іншыя вядомы ў Польшчы, Балгарыі, Югаславіі. На Беларусі самай старажытнай з'яўляецца назва Магільна, якая ўпершыню ўпамінаецца ў 1235 г. на тэрыторыі сучаснай Міншчыны (вёска Магільна Уздзенскага раёна). На Украіне існуюць райцэнтры Магілёў-Падольскі ў Вінніцкай і Магілёў у Днепрапятроўскай абласцях. У Сенненскім і Шумілінскім раёнах Віцебскай вобласці ёсць вёскі пад назвай Магілёўка. Магілёўка — гэта «паселішча», што знаходзіцца побач з магілай-гарой. Назва вёскі Магілёўшчына Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці сведчыць аб размяшчэнні пагоркаўмагіл не толькі ў вёсцы, але і ў бліжэйшых наваколлях. Назва ж населенага пункта Магілёўцы Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці гаворыць пра абагульненае абазначэнне жыхароў — магілёўцы. Магілёўцамі называлі тых, хто жыў у «магілістай», узгорыстай мясцовасці.

А.Рогалеў.

У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Некаторыя даследчыкі (М.К.Любаўскі, Ц.Сцяпанаў, У.Пічэта) лічаць, што ў 12—14 ст. Магілёў уваходзіў у склад Віцебскага княства, з 14 ст. — Вялікага княства Літоўскага Паводле звестак, якія адносяцца да 1320 г., Магілёвам і воласцю, гэта значыць сёламі, што ўваходзілі ў склад велікакняжацкіх уладанняў — старосты, кіравалі службовыя асобы — старосты. Пасля заключэння ў 1385 г. Крэўскай уніі, саюза Вялікага княства Літоўскага і Польшчы, замацаванага ў 1386 г. жаніцьбай вялікага князя Ягайлы з польскай каралевай Ядвігай і каранацыяй яго пад імем Уладзіслава II, Магілёў трапіў пад уладу польскай кароны. У канцы 14 ст. належаў польскай каралеве Ядвізе і названы ў той час «местам», што значыць горадам.

Недастаткова звестак пра Магілёў і ў 15 ст. У пачатку 1440-х гадоў ён упамінаецца ў ліку гарадоў, якімі валодаў вялікі князь Свідрыгайла, у 1455 г. — у сувязі з вайной князя Свідрыгайлы з польскім каралём і пабудовай у горадзе ў 1477 г. царквы. У 1503 г. Магілёў падараваны ў пажыццёвае ўладанне жонцы караля і вялікага князя Аляксандра Казіміравіча Алене Іванаўне, у 1514 г. разам з замкам і воласцю перададзены ва ўтрыманне пану Юрыю Зяновічу, а потым стаў цэнтрам сталовай эканоміі.

Паводле Магілёўскай хронікі, тут да 1526



Герб Магілёва. 1557 г.

г. «замок с волостью перед тем несколько сот лет был». Аднак рэшткі таго ўмацавання згубіліся пад сучаснай забудовай Магілёва. Археалагічныя матэрыялы сведчаць пра малаінтэнсіўнае жыццё паселішча ў 14—15 ст. Толькі ў першай чвэрці 16 ст. пачаўся хуткі эканамічны і тэрытарыяльны рост Магілёва, павялічылася колькасць яго насельніцтва, якое папаўнялася галоўным чынам з ліку «прихожих людей селян» і выхадцаў з Крычава, Мсціслава, Смаленска і іншых месцаў.

У 1526 г. Баркулабаўскі летапіс і Магілёўская хроніка паведамлялі, што ў Магілёве пачалося замкавае будаўніцтва. Месцам для замка была выбрана зручная ў тактычных адносінах пляцоўка старажытнага могільніка, якая знаходзілася пры зліцці Дубровенкі з Дняпром, з высокімі і стромкімі схіламі, плошчай больш за 1 га, сваім заходнім схілам узвышалася на 20 м над далінай Дубровенкі, паўднёвым — на 25 м над Дняпром. З усходняга боку пляцоўку абкружаў стромкі і высокі да 14 м схіл. З поўначы праходзіў абарончы роў.

Абавязкі па ўзвядзенні замкавых умацаванняў выконвалі гараджане і жыхары воласці, да таго ж горад выконваў толькі чацвёртую частку аб'ёму ўсёй «городской работы». У адным з дакументаў за 1537 г. адзначалася, што «мещане в таковых работах... людям волостным помочни были еще с тех времен, когда в Могилеве замка не было, а волость и город по королевскому указу ремонтировали другие порубежные замки». Да такіх парубежных замкаў адносіліся Мсціслаў, Крычаў, Кіеў, куды магіляўчане накіроўвалі цесляроў, будматэрыялы, правіянт, зброю. Мясцовае насельніцтва, мяшчане і валашчане, у Магілёўскім замку «в час пригоды схаванья свои мевали».

У летапісах Рачынскага і Еўраінава ёсць звесткі пра руска-літоўскую вайну 1534—37 гг., калі ў Магілёве ў 1534 г. на працягу пяці дзён знаходзілася войска Ю.М.Радзівіла.

20 лютага 1561 г. Магілёву, паводле ўстаўнай граматы караля Польшчы і вялікага князя літоўскага Сігізмунда II Аўгуста, дадзена права на абмежаванае самакіраванне — войтаўства, згодна з якім гараджане вызваляліся ад нясення аднолькавых з сялянамі воласці павіннасцей, але заставаліся залежнымі ад замкавай адміністрацыі. Эканамічны рост горада абвастрыў супярэчнасці паміж мяшчанамі і замкавай адміністрацыяй, што ўмешвалася ў гарадскія справы і накіроўвала дзейнасць войтаўства ў сваіх інтарэсах. Неаднаразова гараджане звярталіся да вялікага князя са скаргамі на старост і іншых службовых асоб і з просьбамі аб дазволе гораду неабмежаванага самакіравання. 28.1.1577 г. кароль Польшчы і вялікі князь літоўскі Стафан Баторый выдаў Магілёву прывілею на магдэбургскае права. Магілёў атрымаў герб — на блакітным полі «вежа мурованая высоко выведеная».

Быў створаны выбарчы орган самакіравання — магістрат, які ведаў адміністрацыйнымі, гаспадарчымі, фінансавымі, паліцэйскімі і судовымі справамі горада, быў распарадчым, выканаўчым і судовым органам. Магістрату падпарадкоўваліся ўсе жыхары горада, за выключэннем тых, хто жыў у юрыдыках (адміністрацыйна адасобленыя часткі горада, што былі пад уладай феадала, царквы або манастыра і на якія не пашыралася адміністрацыйная ўлада магістрата). Першапачаткова магілёўскім магістратам кіравалі прызначаныя вялікім князем з мясцовых магнатаў войт і 2 выбарныя гараджаніны-бурмістры. З ліку гараджан выбіраліся 2 радцы (дарадчыкі) і 4 лаўнікі (прысяжныя засядацелі). Магістрат складаўся з рады, што ажыццяўляла функцыі гарадской улады і суда па маёмасных і грамадзянскіх справах, займалася зборам падаткаў, кантралявала гандаль, дзейнасць рамесных цэхаў, і лавы, якая была судовым органам па крымінальных справах. Да 1654 г. пасада магілёўскага войта была пажыццёвай. Ён атрымліваў 1/3 гарадскіх даходаў ад штрафаў, у гарадскіх уладаннях яму адводзіліся вызваленыя ад падаткаў 2 валокі (каля 43 га) зямлі, дом, сядзібны ўчастак з агародам, сенакос. Да 1636 г. магілёўскі магістрат выбіраўся на 2 гады. Выбары праходзілі на агульным сходзе грамадзян, дзе адначасова выбіраліся два поўныя склады рады, кожны з

якіх пасля прынясення прысягі войту кіраваў горадам на працягу года.

Перадача паўнамоцтваў аднаго складу рады іншаму адбывалася ва ўрачыстых абставінах на агульным сходзе ўсіх членаў, магістрата. Службовыя асобы, што здавалі паўнамоцтвы, рабілі справаздачу аб фінансавай дзейнасці. Рада, якая прымала справы, называлася «рочнай». Для вырашэння найбольш важных пытанняў «рочная» і старая рады аб'ядноўваліся. Члены былога складу магістрата прыцягваліся да выканання абавязкаў службовых асоб «рочнай» рады, што адсутнічалі. У магістрат, як правіла, выбіраліся найбольш уплывовыя гараджане (прадстаўнікі гарадскога купецтва, цэхмістры, заможныя майстры). Некаторыя з іх займалі гэтыя пасады на працягу некалькіх гадоў. Замацаванне вышэйшых пасад за вузкім колам асоб прыводзіла да злоўжыванняў з боку вярхоў магістрата. У 1580 г. з-за ўціску пераважнай часткі мяшчанскага насельніцтва, самавольнай і беззаконнай радай пры магістраце быў створаны кантрольна-дарадчы орган з 12 «присяглых посполитых», якія выбіраліся з ліку гараджан ратушнай юрысдыкцыі і сачылі за правільнасцю выкарыстання бюджэту горада.

У 1588 г. пад уплывам гарадской абшчыны паўнамоцтвы «посполитых» пашыраны, яны атрымалі права дарадчага голасу на выбарах службовых асоб абодвух складаў магістрата, на іх ускладаліся абавязкі «справовать и заведовать» усімі гарадскімі даходамі, весці строгі ўлік фінансавых спраў у сваіх спецыяльных ведамасцях і інш. Былі ўведзены пасады 4 «шафаров» (скарбнікаў): 2 ад рады і 2 ад «посполитых». Без удзелу «посполитых» магістрат не меў права прымаць рашэнні. У 1589 г. гараджане дабіліся права выбіраць лентвойта (намеснік войта, спачатку прызначаўся войтам і ў яго адсутнасць меў законную ўладу ў горадзе) і заключылі пагадненне аб адмове войта ад свайго суда (у якасці кампенсацыі магістрат абавязаўся пажыццёва выплачваць яму 130 коп літоўскіх грошай, за войтам захавалася права адмены рашэння магістрацкага суда, а каб змяніць рашэнне войта, можна было апеляваць толькі да вярхоўнай улады).

Знаходзячыся на скрыжаванні водных і сухапутных шляхоў, Магілёў шмат пацярпеў у час войнаў. У 1580 г. з-за баявых дзеянняў паміж рускімі і польска-літоўскімі войскамі ў час Лівонскай вайны 1558—83 гг. Магілёў быў разбураны, значная частка дамоў спалена. Рускія войскі панеслі вялікія страты і вымушаны былі адысці ад горада.

Унутрыпалітычнае жыццё Магілёва ў канцы 16 — 1-й пал. 17 ст. напоўнена вострай класавай барацьбой. Частыя выступленні мяшчан супраць свецкіх і духоўных феадалаў, якім належала частка гарадскіх зямель, так званых юрыдык, разладжвалі эканоміку горада, затрымлівалі яго развіццё. Узмацненню класавай барацьбы ў Магілёве садзейнічаў ўплыў антыфеадальнага казацка-сялянскага паўстання 1594—96 гг. на Украіне і Беларусі. 13(23).12.1595 г. Магілёў быў заняты атрадам С.Налівайкі і ўтрымліваўся ім 2 тыдні. Супраць Налівайкі выступіла 18-тысячнае войска феадалаў пад камандаваннем рэчыцкага старосты М.Буйвіда. У бітве на Буйніцкім полі пад Магілёвам двухтысячнае войска казакоў мужна змагалася, але вымушана было адступіць. У час адступлення казакі спалілі большую частку горада, у т.л. 2 царквы, разграмілі і разрабавалі ў Магілёве «домы и маетности шлехетские», крамы багатых купцоў, разбурылі гарадскую турму.

Сярэднія і ніжэйшыя слаі гарадскога насельніцтва, а таксама ўсе тыя, хто далучыўся да іх, вялі напружаную барацьбу супраць магістрата і гарадскіх вярхоў. Пасля амаль 20-гадовых сутычак паміж гараджанамі і магістратам успыхнулі гарадскія паўстанні 1606—10 гг. (гл. адпаведны артыкул). Выступленні гарадскіх нізоў супраць магістрата адбыліся таксама ў 1636 і 1638 гг.

Да канца 16 ст. ў выніку далейшага развіцця рамеснай вытворчасці і гандлю Магілёў стаў адным з буйнейшых гарадоў у Вялікім княстве Літоўскім. У 1577 г. ў горадзе было 1261 дом, каля 6,5 тысяч жыхароў у 1604 г. — 2211 дамоў, 15 тысяч жыхароў, у 1661 г. — 2940 дамоў.

У 2-й палавіне 16 ст. рамеснікі горада мелі каля 40 розных спецыяльнасцей: кавалі, гарбары, ювеліры, слесары, шубнікі, мяснікі, фарбавальшчыкі, саладоўнікі, півавары, пушкары і іншыя. У 1577 г. ў Магілёве 157 крам, у пачатку 17 ст. — каля 400. З канца 16 ст. большасць рамеснікаў аб'ядноўвалася ў рамесныя цэхі, якіх у Магілёве спачатку было 12, у 1604 г. — 18. Цэхі вялі барацьбу супраць рамеснікаў, што не ўваходзілі ў гэтыя арганізацыі.

Назіраўся значны рост колькасці рамеснікаў з ліку збеглых прыгонных. У магістрацкіх кнігах адзначалася, што «без волной грамоты» ў горад перасяляюцца сяляне «з мес-

тностей разных шляхетских, якия хлеб перепекаючи на рынке продают, ремесло розное робят и поденство се робити наймут». Колькасць рамеснікаў папаўнялася таксама за кошт прыгонных, што перасялялі ў горад феадалы. Павелічэнне рамеснага насельніцтва і ўмяшанне феадалаў у гарадское жыццё стварала канкурэнцыю і іншыя цяжкасці ў развіцці рамёстваў, абумовіла стварэнне карпарацыйных арганізацый, якія забяспечвалі манаполію вытворчасці і продаж рамесных вырабаў на гарадскім рынку. Першыя рамесныя карпарацыі (першапачаткова называліся старостваміі, брацтвамі, пазней цэхамі) вядомы ў Магілёве з 2-й палавіны 16 ст. У 1577 г. на гарадской радзе зацверджаны статуты старостваў кушняроў, калачнікаў, хлебнікаў, у 1579 г. — краўцоў, у 1580 г. — цесляроў, у 1583 г. — маслабойнікаў, у 1588 г. — саладоўнікаў, мяснікоў, шаўцоў, кавалёў і іншых. Магчыма, рамесныя арганізацыі існавалі і раней. Так, 13.9.1580 г. ў гарадскую раду з'явіліся калачнікі, хлебнікі, крупеннікі, арэшнікі, што ад сябе і ад «остальной братии дома оставшейся» (пералічвалася 77 прозвішчаў) занеслі ў кнігу гарадской рады рашэнне аб выбранні старосты, якому было даручана «радити водлуг стародавного звычаю». У канцы 16 — пачатку 17 ст. ў Магілёве значна павялічылася колькасць рамёстваў (з сярэдзіны 17 ст. было больш за 80 розных спецыяльнасцей). Сярод пералічаных раней — слесары, кацельшчыкі, шабельнікі, кажамякі, сядзельнікі, рымары, саф'яннікі, пекары, пірожнікі, шапачнікі, фарбавальшчыкі, муляры, пушкары, медавары, півавары, шапавалы, бондары, сітнікі, варсавальшчыкі, калёснікі, чахольшчыкі. У гарбарнай і кушнерскай вытворчасці існавала больш за 10 спецыяльнасцей Вырабы магілёўскіх саф'яннікаў, гарбароў, кушняроў-футравікоў (юфта, саф'ян, замша, футра, вырабы з футры) карысталіся вялікім попытам на заходнееўрапейскім рынку.

З павелічэннем спецыялізацыі адбывалася драбленне цэхаў, рамеснікі пэўнай прафесіі аб'ядноўваліся ў самастойныя арганізацыі. У канцы 16 ст. ў Магілёве было 12, у 1-й палавіне 17 ст. — 18 цэхаў. Унутраную арганізацыю рамесных цэхаў вызначалі статуты, якія рэгламентавалі аб'ём вытворчасці, якасць прадукцыі, парадак набыцця сыравіны і продажу вырабаў, правілы прыёму, абучэння вучняў, найму чаляднікаў, умовы іх пераходу ў майстры. Саслоўную згуртаванасць актыўна фарміравала сходка ўсіх членаў цэха. Статут магілёўскага цэха купцоў называў галоўнымі 4 сходкі (2 студзеня, 1 красавіка, 1 ліпеня, 1 кастрычніка кожнага года).

Развіццё рамёстваў садзейнічае актыўнаму гандлю. На гарадскім рынку размяшчаліся гандлёвыя рады: шавецкі, жалезны, рыбны, мясны, палатняны, саляны, пякарскі, ганчарны, кавальскі, а таксама купецкі дом, «важніца» (вагавая), карчма, складскія памяшканні. Гандлем пераважна займаліся купцы (26—30% гарадскога насельніцтва). У 1636 г. купецкія вярхі стварылі купецкае брацтва, з дапамогай якога хацелі дасягнуць пануючага становішча на гарадскім рынку. У першай палавіне 17 ст. магілёўскія купцы падтрымлівалі гандлёвыя сувязі больш як з 60 гарадамі: Віцебскам, Мінскам, Полацкам, Оршай, Мсціславам, Гроднам, Брэстам, Слуцкам, Барысавам, Крычавам, Гомелем, Бабруйскам, Заслаўем, Слонімам і іншымі. Асабліва ажыўлены гандаль вёўся з найбліжэйшымі (у радыусе 10 міль) гарадамі, дзе магілёўскія купцы былі вызвалены ад уплаты пошлін.

У сувязі з Брэсцкай царкоўнай уніяй 1596 г., якая аб'яднала на тэрыторыі Рэчы Паспалітай праваслаўную і каталіцкую цэрквы, на Беларусі абвастрылася рэлігійная барацьба. Своеасаблівай формай рэлігійна-палітычнага руху былі праваслаўныя брацтвы, куды ўваходзілі пераважна рамеснікі, гандляры, а таксама духавенства і шляхта. Брацтва кушняроў Магілёва, створанае ў 1589 г., было адным з першых на Беларусі. Вядомы брацтвы пры цэрквах Святога Спаса (1597), Ушэсця (1602), Праабражэнскай (1605), Богаяўленскай (1633), Крыжаўзвіжанскай (1634). Статут брацтваў прадугледжваў збор узносаў, сумеснае святкаванне Каляд, адпраўленне набажэнстваў 4 разы на тыдзень, раздачу міласціны, аказанне дапамогі збяднелым «братчыкам», стварэнне школ. У Магілёве першая брацкая школа ўзнікла ў 1590—92 гг.

У ёй навучаліся дзеці членаў магілёўскага брацтва, а таксама сіроты. Вывучаліся царкоўнаславянская, «руская» (беларуская і ўкраінская), польская, грэчаская і лацінская мовы. Выкладчыкамі былі адукаваныя для таго часу людзі, што добра ведалі мову і адмоўна ставіліся да уніі і каталіцызму: Цімафей Грыбач, Павел Канстанцін, Апанас Стралецкі, Фёдар Тарасевіч і іншыя. Больш як 3 гады ішла барацьба паміж магілёўскім брацтвам і уніятамі, якія атрымалі каралеўскі дэкрэт на перадачу брацкай школы ў распараджэнне уніяцкага архіепіскапа І Кунцэвіча.

У 1621 г. з-за ўціску вярхоўнай улады школаі завалодалі уніяты, пасля чаго яна працягвала працаваць у доме «братчыка» Максімовіча. У 1633 г. гараджане дабіліся каралеўскай прывілеі на пабудову новай школы пры Богаяўленскім кляштары. Школа займалася вялікай выдавецкай дзейнасцю, якая спрыяла барацьбе супраць уніі, акаталічвання і паланізацыі (у 1757 г. пераўтворана ў духоўную семінарыю).

У знак пратэсту супраць гвалтоўнага насаджэння уніяцтва жыхары Магілёва ў 1599 г не пусцілі ў горад архіепіскапа Г.Загорскага, які прыняў унію. Такім жа чынам у кастрычніку 1618 г., пагражаючы зброяй, яны абышліся з архіепіскапам І.Кунцэвічам, які хацеў падпарадкаваць праваслаўныя цэрквы уніі. Кунцэвіч накіраваўся ў Варшаву, паведаміў каралю пра выступленне магіляўчан супраць уніі і дабіўся каралеўскага універсала, паводле якога 20 удзельнікаў выступлення (Ісаеў, Шульха, Пуцята, Шэўнік і іншыя) былі прыгавораны да пакарання смерцю, а на жыхароў горада накладзены штраф.

Падтрымку праваслаўным брацтвам у канфесійнай барацьбе, пашырэнні асветы і друкарства аказваў вядомы царкоўны і культурны дзеяч Рэчы Паспалітай мітрапаліт кіеўскі і галіцкі Пётр Магіла — заснавальнік Мсціслаўска-Аршанска-Магілёўскай праваслаўнай епархіі з цэнтрам у Магілёве і непасрэдны кіраўнік яе брацтваў і манастыроў.

У 1616—1773 гг. (з перапынкамі) існавала Магілёўская брацкая друкарня. 19.3.1633 г. кароль Рэчы Паспалітай Уладзіслаў IV выдаў Магілёўскаму брацтву прывілею на права адкрыцця друкарні і друкавання навучальных і іншых кніг на беларускай, грэчаскай і польскай мовах. У 1636—38 гг. гэта права, відаць, перададзена Спірыдону Собалю, які ў 1636 г. выдаў «Буквар славянскай мовы». У 1676 г. брацтва атрымала ад караля Яна III Сабескага прывілею на адкрыццё друкарні пры Богаяўленскім кляштары і выданне кніг на беларускай і польскай мовах.

У 1690—1708 гг. друкарню ўзначаліў Максім Вашчанка, які з 1698 г. выдаваў кнігі ад свайго імя. У 1708 г. брацтва мела сваё права на друкарню. У канцы 17 — пачатку 18 ст. друкарня выдавала царкоўныя, навучальныя і палемічныя творы: «Псалтыр» і «Акафісты і каноны» (абодва 1693 г), «Малітваслоў» (1695), «Часаслоў» (1697), «Евангелле вучыцельнае» (1697), «Перла мнагацэннае» (1699) Кірылы Транквіліёна Стаўравецкага, «Дыёптра» (1698), «Неба новае» (1699) Іанікія Галятоўскага, «Трыфалагіён, або Цветаслоў» (1748) і іншыя, шмат з іх перавыдавалася. У друкарні працавалі мастакі і гравёры Васіль Вашчанка (сын М.Вашчанкі), Фёдар Ангілейка, Афанасій П., М.Антушкевіч (гл. артыкул *«Магілёўская школа гравюры»*).

У сярэдзіне 17 ст. значны ўплыў на магіляўчан мела народна-вызваленчая і антыфеадальная вайна 1648—54 гг. украінскага і беларускага народаў пад кіраўніцтвам Б.Хмяльніцкага. У складзе паўстанцкіх атрадаў былі выхадцы з Магілёва. Пасля бітвы пад Корсунем 16(26).5.1648 г. Хмяльніцкі накіраваў пад Магілёў надзейных казакоў, ураджэнцаў тых месцаў «с людьми тамошними добре знаючихся» Пераапранутыя гандлярамі, жабракамі, манахамі, яны заклікалі да сумеснай барацьбы супраць магнатаў і шляхты. Летам 1648 г. рамеснікі Магілёва адкрыта заявілі, што чакаюць казакоў на дапамогу. У кастрычніку 1648 г. атрады паўстанцаў дзейнічалі каля Магілёва.

У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 гг. прыхільнік рускай арыентацыі магілёўскі шляхціц К.Ю.Паклонскі з групай аднадумцаў перайшоў на бок рускага цара Аляксея Міхайлавіча, які даў яму чын палкоўніка. Паклонскі сфарміраваў 6-тысячны полк. Магілёў не быў гатовы да абароны (будаўніцтва абарончых збудаванняў расцягнулася на некалькі гадоў і не было завершана). 24.8(3.9) 1654 г. жыхары горада адчынілі браму перад рускімі войскамі і палком Паклонскага і добраахвотна здаліся. Рускі ўрад захаваў Магілёву магдэбургскае права. Мяшчане ўпершыню атрымалі права ўдзелу ў выбарах войта, ім дазвалялася бяспошлінна гандляваць у горадзе. Жыхары пасада вызваляліся ад ваеннай службы і пастою войск. Шляхта захавала былыя правы і прывілеі. Асобам каталіцкага веравызнання забаранялася займаць якія-небудзь пасады. Былі ліквідаваны юрыдыкі феадалаў і замка. Ваеннымі справамі ў Магілёве і павеце кіраваў ваявода, прызначаны з ліку рускіх баяр.

У канцы 1654 г. польска-літоўскія феадалы аднавілі ваенныя дзеянні. У лютым 1655 г. 20-тысячнае войска пад камандаваннем гетмана Я.Радзівіла падышло да Магілёва і пачало яго асаду. Горад абараняла каля 7 тысяч узброеных людзей і казакоў. У самы крытычны момант Паклонскі здрадзіў асаджаным і разам са шляхціцамі адчыніў браму

і ўпусціў войска Радзівіла за вонкавы земляны вал. Тры месяцы насельніцтва Магілёва самааддана абараняла горад. Спробы Радзівіла ўзяць яго штурмам былі адбіты. Зразумеўшы безнадзейнасць асады і небяспеку з боку ўкраінскіх казакоў наказнога гетмана І.Залатарэнкі, Радзівіл «в большом земляном валу дворы попалил» і 1(11).5.1655 г. «со стыдом проч отошел». Абарона Магілёва ў 1655 г., якая адцягнула значныя сілы польска-літоўскіх войск, сарвала наступальныя планы Радзівіла, перашкодзіла яму нанесці з тэрыторыі Беларусі ўдар па Украіне.

Летам 1660 г. да Магілёва наблізіліся войскі гетмана Вялікага княства Літоўскага П.Сапегі, які неаднаразова прапаноўваў гараджанам здацца, абяцаючы ім каралеўскія літасці, але тыя спачатку не згаджаліся. І толькі добра арганізаваная змова заможных гарадскіх вярхоў і шляхты дапамагла падняць гараджан супраць маскоўскага гарнізона. Як паведамляла Магілёўская хроніка, «кожны гаспадар ноччу ў сваёй гасподзе выкруціць салдату з ружжа крэмень». У час узброенага сутыкнення паміж гараджанамі і маскоўскімі стралкамі «пачала была масква браць верх, але нейкі гараджанін адамкнуў турму, у якой знаходзілася многа вязняў палякаў. Гэтыя вязні добра дапамаглі, бо за некалькі гадзін масква збіта і абрабавана». У лютым 1661 г. горад здалі.

У 1661 г. кароль Рэчы Паспалітай Ян Казімір пацвердзіў права мяшчан выбіраць войта, атрыманае імі ад рускага ўрада, даў гораду новы герб: на блакітным полі тры гарадскія вежы, у сярэдняй, адкрытай, браме — рыцар з узнятым мячом, уверсе — коннік («пагоня»). Ваенныя дзеянні нанеслі Магілёву значныя страты, скараціласа колькасць насельніцтва, затрымалася развіццё рамеснай вытворчасці.

Ажыўленню гаспадарчага жыцця садзейнічаў гандаль з рускімі гарадамі і Левабярэжнай Украінай. Кушняры і футроўшчыкі працавалі пераважна на сыравіне, якую прывозілі з рускіх гарадоў. Рускі ўрад даваў магчымасць магілёўскім купцам свабодна гандляваць у Смаленску, Маскве і іншых гарадах. Разам з рускімі купцамі яны ездзілі на далёкія кірмашы, у 1672 г. ўдзельнічалі ў Макар'еўскім кірмашы (сяло Макар'ева на р. Волга). З-за адсутнасці ва ўсходняй частцы Беларусі фальварачна-панскай сістэмы з яе развітой формай сяляне маглі больш свабодна распараджацца прадуктамі сельскагаспадарчай працы, пашыраць абмен паміж гарадам і вёскай, стымуляваць развіццё вытворчых сіл. Развіццю эканомікі Магілёва і росту горада спрыяла таксама адсутнасць у ім засілля феадалаў, якое было прадухілена рашучай барацьбой гараджан. Да канца 17 ст. Магілёў стаў буйным горадам Беларусі з насельніцтвам 15 тысяч чалавек, 3 тысячамі дамоў.



Герб Магілёва. 1661 г.

У пачатку 18 ст. эканамічныя ўмовы Магілёва значна пагоршыліся. Паўночная вайна 1700—21 прынесла яму цяжкія разбурэнні. Тэрыторыя ўсходняй Беларусі была галоўным цэнтрам ваенных дзеянняў. Праз Магілёў праходзілі асноўныя сілы рускай і шведскай армій. У чэрвені 1706 г. горад наведаў Петр I. У сакавіку—ліпені 1708 г. ў Магілёве і наваколлях знаходзіліся рускія войскі. Магіляўчане забяспечвалі іх харчаваннем, зброяй і падводамі, удзельнічалі ў будаўніцтве мастоў цераз Дняпро.

У жніўні 1708 г. Магілёў быў заняты войскамі Карла XII. Шведы падзялілі горад на 15 кварталаў, кожны з якіх павінен быў штодзённа пастаўляць па 312 пудоў хлеба і 960 гарцаў (3 тысячы л) піва. Шведы рабавалі цэрквы і кляштары, вывезлі з горада больш за 9 пудоў серабра. На працягу 6-тыднёвага знаходжання захопнікі адабралі ў насельніцтва Магілёва ўсе запасы харчавання, знішчылі больш за 1700 жылых дамоў.

У Магілёўскай хроніцы паведамлялася, што «года 1708 месяца верасня 8-га... горад Магілёў, нягледзячы на тое, што быў зрабаваны шведам, але застаючыся збудаваным у дамы, крамы... абярнуўся за адзін дзень праз агонь у попел і тло, бо з указу цара Пятра Аляксеевіча масква, калмыкі і татары ў вышэйпамянёны дзень, роўна з усходам сонца, акружылі горад з усіх бакоў...» (гл. артыкул *«Магілёўская хроніка»*).

Пасля вайны гараджане, каб мець грошы для ўплаты падаткаў і аднаўлення гаспадаркі, здавалі зямельныя ўчасткі ў арэнду феадалам. У 1765 г. феадалы арандавалі ў Магілё-

ве 240 зямельных участкаў. З-за цяжкіх павіннасцей і падаткаў, салдацкіх экзекуцый і рэквізіцый мяшчане пераходзілі з-пад улады магістрата ў падпарадкаванне свецкіх і духоўных феадалаў. У скаргах магістрата каралю неаднаразова паведамлялася, што «мещане юридики ратушной на юридики другие переходят». У выніку магістрат губляў шмат падаткаплацельшчыкаў, слабела гарадская абшчына і гарадское самакіраванне. З дапамогай даўгавых абавязацельстваў, завяшчанняў, даравальных запісаў, узброеных «наездаў» феадалы і каталіцкая царква пашырылі свае ўладанні ў Магілёве. У 1729 г. ў ім было 15 юрыдык (замкавая, феадалаў Зянкевіча, Лярскага, Кажанеўскага, Савіцкага, Панятоўскага, кармелітаў магілёўскіх, езуітаў аршанскіх і магілёўскіх і інш.), да 1772 г. — 25.

Горад паступова аднаўляўся, пашыралася рамесная вытворчасць. У 1717 г. тут былі 844 дамы, у 1746 г. — 1119, у 1765 г. — 1879 дамоў, 832 рамеснікі. Цэхі ў той час ужо не маглі справіцца з няцэхавымі рамеснікамі, колькасць якіх увесь час павялічвалася. Да 1770-х гадоў колькасць цэхаў скарацілася да 9. У 18 ст. для прамысловасці Магілёва характэрна пранікненне ў дробнатаварную вытворчасць гандлёвага капіталу, звязанага з пашырэннем ролі скупшчыка, што паступова выцесніў дробнага таваравытворца з рынку збыту і пераўтварыў яго ў наёмнага рабочага. Гэты працэс суправаджаўся ўзмацненнем дыферэнцыяцыі сярод рамеснікаў і вылучэннем з іх асяроддзя параўнаўча невялікай групы заможных майстроў, якія для пашырэння сваёй вытворчасці наймалі рабочую сілу.

Эканамічнаму росту Магілёва спрыялі яго сувязі з рынкам. Побач з захаваннем традыцыйных энешнегандлёвых сувязей Магілёва, якія склаліся ў 16—17 ст., у структуры і кірунках знешняга гандлю ў 18 ст. адбыліся змены. Развіццё рускай прамысловасці, палітыка меркантылізму Пятра I, выхад Расіі да Балтыйскага мора рэзка знізілі неабходнасць пасрэдніцтва магілёўскіх купцоў паміж заходнеўкраінскім і расійскім рынкамі. У 18 ст. гандаль Магілёва з Масквой і Смаленскам крыху аслабеў, але ажыўлена вёўся з гарадамі Левабярэжнай Украіны (Нежынам, Кіевам, Ромнамі), адкуль магілёўскія купцы прывозілі тытунь, турэцкія дываны, маскоўскае сукно, палатно і іншыя рэчы. Сярод польскіх гарадоў галоўнымі гандлёвымі партнёрамі Магілёва ў 18 ст. былі Гданьск і Вроцлаў, якія знаходзіліся пад уладай Прусіі. Развіваліся сувязі з Рыгай, Дынабургам, Круляўцом і іншымі прыбалтыйскімі гарадамі. Іншаземны гандаль Магілёва сканцэнтраваўся ў руках багатых купцоў, быў больш арганізаваны ў параўнанні з папярэднім перыядам: гандлёвыя аперацыі вяліся пераважна на дагаворных умовах, па заключаных раней кантрактах.

У 2-й палавіне 17—18 ст. адбыліся змены ў структуры гарадской рады, выбарчай сістэме і ў прынцыпах кіравання горадам. Войт (у крыніцах 18 ст. «дырэктар»), як і ўся рада, выбіраўся штогод з ліку службовых асоб, што ўваходзілі ў склад пяці змен магістрата (бурмістраў, радцаў і лаўнікаў). Пасада лентвойта ліквідавана. Палавіна членаў магістрата ў абавязковым парадку павінна была быць каталіцкага веравызнання. У гарадскім самакіраванні павялічылася роля сесій «радных і посполитых». Сесія была распарадчым органам і займалася пытаннямі гаспадарчага, фінансавага і грамадска-палітычнага жыцця горада, прымала рашэнні, выкананне якіх было абавязкам дзеючага («рочнага») магістрата. Палітычнае жыццё Магілёва таго часу запоўнена барацьбой гараджан супраць падаткавага і павіннаснага ўціску, беззаконняў і самавольстваў магістрата пры размеркаванні і зборы падаткаў, злоўжываннях уладай. У 1742 г. і 1744 г. гараджане Магілёва не заплацілі належнай сумы грашовага збору, адмовіліся яго ўносіць, а таксама падпарадкоўвацца гарадской радзе. Магістрат прыняў жорсткія меры ў адносінах да найбольш актыўных арганізатараў супраціўлення. Многія рамеснікі былі прыцягнуты да суда, а шэсць чалавек зняволены ў турму. Унутры цэхаў напружаную барацьбу супраць майстроў і цэхавай старшыны вялі чаляднікі і вучні. Яны накіроўвалі скаргі ў магістрат, арганізоўвалі адкрытыя выступленні. У 1748 г. цэхмістры цэхаў краўцоў, слесараў, кавалёў, шаўцоў, рымараў, пекараў, маслабойшчыкаў звярнуліся за дапамогай да магістрата, каб «ремесленники цехов к судам цеховым и складским послушны были».

У 17 ст. ў гарадах Беларусі, у тым ліку і Магілёве, умацоўвалі свае пазіцыі каталіцкія ордэны. Праваслаўныя цэрквы перадаваліся уніятам. У 1692 г. кароль Рэчы Паспалітай выказаў пажаданне, каб магілёўцы добраахвотна сталі уніятамі, а калі яны гэтага не зробяць самі, то будуць у уніі паняволі. Правячыя колы Рэчы Паспалітай узмацнілі барацьбу супраць праваслаўных брацтваў. Сеймавай

пастановай 1676 г. ўсе праваслаўныя брацтвы пазбавіліся права прамога падпарадкавання канстанцінопальскаму патрыярху і сталі залежнымі ад мясцовых епіскапаў, якія прызначаліся з ліку уніятаў.

Міжканфесійныя праблемы актыўна скарыстоўвала ў палітычных мэтах Расія. Царскі ўрад неаднаразова выступаў як заступнік праваслаўя на землях Рэчы Паспалітай. Так, 4.8.1758 г. ў запісцы расійскага ўрада паслу Рэчы Паспалітай у Пецярбургу аб прыцясненні праваслаўных цэркваў і манастыроў на Беларусі абвяргаліся сцвярджэнні віленскага епіскапа, быццам у Магілёве «греко-российскаго закона обыватели, имея несколько десятков церквей своих, хотят еще и более оных иметь и чрез то совсем римской религии костелы вывесть». У ёй гаварылася, што ў Магілёве знаходзіцца не некалькі дзесяткаў цэркваў, а «не более, как только 9, и еще 2 монастыря, Катедральный и Братской». Далей канстатавалася, што «ее императорское величество такие римского духовенства и шляхетства польскаго поступки ни к чему иному причесть не может, как токмо к излишней ревности их религии и к не уважению имеющагося между Всероссийской империею и Королевством Польским вечнаго мирнаго трактата и чинимаго с стороны ее императорского величества за тех бедных людей по силе онаго трактата и по единоверию заступления» (цытуецца паводле зборніка дакументаў «Белоруссия в эпоху феодализма». Т. 2. Мн., 1960. С. 370—371). *Б.І.Сідарэнка.*

Дакументы сведчаць...

ДАРАВАЛЬНАЯ ГРАМАТА КАРАЛЯ СІГІЗМУНДА III ПРАВАСЛАЎНЫМ МЯШЧАНАМ МАГІЛЁВА, ЯКАЯ ДАЗВАЛЯЛА ІМ ЗАСНАВАЦЬ ПРЫ ЦАРКВЕ І МАНАСТЫРЫ СВЯТОГА СПАСА ЦАРКОЎНАЕ БРАЦТВА І ЗАЦВЯРДЖАЛА ЯГО СТАТУТ

21 сакавіка 1597 г.

Жикгимонт III...

Ознаймуем сим нашим листом всим вобец и кождому засобно, кому то ведати належит, иж мещане наши могилевские, чинячи порядок сами межи собою, намовили братство при церкви и монастыри св. спаса, и, на артыкулы згодившися, списали собе вилкер; которых мещан наших именем прощены есмо, абы тое братство церковное св. спаса для всякое певности и потомных часов листом нашим варовано было. И мы, господарь, видячи быть реч слушную, абы ся хвала божая во всем помножала, и на то ласкаво позволивши, артыкулы тые казали есьмо в сесь наш лист слово от слова вписати, и так ся в собе мают.

«Мы, Ермола Алексеевич, Федор Федорович, Герасим а Кандрат Максимовичи, Офанас Яковлевич, Овхим Романович, Офанас а Федор Свиридовичи, Иван Иванович, Мартин а Иван Овхимовичи, Василей а Стефан Левоновичи, Богдан Игнатович, Иван Хоминич, мащане места господарьского Могилевского, имены вышей помененые и не помененые, чинячи порядок в монастыру церкви головной св. спаса, маючи на баченью повинность нашу хрестянскую и беручи приклад з инших мест, к оздобе и помноженью хвалы божое и порядков слушных захованья, собравшися, межи собою вси згодне застановили есьмо братство наше у церкви нашой головной св. вел. спаса на вси потомные часы, таким способом: напервей, иж хто бы кольвек в тое братство наше святобливое церквное вписатися и братом уписным зостати хотел, тот мает дать уписного до скрынки братское тое, што сам похочет, водлуг воли и преможения своего. К тому, кождый брат уписный, кождой недели, по службе божой ранней, повинен до братства церковного прийти и водлуг воли и преможенья своего до скрынки братской на ялмужну дати. Также кождого року складанка одна у году, а меновите, в неделю 4-ю по рождестве христове, для вспоможенья братского, водлуг воли и преможенья нашого быти мает, и теж хто што при скончании живота своего, сам, с доброе воли своее, на братство церквоное надаст и отпишет. А с тых всих приходов службе божая ранняя через попа и дьякона нашого братского, у олтара братского, в кождом тыждню чотыри кроть, а меновите, в неделю, в середу, в пятницу и в суботу отправована быти мает, а особливо в кождую пятницу, по службе божой ранней, всим собором вел. спаса богомолье, т е. молебен за господаря короля е.м., нашого милостивого пана, за панов рад, за рыцерство и за все християнство пана бога просити повинны будут; а за то попом и дьяконом и слугам церковным з скрынки братской с приходов помененых водлуг порядку братского заплатити мает. На кождое свято урочистое, где в которой церкви праздник будет, також на богомолье по 6 гр. давано будет; также и черницом в каждом тыждню водлуг преможенья братского давати мает, а до шпиталей и по турмах вязнем и убожству по улицах два кроть в рок ялмужну давать маем с доброе

воли нашое, а меновите, о божом нароженью и о великодню. Естли бы тех который-кольвек брат уписный, с допущенья... божого, с пригоды, на маетности упал, тогды таковому, с повинности хрестиянской, з скрынки братской водле преможенья братского подпоможенье чинити будем; также и в хоробе брату уписному убогому, яко на ратунок здоровья, так и на выживенье часу тяжкости его, водле преможенья братского дадим и всякими потребами опатровати будем. А кгды теж на которого брата уписного убогого пан бог смерть допустити рачит, а не было бы маетности его, чим тела поховати, тогды вся братья братства церковного накладом своим з крынки братской погреб ему чинити будем водлуг звычая хрестиянского, яко добрая воли и поможность наша будет. В школе теж братской детей братьи уписной и убогих сирот языка и письма словеньского, руского, греческого, латиньского и польского накладом братским дармо учити повинни, водлуг застановленья нашого братского; также и людей в писме учоных, особ духовных и светских, для науки школьной, до проповеди слова божого, до науки детей и до спеванья, в справе и звыклости своей ховати маем Братья братства церковного уписные вси водлуг шлюбу своего и рукоданья, повинностям братским во всем досыть чинити, и схажок водлуг порядку братского пилны быти маем; а естли бы хто якого ж кольвек стану з братьи нашой уписной схажок неделных, для порады благочестия и красолепия церковного, пилен быти и повинностям братским досыть чинити не.хотел, таковый за выступок и непослушенство свое вину, в постановленью нашом братском в книжках описаную, поносити без всякого отреченья мает. А естли бы ся теж, кому кривда якая-кольвек от братства церковного в речах церковных и в справах наших братских видела, тогды тот о тое нигде инде такового кождого з нас позывати не мает, одно до вряду нашого местского Могилевского. До пожитков теж наших церковных братских нихто с духовного и светского стану ниякого вступу мети не мает».

Которое братство церковное св. спаса у Могилеве, с тыми артыкулами в нем описаными, сим листом нашим во всем потвержаем. Мают мещане наши могилевские того братства уживати на вси потомные часы, згожаючися во всем водлуг веры и закону руского, будучи в речах духовных под послушенством владыки теперешнего полоцкого и напотом будучих, а в справах светских под владзою вряду местского права майдеборского мешкаючи и трываючи. А особливо дом братский, на пляцу церковном збудованый за монастыром, со всими кгрунтами, от всяких повинностей и податков вольным чиним; и нихто з якогож кольвек стану духовного и светского в том дому стояти, и вряд господы записовати никому не мает, кгдыж в нем учинки побожные братья отправовати будут. Над то, естли бы ся кому-кольвек в речах церквовных в братстве помененом кривда якая стала, тогды старшие и справцы рочные братства того померковати то мають в дому братском; а естли бы тому досыть не учинили альбо сторона кривду собе в померкованью их розумела, тогды мают таковую справу до владыки полоцкого, яко старшого пастыря, отослати, а он то кончити повинен будет, не затегаючи в то справ светских и ниякого уменьшенья владзы вряду местскому не чиничи. При том теж позволяем, з ласки нашое господарской, в том дому братском два склады медовые вольные в кождый рок мети, коли похочут: а на каждый склад сытити меду мають по 15 пудов, ваги могилевское; который мед кождого складу братья в дому братском через 4 дня пити мают, а с того меду воск на свечи до церкви оборочати и давати повинны будут, в том им арендары корчом могилевских перешкожати не мают: однакож же, кгды сытити мед будут, мает то быти з ведомостью вряду местского и арендаров. И на то дали есмо братству церковному св. спаса в Могилеве сесь наш лист, с подписом руки нашое господарской, до которого и печать нашу Вел. кн. Лит. притиснути есмо росказали. Писан у Варшаве на сойме вальном лета божого нароженья 1597 месяца марта 21 дня.

Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. Мн., 1960. С. 426—429.

Звесткі пра Магілёў у Баркулабаўскай хроніцы

Баркулабаўская хроніка — помнік беларускай гісторыка-мемуарнай літаратуры пачатку 17 ст. Складзена ў в. Баркалабава (Баркулабава) Быхаўскага раёна, верагодна, мясцовым святаром Фёдарам Філіповічам, які, дарэчы, названы ў хроніцы магілёўцам. Летапіс ахоплівае перыяд 1545—1608 г. і ўключае шмат звестак пра жыццё, побыт, звычаі сялян, міграцыю насельніцтва, цэны на сельскагаспадарчыя прадукты і інш. Асабліва багатыя дэталямі і цікавыя з мастацкага боку замалёўкі неўрадлівых і галодных гадоў у пачатку 17 ст. У хроніцы даецца апісанне падзей грамадска-палітычнага і рэлігійнага жыцця канца 16 — пачатку 17 ст. Аўтар хронікі асуджаў ваенныя канфлікты, адмоўна

ставіўся да казакоў, да царкоўнай уніі 1596 г. Жывая гутарковая мова і спецыфічнае паводле адбору матэрыялу, стылю і сродак выразнасці адлюстраванне жыцця ставяць Баркулабаўскую хроніку ў шэраг найвыдатнейшых помнікаў беларускай культуры. Упершыню была апублікавана П.А.Кулішам у 1877 г. Арыгінал зберагаецца ў Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве.

Урыўкі з хронікі, якія прыводзяцца ніжэй, друкуюцца па кнізе «Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці» (Мн., 1975) з захаваннем нумарацыі спасылак да каментарыяў. Складальнік гэтага зборніка і аўтар каментарыяў да хронікі вядомы даследчык старажытнай беларускай літаратуры А.Ф.Коршунаў.

МОГИЛЕВ

За господаря кроля Жикгимонта[19], за митрополита[20] Иону[21], за владыку[22] полоцкого пана Хребтовича[23], за держанем пана Стафия Воловича, за старосту[24] его пана Баркулаба Корсака[25], а пан Иван Чорный был городничим, а место Могилев засели люди прихожие: на Леткове[26], к Печерску[27] идучи, то вотчичи[28] Сухоч[29], Бутак[30], Андросович[31]; около места прихожие люди — селяне с Княжич[32], с Головчина[33], з сел многих; которые сели за Дубровною[34] (рекою. — *А.К.*), то буйничане и голынчане, селяне также и з Радивонкович[35]. Бо первей было село Радивонковичи, а потом Буйничи[36] — старые села, давние. А которые сели на слободе, на Гривце, на берегу оного Кошоваго, коло Десятинныя (церкви. — *А.К.*)[37], продки их з Смоленска — пришлые смоляне, то есть Гаврило Дристун, Иван Белый, Максим и иных много, такъже Овтушко Богатый, — тые вси з Смоленска пришли.

Лет(а) 1526 болший замок зароблен и принято много горы Могилы, на которой теперя замок Могилев (д. 137 адв.) стоит, по горце Могиле назван Могилев. Почавши от Днепра, идучи подле Дубровны аж и за Печерское, на гетой стороне кгрунты, то все буйницкое было. А Буйничи село княженье можное держало: князь Крошинский, князь Мосалский, пан Баркулаб, пан Солтан, пан Филон[38] и иных панов (много. — *А.К.*).

МОСКВА МОГИЛЕВ ВЫЖГЛА В ПЕТРОВ ПОСТ

Року 1580 господарь кроль Стефан был под Псковом[73] и взял город Псков[74]. А москва, то ест Серебреный[75], з немалым войском место славное Могилев выжог. Там же у краи Шклов, Копысу[76], села велми выпустошили. Такъже и около Могилева. На Орши и до Радомлии[77], Мстиславля[78] — тых замков не подходила, ани рушила.

А в Боркулабове князь Чарторийский Иван з войском своим на тот час был. Так теж и Темрюк[79] со тристами войска татарского при нем был у Борку (л. 139) лабове. На тот час и сторожу у Новоселках[80] московскую поймали. А потом Темрюк и князь Чарторийский, князь Иван, взявши ведомость певную от сторожи московское, которую поймали у Новоселках, то есть на имя Ивана...[81], и князь Иван Чарторийский заехал от Шупень[82], дорогою великою шкловскою до Могилева тягнул. А москва под местом Могилевом места жгут. А Темрюк з Боркулабова дорогою могилевскою на Зудобровеня[63] до замку Могилева з войском притягнул. А войско литовское у Школе стояло. Тепер же от Могилева почали отпирати с трех сторон: Чарторийский от Шупень, Темрюк з Баркулабова, войско литовское з Копыси, и з Шклова. Москву от Могилева отперли, побили, отогнали. Страшно было трупу московского гледети; реку Днепр силным трупом язовища[84] загородили, иж колко недель днепровое рыбы не ядали и воды не пивали для великого гнюсу трупу московского.

Року 1579. Пан Андрей Гудовский, урядник баркулабовский, собравши войско немалое, пешого и конного люду триста, с паном Филоном и з его милостью князем Богданом Соломерецким, старостою кричевским, а надо всими тыми войсками люду учтивого яко шесть тисечей пан Андрей Гудовский гетманом был. Под Смоленском и Рославлем [85] так места выжгли, волости[86], села попустошили. Под замьком Смоленским моцно и охотне штурм мели, толко (л. 139 адв.) не дал им господь бог его достати албо выняти; з ласки божое з добычею великою до домов своих здоровы з доброю славою приехали.

...Року 1590 были козаки запорозкие Матюша с полком, Голый с полком у Могилеве. Аж до Минска приставъство[166] по волостям брали, а кривды, шкоды не чинили, толко жонок охочих, тых намовляли и заклинали[167], абы з ними на Низ ишли[168]. И взяли з собою жонок и девок яго двесте поголов.

...Року 1594 на весне заложена церков у Могилеве святаго Спаса у манастыри. Была велми иконами украшена. Потом настоло якоесь братство от святаго Спаса: по месту ходи-

ли, новые церемоние чинили не ведлуг уставу святых отец, на осляти по колку рок ездили. Згорела церков святаго Спаса. Жеребя волк заев. Дитя, которое седело вместо Христа, то ослепло.

Того ж року, весне, у Могилеве, заложен костел святаго (пропуск на 5 литар. — *А.К.*) на селицу Овтушка, небожчика, Богатого[276], бо пред тым у Могилеве полских костелов не бывало.

...Лета божого нароженя 1595, месяца ноября 30 дня, в понедело (к), за тыдень пред святым Николою (прибыл. — А.К.) Севериян Наливайко[286] При нем было казаков 2000, дел 14, гаковниц (пропуск. — А.К.).

Место славное Могилев, место побожное, домы, крамы, острог выжгли: домов всех яко 500, а крамов з великими скарбами 400. Мещан, бояр, людей учтивых так мужей, яко и жон, детей малых побили, порубали, попоганили, скарбов теж незличоных побрали с крмов и з домов. Тут же войско литовское пана Радивила[287], (каштеляна. — *А.К.*) троцкого, гетмана литовского, до Могилева у погоню за козаками притегнули люду рыцерского конного збройного: татар 4000, литвы 14 000. Над тым людом был (л. 153 адв.) гетманом на имя Миколай Буйвид[288].

В тот час Наливайко лежал у Могилева две недели. Услышал о том Наливайко, иж гетман з великим людом и з делами до Могилева тягнет, тогда Наливайко з могилевского замку на гору Ильинскую, где теперь церков святаго Георгия стоит, бо на тот час не было, выехал...

...Того ж року 607[449], на месяц мая, после семое суботы ишол с Шклова и з Могилева на Попову Гору[450] якийсь Дмитр Иванович[451]. Менил себе быти оным царем московским, который первей того Москву взял и там же оженився. Бо тот Дмитр Нагий[452] был наперьвей у попа шкловского именем[453], дети грамоте учил, школу удержал. А потом до Могилева пришол, такъже у священника Федора Синовича, николского (попа. — *А.К.*), у селе дети учил. А сам оный Дмитр Нагий мел господу у Могилеве у Терешка, который проскуры[454] заведал при церкви святаго Николы. И прихожувал до того Терешка час немалый, каждому забегаючи, послугуючы. А мел на собе оденье плохое: кожух плохий, шлык баряный. В лете в том ходил.

Каментарыі

[19] Маецца на ўвазе Сігізмунд II Аўгуст

[20] Мітрапаліт — вышэйшы духоўны саноўнік у тагачаснай праваслаўнай царкве Вял. кн. Літоўскага.

[21] Іону IV Пратасевіч (?—1576) — спачатку епіскап тураўскі, а з 1568 г. мітрапаліт кіеўскі.

[22] Уладыка — свецкая назва епіскапа, кіраўніка пэўнай царкоўнай епархіі.

[23] Герман Храптовіч — епіскап полацкі да 1558 г.

[24] Староста — выбарчая або прызначаная каралём асоба, якая выконвала адміністрацыйна-паліцэйскія абавязкі ў дадзенай мясцовасці.

[25] Баркулаб Іванавіч Корсак (?—1576) — выхадзец з полацкага шляхецкага роду, быў жанаты на дачцэ кн. Васіля Іванавіча Крошынскага Паланеі (1551). У 1562 г. ездзіў з пасольскай місіяй да цара Івана Грознага. У 1564 г. стаў дзяржаўцам свіслацкім і ротмістрам караля, а 25.3.1566 г. — старостам дзісенскім.

[26] Леткава (потым Ледзькава) — цяпер частка гарадской тэрыторыі ў Магілёве ад вул. К. Маркса да Камсамольскага сквера.

[27] Пячэрск — у той час населены пункт за 2 км на паўднёвы захад ад Магілёва, цяпер ускраіна горада пры выездзе на Мінск.

[28] Вотчыны — сяляне, якія валодалі зямлёю на правах прыватнай уласнасці.

[29—31] Звестак пра колішнія населеныя пункты Сухочы, Бутакі і Андросавічы не захавалася.

[32] Княжычы — старажытны населены пункт за 20 км на паўднёвы захад ад Магілёва, даўняя спадчына кн. Макавецкіх.

[33] Галаўчын — старажытны населены пункт у сучасным Бялыніцкім р-не на правым беразе р. Бабіч. У летапісах упершыню ўпамінаецца як горад Голотычъск, заснаваны з выпадку перамогі на гэтым месцы кн. Яраполка Ізяславіча над польскім кн. Усяславам Чарадзеем, аб якім апавядаецца ў «Слове аб палку Ігаравым». У даўнія часы Галаўчын з'яўляўся ўласнасцю кн. Рапалоўскіх, Галаўчынскіх, а потым Служкаў.

[34] Дуброўна (Дубровенка) — правы прыток Дняпра ў Магілёве.

[35] Радзівонкавічы — устанавіць цяпер месцазнаходжанне гэтага населенага пункта немагчыма.

[36] Буйнічы — старажытнае сяло на правым беразе Дняпра каля Магілёва. У свой час славілася жаночым манастыром, заснаваным тут у канцы 16 ст. паводле завяшчання кн. Багдана Саламярэцкага.

[37] «...А которые сели на слободе, на Гривце, на берегу оного Кощоваго, коло Десятинныя (церкви)» — вызначыць цяпер гэту мясцовасць немагчыма.

[38] Высветліць кожнага з пералічаных тут князёў і паноў і час іх панавання ў Буйнічах нам не ўдалося.

[73] Пскоў — старажытны рускі горад. Упершыню ўпамінаецца ў летапісе пад 914 г. ...

[74] Аўтар запісаў памыляецца, бо Пскоў не быў завяваны Стафанам Баторыем, а толькі падвяргаўся яго асадзе, якая працягвалася 7 месяцаў і закончылася без ваеннага поспеху ў 1582 г.

75 Маецца на ўвазе рускі ваявода Васіль Сямёнавіч Абаленскі-Сярэбраны, брат якога Пётр Абаленскі-Сярэбраны быў пакараны Іванам Грозным у 1571 г.

76 Копысь — старажытны населены пункт на левым беразе Дняпра, цяпер цэнтр сельсавета Аршанскага р-на Віцебскай вобл. Першыя звесткі пра яго як горад Полацкага, а потым Смаленскага княстваў адносяцца да 1059 г. У другой палавіне 14 ст. трапіў пад уладу Вял. кн. Літоўскага... У пачатку 16 ст. належаў кн. Астрожскім, а з 1594 г. ў якасці пасагу кн Екацярыны Астрожскай Копысь дастаўся нясвіжскаму кн. Крыштофу Радзівілу Пяруну, які быў ваяводам віленскім і адначасова гетманам і канцлерам Вял. кн. Літоўскага да сваёй смерці ў 1603 г. Той пабудаваў тут умацаваны замак і кальвінісцкі сабор.

77 Радамля — вёска непадалёку ад Чавусаў. Паводле падання, была цэнтрам племя радзімічаў, адкуль і пайшла назва паселішча... У 20-х гадах 16 ст. Радамля стала цэнтрам сельскага староства, якое ў розныя гады займалі Юрый Зяновіч (4.11.1529—34), кн. Васілій Андрэевіч Палубінскі (1535—50), яго сын Іван (1551), Міхаіл Пац (1584—95) і інш. Колісь у Радамлі знаходзіўся каталіцкі касцёл кармелітаў Хадкевічавай фундацыі.

78 Мсціслаў — старажытны беларускі горад на правым беразе р. Вяхры (правы прыток Сожа). Упершыню ўпамінаецца ў летапісах пад 1156 г., а з 1180 г. ўжо быў цэнтрам самастойнага княства кн Мсціслава Раманавіча з роду Уладзіміра Манамаха. У 1358 г. горад трапіў пад уладу вял. кн. Літоўскага. З 1528 г. стаў спадчынай Сігізмунда II Аўгуста і пачаў кіравацца каралеўскімі старостамі. У 1569 г. тут было ўтворана ваяводства.

79 Цямрук — хтосьці з кабардзінскіх князёў, але дакладна высветліць яго асобу пры адсутнасці імя і іншых даных немагчыма.

80 Навасёлкі — дакладна месцазнаходжанне гэтага населенага пункта не ўстаноўлена, бо пад такой назвай існуе шмат вёсак у прылеглых да Магілёва раёнах.

81 Пасля гэтага імя ў рукапісе маецца пропуск на адно слова.

82 Шупені — цяпер вёска Круглянскага р-на на поўдзень ад гарадскога пасёлка Круглае.

83 Задубровенне — тэрыторыя па левы бок за р. Дубровенкай у ваколіцах Магілёва.

84 Язавішча — лазовая запруда на рачным перакаце для лоўлі рыбы або спецыяльна засыпаная плаціна з пратокамі для вады.

85 Рослаў — старажытны рускі горад на р. Асцёр (левы прыток Сожа). Заснаванне яго прыпісваецца Уладзіміру Манамаху. Першыя дакладныя звесткі аб горадзе пачынаюцца з 1150 г. Пад сучаснай назвай вядомы з 1408 г., калі ён апынуўся пад уладай Літвы і з'яўляўся ўдзелам кн. Свідрыгайлы. З 1493 г. да 1503 г. Рослаў знаходзіўся ў складзе Рускай дзяржавы, у 16 ст. — значны гандлёвы цэнтр. У цараванне Івана Грознага горад зноў далучаны да Расіі.

86 Воласць — старая адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў Беларусі і Расіі.

166 Прыстаўства — даніна, якая бралася з мясцовага насельніцтва на ўтрыманне размешчанага ў іх населеным пункце войска.

167 Тут яўная апіска, якая вядзе да скажэння сэнсу, і таму гэта слова трэба чытаць: «заклікалі».

168 «... абы з ними на Низ ишли» — г.зн. павінны ісці разам з казакамі ў нізоўе Дняпра — у Запарожскую Сеч.

276 Размова ідзе пра закладку фарнага (гл. зн прыходскага) касцёла, будаўніцтва якога было завершана ў 1614 г. Касцёл да нашага часу не захаваўся.

286 Севярын Налівайка (? — 11.4.1597) — вядомы кіраўнік казацка-сялянскага паўстання на Украіне і ў Беларусі ў 1594—1596 гг., сын гусяцінскага мешчаніна. Пэўны час служыў у войску валынскага ваяводы князя К.К.Астрожскага, прымаў удзел у ваенных паходах у Малдавію супраць татара-турэцкіх агрэсараў. З войскам К.К.Астрожскага падаўляў паўстанне Крыштофа Касінскага. Пасля малдаўскага паходу, помсцячы багатаму ўладальніку Гусяціна, Гумінца, Няфёдаўкі, Дземаноўкі і іншых маёнткаў Марціну Каліноўскаму за забойства свайго бацькі, падняў паўстанне. У маі 1596 г. асаджаныя каралеўскім войскам пад Лубнамі казакі ў разліку на амністыю для сябе выдалі Налівайку гетману кароннага войска Станіславу Жулкеўскаму. Пасля жорсткіх катаванняў 11.4.1597 г. яго чвартавалі ў Варшаве.

287 Крыштоф Радзівіл (1547—20.11.1603) — сын віленскага ваяводы, канцлера і гетмана Мікалая Радзівіла Рыжага, за свой ваенны талент празваны Перуном Службовую кар'еру пачаў у 1566 г. з пасады крайчага, потым быў падчашым (1569—1576), гетманам дворным (1572), гетманам польным (1578—1589), падканцлерам (1579—1584) і адначасова (з 10.10.1579) кашталяном трокскім, а з 18.4.1589 г. стаў гетманам вялікім. Як гетман польны ўдзельнічаў ва ўсіх ваенных паходах і як кальвініст у саюзе з князем К.К.Астрожскім выступаў супраць Брэсцкай царкоўнай уніі.

288 Асобу Мікалая Буйвіда высветліць не ўдалося.

449 У рукапісе дадзена памылковая дата — 1617.

450 Папова Гара — цяпер Чырвоная Гара, раённы цэнтр у Бранскай вобл.

451 Тут маецца на ўвазе Лжэдзмітрый II.

452 Дзмітрый Нагі (1581—1591) — апошні сын Івана Грознага ад яго жонкі Марыі Нагой.

453 Імя шклоўскага свяшчэнніка ў рукапісе не названа, і пропуску ў радку няма.

454 Праскура (ад грэч. прасфора) — белая круглая булачка з густога цеста, якая выкарыстоўваецца духавенствам для прычасця прыхаджан.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці. Мн., 1975. С. 113—114, 116—117, 122, 131, 132, 153, 187—188, 190—191, 198, 209—210, 222—223.

Магілёўская эканомія (Магілёўская сталовая эканомія)

Каралеўскае ўладанне ў Вялікім княстве Літоўскім у 16—18 ст. Створана ў 1589 г. з дзяржаўных уладанняў, даходы ішлі на ўтрыманне каралеўскага двара (стала) і папаўненне каралеўскай казны. Эканоміяй кіравала каралеўская адміністрацыя, у розны час яе ўзначальвалі старосты Магілёва К.Х.Радзівіл, Я.Радзівіл, Л.Сапега і інш. Дзялілася на 12 войтаўстваў і 1 ключ (1743), у склад якіх уваходзілі 3 гарады — Магілёў, Чавусы і Чэрыкаў, 219 вёсак (1774). Мела 6135 валок зямлі (1743), 5261 сялянскі двор (дым), 25 063 чал. (1772). Сярэдні памер сялянскага надзелу — 1/2 валокі; асноўная павіннасць сялян — чынш. Пасля ўз'яднання ўсходняй часткі Беларусі з Расіяй (1772) землі эканоміі падараваны прыватным асобам.

У справаздачы падстаросты Магілёўскага замка і эканоміі за 1588 г. адзначана: «... ў г. Магілёве з 42 пляцаў (з іх 5 яўрэйскіх), якія падпарадкоўваюцца замкавай адміністрацыі, з 20 сабрана па 10 грошай, з 17 убогіх па 5, а з яўрэйскіх нічога не ўзялі. З 18 рамеснікаў, падначаленых замку, і з 6 гультаёў — таксама...

У справаздачы за 1631 г. падстаросты замка і Магілёўскай эканоміі даецца агульная сума даходу ў памеры 30 261 коп грошай літоўскіх, у тым ліку: з валок зямлі і сядзіб Магілёва і з лесу, які належыць гораду, — 1200 коп грошай літоўскіх; падатка з валок зямлі воласці атрымана 22 503 коп грошай; даходу ад гандлю за 1630—31 гг. 1400 коп. З агульнай сумы даходу расходавана на каралеўскія патрэбы 30 090 коп грошай літоўскіх...»

Б.Гардзееў.

Дакументы сведчаць...

З КАРАЛЕЎСКАЙ УСТАВЫ ПРА ПАВІННАСЦІ І ПАДАТКІ МАГІЛЁЎСКІХ МЯШЧАН

20 лютага 1561 г.

Жикгимонт.

Били нам чолом подданные наши, вси мещане места нашого Могилевского о том, иж што которое постановленье с померы новое, за роскозаньем нашим господарским, учинено есть около платов и пожитков наших, которым обычаем доходы до скарбу нашого давати и вси их повинности в кождый год они полнити мають, якож и устава от тых, кого староста посылала на свое место, дана им есть: ино били они нам чолом; абыхмо нашу господарскую уставу им на то дали, и то все, на што они повинны быти мають, на уставе нашой господарской выписали. А про то, хотячи, абы захованы были во всем подданые наши водле уставы, им даное на сесь час, казали есмо на сем листе нашом выписати ее, слово от слова. И так ся в собе мает:

На-первей: з волок к месту вымереных, которые суть кгрунту середнего, мають платити, водле уставы нашое, с кождое волоки грошей сорок; а особливо за пригоны и иные повинности старые з волоки грошей дванадцать. А з домов в рынку, — от прута пенязей по полосма, а в улицах от прута пенезей по пол-пяти; з огородов в месте от прута пенязей по полтретья, з моркгов полных на предместью, также з моркгов сеножатных, над рекою Днепром померены, — грошей по три; з сеножатей, на болотах померены, от муркгу грош один и пенязей пять. С застенков местских, хто их принял, мають платити до скарбу нашого по тому, яко в реестру, на вряде зоставленом, есть описано.

А тот весь податок, водле уставы нашое, с померы новое в року прошлом 1560 поставленой, мають почати до скарбу нашого платити в року теперешнем 1561, а почати отдавати им тот податок в кождый год, на рок и час певный, то есть: от дня нароженья святое пречистое А при отдаванню тых платов и податков наших не мает уряд на себе больш писчого и бирчого з них брати, одно з волоки пенязей дванадцать. А хто волоки не держит, тот только от ворот пенязи два дати повинен, а з моркгу польного, также и сеножатного пенязь один. А инших некоторых повинностей полнити, податков и стацей давати, и з листы нашими и врядничими ездити неповинни, окром тых платов и повинностей их тут вышей и нижей описаных.

С корчом местских, в которых мед и пиво шинкують, и от горелки, и теж с коморы мытной, и от важчого, што держат на три годы на аренде жидове Берестейские: — Аврам Длук-

гач и Еска Шломич, дають до скарбу нашого в кождый год, водле аренды, коп 1400; а час выдержанья их тое аренды от року теперешнего 1561, от дня Нового лета до двух годов Окроме обестки от людей купецких переездчих, которая завжды на пожиток старостин приходить, а окром складу замкового, который уряду вольно на пожиток свой мети один кроть до году, к святу св. Іоанна крестителя (а сытити ему пятьдесят пудов меду, ваги тамошней Могилевской, або што похочет), и особливо теж окром складов поповских и мещанских, в которых сытити мед вольно попом семь кроть на год, то есть: к святу святого спаса, и на день вознесения Христова, и к святой тройцы, к матце божой, и на день св. Николы, и на день святых апостолов Петра и Павла, и на день святого Ильи; одно ж за кождым разом, не больш, только за два рубли грошей широких меду купивши, розсытити мають. К тому, мещаном места Могилевского вольно есть в кождый год дванадцать складов на пожиток их мети, к святом урочистом, коли они сами похочут, одно ж за каждым разом не больш только за два рубли грошей широких меду купивши сытити они мають. Над то вольно всим мещаном тамошним в домех их, на власную их потребу, а не на продажу, мед и пиво мети, то есть: к веселью, к выданню девки и к оженењу сына, и на коляцыю, коли ся то кому пригодит; а за ведомом мытников и горелку на тые их потребы в домех их палили. Еще в кождый год пять кроть, к святом урочистым, то есть: к божьему нароженью, к запустом великим на неделю масленую, к великодню, к святой тройцы и к святому Николаю осеннему мають вольность вси мещане места Могилевского горелку в домех их палити; одно ж за кождым таковым разом, не больш только по одной четвертце солоду, меры тамошнее Могилевское на горелку спалити вольно...

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Т. 1 (9—18 ст.). Мн., 1936. С. 340—341.

ЛІСТ КАРАЛЕЎСКАГА ДВАРАНІНА С. КАРЫЦКАГА ПРА ЎВЯДЗЕННЕ МАГДЭБУРГСКАГА ПРАВА Ў МАГІЛЁВЕ

2 красавіка 1577 г.

Лета 6. н. 1577 м-ца апреля 2 дня.

Будучы мне Станиславу Корыцкому, дворанину его кор. млсти, за листы и росказанем его гдрское млти, посланым и приданым на увязыване права Майдебурского паном мещаном места гдрского Могилевского. Якож я во всем заховываючисе водлуг привилею паном мещаном от его гдрское млсти даного, также листов и росказаня его кор. млти, кгдым ту приехал до места гдрского Могилевского до старостваего млти вельможного пана пана Александра Ходкевича, старосты Городенского и Могилевского, державцы Пинского, а в небытности его млти самого, зосталем тут у Могилеве на местцу подстаростего Могилевского пана Димитра Василевича.

Там же пришедши до замку оповедалем и оказалем листы его кор. млти и теж листы вельможного пана пана Александра Ходкевича перед паном подстаростим Могилевским. А потом и повторе пришедши до замку гдрского с паны мещаны гдрскими Могилевскими почалем оповедати и листы его кор. млти оказывати, их его кор. млть з ласки своее гдрское рачыл им дати привилей и право Майдебурское. Якож теж его кор. млть и войтом им рачыл дать вельможное его млти пана Миколая Ясенского, писара его кор. млти, подкоморого Виленского, державцу Любошанского.

Ку тому теж мовилем именем его кор. млти до пана подстаростего Могилевского, абы в то право, которое они от его кор. млти упривилевано мают, не вступовал, и кгдыся они тым правом судят и того усего, што у привилею, им от гдра даном, подостатку доложоно и шырей написано вольностей и пожитков ужывати будуть, ажебы в том их праве и суженю переказы никоторое ни в чом не чинил.

Пан подстаростий Могилевский, пан Димитр Василевич поведил тыми словы, иж я видечы листы его кор. млти и теж листы пана моего млтивого его млти пана Александра Ходкевича, ч'че и важу, и против привелею гдрского листов и вашей млти посланцу е.к.м., не спротивляюся, и в то право Майдебурское и привилей их уступоват и до того меть ничего не хочу, и в суда водлуг права их, и гдра им даного, ничым переказы чинити не буду. А так я. Станислав Корыцкий, дворанин е.к.м., так же мовеня слов пану подстаростему Могилевскому от суду замкового вынявши, мещан места гдрского Могилевского списалем и зреестровалем в сесь инвентар, тамже реестр в инвентару описаный ест и с подписом руки его млти пана дворанина до скарбу меского отданый ест.

В том инвертару подано всих домов с боярскими и поповскими волными дванадцать сот шестдесят один дом. В пусте пляцов шест. А в рынку комор и клетей крамных сто трыдцат сем. Яток резницких семнадцать. По вынятю от суду враду замкового, и по списаню и зрейстрованю домов и пляцов места гдрского Могилевского подостатку, водле постановеня реви-

зорского, тедым е.м.п. Миколая Ясенского писара е.к.м., подкоморого Виленского, державцу Любошанског, войта места гдрского Могилевского, также и мещан места гдрского Могилевского в право от его гдрское милости даное Майдебурское увезал и подал.

А пляц е.м. войтовский, который лежит у паркане подле улицы Нехведовское, недалеко церкви стго Николы и другое святого Козмы Демяна об межу з огородом пана Мартина Стравинского, где ест пляцу войтовского прутов пол осма. А иж того пляцу войтовского мало на поселене двора, для того придалем туж аб межу, на той же полате улицы Нехведовской, на огород прутов пят, где мешкали Васка Милкович Дробыш, Богдан Новгородец, Петр дойлид, за которые пляцы тым мещаном мает отмена отдана быть. Ку тому теж на войтовство две волоки зуполные земли в обрубе Дубенецком, которые волоки держали мещане Могилевские Яков Ильинич а Хрол Ильинич, боком подле волоки Сосина протопопы, а другим боком подле Игната Свинчича; ку тому два моркги сеножатей, до тых же волок над рекою Днепром концом припалые аж до бору, которые тыеж Ильиничи Яков и Хрол Вощанки до тых часов у себе держали, водле привилю гдрского подал и увезал.

А на ратуш, где собе панове мещане видечы пристойное местце становить подалем, то есть где мешкают в рынку мещане гдрские посполу з одного домов пять, пялцу под тыми домами прутов одинадцат и чверти пол. Ведже тым мещаном мают за тые пляцы отмену учинит и за домы заплатит, або все огулом поплатить.

Што се тычет пожытков всяких на место приходячих, подостатку у привилю его кор. млти паном (мещаном Могилевским описаных также земль, которые с померы волочное через ревизоры месту гдрскому Могилевскому учененое, вшелякие кгрунты, земли, застенки, моркги, сеножати, выгоны, водле реестров розмереня ревизорского, якож тое место у своих границах заложено ест, тые всякие пожитки у привилю гдрском значне меновите доложоные и водле ревизорских реестров кгрунты, земли описаны и застановены.

Также водле листов к.е.м. и давности звыклое четвертую часть замку зарабливати повинни суть, и будоване которое их в замку ест, тых в уживаню панове мещане во всем вшеляким водле привилею им от гдра даного, то держать и уживать. Ку тому особливе которые панове земяне, шляхта, бояре и духовные на пляцах меских домы свое мают, а на то листов гдрских волных не хотели оказовать а торгов сполне з мещаны они сами и их суседи на торгу с тых пляцов ужывают, таковые вси которые в тым инвентаре, реестре моем, меновите вольными за листы гдрскими не описаны.

Про то водле росказанья и листов гдрских, которые листы от гдра его млти на то собе панове мещане выпросили, повинни будоване паркану, сторожовщины и теж поплатки всякие з оных пляцов меских будут во всем месту полнити. А што ся тыче, иж пан подстаростий Могилевский пан Дмитр Василевич при том увязываню моем припоминал и неоднокроть мовил, иж бы от замку, то ест, домы которые коло замку по близу суть были оподать отнесены, жебы рум престреннейшый коло замку был, и ку тому домавлялся теж, абы от места домов меских при замку яко украинным што зоставил, ином я не маючи тое моцы владности и росказаня е.к.м., иж бы рум коло замку престреннейшый чинить, также домы меские ку замку приворочать мел, теды то все на волю и ласку его гдрское млти здалем, а звлаща во всем водле реестров розмереня ревизорского место яко заложоно ест, домы и пляцы меские списывалем и при месте зоставилем.

И на то я, Станислав Корыцкий, дворанин е.к.м., дал сесь инвентарь списаня и увезаня моего в небытности на тот час вышей мененого е.м. пана войта Могилевского тут у Могилеве, теды на местцы е.м. лент-войту, бурмистром и райцом места гдрского Могилевского подалем под печатю моею.

Писано у Могилеве року вышейменованого.

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Т. 1 (9—18 ст.). Мн., 1936. С. 353—355.

Магдэбургскае права. Што змянілася ў жыцці гараджан?

28.1.1577 г. кароль Польшчы і вялікі князь літоўскі Стафан Баторый выдаў Магілёву прывілей на магдэбургскае права. Паводле яго « ..мяшчане Магілёва вызваляліся ад падсуднасці каралеўскіх чыноўнікаў... улада ў горадзе перайшла ў рукі органа самакіравання — магістрата, які складаўся з бурмістраў, радцаў, лаўнікаў і «іншых асоб урадавых». На чале магістратаў стаяў войт, звычайна буйны феадал, які да сярэдзіны 17 ст. пажыццёва назначаўся каралём за заслугі перад Рэччу Паспалітай.

...У састаў магістрата з году ў год траплялі амаль адны і тыя ж асобы... Так, Харко

Максімавіч у 1577 і 1578 гг. займаў пасаду лаўніка, а з 1579 да 1584 гг. выконваў абавязкі лент-войта. Ярома Аляксеевіч быў бурмістрам у 1577, 1584, 1588 і 1591 гг. Гэтую ж пасаду ў 1583, 1584, 1588 і 1589 гг. займаў Іван Фёдаравіч. На працягу некалькіх год функцыі лаўнікаў займалі магілёўскія купцы Сяргей Максімавіч, Пятруша Фёдаравіч, Хвядко Пошын і інш...»

У серыйным навуковым выданні «Запіскі аддзела гуманітарных навук» Інстытута Беларускай культуры ў 1928 г. была надрукавана праца Ц.Сцяпанава «Гісторыя места Магілёва да надання яму Майдэборскага права (1577 г.)» Аўтар прыводзіць цікавыя звесткі пра грамадска-палітычнае жыццё магіляўчан, у тым ліку пра падаткі, якія выплачвалі ў 1561 г. гараджане:

«...Падаткі магілёўскага меставаго насельніцтва... вызначаны ў наступным размеры:
а) з кожнае валокі сярэдняга грунту па 40 грошай,
б) за вызваленне ад ранейшых выгонаў па 12 грошай,
в) з дамоў, размешчаных на рынку, з прута на 7 1/2 пенязей,
г) з дамоў, размешчаных на вуліцах (не на рынку) — па 4 1/2 пенязей,
д) з гарадоў у месце па 2 1/2 пенязі з прута,
е) з гарадоў у прадмесці,
ж) з маргоў раллі па 3 грошы з морга,
з) з сенажацяў на Дняпры,
і) з сенажацяў балотных па 1 грошу, 5 пенязей з морга.

Апрача таго, жыхары Магілёва павінны былі плаціць на меставы ўрад па 12 пенязей з валокі, а хто не меў поўную валоку, той павінен быў даваць па 2 пенязі за варот. З моргу раллі і сенажатнага на меставы ўрад павінны былі даваць па адным пенязі.

Усе гэтыя падаткі павінны былі спаганяцца кожны год увосень у вызначаны тэрмін

Акрамя падаткаў, вызначаных уставаю 1561 года, магілёўскае насельніцтва павінна было час ад часу плаціць прымусовую пазычку...»

Як і да прадастаўлення Магілёву магдэбургскага права (1577), так і пазней гарадская беднота вельмі жорстка эксплуатавалася купцамі і ліхвярамі, царкоўнай вярхушкай і феадальнай знаццю, не валодала ніякімі юрыдычнымі і выбарнымі правамі, выплачвала празмерныя падаткі.

У пацвярджэнне сказанага прывядзём такія прыклады:

«...17 августа 1577 года могилевский мещанин Борис Игнатович взял у попа Вознесенской церкви Митковича «пенезей коп два литовских» да к тому был должен ему «полкраковки муки пшеничное», записав в залог свой дом с усадьбой. Игнатович дал обязательство возвратить деньги и пшеницу на «Филиповы запусты»... а если б так вчинить не мог, а тот рок хотя дня похибил, рады вже дом на вечность в тых пенезях а и в пшеницы ему поступит».

«Уплатить долг Игнатович вовремя не смог, а 30 января 1578 г. поп-ростовщик завладел всем имуществом должника. В том же месяце в собственность Миткевича перешел за долги дом котельщика Левашко Даниловича...» (ЦЮМ. Вып. 39. С. 34, 39, 269).

Паводле магдэбургскага права эканамічная дзейнасць, маёмасныя правы, грамадска-палітычнае жыццё, саслоўны стан гараджан рэгуляваліся ўласнай сістэмай юрыдычных норм. Магдэбургскае права было скасавана паводле ўказа Кацярыны II у лістападзе 1775 г. пасля далучэння тэрыторыі ўсходняй Беларусі да Расійскай імперыі.

Звесткі пра побыт магіляўчан у 16 стагоддзі

Матэрыялы архіваў магілёўскага магістрата, якія захоўваюцца ў Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі, змяшчаюць даволі цікавую інфармацыю пра побыт гараджан 16 ст. Фрагменты некаторых з гэтых дакументальных запісаў, як правіла судовых, прыводзяцца ніжэй.

Магілёўскія мяшчане Арловіч і Праля пасля паўторнага катавання прызналіся ў крадзяжах, якія зрабілі ў Шклове, Барсуках, Каменных Лавах... і ў адпаведнасці з артыкуламі магдэбургскага права прыгавораны да пакарання смерцю (запіс зроблены 20.9.1577).

Магілёўскія мяшчане колькасцю ў чатыры чалавекі пры нападзенні на Спаскі кляштар разбілі браму, пабілі вокны і печы. Яны прыгавораны ўсё аднавіць за свае сродкі. Аднак супрацьлеглы бок вызваліў абвінавачаных ад выканання іх абавязкаў (21.11.1577).

Магілёўскі мешчанін Азаровіч, узяўшы ў шынкаркі Марыі Жадавай на 50 грошаў мё-

ду, адмовіўся плаціць. Азаровічу загадана вярнуць доўг (16.9.1579).

Мешчанін Несцяровіч абвінавачаны ў крадзяжы хатніх рэчаў, якія выяўлены ў яго, на падставе артыкулаў магдэбургскага права прыгавораны да лупцавання на рынку і да выгнання з горада (4.11.1579).

Мяшчане Козел і Лаўровіч, якія ўкралі бялізну і вопратку, што вісела на ганку ў іншых мяшчан, пасля катавання гарадскім катам павешаны (1585).

Мешчанін Мікіціныч, які ўкраў у Спаскай царкве царкоўнае начынне, якое было выяўлена ў яго, пасля катавання павешаны (1590).

Мешчанін Паўловіч быў пакараны смерцю за крадзяжы коней у горадзе і навакольных вёсках (1597).

Мешчанін Празаровіч абвінавачаны мешчаніна Анушкевіча ў тым, што апошні быццам згвалтаваў яго жонку. Але тая пад катаваннем прызналася, што яе да гэтага прымусіў муж, і была прыгавораны да зняволення ў турму (29.3.1577).

Мешчанін Гаўрыла Скарабагатаў скардзіўся, што былы зяць Іванович развёўся з яго дачкой, не вярнуў пасаг... Магістрат прызнаў развод Івановіча незаконным, які зроблены без пратапопа, загадаў яму сысціся з жонкай, а цесця — вярнуць зяцю пасаг...

Казак Сарпацкі прызнаўся перад магістратам, што прадаў маскоўскую паланянку, якую здабыў за мяжой зямлі непрыяцельскай пад Смаленскам, мешчаніну магілёўскаму Багдановічу за капу грошай (19.8.1579).

Мешчанін Ясковіч прызнаўся перад магістратам, што здабытую за мяжой маскоўскую паланянку Саламаніду прадаў мешчаніну Бутану за 2 капы грошай (20.8.1579).

Магілёўскі мешчанін Акуліныч і яго жонка Марыя заявілі магістрату, што ў гэты галодны час, калі ім няма чым харчавацца, яны разыходзяцца і адзін да аднаго «на вечныя часы прэтэнзій мець не магаць» (1585).

***

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (ф. 517, воп. 1, спр. 4, л. 422) захоўваюцца цікавыя матэрыялы, якія даюць уяўленні пра фінансавыя ўзаемаадносіны паміж гараджанамі. Так, у 1569 г. магілёўскі каваль Іван Меляковіч за 1 капу літоўскіх грошай доўгу, які своечасова не быў вернуты, аддаў кузнечны мех коштам 2,5 капы. У 1616 г. ў мылавара Лук'яна Каралькова за 50 грошай, якія ён не вярнуў, крэдытор забраў 200 брускоў мыла. Бараначнік Кандрат Андрэевіч забраў у свайго калегі па рамяству ў лік нявыплачанага да ўстаноўленага тэрміну невялікага доўгу 30 вазоў дроў, 5 вазоў лучыны, муку, крупу, соль, 3 скоблі, 2 жорны, бочку, дзяжу, ночвы, 4 сякеры, малаток, патэльню і іншую маёмасць...

Вось якімі рабаўніцкімі былі ўмовы здзелак паміж рамеснікамі і ліхвярамі, што вялі да разарэння адных і ўзбагачэння другіх.

Гарадскія паўстанні 1606—10 гг.

Прычынай выступленняў рамеснікаў і гарадской беднаты Магілёва супраць заможных гарадскіх вярхоў сталі злоўжыванні і хабарніцтва членаў магістрата. Службовыя асобы магістрата, якія не лічыліся з інтарэсамі большасці насельніцтва горада і не падпарадкоўваліся выбарнаму кантрольнаму органу, расходавалі сродкі з гарадской казны па сваім меркаванні, абкладалі гараджан цяжкімі падаткамі і рознымі грашовымі паборамі, збор якіх суправаджаўся грубымі экзекуцыямі. У 1606 г. ў скарзе на імя вялікага князя магілёўскія мяшчане пісалі, што фактычна яны адхілены ад выбараў службовых асоб магістрата. Узначаліў выступленне Стахор Мітковіч. Ён паходзіў з бедных магілёўскіх мяшчан; у 1591 г. рамеснікі цэха саладоўнікаў трэці раз выбралі Мітковіча цэхмістрам, як сказана ў дакуменце «человека учтивого, богобойного и в цеховом порядку слушного и пристойного быть старостой над братией нашей, солодовниками места Могилевского». Паўстанне пачалося з таго, што 19.6.1606 г. Стахор Мітковіч, які быў на рынку каля гарадской ратушы, выступіў супраць бурмістра Васіля Якімовіча, «при собрании людей обчих... словы неучтивыми лаял, соромотил и пофалки на здоровье его чинил». У наступныя дні паўстанне прыняло яшчэ больш востры характар. 25 чэрвеня гараджане пад кіраўніцтвам Мітковіча і яго бліжэйшых памочнікаў Мікіты-шабельніка (збройніка),



Стахор Мітковіч (скульптура З.І.Азгура).

Фёдара Ісаковіча і Харапона (краўцоў), Міхаіла Юковіча (ганчара), Сазона (шаўца), Пятра (каваля), Івана (шабельніка), Мялешкі Пузыніна і іншых выступілі не толькі супраць магістрата, але і ўсяго войтаўскага самакіравання. Для заспакаення паўстанцаў і прымірэння іх з магістратам магілёўскі войт Яраш Валовіч накіраваў у горад «шляхетных» паноў Мацея Сухадольскага і Хрызастама Снарскага, але гэта не спыніла выступленняў. 13 ліпеня гараджане, якія паўсталі, выбралі са свайго асяроддзя 12 чалавек «паспалітых» для вядзення розных гарадскіх спраў. 15 ліпеня яны зверглі старую раду, занялі ратушу і выбралі новую гарадскую раду. Прычым выбары праходзілі не звычайныя, а з парушэннем усіх правілаў, якія былі ўстаноўлены каралеўскімі граматамі. Замест заможных гараджан у склад магістрата паўстанцы выбралі «людей легких, права и писма не уместных», некаторыя з іх раней падвяргаліся пакараннем як з боку каралеўскай, так і гарадской улады. Адзін з членаў новага магістрата Хадко Багдановіч — «вандроўны чалавек» — нават не быў аселым жыхаром Магілёва. Былы склад гарадской рады звярнуўся пасля гэтага да войтаўскага суда. Дэкрэтам ад 11 верасня войт адхіліў ад кіраўніцтва ўсімі гарадскімі справамі новы склад магістрата і перадаў уладу ў горадзе былой радзе. Дэкрэтам загадвалася правесці новыя выбары; асобы, якія адмаўляліся ад выканання дэкрэта, павінны былі заплаціць вялікі грашовы штраф. Аднак рашэнне войтаўскага суда не змяніла становішча. Улада ў горадзе па-ранейшаму працягвала знаходзіцца ў руках паўстанцаў. У справы Магілёва вымушана была ўмяшацца вярхоўная ўлада. Вырашыць пытанне трэба было ў судовым парадку, бо вялікі князь не рашыўся выкарыстаць ваенную сілу і адкрыта выступіць на задушэнне супраціўлення гараджан. Вярхоўная ўлада прыняла шэраг мер, каб раскалоць адзінства новага магістрата і схіліць яго членаў да згоды са старой радай. 22.8.1608 г. паміж імі заключана пагадненне, паводле якога новая рада, за выключэннем Ходкі Багдановіча — бурмістра, што велікакняжацкім дэкрэтам прыгавораны да смяротнага пакарання, павінна была адбыць свой тэрмін і перадаць уладу старому складу магістрата, выканаць шэраг іншых абавязкаў. Дзейнасць старога магістрата яшчэ не адзін раз выклікала хваляванні сярод гараджан. У 1610 г. адбылося найбольш буйное выступленне. Вядома, што члены магістрата, які быў выбраны ў 1609 г., абвінавацілі Івана Харковіча, Міхаіла-шаўца, Лавара Міхайловіча, Гаўрылу Івановіча, Мікіту Мільковіча, Максіма Тальбушу і Ісая Шчэснага ў парушэнні спакою і ўчыненні ў горадзе бунтаў. Перад войтам абвінавачаныя адмаўлялі сваю віну і гатовы былі пацвердзіць сваю невінаватасць прысягай. Па распараджэнні войта для расследавання гэтай справы з ліку членаў магістрата была прызначана камісія, якая пацвердзіла ажыццёўленую спробу падняць узброенае паўстанне. Войтаўска-лаўніцкі суд прыгаварыў 5 кіраўнікоў паўстання да смяротнага пакарання без права абскарджання прыгавору ў вярхоўным каралеўскім судзе. Выкананне прыгавору адбылося 23.7.1610 г. на Ільінскай гары ў Магілёве. Тальбуша і Шчэсны былі прыгавораны да 12-тыднёвага турэмнага зняволення, пасля адбыцця якога падвергнуты цялеснаму пакаранню каля ганебнага слупа і выгнаны з горада з забаронай пражываць менш як за 30 міль ад Магілёва. Маёмасць усіх асуджаных была канфіскавана.

Дакументы сведчаць...

КАРАЛЕЎСКІ ЛІСТ ДА НОВАГА МАГІСТРАТА

6 чэрвеня 1607 г.

Жыгімонт III... Ходзьку Багдановічу, Максіму Купрыянавічу і Амельяну Федкавічу, также грамадству: усім сотнікам, дзесятнікам і паспалітаму чалавеку Магілеўскім мяшчанам, нашым падданым.

Нам ведама, што вы, зняважыўшы ўладу тамашняга войтаўскага ўрада, супраціўляяся яму, а што больш — будучы пазваны аб вялікім супраціўленні да нашага суда, не чакаючы на нашу ўхвалу і зрабіўшы згоду на кшталт бунту захапілі сабе ўладу, пазабіралі мескія пажыткі, адпраўляеце суды, бярэце гвалтам людзей і кажаце садзіць да турмы, і вымушаеце да разметаў, або інакш складак на падтрыманне гэтай вашай сваволі. А калі хто вас не слухае, паколькі вы незаконна знаходзіліся на ўрадзе, вы ўтвараеце пахвалкі.

Чаму шмат добрых людзей, тамашніх мяшчан, церпяць праследаванне, хаця яны да вас захоўваюць справядлівасць і не ідуць супроць дэкрэта падскарбія земскага і пісара В.К.Літ. Яроша Валовіча, цівуна Паюрскага, дзяржаўцы Упіцкага і Радуньскага, войта Магілеўскага. Яны ніколькі не забяспечаны ў сваей жызні і маёмасці, паколькі вы прывабілі да сябе людзей вандроўных і невядомых, якія ільсцяцца не толькі на маёмасць, але і на жыццё людзей спаокойных, добрых, якія жадаюць добрага таму месту згодна прывілеям і вольнасцям.

А каб вы не абцяжвалі людзей ніякімі налогамі, або складкамі, і ні да якіх местскіх спраў іх не прыцягвалі, нікога не кідалі ў турму, не чынілі пахвалак, не бунтавалі супроціў тых асоб, якія не згаджаюцца з вамі, то з вышэйвызначаных прычын гэтым нашым лістом бярэм іх пад сваю апеку і рашуча патрабуем ад вас, пад зарукай у 100 коп грошаў літоўскіх на кожнага, хто адважыцца каго з гэтых асоб хапаць, або судзіць, караць заключэннем у турму, браць разметы або складкі і чыніць пахвалкі і бунтаваць. Зарука, у якую хто-колечы з вас трапіць з праўнага ўчынка, будзе спагнана да нашага скарба з маёмасці і асобы кожнага гэткага. І інакш вы не павінны чыніць

Дано ў Варшаве на сойме вальным 6 чэрвеня 1607 г. (Пер. з польскага.)

УГОДА БАКОЎ

22 жніўня 1608 г.

Стаўшы асабіста ў канцэлярыі В.К.Літ. славутныя мяшчане, Магілеўскія райцы: Гапей Ісакавіч і ад грамадства Цімафей Бутак учынілі свае добравольнае вуснае паказанне ў наступным.

Начынаючы ад 1606 года ў месце Магілёве былі вялікія сутычкі, ненавісць і спрэчкі паміж радай старай і новай і мяшчанствам, г.зн. паміж бурмістрамі, райцамі і лаўнікамі: Аўсеем Максімавічам, Іванам Тарасавічам, Васілем Якімавічам, Іванам Беляем, Марцінам Аўхімавічам, Аніскам Ісакавічам, Фёдарам Свірыдавічам, Фёдарам Афанасавічам і пісарам Нікодымам Тапічэўскім — даўнымі ўраднікамі мескімі з аднаго боку, і з другога боку паміж славутнымі: Ходзькам Багданавічам, Максімам Купрыянавічам і Амельянам Фёдаравічам, таксама бурмістрамі, райцамі, лаўнікамі гэтага места ўноў абранымі, якія трымаюцца пры іх: Стахорам Міцькавічам, Мікітай Іванавічам, Федарам Ісакавічам, Ісакам Гапонавічам, Хамой Калітой, Петрам Чартовічам, Мікулай Яцкавічам, Іванам Жыханам, Андреем Мікіцінічам, Лукой Майсеевічам, Міхайлай Конанавічам, Міхайлай Юркавічам, Паўлам Алферьевічам Калена, Еўланам Парфенавічам, Цімошкам Зенкавічам, Мялешкам Сцяпанавічам, Ахремам Юшкавічам і Аляксеем Гапановічам, якія ў месце ў розныя часы падымалі бунты, буйствы, вазмушчэнні супраць караля і права, і асабліва — несправядлівае скідванне старой рады з іх урадаў і лаў, засаджванне, міма прав і звычаяў, новай рады і затым затрымання і цяжкасці ў судзе, лаянкі, бясчэсце і крыўды пры гэтай калатне і грызне.

Усё гэта, у выніку розных позваў, было вызначана на разгляд у каралеўскім судзе. Абодва бакі пільнавалі вырака ў двары е.к.м

Але яны не хацелі і не адважваліся, каб дапусціць гэту справу на вырашэнне праз дэкрэт е.к.м., бо мелі даручэнне і належнае поўнамоцтва ад новай рады і ўсяго грамадства, каб яны, як умацаваныя ад іх, гэтую справу, шляхам стварэння судовай угоды з процілеглым бокам — са старай радай, закончылі і заспакоілі. Пры дапамозе ў гэтай справе запрошаных імі паноў, — канцлера в.к. літ. старасты Магілеўскага Льва Сапегі і пісара і сакратара е.к.м. пробашча Троцкага кс. Еўстахія Валовіча, — яны прынялі ўгоду з пасланцамі і ўмацаваным старай рады лаўнікамі — славутнымі Фёдарам Афанасавічам і Багданам Радкевічам і пісарам Тапічэўскім і ўчынілі наступную пастанову:

1. Новая рада места Магілёва, якая ў працягу двух гадоў засядала на ўрадавай лавіцы, мае са ўсімі мяшчанамі павініцца і за свае правіннасці прасіць прабачэння ў падскарбія В.К. Літ., як войта і галавы.

2. Старую раду-бурмістраў, райцаў, лаўнікаў і вызначанага пісара Нікодыма Тапічэўскага таксама перапрасіць на месцу пэўным у Магілеўскім ратушу. Там зараз-жа прасіць сабе на абодвы бакі ўсе сутычкі, ненавісць і крыўды і разам у згодзе адпраўляць усялякія мескія справы.

3. Зрабіць справаздачу са ўсіх мескіх прыбыткаў, вызначыўшы на гэта пэўны час і дэпутатаў паводле звычая і навукі права.

4. Новая рада (за выключэннем з яе Ходзька Багданавіча, асуджанага каралеўскім дэкрэтам на смерць праз павешанне) мае дасядзець у сваіх лавіцах свой тэрмін. А затым мае адпраўляць свой урад старая рада, засядаць паводле сваей чаргі і сваім звыклым парадкам, пры якой зараз мае быць прыпушчан да выканання сваіх абавязкаў пісар Нікодым Тапічэўскі.

5. Усе шкоды, якія пацярпелі ў гэтай справе, маюць быць размяркованы паміж імі на абодва бакі.

Учыніўшы гэтую ўгоду і пастанову, вышвызначаныя ўмацаваныя, ад імя новай рады і ўсяго грамадства, забяспечваюць і гэтым дабравольным сваім сазнаннем упэўняюць, што рада новая з грамадствам — павінны будуць прыняць і выконваць усё тое, што яны ў сваіх асобах і за поўнамоцтвам іх пастанавілі.

А ўжо затым ніякіх згод, бунтаў і калатні ў месце супроць старой рады не чыніць, але да яе ў ва ўсім вясці сябе прыстойна і спакойна, пад закладам на караля 4.000 коп грошаў літоўскіх.

Для выканання гэтай угоды і пастановы пакладаем і назначаем пэўны тэрмін да дня св. Марціна (XI.II) свята рымскага гэтага 1608 года. Калі ў гэты час цяперашняя ўгода не будзе выканана першай радай і мяшчанамі, тады старай радзе места Магілёва і ўсім пакрыўджаным застаецца на ўсё вольнае, поўнае і непарушнае право прад каралём супроць новай рады і мяшчан, якія пры ёй стаяць.

Зараз пасля св. Марціна абодва бакі ў вызначаны тэрмін, без усялякага прыпозва, павінны з'явіцца ў двор караля е.м. для судовага разбора справы з той умовай, што новая рада з мяшчанамі не толькі старай радзе дасць адказ на ўсі яе скаргі, але будзе павінна і заклад, 4000 коп грош літоўскіх, у выпадку адмавення ад гэтай угоды, або незадавалення яе ў якім кольвек параграфу, заплаціць каралю е.м.

Канцлер Леў Сапега. Пісар Еўстахій Валовіч (Кніга правілняў г. Магілева) (32) (Пер. з польскага).

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Т. 1 (9—18 ст.). Мн., 1936. С. 372—380.

АДПІСКА ВАЕЙКАВА ЦАРУ АЛЯКСЕЮ МІХАЙЛАВІЧУ ПРА ПЕРАМОГУ ЯГО ВОЙСК РАЗАМ З ПАЛКАМІ ВАСІЛЯ ЗАЛАТАРЭНКІ І ПАКЛОНСКАГА ПАД МАГІЛЁВАМ

12 жніўня 1654 г.

Государю царю и вел. кн. Алексею Михайловичю.., холоп твой Мишка Воейков, челом бьет.

В нынешнем, государь, во [7]162[1654] г августа в 8 день в ночи прибежал ко мне, холопу твоему, и к полковнику к Костянтину Поклонскому Могилевского у с. Горбовичь крестьянин Ивашка Рыбалка и сказал: шли де из Могилева 300 коней шляхты, идут де к нам в Чаусы Тобияш Ждановичь да Михаил Гижитцкий, а с ними 3 хоронги да пеших гайдуков человек с 10. Да того ж, государь, числа в день пришли из-под Гомля запорожские козаки, полковник Василий Золоторенко ко мне, холопу твоему, и стал под Чаусовым; и я, холоп твой, поговоря с ними, с полковники, с Костянтином и с нежинским полковником с Василием Залотаренком, с теми твоими государевыми людми против тех ляхов могилевцов Ждановича и Гижитцкова пришед встречю за 5 миль от Могилева, и того Ждановича и Гижитцкова панов, божиею милостию и твоим государьским счастьем, побил, и на том бою взяли, государь, твои государевы люди 2 хоронги, да литавры, да барабан, да языков взяли 3 чел., 2 чел. шляхты, да гайдука шляхтича, государь, Юрья Путяту, да Яроша Могучава, да гайдука Наумка Игнатова. А на том, государь, бою твои государевы люди побили тех ляхов могилевцев человек с 200, а твоих государевых людей сохранил бог, до смерти никово не убили, а ранен, государь, ясаул Филип по руке слегка полку Золотаренкова, да у меня, холопа твоего, ранен человек мой Гришка Левонтьев саблею по голове слегка, да подо мною, холопом твоим, посекли коня слегка ж. И я, холоп твой, с тою вестью послал к тебе, государю, астра-

ханца Бажена Мизинова. А кто, государь, имяны на том бою языков взял, и под сею, государь, отпискою роспись имянная.

Астраханец Бажен Мизинов взял языка Наумка Игнатова; шляхтичь Леско Кутински полку Костянтина Поклонского взял языка Юрья Путяту; полку Золотаренкова судья Иван Буток взял языка Ярошку Могучева.

Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. Мн., 1960. С. 74.

АДІІСКА СТРАПЧАГА ВАЕЙКАВА ЦАРУ АЛЯКСЕЮ МІХАЙЛАВІЧУ ПРА ПАДЫХОД ЯГО ВОЙСК І ПАЛКОЎНІКА ПАКЛОНСКАГА ДА МАГІЛЁВА І ГАТОЎНАСЦЬ ЖЫХАРОЎ ГОРАДА АКАЗАЦЬ СУПРАЦІЎЛЕННЕ ВОЙСКАМ РАДЗІВІЛА

16 жніўня 1654 г.

Государю царю и вел. кн. Алексею Михайловичю... холоп твой Мишка Воейков челом бьет.

Послан я, холоп твой, для твоего государева дела с полковником с Костянтином с Поклонским И я, холоп твой, и полковник Костянтин собрали пеших могилевцев, и чаусовцов, и прадомцов крестьян с 1000 чел. с бердыши, и с рогатины, и с пищалми да конных крестьян со 100 чел. И августа, государь, в 11 день с теми новоприборными людми полковник Костянтин и я, холоп твой, с твоими государевыми ратными людами, с стрельцами и с татары, из Чаусова пошел к Могилеву, и от Могилева за 3 мили в с. Петровичех пришед, стали обозом и около обозу вал скопали. И того ж, государь, числа выехали из Могилева на твое государево имя шляхтичь Микулай Гелда да 3 козака, Иван Миткиев, да Демид Филипов, да Федор Андреев, да 12 чел. пеших гайдуков; и я, холоп твой, того шляхтича и козаков и гайдуков привел к вере по чиновной книге в с. Благовичех. Да те же, государь, шляхтичь, и козаки, и гайдуки сказали мне, холопу твоему, и полковнику: августа де в 9 день могилевской державец велел на Днепре делать 3 мосты; а сказал им: идет де к нам в Могилев ксенжа Родивил: и могилевцы де черные люди державцу могилевскому пану Петровскому сказали: мы де все будем битца с Родивилом, пока нас станет, а в Могилев Родивила не пустим. Да того ж, государь, числа с. Горбовичь крестьяне привели ко мне, холопу твоему, и к полковнику ляха Яна Тарновского, челядника старосты кричевского пана Олшевского, и тот лях в роспросе сказал: ехал де он из Орши в Кричев к пану Олшевскому с листами, да из-под Могилева, государь, приборные козаки из загону привели дву литвинов, Яныковского да Ждановского И я, холоп твой, тех языков 3 чел. де четвертой, что на бое взял астраханец Бажен Мизинов, и листы запечатав в столбец, с сею отпискою послал к тебе, государю, под Смоленск с московскими стрелцами и с провожатыми А что, государь, полку полковника Костянтина Поклонского шляхтичь Олексей Кучинский взял на бое шляхтича Юрья Путяту, и того языка, едучи с бою, полковник Василий Золотаренко и судья отняли насилством и повели с собою под Смоленеск, а идучи, государь, под Смоленеск, могилевцов, и чаусовцов, и радомцов крестьян и козаков, которые поддались под твою государеву высокую руку, пограбили, лошади, и коровы, и всякую животину поимали. А я, холоп твой, им, полковнику и судье, говорил и к ним после писал, чтоб они тех твоих государевых сел и деревень не пустошили, и что они взяли, и то б им назад отдали. И те, государь, казаки ничего им не отдали А по твоей государеве грамоте к столнику и воеводе к кн. Федору Куракину с товарыщи на встречю послал сего ж числа, чтоб он шел наспех. А мы, холопи твои, прося у бога милости, твоим государьским счастьем станем промышлять всячески, сколко милосердый бог милости подаст. И августа ж, государь, 11 дня из Могилева пан Петровский прислал лист от ксенжи Родивила и от себя к полковнику к Констянтину, и те, государь, листы посланы к тебе, государю, вместе с сею ж отпискою.

Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. Мн., 1960. С. 75—76.

РАСПЫТАНЫЯ ГУТАРКІ МАГІЛЁЎЦА АЛЯКСЕЕВА Ў МАГІЛЁЎСКАГА ВАЯВОДЫ ВАЕЙКАВА ПРА КОЛЬКАСЦЬ РАДЗІВІЛАЎСКІХ ВОЙСК ПАД МІНСКАМ

7 верасня 1654 г.

[7]163[1654] г. сентября в 7 день в роспросе сказался могилевец Илюшка Алексеев, сказался шляхтичь белоруский.

Был де он в Минску, заехал из Могилева тому недель с 5, и служил де он при Юдиничу; а из Минска де он вернулся назад до Могилева, а у него де в Могилеве жена и дети. А про Родивила сказал: пошел де Родивил из Минска в Люблинечь, а с ним коней за 100; а пол-

ханца Бажена Мизинова. А кто, государь, имяны на том бою языков взял, и под сею, государь, отпискою роспись имянная.

Астраханец Бажен Мизинов взял языка Наумка Игнатова; шляхтичь Леско Кутински полку Костянтина Поклонского взял языка Юрья Путяту; полку Золотаренкова судья Иван Буток взял языка Ярошку Могучева.

Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. Мн., 1960. С. 74.

АДПІСКА СТРАПЧАГА ВАЕЙКАВА ЦАРУ АЛЯКСЕЮ МІХАЙЛАВІЧУ ПРА ПАДЫХОД ЯГО ВОЙСК І ПАЛКОЎНІКА ПАКЛОНСКАГА ДА МАГІЛЁВА І ГАТОЎНАСЦЬ ЖЫХАРОЎ ГОРАДА АКАЗАЦЬ СУПРАЦІЎЛЕННЕ ВОЙСКАМ РАДЗІВІЛА

16 жніўня 1654 г.

Государю царю и вел. кн. Алексею Михайловичю... холоп твой Мишка Воейков челом бьет.

Не паддаецца, ізноў, горад Магілёў, з Ласкі Маткі Божай, Кіеву (выключэнне толькі мошчы святых). А з Божай Ласкі і ў гэтым горадзе паказаць целы святых, бо ёсць у царкве Святых Багаяўленняў Божых бездакорнае жаночае цела гадоў сарака. Ёсць, ізноў, гэты горад Магілёў багатым на людзей вучоных, набожных, гандлёвых і на розныя рамёствы багаты, цэрквамі ўпрыгожаны, цэрквы скарбамі, працамі і штодзённым квітнеючым грэка-рускім набажэнствам упрыгожаны, з-за чаго варта прыпомніць такі верш:

Богам ратуем мы гэты град Магілёў
Праайцец і айцец Яфетавых сыноў.

Выводзячы гэты верш, тады так я яго патлумачу. Калі пасля патопу патрыярх Ной даў траім сваім сынам Сіму, Хаму і малодшаму Яфету бласлаўленне і раздзяліў зямлю на тры часткі, з падзелу тады прыпала на Яфета Еўропа, на якой аселі русь альбо славяне, з такімі віднымі гарадамі, не называючы ўсіх, як Кіеў, Чарнігаў і Магілёў; Яфет, паводле Кіева-Пячэрскага Сінопсіса і Стрыйкоўскага, тлумачыцца славянскаю моваю як той, што расцягваецца, распаўсюджваецца і далей пашыраецца. І так, з Божай Ласкі і Найсвяцейшай Яго Маткі, з прагэкцыі найяснейшага нераможнага караля ягамосці Яна III павялічыўся гэты горад Магілёў, які з папраўленнем людскіх цнотаў можа і болей павялічыцца, бо, як піша Стрыйкоўскі-храніст, тых, што жывуць у Еўропе, называюць унукамі Яфетавымі альбо племенем Яфетавым.

Жыгімонт Аўгуст, які ў гэты час шчасліва валадарыў, бачачы, што як пчолы збіраюцца людзі да Магілёва, і каб справядлівасць і слава Божыя шырыліся, прыгожа ўмацаваў горад правам і вольнасцямі ўзнагародзіў.

[1] Жыгімонт I памёр у 1548 г.

***

Года 1574. Генрых з Францыі з вялікім і неацэнным выдаткам абраны на Польскае каралеўства. Адпанаваўшы толькі месяцаў сем, уцёк ён у Францыю, калі ж хто жадае ведаць чаму, няхай не пашкадуе часу і працы, а прачытае хронікі, аб гэтым будзе ведаць.

Года 1576. Стафан Баторы, сямігродзкі князь, быў абраны на Польскае каралеўства і каранаваны. Пасля гэтай каранацыі былі высланы да яго ад горада Магілёва паслы-гараджане для атрымання і прысуджэння згодна з парадкам магдэбургскага права, які, як ласкавы бацька іх прыняўшы, правам утытулаваў і атрымалі аб чым прасілі. Потым, у годзе 1577-м, пачаў горад Магілёў судзіць магдэбургскім правам, якое мы і цяпер ужываем.

Гэты штонайяснейшы кароль, пан наш міласцівы, надаў лацінскаю моваю гораду Магілёву права на розныя вольнасці... а гербам гораду — адну вежу з надпісам наўкола рускім пісьмом: «Пячаць горада Магілёўскага», а надаўшы, і прывілей выдаў, як тут бачыш. Кіеў у гэты час быў ва ўладзе Стафана Баторыя.

Года 1586. Памёр кароль Стафан Баторы, караляваў 10 год, 7 месяцаў і 12 дзён. Праз чатыры гады пасля яго смерці, гэта значыць у годзе 1590-м, прыйшоў да Магілёва з войскам невядома адкуль нейякісь казак ці гультай па прозвішчы Мацюша і нарабіў вялікіх шкод, было на што паглядзець, аднак горад Пан Бог уратаваў.

Года 1595. Прыйшла ізноў на Магілёў навала, ад Налівайкі. Невядома таксама, з якіх прычын гэта сталася, ці з гультайства, ці з маскоўскага махлярства, бо ў гэты час міру з Масквою не было. Таму старэйшыя людзі часта ўспаміналі Налівайку, Мазепу і Лабаду. Нездарма, відаць, не выходзіла гэта з людской памяці, бо нарабіла гэтая саранча новазбудаванаму і заселенаму гораду бед нязносных і крыві праліла нямала. Але Пан Бог гараджан-мучанікаў бласляўляў і бласлаўляе. Гэты Налівайка Магілёў зрабаваў і цэрквы папаліў.

Года 1610. У час каралявання Жыгімонта III, а за войтаўствам у гэты час Яраша Валовіча, падскарбія земскага і пісара Вялікага княства Літоўскага, войта магілёўскага, пачаліся былі ў Магілёве бунты. Зачыншчыкамі гэтых бунтаў былі Іван Харковіч, Мікіта

Мілковіч, Максім Талбішаў, Гаўрыла Іванавіч, Міхал Чэбатар, Лавар Міхайлавіч і Ісай Шчэсны. Гэтыя бунтаўшчыкі са сваімі хаўруснікамі не ладзілі з магістратам, плаціць падаткі гораду і выконваць розныя павіннасці магістрату не хацелі, на рады і сходы асобам сваім на месцы, асобна, у свой уласны звонік біць загадвалі, на ратушу і на магістрат нападалі, гвалту перад ратушаю жадалі, на судовую хату напалі, дзверы адбілі. У гэты ж час мусіў заставацца ў вялікай небяспецы і магістрат. Потым, з выданнем уласна каралеўскай граматы названаму магілёўскаму войту, памянёныя бунтаўшчыкі былі асуджаны...

(...) Года 1632. Красавіка 29 дня памёр, пакінуўшы двух каралевічаў, Уладзіслава і Казіміра, Жыгімонт Трэці Нераможны, кароль польскі. Пасля смерці Жыгімонта абрана на Польскае каралеўства Уладзіслава...

Гэтага ж 1633 года. Месяца чэрвеня 2-га дня з наканавання Божага і з ласкі караля ягамосці Уладзіслава вернуты да набожнасці магілёўскія цэрквы, якія ўсе былі пазамыканы і апячатаны, гадоў 30 застаючыся без набажэнства. Пан Бог будзе судзіць за занядбанне Яго Святой Славы. А царква Узнясення Святога Крыжа, гэта значыць Ваздзвіжання Чэснага Крыжа, вернута праз год пасля гэтага. Пра тое, як жылося ў час закрыцця святых цэркваў набожным праваслаўным людзям, у пісьме і пісанні летапісцаў не давялося адшукаць ніякіх вестак. Толькі гэта прыйшлося чуць ад старэйшых людзей, што была на выгане, на Віленскім тракце, драўляная хібарка, дзе ў дзень Хрыстова Уваскрасення благаверны свяшчэннік, калі збіраліся набожныя людзі, адпраўляў святую літургію, а тады уніяты ці жаўнеры, напаўшы, людзей разагналі і ў час самай імшы памянёнага свяшчэнніка забралі і, звязаўшы, Бог ведае куды яго завязалі. Толькі была такая чутка, што быў мучаны, а потым трапіў у Кіеўскія пячоры. А прозвішча таму свяшчэнніку было Зара.

Года 1633. Месяца чэрвеня 10 дня ў час крыжовага ходу Святой Тройцы Пан Бог, пасля прыйшлай радасці, што былі вернуты Божыя цэрквы, адведаў смуткам. Вялікая колькасць людзей, якія плылі паромам на другі бераг Дняпра да Святой Тройцы на набажэнства, патанула. Гаварылі старэйшыя людзі, што гэта уніяты ад зайздрасці ноччу падрэзалі паром. Пан Бог гэта рассудзіць. У гэтым жа годзе Сухадольскі здаў Самсонскаму магілёўскае ландвойтаўства. У гэтым жа годзе згарэў Магілёўскі замак.

Года 1636. Месяца жніўня 1-га дня, пасля той духоўнай вайны, што вялі супраць дагматаў праўдзіва святой праваслаўнай веры тыя кажаны, альбо уніяты, Брацкая царква асвечана, гэта значыць усё брацтва магілёўскіх гараджан, запаліўшы ў сваіх сэрцах агонь, падахвочаныя Святым Духам і ўзрушаныя Божаю Міласцю, з дастаткаў сваіх убогіх такі слаўны будынак царквы Святога Богаяўлення, альбо, дакладней, па-руску, Хрышчэння ў Ірдане, а з правага боку Паслання Святога Духа, а з левага — Нараджэння пачаўшы збудавалі і асвяцілі.

Года 1648. Месяца мая 20 дня, адпанаваўшы шчасліва на польскім каралеўстве 16 гадоў, Уладзіслаў IV, кароль польскі, замяніў жыццё на смерць, а ў яго панаванне і брама, якая называецца Алейнай, у нейкім годзе збудавана. А пасля смерці Уладзіслава абрана за караля Казіміра.

Года 1654. Маскоўскае войска наступіла, сіле якога горад Магілёў не змог працівіцца, мусіў з рады правялебнага ў Бозе айца Ёля Труцэвіча, ігумена Куцеінскага кляштара, паддацца, якога ў 1655 годзе маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч з усёю брацціяю-манахамі, і каштоўны алтар з Куцеінскай царквы, зэгар, таксама, вывез за Маскву, пад Вялікі Ноўгарад...

У гэтым жа годзе месяца лютага 6-га дня масква пад Шапялевічамі разграмілі Радзівіла. Пакуль Радзівіл цягнуўся пад Магілёў, тут жа, каля Новага Быхава, натрапіў ён на Залатарэнку, дзе з імі і змагаўся. Потым пад Старым Быхавам быў Залатарэнка забіты.

Года 1655. Месяца лютага 6 дня, на святога Міколу, рушыўся Радзівіл з Шапялевіч да Магілёва, а Паклонскі хацеў узяць горад раней, з-за чаго магілёўцы, асцярогшыся, пахаваліся за вал, бо такога замка яшчэ не было. Хутка пасля яго наступіў князь Радзівіл, тыдняў дванаццаць рабіў рознья штурмы, як мог здабываў падкопамі, нават гасарыю, глумячыся над ёю, гнаў на штурм, хацеў зраўняць горад з зямлёю. Аж з ласкавым умяшаннем Найсвяцейшай Панны Марыі, Маткі Божай, якая свае гарачыя малітвы і найдаражэйшыя слёзы скіроўвала да маестату Божага, застаўся горад цэлым, якім ён яўлены на абразе Найсвяцейшай Панны Марыі, што знаходзіцца ў Брацкай царкве... Радзівіл, не могучы здабыць горад, зрабіў пад яго падкопы, і, уставіўшы ў іх некалькі дзесяткаў бочак пораху, хацеў узарваць вал... А ў той час, калі пад горадам быў запалены порах, яна ўбачыла, што з абраза цякуць слёзы І маліт-

вамі Найсвяцейшай Панны гэтая Божая кара адступілася ад горада, а абярнулася на вайсковы люд, што горад здабывалі. І многа паспалітых людзей у час гэтага ўзрыву загінула, а горад з людзьмі засталіся цэлымі, і адступіў Радзівіл...

У гэтым жа годзе, а менавіта дня 2-га мая, Радзівіл, загадаўшы выпаліць усе прадмесці, павярнуўся наўцёкі і многа людзей розных станаў за сабою ў чужыя землі забраў блукаць, і ўсе прадмесці спустошыў, абрабаваў і зруйнаваў.

Перш чым прыйшоў Радзівіл да Магілёва, Паклонскі, сабраўшы скуль мог гультайства, уцешыўшы сябе фантазіяй узбагаціцца з рабунку, задумаў вывесці жыдоў як бы ў Літву і загадаў усім жыдам рыхтавацца ў дарогу. А яны, выбіраючыся са сваімі скарбамі, дзе маглі хавалі залатыя дукаты, у хлябы запякалі, жанчыны і дзяўчаты ў косы заплятралі. І так вывеўшы за Пячэрск, усіх жыдоў загадаў пасекчы і ў магілы (капцы якіх ёсць і сёння) пазасыпалі, і многа ў іх багацяў у розных схованках пазнаходзілі. Многа, таксама, у гэты час жыдоўства, што засталіся, якія не пайшлі з Паклонскім да Літвы, пахрысціліся, з якіх і дзесятая частка не памёрлі ў хрысціянстве, зноў потым жыдамі сталі. Сцвярджаюць, што гэты Паклонскі быў паповіч з Чарнігава. А жыды магілёўцы і зараз святкуюць гадавіны па загубленых, ходзяць за Пячэрск на іх капцы плакаць.

Года 1655. Хутка пасля адступлення Радзівіла прыцягнуўся да Магілёва з вялікім войскам маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч, які, пабываўшы тут толькі адзін дзень, пайшоў пад Вільно, Вільно ўзяўшы, падышоў пад Рыгу. Рыжане быццам бы падвялі падкоп пад палатку, дзе стаяў цар, але яго папярэджана, і так адступіў ад Рыгі... Вярнуўшыся тады з-пад Рыгі да Магілёва, стаяў цар ягамосць два тыдні ў Магілёве.

Года 1659. Прыцягнуліся да Магілёва тры маскоўскія ваяводы, адзін з якіх — Даўгарукі. Гэты загадаў высекчы ў Магілёве сады, па якой прычыне, няма вестак. Другі — Лабаноўскі, трэці — Сямён Данілавіч Змееў. Адсюль гэтыя трое з войскам падступілі пад Быхаў, стаялі тыдняў трыццаць, а потым са здрады і намовы Ільінічаў, Рачкоўскіх і Шульцаў здаўся горад. Пасля здачы горада Быхава ўвесь люд у горадзе быў высечаны пад корань.

Года 1660. Гетман Чарнецкі, ваявода рускі, і Сапега, гетман літоўскі, на Палонцы, пад Ляхавічамі, дашчэнту разбілі Хаванскага. А, скажам, рупліўца-воін Змееў, мілуючы паражэнне пад Ляхавічамі, загадаў намаляваць гэтую бітву мастаку Марыяну, італьянцу, які ў гэты час сваім домам жыў у Магілёве, там, дзе ва ўласнасцях магілёўскіх ксяндзоў езуітаў пабудавана Тычынава камяніца...

Чарнецкі тады з Сапегам у гэтым жа годзе месяца чэрвеня 18 дня прыйшлі пад Магілёў, у Пятроўку. Чарнецкі стаў лагерам на гары ў Буйнічах, а Сапега за Лупалавам, за гарою, потым пабудавалі на Дняпры мост і для абароны моста ўмацавалі гарадок. Потым з горада масква і ахвотнікі гараджане пайшлі раскапаць гарадок і разбурыць мост, якіх Сапегава войска, якое ішло ад Мышаковай гары, прыціснуўшы да берага, днём пасцінала ўсіх пад корань і патапіла. А потым усе прадмесці, дорага брусаваныя, цэрквы Успення Найсвяцейшай Панны Марыі і новазбудаваную Пакрова і другія папалілі, цэлаю засталася толькі Узнясення Святога Крыжа, хоць і яна была некалькі разоў запалена, але абаронена.

Года 1661. Месяца лютага 1-га дня, на святога Трыфана, высеклі ў Магілёве гараджане магілёўцы маскоўскі гарнізон. А траіх ваяводаў, Сямёна Савіча Гарчакова, Мацвея Андрэевіча Палуэктава і Сямёна Іванавіча Чэкіна, стралецкага галаву, палонена і да караля Яна Казіміра з пасланымі ад горада панамі Пятром Казановічам, войтам, Базылём Леашкевічам, Юзафам Паром, бурмістрамі, адвезена і аддадзена... Гэтага парубання маскоўскага гарнізона з рады на гэты час галоўных гараджан атаманам быў Пора, бурмістр, са сваімі памочнікамі на такое адважнымі.

Года 1664. Месяца лютага, на першым тыдні вялікага паста, адведаў Пан Бог горад агнём. Пачало гарэць ад дома Савы Ціхенкіна, дзе цяпер за весавою камяніца. Крамы пагарэлі ўсе, а дамоў мала што.

У гэтым жа годзе. Месяца сакавіка 20 прыйшоў з-за пушчы кароль Ян Казімір. Потым, пры ягонай бытнасці, месяца красавіка 6 дня ізноў адведаў Пан Бог горад агнём ад дома, што недалёка ратушы, дзе ў гэты час жыў Гаўрыла Пжэксга, а цяпер камяніца Васілеўскіх (якая ў 1740 годзе разбрана і аддадзена на збудаванне кармеліцкага кляштара). У гэты час згарэлі ратуша, крамы, царква і званіца, а званы нават паплавіліся. Гарэла аж да жаночага кляштара, у якім была цудоўная студня, ад таго часу згінула. Кароль жа, бачачы, што пры ягонай бытнасці гораду не-

шчасліві, месяца красавіка восьмага дня ад'ехаў з горада.

У гэтым жа годзе. Князь Якаў Кудэнекавіч Чаркаскі з Празароўскім і з Баратынскім аблажылі Копысь і Шклоў. А Міхал Пац, ваявода віленскі, стаў з войскам пад Шкловам, дзе масква, патаемна пераправіўшыся цераз Днепр, наступіла вялікім войскам месяца чэрвеня 15-га дня. Што бачачы, адступіў гетман да Магілёва, а князь Якаў следам з усім войскам таксама пад Магілёў, дзе маскоўскія войскі сталі за дальнім валам, а гетман, з усім войскам і з гусарыяй, таксама за валам. З'язджаліся цэлы дзень. А масква моцна біла з гармат аж пад самы горад, туды, дзе са сцяны Шклоўскай брамы глядзелі людзі, і нямала гэтых, што глядзелі, напалохалі, бо брама была яшчэ не накрыта. Бачачы каля горада такую страляніну, назаўтра загадалі гарадскім збройнікам нарыхтаваць разбуральныя гарматы. І калі апоўдні ў лагеры пад намётам князь Якаў Кудэнекавіч з другімі абедаў, гарадскі пушкар навёў з круглай вежы малельні, з бакавога выхаду (бо войска стаяла на Віленскім полі) гарматы і, даўшы агню, забіў князя Якава Кудэнекавіча Чаркаскага. Што бачачы, затрывожыліся масква і, забраўшы целы забітых, у гэтую ж ноч кінуліся наўцёкі. І калі б у гэты час насеў на іх гетман, усіх паваліў бы пагалоўна. А так прастаяў гетман лагерам за Дуброўнам у дальнім вале тыдняў 14.

Года 1667. Месяца ліпеня 20 дня, на святога Гальяша, ізноў адведаў Пан Бог горад агнём. Пагарэлі крамы і частка дамоў. У гэты ж час прыбыў да Магілёва ягамосць айцец Ёсіф Нялюбавіч Тукальскі, кіеўскі мітрапаліт. Зімаваў у Магілёве, а потым вадою ад'ехаў да Кіева. У Кіеве, у Брацкім кляштары, быў нядоўга... і хутка ад'ехаў, не ведаю чаму, у Чыгірын, дзе жыў з Дарашэнкам, там і памёр. А Дарашэнка, які бунтаваў супраць караля, знюхаўшы нешта не да смаку, перакінуўся да маскоўскага цара Аляксея. Жыў пад маскоўскімі царамі ў спакоі, але не было яму вольна выехаць за граніцу. Памянёны мітрапаліт Тукальскі тры гады сядзеў у Мальборку ў замкавай вежы, а гэта з той прычыны, што быў ён дарадцам адлучэння ад палякаў. А калі вызваліўся з Мальборка і ехаў да Магілёва, у час ягонай бытнасці ў Вільні, у праваслаўным кляштары, было прывезена з Рыма, з кансервацыі, цела святога Ёзафата, і па такому выпадку жадана, каб у праваслаўнай царкве Святога Духа звонена. Тады гэты мітрапаліт, ведаючы, што быў Ёзафат галоўным непрыяцелем благавернасці, загадаў не званіць. За што хацелі ізноў узяць яго ў турму, але ён, папярэджаны, патаемна выехаў з Вільні ў Магілёў...

(...) Года 1683. За мілю ад Магілёва, у вёсцы пана Каркоўскага Котушы, нарадзіўся выradак жаночага полу а дзвюх галавах і адным целе, які нежывы быў паказаны ў Магілёве ў дварэ і якога невядома дзе закапалі.

(...) Года 1684. У Магілёве за валам, на Шклоўскай вуліцы, жыдоўка па імені Шэйна, дачка чашніцкага арандатара Вульфа, жонка Азіка Габрыяловіча, нарадзіла дзіця нечалавечага выгляду, з кіпцюрамі, падобнае на калматага мядзведка. Гэтага выradка тут да д'ябла і закапана.

(...) Года 1686. У Магілёве, у самім горадзе, было мноства рысяў, якіх некалькі дзесяткаў забіта і на прадмесці, і ў горадзе некалькі забіта, а гэта напэўна з незвычайна вялікіх снягоў (бо ў гэтую зіму гаспадарылі шчодрыя снягі і лютыя маразы), што не маглі мышкаваць, а магчыма, таксама і з якой другой прычыны...

Пасля нататак аб ваенных гісторыях, што дзеяліся ў Вялікай Польшчы і ў Літве з уварваннем у Польскую дзяржаву шведскага войска, вяртаюся я тут да гісторый, якія дзеяліся на Русі і ў Магілёве.

(...) У гэты час (хоць тут я дня і года не называю) прыбыў да Магілёва з літоўскім войскам, з татарамі ягамосць пан з Бонча Сініцкі, мечны Вялікага княства Літоўскага. Магілёўскі замак і эканомію ўзяў пад сваю ўладу, яму ж на дапамогу па загаду маскоўскага цара Пятра Аляксеевіча прыбыло некалькі палкоў казакаў. Гэты, мала што знаходзячыся ў Магілёве, забраўшы замкавыя гарматы і кулі, што ёсць апісана ніжэй, аблажыў Быхаў. І моцна ўсеўся, толькі б яго здабыў, а так кругом горада атакаваў, што ані з Быхава, ані да Быхава праз войска ніхто не мог прабіцца. І хоць Більдзюк з горада даваў Сініцкаму моцны адпор, аднак меў Сініцкі пры сабе бамбардзір і бомбамі ламаў гарадскія будынкі, дзіравіў горад ядрамі. А час ад часу ўсё болей войска прыбывала на дапамогу, а ў горадзе з-за войска правіянту ўбывала. І так Більдзюка, хворага на сілы і прыстасаванні, і многа пры ім вайсковых людзей... ці пабрана, а самога Більдзюка з двума яго хаўруснікамі акавана і адпраўлена ў Сібір у ссылку.

Сініцкі, умацаваўшыся ў Быхаўскай губерні як заваяванай, ваенны люд, што быў пры Більдзюку, узяў пад сваю каманду, горад прывёў у парадак, акружыў гарматамі і

вартай, а сам часткова знаходзіўся ў Быхаве, часткова ў Магілёве, часткова ў сваім Палуйкевіцкім доме, раз па-нямецку, другі раз папольску, як яму падабалася, убіраўся, бо, пасля ўзяцця Быхава і ўзяцця пад сваю ўладу магілёўскай эканоміі, вельмі распанеў. І так кожны імкнуўся да яго на службу, вербаваўся да яго войска, трымаў ён пакаёвых слуг і розных чыноўнікаў, вельмі ўбраных у строі.

(...) Быхаўскі замак, пабудаваны крывавай людскою працаю, заставаўся нядоўга. Ягамосць пан Сініцкі, як учыніў супраць найяснейшага маскоўскага цара здраду, замкнуўся ў Быхаве. Хутка гэты палац апусцеў, а пасля пажару ў горадзе Магілёве адны яго руіны былі перавезены ў Магілёўскі замак, у другі, абрабаваны вайсковымі маскалямі, абпалены згніў, а рэшткі гэтых будынкаў сяляне палуйкевічаўцы пазабіралі на дровы.

(...) Года 1704. Выйшаў з Маскоўскай сталіцы строгі ўказ на вярбоўку і, таксама, загад маскоўскага цара Пятра Аляксеевіча, які, вывучыўшы і зведаўшы ўласнай асобай розныя нацыі, дзяржавы і народы, упадабаў нямецкі строй і для гэтага загадаў, каб ваенныя людзі і гараджане ўбіраліся па-нямецку і галілі бароды (бо перад гэтым быў у Маскве звычай, што не кожнаму было вольна галіць бараду). Але гэты загад быў не даспадобы паспалітым людзям, якія ў гэты час заставаліся ў прастаце. Адны з-за галення бародаў уцякалі за граніцу (адкуль была з'явілася вялікая слабада і другія), пра што будзе сказана і напісана ніжэй. Другія за бароды плацілі ў царскі скарб па некалькі дзесяткаў рублёў пошліны. А які б з гараджан не хацеў убірацца ў Маскве панямецку, і ішоў бы які праз браму каля варты, якая тут стаяла, загадавана было прыкленчыць і па калена кафтан абрэзаць. І адсюль уведзены на Маскве нямецкі строй, і ад гэтых часоў пачата курыць і нюхаць табачны напітак публічна, а перад гэтым курана і нюхана патаемна. І толькі ў горадзе Магілёве ёсць такі старасвецкі закон, каб ад Магілёва да Смаленска пад страхам смерці ніхто не адважваўся правозіць ні тытуню, ні гарэлкі.

У гэтым жа годзе 1704-м. На святога Гальяша, гэта значыць дня 20 ліпеня, у вячэрні час, як гналася быдла, паказалася на небе камета, з'явілася з малой зоркі, а потым, павялічыўшыся, вяла свой хвост на поўнач, і страшна гэта было. У гэты час, увечары, адслужаны ў цэрквах усеагульныя малебны. Трывала гэтая камета аж да апоўначы (...)

Год шчасліва наступіўшы тысяча семсот шосты пакінуў гораду нешчаслівую спадчыну, бо адбываліся ў гэтым годзе пераходы і пераезды розных войскаў, будаўніцтва мастоў праз Днепр, прысутнасць у горадзе знатных асоб, засыланне інспекцый з павета, зборшчыкаў падаткаў і дэпутатаў, з-за чаго была ў горадзе вялікая неразбярыха, якую і апісаць цяжка, хіба што вартнейшае крацюсенька апішам мы ніжэй.

(...) Дня 20 лютага маскоўскі цар Пётр Аляксеевіч быў у Оршы, да якога, прасіць манаршаскай міласці, каб не абрабавала горад войска, ездзіў магістрат. Адвезлі паклоны і пры другіх паднашэннях адвезлі і паклалі на сярэбраных пазалочаных падносах тры вялікія караваі, за якія заплочана з горада пекару дзесяць злотых. Прыняў магістрат ахвотна і абяцаў рабіць гораду розныя палёгкі, аднак жа мусілі ў гэты час даць на маскоўскае войска правіянт сенам і аўсом.

Пры бытнасці нашых магілёўскіх дэпутатаў у Оршы прыбылі да цара ягамосці два бернардзінцы прасіць ялмужыны[1] і спавядаліся перад царом, што «мы, убогія законнікі, не маем з чаго жыць, толькі з ялмужыны». Спытаў цар: «Многа лі вас?» Адказалі, што ўсіх шасцёра. Адказаў на гэта: «Цьфу ты, растакая маць, Бог всю вселенную пітайет, а вас шасцярых не прапітайет». І, дастаўшы з кішэні жменю капеек, даў бернардзінцам, а даўшы, сказаў: «Падзі к чорту».

(...) Года 1706. Мая чатырнаццатага дня быў заказаны гораду правіянт на дывізію генерала Баура, да якога ў Шклоў ездзілі паново магістратавыя і, каб не даваць правіянту, задобрылі генерала Баура тысячаю тынфаў. У гэты час адбілася рэха, быццам бы прыбліжаецца і кіруецца да Магілёва швед, з-за чаго з горада да Слуцка, Мінска і далей пасылана шпегаў, але не ўзялі ніякай весткі, бо швед у гэты час яшчэ не ўвайшоў у Польшчу. Мечны і падстолі Сініцкія, хоць горад і рабавалі, аднак называлі сябе яго заступнікамі, з-за чаго падстолі Сініцкаму, за апякунства, мусіў заплаціць горад тысячу тынфаў.

Мая 15 дня князь Валконскі і Гагарын з некалькімі палкамі ваеннага люду прыцягнулі да Магілёва і сталі пад Пашковам, дзе для гэтай маскоўскай старшыны быў арганізаваны за гарадскі кошт банкет. А калі іх на банкет не дачакаліся, ўсё прыгатаванае аднеслі ім у лагер, а на войска, пабраўшы ў гаспада-

[1] Ялмужына — міласціна, грошы.

роў, дадзена пяцьсот боханаў хлеба. Гэтае ж войска, пераправіўшыся праз горад і Днепр, стала лагерам каля Затраенча на лугах. У гэты ж час будавалі масква праз Днепр мост, на што дадавана з горада людзей і грошай. Было гэтае будаўніцтва для горада вялікай мукай. У гэты ж час эканом Сініцкі за сваё апякунства выцягнуў з горада 3000 тынфаў.

(...) Чэрвеня 8 дня, чакаючы на прыезд цара ягамосці ў Магілёў, нарыхтаваў горад розных напіткаў, закупілі віна, сыцілі мёд, варылі рознае піва і рыхтавалі розныя харчы. А генерала Баура, які нахлебнічаў у Магілёве і меў пакой у камяніцы Захара Аўтушкевіча, абцяжарваючы горад сваёй кухняй, задобрылі, каб быў міласцівы да горада, пры другіх падарунках двумастамі талерамі бітымі.

(...) Дня 16 чэрвеня для сустрэчы цара ягамосці Пятра Аляксеевіча пяклі чатыры караваі, за якія заплацілі пекару шаснаццаць злотых. Тады ж, перад царскім прыездам у Магілёў, выдалі з горада на маскоўскае войска чатырыста мерак жыта правіянту (...) Чэрвеня 21 дня ўдалося пачуць, што едзе цар ягамосць у Магілёў вадою, гэта значыць Дняпром. Тады магістрат, хуценька ўсеўшы ў лодкі, ездзілі ў Холм на паклон, але, не дачакаўшыся, вярнуліся ў горад. І гарадская артылерыя была пастаўлена на выхадах, і пушкары з гарадской вартай, якім для стральбы на царскі прыезд выдана з ратушы трыста фунтаў пораху.

Назаўтра, як хутка летні дзень, пачата ў лагеры барабаніць, маскоўскае войска, некалькі дзесяткаў тысяч, выстраілася з прыналежнасцямі, і дадзена знаць, што едзе цар ягамосць у Магілёў байдакам. Магістрат адразу пайшоў на сустрэчу. Прыбыў цар ягамосць у графства байдакам, але не высядаў. Хутка генералаў, афіцэраў і нямала польскіх паноў прыбыло на бераг на сустрэчу, і каня для цара прыведзена. А калі цар ягамосць высядаў з байдака, магістрат на сярэбраным пазалочаным падносе вялікі каравай, а на другім сітны хлеб з паклонам падалі, але тут, на беразе, не прыняў, з загадаў стаць з хлебам ля пакоя. А сам, сеўшы на каня, з вялікай світай афіцэраў, немцаў і палякаў, бо тут прысутнічалі ягамосць пан Агінскі, Заранак і многа польскіх паноў, паехаў сярод палкоў, а праехаўшы раз і другі, тут і там, з канца да канца, загадаў даваць агню, дзе і страляна беглым агнём тры разы, і з палкавых гармат таксама ў лагеры біта.

Аб'ехаўшы сваё войска, ехаў цар ягамосць Пётр Аляксеевіч з усёю світаю у горад Магілёў... А калі ўехаў у Алейную браму, дадзена агню з гармат каля ратушы. Уязджаючы, такія фармальна сказаў словы: «Права ізрадна». А едучы праз рынак, зайшоў у Брацкую царкву, дзе ў гэты час айцец Трацэвіч, брацкі ігумен, пасля Божай службы адпраўляў малебен і, мала ў царкве забавіўшыся, ехаў да пакоя генерала Баура. А Баур у гэты час меў пакой у магілёўскага бурмістра пана Захара Аўтушкевіча. І калі ссеў з каня, хуценька магістрат ушанавалі цара хлебам і падалі на сярэбраным пазалочаным падносе вялікі каравай і сітны хлеб. Быў з гэтага вельмі задаволёны. І магістрат прыняў цар ягамосць спагадліва. Прыйшлі, таксама з хлебам і магілёўскія жыды, і жывога асятра прынялі ў чане, але цар ягамосць на іх і не глянуў, загадаў толькі прыняць ад іх хлеб.

Паабедаўшы ў генерала Баура і мала што забавіўшыся, пад вечар ехаў цар ягамосць да байдака і заехаў да генерала Кікіна, а Кікін меў гасподу ў пана Фёдара Казановіча, дзе, калі прыехаў, гаспадар з гаспадыняю, сустрэўшы яго хлебам і соллю, упалі ў ногі. А калі спытаў гаспадара, як бы зваўся, гаспадар, крыху сумеўшыся, адказаў, што Фёдар Казановіч, Пятровіч. Тады цар, паклаўшы рукі на яго плечы, сказаў: «Полна, не пугайся, я знаю, што за тваім бацюшкам маскву высеклі, на то вайна была, а масква втагды дурна была...» І тут мала бавячыся, аб'ехаўшы палкі, усеў у байдак.

У гэты ж самы час на другім беразе Дняпра, на Лупалаве на лугах, стаяла тры тысячы рэкрутаў, якія, калі цар усядаў у байдак, закрычалі, просячы падаравання: «Асудар праведный, пожалуй». Ад гэтага крыку быў горад перапалоханы, бо людзі падумалі, што пачалі маскалі высякаць горад. А потым цар ягамосць хутка, у гэтую ж ноч, узяўшы праваднікоў, паплыў з Магілёва да Кіева.

А калі плыў Дняпром і прыплыў да Быхава, Сініцкі, які ў гэты час тут нахлебнічаў, загадаў на царскі прыезд біць з гармат. А ўся быхаўская артылерыя, і ўся тая, што пабраў Сініцкі з магілёўскага замка, была пастаўлена каля быхаўскага замка. Потым сам Сініцкі з братам і з вялікай світай сваіх вайсковых выехаў на бераг, прасіў цара ягамосця да сябе на абед. Але цар ягамосць не высеў, аднак прасіў Сініцкага ў байдак і там яго шчодра частаваў, і напамінаў яму, каб быў верным цару, каралю ягамосці і Рэчы Паспалітай. А гэтага цар ягамосць не ведаў, што быў Сініцкі шведскай і сапежынскай кампаніі. Пасля царскага ад'езду ўсё маскоўскае войска выйшла з

Магілёва ў Літву і масты, дзеля праходу маскоўскіх плытоў і байдакаў, паразбірала.

(...) Год 1707. У гэтым годзе пастаянна то ў Літву праз Магілёў, то з Літвы за Магілёў прагульваліся маскоўскія войскі, адсюль бранне коней на падводы, даванне правіянту, кармленне праезжых драгунаў і пяхотных салдатаў, пачынка мастоў, пакоі па знатнейшых і незнатнейшых гараджанах трывалі штодзённа. А пад Копысем стаяла немалое, некалькі дзесяткаў палкоў, пяхотнае і коннае войска, і тут капалі акопы. На капанне гэтых акопаў давана сялянскага люду з рыдлёўкамі і сякерамі з усяго Аршанскага павета па некалькі соцень на тыдзень, таксама і з Магілёўскай эканоміі і з самога Магілёва ў тыдзень давана і высылана на капанне гэтых акопаў па дзвесце чалавек. А гэтыя акопы капана па такой прычыне, што меўся швед, перайшоўшы ў Копысі Днепр (бо ў Копысі ў гэты час Днепр быў неглыбокі, што войска магло перабрацца на другі бок па вадзе конна), ісці на Маскву. І так тут маскоўскае войска, каб не прапусціць у Копысі праз Днепр шведа, умацоўвалася.

(...) У гэтым жа годзе 1707. Сініцкі мечны і другі, падстолі, ужо здрадзіўшы цару ягамосці і маскоўскаму войску, моцна абасноўваліся ў Быхаўскім замку, маючы пры сабе ў самім горадзе нямала кавалерыі і пяхоты, а таксама і сваёй дворнай світы, замак і брамы быхаўскай артылерыяй і той, якую забраў у Магілёўскім замку пад час здабывання Більдзюка, акружыў і ўмацаваў, пры артылерыі, на вале, густа паставіў варту, загадаў навазіць у Быхаў вялікіх калодаў і больш дзесяці вазоў вялікіх шрубаваных нажоў, а конныя татарскія харугвы, якіх меў пры сабе больш дзесяці, выправіў у Магілёўскую эканомію і ў сапежынскія маёнткі на выбранне грошай. І ўжо добра ўмацаваўшыся ў замку, пачаў сакрэтныя сувязі са шведам, данасячы, што хоча з усім сваім войскам дапамагаць шведам супраць маскаля. Шведскі кароль яму за гэта падзякаваў і абнадзеіў, што ў хуткім часе будзе з войскам на Русі. Потым гэты ж Сініцкі пісаў сакрэтныя лісты аб сваім пачыне да Сапегаў, у якіх знаменаваў, што гатовы дапамагаць супраць Масквы і Рэчы Паспалітай і ім.

...Генерал Баур, прыехаўшы з вялікай вайсковай світай і з другімі генераламі экіпажамі, трайнямі і вазамі ў Быхаўскі замак, узялі яго пад сваю ўладу. А панам Сініцкім, наказаўшы прыгатаваць параконны паланкін і ўсадзіўшы іх да гэтага паланкіна, загадалі акаваць рукі і ногі і прыставілі вельмі пільны канвой, каб праводзілі ў Сібір.

Браты Сініцкія, мечны і падстолі, будучы акаванымі і застаючыся ў вялікай небяспецы, на жывы Бог прасілі генералаў, каб іх слугі, памочнікі і дарадцы, пяхотнае і коннае войска засталіся паводле дагавораў вольнымі. Што з імі сталася, ніякай весткі я не атрымаў, толькі гэта добра ведаю, што абодвух Сініцкіх, акаваных, на параконным паланкіне праводжана праз Магілёў, а за імі, як першага дарадцу, на звычайных калёсах вязлі Міхала Петуха, і ніякай світы Сініцкага не было. Як іх праводзілі праз Магілёў, ніжэй апішацца (...)

У апошнія дні ліпеня праводжана Сініцкіх са значнаю маскоўскаю світаю праз горад Магілёў. Найперш ішла ў поўнай выкладцы і паваеннаму ўрачыста, з музыкай і барабанамі, пяхота, потым, з выцягнутымі палашамі, некалькі палкоў драгуніі, потым, перад паланкінам, у якім сядзелі акаваныя Сініцкія, няслі маскоўскія падпрапаршчыкі, паклаўшы на плечы дрэўкі і трымаючы іх каля грудзей, узятыя харугвы Сініцкага, якіх было восем доўгіх і шэсць кароткіх, а самі харугвы валакліся краямі каля конскіх хвастоў па самай зямлі. А гэта было зроблена па-ваеннаму звычаю, дзеля ганьбы і крыўды, што непрыяцеля пераможана. Абодва Сініцкія ехалі ў паланкіне акаванымі, так што і шапкі ні перад кім не маглі зняць. А за імі на звычайных калёсах быў везены Пятух, пры Сініцкіх прыслужваў нейякісь пакаёвы. За імі, таксама, была немалая світа конніцы і пяхоты. Праводзіўшы гэтых Сініцкіх праз горад, сталі масквы ў горадзе і на прадмесцях на адпачынак. І як сталі на адпачынак, старшы Сініцкі спавядаўся і прачашчаўся, а малодшы, падстолі (бо быў кальвінам і блюзнерцам абразаў), хоць і ўгаворвана, не хацеў адзывацца. І так у Магілёве абедалі...

Пасля заканчэння абеду масква з Сініцкімі хутка рушыліся з горада. Памянёныя Сініцкія былі адпраўлены да смаленскай граніцы, а датуль, праз Маскву, саслана іх у Сібір, якія там доўга жылі ў вялікіх нястачах. А Пятух быў хутка вернуты са сталіцы на Русь, прыбыў у свае маёнткі, якія былі ў Магілёўскай эканоміі.

Год 1708. О горад, горад Магілёў! Першы летапісец, не могучы ўзяць ніякай весткі, адкуль бы горад называўся Магілёвам, растлумачваў, што ёсць гэта магутны леў, але ў год тысяча семсот восьмы Марс, завастрыўшы

свае клыкі і зубы, аблупіў з цябе аздобную ільвіную шкуру і абвалок цябе чорным і грубым мяшком, які і будучыя часы не забудуць, што ўжо адсюль не можаш ты называцца манутным ільвом, хіба магіламі фартун тваіх грамадзянаў, як будзе ніжэй.

На пачатку гэтага года прыйшлося чуць, што шведскі кароль у сто тысяч войска пяхоты і драгуніі цягне праз Вільню на Русь. І хоць тут я не змяшчаю, у які час і пару быў у Вільні, аднак, будучы ў Вільні, шведскі кароль моцна абрабаваў горад, бо загадаў даваць на войска вялікія правіянты. Таксама, выбіраючыся з Вільні, забраў у няволю ў лагер віленскі магістрат. У гэтай няволі Мароз, віцебскі войт, памёр, а астатніх адпушчана.

(...) У гэтым годзе 1708. Месяца студзеня 10-га быў цар ягамосць Пётр Аляксеевіч у Копысі, бо тут скупілася ў грамаду вялікае маскоўскае войска і тут, пад Копысем, стаяла ў акопах для адпору шведу, які цягнуўся на Русь. Спадзяваліся цара ягамосця да Магілёва, і харчовых прыпасаў, як то піва, мёду з ратушы нарыхтавана, але не быў.

(...) Года 1708. 18 лютага цар ягамосць Пётр Аляксеевіч з немалым войскам быў у Беліцы, пра бытнасць якога пачуўшы, пасылана да яго з горада паслоў прасіць аб міласці, так як у гэты час было гораду ад маскоўскага войска вельмі цяжка. У гэты час нейякісь Міхаіл Судзін быў упраўляючым Магілёўскай эканоміі і меў пакой у замку.

(...) Месяца сакавіка 14 дня Аляксандр Данілавіч Менчык, маскоўскі князь і першы царскі дарадца, з вельмі пышнай кавалькадай і помпай, з многімі вайсковымі аксэсуарамі і з немалой вайсковай світай уехаў у Магілёўскі замак. Шасціконных экіпажаў ішло некалькі дзесяткаў, на вярблюдах і мулах праводжана ўюкі, вакол рабы. І так заняў сабе і свайму двару пакоі ў замку, а іншыя афіцэры сталі па багатых і сярэдніх дамах.

Тады магістрат, ведаючы і чуючы, што гэты чалавек ліхі, чэрствы масквіцін, клапоцячыся, каб быў міласцівы, пайшлі да яго ў замак з хлебам, з соллю, з прыправамі, віном і цукрам. Яму ж пры іншых паднашэннях завязлі бочку венгерскага віна і падаравалі апраўленую ў серабро крыштальную шкатулку гданьскай работы, якая каштавала тысячу злотых.

Назаўтра сакратар князя Менчыка, прыбыўшы ў ратушу да ўсяго магістрата, загадаў, каб тут жа і штодзённа выдавана з горада ўсе харчы ад самай вялікай і аж да найменшай рэчы. Таму горад, сціснуты адусюль бедамі, мусіў што толькі было з харчоў загадана князем выдаваць і карміць двор. І як толькі выйшаў загад, давана фураж, бочкамі французскае і венгерскае віно, мёд і піва, вараныя буракі, капусту, соль, таксама бочкамі, штодзённа жывога вала, некалькі дзесяткаў баранаў, гусі і куры давана чародамі, хлеба сітнага і свежага па буханак сто, гарэлку звычайную і сівуху мернікамі, мыла на хусткі штотыдзень па некалькі дзесяткаў фунтаў, рыбы марожанай вазамі, а жывой — сколькі можна было дастаць. А калі б не давана чаго, тады адразу брана магістрат пад варту і карана.

Вось так проста, ласкавы чытачу, і немагчыма тут усяго выпісаць, адсылаю я да скарбовага рэестра, які знаходзіцца ў ратушы ў архіве, дзе прачытаўшы, мусіш ты са слязьмі здзівіцца, як мог горад Магілёў вынесці такія кары і другое на гэта падобнае, калі гэты праклятый чарвяк са сваім дваром стоячы ў замку ад сакавіка 14 да мая 19 тачыў і аб'ядаў горад, і якому на харч і на паднашэнні страчана вялікая сума.

Гэты князь Менчык, будучы ў Магілёве, меў такі намер і часта думаў, якім бы чынам адпомсціцца гораду Магілёву за парубанне перад гэтым у Магілёве масквы і якім бы чынам, каб высекчы горад пад корань, нацкаваць на гэта цара ягамосця. А калі на балі аб'явіў пра свой намер князю Шарамецьеву, старому кавалеру і з даўняга знакамітага роду, і другім чыноўнікам, што былі тут жа пры весялосці, тады стары князь Шарамецьеў фармальна сказаў гэтыя словы: «Аляксандр Данілавіч Менчык, полна гаваріць, на то тут вайна была, можна разумець полна, што і нашы былі вінаваты. Сматрі нонячы, ні многа лі в Польшчы нашых пабіта, да будзім лі мсціцца, да на всём Божые ізволенье. Плюнь на ета. Пасматрі, нонячы места Магілёў і нас саміх, і салдат, драгон і афіцэраў царскіх хлебам і соллю корміт, абіды нам не творіт, а мы ат ніх благадарны. Нехай сабе здраствуют».

Гэты князь Менчык, маючы свой ліхі намер высекчы горад Магілёў укаранёным у сэрцы, калі адзін раз (бо меў прывычку паходжваць на набажэнства да Божай Брацкай царквы) стаяў перад цудоўным абразам Найсвяцейшай Панны Багародзіцы, ізноў задумаўся, як бы давесці свой намер да выніку, і, пра гэта думаючы, страціў прытомнасць і ўпаў. І ад гэтага часу перастаў хадзіць да Брацкай царквы, але ўжо хадзіў да Святога

Спаса. Толькі з пратэкцыі Панны Марыі гэты яго ліхі намер не здзейсніўся.

(...) Дня 19 мая князь Менчык з помпаю і са значнаю світаю сваіх целаахоўнікаў і дваран, караванаў вярблюдаў і мулаў, якія няслі ўюкі, выехаў з Магілёўскага замка прэч, а на яго месца ўехаў у замак маскоўскі палкоўнік Андрэй Вілліч Шарфаў, якога, таксама, штодзённа быў вымушаны горад харчаваць за свой кошт.

(...) Вяртаюся я да тэмы, што была вышэй. Паколькі прыйшоў час Галаўчынскай бітвы, маскалі каля лупалаўскіх слупоў варажылі, запалілі порах і, паводле ваеннага звычаю, углядаліся на дым (а адбывалася гэта ў нядзелю пад вечар). З гэтай варажбы стала ліхая надзея, таму войска, калі ішло пад Галаўчын супраць шведа, было вельмі невясёлым.

Перад прыходам да Магілёва шведскага караля з войскам, як бывала пройдзе ўлеце невялічкі дождж, тады Бог ведае адкуль узялося страшнае мноства маленькіх жабак, і ўсе скачуць у горад, а не з горада. І так, бывала, зямлю накрыюць, што і ступіць нельга, але як стукнулі гарычыя дні, то ўсе пагінулі.

Года 1708. Месяца ліпеня 3-га дня на пяцістах конях уварваліся ў горад валахі, і кожны для знаку меў ушыты ў шапку пучок саломы. Шукаючы масквы, рассыпаліся па вуліцах (...)

У гэты ж час, калі валахі прыбеглі на рынак, адна відная гарадская асоба заклікала: «Эй, мосці панове, бараніце нас ад гэтых... маскалёў, бо яны ўжо дасталі нас да жывога», але трапіў з агню ды ў полымя, пра што ніжэй раскажацца (...)

Праз тры дні пасля валахаў прыцягнуўся з усім сваім войскам шведскі кароль і стаў лагерам на Буйніцкім полі. Лагер з усім абсталяваннем быў даволі вялікім. У гэты ж час, як толькі прыбыў шведскі кароль, хадзіў да яго магістрат прасіць аб міласці. Адказаў праз перакладчыка: «Паколькі давалі вы правіянт маскалям, патрэбна каб далі і мне».

(...) Шведы, калі прыбылі да Магілёва, адразу да апошняга абрабавалі Буйніцкі кляштар, законнікаў паразганялі, што не засталося ў кляштары ніводнай жывой душы, драўляную старадаўнюю царкву Успення Найсвяцейшай Панны Буйніцкай разабралі і гэтым зрубам наслалі масты, што былі на ўзгор'і. А калі аднаго часу шведскі кароль аб'язджаў войска і фарпосты і ехаў адным мастом, які другія афіцэры, паехаўшы напярадзе, праехалі, то каралеўскі конь, які меў на сабе талісман, ні ў якім разе не хацеў пускацца праз мост. Кароль, вельмі гэтаму здзівіўшыся, прыгледзеўся да моста і, убачыўшы на ім дзве дошкі, загадаў іх перавярнуць. Аж на адной дошцы абраз Спаса, а на другой Багародзіцы, абодва абразы з разабранай Буйніцкай царквы. Загадаў адставіць іх убок, і ў гэты ж час конь пайшоў праз мост (...)

Шведскі кароль быў малады, не меў гадоў трыццаці, росту быў высокага, грузны, твар меў васпаваты, нос доўгі, быў плячысты, твару прадаўгаватага, меў падстрыжаную ножніцамі шавялюру. І хоць бачылі мы яго больш дзесяці разоў, быў усё ў адным строі, меў пад нізом порты і ласіную камізэльку, а верхнюю цёмна-сінюю, суконную, толькі абшытую галунамі, і на адным, не надта ўбраным кані, які толькі што меў талісман, выязджваў.

(...) Дня чатырнаццатага па старому календару шведскі кароль перабраўся на той бок ракі Дняпра і начаваў лагерам пад гарою на гарадскіх валоках, якія і цяпер называюцца шведскай зменай. Назаўтра гадавы магістрат, што былі пад вартаю, пабрана і адведзена ў няволю ў шведскі лагер, якія, пабыўшы ў ім некалькі дзён, з заступніцтва ягамосці пана Панятоўскага, камісара, ледзьве выбраліся, за што заплацілі сто залатых дукатаў і сто талераў бітых (...)

У гэты ж час быў такі пагалосак, што шведскі кароль з усім сваім войскам меўся цягнуцца на Смаленск, але займае патаемных паслоў ад Мазепы, якія клікалі яго ў Малярасійскія землі, бо Мазепа хацеў выбіцца з маскоўскага падданства і стаць удзельным князем, і абяцалі, што, калі казацкае войска злучыцца са шведскім, будзе непераможным. І так шведскі кароль, паслухаўшы ўкраінскага гетмана Мазепу, пацягнуўся са сваім войскам на Украіну.

(...) А калі ўжо гэты Люцыфер са сваім войскам пайшоў на Украіну, то па розных мястэчках, як то ў Смалянах і іншых, было многа масквы. Тады гараджане, калі хто меў з тавараў, ці з закладаў, ці з іншых рэчаў, пахаваных у зямлю, пачалі іх, не баючыся на сабе ніякага няшчасця, даставаць.

Верасня 2 дня дзікі мядзведь, даволі вялікая махіна, чарнюткі, бліскучы, поўсць на ім была малая (бо яго забітага прывезена да ратушы, што мы бачылі самі), убег пасля ўзыходу сонца ў горад, задзёр у садзе юнака, параніў жанчыну і ўцёк у Шклоўскую браму. А калі ў адным садзе ўлёгся, абступілі яго людзі з мушкетамі і забілі, і прывезлі на возе да

ратушы. Была гэтая пачвара на здзіўленне людское, але старэйшыя людзі ўбачылі ў гэтым ліхі знак.

Года 1708 месяца верасня 8-га, на святога мучаніка Сазонта, напярэдадні Нараджэння Найсвяцейшай Панны, Пан Бог, які доўга цярпеў, караючы горад за нашы цяжкія грахі, дапусціў так, што горад Магілёў, нягледзячы на тое, што быў зрабаваны шведам, але застаючыся збудаваным у дамы, крамы, на Божыя святы абярнуўся за адзін дзень праз агонь у попел і тло, бо з указу цара Пятра Аляксеевіча масква, калмыкі і татары ў вышэйпамянёны дзень, роўна з усходам сонца, акружылі горад з усіх бакоў. Пазачынена брамы, па трывозе ўдарана ў барабаны, а калі заўважылі, аж замак ужо гарыць. Адчынена брамы, прошана літасці, але дарэмна, толькі дадзена гадзіна вольнага часу і прыстаўлена варта, пакуль пазношаны з ратушы ў склеп гарадскія кнігі. Тут калмыкі крамы адбіваюць, рабуюць, з другога канца паляць, заўважым, між іншым, людзей з адзення абіраюць, грошы мацаюць, цэрквы адкрываюць, рабуюць, і калі ўжо, адным словам кажучы, загарэўся астрог, кінуліся на прадмесці і найперш абрабавалі багатыя дамы. А калі агонь заняўся з усіх бакоў, зрабаваўшы горад да асновы, ад'ехалі прэч. Калі калмыкі адбілі царкву святога Міколы і павыцягвалі сундукі, то некаторыя з-за агню ад'ехалі прэч, а астатняе дакончылі смялейшыя гараджане самі. Нават мікалаеўскія папы і панамары ў гэты час добра ўзбагаціліся. У гэты час кожны нясмелы ад сваіх рэчыў уцякаў, а той, хто нічога не меў, падмацаваўся чужым дабром.

У гэты ж час, калі ўжо Божы гнеў, гарачасць Божая за грахі людскія расплыліся агнём па ўсім горадзе, муж пра жонку, а жонка пра мужа нічога не ведаючы, хапалі толькі малых дзяцей, куды маглі прэч з горада ўцякалі, да лясоў, да яроў, да Буйнічаў, да Котуша, хаваліся, дзе хто мог. А так як горад быў запалены, то некаторыя крычалі: «Гэта ўжо масква высякаюць горад». Не ў аднаго тады з такога вялікага страху вырываліся з сэрца апакаліпсічныя словы: «Горы-горы, прытуліце нас, бо хто ж сцерпіць дзень гневу Божага...» У гэты час набожны і акамянелы люд мусіў выплакаць апошнія слёзы, бачачы, як аздобныя Божыя святыні, арнаментаваныя крыжы, Божыя цэрквы памаленьку, разгарэўшыся ў агні, валяцца на зямлю...

(...) І гэта, таксама, напомню, бо потым была такая вестка, што калі б гараджане тым прысланым для спальвання горада калмыкам, татарам і маскве меліся працівіцца, альбо ўзброенай рукой абараняцца, то мілі за дзве стаяла некалькі палкоў, якія мелі загад спустошыць горад агнём і мячом да асновы, але ад мяча Пан Бог уратаваў. Тут вяртаюся я да першага сказу.

Назаўтра, пасля нешчаслівага спальвання горада, калі ўжо ўсё стала тлом, агонь супакоіўся, бо не было ўжо чаму гарэць, адзін другога шукалі, малыя дзеці без малака, без калысак плакалі, падрослыя есці прасілі, але дарэмна, бо ўсё пагарэла. І калі адзін аднаго знайшоўшы прыходзілі на сваё дамашняе папялішча, не маглі пазнаць, дзе жылі, хіба што знаходзілі па печах, бо і ўсе сады згарэлі пад корань, так што не было дзе і прытуліцца ад дажджу і холаду. І так некаторыя, калі дзе якая халупа ацалела, прасіліся ў суседства, убогія капалі зямлянкі і рознага адведвалі, пакуль агледзеліся. А некаторыя, каму выпадала, пачалі будаваць невялічкія хаты.

(...) У гэты ж час немалое маскоўскае войска сабралася на тым баку Дняпра, непадалёку Лясной, і сам цар ягамосць Пётр Аляксеевіч быў у гэтай бітве. А адбывалася гэта ў самыя замаразкі...

Сам цар ягамосць, бегаючы сярод палкоў, фармальна казаў такія словы: «Радзейце, братцы, Богу і государу». На сваім кані моцна ўвіваўся. А калі ўжо войскі змяшаліся, узяліся за штыкі. І хоць масквы досыць набіта, аднак перамога засталася пры маскалю, бо многа шведаў паўцякала ў лясы і пушчы, а калі ўжо наступіла ноч і выбарабанена на мір, гэтым часам бітва і закончылася. Генерал Леанхофт з чатырма тысячамі апынуўся далёка. Тут многа шведскіх скарбаў, коней, адзення, вазоў, стрэльбаў, куляў et cetera і рознай амуніцыі падастаўлася мясцовай шляхце і сялянам. Гэтае шведскае войска вязло з сабою для пераправы праз рэкі і шкураныя масты, але ўсё гэта пагінула пад Лясною. Некалькі тыдняў нельга было там з-за мноства трупаў ездзіць дарогамі, бо былі разбэсціліся над імі сабакі і звяр'ё, хіба што вялікай кампаніяй і са стрэльбамі.

У гэты ж час многа шведаў-недабіткаў, якія паўцякалі ў лясы, не мноствам, але па дзесяць, па пятнаццаць чалавек вярталіся праз Магілёў назад, рэдка хто ў мундзіры, але накрыўшыся рагожамі. Аднак пад сумненнем, каб меўся каторы са шведаў прыцягнуцца да сваёй айчыны, бо шляхта і сяляне па вёсках іх забівалі за тое, што шведы, іду-

чы дарогамі на Украіну, мучылі тутэйшы народ правіянтамі.

Год 1709. У гэтым годзе была лютая зіма, стаяла доўга, снягі былі невыносныя і нечувана вялікія, што не толькі звяр'ё, птаства, але і людзі на дарогах мёрзлі. І была дарагавізна на збожжа і на розныя харчовыя рэчы...

Друкуецца са скарачэннямі паводле публікацыі ў часопісе «Полымя» (1992 г., № 7. С. 148—157; № 8. С. 198—211).

Магілёўская школа іканапісу

У 16—18 ст. Магілёў з'яўляўся адным з буйнейшых цэнтраў мастацкай культуры Вялікага княства Літоўскага. Побач з кнігадрукаваннем, гравюрай — «дрэварытам» і «медзярытам» — разьбой па дрэве высокага ўзроўню дасягнула ў горадзе «малярства» — майстэрства жывапісу і іканапісу. У Магілёўскай брацкай друкарні працавалі майстры-гравёры і мастакі-іканапісцы (Афанасій Пігарэвіч і іншыя). Праваслаўнае брацтва клапацілася аб адпаведнасці выяў у кніжнай графіцы мясцовым традыцыям праваслаўнага іканапісу, ідэалам «даўніны». Таму кампазіцыі гравюр магілёўскіх выданняў блізкія да твораў іканапісу. Дакументы і іншыя гістарычныя і архіўныя крыніцы змяшчаюць вялікую колькасць імён мастакоў, якія працавалі ў Магілёве. У дакументах магілёўскага магістрата за 1578—89 гг. сустракаецца 6 імён мясцовых мастакоў, у 17 ст. — 8. У інвентарах Магілёва за 1736 г. ўпамінаецца 5 імён «маляроў», «мастакоў» і «багамазаў», за 1765 г — 6. У 18 ст. ў Магілёве ў розны час працавала 30 жывапісцаў. Як і прадстаўнікі іншых прафесій, магілёўскія мастакі навучаліся традыцыйным шляхам, характэрным для сярэдневяковай рамеснай вытворчасці: майстры бралі вучняў на пэўны тэрмін, абавязваліся навучыць іх свайму рамяству і неслі за іх адказнасць. Напрыклад, у 1578 г. «малер» Ісак Іванавіч звяртаўся ў магістрат з просьбай вызваліць яго ад абавязкаў у адносінах да свайго вучня, які знаходзіўся ва ўцёках. Вядомы прыклады наследавання прафесіі (Міхаіл Багамаз вучыўся ў свайго дзеда). Большасць мастакоў з'яўлялася «мяшчанамі магілёўскімі» Былі мастакі і духоўнага звання (манахі Пётр, Лук'ян і Рыгор са Спаскага манастыра). Некаторыя мастакі займаліся не толькі іканапісам, але і збытам сваіх абразоў у навакольных вёсках і бліжэйшых гарадах, працавалі на рынак (Міхаіл Багамаз), выконвалі і іншыя жывапісныя работы [Акулініч Макар, які жыў у канцы 16 ст., «прадаў ярчак (сядло) маляваны, з пазалотай»]. Афанасій Пігарэвіч (канец 17 — пачатак 18 ст.) рабіў фрэскі, насценныя размалёўкі, напісаў таксама абразы «Евангелісты», «Маці Боская», упрыгожыў размалёўкамі ратушу па заказе магістрата, выканаў пазалотныя работы Ігната Саца. Творы іканапісу і жывапісныя размалёўкі мелі вялікае значэнне ў культурным жыцці горада. Паводле сведчання «Магілёўскай хронікі...», устанаўленне на «Алейнай браме» горада ў пачатку 18 ст. абраза «Маці Боская» (мастак Мірон Пігарэвіч) замест старажытнай, якая згарэла, суправаджалася вялікай колькасцю народу і вылілася ў значную грамадскую падзею. Інтэр'еры цэркваў упрыгожвалі разныя шмат'ярусныя іканастасы (зберагалася разьба іканастаса Мікалаеўскай царквы), насценныя размалёўкі, брацкія і цэхавыя абразы. У сярэдзіне 17 — пачатку 18 ст. фрэскавыя размалёўкі былі ў Богаяўленскай і Мікалаеўскай цэрквах. Твораў магілёўскага іканапісу таго перыяду захавалася мала. Шмат абразоў, якія экспанаваліся на выстаўках у Мінску ў 1918 г. і 1926 г., загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны. Уцалелыя абразы магілёўскіх мастакоў знаходзяцца ў Дзяржаўным мастацкім музеі Беларусі і Музеі старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі ў Мінску, а таксама Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі. У Дзяржаўным мастацкім музеі Беларусі зберагаюцца абраз П.Еўсіевіча «Нараджэнне Марыі» (1649), у кампазіцыі якога выкарыстана мноства этнаграфічных дэталей і прадметаў мясцовага побыту, і аднайменны абраз пачатку 18 ст., блізкі па кампазіцыі да абраза Еўсіевіча, што сведчыць аб пераемнасці ў Магілёўскай школе іканапісу. У Музеі старажытнабеларускай культуры экспануецца буйнафарматны абраз «Дэісус» канца 1-й палавіны 18 ст., які напісаны на высокім прафесійным узроўні, у Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі — 3 абразы 1-й палавіны 17 ст.: «Маці Боская з дзіцем», «Святы Ілья», «Сцэна жыція святога Георгія». З абразоў Магілёўскай школы іканапісу, што захоўваюцца ў цэрквах Быхава, Магілёва і

іншых населеных пунктаў, найбольш ярка выяўляюць асаблівасці мясцовай іканапіснай традыцыі творы «Спас», «Маці Боская Адзігітрыя», «Мікола» (сярэдзіна 17 ст.). Яны аднаго фармату з рэльефнай разьбой на фонах і размяшчаліся, магчыма, у адным іканастасе. Для ўсіх трох твораў характэрна багатая дэкаратыўнасць і паслядоўнасць у адлюстраванні праваслаўнага канона. Магілёўскія абразы 17—18 ст. вызначаюцца асаблівасцю пісьма, іканаграфічным тыпажом, фонавым арнаментам, які нагадвае сетку або дыван раслінных матываў. Арнамент фонаў магілёўскіх абразоў мае высокі рэльеф са скругленым злёгку контурам і дадатковымі штрышкамі на паверхні арнаментальных матываў. Насечка ў прабелаў арнаменту часам адсутнічае, бо сетка яго вельмі густая. Прафесіяналізм выканання абразоў сведчыць аб росквіце Магілёўскай школы іканапісу як значнай гісторыка-мастацкай з'явы ў старажытнабеларускім жывапісе. Самабытны і арыгінальны, з багатай палітрай фарбаў жывапіс Магілёўскай школы ў сваёй аснове зберагае традыцыйны іканапісны канон, у вобразах пераважаюць гуманістычныя пачаткі. Магілёўскі іканапіс у параўнанні з іканапісам іншых рэгіёнаў (палескі, мсціслаўскі, слуцкі і віцебскі) вызначаецца большай жывапіснасцю і цягай да арнаментыкі. Арнамент у магілёўскіх абразах прадстаўлены не толькі рэльефам на фонах, але і багатымі ўзорнымі шляхамі і кветкавымі матывамі ў адзенні персанажаў, што збліжае Магілёўскую школу іканапісу з украінскай. Тыпажом і прапорцыямі фігур магілёўскія абразы блізкія да абразоў віцебскіх і мсціслаўскіх.

Ю.А.Піскун, В.В.Церашчатава.

Магілёўская школа гравюры

У асяроддзі мастацтвазнаўства даўно ведаюць аб існаванні Магілёўскай школы гравюры канца 17 — 1-й палавіны 18 ст. Мастакі гэтай школы працавалі ў друкарні Магілёўскага богаяўленскага брацтва, дзе выдаваліся літургічныя і свецкія кнігі на беларускай, польскай, грэчаскай і лацінскай мовах. Усе выданні гэтай друкарні, як правіла, мелі тытульныя лісты, а тэксты кніг багата ўпрыгожваліся ілюстрацыямі, застаўкамі, канцоўкамі. У аснове мастацкіх прынцыпаў майстроў гравюры Магілёўскай школы былі традыцыі беларускага народнага мастацтва, асабістыя назіранні за навакольным жыццём, смелае ўнясенне ў кампазіцыі рэлігійнага зместу характэрных тыпажоў магілёўскіх жыхароў, іх адзення і прадметаў хатняга побыту. Гэта



Ілюстрацыя М.Вашчанкі да кнігі «Манархія Турэцкая, апісаная Рыко». 1678 г.



М.Вашчанка. Ілюстрацыя да кнігі «Манархія Турэцкая...» 1678 г.

рабіла іх творы рэалістычнымі, жыццёва-пераканаўчымі, надавала ім свецкі характар. Галоўную ролю ў фарміраванні прынцыпаў школы гравюры адыгралі жыхары Магілёва Максім Вашчанка і яго сын Васіль. Прозвішча Вашчанка сустракаецца ў магілёўскіх дакументах з 1578 г. На жаль, пра магілёўскіх дзеячаў мастацтва канца 17 — пачатку 18 ст. даволі мала звестак. Максім Ермаліній Вашчанка нарадзіўся ў 2-й палавіне 17 ст., адукацыю атрымаў у Віленскай езуіцкай акадэміі, куды паступіў у 1660-х гадах. 21 лістапада 1672 г. ён здаў экзамен на бакалаўра свабодных мастацтваў, а 14 ліпеня наступнага года атрымаў званне магістра філасофскіх навук. Відаць, у Віленскай акадэміі Вашчанка цудоўна асвоіў справу мастака-гравёра і праз некалькі гадоў у родным Магілёве наладзіў работу па ілюстраванні і выданні кніг. Першай кнігай, дзе з'явіліся гравюры Максіма Вашчанкі, быў зборнік «Манархія Турэцкая, апісаная Рыко», выдадзены ў 1678 г. Слуцкай друкарняй.

Ілюстрацыі да «Манархіі Турэцкай...» сталі прыкметнай з'явай у беларускім кніжным мастацтве. Гэта быў свецкі цыкл графічных работ з незвычайнай для таго часу рэалістычнай перакананасцю. У адных гравюрах мастак дакладна ішоў за тэкстам, іншыя ствараў незалежна ад канвы апавядання.



Копія гравюры 1702 г. Васіля Вашчанкі. Перамаляваў Ул.Ратомскі.

У ілюстрацыях, якія адносяцца непасрэдна да тэксту кнігі, найбольш поўна праявілася творчая фантазія мастака, яго асабістыя назіранні за жыццём сваіх землякоў-беларусаў з горада Магілёва. Высокіх і згрэбных турэцкіх наложніц, як адзначаў у свой час пуб-



В.Вашчанка. Тайная вячэра. Ілюстрацыя да кнігі «Акафісты і каноны».



В.Вашчанка. Ілюстрацыя да «Кнігі жыцій святых». 1702 г.



В.Вашчанка. Ілюстрацыя да «Кнігі жыцій святых». 1702 г.

ліцыст А.Сайкоўскі, Вашчанка ператвараў нярэдка ў магілёўскіх маладзіц.

З яго імем звязана з'яўленне гравюр у беларускім кнігадрукаванні, якія выкананы разцом на медных пласцінках. Праўда, спроба вырабу такіх гравюр была зроблена раней магілёўцам Спірыдонам Собалем. Да 1690-х гадоў у друкарнях Беларусі ні адна кніга кірылічнага шрыфту не была праілюстравана гравюрамі-медзярытамі.

У 1693 г. Магілёўская брацкая друкарня выдала кнігу «Акафісты і каноны», дзе было больш за 3 дзесяткі ілюстрацый-медзярытаў Вашчанкі. Гэта кніга — лепшае беларускае выданне тых часоў і па мастацкім афармленні, і па паліграфічным выкананні. Усе ілюстрацыі склалі самы багаты новазапаветны цыкл гравюр аб жыцці Ісуса Хрыста. З зайздроснай творчай фантазіяй магілёўскі мастак выканаў шматфігурныя кампазіцыі ў выглядзе звычайных сцэн жыцця сваіх землякоў-магілёўцаў. Усе ілюстрацыі да «Акафістаў і канонаў» носяць ярка выражаны жанравы характар, насычаны беларускім нацыянальным каларытам. Гэтыя медныя пласціны з гравюрамі праз 35 гадоў былі выкарыстаны пры перавыданні кнігі ў 1728 г. Памёр М.Е.Вашчанка ў 1708 г.

Традыцыі мастака прадаўжаў яго сын Васіль Максімавіч Вашчанка, які стаў адным з самых вядомых майстроў Магілёўскай школы гравюры. Па кнігах, што ён ілюстраваў, можна меркаваць, як працаваў ён у друкарні Магілёўскага богаяўленскага брацтва ў 1694—1730 гг. Сярод творчай спадчыны В.М.Вашчанкі ёсць работы з аўтографам і без аўтографа мастака. Выканаў загалоўныя лісы ў кнігах «Дыоптра» (1698), «Неба новае», «Перла мнагацэннае» (абодва 1699), «Кніга жыцій святых» (1702), а таксама гравюры «Іаан Дамаскін», «Нараджэнне Хрыста» для кнігі «Асмагласнік» (1730) і інш. Гэта тонкая разьба, вельмі дакладная штрыхоўка, з дапамогай якой мастак мадэліруе фігуры персанажаў, настолькі дасканалыя, што амаль усе гэтыя работы — шэдэўры графічнага мастацтва пачатку 18 ст.

Да лепшых твораў Вашчанкі належыць тытульны ліст «Кнігі жыцій святых». Фігуры дзеючых асоб і анёлаў выгравіраваны тут з вялікім майстэрствам. Гранічна адточана іх пластыка, прыдумана кампазіцыя кожнага ліста. Характэрна, што ўнізе малюнка адлюстраваны куточак сярэдневяковага Магілёва. Гэта, бадай, адзін з самых першых выпадкаў у паліграфіі, калі ў кнізе царкоўнага характару рэалістычна паказаны гарадскі пейзаж. У наступных сваіх гравюрах Вашчанка дасягнуў найвышэйшага мастацкага майстэрства. З ранейшай выразнасцю лінейных рытмаў ён абагаціў свае ксілаграфіі святлоценявымі эфектамі. Тыпажы яго работ простанародныя і прыцягваюць гледача выразнасцю і чысцінёй свайго ўнутранага свету (кнігі «Асмагласнік», «Тайная вячэра»). Пра незвычайную мастацкую каштоўнасць твораў Вашчанкі сведчыць і той факт, што некаторыя яго гравюры выкарыстоўваліся паўторна ў шэрагу кніг. Так, напрыклад, ксілаграфія «Вадахрыст», якая з'явілася першы раз на старонках кнігі «Дыоптра» ў 1698 г., друкавалася пазней у кнігах «Неба новае», «Перла мнагацэннае» і «Кніга жыцій святых».

Сярод прадстаўнікоў Магілёўскай школы гравюры пасля бацькі і сына Вашчанкаў па



М.Вашчанка. Гравюра «Іаан» да кнігі «Новы запавет».



Ф.Ангілейка. Маці Боская. Ілюстрацыя да кнігі «Часаслоў».

сваіх мастацкіх каштоўнасцях лічацца работы іх земляка Фёдара Ангілейкі. Як сведчаць яго аўтографы на ксілаграфіях, Ангілейка працаваў у Магілёўскай брацкай друкарні ў 1700—03 гг. За 3 гады выйшлі ў свет 2 кнігі з яго ілюстрацыямі — «Ирмолой сиречь Осмогласник» (1700) і «Часослов сиречь Последование службы» (1703). Ксілаграфіі з адлюстраваннем цара Давіда, Іаана Прадцечы, Ісуса Хрыста і іншых персанажаў, пра якія вядзецца апавяданне ў гэтых царкоўных кнігах, па манеры графічнага выканання блізкія да работ Васіля Вашчанкі. Гравюрам Ангілейкі характэрны прастата тэхнічных прыёмаў і нескладанасць кампазіцыі, што набліжае іх да твораў народнага мастацтва. У пачатку 18 ст. ў друкарні Магілёўскага богаяўленскага брацтва акрамя названых мастакоў працавалі Мікіта Антушкевіч, Апанас Вашчанка, Янка Стральбіцкі і Апанас П.

Арнаментальныя матывы магілёўскіх гравюр пазней з'явіліся ў маскоўскіх выданнях. Гэта не дзіўна. Магілёўскія майстры кнігадрукавання даволі часта бывалі ў Кіеве і Маскве, дзе не толькі пераймалі вопыт кнігавыдаўцоў, але і дзяліліся ўласным вопытам.

Кнігі, выдадзеныя Магілёўскай брацкай друкарняй, з'яўляюцца найцікавейшай старонкай гісторыі беларускага кнігавыдання, а прозвішчы першых магілёўскіх кнігадрукароў занялі дастойнае месца сярод славянскіх асветнікаў 17—18 ст. *А.Кандрусевіч.*

Назаўсёды ў памяці землякоў

ІЯЎЛЕВІЧ (ЯЎЛЕВІЧ) ІГНАЦІЙ

Беларускі педагог-асветнік, пісьменнік, грамадскі і царкоўны дзеяч, прадстаўнік сілабічнай паэзіі. Нарадзіўся 26.9.1619 г. ў Магілёве ў сям'і небагатага мешчаніна. Бацькі ахрысцілі і далі імя сыну ў Крыжаўзвіжанскай царкве, што знаходзілася каля Быхаўскага рынку. Першапачатковую адукацыю атрымаў у г. Шклове, потым вучыўся ў розных бакалаўраў у Магілёўскай брацкай школе і тры гады ў Замойскай акадэміі (Польшча), дзе вывучаў тэалогію і медыцыну. Пасля вучобы працаваў выкладчыкам у Кіева-Магілянскай калегіі (быў прафесарам свабодных навук). Разам з рэктарам гэтай калегіі С.Пачаскім удзельнічаў у арганізацыі ў Ясах (цяпер Румынія) славяна-грэка-лацінскай акадэміі — першай буйной малдаўскай навучальнай установы, якая адкрылася ў 1640 г. Калі быў студэнтам другога курса філасофіі, 31.8.1647 г. пастрыгся ў Кіеве ў манахі. Пэўны час пражываў у Львове, Яраслаўлі (у Галіцыі), Кракаве, Скіце, Камянцы, Сочаве ў Валахіі, Оршы і інш. месцах. З 1655 г. быў у Полацку ігуменам Богаяўленскага манастыра, пры якім адкрыў школу і бібліятэку. У 1660 г. стаў таксама архімандрытам полацкага Барысаглебскага манастыра. Жывучы ў Полацку, апекаваўся мясцовымі паэтамі Філарэтам Утчыцкім і Сімяонам Полацкім, падтрымліваў прыязныя адносіны з тагачаснымі рускімі дзяржаўнымі і культурнымі дзеячамі Ф.Рцішчавым і Л.Ардын-Нашчокіным. Выступіў з прамовай на прыезд у Полацк цара Аляксея Міхайлавіча (1656). Прымаў актыўны ўдзел у Маскоўскім царкоўным саборы 1660 г. па справе патрыярха Нікана. Апошнія звесткі пра І.Іяўлевіча ёсць у перапісцы з маскоўскім патрыярхам Іакімам за студзень—сакавік 1686 г.

З літаратурнай спадчыны І.Іяўлевіча да нашага часу дайшла яго аўтабіяграфічная запіска на польскай мове, апублікаваная С.Голубевым у 1886 г. Захаваліся некалькі лістоў да Сімяона Полацкага, прамовы з нагоды розных рэлігійных і палітычных падзей таго часу. Вядомы таксама яго дэкламацыя на прыезд у Магілёў віцебскага, аршанскага, мсціслаўскага і магілёўскага епіскапа Іосіфа Гарбацкага (4.8.1650) і некалькі незакончаных элегічных вершаў, створаных на ўзор элегій Авідзія. Памёр каля 1686 г.

ІЯЎЛЕВІЧ ФАМА

Беларускі пісьменнік і педагог 1-й палавіны 17 ст. Ф.Іяўлевіч нарадзіўся ў Магілёве (дакладныя даты жыцця невядомы). Вучыўся ў Магілёўскай брацкай школе, у сярэдзіне 1620-х гадоў у Ягелонскім універсітэце Кракава. У канцы 1620 — пачатку 1630-х гадоў рэктар Кіеўскай брацкай школы. З 1632 г. займаўся педагагічнай дзейнасцю ў магілёўскім, у 1940-я гады — у слуцкім брацтвах. Аўтар паэмы «Лабірынт», якая выдадзена на польскай мове ў друкарні Ф.Цэзары (Кракаў, 1625). Услаўляў у ёй бязмежныя магчымасці чалавечага розуму. Заклікаў да аднаўлення грамадска-палітычнага і культурнага адзінства славянскіх народаў. Крытыкаваў духавенства, якое прывяло да заняпаду сістэму навучання, і заможных мяшчан, што аддавалі перавагу матэрыяльным дабротам перад маральнымі каштоўнасцямі і навукамі. Значная частка паэмы — панегірык запарожскаму казацтву, якое абараняла краіну ад татарскіх набегаў. Твор напісаны ў стылі экспрэсіўна-метафарычнай паэзіі барока, прасякнуты асветніцкімі ідэямі. *Г.Я.Галенчанка.*

СПІРЫДОН СОБАЛЬ

Да ліку выдатных людзей 16—17 ст., якія сталі дастойнымі прадаўжальнікамі справы першага беларускага кнігадрукара і вучонага Францыска Скарыны, належаць некалькі сыноў Магілёўшчыны. Гэта Пётр Мсціславец, браты Кузьма і Лукаш Мамонічы і Спірыдон Собаль. І калі першым з іх у выніку жыццёвых абставін сваю працоўную дзейнасць давялося весці за межамі роднага Прыдняпроўя, то Спірыдон Собаль амаль увесь час працаваў на Магілёўшчыне ў друкарнях Куцеінскага і Буйніцкага манастыроў, а ў апошнія гады свайго жыцця — у друкарні Магілёўскага богаяўленскага брацтва. На жаль, дата нараджэння Спірыдона Багданавіча Собаля невядома. Даследчыкі яго творчасці лічаць, што вядомы беларускі кнігадрукар і асветнік нарадзіўся ў сярэдзіне апошняй чвэрці 16 ст. ў сям'і бургамістра Магілёва.

Бацька Багдан Ігнатавіч Собаль быў гандляром і членам Магілёўскага купецкага брацтва, аб чым сведчаць дакументы гэтай

грамадскай арганізацыі за 1597 г. У кнізе «Хроніка беларускага горада Магілёва» гаворыцца аб тым, што Б.І.Собаль быў адным з кіраўнікоў праваслаўных гараджан, якія 9.12.1618 г. не пусцілі ў горад уніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча з яго світай, што прыбылі сюды, каб укараніць каталіцкую веру.

Да таго часу Спірыдон Собаль скончыў Магілёўскую брацкую школу і дасканала авалодаў друкарскай справай у друкарні Кіева-Пячэрскай лаўры, куды яго ў свой час накіравала богаяўленскае брацтва. У 1616 г. брацтва адкрыла ў Магілёве ўласную друкарню, дзе была выдадзена кніга «Служэбнік». З-за вялікага попыту яе праз год давялося перавыдаваць. Паводле даследчыкаў М.І.Прашковіча і М.Б.Батвінніка, да выдання «Служэбніка» меў дачыненне і Собаль. З пачатку 17 ст. працаваў настаўнікам, потым рэктарам Магілёўскай брацкай школы. Пасля суда над непакорнымі магіляўчанамі (1619) былі закрыты не толькі праваслаўныя цэрквы і манастыры, але і друкарня богаяўленскага брацтва. З 1624 г. С.Собаль выкладаў у Кіеўскай брацкай школе і Кіева-Магілянскай акадэміі, у 1628 г. па запрашэнні кіеўскага мітрапаліта Іова Барэцкага прыехаў у яго рэзідэнцыю і два гады працаваў у друкарні Кіева-Пячэрскай лаўры. Выдаў шэраг кніг маральна-павучальнага і рэлігійнага зместу — «Ліманар», «Мінея супольная», «Анцён», «Апостал» і інш.

У родныя мясціны С.Собаль вярнуўся ў 1630 г. па просьбе праваслаўнага магната Б.Статкевіча, які выдзеліў С.Собалю сродкі для стварэння друкарні ў Куцеінскім мужчынскім кляштары, што непадалёку ад Оршы. У 1631 г. С.Собаль выдаў у Куцеінскай друкарні кірыліцай кнігі літургічнага характару — «Брашна духоўнае», «Малітвы паўсядзённыя», «Буквар», у 1632 г. — «Часаслоў». Гэтыя выданні мелі вялікае значэнне ў пашырэнні асветы не толькі на Беларусі, але і на Украіне, у Літве На тытульным лісце «Буквара» ўнізе даюцца яго выхадныя звесткі: «В Кутейно изображена в типографии Спиридона Соболя. Року 1631». Па краі ліста вакол усяго тэксту зроблены ўзорысты арнамент, які надае тытульнаму лісту асаблівую прывабнасць.

Першая старонка «Буквара» пачынаецца з азбукі, 44 літары якой падаюцца ў звычайным і ў адваротным парадку. Гэта зроблена, напэўна, для развіцця зрокавай памяці ў на-



Мемарыяльная дошка Спірыдону Собалю.


БУКВАРЪ
ЯЗЫКА
СЛАВЕНЬСКА.
Писáнїй Чтенїя оучи
тисм хотящимъ, вло
лезное рукоположенїе.
Ў Могилéва,
Ў Друкáрни, Спирндóна Сóсола.
Лéта Ѡтрсхвалнаго. 1636

Вокладка «Буквара» С.Собаля. 1636 г.

вучэнцаў. Далей некалькі старонак кнігі заняты словамі з адной зычнай і галоснай, з дзвюма зычнымі і галоснай, а таксама з трыма зычнымі і адной галоснай. На наступных старонках даецца вялікі матэрыял на кожную з літар алфавіта — да 20—25 складоў, якія пачынаюцца або заканчваюцца той ці іншай літарай, напрыклад «май, рай, чай, сей, твой». Значнае месца ў «Буквары» аўтар і выдавец адводзяць фанетыцы, скланенню назоўнікаў і прыметнікаў, знакам прыпынку і націскам, дзеясловам і ўтвораным ад іх дзеепрыметнікам і дзеепрыслоўям. У праграмах брацкіх школ у той час вялікая ўвага аддавалася навыкам складання вершаў. Спірыдон Собаль у «Буквары» таксама дае вучням такія першапачатковыя навыкі. Асобнае месца ў кнізе займае «Дзесяцаслоўе» — дзесяць запаведзяў «Ветхага запавету». У «Буквары» С.Собаля вырашалася адразу дзве задачы — навучанне падрастаючага пакалення і выхаванне яго ў духу праваслаўя.

У Куцейне С.Собаль падрыхтаваў некалькі кваліфікаваных друкароў і, калі перадаў справы друкарні ігумену Маілю Труцэвічу, пераехаў у Буйнічы пад Магілёвам, дзе ў мужчынскім кляштары па заданні Б.Статкевіча адкрыў новую друкарню. У 1635 г. выдаў «Псалтыр», на тытульным лісце якога назваў імя мецэната Статкевіча — уладальніка «месца новазакладзенага сяла Буйнічы». У пачатку 1636 г. С.Собаль па запрашэнні кіраўнікоў Магілёўскага богаяўленскага брацтва пераехаў з Буйніч у Магілёў і адразу ўзяўся за стварэнне Магілёўскай брацкай друкарні. Работа вялася так хутка, што ўжо ў канцы 1636 г. друкарня выдала «Буквар» («Букварь языка славеньска»).

Магілёўскі «Буквар» адрозніваўся ад выдадзенага ў Куцеінскай друкарні меншай колькасцю граматычных раздзелаў, у ім было больш біблейскага матэрыялу. У падручнік увайшлі 10 запаведзяў «Ветхага запавету» і каля дзесятка малітваў. Гэты «Буквар», як і ранейшы, вызначаў усё той жа абавязак настаўніка — навучыць дзяцей не толькі чытанню, але і выхаваць іх у духу праваслаўнай маралі.

Магілёўскі «Буквар» С.Собаля — унікальная кніга, адзіны яе экзэмпляр зберагаецца ў Маскоўскім гістарычным музеі. Ён нямала падарожнічаў па Еўропе, пабываў у руках англічан і немцаў; пра што сведчаць рукапісныя пометкі на яго старонках.

Выданнем «Буквара» ў Магілёўскай брацкай друкарні С.Собаль нібы скіраваў далейшую работу магілёўскіх друкароў на выпуск вучэбнай літаратуры, якая была неабходна для вучняў брацкіх школ беларускага Падняпроўя. Методыку падачы граматычнага і літургічнага матэрыялаў буквароў С.Собаля пазней шырока выкарыстоўваў у сваёй выдавецкай рабоце маскоўскі кнігадрукар 17 ст. В.Ф.Бурцаў.

У 1637 г. ў Магілёўскай брацкай друкарні быў выдадзены «Псалтыр». У ім больш за сто вершаў-псалмоў. «Псалтыр», як і «Буквар», быў настольнай кнігай у брацкіх школах.

У 1638 г. ў Магілёўскай брацкай друкарні С.Собаль выдаў «Тэстамент» — вучэбны да-

паможнік, які ўключаў заданні славеснага характару для трэніроўкі розуму, кемлівасці, волі.

С.Собаль падтрымліваў сувязі з Кіевам і Масквой, дзе марыў стварыць не толькі друкарню, але і школу для навучання юнакоў і дзяўчат грэчаскай і лацінскай мовам. Упершыню ён прыехаў у Маскву ў 1637 г. Там сустрэўся з маскоўскім кнігадрукаром В.Ф.Бурцавым, які набыў у Собаля друкарскія прылады. У дакументах В.Ф.Бурцава засталіся запісы пра дасканалае валоданне беларускім друкаром грэчаскай, лацінскай, польскай, украінскай, рускай і беларускай мовамі.

З дакументаў таго часу вядома, што С.Собаль быў «рэктарам і наглядальнікам школ магілёўскіх і кіеўскіх». 16 красавіка 1639 г. ў пасланні рускаму цару ён пісаў: «Дзяржаўцу і вялікаму князю, усея Русі самадзержцу Міхаілу Фёдаравічу б'е чалом іншаземец, падданы вялікага караля Уладзіслава IV Собаль Спірыдон — рэктар і наглядальнік школ магілёўскіх і кіеўскіх, цяпер жа друкар пісаній праваслаўных і верны слуга мітрапаліта Пятра Магілы...». У гэтым пісьме Спірыдон Собаль паведамляў пра дастаўку ў Маскву «кніг грэчаскіх і лацінскіх, патрэбных да перакладу і да навучання дзяцей» У апошні свой прыезд у Маскву беларускі кнігадрукар звярнуўся да цара з прапановай адкрыць друкарню ў расійскай сталіцы, стварыць школу для навучання грэчаскай і лацінскай мовам «юных падлеткаў». Аднак цар яго прапанову не прыняў, лічыў, што беларускі друкар сваімі кнігамі мог пасеяць толькі ерась і смуту сярод праваслаўных расіян.

Памёр С.Собаль каля 1645 г., пакінуўшы ў спадчыну людзям каля двух дзесяткаў падрыхтаваных і надрукаваных кніг, якія маюць важнае значэнне для вывучэння гісторыі выдавецкай справы не толькі Беларусі, але і Украіны. *А.Кандрусевіч.*

ГЕОРГІЙ КАНІСКІ

Выдатны дзеяч усходнеславянскай культуры Георгій Каніскі, філосаф, пісьменнік, асветнік, чатыры дзесяцігоддзі ўзначальваў беларускую праваслаўную царкву. Рэзідэнцыяй беларускага архіепіскапа быў у той час г. Магілёў. Бібліяграфічную даведку пра Георгія Каніскага можна знайсці ў любым энцыклапедычным слоўніку. Вобраз Георгія Каніскага ўвекавечаны скульптурнай кампазіцыяй на мануменце «Тысячагоддзе Расіі», што быў узведзены ў 1862 г. на тэрыторыі Наўгародскага крамля. На ім значацца 106 прозвішчаў дзяржаўных і ваенных дзеячаў, герояў, пісьменнікаў, мастакоў і асветнікаў, якія сталі найбольш вядомымі і славутымі за тысячагадовую гісторыю існавання Расійскай дзяржавы. Скульптурны партрэт Каніскага знаходзіцца побач з выявамі асветнікаў Кірылы і Мяфодзія, Нестара-летапісца, заснавальніка Кіева-Магілянскай акадэміі Пятра Магілы, аднаго з арганізатараў Расійскай акадэміі навук Феафана Пракаповіча і іншых адукаванейшых людзей свайго часу.



Георгій Каніскі.

Нарадзіўся Георгій Каніскі 20.11.1717 г. ў г. Нежын Чарнігаўскай вобласці ў дваранскай сям'і. Калі яму споўнілася адзінаццаць гадоў, бацькі паслалі яго вучыцца ў Кіеўскую духоўную акадэмію. Пасля сканчэння ў 1743 г. акадэмічнага курса Каніскі вырашыў прысвяціць сваё жыццё навуцы. 11.8.1744 г. ён пастрыгся ў манахі брацкага манастыра і замест свецкага імя Рыгор атрымаў духоўнае Георгій. З 1745 г. Каніскі быў прафесарам філасофіі і паэтыкі ў Кіеўскай духоўнай семінарыі, тут распрацаваў курс лекцый паэтыкі



Мемарыяльная дошка Г.Каніскаму.

(«Правілы паэтычнага мастацтва») і філасофіі (на лацінскай мове). Арыгінал апошняй, даволі аб'ёмнай працы, і цяпер зберагаецца ў Дзяржаўнай публічнай бібліятэцы імя М.Я.Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу. У той час Каніскі напісаў таксама шэраг вершаў і паэтычную драму «Уваскрэсенне мёртвых». У 1752 г. Каніскі ва ўзросце 35 гадоў стаў рэктарам Кіеўскай духоўнай акадэміі, на гэтай пасадзе знаходзіўся да прызначэння яго беларускім архіепіскапам.

У кастрычніку 1755 г. Георгій Каніскі пераехаў у Магілёў. З таго часу ўся грамадская дзейнасць яго цесна звязана з палітычным, ідэйным і культурным жыццём беларускага народа. Гэта быў цяжкі перыяд яго жыцця, асабліва першыя два дзесяцігоддзі. У тыя гады адносіны паміж праваслаўным насельніцтвам, католікамі і уніятамі былі надзвычай складаныя. Не быў застрахаваны ад экстрэмісцкіх праяў міжканфесійнай барацьбы і сам архіепіскап. Двойчы на жыццё Каніскага рабіўся замах. У 1759 г. паводле даносу дамініканца Аўлачынскага шляхціцы і жаўнеры з шаблямі ў руках уварваліся ў Аршанскі праваслаўны храм, дзе вёў службу Каніскі... Выратавалі архіепіскапа манахі бліжэйшага Куцеінскага манастыра. А праз год (28.1.1760) магілёўскі плебан Міхаіл Зяновіч і прэфект Іеранім Бадоўскі разам з натоўпам езуітаў напалі на дом архіепіскапа, але той паспеў схавацца ў падвале. У барацьбе з уніяцтвам Георгій Каніскі шукаў абароны і ў Расіі, і ў Польшчы. Імператрыца Лізавета Пятроўна, а потым і Пётр III неаднаразова патрабавалі ад Рэчы Паспалітай спынення прыцясненняў праваслаўнага насельніцтва.

У сакавіку 1767 г. ўтварылася Слуцкая канфедэрацыя — саюз кальвінісцкай, лютэранскай і праваслаўнай шляхты для ўраўнавання яе ў правах з каталіцкай. Адным з арганізатараў канфедэрацыі быў Каніскі. Водгукам на падзеі ў Варшаве была праца Каніскага «Prawa y wolnosci obywatelom Korony Polskicy y W.X.Litewskie go, Religii greckiey wyznancom sluzase» («Правы і свабоды грамадзян Польшчы і Вялікага княства Літоўскага, прызначаныя веравызнанцам грэчаскай рэлігіі»). У 1772 г. адбыўся першы падзел Рэчы Паспалітай, у выніку якога Магілёўшчына адышла да Расіі, а канфесійныя праблемы вырашаны на карысць праваслаўя.

З пачатку 1770-х гадоў дзейнасць Каніскага набыла новы кірунак: ён пачаў выкарыстоўваць царкоўную кафедру і для выкрыцця заган грамадства — самавольства, дэспатызму, прагнасці і невуцтва магнатаў, выступаў супраць прыгнечання імі працоўнага народа. Ён імкнуўся выхоўваць прыхаджан у духу дабрадзейнасці, аддаваў вялікую ўвагу пытанням іх асветы. У 1757 г., пасля прыезду ў Магілёў, ён адкрыў на базе брацкай школы ніжэйшыя класы семінарыі для дзяцей «простага люду». «Больш за справы царкоўныя, — паведамляў Каніскі ў адным з лістоў, — займае мяне цяпер семінарыя...»

Пасля 1772 г. Георгій Каніскі вырашыў пабудаваць для семінарыі, якая тулілася ў

цесным памяшканні пры архіепіскапскім доме, спецыяльны корпус. Падрадчыкам на выкананне заказу стаў пецярбургскі купец Фёдар Мурашэўскі. Хутка быў узведзены 2-павярховы будынак. У семінарыі былі філасофская і багаслаўская кафедры з аддзяленнем па вывучэнні замежных моў. Выкладчыкамі працавалі здольныя выпускнікі Кіеўскай акадэміі — Гарбачэўскі, Грыгаровіч, Пічэўскі, Скальскі і Цвяткоўскі. Апрача класных заняткаў у семінарыі наладжваліся дыспуты і канцэрты мастацкай самадзейнасці, сіламі навучэнцаў ажыццяўляліся пастаноўкі камедый і трагедый, што развівала ў семінарыстаў мастацкі густ, садзейнічала іх маральнаму выхаванню.

Георгій Каніскі нястомна дамагаўся, каб у Беларускай епархіі было больш навучальных устаноў для дзяцей мяшчанскага саслоўя. «Калі праз навучанне людзі будуць выведзены з убоства свайго, — пісаў ён у Сінод у маі 1776 г., — то яны стануць надзейным падмацаваннем не толькі веры праваслаўнай, але і аддана служыць інтарэсам Айчыны будуць». Каніскі прапанаваў ураду паўсюдна стварацъ народныя школы і паказаў асабісты прыклад у гэтай высакароднай справе: у 1781 г. адкрыў пры цэрквах сваёй епархіі — у Магілёве, Мсціславе, Крычаве, Быхаве, Рагачове, Оршы, Чачэрску і інш. — школы «для навучання дзяцей грамадзянскіх асоб рускай грамаце, правапісу і катэхізісу». Свой вольны час Георгій Каніскі прысвячаў навуковым заняткам. Ён цікавіўся не толькі царкоўным, але і палітыка-эканамічным жыццём беларускага краю. Яго пяру належыць шэраг работ па гісторыі Украіны і Беларусі.

Каніскі — аўтар гістарычных запісак пра Магілёўскую епархію («Историческое известие о Могилевской епархии»), інтэрмедый, вершаў, казанняў, прамоў. Яго творы ў 2 тамах упершыню выдадзены ў 1835 г. ў Пецярбургу. Іх высока ацэньваў А.С.Пушкін.

Незадоўга да смерці Каніскі напісаў сабе надмагільную эпітафію з дабрадушным гумарам і глыбокай праўдай. Словы эпітафіі былі высечаны пасля смерці на мармуровай пліце яго магілы ў прыдзеле Спаскай царквы г. Магілёва.

Калыбелью был мне Нежин, а Киев —
учитель.
В тридцать восемь своих лет стал уж я
Святитель.
Потом семнадцать лет боролся я с волками,
А двадцать два, как Пастырь, отдыхал с
овцами.
Архиепископа сан получил в вознагороду,
И из епископа назван членом Синода.
Георгий именем я из Канисских дому,
Коню подобен был всегда я почтовому.
Тут трупа моего зарыты грешны кости
В год семисотый пятый девяностый.

Памёр Георгій Восіпавіч Каніскі ва ўзросце 77 гадоў 13.2.1795 г. На вялікі жаль, Спаская царква, дзе знаходзіўся прах Каніскага, была разбурана летам 1941 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. *Б.Гардзееў.*

З РАШЭННЯ СВЯТОГА СІНОДА БЕЛАРУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ АБ КАНАНІЗАЦЫІ АРХІЕПІСКАПА МАГІЛЁЎСКАГА І БЕЛАРУСКАГА ГЕОРГІЯ КАНІСКАГА

26 жніўня 1993 г., г. Магілёў.

В сонме святых угодников Божих, прославленных и непрославленных, явленных миру и неизвестных ему, спасавшихся в разные времена церковной истории, ныне явлен еще один подвижник веры и благочестия, исповедник и поборник Православия Преосвященный Георгий, Архиепископ Могилевский и Белорусский. Святой Синод Белорусского Экзархата Русской Православной Церкви, рассмотрев житие, труды, подвиги и церковное служение сего местночтимого Праведника, единомысленно с благоговением и любовию определяет:

1. Изволися Духу Святому и нам причислить к лику местночтимых святых Белорусской Православной Церкви *Архиепископа Георгия Конисского*, отмечая при этом христианские его добродетели:

— праведность жизни и пламенеющую любовь к Богу, которыми он явил в себе пример покорности воле Божией и следования за Христом, будучи добрым пастырем Церкви Христовой;

— ревность ко православному исповеданию веры в Господа нашего Иисуса Христа;

— мужественное стояние за веру и права православных в Польско-Литовском государстве, приведшее к претерпеванию изгнаний и неоднократных покушений на его жизнь;

— апостольскую ревность по благоустроению Православной Белорусской епархии в особо трудный период ее бытия;

— жертвенную любовь к многострадальной пастве своей по заповеди Господа нашего Иисуса Христа: *«Нет больше той любви, как если кто положит душу свою за друзей своих»* (Ин. 15, 13).

2. Празднование церковной памяти Святителя установить по юлианскому календарю 13 февраля — в день его праведной кончины и 24 июля — в день его прославления.

3. Писать новопрославленному угоднику Божию честные иконы для почитания и поклонения, согласно Правилам Седьмого Вселенского Собора.

4. Издать житие святого Архиепископа Георгия и творения его для назидания во благочестии чадам церковным.

5. Объявить всей белорусской пастве о сей благодатной радости прославления Святителя.

6. Почтительно сообщить о сем деянии Синода Белорусской Православной Церкви Его Святейшеству, Святейшему Патриарху Московскому и всея Руси Алексию II и Священному Синоду...

Магілёўская епархія

Вядомы беларускі археограф, гісторык, краязнавец, пісьменнік Іван Іванавіч Грыгаровіч нарадзіўся 1.9.1790 г. ў старажытным беларускім горадзе Прапойску (цяпер Слаўгарад) Магілёўскай губерні. У 1811 г. скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю. У 1811—15 гг. выкладаў у Магілёўскім духоўным павятовым вучылішчы, пасля стаў студэнтам Санкт-Пецярбургскай духоўнай семінарыі, якую скончыў у 1819 г. У 1820 г. быў пасвячоны ў святары магілёўскім архіепіскапам Данііламі, праз некалькі дзён ён ужо быў пасвячоны ў протаіерэі гомельскай царквы, у 1824 г. напісаў свой значны гістарычны твор «Беларуская іерархія». Праца гэта доўгі час лічылася згубленай. Тэкст кнігі знайшоў М.Нікалаеў у аддзеле рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу, куды яна трапіла ў 1929 г. разам з падрыхтоўчымі матэрыяламі да работы над слоўнікам беларускай мовы, сямейнымі і іншымі дакументамі І.І.Грыгаровіча. М.Нікалаеў пры падрыхтоўцы гэтага рукапісу да выдання асноўны тэкст пераклаў на сучасную беларускую мову, тэксты актаў і іншых дакументаў пададзены ў кнізе так, як яны ўпісаны ў рукапіс Грыгаровіча (на славянскай, рускай, польскай, старабеларускай мовах). Кніга выйшла ў выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі ў 1992 г. Ніжэй прыводзіцца раздзел з гэтай кнігі, прысвечаны Магілёўскай епархіі. Матэрыялы І.І.Грыгаровіча выкарыстаны таксама пры падрыхтоўцы спіса епіскапаў Магілёўскіх.

ЕПАРХІЯ МАГІЛЁЎСКАЯ І ВІЦЕБСКАЯ

На Беларусі, якая складала частку Вялікага княства Літоўскага, пры моцных зменах уніі праваслаўная вера захоўвалася нязменна. Хоць нельга вызначыць дакладны час, калі хрысціянства было ўведзена ў гэтым краі, аднак ужо ў першай палавіне 14 ст., пры княжанні Альгерда, а потым Казіміра Вялікага, тутэйшыя жыхары не толькі карысталіся свабодай спавядання праваслаўнай веры, але і былі ўраўнаваны ў правах і грамадзянскіх перавагах з католікамі. Бо шмат якія літоўскія князі, што пакінулі нявер'е, хрысціліся ў дабрачынную веру і былі заснавальнікамі праваслаўных цэркваў і манастыроў. Да XVI ст. Магілёўская вобласць па духоўных справах залежала ад Полацкага архірэя. Але, калі пасля доўгачасовага прыцяснення праваслаўных на выбарчым сейме польскіх і літоўскіх чыноў, што адбыўся 1 лістапада 1632 г., кафедра Полацкага архіепіскапства аддадзена уніятам, то прынята было рашэнне замест яе заснаваць епархію ў Магілёве і залежаць ёй ад Кіеўскага мітрапаліта. Тады ж для пражывання мясцовым праваслаўным епіскапам прызначаны Спаскі манастыр і вызначана мець з каралеўскай казны па 2 тысячы польскіх злотых гадавой рэнты. Архірэі спярша называліся Магілёўскімі, Мсціслаўскімі і Аршанскімі, а з 1675 г. калі-нікалі і Беларускімі. Гэты тытул ужыты як у трактатах аб Вечным міры, што заключаны паміж Расіяй і Польшчай у 1686 г., так і ў многіх каралеўскіх прывілеях; потым з 1795 г. загадана ім называцца Магілёўскімі і Полацкімі, а з 1797 г. — Беларускімі і Магілёўскімі, нарэшце, з 1803 г. тытулуюцца яны Магілёўскімі і Віцебскімі. Імянным высачайшым загадам ад 1 лютага 1774 г. гэтая епархія залічана да другарадных з пажалаваннем акладу адпаведна Пскоўскага Архерэйскага дома і, згодна штату 1799 г., стаіць у другім класе дзесятай.

Магілёўскія епіскапы

Іосіф I Бобрыкавіч, епіскап Магілёўскі. Абраны свецкімі чынамі праваслаўнай веры з ігумена або старэйшага віленскага Святадухава манастыра і зацверджаны прывілеем караля Уладзіслава IV, дадзеным 14.3.1633 г. Памёр 9.4.1635 г.

Сільвестр I Косаў, епіскап Магілёўскі. Абраны з прэфектаў Кіеўскай духоўнай акадэміі ў 1635 г. У 1647 г. прывілеем караля Яна Казіміра пераведзены на Кіеўскую мітраполію. У 1635 г. выдаў на польскай мове «Пацярык Пячэрскі». У 1653 г. ў Куцеінскім манастыры надрукавана яго «Дидаскалия або наука, которая ся первей из уст Священников подавала о седми сакраментах или тайнах на Синоде поместном ва граде Могилёве 1637 г.».

Іосіф II Кананові-Гарбацкі, епіскап Магілёўскі. Абраны з ігумена Міхайлаўскага Златаверхага манастыра і рэктара Кіеўскай духоўнай акадэміі і зацверджаны прывілеем караля Яна Казіміра 2.5.1651 г.

Мяфодзій Філімонавіч, епіскап Магілёўскі. Абраны ў 1654 або 1655 г., верагодна, у Маскве, бо ў гэты час Магілёў перайшоў пад уладу цара Аляксея Міхайлавіча. У 1668 г. ўжо ў Нежыне ён здрадзіў або зрабіў нейкае злачынства супраць цара, за што ўтрымліваўся пад аховай у маскоўскім Наваспаскім манастыры, дзе і памёр.

Іосіф III Нелюбовіч-Тукальскі, епіскап Магілёўскі. Абраны з архімандрыта Ляшчынскага манастыра і зацверджаны прывілеем караля Яна Казіміра 3.8.1661 г У 1664 г ён абраны ў Кіеў мітрапалітам. Памёр у 1675 г.

Феадосій Васілевіч, епіскап Магілёўскі. Абраны з архімандрыта Слуцкага манастыра ў епіскапы ў 1669 г., зацверджаны прывілеем караля Міхала Карыбута-Вішнявецкага толькі 20.4.1672 г. Памёр 11.3.1678 г. ў г. Любліне.

Серапіён, або Серафім Палхоўскі, епіскап Магілёўскі. Абраны з архімандрыта Слуцкага манастыра і зацверджаны ў сане епіскапа прывілеем караля Аўгуста II 30.9.1697 г. Памёр у лютым 1704 г. ў Магілёве.

Сільвестр II, або Святаполк князь Чацвярцінскі, епіскап Магілёўскі прыкладна з 1715—16 гг. Ён цярпеў у Магілёве моцныя ганенні ад супраціўнікаў праваслаўя. Памёр у 1727 г. ў Магілёве.

Арсеній Бярло, епіскап Магілёўскі. Абраны ў 1728 г. Праз два гады кароль Аўгуст II маніфестам 29.7.1730 г. забараніў называць яго епіскапам. Таму Арсеній вымушаны быў у 1731 г. пакінуць Магілёў. У Расіі ў студзені 1733 г. ён атрымаў у кіраванне Пераяслаўскую епіскапію, дзе і памёр.

Іосіф IV Валчанскі, епіскап Магілёўскі. Пасвячоны ў епіскапы прывілеем караля Аўгуста III, 30.12.1735 г. У 1742 г. пераведзены архіепіскапам у Маскву, дзе і памёр. Пахаваны ў Чудавым манастыры.

Іераніім Валчанскі, епіскап Магілёўскі. Родны брат Іосіфа IV Валчанскага. Пасвячоны ў епіскапы з ігумена або старэйшага віленскага Святадухава манастыра 2.10.1744 г. Кіраваў паствай да 1754 г Памёр 17.10.1754 г. ў Магілёве.

Георгій Каніскі (глядзі асобны артыкул).

Афанасій Вальхоўскі, епіскап Магілёўскі. Пераведзены ў Магілёў з вікарыя Наўгародскай мітраполіі, епіскапа Старарускага 5.3.1795 г. 27.8.1797 г. звольнены на пакой у Лубенскі Мгарскі манастыр, дзе 1.1.1801 г. памёр.

Анастасій Братаноўскі (Андрэй Сямёнавіч Раманенка-Братаноўскі), нарадзіўся 16.10.1761 г. ў Палтаўскай губерні, епіскап Магілёўскі і Полацкі з 21.10.1797 г., пазней — епіскап Беларускі і Магілёўскі. Шмат часу аддаваў літаратурным заняткам. Выдаў павучэнні, некалькі багаслоўскіх пераводаў з французскай мовы.

Варлаам Шышацкі (Рыгор Шышацкі), нарадзіўся ў 1750 г. ў Чарнігаўскай губерні, епіскап Магілёўскі з 20.12.1805 г. 23.3.1808 г. пажалаваны архіепіскапам. У 1813 г. зняты з пасады Указам Свяшчэннага сінода і быў асуджаны Чарнігаўскай кансісторыяй за тое, што ў час знаходжання ў Расіі французаў патрабаваў ад падначаленага духавенства і вернікаў прысягаць у вернасці Напалеону. Пазбаўлены архірэйства і свяшчэнства і сасланы ў Наўгарод-Северскі манастыр, дзе памёр у верасні 1821 г.

Данііл Мадданскі, Натток-Міхайлоўскі, нарадзіўся на Украіне, епіскап Магілёўскі з 10.9.1813 г. Скончыў Кіеўскую духоўную акадэмію. Да прызначэння ў Магілёў быў ігуменам шэрагу манастыроў, меў сан архімандрыта. 6.7.1813 г. пераведзены на Магілёўскую кафедру і 9.3.1816 г. пажалаваны архіепіскапам. Памёр 31.5.1821 г. ў Магілёве.

Іоасаф Срэценскі (Іаан Іаанавіч Срэценскі), нарадзіўся ў 1768 г. ў г. Кашын, епіскап Магілёўскі з 1821 г. Скончыў Цвярскую духоўную семінарыю, Аляксандра-Неўскую

акадэмію. Быў ігуменам шэрагу манастыроў. Памёр 1.3.1827 г. ў Магілёве.

Павел Мораў (Пётр Аляксеевіч Мораў), нарадзіўся ў 1779 г. ў Архангельскай губерні, епіскап Магілёўскі з 19.3.1827 г. Скончыў Архангельскую семінарыю. Абраны з ігумена Карэльскага манастыра. У жніўні 1831 г. быў пасвячоны ў сан архіепіскапа і пераведзены ў Табольскую епархію. Памёр 18.12.1831 г.

Гаўрыіл Гарадкоў (Георгій Іванавіч Гарадкоў), нарадзіўся 17.4.1785 г. ў в. Гарадковічы Разанскай губерні, епіскап Магілёўскі з 26.8.1831 г. да 1837 г. Скончыў Разанскую семінарыю і Санкт-Пецярбургскую духоўную акадэмію. Выдаў шэраг багаслоўскіх прац. Памёр 7.4.1862 г. ў Разані.

Смарагд (Аляксандр Крыжаноўскі), нарадзіўся 9.3.1796 г. ў Кіеўскай губерні, епіскап Магілёўскі з 1837 г. да 1840 г. Скончыў Санкт-Пецярбургскую духоўную акадэмію. У Магілёў пераведзены з Полацкай епархіі, з Магілёва — у Харкаўскую, пасля Астраханскую, Арлоўскую і Разанскую епархіі. Памёр 11.11.1863 г.

Ісідор (Іакаў Сяргеевіч Нікольскі), нарадзіўся 1.10.1799 г. ў Тульскай губерні, епіскап Магілёўскі з 6.4.1840 г. да 12.11.1843 г. Скончыў Тульскую семінарыю і Санкт-Пецярбургскую духоўную акадэмію. З 1843 г. працаваў у Карталінскай і Кахецінскай епархіях, быў мітрапалітам Кіеўскім і Наўгародскім, членам Свяшчэннага сінода. Памёр 7.9.1892 г.

Анатоль (Аўгусцін Васілевіч Мартыноўскі), нарадзіўся ў 1793 г. ў Падольскай губерні, епіскап Магілёўскі з 22.11.1843 г. да 17.7.1860 г. Скончыў Камянецкую семінарыю і Кіеўскую духоўную акадэмію. Да прызначэння ў Магілёў узначальваў Екацярынбургскую і Пермскую епархіі. Памёр 8.8.1872 г. ў Гербавіцкім манастыры ў Бесарабіі.

Яўсевій (Еўдакім Палікарпавіч Арлінскі), нарадзіўся 21.12.1806 г. ў Тульскай губерні, епіскап Магілёўскі з 29.1.1861 г. да 21.2.1883 г. Скончыў Тульскую семінарыю і Маскоўскую духоўную акадэмію. Да прызначэння ў Магілёў быў епіскапам Вінніцкім, вікарыем Падольскай епархіі і інш. Памёр 21.2.1883 г. ў Магілёве.

Віталь (Васіль Васілевіч Грэгулевіч), нарадзіўся 1.1.1829 г. ў Падольскай губерні, епіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі з 1883 г. Скончыў Санкт-Пецярбургскую духоўную акадэмію. Да прызначэння ў Магілёў быў епіскапам Астраханскім і вікарыем Валынскай епархіі. Памёр 14.5.1885 г. ў Магілёве.

Сергій (Іван Спаскі), нарадзіўся 21.5.1830 г. ў Кастрамской губерні, епіскап Магілёўскі. Скончыў Кастрамскую семінарыю і Кіеўскую духоўную акадэмію. Памёр 20.11.1904 г. ў Магілёве.

Ірыней (Харысім Міхайлавіч Арда), нарадзіўся ў 1835 г. ў Палтаўскай губерні, епіскап Магілёўскі з 19.12.1892 г. Скончыў Кіеўскую духоўную акадэмію. З 1888 г. епіскап Уманскі. У Магілёве працаваў 7 месяцаў, пасля накіраваны ў г. Тулу, Падольск, Екацярынбург, Арол. Памёр у 1902 г.

Яўген (Мікалай Шэршылаў), нарадзіўся 13.4.1826 г. ў г. Чарнігаў, епіскап Магілёўскі ў 1893—1896 гг. Скончыў Чарнігаўскую семінарыю і Кіеўскую духоўную акадэмію. Да прызначэння ў Магілёў выкладаў у Кіеўскай семінарыі, быў епіскапам Брэсцкім і Бабруйскім, Мінскім і Бабруйскім, Астраханскім і Стаўрапольскім. У 1896 г вызвалены ад пасады ў сувязі з цяжкай хваробай. Памёр 23.3.1897 г.

Місаіл (Міхаіл Іванавіч Крылоў), нарадзіўся ў 1837 г. ў г. Ноўгарад, епіскап Магілёўскі з 10.8.1896 г. да 29.4.1904 г. Скончыў Наўгародскую семінарыю і Санкт-Пецярбургскую духоўную акадэмію. Да прызначэння ў Магілёў узначальваў Арлоўскую епархію. Пасля звальнення з Магілёўскай епархіі працаваў у Маскоўскім Сіманавым манастыры.

Стэфан (Мікалай Паўлавіч Архангельскі), нарадзіўся ў г. Пенза, епіскап Магілёўскі з 29.4.1904 г. да 1911 г. Скончыў Казанскую духоўную акадэмію, з 1902 г. епіскап Сумскі, вікарый Харкаўскі.

Канстанцін Булычоў, епіскап Магілёўскі ў 1911—1919 гг. Да прызначэння ў Магілёў быў епіскапам Самарскім.

У маі 1924 г. на чале са Свяшчэнным сінодам і мітрапалітам Магілёўскім і Беларускім на 1-м Беларускім абласным царкоўным саборы ў Магілёве была ўтворана Беларуская аўтаномная праваслаўная царква — аб'яднанне беларускіх епархій абнаўленчай царквы. У 1937 г. Магілёўская епархія аб'яднана з Мінскай. У сакавіку 1942 г. епіскапам Магілёўскім і Мсціслаўскім быў прызначаны **Філафей**. Пасля вайны епархія зноў была ліквідавана. Адноўлена ў 1989 г. У епархіі было 26 цэркваў, у 1995 г. — 50. З 1989 г. на Магілёўскай епархіі архіепіскап **Максім**.

***

Пётр Сімяонавіч Магіла Праваслаўны царкоўны і культурны дзеяч Рэчы Паспалітай. Нарадзіўся 10.1.1597 г. ў Малдавіі ў сям'і гаспадара (князя) Валахіі і Малдавіі. Адукацыю атрымаў у Львоўскай брацкай школе. У 1625 г. пастрыгся ў манахі, а ў 1627 г. стаў архімандрытам Кіева-Пячэрскага манастыра. Дамогся ад каралеўскай улады дазволу на аднаўленне Кіеўскай мітраполіі з цэнтрам у Кіеве. У 1632—47 гг. мітрапаліт кіеўскі, галіцкі і ўсяе Русі. Заснаваў Кіева-Магілянскі калегіум (1632), які названы ў яго гонар. Выражаў інтарэсы вярхоў праваслаўнага духавенства і шляхты Украіны і Беларусі, выступаў супраць Брэсцкай уніі 1569 г. У 1632 г. заснаваў Магілёўскую праваслаўную епархію. Садзейнічаў пашырэнню асветы і друкарства на Украіне, Беларусі, Малдавіі. Непасрэдна кіраваў Віленскім, Слуцкім, Магілёўскім і Аршанскім брацтвамі з манастырамі. У 1635 г. наведаў Вільню, Мінск, Магілёў і іншыя беларускія гарады. Аўтар кніг, якія выкарыстоўваліся як падручнікі ў духоўных навучальных установах да пачатку 20 ст., — «Евангелле вучыцельнае» (1616), «Анфалагіон» (1636), «Еўхалагіон», шматлікіх палемічных пропаведзей і інш. Памёр П.С.Магіла 11.1.1647 г. ў Кіеве.

За веравызнанне змагаліся

Прадстаўнікам розных народаў уласцівы розныя ўяўленні пра Бога. Даволі зразумелае жаданне назаўсёды захаваць сваю веру не раз станавілася прычынай сур'ёзных канфліктаў паміж рознымі групамі насельніцтва. Ужо ў 1358 г., калі землі Мсціслаўскага княства перайшлі ў валоданне вялікага князя літоўскага Альгерда, вядомы выпадкі сутычак вернікаў праваслаўя і каталіцызму. Праваслаўныя агітавалі католікаў да вераадступніцтва, католікі — праваслаўных. А уніяты, якіх падтрымлівала каралеўская ўлада Рэчы Паспалітай, дазвалялі сабе не толькі меры перакананне вернікаў (што было галоўным у дзейнасці Магілёўскіх епіскапаў), а грубае ўмяшанне ў духоўнае, сацыяльнае і эканамічнае жыццё магіляўчан. Вялікі князь М.Корбут-Вішнявецкі 8 гадоў не даваў прывілея Магілёўскаму епіскапу Феадосію Васілевічу, які абвінавачваўся ў нелаяльнасці да каталіцызму. Па той жа прычыне кароль Аўгуст II забараніў (1728) называць епіскапам Магілёўскім Арсенія Бярло. А вось для епіскапаў Сільвестра II і Георгія Каніскага службовыя асобы каталіцкага веравызнання стварылі зусім невыносныя ўмовы, пагражалі забойствам, рабілі спробы забойства. У выніку першы павінен быў збегчы з Магілёва ў Маскву.

Не без ведамі магілёўскіх каралеўскіх старостаў справы даходзілі да больш жорсткіх мер уздзеяння на праваслаўных магіляўчан. Напрыклад, у 1617 г. ўладар Любужскага маёнтка уніят Зяньковіч са сваёй дружынай на конях уварваўся на Гандлёвую плошчу і пачаў граміць крамы праваслаўных гандляроў, біць іх, патрабуючы пераходу ва уніяцтва. Аднак праваслаўныя магіляўчане не спалохаліся: перабілі дружыннікаў разам з іх гаспадаром, труп якога кінулі ў Дняпро.

Праз год з гэтай жа мэтай у Магілёў накіроўваецца полацкі уніяцкі архіепіскап І.Кунцэвіч, якога, пагражаючы забойствам, магіляўчане не пусцілі ў горад. У 1633 г. праваслаўныя магіляўчане з дапамогай сілы выгналі з горада ўсіх уніяцкіх манахаў, якія агітавалі праваслаўных да пераходу ва уніяты. Многія манахі былі вельмі скалечаны. Гэтае «свавольства» дорага каштавала магіляўчанам. За ўсе вышэй названыя ўчынкі яны былі абавязаны сабраць вялікую суму грошай і пабудаваць касцёл Ушэсця (св. Станіслава). У якасці пакарання ў Магілёве забаранялася дзейнасць усіх цэркваў.

Нягледзячы на гэтыя меры, магіляўчане ўпарта трымаліся сваёй веры. Колькасць жыхароў Магілёва каталіцкага веравызнання ніколі не перавышала колькасць вернікаў праваслаўя. У 18 ст. насельніцтва горада стала хутка расці за кошт павелічэння прытоку яўрэяў. У 1904 г., напрыклад, іх колькасць склала больш за 27 тыс. чалавек (з 55,5 тыс. чалавек усяго насельніцтва). Яўрэі падчас цярпелі ганенні як ад праваслаўных, так і ад католікаў. Але яны ўпэўнена трымаліся і нават займалі вядучыя пазіцыі ў гарадскім рамястве, гандлі, прамысловасці. *Т.Шчарбакова.*

Яўрэі ў Магілёве

У Магілёве яўрэі з'явіліся ў 16 ст., але ўжо ў пачатку 17 ст. паводле каралеўскіх грамат ім забаранялася сяліцца ў горадзе (1626, 1633), а гараджанам здаваць для іх у наём будынкі (1646). На старонках Магілёўскай хронікі заўважаліся яўна негатыўныя адносіны да яўрэяў, даваўся пералік тых злодзействаў, якія нібы ўчынілі яны ў Магілёве.

Адзін з пунктаў даравальнай граматы цара Аляксея Міхайлавіча (1654) абвяшчаў высяленне яўрэяў з Магілёва. Шляхціц К.Паклонскі быццам бы з мэтай аховы сабраў іх і вывеў з горада. Як сведчыць Хроніка «большасць жыдоў сабралася з рэчамі і грашамі, самыя каштоўныя з якіх былі захаваны ў адзенне, дзявочыя валасы і хлеб, але калі яны зайшлі за Пячэрск, Паклонскі загадаў іх перабіць, у выніку чаго было забрана шмат каштоўнасцей і іншых рэчаў...»

Аднак шэраг каралеўскіх прывілеяў як для асобных яўрэяў, так і кагалу забяспечвалі недатыкальнасць іх асоб і маёмасці, пэўную свабоду руху і заняткаў гандлёвымі справамі і рамесніцтвам. У адным з артыкулаў Статута Вялікага княства Літоўскага прадугледжвалася пакаранне смерцю за забойства яўрэя, а за рану ці пабоі плаціла, як шляхціцу. Каралеўская грамата ў Магілёве за 23.6.1626 г. дазваляла адводзіць яўрэям зямлю за замкам для будаўніцтва дамоў, крам, ставіць піваварні і лазні, але толькі на той вуліцы, дзе ёсць іх малітоўная школа (цяпер раён вуліц Вялікай і Малой Грамадзянскай). Ад іудзейскай школы гэта месца пазней атрымала назву Школішча, якое з'яўляецца сапраўдным гістарычным мікратапонімам Магілёва.

На былым Пакроўскім пасадзе знаходзіўся цэлы комплекс сінагог, у тым ліку адна са старэйшых драўляных сінагог (канца 17 — пачатку 18 ст.), якая была размалявана ў 18 ст. мастаком Айзікам Сегалам са Слуцка і з'яўлялася цудоўным помнікам драўлянага дойлідства і мастацтва перыяду барока. Цяпер там мураваны і атынкаваны будынак сінагогі 19 ст. (на рагу вул. Вялікай Грамадзянскай і Дняпроўскай набярэжнай).

Да канца 18 — пачатку 19 ст. можна аднесці крыху перабудаваны корпус сінагогі па вул. К.Лібкнехта, 21 (былой Паштовай). Галоўны фасад будынка прарэзаны 5 высокімі паўцыркульнымі вокнамі з прафіляванымі абрамленнямі, паміж якімі гарызантальная рустоўка з прафіляванымі паскамі, уверсе моцна выступае трохвугольны франтон з паўкруглым праёмам у цэнтры.

Цікавым помнікам з'яўляецца і будынак былой харальнай (галоўнай) сінагогі Цукермана, дзе цяпер зал спартыўнай гімнастыкі (вул. Ленінская, 25). Спачатку ён быў пабудаваны як палац каталіцкага архібіскупа С.Богуша-Сестранцэвіча, але пасля паўстання 1831 г. беларуская магілёўская каталіцкая епархія была зачынена і прымусова пераведзена ў Пецярбург. Будынак перадалі гораду. Там размясціліся казначэйства і іншыя службы. Без сапраўднага гаспадара будынак хутка прыйшоў у заняпад. У канцы 1850-х гадоў ганаровы грамадзянін горада Цукерман, які, як сведчаць дакументы, нажыўся на пастаўках лесу ў час Крымскай вайны, выкупіў будынак і пераабсталяваў яго пад сінагогу.

Пасля правядзення Кацярынай II у 1791 г. мяжы аселасці (Віцебск—Мсціслаў—Гомель) пачалося інтэнсіўнае павелічэнне яўрэйскага насельніцтва на Беларусі, у прыватнасці ў Магілёве. Калі ў 1783 г. ў горадзе жыло каля 7 тысяч хрысціян і 2,5 тысячы іудзеяў, то ў 1867 г. хрысціян было каля 13 тысяч, іудзеяў каля 22 тысяч. Большасць мураваных дамоў у Магілёве ў мінулым стагоддзі належала яўрэям.

У пачатку 20 ст. ў горадзе было каля 30 сінагог і малітоўных дамоў. Адна з прыгажэйшых сінагог у неараманскім стылі з чырвонай цэглы стаяла справа за мостам цераз Дубравенку на Віленскай вул. (цяпер вул. Лазарэнкі). Яна не захавалася да сённяшняга дня (разбурана катастрафічнай паводкай 1942 г.), але падобны будынак і цяпер існуе ў Бабруйску. Трэба адзначыць, што яўрэі Магілёва стварылі цудоўныя помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры, якія з'яўляюцца добрым укладам у беларускую і агульнасусветную гісторыю і культуру.

З.Яцкевіч.

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Паводле 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772), Магілёў увайшоў у склад Расіі і быў цэнтрам Магілёўскай правінцыі (да 1775) і Магілёўскай губерні, з 1778 г. — Магілёўскага намесніцтва, з 1796 г. — павета Беларускай, з 1802 г. — Магілёўскай губерняў. Пасля далучэння да Расіі рэарганізавана гарадское самакіраванне; у 1775 г. Магілёў пазбаўлены магдэбургскага права, а ў адпаведнасці з Даравальнай граматай гарадам 1785 г. для кіраўніцтва гаспадарчым жыццём з прадстаўнікоў гарадскіх саслоўяў пачала выбірацца дума. Былі ліквідаваны юрыдыкі. Купецтва, якое аб'ядналася ў гільдыі, атрымала шэраг прывілеяў.

У 1781 г. зацверджаны новы герб «Пагоня» на чырвоным полі ў спалучэнні з верхняй палавінай двухгаловага арла — герба Расійскай імперыі. У канцы 18 ст. ў Магілёве 22 вуліцы, 32 завулкі, 2 тысячы дамоў; у 1783—84 гг. працавалі 33 прамысловыя прадпрыемствы, у тым ліку 22 гарбарныя, 7 броварaў, 2 цагельныя заводы, 2 вадзяныя млыны. У 1780 г. тут было 748 майстраў-рамеснікаў: слесараў, кавалёў, меднікаў, залатых спраў майстроў, гарбароў (жылі пераважна ў задняпроўскай частцы горада — Лупалаве), шаўцоў, сёдзельнікаў, краўцоў, хлебнікаў, мяснікоў, цесляроў, сталяроў, цагельнікаў і інш. У 1785 г. ў горадзе было 479 купцоў, больш за 240 крамаў, праводзіліся 3 таргі на тыдзень. Павелічэнню аб'ёму гандлю з Масквой, Рыгай, Пецярбургам, Кіевам і іншымі гарадамі спрыяў тракт Пецярбург—Кіеў праз Магілёў, ажыўленне суднаходства па Дняпры пасля пабудовы Бярэзінскага канала (1797—1805), які злучыў басейны Дняпра і Заходняй Дзвіны.

У Магілёве знаходзіліся рэзідэнцыі праваслаўнага і каталіцкага архіепіскапаў Г.Каніскага (з 1775) і С.Богуша-Сестранцэвіча (з 1782). У рэзідэнцыі апошняга працавала друкарня, што існавала ў 1774—1844 гг. У 1776 г. друкаванне вялося на рускай мове грамадзянскім шрыфтам. Паводле ўказа Кацярыны II ад 5.6.1780 г. друкарня павінна была друкаваць афіцыйныя матэрыялы, выконваючы функцыі губернскай. Вядома 60 назваў выдадзеных кніг, у тым ліку 43 на польскай, 12 на лацінскай, 8 на рускай, па адной на французскай і нямецкай мовах. Сярод іх падручнікі «Кароткая французская граматыка» (1784, 1796), вучэбныя праграмы, даведачная літаратура — «Каляндар беларускіх намесніц-



Герб Магілёва. 1781 г.



Магілёў у канцы 18 — пачатку 19 ст. Шклоўскі рынак (цяпер Камсамольскі сквер, вуліца Першамайская).

тваў на 1783 г.» (1782), «Беларускія календары» (1784—95), «Дырэкторыумы» (царкоўныя календары са спісамі парафій і службовых асоб Магілёўскай епархіі; святочныя малітвы, традыцыйныя астранамічныя звесткі, 1807—44), «Каталогі...» (спісы каталіцкага духавенства Расіі, 1784—1802), афіцыйныя выданні — «Трактат вечнага міру і дружбы» (1792), «Установы для кіравання губерняў» (1774, 1777, 1795), навуковыя працы — «Кароткія нататкі пра некаторыя азіяцкія дзяржавы» (1791) В.Галынскага, «Пра Заходнюю Русь» (1793) і «Пра паходжанне сарматаў і славян» (1810) Богуша-Сестранцэвіча, трактат «Тры кнігі пра паэтычнае майстэрства» (1786) Ф.Пракаповіча і інш., мастацкія творы — трагедыя «Гіцыя ў Таўрыдзе» (1783), пропаведзі, прамовы і панегерычныя вершы Богуша-Сестранцэвіча, пераклад на польскую мову А.Голанда «Гісторыі Сіндбада-Марахода» і інш. У Магілёўскай друкарні быў выкарыстаны грамадзянскі шрыфт, які паклаў пачатак грамадзянскаму кнігадрукаванню на Беларусі.

У час Айчыннай вайны 1812 г. французскія войскі маршала Даву 8(20) ліпеня падышлі да Магілёва. У распараджэнні магілёўскага губернатара Д.А.Талстога, які спрабаваў да падыходу арміі Багратыёна арганізаваць абарону горада, былі атрад палкоўніка А.І.Грэсера (каля 400 чалавек) і батальён унутранай аховы (200—300 чалавек), які адступіў з-пад Барысава і не быў прызначаны да ваенных дзеянняў. Гэтыя невялікія сілы размясціліся на заходняй ускраіне горада на Віленскім полі пад прыкрыццём земляного вала. Першая атака французскіх конных егераў была адбіта, аднак пасля прыбыцця пяхоты праціўніка барацьба стала няроўнай. Частка французскай пяхоты рушыла ў абход правага фланга абаронцаў горада да Шклоўскай брамы, а другая пайшла ў штыкавую атаку. Салдаты магілёўскага батальёна пачалі арганізаванае адступленне на поўдзень, абходзячы цэнтр горада. Калі прайшлі Быхаўскую заставу, праз Буйнічы адышлі да в. Дашкаўка. У баі за Магілёў страты рускіх (разам з забітымі і параненымі) склалі 40—50 чалавек, 200 чалавек трапілі ў палон. 8(20).7.1812 г. французы ўступілі ў горад, перабілі варту і захапілі мост цераз Дняпро, прадуктовы склад, вялікую колькасць коней і буйной рагатай жывёлы.

Напярэдадні, 7(19) ліпеня, Багратыён адправіў з Бабруйска на Магілёў 7-ы пяхотны корпус (камандзір генерал-лейтэнант М.М.Раеўскі) і частку 4-га кавалерыйскага корпуса (камандзір генерал-маёр К.К.Сіверс), 8(20) ліпеня ў тым жа напрамку рухаўся 8-ы пяхотны корпус (камандзір генерал-лейтэнант М.М.Бараздзін) з часцямі кавалерыі Сіверса, якія прымкнулі да яго. На маршы армія расцягнулася. 9(21) ліпеня, калі асноўныя сілы войск Раеўскага знаходзіліся пад Старым Быхавам, казацкі полк з 2 тысяч чалавек (камандзір палкоўнік Сысоеў), што наступаў у авангардзе конніцы Сіверса, наблізіўся да Магілёва. Сысоеў, які даведаўся пра адступленне з горада атрада Грэсера і ўступленне туды французскіх войск, пасля падыходу яшчэ 2 казацкіх і 2 драгунскіх палкоў працягваў рух наперад. За 6 км ад Магілёва рускі авангард сустрэўся з высланым на Старабыхаўскі шлях 3-м конна-егерскім палком корпуса Даву. Адбылася перастрэлка, у якой казакі акружылі конных егераў і нанеслі ім цяжкія страты: каля 500 чалавек было забіта, больш за 200 трапіла ў палон, астатнія кінуліся наўцёкі. У час праследавання праціўніка казацкі авангард Сысоева быў спыне-



Земляны вал і Алейная брама ў Магілёве. З акварэлі І.Пешкі. 18 ст.

ны каля в. Буйнічы агнём французскай артылерыі. Баграціён вырашыў атакаваць праціўніка сіламі корпуса Раеўскага і авалодаць Магілёвам, дзе была пастаянная пераправа цераз Дняпро, а ў выпадку няўдачы арганізаваць пераправу каля Новага Быхава. І хоць 11(23).7.1812 г. ў бітве каля в. Салтанаўка рускія войскі з вялікімі для сябе стратамі зніштчылі полк кавалерыі праціўніка, аднак прабіцца да Магілёва не здолелі.

У Магілёве французскія захопнікі ўстанавілі жорсткі акупацыйны рэжым. Паводле загаду маршала Даву (магілёўскага ваеннага губернатара) была створана часовая камісія для кіравання губерняй, у якую ўвайшлі мясцовыя апалячаныя памешчыкі і чыноўнікі (так званая камісія «польскага кіравання»). На камісію ўскладалася задача падтрымкі парадку збору і дастаўкі ў французскую армію правіянту і фуражу. У паветах ствараліся павятовыя камісіі. 11(23) ліпеня ў выступленні перад чыноўнікамі і шляхтай Магілёва Даву аб'явіў, што сяляне па-ранейшаму будуць падпарадкоўвацца сваім памешчыкам, і запрасіў для французскай арміі «тры рэчы: хлеба, хлеба, хлеба». Асноўная маса беларускага апалячанага дваранства, якая была незадаволена разбурэннем і рабаўніцтвам маёнткаў, патрабаваннямі абавязковых паставак, стрымана аднеслася да французскіх ваенных улад. 21 ліпеня (2 жніўня) акупанты пад пагрозай зброі прымусілі жыхароў Магілёва даць прысягу Напалеону. 28 ліпеня (9 жніўня) пасля таго, як корпус Даву пакінуў горад, прызначаны на пасаду ваеннага губернатара генерал Ю.Панятоўскі арганізаваў Магілёўскую канфедэрацыю шляхты, якая прапанавала далучыць Беларусь да Польшчы.

У пачатку жніўня 1812 г. быў зацверджаны новы адміністрацыйны парадак, створана Магілёўская грамадзянска-ваенная камісія на чале з Галынскім. Губерня перайменавана ў дэпартамент, паветы — у прэфектуры. Мэрам Магілёва стаў падкаморы Венцлавовіч, у паветах з мясцовага дваранства прызначаны падпрэфекты. Акупацыйныя ўлады зрабілі спробу правесці камплектаванне ўзброеных сіл. Паводле загаду Напалеона ў кожным павеце ствараліся атрады так званай «нацыянальнай гвардыі» і жандармерыі, але яны вылучаліся нізкімі баявымі якасцямі і слабай дысцыплінай. Сяляне і рамеснікі, якія былі мабілізаваны ў «нацыянальную гвардыю», хутка разбягліся. Рэкруцкі набор у корпус Панятоўскага на тэрыторыі Магілёўскай губерні таксама пацярпеў правал.

У пачатку лістапада 1812 г. галоўныя сілы французскай арміі пасля паражэнняў у Расіі адступілі са Смаленска праз Оршу да Бярэзіны. Рускія войскі, якія праследавалі праціўніка, рухаліся на поўдзень праз Горкі і Копысь. Каб перарваць сувязі непрыяцеля з Магілёвам, дзе была буйная прадуктовая база французаў, галоўнакамандуючы рускай арміяй М.І.Кутузаў загадаў атраду падпалкоўніка Давыдава і калужскаму апалчэнню генерал-лейтэнанта Шэпелева выйсці да горада з паўночнага і паўднёвага бакоў, а атраду генерал-лейтэнанта Гудовіча пасля пераправы цераз Дняпро рухацца ў напрамку Бялыніч. Непасрэдна для заняцця Магілёва вылучаны атрад генерал-лейтэнанта А.П.Ажароўскага. Калі ён даведаўся пра намер французаў спаліць Магілёў, то паскорыў прасоўванне атрада і ўвечары 12(24).11.1812 г. авалодаў горадам. У якасці трафеяў захоплены армейскія магазіны з вялікім запасам прадуктаў і фуражу. Пасля вызвалення Магілёва атрад Ажароўскага быў накіраваны ў бок Бярэзіны для праследавання праціўніка. У Магілёве для аховы вайсковых складоў і палонных французаў засталося калужскае апалчэнне генерала Шэпелева. Сюды, як у адзін з неразбураных гарадоў, адводзіліся на адпачынак рускія войскі.

У 1825 г. ў Магілёве пражывалі 5675 мужчын і 5957 жанчын. 51 мураваны і 1506 драўляных дамоў, 18 цэркваў, 5 кляштараў, 7 навучальных і 9 богаўгодных устаноў, 81 фабрыка і завод, 260 крам, карчма, 150 піцейных дамоў, 8 лазняў і 117 садоў. З Магілёвам была звязана дзейнасць многіх рэвалюцыянераў-дзекабрыстаў. На будынках горада, звязаных з імёнамі дзекабрыстаў, устаноўлены мемарыяльныя дошкі. Працуе музей дзекабрыстаў.

Напярэдадні сялянскай рэформы 1861 г. Магілёў — адзін з буйнейшых гарадоў Беларусі. Насельніцтва, паводле перапісу 1841 г., складала 19 669 жыхароў, з іх 11 064 мужчыны і 8065 жанчын. Кожны трэці будынак у ім быў мураваны (740 з 2259). У горадзе былі 44 манахі і манастырскія служкі, 161 святар і царкоўны служка, 3 генералы, 157 штабс-афіцэраў і обер афіцэраў, 1689 ніжніх ваенных чыноў, з 392 служачых гарадскіх ведамстваў 194 былі жанчыны, 36 акцёраў і тэатральных служачых, 77 купцоў, 417 сялян, 54 замежныя і 2 ганаровыя грамадзяніны. У гарадской

турме ўтрымліваліся 1841 мужчына і 81 жанчына. Вуліц было 24, у тым ліку 9 брукаваных, 1 грамадскі і 241 прыватны сад, 1979 агародаў.

У 1854 г. працавалі 27 цагельных заводаў, 4 мукамольна-крупадзёрныя прадпрыемствы, лесапілка, 34 невялікія маслабойні, развівалася ганчарная, піваварная, суконная, табачная і іншыя галіны вытворчасці. У 1841 г. пабудаваны адзін з першых на Беларусі мукамольны завод, дзе пераважала наёмная праца; прадпрыемства мела паравы рухавік, ад якога працавала лесапільня. У горадзе на той час было каля 2500 рамеснікаў, 189 саматужных прадпрыемстваў (1859), з іх больш за 100 гарбарных, дзе занята было каля 1000 чалавек. Існавалі мужчынская гімназія (з 1809), павятовае і прыходскае вучылішчы і 3 прыватныя жаночыя школы. У 1833 г. адкрыта першая публічная бібліятэка (60 кніг). У 1838 г. пачала выходзіць газета «Могилёвские губернские ведомости». Але на развіццё горада ў перадрэформенныя дзесяцігоддзі адмоўна ўплываў крызіс прыгонніцтва. Працоўнае насельніцтва жыло ў галечы і антысанітарыі. У 1847 г. колькасць памершых перавысіла колькасць народжаных на 396 чалавек, у 1855 г. — на 261. Аднак несельніцтва горада павялічвалася за кошт прытоку з навакольных вёсак і мястэчак.

Паўстанне 1863—64 гг. у Польшчы, Беларусі і Літве абышло Магілёў, але зрабіла пэўны ўплыў на Магілёўшчыну. Непадалёку ад горада размяшчалася 3-я зводная рэзервовая артылерыйская брыгада, а ў яе падраздзяленнях створана ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя. Члены яе (А.В.Алендскі, браты М.А. і І.А.Манцэвічы) у красавіку 1863 г. сфарміравалі Чарнаруцкі паўстанцкі атрад, які дзейнічаў на тэрыторыі Магілёўшчыны. 6.6.1863 г. ў Магілёве ўлады расстралялі 4 афіцэраў, у тым ліку і братоў Манцэвічаў, якія змагаліся на баку паўстанцаў. Падтрымліваў паўстанне старшыня палаты крымінальнага суда ў Магілёве, прадстаўнік старажытнага шляхецкага роду Ігнацій Валовіч, за што і быў высланы ў чэрвені 1864 г. ў Енісейскую губерню, дзе і памёр.

Пасля адмены ў 1861 г. прыгонніцтва паскорылася эканамічнае развіццё Магілёва, ажывіліся прамысловасць і гандаль. У 1885 г. ў горадзе 124 прадпрыемствы (270 рабочых, гадавы аб'ём прадукцыі 319 тысяч рублёў), у 1900 — 220 (790 рабочых, гадавы аб'ём прадукцыі 1098 тысяч рублёў). Па аб'ёме прадукцыі пераважалі гарбарная, маслабойная, піваварная і тытунёвая вытворчасць.

У канцы 19 — пачатку 20 ст. ў Магілёве існавалі 3 групы крэдытных устаноў: камерцыйнага крэдыту (аддзяленні Дзяржбанка Расіі, Таварыства ўзаемнага крэдыту, 2 прыватныя банкірскія канторы Цукермана і Ратнера), зямельнага крэдыту (аддзяленні Дзяржаўнага дваранскага зямельнага банка, Сялянскага пазямельнага банка, аддзяленні Маскоўскага і Віленскага акцыянерных зямельных банкаў), дробнага крэдыту (крэдытныя і пазыкова-ашчадныя таварыствы, касы-



Магілёў. З малюнка 19 ст.

таварыствы, пазыкова-ашчадныя касы: губернская земская дробнага крэдыту, для служачых Магілёўскага губернскага праўлення, служачых мужчынскай гімназіі, казённай палаты, акцызнага ўпраўлення Магілёўскай губерні і інш). Працавалі 3 друкарні (52 рабочыя), механічныя майстэрні. У 1888 г. ўзведзены будынак тэатра. У 1867 г. пры Магілёўскім губернскім статыстычным камітэце быў заснаваны Магілёўскі музей. У 1893 г. ў ім створаны гісторыка-археалагічны аддзел. Вялікі ўклад у развіццё музея зрабілі А.С.Дамбавецкі, Е.Р.Раманаў, С.Ю.Чалоўскі. У музеі больш за 1500 экспанатаў, сярод іх: кальчуга з Анэлінскага кургана Быхаўскага павета, калекцыі манет Вялікага княства Літоўскага 16—17 ст., а таксама арабскіх і заходнееўрапейскіх, рускія асігнацыі пачатку 19 ст., памятныя медалі, старажытная зброя, раннія друкаваныя кнігі, рукапіснае евангелле 15 ст., каралеўскія граматы, сані, што пакінуў Напалеон у час уцёкаў з Расіі, атлас 1823 г. з планамі гарадоў Магілёўшчыны, узоры нацыянальнага адзення з вёсак Магілёўшчыны, батлейка з Быхаўскага павета, мадэлі сялянскага двара з Рагачоўскага павета, сельскагаспадарчыя прылады працы, вялікая калекцыя дзіцячых цацак, гербарыі і інш. Большая частка экспанатаў перададзена пазней у Магілёўскі губернскі музей (з 1938 г. Магілёўскі абласны краязнаўчы музей).

У 1870—80-я гады Магілёў — буйны цэнтр народніцкага руху ў Беларусі. Упершыню народніцкія групы рэвалюцыйна-асветніцкага характару ўзніклі ў горадзе ў пачатку 1870-х гадоў. Яны аб'ядноўвалі дэмакратычную моладзь, пераважна навучэнцаў сярэдніх навучальных устаноў. Цэнтрам пашырэння народніцкіх ідэй у Магілёве была мужчынская гімназія. У 1872 г. тут сфарміраваны гурток гімназістаў Гурэвіча, братоў Левенталей, Цукермана, Аксельрода, якія пад выглядам самаадукацыі вывучалі рэвалюцыйную тэорыю, гісторыю, сацыялогію, палітычную эканомію. У 1874—75 гг., у час масавага «хаджэння ў народ», у гімназіі існаваў гурток, што ажыццяўляў прапагандысцкія функцыі. Ён быў заснаваны ўраджэнцам Беларусі, студэнтам Пецярбургскага універсітэта Б.К.Ержыковічам. Аб'ядноўваў больш за 20 чалавек, сярод іх Р.П.Ісаеў, П.І.Пятроў, Н М.Забела, В І.Геранімус, В.І.Світыч, Л.Дабравольскі, Л.С.Залкінд. Сувязі з гуртком падтрымлівалі дзеяч міжнароднага рэвалюцыйнага руху, вучоны-прыродазнавец, ураджэнец Магілёва М.К.Судзілоўскі і С.П.Кавалік. Акрамя іх у 1875 г. ў Магілёўскай губерні вялі прапаганду члены пецярбургскіх народніцкіх гурткоў, мясцовыя ўраджэнцы Ракуза і яго сястра Жохава. Але ў адрозненне ад народніцкіх цэнтраў Расіі на Магілёўшчыне «хаджэнне ў народ» не атрымала вялікага пашырэння.

У час дзейнасці народніцкіх арганізацый «Зямля і воля» (1876—79) у Магілёве існавалі тры нелегальныя гурткі, у якіх было больш за 50 чалавек. Адным з іх кіраваў адстаўны чыноўнік С.Язерскі (уваходзіла інтэлігенцыя, пераважна настаўнікі), гуртком у мужчынскай гімназіі — Сафронаў, у жаночай — Г.Гаркаві. Члены гурткоў вялі прапаганду ў Магілёве і навакольных вёсках, распаўсюджвалі нелегальную літаратуру. Сярод іх найбольш актыўным і папулярным быў гімназіст Забела, які дасканала ведаў беларускую мову. Вялікую агітацыйную работу праводзілі Ісаеў, Ф.Грыгор'еў, брат і сястра Паповы. Пасля расколу ў 1879 г. «Зямлі і волі» на 2 арганізацыі — «Чорны перадзел» і «Народная воля» — народнікі Магілёва далучыліся да апошніх. Нелегальную рэвалюцыйную работу у горадзе вялі Забела, Лепяшынскі, Шафранскі, Адынец і інш. У 1882 г. народніцкія гурткі Магілёва ўвайшлі ў Паўночна-Заходнюю арганізацыю «Народнай волі». У 1882—83 гг. у Магілёве створаны гурткі нарадавольцаў-афіцэраў, якія падпарадкоўваліся непасрэдна ваенна-рэвалюцыйнаму цэнтру «Народнай волі» і вялі прапаганду сярод афіцэраў з мэтай падрыхтоўкі ваенных кадраў для будучага паўстання. Яны былі строга законспіраваны і засталіся нераскрытымі царскімі ўладамі. *Б.І.Сідарэнка.*

Дакументы сведчаць...

ПІСЬМО ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧАГА 2-й ЗАХОДНЯЙ АРМІЯЙ П.І.БАГРАЦІЁНА МАГІЛЁЎСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ ПРА ЎЗБРАЕННЕ РЭКРУТАЎ ДЛЯ АБАРОНЫ МАГІЛЁВА

5 ліпеня 1812 г.

Милостивый государь мой гр. Димитрий Александрович!

Я получил сейчас ваше представление от 4 июля под № 5659, на которое спешу ответствовать в.с.

1. Все распоряжения, вами сделанные, весьма хороши, и я с оными согласен, но отправление денег считаю безопаснейшим к г-ну министру финансов, нежели куда-либо в другое место.

2. Полковнику Грессеру здесь влагаю предписание, по коему он должен будет остаться в Могилеве для защищения оного, а к нему присоединятся и 664 рекрута, которых я приказал возвратить в Могилев.

3. Если сии рекруты не снабжены приличным вооружением, то не найдете ли средств, в.с., вооружить их, а они поступят также под команду Грессера и составят временный отряд, для защищения от партий неприятельских.

4. Я завтра переправляюсь у Бобруйска, и дня в 4 прибудет в Москву летучий корпус, вслед за коим и я последую.

Известив сим в.с., я прошу вас всякий раз давать знать мне о всем том, что верного иметь будете о неприятельских движениях, дабы я соображать мог по движениям его направление вверенной мне армии.

Имею честь быть с истинным почтением в.с. покорный слуга кн. Багратион.

Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 4. Мн., 1979. С. 19.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ «МОГИЛЕВСКИЕ ГУБЕРНСКИЕ ВЕДОМОСТИ»

...ПРА НАШЭСЦЕ ФРАНЦУЗАЎ НА МАГІЛЁЎ

...Нашествие французов на Могилев случилось внезапно. Из жителей никто почти не знал о предстоящей опасности до тех пор, пока не услышали перестрелки от Виленской заставы, тогда всяк, кто только мог, спешили убраться в безопасное место. В городе остались только мещане, бедные чиновники, инвалидные солдаты и духовенство. Капитан, начальник инвалидной команды, по долгу службы встретил врагов с оружием в руках. Он мысля так: «хоть одним врагом меньше», привел в возможный порядок свою команду и выстроил ее при входе с Бульварной площади на Виленскую улицу, а некоторые более сильные солдаты, откопав где-то в грязи пушку заржавевшую, вытащили ее на окоп, который в то время был гораздо выше, чем теперь, и, начиная от самого Днепра, за крестиком, проходил через Быховскую, Виленскую и Шкловскую заставы, а наряду с Дебрею опять примыкал к Днепру.

В виду неприятеля защитники Могилева зарядили пушку, всем имевшимся у них запасом и выстрелили самым ужасным образом. Этот выстрел был большой задачей для французов, узнавших наперед, что в Могилеве вовсе нет русского войска. Он принудил неприятеля стать в боевой порядок, и, устрашив жителей так и неприятелей, был причиною бесполезной перестройки.

Озадаченные французы вошли в город с осторожностью; но здесь представилось им другое неожиданное зрелище: капитан со своею командою, несмотря на то что в ней было только несколько десятков человек, ни за что не хотел сдаться неприятелю. Окруженный несметным числом французов, он не оставлял командовать: «пали, руби, бей!..» И сам с полусаблею в руках бросился на их предводителя. Честь и слава достойному герою: он отдался в плен раненый и закричал, пардон, только тогда, когда упал на землю, а команда его в порядке отступила за Быховкую заставу.

Могилевские губернские ведомости. 1851. № 21.

А НЕ ФРАНЦУЗЫ ЛИ ТАМ?

«...Проскакал в безопасности от Черикова, но тут возник у меня вопрос, не занят ли Могилев французами. Известия, мною собираемые, были противоречивы: иные говорили, что занят, другие — что еще нет. Приняв в соображение, что у страха глаза велики, а чело сме-

лым бог владеет, я решился ехать на Могилев; на последней станции под Могилевом получил такие же противоречивые известия, но все же не изменил решения ехать на Могилев.

...Въезд мой в Могилев был на рассвете, едва светлело. Въезжая в Могилев, перекрестился, на улице мертвая тишина, нет прохожих, итак в недоумении приезжаю к мосту на Днепре, скачу во всю прыть тройки и, к крайней моей радости, встречаю на мосту полицейского драгуна, род теперешних губернских жандармов. Еще раз перекрестился и прямо в губернаторский дом, застаю там губернатора графа Дмитрия Александровича Толстого и полковника... Грессера, но тут же подают им заложенный экипаж, и от них узнаю, что передовые разъезды французские за 15 верст и что состоящие под начальством у Грессера два батальона... уже накануне выступили по тракту... к Бобруйску, и что Толстой и Грессер, при первом известии о наступательном движении французских войск, выедут из Могилева...»

Записки С.Г.Волконского. СПб, 1902. С. 166—168.

З РАПАРТА ГЕНЕРАЛА П.І.БАГРАЦІЁНА АЛЯКСАНДРУ І

1812 г. июля 13 дня. На марше в Н. Быхове ...Если бы мое донесение, отправленное июля 10 числа, не достигло к Вашему императорскому величеству: на таковой случай беру смелость поднести у сего дубликатное, из коего всемилостивейший Государь усмотреть соизволите, что мое непременное намерение было остановить неприятеля при Могилеве и вытеснив оного, проложить вверенной мне армии кратчайший путь к Смоленску. Чтобы намерение сие привести в самое действие, в ночи 10-го числа корпус под командою генерал-лейтенанта Раевского прибыл к Дашковке, а его авангард, как имел щастие доложить, находился в восьми верстах от Могилева...»

ЦДГАРФ, ф. ВУА, спр. 3504, л. 285—288.

ПАДАРАВАННЕ ПРЫГОННЫХ СЯЛЯН

1824 г. января 19-го дня по указу е. им. в. в Могилевском пов. зем. суде явяся лично порутчица войск российских Катерина Скоробогатова сие верующее письмо дочери своей капитанше Марье Августовой выданное... Любезная дочь Марья Дмитриевна, имея я крепостного моего человека Константина Андреева, писанного за мною последней ревизии при доме в Могилеве, равно крестьянскую девку Юстину Кондратьеву, доставшуюся мне по купчей крепости в 17-й день июля 1823 года от докторши Ширметовой, поручаю оных Андреева и Кондратьеву, любезнейшая дочь, тебе в непострединственное твое распоряжение с представлением полного права таковых крестьян, буде пожелаешь, продать, заложить, подарить, за собою оставить и во всякие крепости укрепить и на сей предмет всякого рода сделки заключить.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 87, Павятовы земскі суд, 1824 г., л. 7.

З АКТАЎ МАГІЛЁЎСКАГА ПАВЯТОВАГА ЗЕМСКАГА СУДА ПРА ПРОДАЖ І ЗАКЛАД ПРЫГОННЫХ СЯЛЯН

1824 г.

б) 1824 г. июня 11-го дня по указу его императорского величества в Могилевском поветовом суде явясь лично г-н Иван Мертенс сие верующее письмо Авраму Антоновичу Щербикову выданное и служащее согласно с законами признал и таковое признание в протоколе собственноручным подписанием утвердил сими словы: милостивый государь Аврам Антонович имея я излишне в доме крепостных моих дворовых людей, из числа коих тоже крепостную мою женщину Прасковью Афанасьеву с малолетним сыном Осипом и дочерьми Катериною и Прасковьею, записанных по последней ревизии за мною в г. Белорусском Могилеве отдаю вам на услужение с тем, что буде во время таковых пожелает кто купить оную с детьми, то я милостивый государь верю сделать наши условия именно об том уведомить: а по получении от вас известия и выдано будет от меня купчая крепость со внесением принадлежащих пошлин, а что вы посему учините я ни в чем спорить и прекословить не стану пребывая с истинным почтением и преданностью. — Ваш милостивый государь покорнейшим слугою Иван Мертенс тысяча восемьсот двадцать четвертого года июня 11-го дня. Сие верующее письмо принадлежит Авраму Антоновичу Щербикову: на подлинном подписано Иван Мертенс. Сия доверенность за признанием есть в книгу принята и записана.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772—1903 гг.). Т. 2. Мн., 1940. С. 139—140.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ПРА ВЫДАННЕ ГАЗЕТЫ «МОГИЛЕВСКИЕ ГУБЕРНСКИЕ ВЕДОМОСТИ»

На основании высочайше утвержденного 3 июня 1837 г. Положения о порядке производства дел в губернских правлениях предложено Могилевским губернским правлением со второй половины с.г. издавать установленные «Губернские ведомости», издание которых до сего времени останавливалось по неустройству состоящей при правлении типографии.

Желающие получать «Могилевские губернские ведомости» приглашаются с своими требованиями о сем относиться в редакцию издания «Губернских ведомостей» с подробным означением своего адреса и места, куда присылать оные, и с приложением денег за годовое издание 10 рубл., а полугодовое по 5 руб.; за напечатание же частных извещений плата назначается от 1/4 до 1/2 коп. за букву или в соразмерность того по числу строк.

Могилевские губернские ведомости. 1838. 2 ліп.

З РАПАРТА ЖАНДАРСКАГА ПАЛКОЎНІКА САКАЛОВА КНЯЗЮ ДАЛГАРУКАВУ ПРА РЭАКЦЫЮ НАСЕЛЬНІЦТВА НА ДЗЕЯННІ ПАЎСТАНЦАЎ

5 мая 1863 г.

...Городское население, как г. Могилева, так и всех уездных городов Могилевской губ., остается покойным, при своих занятиях и изъявляют во всем преданность правительству, учредив по возможности от себя охранные для городов стражи в помощь военным командирам.

О чем долгом считаю довести до сведения в. сиятельства.

Полковник Соколов 7-й.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2. Мн., 1940. С. 518.

З РАПАРТА ЖАНДАРСКАГА ПАЛКОЎНІКА САКАЛОВА ШЭФУ ЖАНДАРАЎ КНЯЗЮ ДАЛГАРУКАВУ ПРА РАССТРЭЛ АФІЦЭРАЎ, ЯКІЯ ПЕРАЙШЛІ ДА ПАЎСТАНЦАЎ У МАГІЛЁВЕ

6 чэрвеня 1863 г.

Сего числа в 10 часов утра в г. Могилеве по приговору военного суда, утвержденному командующим войсками свиты е. имп. велич. генерал-майором кн. Яшвилем, расстреляны исключенные из службы артиллерийские офицеры: Подпоручик Корсак, прапорщики Манцевич 1-й и Манцевич 2-й, передавшиеся в шайку мятежников и взятые с оружием в руках, и дворянин Илдефонс Анцыпа, предводительствовавший шайкою мятежников в Быховском уезде.

О чем имею честь довести до сведения вашего сиятельства.

Полковник Соколов 7-й.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2 (1772—1903 гг.). Мн., 1940. С. 527—528.

Нашы продкі ў палку Магілёўскім

Восенню 1805 г. ў рускай арміі ўзнікла новая вайсковая часць. У мястэчку Навагрудак Мінскай губерні пад камандаваннем генерал-маёра Лявонцьева быў сфарміраваны полк, які атрымаў назву Магілёўскага мушкецёрскага. У тыя часы існавала традыцыя — прысвойваць новым фарміраванням імя той мясцовасці, адкуль папаўняўся асноўны кантынгент яго складу, а ў новым палку пераважная колькасць рэкрутаў была з Магілёва і Магілёўскай губерні.

Хутка Магілёўскі мушкецёрскі полк быў перакінуты ў Польшчу. Ішла руска-прускафранцузская вайна 1806—07 гг. У пачатку 1807 г. полк атрымаў першае баявое хрышчэнне ў кровапралітнай бітве пры Прэйсіш-Эйлаў. Ён змагаўся на правым апорным флангу. Салдаты і афіцэры праявілі вялікую мужнасць і гераізм, шмат з іх загінула. Усе ўдзельнікі бітвы былі ўзнагароджаны: салдаты — спецыяльна зацверджаным медалём (на ганаровай георгіеўскай стужцы надпіс: «За працу і храбрасць», на адваротным баку — «Перамога пры Прэйсіш-Эйлаў 27 студзеня 1807 года»), афіцэры — баявымі ордэнамі. Вясной таго ж года Магілёўскі полк увайшоў

у склад рускага экспедыцыйнага корпуса пад камандаваннем фельдмаршала М.Ф.Каменскага. У баях пад крэпасцю Данцыг магіляўчане правялі імгненную атаку, у выніку якой французскія войскі адступілі, пакінуўшы ўсю артылерыю. Пасля заканчэння вайны Магілёўскі полк прыбыў на зімовыя кватэры ў Віцебскую губерню.

У час руска-шведскай вайны 1808—09 гг. полк тэрмінова быў перакінуты ў Фінляндыю, дзе на долю воінаў выпалі цяжкія выпрабаванні. У баях пры Рэвалаксе і Пулкіла палку давялося ваяваць з праціўнікам, што ў восем разоў перавышалі яго. Асабліва вылучыліся магілёўскія партупей-прапаршчыкі Пацалоўскі і Рагошын, якія паспелі сарваць з дрэўка і схаваць батальённыя баявыя сцягі. Выдатны подзвіг здзейсніў радавы Пятроў. Ён літаральна вырваў палкавы сцяг з рук ворага і схаваў. Яшчэ неаднойчы вызначаліся воіны-магіляўчане ў баях. У пачатку верасня 1808 г. яны штурмам авалодалі варожымі пазіцыямі пры Аравайсе. У маі 1809 г. полк па тонкім лёдзе Батанічнага заліва, які пачаў раставаць, зайшоў у тыл шведам і прымусіў іх скласці зброю.

У 1811 г. полк называўся Магілёўскім пяхотным. Пад такой назвай ён уступіў у вайну 1812 г. з Напалеонам, уваходзіў у 5-ю пяхотную дывізію 1-й рускай арміі, якой камандаваў Барклай дэ Толі. Потым перайшоў у склад корпуса Вітгенштэйна, які павінен быў не прапусціць французскія войскі да сталіцы Расіі — Пецярбурга. Магіляўчане разам з іншымі часцямі рускай арміі ў жорсткіх баях у ліпені 1812 г. праявілі ўзоры мужнасці і ратнай доблесці. Магілёўскі полк удзельнічаў у баях пад Полацкам, каля Чашнікаў, на рацэ Бярэзіна, дзе былі канчаткова разгромлены рэшткі некалі вялікай арміі Напалеона, у 1813 г. — каля Люцэна і Баўцэна, у славутай «бітве народаў» каля Лейпцыга, у Парыжы каля Бельвільскіх вышынь.

Ратныя подзвігі Магілёўскага пяхотнага палка ў руска-турэцкай вайне былі адзначаны ганаровай баявой узнагародай воінскіх часцей — сярэбранымі трубамі з надпісам: «За вайну з Турцыяй». Вылучыўся полк таксама ў баях пад Варнай і каля крэпасці Кюстэнджы.

Пазней ён называўся 26-м Магілёўскім пяхотным. У сакавіку 1854 г. пад моцным агнём праціўніка полк імгненна фарсіраваў Дунай і штурмам авалодаў турэцкімі ўмацаваннямі. У адным з баёў камандзір палка палкоўнік І.І.Цяжальнікаў быў паранены, але не пакінуў поля бою. За гэты подзвіг яму датэрмінова прысвоілі званне генерал-маёра. Партрэт І.І.Цяжальнікава, які выканаў І.Я.Рэпін, адзін з лепшых партрэтаў рускіх военачальнікаў мінулага стагоддзя.

Магілёўскі полк удзельнічаў і ў легендарнай абароне Севастопаля ў 1855 г. Уваходзіў у склад гарнізона горада, вылучыўся ў баях каля Чорнай рэчкі і Фядзюнінскіх вышынь.

Мужна змагаўся полк і ў першай сусветнай вайне. Геройскі подзвіг здзейсніў тады магілёўскі прапаршчык Яфрэм Хахлюшкін, за што быў узнагароджаны ордэнам Георгія.

І.Куксін.

Аб магілёўскай управе Паўночнага таварыства дзекабрыстаў

У 1815—30 гг. у Магілёве існавала штаб-кватэра войск 1-й рускай арміі. Некаторыя члены дзекабрысцкіх арганізацый, як, напрыклад, А.А.Авенарыус, В.І.Гурко, В.Н.Ліхараў і іншыя, служылі пры галоўнай кватэры; многія будучыя дзекабрысты знаходзіліся ў розных палках 1-й рускай арміі. Адным з ад'ютантаў галоўнакамандуючага Ф.В.Остэн-Сакена быў паручнік лейб-гвардыі Кірасірскага палка Пётр Паўлавіч Цітоў (1800—78). Ён быў сынам навятовага прадвадзіцеля дваранства Разанскай губерні, адукацыю атрымаў у вядомым Маскоўскім вучылішчы каланаважатых, якое скончылі многія актыўныя дзеячы дзекабрысцкага руху. Цітоў служыў у цяжкай кавалерыі, удзельнічаў у загранічным паходзе 1815 г., звязаным з уцёкамі Напалеона з вострава Эльба і вядомымі «ста днямі».

У лютым 1824 г. ў Маскве, дзе Цітоў знаходзіўся па справах службы, ён наведаў дом свайго старога знаёмага М.М.Нарышкіна. Адзін са старэйшых удзельнікаў тайных таварыстваў, адзін з кіраўнікоў Маскоўскага аддзялення Паўночнага таварыства паведаміў Цітову аб існаванні арганізацыі, якая імкнецца да карэннай перабудовы Расіі, і прыняў яго ў тайную арганізацыю. На Цітова была ўскладзена задача збіраць статыстычныя даныя, аб тых месцах, дзе ён будзе знаходзіцца,

а таксама паведамляць Нарышкіну «о происшествиях, образе мыслить в главной квартире». Вядома, што ў 1824—25 гг. некалькі пісем з неабходнай інфармацыяй было адпраўлена ў Маскву.

Праз паўтара года, у жніўні 1825 г., у поле зроку Нарышкіна трапіў другі ад'ютант Остэн-Сакена, капітан гвардзейскага Ізмайлаўскага палка Уладзімір Аляксеевіч Мусін-Пушкін (1798—1854). Мусін-Пушкін паходзіў з вельмі адукаванага і знатнага дваранскага роду. Яго бацька, граф А.І.Мусін-Пушкін, вядомы збіральнік старажытных помнікаў, гісторык, у калекцыі якога захоўваўся арыгінал «Слова аб палку Ігаравым». Па маці ён даводзіўся стрыечным братам М М Нарышкіну, якога ведаў з дзяцінства. Адукацыю атрымаў дома. Акрамя таго, вывучаў курс матэматыкі ў вучылішчы калонаважатых у 1815—16 гг. Служыў у розных пяхотных палках. У 1825 г. сустрэўся з Нарышкіным і даведаўся аб існаванні тайнага таварыства, быў прыняты ў яго як «согласный» член. Яму было даручана разам з П П Цітовым арганізаваць у Магілёве ўправу Паўночнага таварыства.

Такія ўправы, на чале якіх стаялі старыя і праверaныя члены, ствараліся паводле статута тайнага таварыства. У іх маглі ўваходзіць ад двух да пяці чалавек. Магілёўская ўправа, як меркавалася, павінна была складацца з 2 «паўупраў» (філіялаў). Але на самай справе, па прапанове Цітова, яны «рашыліся на адну». Перад ёй ставілася задача паралізаваць дзеянні камандавання 1-й арміі ў момант выступлення тайнага таварыства. У арганізацыйных адносінах Магілёўская ўправа не была аформлена канчаткова з-за недахопу інфармацыі ад Нарышкіна. Спачатку галоўным было «замечать людей и стараться возбудить желание к чтению, упражнению и рассуждениям». Пры арганізацыі ўправы Цітоў і Мусін-Пушкін кіраваліся «артикулами», прадстаўленымі Нарышкіным. Галоўным з іх быў такі: «Доставить государству Конституцию, подобную американским штатам». Ва ўправу ўваходзілі наступныя афіцэры: Фёдар (Фрыдрых) Логвінавіч Брэверн (1799 — пасля 1863) — штабротмістр лейб-гвардыі Коннага палка, ад'ютант галоўнакамандуючага 1-й арміі; Аляксандр Мікалаевіч Гвоздзеў (1794—1828) — падпалкоўнік кватармайстарскай часці, удзельнік Айчыннай вайны 1812 г. і замежных паходаў наступных гадоў, узнагароджаны 3 ордэнамі; Антон Апалонавіч Жамчужнікаў (1800—73) — паручнік кватармайстарскай часці, у мінулым член «Саюза дабрабыту»

Як бачым, састаў управы павінен быў адпавядаць прынятаму ў дзекабрысцкіх арганізацыях пасля 1821 г. курсу на «военную революцию». Перавага аддавалася людзям абсалютна надзейным, якія мелі штаб-афіцэрскі чын. Аднак далей тэарэтычных размоў справа ў Магілёве не пайшла. Асноўная прычына — недахоп інфармацыі і часу. Аб дзеяннях у галоўнай кватэры ў Магілёве дзеячы Паўночнага і Паўднёвага таварыстваў нічога не ведалі.

С.П.Трубяцкі (1790—1860), які прыязджаў у Магілёў у лістападзе 1825 г., ніякіх канкрэтных указанняў Цітову і Мусіну-Пушкіну даць не мог. Магчыма, у далейшым Магілёўская ўправа магла б і адыграць значную ролю ў дзейнасці тайнага таварыства, асабліва ў сувязі з намечаным на лета 1826 г. выступленнем усіх дзекабрысцкіх арганізацый «посредством войск», але падзеі былі паскораны раптоўнай смерцю імператара Аляксандра I і паўстаннем 14 снежня на Сенацкай плошчы ў Пецярбургу.

Следчаму камітэту даволі хутка стала вядома пра стварэнне Магілёўскай управы. 2.2.1826 г. Цітоў і Мусін-Пушкін былі арыштаваны і адпраўлены ў Пецярбург, дзе ўтрымліваліся ў казематах Петрапаўлаўскай крэпасці. Паколькі дзейнасць магілёўскіх дзекабрыстаў практычна нічым не праявілася, а галоўныя члены тайных таварыстваў амаль нічога пра іх не ведалі, то ні Брэверн, ні Гвоздзеў, ні Жамчужнікаў арыштаваны не былі, але сакрэтны нагляд над імі са шматмесячнымі данясеннямі «о поведении» быў устаноўлены.

15.2.1826 г. сустаршынёй Магілёўскай управы быў аб'яўлены прыгавор. Цітова пасля дадатковага трохмесячнага ўтрымання ў крэпасці перавялі ў Омскі гарнізонны полк. Пазней ён удзельнічаў у руска-турэцкай вайне 1828—29 гг., дзе быў двойчы паранены, атрымаў манаршую міласць і ордэн Ганны 3-й ступені з бантам. Пасля выхаду ў адстаўку ў 1831 г. на грамадзянскай службе. Мусіна-Пушкіна трымалі ў крэпасці яшчэ месяц, пасля адправілі ў Фінляндыю, дзе ён служыў у Пятроўскім пяхотным палку. У 1831 г. атрымаў дазвол выйсці ў адстаўку і пасяліўся ў Маскве, знаходзячыся пад тайным наглядам да 1835 г.

У цэлым трэба адзначыць, што стварэнне Магілёўскай управы Паўночнага таварыства з'яўлялася лагічным крокам тайнага таварыс-

тва пры падрыхтоўцы «ваеннай рэвалюцыі» ў Расіі, але не паспела вырасці ў моцную арганізацыю і ў паўстаннях дзекабрыстаў не ўдзельнічала. *М.Тарасава.*

З успамінаў паручніка Г.І.Філіпсона

Пасля разгрому царызмам выступленняў дзекабрыстаў многія з іх утрымліваліся пад арыштам у Магілёўскай крэпасці. Праз Беларусь пралеглі канвойныя маршруты ў сталіцу імперыі многіх членаў Паўднёвага таварыства.

... В одно время узнали мы о бунте Черниговского полка и о Петербургской катастрофе 14 декабря. Однажды ночью, часов в 11, мы услышали в нашем коридоре шум и бряцание цепей. Я еще не спал и выбежал из своей комнаты. По коридору двигалась целая толпа. Впереди шел жандармский полковник Гавриков с нашим Кононовым сзади них. Окруженные четырьмя часовыми, шли трое арестантов в цепях, за ними жандармский офицер, фельдъегерь, и несколько личностей, мне неизвестных.

Арестантов поместили в двух коротких комнатах. На другой день и в следующие продолжались такие же приводы арестантов. Их перебывало у нас до 50 и, как помещений уже недоставало, то нас стеснили по два и по три в одной комнате. Это все были офицеры Черниговского полка и других полков 1-й и 2-й армий, расположенных в юго-западной России.

Их содержали в кандалах и с большою строгостию: у каждого окна в их комнатах стоял часовой без штыка и шомпола, а в общей для двух комнат передней сидел унтер-офицер. Сверх того, было по часовому на обоих концах коридора, на дворе против окон ходили три часовых с заряженными ружьями. Надзор за исправностию караулов возложен был на дежурного, которым ежедневно назначали одного из нас.

...Вообще я должен сказать, что сообщество политических арестантов навело многих из нас на новые мысли и понятия и в первый раз заставило подозревать, что не все к лучшему в этом лучшем из миров.

Важнейшие из арестантов, как Пестель, Муравьев, Бестужев-Рюмин и другие пробыли в Могилеве по нескольку дней, остальные гораздо долее...

«Русская старина». М., 1885. С. 29—30.



Мемарыяльная дошка дзекабрыстам на доме № 8 па вуліцы Першамайскай.

Браты Юшнеўскія

...Іх было двое: Аляксандр Пятровіч і Сямён Пятровіч. Аляксандр нарадзіўся ў сям'і стаўбавога двараніна ў 1799 г. Скончыў гімназію і Маскоўскі універсітэт. Выбраў ваенную кар'еру і, калі ў 1821 г. ў 2-ю рускую армію прыбыў для праходжання службы Сямён, ён быў ужо генерал-інтэндантам гэтай арміі, а тайна — членам Тульчынскай управы «Саюза дабрабыту», крыху пазней адным з кіраўнікоў Паўднёвага таварыства дзекабрыстаў. Быў арыштаваны ў Тульчыне 13.12.1825 г Судом ваеннага трыбунала Аляксандр быў прыгавораны да вечнай катаргі з пасяленнем у Якуціі Памёр 10.1.1844 г. ў царкве в. Аек каля труны свайго таварыша Ф.Ф.Вадкоўскага.

Сямён нарадзіўся 1.2.1801 г. ў Магілёве, потым вучыўся ў Маскоўскім універсітэцкім пансіёне. Прыклад старэйшага брата, а таксама некаторых прагрэсіўных выкладчыкаў пансіёна, меў вялікі ўплыў на фарміраванне светапогляду маладога Юшнеўскага. Ён вырашыў прысвяціць сваё жыццё барацьбе за новае справядлівае грамадства, за звяржэнне

цара і адмену прыгоннага права. Вершы Пушкіна і рэвалюцыйных французскіх паэтаў былі яго любімымі творамі. У 1823 г. быў прыняты ў Паўднёвае таварыства. Арыштаваны 26.1.1825 г., а 13 лютага пад канвоем дастаўлены ў Пецярбург, праз дзень заключаны ў Петрапаўлаўскую крэпасць з загадам «трымаць строга». Пасля арышту царскія жандары не маглі прад'явіць сур'ёзных абвінавачанняў Сямёну Юшнеўскаму. І брат яго, Аляксей Пятровіч, і іншыя дзекабрысты стараліся ў час следства аблегчыць лёс маладога рэвалюцыянера. Ды і сам ён быў цвёрды, не даваў паказанняў ні супраць сябе, ні супраць сваіх таварышаў па барацьбе. Адседзеўшы свой тэрмін у казематах, Сямён Юшнеўскі быў звольнены з арміі. Жыў у вёсцы Хруставаў Альгапольскага павета Падольскай губерні. Мясцоваму начальству было загадана ажыццяўляць строгі нагляд за ім. Нягледзячы на сваё цяжкае становішча, пастаянныя праследаванні, Сямён Пятровіч шмат часу аддаваў народнай асвеце Памёр у 1844 г., як і яго старэйшы брат. *А.Ярохін.*

Сяргей Ясенін у Магілёве

Рускі паэт-лірык, пясняр сялянскай Русі, знаўца народнай мовы і народнай душы нарадзіўся ў 1895 г. ў в. Канстанцінава Разанскай губ. У 1915 г. быў прызваны ў армію, дзе атрымаў спецыяльнасць ваеннага санітара. Накіраваны ў распараджэнне Паўночна-Заходняга фронту і прызначаны ваенным санітарам асабістага поезда яе вялікасці імператрыцы Аляксандры Фёдараўны.

5.4.1916 г. ў складзе вялікай світы імператрыцы Ясенін прыбыў у Магілёў. Праз некалькі дзён, не жадаючы пісаць «вернападданіцкіх вершаў» ён дэзерціраваў. Каля двух месяцаў, абыходзячы гарады і вялікія вёскі, дабіраўся Ясенін да радзімы, дзе ціхенька адседжваўся, бо яму пагражаў ваенны трыбунал. Толькі пасля Лютаўскай рэвалюцыі паехаў у Маскву, а потым у Петраград.

Б.Гардзееў.

Магілёў сустракае каранаваных асоб

Сярод тысяч людзей, якія за шматвяковае існаванне Магілёва наведалі яго, ёсць шэраг «венцаносных», што ўплывалі на палітыку тагачаснай Еўропы. Візіт іх у Магілёў, як кропля з ракі старадаўнасці, адлюстроўвае часам крывавую і трагічную або велічную і пампезную гісторыю Магілёўшчыны.

4.9.1617 г. ў Магілёве быў кароль Рэчы Паспалітай Уладзіслаў IV, які ішоў з войскам на Масковію. А пад 1607 г. Баркулабаўскі летапіс паведамляе пра візіт у наш край Ілжэдзмітрыя II «... месяца мая, после семое суботы ишол со Шклова и з Могилева на Попову Гору якийся Дмитр Иванович. Менил себе быти оным царем московским, который первей того Москву взял и там же оженився...»

Да падзей вайны Расіі з Рэччу Паспалітай сярэдзіны 17 ст. адносяцца звесткі пра візіт у Магілёў цара Аляксея Міхайлавіча. У 1654 г магіляўчане адчынілі вароты царскім войскам і, прысягнуўшы цару, вытрымалі 3-месячную аблогу войск Рэчы Паспалітай. Паводле царскага ўказа, які браў горад пад сваю апеку, забаранялася жыць у горадзе казакам і яўрэям Іх дамы перадаваліся магістрату і пад кватэры стральцам. Нельга было таксама выбіраць палякаў у ратушу. У 1655 г. ў Магілёў прыбыў цар Аляксей Міхайлавіч. Ён пацвердзіў вольнасці і правы гараджан. Калі ў 1656 г. ён вяртаўся з-пад Рыгі, прабыў у Магілёве 2 тыдні. У 1664 г. з 20 сакавіка да 8 красавіка ў Магілёве чакаў маскоўскіх паслоў, каб падпісаць мір, кароль Ян-Казімір, але з-за раптоўнага пажару выехаў з горада.

У час Паўночнай вайны ў 1706 г. рускім войскам, якія ваявалі на землях Вялікага княства Літоўскага супраць шведаў, загадана было збірацца на царскі агляд пад Магілёў. Раніцай 22 чэрвеня на байдаку з Оршы ў Магілёў прыбыў цар Пётр I і стаў ва ўрочышчы Грабеж каля рачулкі Дзебра. Гарадскі магістрат, сустракаючы цара, паднёс яму 2 сярэбраныя з пазалотай блюды з вялікім пірагом і сітніцай. Цар распарадзіўся даставіць хлеб на кватэру, а сам адразу накіраваўся да войска. Пасля вайсковага агляду цара са світай вітаў гарматны салют з усіх бастыёнаў. Пальба

спадабалася Пятру I, які прамовіў: «Право, изрядно». Цар наведаў Брацкую царкву, пасля чаго накіраваўся да бурмістра Анташкевіча. Там члены магістрата з паклонам паднеслі яму хлеб-соль. Ад яўрэйскай абшчыны яму ўручаны быў хлеб і жывы асетр. Пётр I даручыў свіце ўзяць і гэтыя падарункі. Пад вечар цар заехаў да генерала Кікіна, пазнаёміўся з гаспадаром дома Фёдарам Казановічам, успомніў падзеі 1661 г.: «...не пугайся, я знаю, что при твоем батюшке здесь москвитян выбили, но ведь тогда война была». Потым развітаўшыся з войскам і на сваім байдаку адплыў у Кіеў. У 1707 г. праз горад праязджаў царэвіч Аляксей Пятровіч.

6.7.1708 г. Магілёў занялі шведы на чале з Карлам XII. Кавалерыю яны размясцілі на правым беразе Дняпра, а пяхоту — на высотах ад горада да Буйніч. Шацёр караля стаяў паміж горадам і Буйніцкім манастыром на ўзгорку, які пасля празвалі «Карлавай далінай». На горад ускладаліся грашовая і харчовая кантрыбуцыі для шведскага войска. Карл XII сам наведаў магілёўскія цэрквы для агляду сярэбраных рыз на абразах і другіх каштоўных рэчаў. Нехта падказаў каралю, што найбольш каштоўнае царкоўнікі схавалі, і Карл XII загадаў выдаць каштоўнасці, пагражаючы Магілёву рабаўніцтвам і пажарам. Гараджане выдалі больш за 9 пудоў схаванага серабра, якое шведы ў абозе пераплавілі на манеты, але войска рабавала насельніцтва і пасля гэтага. 14 жніўня «сатана», як празвалі магіляўчане Карла XII, пераправіўся на левы бераг Дняпра. Шведскі пастой абышоўся гораду ў 507 512 бітых талераў.

У 1780 г., праз восем гадоў пасля ўваходжання Магілёва ў склад Расійскай імперыі, у горадзе адбылася сустрэча імператрыцы Кацярыны II з аўстрыйскім імператарам Іосіфам II. Кацярына II аб'язджала тады 5 новых расійскіх губерняў. Аўстрыйскі імператар прыбыў у Магілёў пад імем графа Фалькенштэйна ў 9 гадзін 21 мая. «Афіцэр у зялёным гарнізонным мундзіры росту сярэдняга, твару нямецкага, зачэсаны ў адну пуклю з касой» — такім ён з'явіўся перад жыхарамі Магілёва.

22 мая ў 7 гадзін раніцы імператар пяшком хадзіў маліцца ў касцёл езуітаў, потым глядзеў на горад з вежы ратушы. Сваёй маці ён пісаў у той час: «...горад пабудаваны кепска, драўляныя дамы, гразкі вуліцы...»

23 мая ў 11 гадзін раніцы пад звон і гарматныя стрэлы з гарадскога вала ў горад уехала кавалькада карэт з Кацярынай і яе світай. Каля пабудаванай драўлянай брамы яе сустрэлі члены магістрата і паднеслі залатыя і сярэбраныя ключы ад горада. Адбыліся ўрачыстыя малебны ў кармеліцкім касцёле і саборнай царкве Святога Спаса. Амаль тыдзень у сустрэчах, танцах, музыцы правялі госці ў Магілёве. Імператрыца шчодра абдорвала мясцовыя рэлігійныя ўстановы і канфесіі, а іх кіраўнікам «преосвященному епископу Георгию» і «епископу католическому» падаравала «крест с дорогими камнями украшенный и тысячу рублей», а другому — «табакерку с алмазами». Генерал-губернатар і яго жонка атрымалі таксама «от Ея Императорского Величества всемилостивейшие подарки». 29 мая імператрыца з імператарам у знак свайго візіту ў горад каля драўлянай царквы Уваскрэсення Хрыстова залажылі першы камень царквы Святога Іосіфа. У 3 гадзіны папаўдні на карэтах выехалі ў Шклоў. Пра свой візіт у Магілёў Кацярына II пісала: «... бавіла час весела, аднойчы смяялася 5 гадзін запар». 2.10.1781 г. ў Магілёве праездам быў вялікі князь Павел Пятровіч з жонкай Марыяй Фёдараўнай. У 1802 г. 15 чэрвеня ў 6 гадзін вечара горад наведаў імператар Аляксандр I. 16 чэрвеня на Лупалаўскім полі адбыўся царскі агляд фанагрыйскага палка, які тут кватараваў, пасля чаго Аляксандр I выехаў у Санкт-Пецярбург.

У 1839 г. ў Магілёве захварэў наследнік прастола вялікі князь Аляксандр Мікалаевіч (Аляксандр II) і паўтара месяца правёў у доме дваранства. У час хваробы паводле яго загаду магіляўчанам у якасці міласціны было раздадзена 20 тысяч рублёў асігнацыямі і створаны стыпендыяльны фонд у 1500 рублёў.

Апошнім каранаваным візіцёрам у Магілёў быў цар Мікалай II. У 1-ю сусветную вайну з 8.8.1915 г. ў Магілёў была пераведзена Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандавання Расійскай арміі. 21 жніўня сюды прыехаў Мікалай II, які прыняў на сябе вярхоўнае камандаванне. 5.5.1916 г. ў Стаўку прыехала царыца Аляксандра Фёдараўна з дзецьмі. Вось яе першае ўражанне пра Магілёў: «Так, сумны і гразкі горад». У дзённіку цара візіт у Магілёў нічым не вылучаецца — пасяджэнні Стаўкі, прачытаныя кнігі, прагулкі па навакольлі. Пачатак Лютаўскай рэвалюцыі застаў Мікалая II у Магілёве. У ноч з 28 лютага на 1 сакавіка 1917 г. ён выехаў у Петраград, але не даехаў і на станцыі Дно адрокся ад прасто-

ла. Пад вечар 3 сакавіка цягнік з палкоўнікам Мікалаем Раманавым вярнуўся ў Магілёў, які сустрэў яго ганаровай вартай на вакзале, чырвонымі сцягамі і «Марсельезай» на вуліцах. Разам з сям'ёй былы цар знаходзіўся ў Стаўцы. У горадзе не было шматлюдных мітынгаў. Толькі аднойчы 20—30 чалавек моладзі прайшлі са спяваннем «Марсельезы» па вуліцах, а калі падышлі да Стаўкі, пачалі абразліва лаяць цара, зрываць трохколерны сцяг і імператарскага гербавага арла. Іх ніхто не разганяў.

6 сакавіка паводле тэлеграмы Часовага ўрада Мікалаю II з сям'ёй дазвалялася выехаць за мяжу. 7 сакавіка ў другой тэлеграме Часовага ўрада загадвалася былога цара з сям'ёй арыштаваць і даставіць у Царскае Сяло. 8 сакавіка ў 10 гадзін раніцы Мікалай II пры развітанні з афіцэрамі штаба у вялікай зале сказаў: «Карысць радзімы і неабходнасць прадухілення жахаў міжусобіцы і грамадзянскай вайны, а таксама стварыць магчымасць накіраваць усю моц для працягу барацьбы на фронце прымусілі мяне адрачыся ад прастола на карысць майго брата вялікага князя Міхаіла Аляксандравіча, але, улічваючы абставіны, якія склаліся, вялікі князь, у сваю чаргу, адрокся ад прастола. Заклікаю вас, панове, павінавацца Часоваму ўраду і прыкласці ўсе намаганні дзеля працягу вайны з Германіяй і Аўстра-Венгрыяй да пераможнага канца». Многія прысутныя плакалі, некаторыя страцілі прытомнасць Не вытрымаўшы, Мікалай II са слязамі на вачах выйшаў з залы. Каля Стаўкі стаяў натоўп гараджан з непакрытымі галовамі. Былы цар развітаўся з людзьмі і з сям'ёй на аўтамабілі накіраваўся да вакзала. На Дняпроўскім праспекце толькі некалькі жанчын, якія пазналі цара, з плачам кінуліся да яго аўтамабіля. Болей жалю ніхто не выказваў ні па дарозе, ні на вакзале. Апоўдні цягнік з падканвойным грамадзянінам Раманавым рушыў з Магілёва ў Петраград... *С.І.Бяспанскі.*

Пушкін у Магілёве

Імя рускага пісьменніка, пачынальніка новай рускай літаратуры, стваральніка рускай літаратурнай мовы, Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна (1799—1837) добра вядома магіляўчанам. Паэту пастаўлены помнік, імем названа вуліца ў Магілёве. Такое ўшанаванне А.С.Пушкіна ў горадзе на Дняпры невыпадкова. Вядома, што ў 1820 г. цар Мікалай I, якому вельмі не падабалася вальнадумства паэта, пад выглядам службовага перамяшчэння паслаў яго на поўдзень Расіі. Па шляху ў ссылку Аляксандр Сяргеевіч наведаў у Магілёве сваіх сяброў-дзекабрыстаў. Да нашых дзён захавалася падарожная Пушкіна, якую ён прад'яўляў на паштовых станцыях Беларускага тракту.

11.5.1820 г. праязджаў праз Магілёў па Шклоўскай вуліцы (цяпер Першамайская), спыняўся ў заезным двары (насупраць гасцініцы «Дняпро», якой тады яшчэ не было, а потым праз Буйнічы, Быхаў, Рагачоў маршрут пераходзіў на левабярэжжа Дняпра.

У 1824 г. быў сасланы ў радавы маёнтак Міхайлаўскае пад нагляд мясцовых улад. Шлях яго пралягаў праз Магілёў, Оршу, Віцебск і інш., у Магілёве спыняўся ў гасцініцы «Брыстоль» (цяпер раён плошчы Арджанікідзе). Гэта падзея апісана Аляксандрам Распопавым праз сорак гадоў пасля гібелі паэта («Русская старина», 1876, т. 15).

В.Валодзін у «Аповесці пра Пушкіна» гаворыць: «Не выгнаннікам, а трыумфатарам выехаў ён з Магілёва. Слава ішла ўслед за яго запыленай каламажкай, а іншы раз і другая брычка з чалавекам у няпэўным касцюме — пераапранутым паліцэйскім чынам». Наш зямляк Пятро Прыходзька ў вершы «Пушкін у Магілёве» піша:

Ён выйшаў на бераг, да самага вала,
І слухаў бурлівыя хвалі Дняпра.
Усю ноч з ім тады Беларусь размаўляла,
Пакуль не ўзышла маладая зара.

З успамінаў А.П.Распопава

6 августа 1824 года, когда перед манежем полковая музыка играла вечернюю зарю, а публика, пользуясь праздничным днём и приятною погодою, гуляла по Шкловской улице, проезжала на почтовых, шагом коляска; впереди шел кто-то в офицерской фуражке, шинель внакидку, в красной шелковой, русского покроя рубахе, опоясанной агагиником. Коляска поворотила по Ветряной улице на почту; я немедленно поспешил вслед за нею, же-

лая узнать, кто приезжает. Смотритель сказал мне, что едет из Одессы коллежский асессор Пушкин; я тотчас бросился в пассажирскую комнату и, взявши Пушкина за руку, спросил его:

— Вы, Александр Сергеевич, верно, меня не узнаете? Я — племянник бывшего директора лицея — Егора Антоновича Энгельгардта; по праздникам меня брали из корпуса в Царское Село, где вы с Дельвигом заставляли меня декламировать стихи.

Пушкин, обнимая меня, сказал:

— Помню, помню, Саша, ты проворный был кадет.

Я, от радости такой неожиданной встречи, не знал, что делать: опрометью побежал к гулявшим со мною товарищам известить их, что проезжает наш дорогой поэт А.С.Пушкин... Все поспешили на почту. Восторг был неописанный.. в восторге, что между нами великий поэт Пушкин, мы взяли его на руки и отнесли, по близости, на мою квартиру...

Там веселая встреча продолжалась. Звучали гитарные переборы. Пели «Черную шаль». Под рокот грозы, бушевавшей над Днепром, Пушкин читал стихи, которые в рукописях ходили по России и которые при жизни его так и не были опубликованы.

«Пушкин, — по воспоминаниям, — был в самом веселом и приятном расположении духа... Мы всей гурьбой проводили его на почту... и, простившись, пожелали ему счастливого пути».

Поэт потом не раз вспоминал, рассказывал няне и друзьям, как его принимали в Могилеве.

В пятом часу утра 7 августа выехали из Могилева...

Друкуецца па кн: С и м а н о в и ч Д. Подорожная Александра Пушкина. Мн., 1977. С. 12—14.

ІХ ЛЁСЫ ПЕРАСЕКЛІСЯ З ЛЁСАМ ПАЭТА Ў МАГІЛЁВЕ

Сведкамі сустрэчы А.С.Пушкіна з дзекабрыстамі ў Магілёве ў 1824 г. былі А.П.Распопаў і А.А.Куцынскі, успаміны якіх дайшлі да нас. Хто яны?

Аляксандр Пятровіч Распопаў быў пляменнікам Я.А.Энгельгарта, дырэктара Царскасельскага ліцэя, дзе вучыўся А.С.Пушкін. У 1824 г. ён служыў у Лубенскім гусарскім палку. Даслужыўся да звання генерал-маёра. У 1830-я гады сустракаўся з А.С.Пушкіным у некалькіх дамах, а таксама ў дзядзькі Ягора Антонавіча Энгельгарта, Аляксандр Пятровіч наведаў кватэру паэта ў сумныя дні 1837 г., Пушкін, па яго словах, убачыўшы яго, «усміхнуўся».

Андрэй Андрэевіч Куцынскі ў 1824 г. служыў у чыне карнета ў Лубенскім гусарскім палку. У 1829 г. ён ужо быў паручнікам. Даслужыўся да звання генерал-лейтэнанта корпуса жандараў. З паэтам неаднойчы сустракаўся і пазней, калі служыў у грамадзянскім ведамстве. *Б.Гардзееў.*

Імёны, якія засталіся ў гісторыі Магілёва

З Магілёвам у розныя часы былі звязаны жыццё і дзейнасць вядомых дзяржаўных і рэлігійных асоб, ваенных дзеячаў, работнікаў навукі і культуры. Адны з іх толькі наведвалі горад, спыняліся тут, каб адпачыць з вялікай дарогі, іншых прывялі сюды ваенныя справы, а некаторыя ўпісалі свае імёны ў архітэктуру горада, летапісы і мемуары Кожны з іх пакінуў прыкметны след у гісторыі Магілёва.

Да прызначэння на высокія пасады ў Вялікім княстве Літоўскім старостам магілёўскім быў Леў Сапега, з 1552 г. дзяржаўцам магілёўскім і тыкоцінскім — Станіслаў Кежгайлавіч. Два прадстаўнікі магнацкага роду Радзівілаў таксама мелі дачыненне да гісторыі Магілёва. У 1610—15 гг. пасаду старосты магілёўскага займаў Крыштоф Радзівіл. Яго сын Януш Радзівіл у 1654 г. на чале літоўскага войска наблізіўся да горада, каб штурмам захапіць яго. Аднак усе атакі былі адбіты абаронцамі Магілёва, толькі праз 3 месяцы гетман зняў асаду горада і адышоў з войскам. З 1563 г. старостам магілёўскім быў Астафій Валовіч, прадстаўнік вядомага на Беларусі шляхецкага роду. Менавіта на тыя часы прыпадае пачатак эканамічнага, палітычнага і культурнага росквіту Магілёва.

У сярэдзіне 18 ст. ў горадзе працавалі ювелір і чаканшчык па серабры Афанасій Воўчак, у 2-й пал. 18 ст. вядомы хормайстар (у епіскапа Г.Каніскага) Павел Пётух.

Шмат часу правёў у Магілёве ў губернскім архіве прыродазнавец, этнограф, гісторык 18 ст. Андрэй Меер, калі працаваў над «Апісан-

нем Крычаўскага графства або былога старостава». У сваёй працы ён апісаў прыроду, побыт і культуру насельніцтва на тэрыторыі цяперашніх Крычаўскага, Клімавіцкага, Хоцімскага, Касцюковіцкага і Краснапольскага раёнаў. Скарочаны варыянт яе быў надрукаваны ў 1901 г. ў «Могилевской старине».

У 1811—15 гг. у Магілёўскім духоўным вучылішчы выкладаў грэчаскую і лацінскую мовы Іван Іванавіч Грыгаровіч, беларускі гісторык афіцыйна-дваранскага кірунку, археограф і мовазнавец.

Імя генерал-фельдмаршала Міхаіла Багданавіча Барклая дэ Толі добра вядома прыхільнікам гераічнага мінулага нашай Радзімы. Нарадзіўся ён 24.12.1761 г. ў маёнтку Помуш (цяпер у Пакроўскім раёне Літвы). Граф і князь з шатландскага роду. Удзельнік руска-турэцкай 1787—91 гг. і руска-шведскай 1788—90 гг. войнаў. Са студзеня 1810 г. да верасня 1812 г. ваенны міністр. У Айчынную вайну 1812 г. галоўнакамандуючы 1-й Заходняй арміяй. Па сканчэнні вайны прызначаны галоўнакамандуючым 1-й арміяй са штаб-кватэрай у Варшаве, з 1816 г. ў Магілёве; выступаў супраць развіцця сістэмы ваенных пасяленняў. У 1817 г. суправаджаў Аляксандра I у час яго падарожжа па Беларусі. Вясной 1818 г. атрымаў водпуск, каб залячыць раны, і пакінуў Магілёў. Памёр 25.5.1818 г. ад хваробы сэрца па дарозе на лячэнне ў Германію. Пахаваны ў маёнтку Бекгоф (цяпер Йыгевестэ, Эстонія).

Палкаводцу М.Б.Барклаю дэ Толі і вялікаму рускаму паэту не суджана было сустрэцца ў Магілёве ў 1824 г. — генерала ўжо не было ў жывых. На пасаду камандуючага 1-й арміяй быў прызначаны Ф.В.Остэн-Сакен. А.С.Пушкін прысвяціў генералу Барклаю дэ Толі верш «Палкаводзец», дзе аддаў яму даніну справядлівасці.

Паэт пісаў:

О вождь несчастливый!.. Суров был
жребий твой:
Все в жертву ты принес земле
тебе чужой.
В молчанье шел один ты с мыслию
великой,
И, в имени твоем звук чуждый
не взлюбя,
Своими криками преследуя тебя,
Народ, таинственно спасаемый
тобою,
Ругался над твоей священной
сединою...

Прадстаўнік старадаўняга шляхецкага роду Бжастоўскіх Ігнацы Бжастоўскі працаваў старшынёй палаты крымінальнага суда ў Магілёве. У маі 1862 г. ён ўдзельнічаў у з'ездзе «белых» у Вільні як прадстаўнік ад Магілёўскай губерні. Адзін з кіраўнікоў паўстання 1863—64 гг.

У 19 ст. значны ўклад у вывучэнне гісторыі і прыроды Беларусі, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа зрабіў Адам Ганоры Карлавіч Кіркор. У свой час ён вучыўся ў Магілёўскай мужчынскай гімназіі. Яму належыць большасць гістарычна-этнаграфічных нарысаў пра Беларусь у 3-м томе «Живописной России» (1882).

У 19 ст. доўгі час жыў у Магілёве дваранскі гісторык, краязнавец і этнограф, вайсковы тапограф і статыстык Міхаіл Восіпавіч Без-Карніловіч. Ён аўтар шэрагу прац па беларускім гістарычным краязнаўстве, пераважна па Віцебскай і Магілёўскай губернях.

У 1848 г. начальнікам 11-й (Магілёўскай) акругі шляхоў зносін стаў працаваць 40-гадовы Мікалай Феліксавіч Ястрэбскі, ураджэнец маёнтка Барысаўшчына Рэчыцкага павета Мінскай губерні (цяпер вёска ў Хойніцкім раёне Гомельскай вобл.), выпускнік Віленскага універсітэта і інстытута Корпуса шляхоў зносін, у якім працаваў з 1832 г., лаўрэат Дзямідаўскай прэміі (1839) за двухтомны «Курс практычнай механікі». На жаль, пражыццё і дзейнасць Ястрэбскага ў Магілёве пакуль мала звестак. А між іншым паводле яго праекта і пад яго кіраўніцтвам у 1860 г. быў пабудаваны мост цераз Дняпро — папярэднік сучаснага асноўнага моста. Ён кіраваў таксама будаўніцтвам шашэйных дарог, якія вялі з Магілёва на Кіеў, Бабруйск, Доўск. Здольнасці М.Ф.Ястрэбскага адкрывалі перад ім шырокія магчымасці ў сэнсе кар'еры. Яго нават перавялі на больш высокую пасаду ў Кастрамскую губерню, але ў лютым 1863 г. ён падаў у адстаўку і застаўся ў Магілёве, дзе працягваў тэхнічны нагляд за работай паравога млына, што быў пабудаваны паводле яго праекта і пад яго непасрэдным кіраўніцтвам. Вынікам нагляду за камерцыйным бокам аднаго з першых у горадзе класічных прамысловых прадпрыемстваў з'явілася кніга Ястрэбскага — практычны дапаможнік «Галоўныя асновы двайной бухгалтэрыі», надрукаваная ў 1874 г.

З 1915 г. ў Магілёўскім архіве працаваў Дзмітрый Іванавіч Даўгяла. У 1921 г. ён стаў

загадчыкам гэтай установы, ініцыятарам стварэння ў 1924 г. ў Магілёве таварыства краязнаўцаў, якое выдала пазней зборнік-альманах «Магілёўшчына». Даўгяла — аўтар прац па гісторыі гарадоў перыяду феадалізму, адзін з выдаўцоў «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў» і «Актаў Віленскай археаграфічнай камісіі», а таксама складальнікаў («Гісторыі Беларусі ў дакументах і матэрыялах»).

СТАНІСЛАЎ ІВАНАВІЧ БОГУШ-СЕСТРАНЦЭВІЧ

Царкоўны дзеяч, вучоны, літаратар С.І.Богуш-Сестранцэвіч нарадзіўся 3.9.1731 г. ў в. Занкі Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці ў небагатай сям'і кальвіністаў. Вучыўся юнак ва універсітэтах Крулеўца (цяпер Калінінград), Франкфурта, Амстэрдама, Лондана, валодаў амаль усімі літаратурнымі мовамі. Калі вярнуўся на радзіму, бацька паспрабаваў зрабіць яго гандляром. Ужо першая камерцыйная вандроўка прайшла няўдала — Станіслаў быў абрабаваны. Пасля гэтага юнак стаў афіцэрам прускай арміі. Прынцыповасць, тэмперамент і дуэлі прывялі маладога капітана да звальнення, і ён вярнуўся дамоў, дзе ўступіў у літоўскую гвардыю. Але пасля ранення ў адной з ваенных аперацый С.І.Богуш-Сестранцэвіч падаў у адстаўку. У час настаўнічання ў Радзівілаў нешчасліва закахаўся ў каталічку. Хоць Станіслаў па яе жаданні прыняў гэту веру, шлюб не адбыўся, што і прывяло яго на духоўны шлях. У 1763 г. ён скончыў галоўную школу піяраў у Варшаве і атрымаў прыход у Гомелі.

Аўтарытэт маладога святара ўзрос пасля яго пропаведзі з нагоды няўдалага замаху на караля Рэчы Паспалітай С.Панятоўскага ў 1770 г. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. ён быў прызначаны кіраўніком новаўтворанага беларускага біскупства, якое ахоплівала фактычна ўсю каталіцкую царкву Расіі. Дзякуючы падтрымцы Кацярыны II Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч адкрыў на Беларусі школы, садзейнічаў адкрыццю Віленскага універсітэта, выступаў супраць разумовага прыгнёту і схаластыкі. У 1782 г. ён стаў магілёўскім каталіцкім архіепіскапам. С.І.Богуш-Сестранцэвіч вывучаў Беларусь, паходжанне славян, прапагандаваў ідэі гуманізму, асветніцтва. Заснаваў у Магілёве друкарню, дзе выдавалася духоўная і свецкая літаратура на рускай, польскай і лацінскай мовах. У 1783 г. ў гэтай друкарні была выдадзена вершаваная трагедыя «Гіцыя ў Таўрыдзе», якую Богуш-Сестранцэвіч прысвяціў Кацярыне II. Твор пастаўлены ў Магілёўскім тэатры, а таксама ў многіх рускіх тэатрах. У 1793 г. выйшла яго кніга «Аб Заходняй Расіі», у якой даказвалася гістарычная еднасць рускага, украінскага і беларускага народаў, віталася ўз'яднанне Беларусі з Расіяй. За час знаходжання ў Магілёве С.І.Богуш-Сестранцэвіч напісаў і выдаў шэраг грунтоўных гісторыка-краязнаўчых прац, у т.л.: «Гісторыя Таўрыі», «Аб паходжанні славян і сарматаў», «Даследаванне аб паходжанні рускай мовы», быў ініцыятарам друкавання календароў. У рукапісах засталіся «Літоўская (беларуская) граматыка», «Слоўнік роднай мовы» і іншыя літаратурныя і навуковыя творы. У 1782 г. яго спадчыну часткова выдаў А.Вярыга-Дарэўскі.

З дзейнасцю С.І.Богуша-Сестранцэвіча ў Магілёве звязана пабудова палаца (вул. Ленінская, 25), перабудова касцёла кармелітаў (Станіславаўскі касцёл). У яго рэзідэнцыі ў в. Маляцічы, што ў Крычаўскім раёне, быў узведзены архітэктурны ансамбль — паменшаная копія сабора Святога Пятра ў Рыме. Акрамя друкарні ён адкрыў у горадзе некаторыя мануфактуры і тэатр. З 1798 г. Станіслаў Іванавіч жыў і працаваў у Пецярбургу, дзе займаў пасаду мітрапаліта каталіцкай царквы. У 1813 г. ён быў абраны прэзідэнтам Вольнага эканамічнага таварыства, членам Расійскай акадэміі навук, Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі, адначасова працягваў сваю літаратурную і навуковую дзейнасць. Памёр С.І.Богуш-Сестранцэвіч 1.12.1826 г.

С.І.Богуш-Сестранцэвіч даводзіўся родным дзядзькам В.Дуніну-Марцінкевічу. Як выдатны вучоны і літаратар, царкоўны і грамадскі дзеяч ён заслугоўвае добрай памяці ў жыхароў Магілёва. *З.Яцкевіч.*

ЛЕТАПІСЕЦ ІГУМЕН АРЭСТ

Імя ігумена Арэста надоўга было выкраслена з айчыннай гісторыі. Хто ж ён, гэты чалавек-інкогніта, пра якога даследчык Е.Раманаў пісаў у свой час, што ігумен Арэст заслугоўвае асаблівага жыццяпісу і што трэба ратаваць ад часу і невукаў кожную вестку пра нашага летапісца. Што звязвае яго з Магілёвам?

Ігумен Арэст, у свецкім жыцці Ануфрый Сцяпанавіч Костка, ураджэнец мястэчка Гайшын былога Быхаўскага павета (цяпер Слаўгарадскі раён). Бацька яго быў уніятам, але потым перайшоў у праваслаўе. Будучы ігумен вучыўся ў Магілёўскай духоўнай семінарыі.

З верасня 1801 г. да снежня 1804 г. працаваў настаўнікам лацінскай мовы Невельскай духоўнай семінарыі, дзе ў 1802 г. пастрыгся ў манахі з імем Арэст. Летам 1803 г. Арэст быў удастоены святарства і ў снежні 1804 г. прызначаны камісарам магілёўскай семінарыі, але ў Магілёў не выехаў, быццам бы з-за дрэннага стану здароўя. Амаль два гады пражыў у Невелі без пасады, пакуль новы магілёўскі епіскап Варлаам не выклікаў яго ў сваю рэзідэнцыю ў Магілёў і не даручыў спачатку казначэйства, а потым і эканомства архірэйскага дома. На працягу свайго нялёгкага і складанага жыцця, зведаўшы ўзлёты і падзенні, ласку і няміласць саноўных асоб, Арэст стварыў рукапіс арыгінальнай хронікі горада Магілёва, які ўвайшоў у айчынную гістарыяграфію пад назвай «Запіскі ігумена Арэста». Той жа Е.Раманаў у адным з выпускаў «Могилевской старины» ахарактарызаваў запіскі як «адну з галоўных крыніц для вывучэння гісторыі Магілёўскага краю». Пэўнае ўяўленне пра рукапіс «Запісак» можна скласці па той яго частцы, што была надрукавана ў 2-м і 5-м тамах «Археалагічнага зборніка дакументаў» серыйнага выдання дакументаў па гісторыі Беларусі і Літвы ў 1867—1904 гг. у Вільні. Памёр Арэст у 1850 г. *А.П.Ярохін.*

ПЁТР ГЕОРГІЕВІЧ КАМБУРАЎ

На жаль, мы не маем дастатковых біяграфічных даных пра гэтага таленавітага чалавека. Вядома толькі, што нарадзіўся Пётр Георгіевіч у 1860 г. У дваццаць пять гадоў скончыў архітэктурнае аддзяленне Санкт-Пецярбургскага інстытута грамадзянскіх інжынераў, у 1887 г. прыехаў у Магілёў і пачаў сваю працоўную дзейнасць (у 1892—95 гг. губернскі, 1895—1914 гг. гарадскі архітэктар). У горадзе засталося шмат помнікаў П.Г.Камбурава. Найбольш значныя з іх — будынкі тэатра, Дзяржаўнага і Пазямельнасялянскага банкаў, жаночага епархіяльнага вучылішча. Яны і да гэтага часу застаюцца помнікамі архітэктуры.

Дэбютам маладога архітэктара ў горадзе на Дняпры быў праект тэатральнага будынка. Задума пабудаваць тэатр у губернскім горадзе зарадзілася ва ўлад яшчэ ў 1865 г. Але толькі з прыходам да кіраўніцтва губерняй А.С.Дамбавецкага справа нарэшце зрушылася. Месца для тэатральнага будынка было выбрана ў самым цэнтры горада — на перакрыжаванні Дняпроўскага праспекта і Дваранскай вуліцы (цяпер гэта вуліца Першамайская і Камсамольская), узведзены ў 1886—88 гг. У былыя часы тут праходзіў Блізкі вал і глыбокі роў перад ім.

У 1889—92 гг. паводле праекта Камбурава, выкананага з М.М.Маркавым, быў пабудаваны на Быхаўскай вуліцы (цяпер вул. Варонскага, 29) будынак Магілёўскага жаночага епархіяльнага вучылішча, дзе потым рыхтавалі хатніх настаўніц. Будынак заняў дамінуючае становішча на тэрыторыі тагачаснага Задубравенскага пасада.

Наступным творчым поспехам архітэктара П.Г.Камбурава быў праект і будаўніцтва Дзяржаўнага банка на былой Ветранай вуліцы (цяпер вул. Ленінская, 50), пабудаваны ў 1904—06 гг. Адзін з апошніх твораў нястомнага магілёўскага архітэктара — будынак Пазямельна-сялянскага банка (1912—14 гг.), размешчанага на былой Афіцэрскай вуліцы (цяпер вул. Міронава, 33).

Але ў бурныя рэвалюцыйныя гады і ў грамадзянскую вайну былі бясследна згублены магілёўскія горадабудаўнічыя дакументы, у выніку чаго да нядаўняга часу амаль ніхто з даследчыкаў не адважыўся назваць імя аўтара праекта гэтага унікальнага будынка, які сціпла стаіць у баку ад шумных вуліц, хаваючы свой арыгінальны фасад за густымі кронамі каштанаў, хоць у ім выразна праглядваецца архітэктурны почырк П.Г.Камбурава. Сумнявацца ў гэтым, бадай, не даводзіцца, бо ўнутраная планіроўка будынка і асабліва архітэктурнае афармленне галоўнага фасада — прысутныя рысы тых збудаванняў, аб якіх мы вялі размову ўпачатку: тэатра, жаночага вучылішча і Дзяржаўнага банка. *А.Кузняцоў.*

АЛЯКСАНДР ДАМБАВЕЦКІ

За 145 гадоў існавання Магілёўскай губерні яе ўзначальвалі 25 чалавек. Адны з іх, напрыклад, сапраўдныя стацкія саветнікі С.Вязміцінаў, С.Жэгулін і Ф.Мелер-Закамельскі займалі пасаду губернатара не больш як год, іншыя — М.Бакунін, І.Максімаў, С.Энгельгардт — па паўдзесятка гадоў, трэція — Н.Гамалея і А.Беклемішаў — па 10, а

вось сапраўдны стацкі саветнік Аляксандр Станіслававіч Дамбавецкі — 21 год (1872—93). Дамбавецкі застаўся ў памяці магіляўчан як добры адміністратар, які садзейнічаў пашырэнню на тэрыторыі Магілёўшчыны адукацыі, культуры і аховы здароўя. Увесь свой вольны час аддаваў краязнаўству і этнаграфіі, усямерна садзейнічаў вучоным у правядзенні археалагічных раскопак у Быхаўскім, Клімавіцкім і Чэрыкаўскім паветах.

Але да гэтага часу невядома, дзе ён нарадзіўся (гадя жыцця 1840 — каля 1914), да якога саслоўя належаў. А.С.Дамбавецкі скончыў Кіеўскі ун-т. З 1870 г. камергер, ганаровы суддзя Лідскага павета, у сакавіку 1872 г. быў прызначаны губернатарам замест В.Д.Дуніна-Баркоўскага, які пайшоў у адстаўку. Дамбавецкаму ў той час было 32 гады.

Новы губернатар сканцэнтраваў сваю дзейнасць не на барацьбе з нарастаючым рэвалюцыйным рухам, а на канкрэтных гаспадарчых справах, якія былі накіраваны на паляпшэнне сацыяльных умоў жыцця народа. У першы год службы па ініцыятыве А.С.Дамбавецкага на месцы згарэлага ў 1708 г. замка і развалін бастыённых умацаванняў быў пасаджаны парк, спланавана і забудавана Гандлёвая, а потым Губернатарская плошчы.

Аляксандр Станіслававіч аддаваў шмат увагі развіццю сістэмы навучальных устаноў: здабыў сродкі для ўзвядзення ў Магілёве будынка жаночай гімназіі, па яго ініцыятыве была адкрыта фельчарская школа. Для паспяховай дзейнасці прамысловых прадпрыемстваў у горадзе ўтворана некалькі крэдытных устаноў. Зыходзячы з практычных мэт, А.С.Дамбавецкі задумаў скласці падрабязнае апісанне магілёўскага Прыдняпроўя ў геаграфічным, гістарычным і этнаграфічным аспектах, стану і развіцця прамысловасці, лясной і сельскай гаспадарак, культурна-асветных устаноў, народнай адукацыі і медыцыны. Падрыхтаваў план гэтай унікальнай навуковай працы і як старшыня губернскага статыстычнага камітэта даручыў падначаленым яму чыноўнікам сабраць неабходныя для кнігі звесткі. Да апрацоўкі сабраных матэрыялаў Дамбавецкі прыцягнуў каля 20 мясцовых спецыялістаў розных галін ведаў.

Праца ў трох тамах пад назвай «Спроба апісання Магілёўскай губерні ў гістарычных, фізіка-геаграфічных, этнаграфічных, прамысловых, сельскагаспадарчых, лясных, вучэбных, медыцынскіх і статыстычных адносінах» была выдадзена друкарняй губернскага праўлення ў 1882—84 гг. Трохтомнік ілюстраваны мноствам гравюр і малюнкаў магілёўскіх мастакоў. У асяроддзі гісторыкаў і краязнаўцаў гэты трохтомнік вядомы пад назвай «Хроніка А.С.Дамбавецкага», ён адзін з унікальных помнікаў гісторыі беларускага Прыдняпроўя.

А.С.Дамбавецкі нямала зрабіў для таго, каб Магілёў стаў адным з буйнейшых беларускіх кнігавыдавецкіх цэнтраў.

Быў ініцыятарам адкрыцця Магілёўскага музея (1879), у выніку чаго ўтварылася некалькі яго аддзелаў: гістарычны, этнаграфічны, геаграфічны.

Губернатарства А.С.Дамбавецкага было адзначана яшчэ адной падзеяй у культурным жыцці Магілёўшчыны — пабудовай у Магілёве арыгінальнага архітэктурнага будынка драматычнага тэатра. Па закліку губернатара ў будаўніцтве тэатра актыўна ўдзельнічала насельніцтва горада, якое сабрала, як паведамлялася ў 2-м томе «Спроба апісання Магілёўскай губерні...», да 4000 рублёў ахвяраванняў. Першы тэатральны сезон быў адкрыты драматычнай трупай антрэпрэнёра Г.Дзеркача. Яна паставіла ў горадзе спектаклі паводле п'ес «Рэвізор» М.Гогаля, «Маскарад» М.Лермантава, «Без віны вінаватыя» А.Астроўскага і «Другая маладосць» П.Нявежына. Пазней магіляўчане пазнаёміліся са сцэнічным мастацтвам не толькі рускіх, але і ўкраінскіх і польскіх тэатральных трупп.

Магілёўскі губернатар падтрымліваў правядзенне і ўваходзіў у падрыхтоўчы камітэт 9-га археалагічнага з'езда. Актыўна садзейнічаў У.З.Завітневічу, М.В.Фурсаву, Е.Р.Раманаву і С.Ю.Чалоўскаму ў вывучэнні імі гісторыі Магілёўшчыны і правядзенні шматлікіх археалагічных раскопак. Не без яго дапамогі і падтрымкі былі напісаны, а потым выдадзены кнігі М.В.Фурсава і С.Ю.Чалоўскага «Дзённік курганных раскопак...» (1892), У.З.Завітневіча «Археалагічныя адшуканні ў басейне ракі Бярэзіны», Е.Р.Раманава «Археалагічная карта Магілёўскай губерні» і інш.

А.С.Дамбавецкі ўнёс у жыццё Магілёва і такія на той час новаўвядзенні, як водаправоднае забеспячэнне цэнтральных вуліц горада і тэлефанізацыю каля 70 губернскіх і гарадскіх устаноў.

Ў 1893 г. А.С.Дамбавецкі пераехаў у Пецярбург. *Б.Гардзееў.*

Магілёў — прыгожы горад, магілёўцы — працавіты народ

(з хронікі А.С.Дамбавецкага)

Могилев на Днепре... лежит... в 729 верстах к югу от С.-Петербурга и в 560 верстах к юго-западу от Москвы, при Киевском шоссе... Могилев расположен по обоим берегам Днепра и речки Дубровенки, при впадении последней в Днепр, и имеет в окружности с предместьями приблизительно около 13 верст...

Могилев по всем направлениям расположен на холмистом волнообразном пространстве. Со стороны Московского предместья, т.е. от так называемой «Черниговской заставы», высокий берег Днепра и развернувшийся на нем, в густой зелени деревьев, город, издали, версты за 2, за 3, откуда наиболее выдаются видоизменения местности, представляет истинно прекрасный вид. Храмы и лучшие каменные здания группируются вдоль крутого берега и своею белою блестящею массой надвигаются к краю его, словно стремясь заглянуть в быстрые воды Днепра. Прямо перед глазами зрителя виднеется Спасо-Преображенская церковь, архиерейский дом и главный корпус духовной семинарии; за ними высится колокольня Братского монастыря (самое высокое здание в городе), и горят кресты Воскресенской церкви. Немного левее видна башня городской ратуши и задний фасад здания губернского правления, за которым зеленеет крыша губернаторского дома. Вдали и много правее от Спасской церкви привлекают внимание утопающие в садах здания богоугодных заведений; а за ними эта сторона города как бы убегает, извиваясь в зелени, в синеющую лесом даль возвышенности «Мышаковки». В низине этой живописной картины... виднеется красующаяся среди массы небольших деревянных домов шестиглавая Николаевская церковь.

Направляясь к городу... по Бобруйскому шоссе, приходится прежде всего проехать через Черниговскую браму, а затем через Московское предместье, находящееся на левой низменной стороне Днепра, а именно через ту его часть, которая с давних пор носит название «Луполово»... Главная улица Московского предместья... оканчивается деревянным мостом, на устоях, через Днепр.

Перейдя этот мост, вы на правом берегу реки вступаете на улицу «Днепровский подъем», прорезающую естественный холм и ведущую в центр города. Над нею возвышается весьма высокою стеною искусственный вал, остаток укреплений бывшего королевского замка... На верху этой горы разбит осенью 1872 г. городской сад... Летом 1881 г. в этом саду устроен фонтан, составляющий одно из сооружений Днепровского водопровода.

... Ниже Днепровского подъема, вправо от моста, идет под гору по второму ее уступу Школьная улица, ведущая в часть города, называемую «Школище», где особенно скучено еврейское население... В начале улицы, лицом к ней, построены над Днепром каменные здания водопровода. За ними открывается спуск к недавно устроенной пароходной пристани и возле нее, на самом берегу реки, стоит каменное здание основанного в 1687 г. и упраздненного в 1864 г. римско-католического Бернардинского монастыря (костел Св. Антония)... Тут же... находится каменная Вознесенско-Покровская церковь, постройка которой начата в 1668 году.

Влево от Днепровского моста, у подножья вала, находится другой каменный пивоваренный завод. От него идет несколько волнообразно улица Быховская, по которой продолжается Бобруйское шоссе... На левой стороне построенного через Дубровенку моста, при самом устье реки, находится деревянная водная мельница... За мостом открывается влево недавно вымощенная камнем улица, ведущая к Успенской церкви, стоящей на берегу Днепра на небольшом холме; церковь эта начата постройкою в 1670 г. Прямо от моста по направлению Быховской улицы вы встретите каменное здание духовного училища... В конце улицы, за брамою (именуемою Быховскою), на шоссе находится большой каменный корпус бывшего военного госпиталя и провиантский магазин, а тотчас за ним — небольшая оранжерея и парники садовника Бланка.

Поднявшись к Днепровскому подъему и взяв от него вправо, вы увидите Могилев раскрывающимся перед вами со всеми заурядностями и особенностями губернского города. В прямом направлении идет по краю обрывистой горы так называемый «архиерейский вал», упирающийся в искусственную насыпь, известную в народе под именем Кастерни... Влево глазам вашим представляется пло-

щадь, среди которой разбит, в форме правильного круга, сквер, называемый Беклемишевским... В центре сквера находятся солнечные часы, они поставлены... на пьедестале из пушки, отнятой у французов в 1812 году.

От Беклемишевского сквера идут две большие, прямые и самые лучшие улицы: «Днепровский проспект» (бывшая Шкловская) и «Большая Садовая» (б. Ветреная), расходящиеся между собой в дальнейшем своем направлении.

На Днепровском проспекте почти все постройки каменные, деревянные весьма редки и оставляются доживать свой век, постепенно заменяясь каменными. В начале улицы расположены... 1) губернский архив... в нижнем этаже которого помещается публичная библиотека и музей; 2) Братский Богоявленский монастырь... в строениях которого находится длинный ряд лавок; 3) Воскресенская церковь. За нею... начинается бульварная площадь, которая, простираясь до Большой Садовой улицы, занимает более 1 1/4 десятины. На этой площади разбит небольшой сад, обязанный своим существованием бывшему в 1828—31 годах губернатору М.Н.Муравьеву и потому именуемый Муравьевским... Вообще это место есть самое бойкое в городе. На одном из углов площади находится дом дворянства, а возле него, во дворе, костел во имя Успенья Пресвятой Богородицы... Костел построен в 1692 г. прославленными гражданами Могилева... по велению короля Яна III Собеского, в наказание за убиение помещика Зеньковича.. На противоположной стороне Муравьевского сада находится второй приходской костел — Фара, построенный в 1604 г.; при нем дом, в котором помещается банк Могилевского общества взаимного кредита. За бульварной площадью, далее по Днепровскому проспекту, ведущему на Шкловский тракт, встретятся: 1) полусгоревшее громадное каменное здание... которое до пожара 1871 г. служило казармами местных войск... 2) Наискось от казарм — кафедральный собор во имя Св. Иосифа Обручника; 3) трехэтажное каменное здание женской гимназии и 4) на конце уже города довольно обширный, каменный двухэтажный тюремный замок, а за ним так называемые «жандармские казармы», тоже 2-этажное каменное здание, пожертвованное городом в 1880 г. под реальное училище.

Большая Садовая улица в начале... довольно узка, некоторые из расположенных здесь домов существуют еще с XVIII столетия. По ней идет непрерывный ряд мелких еврейских лавок... В ряду исключительно каменных построек в узкой части этой улицы находятся... замечательные каменные здания: 1) архиерейский дом, построенный Преосвященным Георгием Канисским... 2) Спасо-Преображенская церковь, внутри двора архиерейского дома... в ней похоронен, в числе других архиереев, и Канисский, скончавшийся 13 февраля 1795 г. Во дворе архиерейского дома помещается и духовная консистория. 3) Духовная семинария, рядом с архиерейским домом...

За Муравьевским садом на правой стороне Большой Садовой встречаются: каменная еврейская синагога... губернская почтовая контора.., мужская гимназия — двухэтажное каменное здание — капитально перестроенное и значительно расширенное в 1878—79 гг.; при ней... дом, в котором открыта в 1880 г. общая ученическая квартира для гимназистов. Против гимназии... находится деревянная лютеранская церковь.

Днепровский проспект и Большая Садовая улица... пересекаются улицами: Дворянскою, Почтовою, торговою площадью, известною под названием Шкловского базара, и Офицерской улицею.

Дворянская улица... оканчивается в обе стороны вымощенными спусками с возвышенного городского центра. Спуск налево образует Виленскую улицу, ведущую... к почтовой дороге на Вильну.

... Малая Садовая улица (бывшая Зеленая) параллельна Большой Садовой. На ней находится табачная фабрика, Николаевский детский приют и напротив него в 1881 г. построены 2 довольно обширных деревянных дома для городского училища и ремесленных при нем классов...

На Почтовой улице, идущей мимо дома почтовой конторы расположен... 2-этажный дом с каменными надворными постройками, где помещается пожарная команда и полицейское управление... На другом конце улицы находится весьма красивое деревянное здание центральной фельдшерской школы, построенное в 1874 г., а за ним... по краю обрыва... тянутся каменные здания богоугодных заведений...

Торговая площадь (Шкловский базар) идет за зданиями мужской гимназии и занимает около 3 десятин; опираясь на концы 4-х улиц (Днепровского проспекта, Большой и Малой Садовых и еще незастроенной За-

польской), базарная площадь тянется до так называемого «Дебрянского оврага», где приютилось бедное, преимущественно христианское, население. Площадь эта... служит местом базара в торговые дни недели: среду, пятницу и воскресенье...

На окраине города от Дебрянского оврага к Днепровскому проспекту тянется Офицерская улица, отличающаяся своей шириной...

Из числа отдельных местностей города заслуживает внимания та его часть, которая называется по имени протекающей по ней речки Дубровенки... Город тут является словно рассыпанным... по косогорам; на господствующих... высотах... красуется Крестовоздвиженская (тоже Борисо-Глебская) церковь с голубым звездообразным куполом...

... возвышенная над рекою местность (над Успенской церковью) называется «Самусева гора», где похоронен русский гарнизон, вырезанный могилевцами в 1661 г. На насыпном холме, под которым покоятся кости убитых солдат, поставлен небольшой деревянный крест...

Спустившись по Завальной улице к берегу Днепра, вы увидите направо каменную паровую мельницу помещика Жуковского, за которой вплоть до Буйнич пойдут высокие холмы, прорезанные крутыми живописными оврагами, а прямо по ту сторону Днепра — военный лагерь.

Лагерь отведен для четырех полков 16-й пехотной дивизии: Владимирского, Суздальского, Угличского и Казанского и для 16-й артиллерийской бригады...

* * *

Состояние г. Могилева в отношении благоустройства, образованности и наружного вида довольно улучшилось за последнее время, несмотря на постепенный упадок в нем промышленности и торговли, обусловливаемый отсутствием железной дороги и произошедшим вследствие этого отделением от него всякого жизненного движения.

Возникшее в 1872 г. стремление к улучшению внешних гигиенических условий жизни городов губернии привело к убеждению в необходимости устройства в Могилеве водопровода для более удобного снабжения нагорных жителей водой — этим необходимым для существования и для защиты от пожаров элементом первейшей потребности. Изыскивались и обсуждались различные меры и способы для осуществления этого предложения, и в 1874 г. дело было приведено к концу...

Могилеву недостает здания для театра. На постройку его собрано до 4000 руб...

В настоящее время в Могилеве домов: каменных 263 (из них принадлежат христианам 92 и евреям 171), деревянных 3243 (принадлежащих христианам 2310 и евреям 933); домовладельцев 2371, из них христиан 1509 и евреев 862.

Лавок, составляющих отдельные от домов строения: каменных 143 и деревянных 351; магазинов для склада товаров: каменных 6 и деревянных 7.

Церквей православных: каменных 21 и деревянных 8...

Костелов римско-католических 3, из них — два каменных приходских и один деревянный кладбищенский. Евангелическо-лютеранская церковь деревянная 1. Еврейских синагог 2 и молитвенных школ 36, из числа их каменных 13.

Всех учебных заведений в городе, не считая детского приюта, 15; именно: мужская и женская гимназии, духовная семинария, духовное училище, центральная фельдшерская и центральная повивальная школы, городское училище с ремесленными классами; приходское училище; мужское с ремесленным отделением и женское; мужское и женское еврейское народные училища; 4-классное женское училище, женская одноклассная подготовительная школа, 3-классное еврейское женское училище и элементарная одноклассная школа русской грамотности для бедных еврейских девочек. Еврейских хедеров 44.

Библиотек, доступных обществу, 4: Публичная, при Собрании (клуба) и две частных, из коих при одной устроен кабинет для чтения; типографий 3: одна при губернском правлении и 2 частных, фотографий 3.

Жителей в городе к 1880 году числилось 20 735 душ мужского и 19 801 женского пола; в том числе православных 10 824 мужчин и 9918 женщин, католиков 1290 мужчин и 1293 женщины, лютеран 122 мужчины и 51 женщина и евреев 8488 мужчин и 8539 женщин.

Занятие и промышленность жителей гор. Могилева

Христианское население города, за исключением привилегированного класса, занимается по преимуществу: огородничеством, садоводством, рыболовством, выделкою кож, конопляного масла, глиняной посуды и неко-

торыми ремеслами. Торговля же, как и большая часть ремесел, сосредотачивается исключительно в руках евреев.

Огородничество. Удобное огородной земли считается в городе до 300 десятин... на которой с успехом произрастает капуста и огурцы. Капусты продается ежегодно до 20 000 пудов, на сумму 5000 руб., огурцов на 7000 руб., продажа остальных овощей, как-то картофеля, свеклы, моркови, репы, редьки, редиса, петрушки, лука и т.п. простирается до 15 000 рублей.

Садоводство. В городе считается до 100 десятин земли, засаженной фруктовыми деревьями (яблоки, груши, сливы, вишни) и кустами; доходность с тех и других, средним числом, достигается 20 000 рублей. Яблоки и груши... вывозятся в Смоленск, Москву, Витебск и Псков, а частью расходятся на месте.

Рыбная ловля. Ловлею рыбы занимаются до 70 человек ежегодно в течение 30 недель; причем добывается от 1500 до 2000 пудов разной рыбы... на сумму около 8000 руб. Почти все эти рыболовы с наступлением зимнего времени занимаются выделкой простых роговых гребней...

Выделка кож. Выделка сырых кож была одним из старейших по времени ремесел в Могилеве и составляла предмет даже заграничной торговли. В настоящее время ею занимаются до 300 человек и обрабатывают свыше 33 000 кож...

Чемоданное мастерство. Приготовлением чемоданов занимаются, преимущественно в зимнее время, местные мещане-христиане, которых всего три мастера; летом они промышляют съемом садов, огородов, лугов. Оборот всего прооизводства доходил до 1600 рублей.

Сапожное мастерство. Сапожничеством в городе занимаются 300 человек; из них считается 166 мастеров (евреев только 36) и 134 подмастерья (евреев 54). Из мастеров имеют мастерские около 15-ти человек; остальные работают большей частью одиночно...

Выделка конопляного масла. Выделкой конопляного масла, также одним из старейших производств Могилева, занимается ныне до 40 человек, перерабатывая в течение года (ручными приспособлениями) около 14 500 пудов конопляного семени. Масла выделывается 3600 пудов..

Выделка глиняной посуды. Гончаров, выделывающих равную простую посуду, считается в городе 18 человек, из них которые работают только в зимнее время и то в течение 2—3-х месяцев.

Кроме означенных промыслов и ремесел жители города занимаются и другими разного рода ремеслами, как-то: портняжеским, столярным, токарным, шорным и т.п.

... Легковым извозом в городе занимаются по преимуществу христиане, а ломовым — евреи; пароконных извозчиков легковых 43, одноконных 9, ломовых 133, зимовых или временных около 65.

В городе находятся следующие промышленные заведения: четыре крупных и до 60 малых кожевенных заводов; завод для выделки мехов зверей...; табачная фабрика, три пивоваренных завода, три дрожжевых завода; паровая мукомольная мельница; восемь круподерен; водочный завод; четыре свечных... завода; завод для выделки из крови альбумина (вещество, употребляемое для красок) и три пенько-трепальных заведения...

* * *

Говоря о Могилеве, нельзя не упомянуть об одной характеристической особенности, которой ежегодно подвергаются береговые местности города; это затопление их рекою Днепром.

Во время весенних днепровских разливов, продолжающихся около шести недель, прибывающая вода затапливает постепенно местность «Больнье», лежащую по правую сторону реки, и «Троечье» — по левую сторону. Скромные огороды, покрытые летом сочною зеленью огурцов, лука и капусты, представляют из себя весною Венецианские лагуны, по которым снуют взад и вперед Могилевские гондолы, менее поэтичные Венецианских. Затапливается до ста домов со всеми надворными постройками, но вреда от этого никакого не бывает...

Друкуецца са скарачэннямі па кн.:
«Опыт описания Могилевской губернии...»
(Сост. по программе и под ред.
А.С.Дембовецкого). Кн. 2. Могилев, 1884.
С. 1—18, 24—227, 31—33.

З побыту гараджан

Магілёў належыць да Падняпроўскага гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Беларусі. Уваходжанне горада ў розныя дзяржаўна-палітычныя ўтварэнні ўнесла свае асаблівасці ў культуру яго насельніцтва. Магілёў з далёкіх часоў вядомы як буйны цэнтр рамёстваў і мастацкіх промыслаў. У 14—16 ст. тут развіваліся кавальства, ткацтва, мастацкая апрацоўка дрэва, скуры, металаў (ліццё, коўка, чаканка), ружэйная справа, ювелірнае мастацтва. Пра гэта сведчаць матэрыялы археалагічных раскопак і знаходак на тэрыторыі горада. Ювелірнае рамяство старажытнага Магілёва прадстаўлена шкляными пазалочанымі пацеркамі, пярсцёнкамі, медальёнамі з выявамі святых і хрысціянскай сімволікай. Вытанчанасцю і прыгажосцю вылучаюцца бранзалеты, засцежкі, спражкі, фігурныя шпількі і іншыя бытавыя вырабы. Вялікая ўвага аддавалася інкрустацыі каляровымі і высакароднымі металамі, чаканцы. Вырабы з косці (розныя накладкі, грабяні, дзяржанні нажоў) упрыгожваліся пераважна цыркульным узорам. У 17 ст. у сувязі з арганізацыяй кавальскіх цэхаў высокага ўзроўню ў Магілёве дасягнула мастацкае ліццё і коўка металу. Выраблялі алавянны посуд, ліхтары, гарматы, званы, пазалочаныя і пасярэбраныя рэчы з медзі, жалеза і інш. У Магілёве і ваколіцах былі пашыраны разьба па дрэве, выраб керамікі: посуду, цацак, свяцільняў, кафлі, цэглы, рукамыйнікаў і іншых прадметаў хатняга ўжытку. Гаршкі з прамой шыйкай і косым або закругленым краем венчыка, макітры ў канцы 15—16 ст. аздаблялі хвалістым арнаментам або наколкамі, насечкамі. Традыцыі арнаментацыі непаліваных гаршкоў захоўваліся да 17—18 ст. З 16 ст. пашырылася вытворчасць паліванай і чорна-задымленай керамікі. У 17—18 ст. выраблялі гаршкі, кубкі, куфлі, міскі, глякі, талеркі. Паліваны посуд (міскі і талеркі) упрыгожвалі арнаментам у выглядзе кругоў і кветак, збаны з вялікай ручкай — адбіткам пальцаў на яе краях і арнаментам у выглядзе наляпных кветак на плечуках, куфлі — выявамі гарадскога герба і пакрывалі зялёнай палівай. У 2-й палавіне 17—18 ст. посуд (талеркі, збаны) аздаблялі ангобнай размалёўкай пераважна з геаметрычным і раслінным арнаментам.

Вялікім попытам карысталася магілёўская кафля. У канцы 15—16 ст. выраблялася кафля гаршковая, з круглым вусцем, некаторыя вырабы пакрывалі знутры зялёнай палівай. Кафля канца 16—20 ст. каробчатая (тэракотавая, зялёна паліваная, паліхромная). Для паліхромнай кафлі 17 ст. выкарыстоўвалі белую, зялёную, блакітную, карычневую, жоўтую паліву. У канцы 16 — 1-й палавіне 17 ст. кафля была з двухпрыступкавай рамкай на вонкавай пласціне. Паводле тыпаў і прызначэння магілёўская кафля падзялялася на сце-



Магілёўская кераміка. Збан. 17—18 ст. (злева); свяцільні. 18—19 ст. (уверсе справа); посуд. 17—18 ст.

навую, карнізную (простую, складаную і інш.), паясную, вуглавую, кафлі-перамычкі, гарадкі (каронкі). У аздабленні пераважалі раслінны (выява букета кветак у вазе, дубовыя і лаўровыя лісты, бутон хмелю і інш.) і геаметрычны (зігзагі, сетка, «рыбіна луска» і інш.) арнаменты, сюжэтныя, зааморфныя, геральдычныя, міфалагічныя выявы (ільвы, арлы, грыфоны, анёлы, коннікі, гербы і інш.). Некаторыя кафлі датаваныя. Кафля канца 17 — пачатку 18 ст. вылучалася так званым «дывановым арнаментам», рэльефнымі выявамі, у канцы 18—19 ст. яна мела гладкую вонкавую пласціну, якая была пакрыта пераважна зялёнай палівай. У канцы 19 — пачатку 20 ст. паверхню вонкавай пласціны аздаблялі складаным рэльефным малюнкам.

У 17—19 ст. сваім майстэрствам славіліся магілёўскія шкловыдзімальшчыкі. Сталовы посуд выраблялі часцей за ўсё свабодным фармаваннем з бясколернай і слаба афарбаванай масы (зеленаватага, светла-зялёнага і светла-жоўтага колераў), пасудзіны для лякарстваў, захоўвання і транспартавання вадкасцей — з бясколернай, часцей зеленаватай масы. Бутэлькі выдзімаліся ў формы, аздабляліся вакол рыльцаў адзінарнымі або двайнымі жгутамі ці стужкамі. Вырабы 19 ст. адрозніваліся пячаткамі з нізкарэльефнымі надпісамі. Цыліндрычныя бутлі мелі паддоны і высокія вузкія шыйкі, у шарападобных яны адсутнічалі, былі з адагнутымі вонкі рыльцамі. Шара- і грушападобныя бутлі (на кальцавых паддонах і без іх) з круглымі жгутамі вакол шыек і шырокімі стужкамі вакол рыльцаў. Збаны былі шара- і грушападобнай формы. Кварты выдзімалі розных памераў з кароткімі шыйкамі і пераважна прамымі плечукамі, шкляніцы — цыліндрычныя на хвалепадобных і кальцавых паддонах. Чаркі і шклянкі канічныя і цыліндрычныя фармаваліся адвольна з жалабатымі сценкамі. Шклянкі ў 18 ст. гравіравалі. У 17 ст. магілёўскае шкло вывозілі на продаж у Маскоўскую дзяржаву.

У Падняпроўі склаўся свой традыцыйны комплекс беларускага адзення, т. зв. «магілёўскі строй». Летні жаночы гарнітур уяўляў сабой пераважна 2 варыянты-комплексы: кашуля, спадніца, фартух; кашуля, спадніца, фартух, гарсэт. Кашулю шылі з прамымі плечавымі ўстаўкамі і адносна вузкім рукавом, адкладным, радзей вузкім стаячым, каўняром. Арнамент натыкання і вышыўкі ў большасці сваёй чырвоны з украпінамі чорнага,



Магілёўская разьба. Франтон і фрагмент франтона жылога дома.

кампанаваўся ў палосы на плечавых устаўках і рукавах (паралельна лініі ўточкі), на каўняры. Аднак пераважалі геаметрычныя (ромбы, крыжы, зорачкі) і раслінныя (васількі, бярозка) узоры. Суконная спадніца (андарак, саян) была чырвона-малінавая з белай, зялёнай, сіняй, чорнай клеткай, палатняная (бяляк) — гладка-белая ці клятчастая шэра-белая з арнаментальным шлякам на падоле. Падпяразваліся магіляўчанкі вузкім дэкаратыўным поясам. Фартух-трыпольнік складаўся з 3 полак белага палатна. Гарсэт (кабат) шылі з сіняга, чырвонага аксаміту, шарсцянкі з баскай у выглядзе клінкоў або прышывалі да спадніцы, аздаблялі нашыўкамі тасьмы. Галаўныя ўборы — чапец, намітка, даматканая хустка, якія ўпрыгожваліся вышытымі пацеркамі, абразкамі, крыжыкамі або нашыўкамі мохрыкаў.

Комплекс мужчынскага адзення — кашуля з багата вышытай манішкай і беласуконнымі нагавіцамі, суконныя ці палатняныя камізэлькі са стаячым каўняром. Насілі таксама шыйныя даматканыя хустачкі-шалікі з вы-

шытым чырвоным арнаментам на канцах. Галаўныя уборы — каўпаковыя магеркі альбо футравапкі. Мужчынскае і жаночае адзенне дапаўнялі белыя світы з вышыўкай, нашыўкай тасьмы і шнура. Гэтыя комплексы адзення, напэўна, былі занесены з вёсак, бо на кірмашах і святах сяляне і гараджане выглядалі амаль аднолькава.

У Падняпроўі, як і па ўсёй Беларусі, тканіны для вырабу адзення і прадметаў хатняга ўжытку былі пераважна даматканыя. Сыравінай здаўна служылі лён, воўна. Ткацтва з'яўлялася адным з галоўных заняткаў жанчын. Усе работы па апрацоўцы сыравіны і падрыхтоўцы яе да ткання выконваліся ўручную. Для тканін Падняпроўя характэрна яркая дэкаратыўнасць, арнаментальная насычанасць, выкарыстанне розных тэхнік ткання, сярод якіх найбольш развіта бранае двухуточнае (натыкалі жаночае адзенне і ручнікі). З 18 ст. вядомы магілёўскія ручнікі. Ткалі іх з ільняных і баваўняных нітак даўжынёй 300—450 см, шырынёй 35—40 см, арнамент займаў 30—80 см на кожным канцы. Тэхніка ткання — браная і закладаная, на канцах па 3—5 гарызантальных палос, што аддзелены адна ад адной гладказатканымі палосамі. З аднаго краю ўздоўж праходзіць суцэльная арнаментальная паласа, праз пэўныя прамежкі чаргуюцца вытканыя або вышытыя асобныя арнаментальныя матывы: чатырохвугольнік, ромб, крыжык, трохвугольнік, зорачка і інш. На канцах ручнікоў белыя карункі (часам чырвоныя) з кутасамі.

З 16 ст., калі Магілёў атрымаў магдэбургскае права, галоўную частку насельніцтва горада складалі рамесна-купецкі люд і мяшчане праваслаўнага, уніяцкага і каталіцкага веравызнання. У канцы 19 ст. ў горадзе было амаль 10 тысяч мяшчан (7701 карэнны і 2267 прыпісных, пераважна праваслаўных). У мяшчан быў свой уклад жыцця і побыт, але шмат чаго агульнага яны мелі і з простым людам. Мяшчанскі двор у асноўным чатырохвугольны, з хатай, надворнымі будынкамі, варотамі з брамкай. Дом звычайна падзяляўся на чыстую палавіну — святліцу і рабочую хату з каморай. Абагравалася святліца грубкай, хата — рускай печчу. Падлога фарбавалася ў белы колер. На вокнах кветкі, каля ганка лаўка для адпачынку. На падворку стаялі свіран, хлявы, хлевушкі, павеці і абавязкова баня, побач трымалі сабаку на ланцугу. Усе будынкі былі драўляныя, таму ў Магілёве неаднаразова здараліся знішчальныя пажары. Іры мяшчанскім двары знаходзіўся агарод, сад, на ўскраіне горада большасць гараджан мела другі агарод ці луг. Пры першай магчымасці кожная сям'я імкнулася прыдбаць дадатковы кавалак зямлі, «бо яна не гарыць і ня тоне», так казалі магіляўчане. Дом, агарод, сенажаці, жывёла, рамесныя прылады працы былі галоўным багаццем мяшчан.

З цягам часу, у залежнасці ад дастатку гаспадаркі, мянялася і адзенне мяшчан. У 17 ст. можна было сустрэць мужчыну ў суконным сурдуце, пад якім была атласная камізэлька, чорная шаўковая касынка на шыі і чорны картуз на галаве, суконныя шаравары, скуранья боты. Зімой заможны мешчанін ганарліва хадзіў у каракулевым футры. Жанчыны паступова сталі апранаць паркалёвыя



Магілёўская кафля (злева направа): 17 ст., канца 17 — пачатку 18 ст., канца 19 — пачатку 20 ст.

сукенкі з фартухом, галаву павязвалі хусткай, маладыя светлай, старэйшыя цёмнай. Зімой мяшчанкі з заможных сем'яў насілі футравыя шубкі. Кожны член сям'і меў будзённае і святочнае адзенне.

Былі ў мяшчан і свае асаблівасці ў вядзенні гаспадаркі. Большасць з іх не трымала коней Яны казалі: «Зімой конь каня з'есць». Меркавалі, што больш выгадна купіць каня ў Чавусах ці Шклове, адпрацаваць на ім лета, а ўвосень прадаць. Мяшчане трымалі кароў, частку малака прадавалі, у малако крыху дабаўлялі вады, інакш «карова не будзе здарова». Існавала таксама павер'е, што залішняя хвала спажыўцом малака магла сурочыць жывёліну. У гаспадарцы заможнага мешчаніна было 5—7 свіней: для сваіх патрэб, на продаж і на развод. Кожны гаспадар меў пад павеццю сані, калёсы, збрую, а ў падполлі бочкі, кадкі, цэбры і інш. Нельга не адзначыць вялікую ашчаднасць і нават скупасць магілёўскіх мяшчан. Яны заўсёды прыхоўвалі грошы на чорны дзень. Прадаўшы тавар, ніколі не гаварылі сапраўдную цану, заўсёды яе памяншалі, розніцу прыхоўвалі. Здаралася, што пасля смерці каго-небудзь з гаспадароў у хаце ў розных месцах знаходзілі прыхаваныя грошы, іншы раз — у латках старога адзення, якое было выкінута ці аддадзена жабракам. Заможныя мяшчане харчаваліся добра, шмат у каго быў самавар для чаю. Усе гараджане мяшчанскага саслоўя абавязкова займаліся якім-небудзь рамяством, выгаднай для сям'і справай.

Жыццёвыя звычаі гараджан рэгуляваліся царкоўнымі канонамі і прадпісаннямі, якія строга і старанна выконваліся. У вялікі пост, напрыклад, магілёўскія мяшчане адпраўляліся на багамолле ў Кіеў. Група з 15—20 чалавек дабіралася туды за тыдзень і гавела ў Кіева-Пячэрскай лаўры. Там багамольцы набывалі царкоўныя кнігі, абразы, крыжы. У горадзе цяжка было знайсці сям'ю, якая б не ўдзельнічала ў такіх вандроўках. Мяшчане пасціліся вельмі строга, нават у часы халерных эпідэмій ў Магілёве ў 1848, 1849 і 1871 г., калі духавенства дазваляла спажываць мясную ежу. «Лепш памру, але не парушу святога посту», — гаварыла адна з хворых мяшчанак.

У Духаўскія дні па 2—3 сям'і, у якіх былі хлопцы ці дзяўчаты, выходзілі ў прыгарадныя гаі на так званыя «маёўкі», дзе пілі чай, гарэлку, розныя наліўкі. Вярталіся дамоў добра «падгуляўшыя». Цікава, што магілёўскія мяшчане не спявалі ў гасцях ці дома. Тых, хто спрабаваў спяваць на «маёўках», супакойвалі, палохалі паліцыяй. Затое і малыя, і старыя шмат спявалі ў царкоўных харах. Сярод мяшчан была пашырана мянушка «кулажнік» Тлумачылася гэта тым, што некалі ў горадзе для простага люду выраблялася немудрагелістая прысмака — кулага, густая мешаніна з ягад каліны, жытняй мукі і мёду. У час продажу яе гаспадар кулагі апускаў руку па самы локаць у месіва і здымаў прыліпшае цеста пакупніку. Гэта была своеасаблівая мерка. Звычайна вырабам і продажам кулагі займаліся бяднейшыя, дробныя гандляры, якія вылучаліся сварлівым характарам, крыклівасцю, не заўсёды былі сумленныя. Вось іх і празвалі кулажнікамі, пасля такая мянушка прысвойвалася ўсім, хто ўдзельнічаў у базарных сварках.



Традыцыйны касцюм дзяўчыны. Канец 19 ст.

Сур'ёзнай справай у мяшчан было вяселле. Хлопцу, які збіраўся жаніцца, будавалі двор, дзяўчыне збіралі пасаг. Рабілі для таго, каб маладыя адразу станавіліся на ўласную гаспадарку. Да жаніцьбы бацькі маладых складалі шлюбны кантракт, дзе агаворвалі ўсе пытанні вяселля і далейшага жыцця маладых. Даследчыкі мінулага вылучылі агульныя рысы магілёўскіх мяшчан — набожнасць, працалюбівасць, ашчаднасць, п'ян-

ства, недахоп адукацыі. Вельмі абразлівым у іх асяроддзі было слова «гультай».

Другой, пасля мяшчан, даволі значнай этна-культурнай часткай насельніцтва Магілёва былі яўрэі. У горадзе яны вядомы з 16 ст., займаліся вінакурэннем, піваварэннем, мёдаварэннем, трымалі корчмы і заезныя дамы, утрымлівалі ў сваіх руках аптовы гандаль, медыцыну, многія рамёствы. Сутыкненне інтарэсаў яўрэйскай абшчыны з хрысціянскай гандлёва-рамесніцкай часткай гараджан выклікала канкурэнтную барацьбу. З увядзеннем у Расійскай імперыі мяжы аселасці колькасць яўрэйскага насельніцтва ў горадзе значна павялічылася і складала, напрыклад, у 1909 г. 27 474 чалавекі з 53 518 усіх магіляўчан. Жыццё яўрэяў рэгулявала абшчына. Ад астатніх гараджан яўрэі адрозніваліся адзеннем. Мужчыны заўсёды насілі вузкі чорны балахон, шырокі чорны пояс, белыя ці сінія панчохі да каленяў, чорныя скураныя туфлі, на галаве чорны каўпак-ярмолку. Галаву галілі, пакідаючы на скронях валасы-пэйсы, якія спадалі да плячэй. Бароды ніколі не галілі. Яўрэйкі насілі рознакаляровыя без таліі сукенкі, на галаве вялікія хусткі, якія павязвалі накшталт чалмы, шыю ўпрыгожвалі ніткамі жэмчугу, на ногі абувалі туфлі, якія ляпалі ў час хадзьбы па пятах. Замужнія жанчыны, як і мужчыны, галаву галілі і насілі парыкі. Яўрэйскі хлопчык лічыўся паўналетнім у 13 гадоў, дзяўчынка — у 12 гадоў і адзін дзень. У шлюб хлопцы звычайна ўступалі ў 18, дзяўчаты — у 16 гадоў. Маладыя год жылі ў бацькоў нявесты, пасля будавалі свой дом. Дамы яўрэі не агароджвалі, у двары нічога не расло. Уваход у дом рабіўся пасярод яго, аціпляліся дамы рускай печчу, драўляную падлогу ў дамах мылі толькі 2 разы на год (вясной і восенню), у той жа час у Дубравенцы мылі драўляную мэблю. Больш заможныя сем'і трымалі кароў, бяднейшыя — коз. Вельмі шанавалася ў яўрэяў субота. У гэты дзень яны не працавалі, нават чай у самавары гатавала хрысціянская прыслуга. Яўрэі верылі ў многія прыкметы. Ведаючы пра гэта, жартаўнікі, праваслаўныя ці католікі, часта насміхаліся з іх. Напрыклад, калі некалькі яўрэяў ехалі на калёсах, жартаўнік услых пачынаў лічыць іх. Яўрэі мітусіліся, спрытнейшыя хаваліся, бо верылі, калі той, хто лічыць, назаве правільную лічбу, хто-небудзь з падарожнікаў хутка памрэ. Трэба адзначыць, што яўрэі былі пазбаўлены права на вышэйшую адукацыю і дзяржаўнае кіраўніцтва, але яны практычна ўтрымлівалі ў сваіх руках аптовы гандаль, піцейныя ўстановы, вытворчасць алкаголю, добра ведалі рыначную кан'юнктуру.

З іншых слаёў насельніцтва ў розныя часы ў Магілёве пражывала ў значна меншай колькасці шляхта, праваслаўнае, каталіцкае і уніяцкае духавенства, казакі, салдаты, рабочыя. Усе яны ўносілі свае адметныя асаблівасці ў культуру горада, яго архітэктуру і аблічча.

С.І.Бяспанскі.

Дакументы сведчаць

ДА ПЫТАННЯ АБ СКЛАДАННІ АРХЕАЛАГІЧНАЙ КАРТЫ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ

Віленскае аддзяленне Папярэдняга камітэта па арганізацыі 9-га Археалагічнага з'езда 13.11.1892 г. накіравала ліст Магілёўскаму губернатару. У ім паведамляецца, што раней Папярэдні камітэт перадаў мясцоваму статыстычнаму камітэту археалагічныя звесткі, якія былі сабраныя настаўнікамі народных вучэльняў і іншымі асобамі па Магілёўскай губерні. Пасля гэтага ў Віленскае аддзяленне звярнуўся Е.Р.Раманаў «с просьбой выслать ему археологические сведения и по Могилевской губернии в виду того, что карта этой губернии им уже составлена, а собранные Отделением сведения послужат ему важным материалом для восполнения таковой». Таму ў лісце змешчана просьба да губернатара, што калі археалагічную карту яшчэ не пачалі ствараць у Магілёве, «сделать распоряжение об отсылке означенного археологического материала г. Романову в Витебск».

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей па тэксце гл. НА РБ, ф. 2001, воп. 1, спр. 1307, арк. 23).

АБ АДКРЫЦЦІ ЦАРКОЎНА-АРХЕАЛАГІЧНАГА МУЗЕЯ
ЗАПІСКА Е.Р.РАМАНАВА ЕПІСКАПУ МАГІЛЁЎСКАМУ І МСЦІСЛАЎСКАМУ ЯЎГЕНУ ПА ПЫТАННІ АБ АДКРЫЦЦІ ЦАРКОЎНА-АРХЕАЛАГІЧНАГА МУЗЕЯ Ў МАГІЛЁВЕ

12.1.1896 г.

Как местному уроженцу, мне известно, что во многих храмах Могилевской епархии находятся предметы, имеющие церковно-археологическое значение, например, древние облачения из холста и пестряди или из редких образцов древней парчи и шелка; древние сосуды, часто со священными изображениями или редким орнаментом; древние кресты; образа и плащаницы старого письма; предметы церковной утвари; старопечатные и рукописные книги, колокола и т.п. Встречаются редкие портреты (например, Дмитрия Ростовского в гомельском уезде), старинные церковно-канцелярские книги, памятники местных церковных братств, древние каменные кресты и плиты с надписями, резные деревянные статуи Богоматери и святых. В некоторых церквах имеются издания, представляющие в настоящее время библиографическую редкость.

Предметы эти, вследствие ветхости, при богослужении не употребляются и хранятся на церковных чердаках и в башнях колоколен, в виду неимения у причтов средств для содержания их в благоговейной сохранности.

Сравнительное обилие таких памятников церковной старины и настоящее положение их, которое, конечно, нельзя назвать нормальным, обязывает меня, одного из пожизненных действительных членов одного из археологических обществ, почтительнейше просить Ваше Преосвященство, не признаете ли Вы возможным сделать зависящее распоряжение об открытии в Могилеве епархиального церковно-археологического древлехранилища, в котором были бы сосредоточены предметы церковной старины епархии. Важность открытия подобных учреждений не может подлежать сомнению, и, в последнее время, они открываются в епархиях все чаще и чаще.

Учреждением епархиальных древлехранилищ преследуется обыкновенно двоякая цель. С одной стороны они имеют в виду сохранить от уничтожения предметы церковной старины, представляющие обще археологический интерес, с другой — выяснить и наглядно представить исторический ход церковной жизни в краи.

Подобное же значение имело бы открытие церковно-археологического музея и для Могилевской епархии, усугубленное еще тою поучительною многовековою борьбою с р.-католичеством, которую вынесла эта епархия, победоносно закончив ее, под руководительством своих доблестных пастырей, на пользу православия и русской народности.

Не нахожу нужным скрывать от Вашего Преосвященства, что открытие таких музеев в провинции по новизне дела и по другим причинам почти всегда встречается с препятствиями, и притом не материального только свойства. Но я полагаю, что важность подобных учреждений сознана повсеместно и что для открытия церковно-археологического музея препятствий не встретится. По крайней мере, открытие такого музея по моей инициативе особых препятствий не встретило при авторитетном участии и покровительстве преосвященного Антонина в г. Витебске.

Записки Северо-Западного отдела РГО. Кн. 1. Вильна, 1910. С. 225—226.

ЗАПІСКА Е.Р.РАМАНАВА ЕПІСКАПУ МАГІЛЁЎСКАМУ І МСЦІСЛАЎСКАМУ МІХАІЛУ ПА ПЫТАННЮ АБ АДКРЫЦЦІ ЦАРКОЎНА-АРХЕАЛАГІЧНАГА МУЗЕЯ

6.2.1897 г.

Ваше Преосвященство, Милостивейший Архипастырь и Отец.

Год с лишним тому назад, 12-го января 1896 г., мною подана Преосвященнейшему Евгению докладная записка о необходимости учреждения церковного древлехранилища по образцу многих других епархий.

В виду того, что до настоящего времени по сей записке не сделано никаких распоряжений, позволяю себе обратиться к Вашему Преосвященству с покорнейшей просьбой, не благоизволите ли Вы ускорить открытие сего полезного учреждения и не признаете ли возможным:

1, учредить комиссию по устройству музея, по возможности, не менее, как из трех членов. Задачами Комиссии должно быть: забота о пополнении музея, хранение поступающих в него предметов церковной старины, ученое описание ведения описей и каталогов. В числе членов необходимо иметь священника — хранителя музея.

2, Сделать распоряжение об отводе для помещения музея одной или двух комнат, по возможности в семинарии или вблизи ее.

3, Пригласить богоявленское братство не найдет ли оно возможным оказать вспомоществование устройству музея отпуском средств на приобретение необходимой обстановки музея (6 витрин, 2 шкафа), как это сделали братства других епархий.

4, Предложить благочинным приступить теперь еще к высылке в Консисторию или непосредственно в Комиссию по устройству музея, предметов церковной старины, заслуживающих сохранения по их редкости или тому значению, какое они имеют для выяснения исторического хода церковной жизни в епархии, так то:

I. а, древние иконы
антимисны
кресты
плащаницы
хоругви
евангелия

б, древние сосуды: потиры, дискосы, звездицы, дарохранительницы и т.п.

в, предметы церковной утвари: кадильницы, венцы и т.п.

г, древние облачения — полотняные, парчовые, шелковые, независимо от степени их сохранности.

д, книги старопечатные до 1792 г.

е, книги богослужебные рукописные до 1834 г.

ж, древние колокола с орнаментом и надписями до половины 18 века, преимущественно местного изготовления.

II. а, портреты, автографы, печати и т.п. памятники местных епископов и других деятелей на церковном поприще.

б, планы и виды храмов и монастырей епархии (в видах составления при музее полного альбома храмов епархии).

в, церковноисторические книги, имеющие исторический интерес, акты, хроники, древние церковные летописи.

г, памятники местных церковных братств — образа, чаши, вертепы, звезды и т.п.

д, каменные кресты, древние намогильные плиты, камни с надписями и т.п., или в случае громадности, снимки с них.

е, образцы местного церковного орнамента, двери, киоты, рамы и т.п.

Кроме того, желательно сосредоточить в музее разные изображения, статуи, распятия, оставшиеся от времен унии. Этими мерами Ваше Преосвященство положите прочное основание епархиальному церковному музею.

Испрашивая благословения Вашего Преосвященства, имею честь быть покорнейшим слугою.

Е.Романов.

НА РБ, ф. 2502, воп. 1, спр. 797, арк. 5—6.

ВЫТРЫМКА СА СПРАВАЗДАЧЫ АБ СТАНЕ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА МУЗЕЯ ЗА 1899 Г.

Пополнение музея в отчетном году: в отдел 1-й (историко-археологический): 1, от Императорской археологической Комиссии из числа представлявшихся ей кладов, найденных разновременно в губернии: а) коллекция из 13 серебряных низкопробных монет — полугрошевиков Великих Князей Литовский Александра и Сигизмунда I, а также Сигизмунда Августа; б) коллекция из 256 медных русских монет чеканки 1731—1757 гг., весом 4 фунта 79 золотников и в) коллекция из 33 серебряных польских монет: 6 и 30-ти грошевиков Иоанна Казимира и Иоанна III, прусских 6-ти грошевиков и 1 медной русской полушки 1731 г.;

2, от действительного члена губернского статистического комитета Е.Р.Романова: а) клад, состоящий из мелкой медной монеты — «копеек» времен царя Алексея Михайловича, б) одна таблица с разными предметами, найденными при раскопке курганов в имении Чирчине близ д. Троицы, Старосельской волости, Оршанского уезда и в) два листа и два полулиста гербовой бумаги времен Екатерины II, Александра I и Николая I;

3, от Л.И.Иванова — серебряная монета 1817 г. — «5 злотых», вычеканенная для обращения в Польше, и, 4, часть зуба мамонта, найденного в р. Днепре близ д. Нижней Тошицы, Рогачевского уезда, представленного местным уездным полицейским управлением...

в отдел III (библиотека музея): 1, от г. Начальника губернии — две брошюры Турцевича и Виноградова о жизни и деятельности графа М.Н.Муравьева, изданные ко дню открытия ему памятника в г. Вильне в 1898 г.; 2, от г. Романова — «Материалы по исторической то-

пографии Велижского уезда Витебской губернии» (труд г. Романова) пять экземпляров «Указателя к неофициальной части Могилевских губернский ведомостей за время их существования (1839—1898 гг.)».

Одним из главных препятствий к развитию музея является недостаток в материальных средствах, т.к. пособия из Статистического Комитета были лишь единовременными, а денежные поступления музея в отчетном году состояли лишь из доходов от продажи каталогов и потому, естественно, не могли быть сколько-нибудь значительными, почему и не представлялось возможным пополнить его путем приобретения встречающихся ценных предметов, между тем как безвозмездные поступления являются вообще случайными, и пополнение ими музея не может идти быстро.

Обзор Могилевской губернии за 1899 г. Могилев, 1900. С. 97—98.

Матэрыял падрыхтаваў І.Грабянчук.

АПІСАННЕ МАГІЛЁЎСКАГА ЦАРКОЎНА-АРХЕАЛАГІЧНАГА МУЗЕЯ Ў ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

... Музей помещается бесплатно в доме Богоявленского братства, которое безвозмездно же отапливает помещение музея и дает прислугу. Необходимая утварь — мебель, витрины, шкафы и т.п. устроены также на средства братства и Романова; на их же средства произведена и доставка предметов церковной старины из храмов Могилевской епархии.

В настоящее время в музее находится более 1500 предметов и архив древних документов из 4000 номеров с лишком. Среди множества ценных в археологическом отношении предметов заслуживают внимания плащаница 1566 г. работы близкой родственницы супруги Иоанна Грозного Анастасии Романовны — Анны Федоровны Полецкой и первопечатная минея 1490 г. Дополнительных памятников старины не обнаружено

Обзор Могилевской губернии за 1905 г. Могилев, 1906. С. 89.

УРЫВАК З ЛІСТА ВІЦЕБСКАГА ГУБЕРНАТАРА Ў ДЭПАРТАМЕНТ АГУЛЬНЫХ СПРАЎ МІНІСТЭРСТВА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ ПА ПЫТАННІ АБ СТВАРЭННІ ТАВАРЫСТВА ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАГА КРАЮ Ў МАГІЛЁВЕ

30.4.1905 г.

... Приняв во внимание, что проектируемое ученое общество ставит себе главной целью естественно-историческое изучение Белорусского края и что в этом отношении сделан уже серьезных почин (исторические труды Сементовского-Курилло и Сапунова, этнографические сборники Шейна, Романова, Никифоровского, труды профессора Карского), а между тем край совершенно не обследован в экономическом отношении и научные попытки в этом смысле весьма желательны, — я полагал бы, что обществу может быть предоставлено право изучения Белоруссии и в этом отношении и тогда § 1 проекта Устава редактировать следующим образом:

«Общество изучения Белорусского края имеет целью:

а) следя за успехами естественных и исторических наук, содействовать развитию и распространению естественно-научных, исторических и экономических знаний в населении Белорусского края, б) учредить с надлежащего на то разрешения и с соблюдением установленных на сей предмет правил исторические и естественно-научные музеи, в) заниматься изучением природных условий Белорусского края, его флоры, фауны, минерального царства, почв, метеорологических явлений, его минувших судеб, антропологических, этнографических и экономических данных его населения».

Деятельность Общества изучения Белорусского края, учреждаемого в Могилеве, распространяется на все губернии Северо-Западного края, за исключением Ковенской.

НА РБ, ф. 1416, воп. 2, спр. 21306, арк. 2—3.

ЛІСТ А.ПАДЗЬЯКАВА ДА Е.Р.РАМАНАВА З ЗАПЫТАННЕМ АБ СТВАРЭННІ ТАВАРЫСТВА ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАГА КРАЮ Ў МАГІЛЁВЕ

Временно Управляющий Канцелярией Виленского, Ковенского и Гродненского Генерал-Губернатора. 27 июня 1905 г.

Милостивый Государь

Евдоким Романович

Придавая большое значение научному всестороннему обследованию тех условий, при которых приходилось развиваться и крепнуть русскому делу в крае, и усматривая залог успешной и плодотворной деятельности, предстоящей вновь возникшему при Вашем деятельном участии обществу изучения Белорусского края в таких обстоятельствах, что осуществление преследуемых этим обществом задач ныне возложено на такого авторитетного исследователя Белоруссии, как Ваше Высокородие, г. Главный Начальник Северо-Западного края покорнейше просит Вас не отказать сообщить ему, вступило ли названное Общество в организационный период, из кого образовано в настоящее время его Правление, какие из намеченных в уставе задач предназначены к осуществлению в первую очередь и какие именно научные силы вошли в состав общества из губерний Северо-Западного края. *А.Подъяконов.*

НА РБ, ф. 1416, воп. 2, спр. 21306, арк. 4.

Матэрыял падрыхтавала Т.Палажэнцава.

Сады і паркі Магілёва

Першы ўспамін пра магілёўскія сады пакінуў у сваіх нататках пятроўскі стольнік Пётр Андрэевіч Талстой, які праязджаў праз Магілёў у 1697 г. Ёсць звесткі, што ў 17—18 ст. усю сваю маёмасць — землі разам з садамі — Максім Папцэвіч і Іван Казакевіч ахвяравалі магілёўскаму брацкаму Богаяўленскаму манастыру. Васіль Крэйдзін, напрыклад, падараваў таму ж манастыру Бізігаўскі сад у Нагорскай сотні. Вялікія сады былі пры кармеліцкім кляштары, каля палаца каталіцкага біскупа С.Богуша-Сестранцэвіча (вул. Ленінская, 25), а таксама ў Спаскім манастыры, побач з палацам праваслаўнага арцыбіскупа (вул. Ленінская, 11а). Апошні пасаджаны дзякуючы намаганням пераемніка Г.Каніскага арцыбіскупа Афанасія. Яшчэ адзін сад быў у курданёры (замкнёным двары) езуіцкага кляштара. Ён праіснаваў да 1820-х гадоў, пакуль езуітаў не выгналі з Расіі, а магілёўскі кляштар не перайшоў да першай расійскай арміі. Дрэвы высеклі, каб яны не перашкаджалі муштраваць салдат.

У 1820—21 гг. паміж галоўным корпусам старога беларуска-магілёўскага шпіталя і р. Дубровенка была створана вялікая садова-паркавая кампазіцыя. Рэшткі комплексу сёння можна бачыць у выглядзе алей з векавымі дрэвамі і некаторымі іншымі элементамі паркавай архітэктуры. Паводле праектаў архітэктараў сярэдзіны 19 ст. невялікі паркавы ансамбль, пераважна з газонаў і клумбаў, узнік пры гарадской бальніцы (вул. Боткіна), пры новым вайсковым шпіталі, што знаходзіўся за быхаўскай заставай (вул. Чэлюскінцаў). За шпіталем размяшчаліся аранжарэі і парнікі Бланка.

Магілёўскія дакументы сведчаць, што ў другой палавіне 19 ст. ў горадзе каля 100 дзесяцін зямлі былі засаджаны садовымі дрэвамі, плады якіх вывозіліся на продаж у Маскву, Смаленск, Віцебск, Пскоў і іншыя гарады Расійскай імперыі. У пачатку 20 ст. ў Магілёве існавала некалькі садаводстваў: Бабкова, Біндзера і Аконскага, а таксама Сад-Трэк, Дзіцячы сад (абодва ў раёне аўтавакзала), Мікалаеўскі, гарадскі (на вале), Мураўёўскі (за тэатрам) і Беклемішаўскі (былая Губернатарская, цяпер плошча Савецкая). Таму невыпадкова правядзенне менавіта ў Магілёве першай выстаўкі садаводства ўвосень 1903 г. Адносна яе ў архіве захавалася перапіска паміж дырэктарам Дэпартамента земляробства і магілёўскім губернатарам.

Амаль усё гістарычнае ядро горада ўпрыгожвалі своеасаблівыя зялёныя аазісы. Сцежка, што спускалася ад дома губернатара па тэрасах да Дняпра, і сам бераг ракі былі абсаджаны акацыямі. У садзе магілёўскага генерал-губернатара Дамбавецкага (сад высаджаны ў 1872 г.) летам 1884 г. зроблены фантан, які з'яўляўся састаўной часткай Дняпроўскага водаправода. У цэнтры Беклемішаўскага саду знаходзіўся сонечны гадзіннік. Дрэвы на вуліцах горада добра даглядаліся.

Пра гэта сведчыць шэраг найменняў асноўных вуліц таго часу: Вялікая Садовая (цяпер Ленінская), Малая Садовая (Піянерская) і Зялёная (К.Маркса). За горадам былі сядзібна-паркавыя комплексы. Адзін з такіх тэрасных паркаў, што спускаўся да правага берага ракі Дубровенка, выяўлены аўтарам дадзенага артыкула каля вёскі Сарканайск, якая ў бліжэйшы час знікне сярод сучаснай гарадской катэджавай забудовы.

Адным з сапраўдных шэдэўраў садова-паркавага мастацтва канца 18 — пачатку 19

ст. можна лічыць ансамбль сядзібы «Піпенберг» на ўскраіне Магілёва каля Буйнічаў. Ён мае вельмі цікавую гісторыю. 8.4.1782 г. ў Магілёў прыбыў другі магілёўскі намеснік, расійскі сенатар Пётр Багданавіч Пасек. Тады і пачалі будаваць сабор Святога Іосіфа, што быў закладзены імператрыцай Кацярынай II і аўстрыйскім імператарам Іосіфам II з нагоды іх сустрэчы. Кацярына II выбрала праект, які прапанаваў архітэктар і мастак Мікалай Львоў. Дарэчы, ён пакінуў нам шэраг цікавых акварэлей з выявамі Магілёва канца 18 ст. Падрадчыкам пабудовы сабора і загараднай рэзідэнцыі Пятра Багданавіча быў Чыр'еў. Зразумела, што храм будаваўся за дзяржаўны кошт. З той жа цэглы і за тыя ж грошы пад наглядам Пасека пабудавана сядзіба «Піпенберг». Ансамбль размяшчаўся на 2 берагавых тэрасах: на ніжняй быў створаны прамавугольны штучны вадаём, на верхняй стаяў палац у стылі класіцызму з элементамі несапраўднай готыкі. Былі тут, відаць, і прыгожыя партэры, і цудоўныя баскеты з натуральных і штучных насадак, творы архітэктуры малых формаў (скульптуры, альтанкі і інш.). Рэшткі раслін захаваліся і цяпер, але вельмі здзічэлі. На верхняй тэрасе, напрыклад, вакол рэшткаў падмурка палаца растуць ружы.

Стваральнікі гэтага цудоўнага сядзібнага комплексу невядомы. Але, калі ўлічыць працу ў Магілёве выдатнага архітэктара, аднаго з заснавальнікаў пейзажнага стылю ў расійскім садова-паркавым мастацтве М.А.Львова, які быў знаёмы з Пасекам, можна меркаваць, што аўтарства помніка належыць яму. Мікалай Аляксандравіч распрацоўваў і ансамбль Саборнай плошчы, дзе насупраць храма Святога Іосіфа знаходзілася брама, за якой пачынаўся раўчук у бок р. Дубровенка. Надзвычай творча ў пачатку 19 ст. да развіцця цудоўнага горадабудаўнічага комплексу паставіўся таленавіты дойлід Стасаў. Паводле яго прапановы раўчук быў засыпаны і абкладзены дзёрнам, пасаджаны кусты і дрэвы, пракладзены сцежкі, а таксама зроблены вадасцёкі ў выглядзе труб, якія ішлі пад зямлёй. Садова-паркавы ансамбль — адзін з прыгажэйшых горадабудаўнічых помнікаў — стаў цудоўным месцам адпачынку магіляўчан.

Лёс і час не былі літасцівыя да гэтага твора. У 19 ст. ў «Піпенбургу» размясціўся жаночы пансіён, які ў 1865 г. быў ператвораны ў Марыінскую гімназію. Пасля пабудовы ў 1875 г. жаночай гімназіі на Дняпроўскім праспекце (вул. Першамайская) «Піпенберг» апусцеў і хутка прыйшоў у заняпад. Да нашых дзён дайшлі толькі рэшткі помніка (падмуркі, сажалка, парк), яны не ахоўваюцца. «Піпенберг» можна было б выратаваць, калі б надаць яму статус помніка, прыступіць да яго вывучэння і кансервацыі. *З.Яцкевіч.*

Магілёўскія масты

Перавоз на Дняпры існаваў з таго часу, калі быў пабудаваны замак, магчыма, з 13 ст. Дакументальна вядомы з 16 ст., належаў Спаскаму манастыру. Паводле граматы караля Жыгімонта III, якая датуецца 13.6.1588 г., магіляўчанам дазвалялася пабудаваць мост цераз Дняпро, які злучыў бы горад з Траецкім пасадам ці Лупалавам. Да пабудовы моста з жыхароў горада плата за перавоз не бралася, ён быў асобны ад царкоўнага (Спаскага).

Масты былі і каля некаторых магілёўскіх брам: Мескай у замку, Каралеўскай і Ветранай у Старым горадзе. Магістрацкія кнігі Магілёва з 1698 г. захавалі цікавы дакумент — рэестр будавання моста каля брамы Ветранай. У ім гаворыцца пра закупку і кошт дрэва для яго. Звычайна прыбрамныя масты рабіліся наступным чынам: у роў перад валам, які быў запоўнены вадой, убіваліся альховыя ці дубовыя палі. Наверсе апошніх мацаваліся бэлькі, што стваралі канструкцыйную аснову насцілу. Насціл рабілі з дошак ці тонкіх бярвён. Бліжэйшая да брамы частка моста была пад'ёмнай, што давала магчымасць адсякаць ворага, а таксама зачыняць нанач ці ў небяспечныя часы горад або замак.

У магістрацкіх кнігах за 1713 г. падрабязна пералічваецца колькасць дрэва і кошт рамонту Ветранага моста. Напрыклад, за работу дойлідам заплацілі 11 злотых 15 грошаў, чатыром падзёншчыкам за 5 дзён — 4 злотыя 20 грошаў. Ветраная брама з мостам знаходзілася ў раёне сучаснага прыпынку «Вуліца Болдзіна». У пачатку 1980-х гадоў, калі вяліся рамонтныя работы, тут быў выкапаны кат-

лаван. Мясцовы краязнавец і журналіст Мікалай Ножнікаў бачыў, як экскаватарам выбіраліся дубовыя палі, якія добра захаваліся. Тады, магчыма, і скончылася гісторыя Ветранага моста, а таксама культурнага слоя, што захоўваў рэшткі жыцця і дзейнасці нашых продкаў. Магістрацкія кнігі сведчаць таксама, што для рамонту моста каля Быхаўскай брамы ў 1699 г. (раён вуліц Мянжынскага і Чэлюскінцаў) на гарадскім рынку набываліся брусы, бярвёны, цвікі латныя.

У час войнаў у Магілёве рабіліся пераважна наплаўныя масты. Шэраг такіх мастоў пабудаваны ў Паўночную вайну 1700—21 гг. расійскімі і шведскімі воінамі з прымусовым удзелам магіляўчан. 21.6.1706 г., калі Пётр I разам з войскам пакінуў Магілёў, масты былі распушчаны для праезду байдакоў і плытоў. Паводле летапісаў, у сакавіку 1708 г. расійскія воіны пачалі будаваць 2 масты на байдаках. Адзін з іх быў насупраць вусця ракі Дзебры. Для гэтага моста выкарыстаны драўляны вал (сцяна) і вежа, што былі пабудаваны для ўмацавання Пакроўскага пасада ўздоўж Дзебры ў 1704 г. пад кіраўніцтвам архітэктара, палкоўніка Федаровіча. Другі мост пабудаваны побач з Бернардзінскім касцёлам (каля сучаснага моста). З-за вялікай вады, што заліла Пакроўскі пасад амаль да самай Грыўцы, памост зроблены на высокіх месцах. Вясною акрамя 2 папярэдніх мастоў для пераходу маскоўскіх войскаў за кошт жыхароў горада пабудаваны трэці — у Палыкавічах.

У пачатку ліпеня 1708 г. ў Магілёў увайшоў авангард шведскіх войскаў. Маскоўскія салдаты пассякалі байдакі, на якіх мацаваліся насцілы, і масты распусцілі. Шведы мусілі будаваць новыя, але дрэва, відаць, было бракаванае. Тады яны па-варварску разбурылі Буйніцкі манастыр і разабралі драўляныя пабудовы разам з царквой Успення.

На малюнку Язэпа Пешкі, які датуецца мяжой 18—19 ст., адлюстраваны адзін з гарадскіх мастоў. Ён праходзіў у раёне царквы Святога Мікалая. Некаторыя старажылы Магілёва памятаюць той ці іншы мост у дадзеным месцы і адзначаюць, што ён быў не толькі пешаходны, але па ім можна было ездзіць на конях.

19 ст. — перыяд інтэнсіўнага будаўніцтва мастоў не толькі цераз Дняпро, але і цераз невялікія рэчкі, што цякуць у Магілёве. Захавалася перапіска за 1825 г. губернскага архітэктара Страхава і магілёўскага губернатара Максімава пра будаўніцтва моста цераз р. Струшню, які будавалі з 30 красавіка да 9 верасня 1826 г. У 1835 г. пабудаваны мост цераз Дубровенку, у 1860 г. паводле праекта Мікалая Ястрэбскага і пад яго ўласным кіраўніцтвам — цераз Дняпро. Апошні ўзведзены замест паромнай пераправы па сусветных стандартах таго часу. Пры будаўніцтве былі ўлічаны мясцовыя асаблівасці. Вышыня моста, напрыклад, абумоўлена высокімі веснавымі водамі, даўжыня больш за 190 м. Мост меў восем пралётаў, апоры і быкі зроблены на драўляных палях, пралёты накрыты аркамі многавугольнай сістэмы.



Магілёў. Выгляд з боку Дняпра. З малюнка Н.Орды. 1877 г.

Вялікі ўдзел у будаўніцтве мастоў прыняў першы гарадскі галава Рыгор Гартынскі. Пры ім узведзены мост на дарозе насупраць каталіцкіх могілак. Верагодна, гэта быў мост цераз роў перад Палявым ці Дольным валамі ў раёне былой Віленскай брамы (сучасны раён вул. Лазарэнкі, 29). Другі мост пабудаваны цераз Дзебру (спуск ад 1-й гарадской бальніцы), трэці — на р. Дубровенка насупраць пешаходнай лесвіцы, якая ішла, відаць, ад былой Дубровенскай брамы. Сёння на тапанімічнай карце горада цудам захаваўся Брамны завулак, што вёў ад лесвіцы да моста цераз Дубровенку. Цяпер там невялікі масток, які вядзе да Быхаўскага рынку. Чацвёрты мост пабудаваны на р. Струшні. Магчыма, ён знаходзіўся ў вусці гэтай невялікай рачулкі, на месцы сучаснага аўтамабільнага моста.

Напярэдадні адкрыцця ў 1902 г. чыгункі ў Магілёве ўзведзены яшчэ адзін мост цераз Дубровенку. Ён знаходзіўся ў раёне Карабанаўскіх могілак за сучасным чыгуначным насыпам, што зроблены пасля апошняй вайны. Верагодна, мост узарвалі ў 1944 г. партызаны. Як сведчыць дарэвалюцыйны здымак, ён быў металічны, мацаваўся на 2 мураваных з цэглы слупах-апорах авальнай формы і земляным насыпе каля рэчкі.

Першы металічны мост цераз Дняпро ўзведзены ў 1936 г. Гэта быў чыгуначны мост на шляху Магілёў—Крычаў. У 1956 г. на месцы ўзарванага ў 1944 г. моста Ястрэбскага пабудавалі жалезабетонны. У 1967 г. зроблены мост цераз Дняпро (у раёне праспекта Шміта)

З.Яцкевіч.

Магілёўскае піва

Без гэтага цудоўнага пітва немагчыма ўявіць гісторыю Магілёва. Як вядома, для гатавання піва неабходна прыгатаваць солад. У Магілёве гэтай справай з 1578 г. займаліся не асобныя людзі, а цэлы цэх, у 1591 г. ў ім працавала 17 саладоўнікаў. Захавалася пастанова саладоўнікаў 1597 г. пра больш дэталёвую арганізацыю цэха. Але дзейнасць цэха, напэўна, не задавальняла цалкам патрэбы горада, таму паводле граматы караля Жыгімонта III 1604 г. дазвалялася ўсялякаму магілёўцу гатаваць піва і іншае пітво толькі для ўласнага спажывання, а не на продаж.

Як сведчыць інвентар Магілёўскага замка за 1604 г., кіраўніцтва магілёўскага старостваа, якое месцілася тут, таксама не магло абысціся без піва. Сярод замкавай маёмасці акрамя пякарні і карчмы згадваецца і мураваны бровар. Бровары былі і ў гараджан. Так, у 1638 г. магілёўскі бурмістр Цімафей Гананоўіч ахвяраваў Богаяўленскаму брацкаму манастыру сваю маёмасць: 2 зямельныя пляцы, студню, а таксама бровар з лісцем, катлом піўным і ўсім начыннем для варэння піва.

Амаль ніводнае пасяджэнне магістрата, брацтваў і цэхаў не абыходзілася без гэтага пітва. Кожная старонка гарадскіх прыходна-расходных кніг сведчыць пра колькасць піва, назвы гатункаў і яго кошт. Сустракаюцца нават цэлыя рэестры, якія складзены ў магілёўскім магістраце, пра прыгатаванне і продаж піва. У 17—18 ст. асаблівым попытам карысталіся гатункі піва «Тутэйшае» («Магілёўскае»), «Лупалаўскае» і «Простае», а таксама «Аршанскае», «Белае», «Кралеўскае», «Гданьскае».

Багата піва было зварана ў час Паўночнай вайны, прычым, як адзначана ў «Запісках ігумена Арэста», піва розных гатункаў як для рускіх войскаў і іх камандзіраў, так і для шведскіх Напрыклад, 10.12.1708 г. Пётр I знаходзіўся ў Копысі і, як меркаваў магістрат, мог завітаць у Магілёў. Таму было прыгатавана шмат віна, мёду, піва і розных прадуктаў. Але цар не даехаў да Магілёва, і членам магістрата прыйшлося ўсё прыгатаванае выпіць і з'есці, каб не сапсавалася і дарма не прапала.

Вядомы і другі цікавы факт. Пасля бітвы пад Галоўчынам 3.7.1708 г. галоўнае шведскае войска ўвайшло ў горад і з кожнай яго часткі (іх было 15) запатрабавала па 12 500 фунтаў хлеба і 960 гарнцаў піва. У сістэме мер Вялікага княства Літоўскага вядомы малы, ці просты гарнец, які змяшчаў 2,8 л, і вялікі, ці цэхавы, — 5,6 л. Невядома, якімі гарнцамі запатрабавалі шведы, але калі і малымі, то гэта больш за 2500 л з кожнай часткі горада. Вядома, што з галадухі нельга злоўжываць ежай і пітвом, аднак шведы, відаць, пра ўсё забыліся, і, як піша летапісец, шмат іх тады ад пераядання памерла.

У Магілёве, як і ва ўсёй Рэчы Паспалітай,

піва ў 17—18 ст. каштавала па 4—6 грошаў за гарнец, толькі фірменнае, накшталт «Лавіцкага» ці «Варшаўскага», — ад 8 грошаў да 1 злотага 16 грошаў. У час Паўночнай вайны кошт піва (як і іншых прадуктаў) у Магілёве павысіўся і яно каштавала 1 злоты за гарнец.

Калі ў 1772 г. Магілёў увайшоў у склад Расійскай імперыі, рамесніцкі выраб піва паступова стаў мануфактурным і заводскім. У 1783—84 гг. у горадзе дзейнічала 7 піваварных заводаў. Адзін з дакументаў сведчыць пра існаванне старога замкавага бровара ў вусці р. Дубровенка ў 1837 г. У 2-й палавіне 19 ст. ў Магілёве дзейнічала некалькі піваварных заводаў. Адзін з іх, які быў заснаваны ў 1862 г., належаў вядомаму на Беларусі купцу, уладальніку піваварных заводаў, баварскаму падданаму Францу Міхайлавічу Лекерту. У 1879 г. завод размяшчаўся ў былым Маскоўскім (раней Лупалаўскім) прадмесці на вул. Шашэйнай у двухпавярховым мураваным будынку са скляпеннямі і млынамі для перамолвання соладу. У 1880 г. завод тэлефанізаваны, у канцы 19 ст. абсталяваны 2 паравымі машынамі, паравым катлом, меў водазабеспячэнне, а таксама ледавік для захоўвання піва. У 1913 г. на заводзе працавала 50 рабочых, якія выпускалі прадукцыі на 170 тыс. рублёў за год, у сярэднім каля 100 тыс. вёдзер. Найбольш вядомымі былі тры гатункі: «Бок-біра» (вышэйшы гатунак, вядро каштавала 2 руб.), «Баварскае» (2-і гатунак, 80 кап.), «Рускае» (3-і гатунак, 75 кап.). У тым жа прадмесці ў 1870 г. заснаваны яшчэ адзін піваварны завод, які ў 1910—13 гг. меў 3 паравыя рухавікі. На ім працавала каля 50 рабочых, выпускалася каля 150 тыс. вёдзер піва за год. Уладальніцай завода была Э.Яннік.

Вядомы магілёўскі краязнавец І.Філіповіч сцвярджае, што на каталіцкіх могілках пахаванні Яннікаў і Лекертаў знаходзяцца ў адной агароджы, таму мяркуе пра сваяцтва ўладальнікаў буйнейшых піваварных заводаў у Магілёве. Завод Яннікаў адлюстраваны на адным са здымкаў пачатку нашага стагоддзя, што змешчаны ў экспазіцыі абласнога краязнаўчага музея. Побач знаходзяцца і фірменныя бутэлькі завода з 5 медалямі з разнастайных выставак. Зразумела, што магілёўскае піва сапраўды было лепшым, калі заслужыла гэтыя ўзнагароды. Прозвішчы ўладальнікаў адлюстраваліся і ў мясцовай тапаніміцы. У раёне сучасных праспектаў Шміта і Пушкіна побач з так званым пасёлкам Абісінія раней знаходзіўся Яннікаў луг, дзе для патрэб завода вырошчвалі хмель.

Магілёўскае піва і сёння не страціла сваіх якасцей, добрыя традыцыі ў яго вытворчасці захаваліся і цяпер. *З.Яцкевіч.*

Назаўсёды ў памяці землякоў

КАНДРАТ ІВАНАВІЧ ГРУМ-ГРЖЫМАЙЛА

Нарадзіўся 21.9.1794 г. ў Магілёве ў заможнай сям'і губернскага чыноўніка, якая належала да старажытнага магілёўскага роду. У некаторых дакументах іх прозвішча значыцца як Грума (Гржымайла, верагодна, назва герба, якім карыстаўся гэты шляхецкі род). Кандрат паступіў у губернскую гімназію, атрымліваў высокія адзнакі па ўсіх прадметах, у 1815 г. бліскуча яе скончыў. Потым стаў студэнтам медыцынскага факультэта Віленскага універсітэта. У 1821 г. Грум-Гржымайла атрымаў дыплом, вярнуўся ў родны горад і стаў працаваць урачом у ваенным шпіталі. У той час ён напісаў дысертацыю «Наогул пра пахавыя грыжы і новы спосаб іх лячэння шляхам аперацыі».

Доктар К.І.Грум-Гржымайла стаў вядомым у медыцынскіх колах Расіі. У 1833 г. быў запрошаны на работу ў Пецярбург, дзе ярка праявіліся не толькі яго ўрачэбны талент, але і якасці грамадскага дзеяча. Да 1868 г. Грум-Гржымайла выдаваў газету «Друг здравия», якая адыграла значную ролю ў прапагандзе і папулярызацыі медыцынскіх ведаў. Адначасова з работай практычнага ўрача напісаў і выдаў шэраг прац па хірургічным лячэнні захворванняў органаў брушной поласці, па фізіялогіі і паталогіі дзіцячага арганізма, гігіене, курарталогіі і іншай разнастайнай тэматыцы.

Ён нярэдка прыязджаў у Магілёў, дзе выступаў з лекцыямі, прымаў хворых землякоў і дапамагаў ім. Шмат магіляўчан ездзілі да яго ў Пецярбург, ніводнаму ён не адмовіў у дапамозе. Памёр К.І.Грум-Гржымайла ў 1874 г. ў Санкт-Пецярбургу.

ЛЕЎ КАЗІМІРАВІЧ НАГУМОВІЧ

Хірург, доктар медыцыны (1812). Нарадзіўся ў 1792 г. ў Магілёве. Скончыў Віленскі універсітэт. З 1812 г. ваенны ўрач. Удзельнік вайны 1812 г. У 1818—26 гг. ардынатар Магілёўскага ваеннага шпіталя. Аўтар прац па лячэнні агнястрэльных ран, халеры. Выдаў «Дапаможнік па лячэнні агнястрэльных ран...» (СПб, 1822). Памёр Л.К.Нагумовіч 26.4.1853 г. *Б.Гардзееў.*

ФЕЛІЦЫЯН ВАСІЛЕВІЧ РЫМКЕВІЧ

Урач, доктар медыцыны (1821). Нарадзіўся ў 1799 г. ў Магілёве. Скончыў Віленскі універсітэт (1820). З 1826 г. прафесар гэтага універсітэта. У 1832—42 гг. працаваў у Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі (з 1834 г. ардынарны прафесар фізіялогіі). У 1831 г. ўдзельнічаў у ліквідацыі ачагоў халеры ў Слуцку, Слоніме, Віцебску. Аўтар прац па аўскультацыі сэрца і сасудаў, дыягностыцы хвароб печані, сэрца, а таксама дзіцячых і венерычных хвароб. Памёр Ф.В.Рымкевіч 17.12.1851 г.

ФЁДАР СПІРЫДОНАВІЧ ШЫМКЕВІЧ

Беларускі, украінскі і рускі мовазнавец, педагог. Нарадзіўся ў Магілёве 16.2.1802 г. Скончыў Кіеўскую духоўную акадэмію (1827). Стварыў першы ў гісторыі айчыннай лексікаграфіі этымалагічны слоўнік рускай мовы (фактычна гэта слоўнік усходнеславянскіх моў) пад назвай «Караняслоў рускай мовы, параўнаны з усімі найгалоўнейшымі славянскімі гаворкамі і з дваццаццю чатырма замежнымі мовамі» (ч. 1—2, 1842). Даследаваў старарускія летапісы («Погляд на расійскія летапісы ў філалагічных адносінах», надрукаваны пад псеўданімам Фёдар Касцеша; 1830) і іншыя помнікі рускай, беларускай і ўкраінскай моў і літаратур («Апісанне рукапісаў, якія знаходзяцца ў бібліятэцы Кіеўскай акадэміі», 1830). Сярод рукапіснай спадчыны Ф.С.Шымкевіча слоўнікі беларускай, украінскай, сербахарвацкай, верхнялужыцкай, гоцкай і славенскай моў, «Нямецкая граматыка» і іншыя працы. Памёр 3.4.1843 г. *В.А.Чабаненка.*

ЕЎДАКІМ РАМАНАВІЧ РАМАНАЎ

Нарадзіўся 11.9.1855 г. ў мястэчку Навабеліца, цяпер у межах г. Гомеля. Мовазнавец, этнограф, фалькларыст, археолаг, усё сваё жыццё прысвяціў вывучэнню роднага краю. Правадзейны член Рускага геаграфічнага таварыства (1886), Маскоўскага таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі (1888), Маскоўскага археалагічнага таварыства (1890), Віцебскага статыстычнага камітэта (1891). У 1870 г. скончыў Гомельскую прагімназію. Працаваў настаўнікам, інспектарам народных вучылішчаў Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай губерняў (1886—1906), член Часовай камісіі па ўладкаванні Віленскай публічнай бібліятэкі і музея (1906—16). У 1897—1903 гг. рэдактар неафіцыйнага аддзела газеты «Могилевские губернские ведомости»; пад яго рэдакцыяй выдадзены 3 выпускі «Магілёўскай даўніны» (1900—03). З 1910 г. ў Паўночна-Заходнім аддзяленні Рускага геаграфічнага таварыства. Апублікаваў больш за 200 прац па этнаграфіі, фальклоры, гісторыі, археалогіі і мове беларусаў, больш за 10 тысяч фальклорных твораў. Адстойваў права беларускага народа на развіццё нацыянальнай культуры, мовы, навукі і літаратуры. Асноўная фальклорна-этнаграфічная праца — «Беларускі зборнік» (выпускі 1—9, 1886—1912) — своеасаблівая энцыклапедыя побыту і культуры беларусаў. Сярод прац «Крыніцы для гісторыі Магілёўскага краю» (выпуск 1, 1916). У 1886—94 гг. вёў археалагічныя раскопкі ў Магілёўскай і Віцебскай губернях. Склаў археалагічныя карты Магілёўскай, Віцебскай і Гродзенскай губерняў. Сабраў звесткі пра 1000 гарадзішчаў Беларусі, выявіў шмат стаянак першабытнага чалавека. Памёр Е.Р.Раманаў 20.1.1922 г.

МАЦВЕЙ ВАСІЛЕВІЧ ФУРСАЎ

Беларускі археолаг і гісторык. Год нараджэння невядомы. Пасля заканчэння Пецярбургскага універсітэта вярнуўся ў Магілёў. Доўгі час быў дырэктарам мужчынскай гімназіі і адначасова рэдактарам неафіцыйнай часткі газеты «Могилевские губернские ведомости». Потым захапіўся археалогіяй і гісторыяй роднага краю. Зрабіў апісанне экспанатаў Магілёўскага музея, напісаў гістарычны нарыс да кнігі «Спроба апісання Магілёўскай

губерні...» (кн. 1—3, 1882—84), склаў карту гарадзішчаў і курганоў Магілёўскай губерні. У 1893 г. Мацвей Васілевіч быў абраны членам-карэспандэнтам Маскоўскага археалагічнага таварыства. Памёр М.В.Фурсаў 8.6.1901 г.

ПАВЕЛ ВАСІЛЕВІЧ ШЭЙН

У гісторыю айчыннай навукі Павел Васілевіч Шэйн увайшоў як збіральнік і выдавец рускага і беларускага фальклору. Яму належаць такія фундаментальныя зборнікі, як «Рускія народныя песні» (1870), «Беларускія народныя песні» (1874), «Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю» (1887—1902) і «Велікарус у сваіх песнях, абрадах, звычаях, вераваннях, казках, легендах і т.п.» (1898—1900).

Каля 50 гадоў збіраў П.В.Шэйн творы вуснай народнай творчасці: з 1850-х гадоў і да пачатку 20 ст. Перад вачыма гэтага таленавітага фалькларыста і этнографа прайшла яркая паласа падзей гістарычнага развіцця Расійскай дзяржавы, якія не маглі не знайсці адлюстраванне ў народнай творчасці.

Ён нарадзіўся ў 1826 г. ў Магілёве ў сям'і купца. Пазней, у паслясловіі да свайго зборніка «Беларускія народныя песні» П.В.Шэйн напісаў: «Хаця і нарадзіўся ў Магілёве на Дняпры, але да 17 гадоў рос і выхоўваўся ў асяроддзі далёка не беларускім... У дзяцінстве я перанёс нямала цяжкіх хвароб, якія часта на доўгі час прыкоўвалі мяне да ложка». У верасні 1843 г. бацька адвёз зусім хворага сына ў Маскву і ўладкаваў у Нова-Екацярынінскую бальніцу. Там Павел праляжаў больш як 3 гады. І ўрачы, і студэнты-медыкі адносіліся да яго з цеплынёй, яны не толькі сачылі за ходам лячэння, але і прыносілі для хворага цікавыя кнігі. П.В.Шэйн вывучыўся чытаць па-нямецку, пазнаёміўся з творамі лепшых паэтаў Германіі і сам пачаў пісаць вершы.

Пасля выхаду з бальніцы ён паступіў у нямецкае вучылішча пры лютэранскай царкве Святога Міхаіла ў Маскве, дзе атрымаў прафесію настаўніка малодшых класаў. З лета 1851 г. ён доўгі час вандраваў па расійскіх губернях як выхавацель дваранскіх дзяцей, даваў урокі ў прыватных дамах і настаўнічаў у Маскоўскай нядзельнай школе. Летам 1861 г. П.В.Шэйн па запрашэнні графа Л.М.Талстога прыехаў у Ясную Паляну Тульскай губерні і выкладаў у мясцовай школе рускую мову. Потым перайшоў у Тульскае павятовае вучылішча, дзе працаваў да канца 1864 г. У 1865 г. П.В.Шэйн атрымаў прапанову папячыцеля Віленскай вучэбнай акругі І.П.Карнілава перасяліцца ў г. Віцебск, там выкладаў нямецкую мову і рускую славеснасць у мужчынскай і жаночай гімназіях.

Яшчэ ў час сваёй работы выхавацелем дзяцей памешчыка К.А.Краткова ў Усць-Урэне Сімбірскай губерні П.В.Шэйн пачаў актыўна збіраць у навакольных сёлах рускія народныя былiны, паданні і песні. Значную частку твораў народнай творчасці апублікаваў у часопісе «Чтения» за 1859 г. Публікацыю заўважыў вядомы знаўца рускай народнай творчасці А.М.Афанасьеў, у сваёй рэцэнзіі ён ахарактарызаваў яе як «цудоўнае дапаўненне да падобных зборнікаў Акадэміі навук». Пасля яго прыхільнага водгуку Павел Васілевіч з большай упэўненасцю працягваў работу фалькларыста і этнографа. У Цвяры і Яснай Паляне, у Туле і Епіфаніі яго фальклорныя зборы папоўніліся як уласнымі запісамі, так і запісамі знаёмых настаўнікаў і вучняў.

У Віцебску Павел Васілевіч у параўнальна кароткі тэрмін аб'яднаў вакол сябе пісьменных і зацікаўленых у беларускай этнаграфіі людзей, запісы якіх разам з уласнымі знаходкамі склалі потым вялікі зборнік фальклорнага матэрыялу Беларусі. У 1874 г. выйшаў з друку яго зборнік «Беларускія народныя песні». Аб'ём кнігі дасягнуў 35 друкаваных аркушаў. На старонках кнігі было змешчана больш за 1000 тэкстаў, з іх 966 народных песень Беларусі.

Вялікі і разнастайны матэрыял зборніка «Беларускія народныя песні», як адзначалі многія літаратуразнаўцы і этнографы, сур'ёзна ўзбагаціў навуку пра народную творчаць, увёў у літаратурны ўжытак малавядомыя або невядомыя песні насельніцтва Прыдзвінскага краю Беларусі. Гэта работа П.В.Шэйна была адзначана залатым медалём Рускага геаграфічнага таварыства, а аўтару прысвоена ганаровае званне члена-супрацоўніка гэтага таварыства. У 1875 г. Расійская Акадэмія навук прысудзіла Паўлу Васілевічу грашовую прэмію імя былога прэзідэнта Акадэміі навук С.С.Уварава.

Летам 1873 г. П.В.Шэйн пакінуў заняткі ў гімназіях горада Віцебска і пераехаў на работу ў Маскоўскую вучэбную акругу. Спачатку выкладаў нямецкую мову ў прагімназіі г. Шуя (1873—74), потым рускую мову і сла-

веснасць у рэальных вучылішчах гарадоў Зарайск (1874—75) і Калуга (1876—81). У чыне калежскага асэсара ў 1881 г. звольніўся са службы і назаўсёды перасяліўся ў Пецярбург.

У сталіцы пры садзеянні вядомага рускага філолага Я.К.Грота П.В.Шэйн распрацаваў праграму, а потым зрабіў экспедыцыю ў сумежныя паветы Магілёўскай, Мінскай і Віцебскай губерняў. З чэрвеня 1877 г. да студзеня 1878 г. ён сабраў нямала песенных і празаічных тэкстаў, якія меркаваў уключыць у капітальную працу «Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю». Кніга выйшла ў свет у 1898—1902 гг. у 3 тамах.

Філолаг-даследчык У.М.Новікаў у сваёй манаграфіі пра Шэйна сцвярджаў, што ні адзін з існуючых беларускіх фальклорна-этнаграфічных зборнікаў не можа параўнацца з «Матэрыяламі для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю» па разнастайнасці і шырыні прадстаўленых у іх сямейных і каляндарных абрадаў.

Убачыць поўны збор сваёй шматгадовай працы П.В.Шэйну, на жаль, не давялося. 3-і том «Матэрыялаў для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю» быў выпушчаны ў 1902 г., калі аўтара не было ў жывых. Ён памёр 14.8.1900 г. ў г. Рыга.

А.Леўскі.

ДОКТАР РУСЕЛЬ

Такі псеўданім замацаваўся за Мікалаем Канстанцінавічам Судзілоўскім у міжнародным рэвалюцыйным руху. Непаседлівы чалавек, ён аб'ехаў дзесяткі краін і сотні гарадоў свету і ўсюды знаходзіў сяброў і саратнікаў. Аднак у сваёй дзейнасці кіраваўся далёка не дакладнымі ідэямі рэвалюцыйнага народніцтва і сацыял-дэмакратыі.

М.К.Судзілоўскі нарадзіўся 8.12.1850 г. ў г. Магілёве ў дваранскай сям'і. У 1858 г. паступіў у Магілёўскую мужчынскую гімназію, дзе пазнаёміўся з ідэямі народніцкага руху і быў удзельнікам аднаго з гурткоў. Пасля сканчэння ў 1868 г. гімназіі вучыўся ў Пецярбургскім і Кіеўскім універсітэтах, зблізіўся з народнікамі, «хадзіў у народ», вёў актыўную прапаганду народніцкіх ідэй на Украіне і ў Паволжы. У 1875 г. выехаў за мяжу. У Лондане пазнаёміўся з К.Марксам і Ф.Энгельсам. З таго часу М.К.Судзілоўскі цалкам прысвяціў сваё жыццё рэвалюцыйнай дзейнасці: удзельнічаў у выданні эмігранцкіх газет, арганізоўваў іх перапраўку ў Расію, выдаў зборнік рэвалюцыйных песень. Каб быць бліжэй да Расіі, пераехаў у Бухарэст, дзе скончыў медыцынскі факультэт універсітэта, абараніў доктарскую дысертацыю (1877).

У Бухарэсце пазнаёміўся з Хрыста Боцевым, удзельнічаў у падрыхтоўцы вядомага Красавіцкага паўстання балгар (1876) супраць турэцкага панавання. З 1881 г. жыў у Парыжы, потым пераехаў у Балгарыю, дзе адыграў прыкметную ролю ў выданні рэвалюцыйнай літаратуры, падтрымліваў сувязь з народніцкай групай «Вызваленне працы».

У 1887 г. М.К.Судзілоўскі апынуўся ў Амерыцы, дзе прыняў амерыканскае грамадзянства і пасяліўся ў Сан-Францыска. Займаўся медыцынай і публіцыстыкай. Але цяга да перамены месца, імкненне пастаянна знаходзіцца ў гушчыні рэвалюцыйных падзей, прывялі яго ў 1892 г. на Гавайскія астравы, дзе ён стварыў партыю «незалежных», галоўнай мэтай якой абвяшчалася барацьба супраць каланіяльнага прыгнёту. Як прадстаўнік гэтай партыі ў 1900 г. выбраны спачатку сенатарам астраўнога парламента, потым — прэзідэнтам. На гэтай пасадзе ён правёў у жыццё шэраг радыкальна-дэмакратычных рэформ.

З 1903 г. жыў у Кітаі, спрабаваў зрабіць напад на Акатуйскую катаржную турму ў Забайкаллі з мэтай вызваліць палітвязняў. У 1904 г. Мікалай Канстанцінавіч пераехаў у Японію. Вёў там рэвалюцыйную прапаганду сярод рускіх ваеннапалонных, адкрыў для іх 3 школы, выдаваў рускія газеты «Япония и Россия», «Воля», «Восточное обозрение», падтрымліваў цесныя сувязі з японскімі сацыял-дэмакратамі і з кітайскімі рэвалюцыянерамі.

Пазней ён жыў на Філіпінскіх астравах, у Кітаі і зноў у Японіі. Вядомы як аўтар прац па медыцыне, хіміі, філасофіі, сацыялогіі, геаграфіі.

Памёр М.К.Судзілоўскі 30.4.1930 г.

А.Леўскі.

ЯЎГЕНІЯ КАНСТАНЦІНАЎНА СУДЗІЛОЎСКАЯ

Нарадзілася ў 1854 г. ў Магілёве ў заможнай дваранскай сям'і. Вучылася ў Магілёўскай жаночай гімназіі, дзе пазнаёмілася з ідэямі народнікаў.

Скончыўшы ў 1870 г. гімназію, працягвала вучобу ў Пецярбургу, потым у 1872—73 гг. у Швейцарыі (Цюрых). Калі вярнулася з-за мяжы, зблізілася з вядомымі дзяячкамі «Народнай волі» С.П.Пяроўскай, В.М.Фігнер і інш. Пад выглядам вясковай дзяўчыны «хадзіла ў народ», актыўна ўдзельнічала ва ўсіх рэвалюцыйна-прапагандысцкіх акцыях народнікаў. У 1874 г. Я.К.Судзілоўскую арыштавалі, 2 гады яна правяла ў зняволенні ў Петрапаўлаўскай крэпасці. На судзе («працэс 193-х» нарадавольцаў) прыгаворана да высылкі пад нагляд паліцыі ў маёнтак Фастава Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні. Пасля адбыцця тэрміну ссылкі з 1892 г. жыла ў Кіеве, Арлоўскай і Смаленскай губернях, дзе сумяшчала работу ў нядзельных школах з прапагандай народніцкіх ідэй сярод сялян.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі выехала ў Францыю. У канцы 1921 г. вярнулася на радзіму, працавала настаўніцай у в. Фастава.

Дата смерці і месца пахавання Яўгеніі Канстанцінаўны невядомы. *Т.Палажэнцава.*

РЫГОР ПРАКОПАВІЧ ІСАЕЎ

Сына магілёўскага паштальёна Пракопа Ісаева жыхары вуліцы Ветранай (цяпер вул. Ленінская) называлі «неўтаймаваным». Рыгор Пракопавіч Ісаеў нарадзіўся 10.1.1857 г. ў Магілёве. З юнацкіх гадоў стаў на шлях рэвалюцыйнай барацьбы з царскім самадзяржаўем. У час вучобы ў Магілёўскай мужчынскай гімназіі ён кіраваў тайным гуртком самаадукацыі, распаўсюджваў забароненую літаратуру. Потым у Пецярбургскім універсітэце і Медыка-хірургічнай акадэміі актыўна ўдзельнічаў у студэнцкім руху — кіраваў зямляцкай групай студэнтаў — ураджэнцаў Магілёўскай губерні, падтрымліваў цесную сувязь з гуртком, які існаваў у Магілёўскай гімназіі, зблізіўся з членамі тэрарыстычнай групы «Свабода або смерць». У маі 1879 г. ўступіў у «Народную волю», быў членам яе выканаўчага камітэта. Актыўна ўдзельнічаў у распрацоўцы планаў забойства цара ў Маскве, Адэсе і Пецярбургу.

У 1881 г. Р.П.Ісаеў арыштаваны. На «працэсе 20-ці» ў лютым 1882 г. прыгавораны да смяротнага пакарання, якое было заменена пажыццёвай катаргай. Хворы на туберкулёз лёгкіх, ён мужна пераносіў суровыя дні зняволення ў Шлісельбургскай крэпасці. Мянушка Неўтаймаваны, што меў у дзяцінстве, замацавалася за ім назаўсёды. Памёр Р.П.Ісаеў 25.3.1886 г. ў Шлісельбургскай крэпасці.

Т.Шчарбакова.

АНТОН АФОДЗЬЕВІЧ ВАСЮЦІНСКІ

Скульптар-медальер Антон Афодзьевіч (Фёдаравіч) Васюцінскі нарадзіўся ў Магілёве ў 1858 г. Вучыўся ў 1881—88 гг. у Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Працаваў старшым медальерам Пецярбургскага манетнага двара. Сярод работ: «Медаль рускага таварыства птушкагадоўлі» (1886), «Геркулес, які забівае трохгаловую гідру» (1888) і інш. У 1925 г. стварыў бронзавую плакетку «Апошняе падполле У.І.Леніна ў 1917 г. ў Разліве». Памёр А.А.Васюцінскі ў 1935 г.

ЛЕАНІД ІСАКАВІЧ МАНДЭЛЬШТАМ

Нарадзіўся 4.5.1879 г. ў Магілёве, у купецкай сям'і. Вучыўся ў Новарасійскім (Адэса) універсітэце, у Страсбургу. З 1925 г. прафесар Маскоўскага універсітэта, з 1934 г. ў Інстытуце фізікі АН СССР. Акадэмік АН СССР з 1929 г., член-карэспандэнт з 1928 г. Навуковыя працы па оптыцы, тэарэтычнай фізіцы, радыётэхніцы. Л.М.Мандэльштам адзін з заснавальнікаў школы савецкай радыёфізікі. Памёр 27.11.1944 г. *Т.Палажэнцава.*

РУВІМ ІСАЕВІЧ ФРАЕРМАН

Нарадзіўся ў 1881 г. ў Магілёве. Скончыў Харкаўскі тэхналагічны інстытут. Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Падзеям грамадзянскай вайны на Далёкім Усходзе, жыццю малых народаў прысвяціў аповесці, пераважна для дзяцей: «Агнёўка» (1924), «Буран» (1926), «Васька-гуляк» (1929), «Другая вясна» (1932), «Нікічэн» (1933) і інш. Паводле аповесці «Дзікая сабака Дзінга, або Аповесць аб першым каханні» ў 1962 г. быў зняты кінафільм. Рувім Ісаевіч апублікаваў шэраг апавяданняў для дзяцей, нарысаў, кніжку пра А.Гайдара.

Памёр Р.І.Фраерман 28.3.1972 г.

ВЯЧАСЛАЎ ГАРНОЎСКІ

Гады нараджэння і смерці В.Гарноўскага, на жаль, невядомы. Удзельнік нацыянальна-вызваленчай вайны ў Грэцыі. У 1820 г. ў

Магілёве ён уступіў у тайнае грэчаскае рэвалюцыйнае таварыства. У пачатку 1821 г. В.Гарноўскі пакінуў Магілёў, у Валахіі сфарміраваў уланскі полк. На працягу 3 месяцаў прымаў удзел у баявых дзеяннях супраць туркаў рускіх войскаў пад камандаваннем генерал-маёра Аляксандра Іпсіланці. Пасля паражэння пад Драгашанамі Гарноўскі перайшоў аўстрыйскую граніцу, але быў схоплены і зняволены ў турму на 5 гадоў. У 1826 г. па патрабаванні цара Аляксандра I быў выдадзены Расіі, вернуты ў Магілёў пад пільны нагляд паліцыі. У 1837 г. ўрад Грэцыі завочна ўзнагародзіў В.Гарноўскага найвышэйшым ордэнам «Збавіцель».

ВАЦЛАЎ ПЯТРОВІЧ ФЕДАРОВІЧ

Нарадзіўся ў 1848 г. ў Магілёве, беларускі краязнавец, калекцыянер. Скончыў Маскоўскі універсітэт. Працаваў у Сараставе, Царыцыне, Ерэване. З 1884 г. жыў у Віцебску. У часопісах «Ziemia» («Зямля»), «Kraj» («Край») і інш. друкаваў артыкулы па гісторыі Віцебшчыны. Сабраў археалагічную і нумізматычную калекцыі, творы літаратуры і мастацтва. Сярод іх рукапісы А.Рыпінскага, Я.Баршчэўскага, манускрыпты 17—18 ст., абразы, пячаткі, ордэны, прадметы вайсковага побыту і хатняга ўжытку —усяго каля 4,5 тысяч экзэмпляраў, у 1924 г. ўсё гэта было перададзена Віцебскаму краязнаўчаму музею. У бібліятэцы В.П.Федаровіча (налічвала больш за тысячу тамоў) былі кнігі па гісторыі Беларусі і Літвы, беларускія і літоўскія выданні 18—20 ст. В.П.Федаровіч быў членам-карэспандэнтам Кракаўскай АН, ганаровым членам Віцебскай вучонай архіўнай камісіі. Пасля смерці ў 1912 г. выйшла яго кніга гістарычных нарысаў на польскай мове «Z okolic Dzwiny».

Памёр В П.Федаровіч 25.1.1911 г.

Т.Шчарбакова.

Архітэктурная спадчына Магілёва

Па колькасці, гістарычнай разнастайнасці і ступені захаванасці помнікаў архітэктуры і гісторыі горадабудаўніцтва Магілёў з'яўляецца унікальным горадам Беларусі. Цэнтральная частка горада ў асноўным захавала гістарычную планіроўку 17—19 ст., дзе сярод сучаснай забудовы размешчаны помнікі архітэктуры розных тыпалагічных груп: жылыя, культавыя, грамадзянскія будынкі 17 — пачатку 20 ст. Непаўторны маляўнічы рэльеф тэрыторыі горада ўздоўж Дняпра і Дубровенкі, веліч лепшых помнікаў беларускага дойлідства, выразнасць сучаснай забудовы робяць Магілёў адным з цікавейшых гарадоў Беларусі.

Помнікі горадабудаўніцтва ў сучасным Магілёве

У архітэктурна-планіровачнай структуры горада вылучаецца гістарычны цэнтр — помнік горадабудаўніцтва і архітэктуры. Тут можна вызначыць 4 гістарычныя зоны, у якіх часткова захавалася планіроўка старажытных пасадаў — Нагорскага, Шклоўскага, Пакроўскага і Задубровенскага. Цяпер гэтыя зоны з'яўляюцца помнікамі архітэктуры горадабудаўніцтва.

Нагорскі пасад — найбольш старажытная частка Магілёва, згадваецца ў навуковых дакументах 16—18 ст. Гэта тэрыторыя абмежавана вуліцамі Лазарэнкі (былая Велікакняжацкая, Віленская), Камсамольская (былая Дваранская), Вал Чырвоная Зорка (былы Архірэйскі Вал) і Левая Дубровенка. Каля 1526 г. на месцы старажытнага замка на высокім плато пры ўпадзенні Дубровенкі ў Дняпро быў пабудаваны Магілёўскі замак (цяпер тэрыторыя парку імя Горкага) плошчай больш за 1 га. Да замка далучаўся гандлёва-рамесніцкі Нагорскі (Нагорны) пасад, які пазней атрымаў назву Стары горад. Паміж замкам і пасадам сфарміравалася гандлёвая плошча (у канцы 18 ст. Губернская плошча, цяпер — Савецкая) Гандлёвая плошча ў пачатку 17 ст. займала тэрыторыю больш за 2 га, мела форму няправільнага шматвугольнага


МАГІЛЁЎ
паводле плана 1918 г.
(выданне П. Е. Навоева)
у Оршу
ст. Магілёў
Кацярынінская вул.
Пилыкавіцкая вул.
Бярозавая вул.
Рабочая вул.
3-я Цагельная вул.
5-я Цагельная вул.
Капітанаўская вул.
Новабазарная вул.
Карагандаўская вул.
1-я Ледзькаўская вул.
у Асіповічы
Віленская вул.
Афіцэрская вул.
Дзебранскі яр
3-я лінія Машкоўскай гары
4-я лінія Машкоўскай гары
Пушкарэвічаў зав.
Віленская вул.
Дняпроўская вул.
Мал. Садовая вул.
Зялёная вул.
Суворавскі сад
Ніжняя Мошка
2-я Струшня
Глеба Барысаўская вул.
Вял. Заваллe
Мал. Заваллe
Быхаўская вул.
Вял. Мяшчанская вул.
Пакроўская вул.
2-я Мікалаеўская вул.
Быхаўская шаша
Левае Заваллe
Папінская вул.
Дняпро
Новачарнігаўская вул.
Узвальская вул.
Лагерная вул.
Вял. Чавуская вул.
1-я Гарбарная вул.
Старачарнігаўская вул.
Алейны вал
1-я Слабодская вул.
у Чавусы
Палявая вул.
Бойніцкая вул.
Бойніцкая вул.
Лупа лаўка
Андрэеўская вул.
Рагачоўская вул.
у Гомель
Сады
Могілкі
Яры

ніка. На ёй знаходзіліся 26 драўляных крам. У канцы 18 ст. на плошчы створаны ансамбль мураваных грамадскіх будынкаў. Тэрыторыя Нагорскага гандлёва-рамесніцкага пасада была абнесена земляным абарончым валам, які называўся Кругавым (або Блізкім). За валам ішоў глыбокі роў, ён аддзяляў тэрыторыю Нагорскага пасада (у 1809 г. ён засыпаны, а частка вала на яго працягу скапана).

У той частцы вала, дзе праходзіў роў, былі 2 брамы: Ветраная (драўляная) і Каралеўская (мураваная). Ад кожнай брамы цераз роў перакідваўся драўляны мост. Ад Ветранай брамы пачыналася вул. Ветраная, ад Каралеўскай — вул. Шклоўская, яны вялі да гандлёвай плошчы. Да 17 ст. сфарміравалася двухпрамянёвая сістэма планіроўкі Нагорскага пасада. Яна існуе да нашага часу — ад Савецкай плошчы адыходзяць радыяльныя вуліцы Першамайская (былая Шклоўская, пазней Дняпроўскі праспект, Ульянавай-Крупскай) і вул. Ленінская (былая Ветраная, пазней Вялікая Садовая). На тэрыторыі Нагорскага пасада захаваліся падмуркі гарадской ратушы 17 ст. (Савецкая плошча), рэшткі езуіцкага калегіума 17—18 ст. (вул Першамайская, 7а), фарны касцёл 17 ст. (вул. Камсамольская, часткова), архірэйскі палац 18 ст. (вал Чырвоная Зорка, 5), будынак гарадской управы 19 ст. (вул. Ленінская, 1), будынкі акруговага суда 18—19 ст. на Савецкай, абласнога драмтэатра 19 ст. на Тэатральнай плошчах, жылы дом 18 ст. (вул. Ленінская). Акрамя таго, на тэрыторыі Нагорскага пасада знаходзіўся шэраг помнікаў архітэктуры. Сярод іх два буйнейшыя праваслаўныя манастыры 17 ст. — Богаяўленскі і Спаскі, ансамбль Архірэйскага двара і духоўнай семінарыі 18 ст., Станіславаўскі касцёл 17—18 ст., фарны і езуіцкі касцёлы 17 ст., ансамбль грамадскіх будынкаў на Губернатарскай плошчы 18—19 ст. і інш.

Шклоўскі пасад забудаваны да канца 17 ст., займаў тэрыторыю старажытнага Шклоўскага пасада і прылеглыя да яго кварталы, якія разам з Віленскім і Задубровенскім пасадамі называліся Новым горадам. У сучасным Магілёве ён абмежаваны вуліцамі Лазарэнкі, Камсамольскай, Божкіна (былая Вялікая Гваздоўка), Ціміразеўскай (былы Варанцоўскі завулак), Дзябранскім Ярам і р. Дубровенка. Новы горад знаходзіўся паміж двума абарончымі валамі: Кругавым (Блізкі) і Палявым (Далёкі). Палявы вал абкружаў Новы горад і пачынаўся ад яра р. Дзебра, перасякаў Дубровенку і падыходзіў да Дняпра. У Палявым вале было восем драўляных брам. Тры з іх — Шклоўская, Віленская і Быхаўская — размяшчаліся на галоўных вуліцах і адкрывалі ўезд у горад адпаведна з поўначы, паўночнага захаду і паўднёвага захаду. У канцы 18 — сярэдзіне 19 ст. частка Новага горада пабудавана за Палявым валам. Планіровачная структура таго часу існуе і цяпер. У 1938—40 гг. тут створаны новы ансамбль плошчы Леніна і пракладзена новая шыротнага напрамку вул. Міру (сучасны праспект Міру). Захаваліся і асноўныя вуліцы Шклоўскага пасада: Першамайская, Ленінская, паралельныя ім Піянерская (былая Малая Садовая) і Карла Маркса (былая Зялёная), папярочныя К.Лібкнехта (былая Паштовая, Пажарная) і Міронава. Да нашага часу на тэрыторыі Шклоўскага пасада ёсць нямала помнікаў архітэктуры. Сярод іх Архіепіскап-



Віленская вуліца. Фота пачатку 20 ст.

скі палац, жылы корпус Спаскага манастыра, жылы дом (усе 18 ст), будынкі мужчынскай гімназіі, настаўніцкага інстытута (усе 19 ст.), будынкі банка, крэдытнага таварыства (усе 20 ст.), размешчаныя на вул. Ленінскай. Акрамя таго, на вул. Камсамольскай захаваўся Станіславаўскі касцёл 18 ст., на вул. Першамайскай — будынак жаночай гімназіі 19 ст. і царква Трох Свяціцеляў 20 ст., на вул. Міронава — будынак Дваранскага сходу 19 ст., на вул. Піянерскай — будынак рэальнага вучылішча 19 ст.

Пакроўскі пасад забудаваны ў 16 — пачатку 18 ст. ў поймавай частцы Дняпра і нізіннага плато за валам Чырвоная Зорка. З поўдня Пакроўскі пасад быў абмежаваны Дняпром, з усходу — ярам і р. Дзебра, з поўначы — Нагорным і Шклоўскім пасадамі. Гэта частка горада не мела абарончых збудаванняў з-за натуральных перашкод, якімі з'яўляліся Дняпро, яр Дубровенка і высокі Архірэйскі вал. Планіроўка Пакроўскага пасада нерэгулярная: жылыя кварталы драўляных дамоў выцягнуты ўздоўж лініі Дняпра ў форме няправільных чатырох- і шматвугольнікаў. Захаваліся асноўныя вуліцы пасада: сучасныя Вялікая Грамадзянская (былая Вялікая Мяшчанская), паралельна якой праходзяць кароткія вул. Волі 1-я (былая Пакроўская, 1-я Мікалаеўская), Волі 2-я (былая 2-я Мікалаеўская). У паўднёвай частцы пасада размешчаны прыдняпроўскі парк. У гэтай частцы горада выдатны помнік беларускага барока — Мікалаеўская царква 17 ст., якая знаходзіцца ў комплексе з Ануфрыеўскай царквой, шпіталем, званіцай, агароджай з брамай. Сярод сучаснай жылой забудовы вылучаюцца гарадская «лазня», «мытны дом», «гасціны дом», дом браціі кушнерскага цэха, сінагога і яўрэйская школа, а таксама драўляныя жылыя дамы 19 — пачатку 20 ст. На жаль, не захаваліся касцёл і кляштар Бернардзінцаў 17 ст., Пакроўская царква 18 ст., якія існавалі да 20 ст.



Рэстаўрыраваная царква Трох Свяціцеляў.

Задубровенскі пасад у сучасным Магілёве займае тэрыторыю на захад ад Дубровенкі і ўздоўж правага берага Дняпра. Абмежаваны сучаснымі вуліцамі Заводскай (былая Папінская), Чэлюскінцаў (былая Быхаўская шаша), Мянжынскага (былая Малое Заволле), Лазарэнкі і Садовай (былыя завулкі Садоўскі, Пушкаровічаў). У пісьмовых крыніцах упамінаецца ў 16—18 ст., калі тэрыторыя пасада была ўмацавана часткай Палявога (Далёкага) вала з 4 драўлянымі брамамі: Віленскай, Уструшненскай, Трысненскай, Быхаўскай, Папінскай, ад якіх пачыналіся гарадскія вуліцы. З канца 17 — пачатку 18 ст. на гэтай тэрыторыі сфарміраваліся 3 пасады: на поўначы Віленскі, у цэнтры Задубровенскі, на поўдні Папінскі. Сучасныя вуліцы Лазарэнкі і Чэлюскінцаў — галоўныя вуліцы Задубровенскага пасада. Яны злучаны папярочнымі больш кароткімі вуліцамі Мянжынскага, Вароўскага (былыя Быхаўская, Салтанаўская, Белаградская) і інш. На сучаснай тэрыторыі Задубровенскага пасада захаваліся 2 мураваныя Барысаглебскія царквы (зав. Брусава, 2), будынак жаночага епархіяльнага вучылішча (вул. Вароўскага, усе 19 ст.), а на старажытных каталіцкіх могілках (вул. Лазарэнкі) — 2 мураваныя капліцы.

У 2-й палавіне 19 ст. пачала забудоўвацца паўночная частка горада — Карабанаўскае прадмесце, абмежаванае цяпер вуліцамі Першамайскай, Віцебскі тупік, Карабанаўскай і Сурганава (былая Нагорная шаша). Архітэктурна-планіровачная структура прадмесця сфарміравалася ў 20 ст., калі ў 1902 г. была пракладзена чыгунка. Утварылася Прывакзальная плошча з мураваным будынкам чыгу-

начнага вакзала. Ад Прывакзальнай плошчы забудоўваўся Кацярынінскі тракт, які звязаў вакзал з цэнтрам горада. На былой тэрыторыі Карабанаўскага прадмесця захаваліся помнікі архітэктуры пачатку 20 ст.: комплекс будынкаў чыгуначнага вакзала, былы ваенны шпіталь на вул. Сурганава, артылерыйскія казармы на вул. Крупскай, а таксама жылыя драўляныя дамы 19 — пачатку 20 ст.

Помнікі архітэктуры 17 — сярэдзіны 18 стагоддзя

З пачатку 17 ст. Магілёў — самы буйны гандлёва-рамесніцкі цэнтр Беларусі. Высокі ўзровень эканамічнага патэнцыялу, шырокія гандлёвыя і культурныя сувязі, развіццё рамяства садзейнічалі фарміраванню ў Магілёве высокаразвітай мастацкай культуры. Асабліва славіліся магілёўскія майстры гравюры па медзі, разьбы па дрэве, у манументальным жывапісе і архітэктуры. У іх творах своеасаблівыя традыцыі, мясцовыя прыёмы і формы. Усё гэта дае падставу гаварыць аб існаванні ў 17—18 ст. Магілёўскай школы дойлідства (у 2-й палавіне 18 ст. школа заняпала). Найбольш значныя дасягненні былі ў будаўніцтве культавых мураваных храмаў з сінтэзам аб'ёмна-планіровачных структур старажытнарускага 3-апсіднага крыжова-купальнага храма і 3-нефавай базілікі, што характэрна для заходнееўрапейскага будаўніцтва. Росквіт Магілёўскай школы дойлідства супаў з развіццём архітэктуры беларускага барока, асаблівасці якога яскрава праявіліся ў помніках таго часу. Лепшыя помнікі архітэктуры перыяду барока ў Магілёве — архітэктурныя комплексы праваслаўных манастыроў: Богаяўленскага, Спаскага, Мікалаеўскага, а таксама храмы Пакроўскі і Успенскі. Да нашага часу збярогся унікальны помнік Магілёўскай школы дойлідства — архітэктурны ансамбль Мікалаеўскай царквы. Мастацкія асаблівасці Магілёўскай школы дойлідства найбольш відавочныя ў помніках архітэктуры горада, што, на жаль, не захаваліся, але з'яўляюцца значнымі вехамі ў гісторыі беларускай архітэктуры.

Богаяўленскі манастыр — адзін з буйнейшых праваслаўных манастыроў 17—18 ст., архітэктура яго зрабіла вялікі ўплыў на будаўніцтва шэрагу праваслаўных храмаў Беларусі. Да сярэдзіны 18 ст. Богаяўленскі манастыр — буйны архітэктурны комплекс, у які ўваходзілі цэрквы Богаяўленская і Іаана Багаслова, званіца, друкарня, крамы, будынак шпіталя, дом настаяцеля манастыра, шэраг гаспадарчых пабудоў. Комплекс быў абкружаны мураванай агароджай з уязной брамай.

Будаўніцтва манастыра пачата ў 1618 г. на месцы дома з пляцам на вул. Шклоўскай. Даравальны фундуш на гэту зямлю аформіў князь Ян Агінскі. У 1633 г. кароль Уладзіслаў IV падпісаў прывілей на будаўніцтва манастыра. Галоўны храм манастыра — Богаяўленская царква, пабудавана ў 1633—36 гг. мясцовымі майстрамі Варламам Палоўкам і Арсеніем Азаровічам у стылі ранняга барока. Гэта мураваная крыжова-купальная базіліка з развітой 3-апсіднай алтарнай часткай. У інтэр'еры 2 рады слупоў (па 5 у кожным) падзялялі ўнутраную прастору на 3 нефы (цэнтральны шырэйшы за бакавыя), кожны заканчваўся паўцыліндрычнай апсідай. Над сяродкрыжжам узвышаўся паўсферычны купал на светлавым 8-гранным барабане (купал пастаўлены ў 1700 г.) з невысокай галоўкай. Галоўны фасад завяршалі 2 вежы і фігурны франтон паміж імі. Ён меў гарызантальную 3-ярусную пабудову, быў дэкарыраваны плоскімі арачнымі нішамі з гіркамі, што характэрна для архітэктуры ранняга барока. Інтэр'ер Богаяўленскай царквы багата аздоблены, сцены дэкарыраваны размалёўкай. Асаблівай прыгажосцю і высокім майстэрствам вылучаўся драўляны 4-ярусны іканастас у тэхніцы скразной беларускай разьбы, пакрыты пазалотай. Некаторыя абразы ў іканастасе 17—18 ст. выкананы мясцовым майстрам Афанасіем Пігарэвічам, а сярэбраныя аклады да іх — работы магілёўскага чаканшчыка Пятра Сліжыка.

Крыху пазней, у сярэдзіне 1730-х г., пабудаваны другі храм — мураваная «цёплая» (для зімовай службы) царква Іаана Багаслова. У 1657 г. побач з Богаяўленскім храмам пабудаваны мураваная 4-ярусная шатровая званіца і агароджа.

У 1676 г. кароль Ян Сабескі даў прывілей Магілёўскаму праваслаўнаму брацтву на адкрыццё пры Богаяўленскім манастыры друкарні і выданне кніг на беларускай і польскай мовах. У тым жа годзе пабудаваны драўляны будынак друкарні (у 1737 г. пастаўлены мураваны). З дзейнасцю гэтай друкарні звязаны імёны вядомых беларускіх гравёраў — братоў М. і В.Вашчанкаў, Ф.Ангілейкі і інш. Богаяўленскі манастыр неаднаразова разбураўся і зноў аднаўляўся (разбураны ў 1708 г. і

1748 г., у 1760-х гадах адноўлены, у 1812 г. зноў разбураны, у 1866 г. часткова адноўлены). У 1928 г. абедзве манастырскія царквы былі закрыты (у іх размяшчаліся цэнтральныя архівы БССР). У гады Айчыннай вайны ўвесь комплекс Богаяўленскага манастыра поўнасцю разбураны.

Спаскі манастыр — старэйшы архітэктурны комплекс горада. Размяшчаўся ў яго цэнтральнай частцы на вул. Ветранай (Шклоўскае прадмесце). Яго галоўны храм — драўляная Спаская царква, вядома з 1478 г., мела важнае значэнне ў жыцці Магілёва, а Спас лічыўся заступнікам горада і яго жыхароў. Да сярэдзіны 18 ст. Спаскі манастыр — адзін з буйнейшых на Беларусі. Разам з будынкамі архірэйскага двара і духоўнай семінарыі (19 ст.) ансамбль пачынаўся ад Архірэйскага вала, займаў увесь квартал па вул. Ветранай. У манастырскі комплекс уваходзілі драўляная Спаса-Праабражэнская царква, манастырскія карпусы, якія ўтваралі ўнутраны трапецападобны дворык. Да манастырскіх карпусоў далучаліся крамы. Уся тэрыторыя была абкружана мураванай агароджай з брамай і званіцай. У 1588 г. пры Спаскім манастыры зацверджана праваслаўнае брацтва, якое існавала да 1618 г. (з 1618 г. да сярэдзіны 17 ст. манастыр перайшоў да уніятаў).

Мураваныя будынкі Спаскага манастыра пачалі будаваць з сярэдзіны 18 ст., калі манастыр вярнулі праваслаўным. У 1740—42 гг. пад кіраўніцтвам магілёўскага епіскапа Іосіфа Валчанскага пачалося будаўніцтва мураванай Спаса-Праабражэнскай царквы. У 1748 г. другі епіскап Іеранім Валчанскі давёў будаўніцтва царквы да даху. Але пасля пажару 1748 г. ад храма засталіся толькі сцены. З 1756 г. храм будавалі пад кіраўніцтвам епіскапа Георгія Каніскага, вядомага палітычнага і культурнага дзеяча. Ён выклікаў з Вільні архітэктара І.К.Глаўбіца, паводле праекта якога ў 1762 г. і было скончана будаўніцтва Спаса-Праабражэнскай царквы, а ў 1785 г. побач з ёю пастаўлена мураваная званіца. Да 1802 г. царква была кафедральным саборам Магілёва, у 1884 г. перададзена Магілёўскай духоўнай семінарыі. Яна з'яўляецца прыкладам позняга, так званага віленскага, барока, што было характэрна для творчасці архітэктара Глаўбіца. Гэта крыжова-купальны 2-вежавы храм. Над сяродкрыжжам узвышаўся светлавы 8-гранны барабан, завершаны сферычным купалам з круглымі вокнамі-люнетамі. Да глухіх граней барабана далучаліся 4 вежачкі з невялікімі галоўкамі наверсе. Разам яны стваралі пяцігаловую кампазіцыю, што характэрна для праваслаўнага дойлідства. Галоўны фасад меў двухчастковую кампазіцыю, якая была падкрэслена тонкапрафіляваным карнізам. Над фасадам узвышаліся дзве 2-ярусныя вежы з цыбулепадобнымі галоўкамі, паміж імі — высокі фігурны шчыт. Выкарыстаны дэкаратыўныя элементы фасадаў: стройныя спараныя пілястры на галоўным і бакавым фасадах, тонка прафіляваныя карнізы, ляпныя дэталі над паўцыркульнымі вокнамі. Інтэр'ер храма багата аздоблены. Там знаходзіліся творы жывапісца Мірона Пігарэвіча і чаканшчыка Пятра Сліжыка з Магілёва. Храм быў размешчаны над Дняпроўскай кручай, вылучаўся сярод жылой забудовы і быў відаць з боку Дняпра на далёкай адлегласці. Разбураны ў гады Айчыннай вайны. Ад усяго комплексу Спаскага манастыра ўцалеў мураваны 2-павярховы манастырскі корпус, які тарцом выходзіў на вул. Ветраную (цяпер вул. Ленінская, 11), выкарыстоўваецца як жылы будынак. Захавалася таксама частка аднапавярховага крыла (арыентавана ва ўнутраны двор). У 2-павярховым корпусе размяшчалася кансісторыя, у аднапавярховым — манаскія келлі, гаспадарчыя і службовыя памяшканні.

Архірэйскі палац размяшчаўся на тэрыторыі Спаскага манастыра. Узведзены ў 1763—85 гг. (праект арх. І.Глаўбіца) як рэзідэнцыя праваслаўнага архіепіскапа Георгія Каніскага, з 1797 г. — Анастасія Братаноўскага. Помнік архітэктуры позняга барока. Добра захаваўся да нашых дзён (цяпер тут музей гісторыі Магілёва). Мураваны 3-павярховы (3-і паверх мансардавы) будынак быў размешчаны на высокім плато і разам са Спаскай царквой складаў адзіную панараму, што раскрывалася з боку Дняпра. У плане прамавугольнік з сіметрычнымі 2-павярховымі рызалітамі па тарцах (цяпер унутраная планіроўка зменена). У агульным манументальным аб'ёме палаца і яго дэкаратыўнай аздобе спалучаліся рысы позняга барока і ранняга класіцызму. Пластычнае вырашэнне фасадаў з крывалінейным пераходам да бакавых рызалітаў, складаныя па абрысе ліштвы акон, высокі ламаны дах — гэта элементы архітэктуры барока. Рызаліты і бакавыя фасады маюць больш строгае класіцыстычнае рашэнне: паверхні сцен па ўсёй вышыні пакрыты глыбокім рустам, прамавугольныя вокны дэкарыраваны простымі сандрыкамі і падаконны-

мі нішамі. Тарцовы фасад 2-павярховага корпуса, што захаваўся, мае багатае дэкаратыўнае аздабленне: пілястры з карынфскімі капітэлямі, высокія прамавугольныя аконныя праёмы з ліштвамі і інш.

У канцы 18 ст. да архірэйскага двара далучаны комплекс будынкаў Магілёўскай духоўнай семінарыі (не захаваўся).

Ансамбль Мікалаеўскай царквы — адзіны комплекс архітэктуры барока, які захаваўся, поўнасцю адноўлены і рэканструяваны ў наш час (у 1981 г. скончана знешняя рэстаўрацыя будынкаў). Размешчаны воддаль ад цэнтра ў нізкай пойме Дняпра. Комплекс складаецца з мураваных будынкаў Мікалаеўскай і «цёплай» (зімовай) Ануфрыеўскай цэркваў, жылога дома (першапачаткова шпіталя), званіцы. Абкружае тэрыторыю мураваная агароджа з уязной брамай.

У 1636 г. кароль Уладзіслаў IV выдаў прывілей мітрапаліту Пятру Магіле на будаўніцтва ў Магілёве царквы святога Мікалая. Першапачаткова была пастаўлена драўляная царква (пры ёй існавалі драўляныя келлі манахаў). У 1669—72 гг. ажыццёўлена будаўніцтва мураванай Мікалаеўскай царквы. Мікалаеўская царква — 3-нефавая, 3-апсідная крыжова-купальная базіліка, характэрны прыклад беларускага барока і магілёўскай школы дойлідства. У яе архітэктурна-прасторавай кампазіцыі спалучаюцца базілікавая (з боку галоўнага фасада) і крыжова-купальная (з боку алтарнай часткі) пабудовы.



Магілёўская Мікалаеўская царква. Агульны выгляд.

Над сяродкрыжжам, на нізкім светлавым васьмігранным барабане цыбулепадобны купал, які аб'ядноўвае абедзве часткі храма ў адзіную кампазіцыю. Знешняе дэкаратыўнае аздабленне храма сканцэнтравана пераважна на галоўным фасадзе, які вырашаны плоскай сцяной. Прафіляванымі карнізнымі паясамі плоскасць фасада падзелена на 3 ярусы. Першы — аснова для наступных ярусаў — дэкарыраваны 3 паўцыркульнымі нішамі на ўсю яго вышыню. Другі, крыху меншы па вышыні, дэкарыраваны глухой аркатурай з ляпным арнаментам і спаранымі нішамі з гіркамі. Трэці ярус — значна вузейшы за астатнія, больш насычаны аздобай, яго ўпрыгожваюць паўкалонкі, аркатурны пояс з арнаментам. Фланкіраваны фасад 2 чацверыкамі — аснаванні невысокіх вежаў з цыбулепадобнымі галоўкамі. Дэкаратыўнае ўбранства ярусаў галоўнага фасада стварае ўражанне цэласнасці, разнастайнасці і багацця, надае помніку незвычайную прыгажосць. Унутраная прастора храма 2 радамі калон (па 3 у кожным) падзелена на 3 нефы. Барабан купала пры дапамозе ветразяў абапіраецца на 4 слупы. Інтэр'ер багата аздоблены фрэскавым жывапісам. Скляпенні купала ўпрыгожаны фрэскавай кампазіцыяй «Тройца новазапаветная» (17 ст.), па ветразях — выявы 4 апосталаў з сімваламі. Сцены паміж аконнымі праёмамі размаляваны на 2 узроўнях на біблейскія і евангельскія тэмы (збераглося 19 кампазіцый). Усе яны створаны ў 1-й палавіне 18 ст. Але самы выдатны мастацкі твор — 4-ярусны іканастас, выкананы мясцовымі майстрамі ў 17 ст. ў тэхніцы скразной драўлянай разьбы з пазалотай, які захаваўся да нашага часу.

Ануфрыеўская царква. Пабудавана ў 1798 г. як крыжова-купальны храм. Мураваная агароджа з убудаванымі ў яе званіцай, каплічкай і жылым домам узводзілася на мяжы 17—18 ст., агінае па перыметры ўсю трапецападобную тэрыторыю. Мае 2 ўваходы — заходні і ўсходні. Усходні — гэта галоўная ўязная брама з лучковым праёмам. У паўднёва-заходнім баку агароджы 1-ярусная званіца, у паўночна-заходнім — невялікая квадратная ў плане каплічка. Мураваны 1-павярховы жылы дом пабудаваны ў канцы 17 ст. як шпіталь, таксама далучаны да паўднёвага боку агароджы. Усе гэтыя збудаванні разбураны ў Айчынную вайну і зноў узведзены ў 1980-я гады.

Пакроўская і Успенская цэрквы. Пабудаваны ў традыцыях Магілёўскай школы дой-

лідства і архітэктуры стылю барока Мураваныя цэрквы пабудаваны ў 17 ст. (Успенская ў 1670 г.), існавалі да пачатку 20 ст. Гэта 1-зальныя крыжова-купальныя храмы, з трыма паўцыліндрычнымі апсідамі і паўсферычным купалам на масіўным светлавым барабане, які пастаўлены над сяродкрыжжам. Іх аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя вылучалася ступеньчатасцю: пад невысокімі аб'ёмамі рызніц узвышаўся больш высокі аб'ём асноўнай часткі храма, а над усім гэтым — купал на высокім барабане. Знешняя дэкаратыўная аздоба вельмі сціплая: стройныя пілястры на вуглах, тонка прафіляваны карніз, ніша з 2 калонкамі на франтоне ўпрыгожана ляпным арнаментам (Успенская царква).

Сярод помнікаў каталіцкіх ордэнаў у Магілёве ў той час існавалі: касцёл і калегіум езуітаў, касцёл і кляштар бернардзінцаў, фарны касцёл. Усе яны разбураны ў гады Айчыннай вайны (часткова захаваліся толькі рэшткі езуіцкага калегіума і фарнага касцёла).

Касцёл і калегіум езуітаў. Пабудаваны ў канцы 17 — пачатку 18 ст. ў стылі барока. Комплекс размяшчаўся ў Нагорным пасадзе на вул. Шклоўскай каля Каралеўскай брамы (цяпер Тэатральная плошча). Уключаў мураваныя будынкі калегіума (закладзены ў 1686 г.), школы (абодва закончаны ў 1699 г.) і касцёла святога Ксаверыя (1699—1725 г.). Касцёл Ксаверыя — 3-нефавая базіліка з паўцыліндрычным завяршэннем цэнтральнага нефа, з 2 барочнымі вежамі на галоўным фасадзе. Яго інтэр'ер быў багата аздоблены карынфскімі пілястрамі, сцены — размалёўкай. Будынак калегіума 2-павярховы, прамавугольны ў плане, тарцом далучаўся да касцёла Ксаверыя. З 1820 г. ў будынку калегіума размясцілася ваенна-афіцэрская школа. У 1826 г. ў адным з памяшканняў следчая камісія вяла допыт дзекабрыстаў — членаў «Паўднёвага таварыства» С.І. і М.І.Мураўёвых-Апосталаў, М.П.Бястужава-Руміна і інш. У 1983 г. на месцы разбуранага калегіума быў пабудаваны 9-павярховы жылы дом (вул. Першамайская). Рэшткі калегіума (падвалы, паўднёва-заходняя частка дваровага фасада) былі захаваны і выкарыстаны пры будаўніцтве Музея дзекабрыстаў.

Фарны касцёл (касцёл Казіміра). Пабудаваны ў 1604 г. (перабудаваны ў 1810 г.). Размяшчаўся ў глыбіні квартала паміж вуліцамі Шклоўскай і Ветранай. Гэта мураваны 1-нефавы прамавугольны ў плане будынак з 5-граннай апсідай і 2-вежавым галоўным фасадам у стылі барока. Аднак пасля перабудовы ў 19 ст. набыў рысы класіцызму: усходні і заходні фасады былі вырашаны ў формах класіцыстычных калонных порцікаў, а асноўны аб'ём завершаны драўляным купалам на нізкім барабане. Будынак часткова захаваўся, уваходзіць у ахоўную зону гістарычнага цэнтра горада.

Касцёл і кляштар бернардзінцаў Быў размешчаны на правым беразе Дняпра. Заснаваны ў 1687 г. па фундацыі рэчыцкага лоўчага Фёдара Ржавускага. Касцёл святога Антонія пабудаваны ў стылі барока. Гэта 1-нефавы, прамавугольны ў плане будынак з 3-граннай апсідай і 2-вежавым галоўным фасадам (у 18 ст. да касцёла прыбудаваны прамавугольны ў плане аб'ём з дзвюма 2-яруснымі вежамі). Мураваны 2-павярховы корпус кляштара, які далучаўся з усходу да касцёла, П-падобны ў плане, меў 2-павярховую калідорную сістэму планіроўкі, дзе размяшчаліся келлі і службовыя памяшканні. Разбураны ў гады Айчыннай вайны.

Гарадскі асабняк (па Ленінскай вуліцы, 37). Трохпавярховы мураваны будынак, узведзены ў 18 ст. ў стылі барока. Гэта помнік мураваных жылых будынкаў, што дзе-нідзе засталіся на Беларусі. Будынак часткова пацярпеў у гады Айчыннай вайны. У 1970-я г. рэканструяваны, з 1982 г. тут створаны мастацкі музей В.К.Бялыніцкага-Бірулі — філіял Дзяржаўнага мастацкага музея Беларусі. Гэта невялікі прамавугольны ў плане будынак. У цэнтры яго лесвіца, вакол якой на 2-м паверсе згрупаваны жылыя памяшканні з масіўным скляпеністым перакрыццем. Сцены рытмічна прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі і дэкарыраваны прафіляванымі лапаткамі. Пры рэканструкцыі ў цэнтры галоўнага фасада быў зроблены лучковы ўваходны праём, над карнізам атык лучковага абрысу, што ўтварае 3-і мансардавы паверх. Сціплы па сваім дэкоры і вельмі ўдалы ў прапарцыянальным аб'ёмна-прасторавым вырашэнні будынак уяўляе сабой забудову гарадскога жылля 18 ст. для заможных гараджан.

Помнікі архітэктуры канца 18 — сярэдзіны 19 стагоддзя

З канца 18 ст. ў Магілёве разгарнуліся вялікія горадабудаўнічыя работы па добраўпарадкаванні гарадской тэрыторыі. Распрацоўваліся рэгулярныя планы забудовы Магілёва (першы ў 1778 г.). Да таго часу земляныя абарончыя ўмацаванні страцілі сваё стратэгічнае значэнне і перашкаджалі далейшаму развіццю горада. Таму перабудова горада пачалася са знішчэння земляных умацаванняў.

У 1809 г. быў скапаны Кругавы вал у цэнтры горада, засыпаны роў, у 1822—23 гг. галоўныя вуліцы Ветраная і Шклоўская атрымалі выгляд скразных магістралей і праходзілі праз увесь горад. Былі скапаны валы і ў іншых частках, вуліцы брукаваліся, дробныя кварталы аб'ядноўваліся ў больш буйныя. Магілёў развіваўся як суцэльны горадабудаўнічы арганізм, што адкрывала магчымасці для стварэння ансамблевай забудовы вуліц і плошчаў у стылі класіцызму.

Ансамбль Губернатарскай плошчы — адзін з першых ансамбляў, якія былі створаны ў беларускіх гарадах у стылі класіцызму. Пабудаваны ў канцы 18 — пачатку 19 ст. Кампазіцыйны цэнтр ансамбля — мураваны будынак гарадской ратушы на паўночным баку плошчы (узведзены ў 17 ст., перабудаваны ў 18 ст.) Паўкальцом абкружалі плошчу новыя мураваныя будынкі ў стылі класіцызму: каля ратушы на ўсход ад яе размяшчаліся губернатарскі дом і будынак губернскага праўлення. На захад ад ратушы знаходзіліся два будынкі —віцэ-губернатара і двух саветнікаў і ніжняга земскага суда, урачэбнай управы і архіва. У 2-й палавіне 19 ст. на Дняпроўскім праспекце і вул. Ветранай, што ўліваліся ў плошчу з поўначы, пабудаваны 2 мураваныя 3-павярховыя жылыя дамы, якія тарцамі выходзілі на плошчу. Паўднёвая частка плошчы, што далучалася непасрэдна да старажытнага замка, заставалася незабудаванай. У канцы 19 ст. на тэрыторыі замка разбіты гарадскі сквер (цяпер парк культуры і адпачынку). Архітэктурны ансамбль разбураны ў гады Айчыннай вайны. Да нашага часу захаваліся толькі два будынкі: адзін з жылых дамоў, які ў канцы 19 ст. быў пераабсталяваны пад будынак гарадской управы па вул. Ленінскай, 1, і будынак ніжняга суда, урачэбнай управы і архіва на вул. Першамайскай, дзе ў 1883 г. размяшчаўся акруговы суд. Захаваліся таксама падмуркі і рэшткі сцен гарадской ратушы, раскопкі якіх вяліся ў 1980-я гады. У 1982 г. ў цэнтры плошчы ўзведзены мемарыяльны комплекс — скульптурная кампазіцыя «Змагарам за Савецкую ўладу».

Акруговы суд. Захаваўся мураваны 2-павярховы будынак, узведзены першапачаткова ў 1770-я гады як адзін з элементаў ансамбля Губернатарскай плошчы. Яго паверхі капітальнымі сценамі былі падзелены на тры часткі з асобным уваходам для кожнай установы: ніжняга суда, урачэбнай управы, губернскага архіва. Архітэктурнае вырашэнне вельмі сціплае, у формах класіцызму: строгі рытм прамавугольных аконных праёмаў, прафіляванья карнізы, прамавугольныя і лучковыя атыкі, над карнізам па восі галоўных уваходаў. Пры рэканструкцыі ў 1883 г. будынак акруговага суда набыў больш насычаную дэкаратыўную аздобу: былі зроблены трохвугольныя і лучковыя сандрыкі над вокнамі, руставаныя пілястры, ажурныя брылі на ме-



Панарама забудовы Саборнай плошчы. З акварэлі канца 18 ст.

талічных калонках над уваходамі. Акрамя таго, надбудаваны 3-і паверх, над якім зроблены складаны атык па восі цэнтральнага ўвахода. У 1950-я гады будынак пераабсталяваны пад Магілёўскі абласны краязнаўчы музей.

Ансамбль Саборнай плошчы другі па значэнні архітэктурны ансамбль Магілёва, пабудаваны ў канцы 18 — першай палавіне 19 ст. ў стылі класіцызму на вул. Шклоўскай паводле праектаў вядомых рускіх дойлідаў М.Львова і В.Стасава.

Гарадская ратуша — адзін з лепшых помнікаў грамадзянскай архітэктуры, дзе ўвасобіўся багаты будаўнічы і творчы вопыт беларускіх майстроў. Першапачаткова ратуша ўзведзена ў канцы 17 ст. Уяўляла сабой мураваны прамавугольны ў плане 2-павярховы будынак, створаны ў 1679—81 гг. мясцовымі дойлідамі пад кіраўніцтвам майстра Феські. У цэнтры будынка да яго галоўнага фасада далучалася высокая (каля 26 м) вежа, пабудаваная ў 1682—86 гг. пад кіраўніцтвам майстра Крузберга з Быхава. Аднак гэта вежа абвалілася, у 1692—98 гг. на чале з майстрам Ігнатам была адбудавана новая вежа вышынёю да 38 м.

У 1773 г. будынак ратушы рэканструяваны ў стылі класіцызму і ў такім выглядзе захаваўся да Айчыннай вайны. Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя ратушы вырашана на кантрастным супастаўленні 2-павярховага выцягнутага корпуса і 4-яруснай вежы, накрытых паўсферычным купалам са шпілем. Унутры вежы вітыя ўсходы вялі на пляцоўку



Від на ратушу, дом губернатара і руіны гарадской брамы. З акварэлі Ю.Пешкі. Канец 18 ст.

кожнага паверха. На 1-м паверсе размяшчаліся пакоі ўчастковага прыстава і яго канцылярыі, архіў магістрата, крамы з кладоўкамі для продажу дробных тавараў, на 2-м — пакоі гарадской думы і магістрата. Помнік узарваны ў 1957 г.

Іосіфаўскі сабор. Да нашага часу не захаваўся, быў разбураны ў 1937 г. (на яго месцы пабудавана гасцініца «Дняпро»). Іосіфаўскі сабор закладзены ў памяць аб сустрэчы ў Магілёве рускай імператрыцы Кацярыны II і аўстрыйскага імператара Іосіфа II у 1780 г. (да 1802 г. з'яўляўся царквой). Іосіфаўскі сабор адзін з выдатных твораў М.Львова і адзін з першых культавых пабудоў у стылі класіцызму на Беларусі, аказаў значны ўплыў на шэраг культавых пабудоў у беларускіх гарадах.



Будынак ратушы. Фота пачатку 20 ст.

Вырашаны ў простых манументальных формах: да квадратнага ў плане асноўнага аб'ёму з усходу далучалася паўцыліндрычная апсіда, з захаду — прытвор, які значна выступае, вылучаны 6-калонным дарычным порцікам на 3-ступеньчатым стылабаце і 3-вугольным франтонам з шырокім трыгліфным фрызам. Бакавыя фасады з чатырма дарычнымі калонамі, якія пастаўлены папарна каля дзвярных парталаў і завершаны 3-вугольнымі франтонамі. У цэнтры асноўнага аб'ёму круглы барабан з паўсферычным купалам і 2 абалонкамі на адлегласці каля 3 м адна ад адной. Ва ўнутранай абалонцы — 12 арачных праёмаў, а ў цэнтры — вялікая круглая адтуліна. Вонкавая абалонка мела 12 круглых акон-люкарнаў. У інтэр'еры купал падтрымлівалі ветразі, што абапіраліся на 4 слупы. Інтэр'ер сабора быў багата аздоблены, вылучаліся абразы на медных шчытах, якія выканаў вядомы рускі мастак В.Баравікоўскі ў 1797 г.

Акрамя праекта сабора М.Львоў распрацаваў схему Саборнай плошчы. Плошча ў плане мела форму эліпса, цэнтрам кампазіцыі быў Іосіфаўскі сабор, галоўны фасад якога выходзіў на вул. Шклоўскую, па баках сабора стаялі 1-павярховыя флігелі з вежачкамі, што злучаліся з ім металічнай агароджай паміж мураваных слупоў. На процілеглым баку плошчы, па вул. Шклоўскай, на адной восі з саборам была манументальная мураваная брама, фланкіраваная такімі ж флігелямі з агароджай Брама пабудавана ў 1780 г. і захавалася да нашых дзён, рэканструявана. У 1946 г. на ёй былі ўстаноўлены мемарыяльныя дошкі ў гонар часцей 2-га Беларускага фронту, што вызвалялі горад 28.6.1944 г.

У 20—30-я гады 19 ст. ансамбль Саборнай плошчы завершаны паводле праекта В.П.Стасава. На плошчы на процілеглым баку ад Іосіфаўскага сабора за аркай і агароджай у 1815—31 гг. пабудаваны мураваны 1-павярховы будынак экзерцыргаўза ў стылі класіцызму. Збудаванне даўжынёй больш за 100 м уяўляла сабой адзіную высокую залу і прызначалася для вядзення ваенных вучэнняў. У 1846 г. пераабсталявана для размяшчэння гарнізоннага батальёна (у 1870 г. будынак згарэў і больш не аднаўляўся). Паводле праекта В.Стасава была рэканструявана тэрыторыя за аркай, знесены старыя дамы і пасаджаны сквер.

Духоўная семінарыя з'яўлялася адной са старэйшых устаноў Беларусі, створана паводле загаду архіепіскапа Георгія Каніскага ў канцы 18 — сярэдзіне 19 ст. Архітэктурны



Магілёўскі Іосіфаўскі сабор. Бакавы фасад (чарцёж).

комплекс яе ўваходзіў у ансамбль Спаскага манастыра. Пры манастыры былі ўзведзены будынкі вучэбнага корпуса і інтэрната (не захаваліся). У 1780—85 гг. пабудаваны новы вучэбны корпус паводле праекта архітэктара М.Львова (таксама не захаваўся). Гэта быў 2-павярховы мураваны дом з параднай лесвіцай і вестыбюлем, за ім размяшчалася круглае ў плане памяшканне (на 1-м паверсе бібліятэка, на 2-м — зала для сходаў), у бакавых частках — класныя памяшканні. Вырашаны ў стылі класіцызму, галоўны фасад будынка вылучаў 2-калонны (з 2 бакавымі пілястрамі) дарычны порцік, завершаны трохвугольным франтонам з трыгліфным фрызам. У 1795 г. побач з вучэбным корпусам пастаўлены 2-павярховы мураваны корпус для настаўнікаў і казённых выхаванцеляў. З 1797 г. будаўніцтва семінарыі працягваў архіепіскап Анастасій Братаноўскі, які набыў зямельны ўчастак па вул. Ветранай з 2 драўлянымі 1-павярховымі дамамі для выхаванцеляў і 1-павярховы мураваны для рэктара і прэфекта. Да канца 1820-х гадоў будынкі семінарыі аб'яднаны ў



Будынак Магілёўскай духоўнай семінарыі. Галоўны фасад (чарцёж 18 ст.).

адзіны комплекс з галоўным уваходам з боку вул. Ветранай. Паводле генплана 1853 г. была праведзена рэканструкцыя ансамбля — ён меў замкнёную кампазіцыю з невялікай плошчай у цэнтры. Галоўны ўваход вылучаўся ўязной брамай, якая знаходзілася на вул. Ветранай на адной восі з архірэйскім палацам. Гэта брама захавалася да нашага часу і з'яўляецца помнікам архітэктуры малых форм: агароджа (мураваныя слупы з ажурнай металічнай рашоткай паміж імі) пастаўлена па паўкруглай лініі. У цэнтры — невялікая брама з 2-калонных порцікаў пад 2-схільнымі дахамі. Пра будынкі былой семінарыі нагадваюць 2 мураваныя 2-павярховыя дамы па вул. Ветранай (цяпер вул. Ленінская, 15, 17). Яны пабудаваны ў 1850-я гады і належалі купцу Кітаеву, потым аддадзены семінарыі і прыстасаваны для настаўнікаў і выхаванцаў.

Будынак па вуліцы Ленінскай, 15 — тып багатага жылога дома. У плане ён Г-падобнай формы з унутранай лесвіцай у цэнтры. З боку двара на 2-і паверх вядзе адкрытая драўляная галерэя, дзе размяшчалася кватэра аканома. Знешні архітэктурны дэкор вельмі сціплы, выкананы ў стылі класіцызму: строгі рытм прамавугольных аконных праёмаў, карнізныя паяскі з сухарыкамі, плоскія нішы на тарцах. Планіроўка анфіладная, часткова зменена. У такіх жа простых формах вырашаны другі 2-павярховы ў плане прамавугольнай формы будынак духоўнай семінарыі па вул. Ленінскай, 17.

Станіславаўскі касцёл на вул. Камсамольскай, 4, былы касцёл кармелітаў, зроблены з цэглы ў 1738—52 гг. як касцёл Ушэсця (да 1783 г.), добра захаваўся да нашага часу. Помнік архітэктуры, які спалучае рысы барока і класіцызму. Спачатку касцёл быў 2-вежавы з фігурным барочным франтонам. З 1788 г. па ініцыятыве архіепіскапа Станіслава Богуша-Сестранцэвіча праведзена рэканструкцыя галоўнага фасада касцёла, да якога прыбудаваны дарычны порцік (разабраны вежы і частка франтона паміж імі). Цяпер помнік — 3-нефавая 6-стоўпная базіліка. Цэнтральны неф заканчваецца паўцыліндрычнай апсідай. Галоўны фасад вылучае 4-калонны дарычны порцік з шырокім фрызам і трохвугольным франтонам, што характэрна для архітэктуры класіцызму. Справа і злева ад порціка 3-яруснья бакавыя памяшканні (пазнейшая прыбудова, дзе размяшчаліся семінарыя і друкарня), завершаныя вежачкамі-ратондамі. Складанапрафіляваныя карнізы, шматслойныя пілястры, абрамленні акон бакавых фасадаў — элементы першапачатковага дэкору, які вырашаны ў стылі барока. Пасля 1860 г храм стаў прыходскім Успенскім касцёлам.

У інтэр'еры касцёла захаваўся адзін з найбольш поўных і найбольш прафесійных фрэскавых евангельскіх цыклаў на Беларусі. Фрэскавыя размалёўкі выканалі ў 1765—67 гг і 1780-я гады мясцовы мастак А.Главацкі, а таксама вучні-манахі Спаскай царквы Пётр, Лук'ян, Рыгор пад кіраўніцтвам мастака П.Піятроўскага. У 1860-я гады фрэскі падновіў мастак Фёрст. На цыліндрычных скляпеннях галоўнага нефа тры фрэскі на евангельскія сюжэты: «Праабражэнне», «Уручэнне ключоў Пятру», «Ушэсце Марыі». У кампазіцыю ўведзены выявы евангелістаў з сімваламі святых Іераніма, Аўгусціна, Клімента, алегарычных фігур Веры, Надзеі, Любові. Па перыметры сцен паміж пілястрамі сюжэтныя кампазіцыі: «Уваскрэсенне Лазара», «Святая Тэрэза», «Хрышчэнне» (паўночная сцяна). На паўднёвай сцяне кампазіцыі з гісторыі кармеліцкага ордэна: «Паданне



Від на Станіславаўскі касцёл і палац архіепіскапа. З акварэлі канца 18 ст.

граматы каралём Сігізмундам манахам-кармелітам», на другім плане адлюстравана архітэктурная панарама Магілёва. Скляпенні бакавых нефаў таксама ўпрыгожаны фрэскавым жывапісам: на паўночным — «Спас нерукатворны», «Святы Себасц'ян», «Страшны суд», на паўднёвым — «Падарожжа», «Вылячэнне Іосіфа», «Аўтапартрэт». У прытворы на скляпеннях дзве кампазіцыі: «Каін, які забівае Авеля» і «Ахвяра Аўраама». Размалёўкі Станіславаўскага касцёла неаднаразова паднаўляліся, што надало разнастайнасць іх стылю, з'яўляюцца выдатным помнікам беларускага манументальнага жывапісу. З 1986 г. касцёл і фрэскавы жывапіс яго інтэр'ера знаходзяцца на рэстаўрацыі.

Архіепіскапскі палац (вул. Ленінская, 25; захаваўся). Мураваны палац, пабудаваны ў 1780-я гады ў стылі класіцызму, рэзідэнцыя каталіцкага архіепіскапа Станіслава Богушa-Сестранцэвіча. Першапачатковы праект складаўся з трох асобных 2-павярховых карпусоў: цэнтральнага (жылога) і двух бакавых (службовы, гаспадарчы), якія аб'ядноўвала аркада, ствараючы парадны двор. Аднак быў пабудаваны толькі цэнтральны корпус, прамавугольны ў плане, з двума бакавымі рызалітамі на дваровым фасадзе, накрыты вальмавым дахам. Галоўны фасад арыентаваны ў бок Дняпра і вылучаны трыма несапраўднымі рызалітамі: цэнтральны завершаны атыкам, бакавыя — трохвугольнымі франтонамі. На 1-м паверсе былі службовыя памяшканні, на 2-м — пакоі архіепіскапа, у заходнім крыле — дамавая капліца вышынёй у 2 паверхі. За палацам знаходзіўся сад і будынкі духоўнай кансісторыі (не захаваліся).

Аляксандраўскі палац (не збярогся, вядомы таксама як дом Пасекавай). Размяшчаўся за Іосіфаўскім саборам, на вул. Шклоўскай. Пабудаваны ў 1780 г. ў стылі класіцызму як рэзідэнцыя імператрыцы Кацярыны II, якая наведала Магілёў для сустрэчы тут з аўстрыйскім імператарам Іосіфам II. Драўляны 1-павярховы будынак сядзібнага тыпу меў развіты план. У яго архітэктуры выкарыстаны дэталі класіцызму, якія характэрны мураваным будынкам: рызаліты (цэнтральны і два бакавыя, цэнтральны завершаны трохвугольным франтонам), пілястры дарычнага ордэра, вокны з ліштвамі і сандрыкамі, прафіляваны карніз з трыгліфным фрызам. У 1808 г. будынак прыйшоў у заняпад, у 1815 г. складзены праект яго рэканструкцыі, існаваў да сярэдзіны 19 ст. (адзначаны на плане 1842 г.).



Архіепіскапскі палац. Галоўны фасад (чарцёж).

Адначасова з перапланіроўкай і пабудовай новых адміністрацыйных і культавых будынкаў у цэнтральнай частцы горада ўпарадкоўвалася жылая забудова. Да нашага часу добра захаваліся некалькі мураваных жылых дамоў на вул. Ленінскай, якія пабудаваны пераважна ў канцы 18 ст.

Жылы дом на вул. Ленінскай, 7. Гэта мураваны 2-павярховы будынак, узведзены ў 1790 г. Пастаўлены на рагу квартала, у плане Г-падобнай формы са скошанай вуглавой сцяной, галоўным фасадам арыентаваны на вул. Ленінскую. Усе жылыя памяшканні разнастайныя па форме, з анфіладным размяшчэннем, выходзяць да ўнутранай лесвіцы ў вуглавой частцы. У архітэктуры жылога дома выкарыстаны формы і прыёмы класіцызму, што характэрны для будаўніцтва Магілёва: шырокі прафіляваны пояс падзяляе паверхі,сцены іх рытмічна прарэзаны шырокімі прамавугольнымі аконнымі праёмамі, дэкарыраваны ліштвамі з замковым каменнем на 2-м паверсе. Цэнтральная частка галоўнага фасада вылучана трохвугольным франтонам з трыгліфным фрызам і невысокай мансардай. На галоўным фасадзе асіметрычна размешчана паўцыркульная арка, праз якую ажыццяўляецца праезд ва ўнутраны двор.



Аляксандраўскі палац. Галоўны фасад. Чарцёж.

Сядзіба «Піпенберг» Існавала на ўскраіне Магілёва ў канцы 18—19 ст., да нашага часу не збераглася. Першапачаткова належала генерал-губернатару Пасеку, потым яе купіў Янчын і падараваў галоўнай штаб-кватэры рускай арміі. У канцы 19 ст. ў ёй знаходзіўся жаночы пансіянат. Сядзібны ансамбль размяшчаўся на правым беразе Дняпра на 2 тэрасах. На верхняй тэрасе быў прамавугольны штучны вадаём, стаяў мураваны 3-павярховы прамавугольны ў плане сядзібны дом, вырашаны ў стылі класіцызму з элементамі несапраўднай готыкі. На ніжняй тэрасе быў сад з архітэктурай малых форм — альтанкамі, капліцай, статуямі і інш. Да нашага часу захаваліся рэшткі падмуркаў і частка парку.



Сядзіба «Піпенберг». Галоўны фасад сядзібнага дома. Чарцёж.

Помнікі архітэктуры канца 19 — пачатку 20 стагоддзя

Архітэктурныя помнікі Магілёва гэтага перыяду яскрава адлюстроўваюць новыя гістарычныя кірункі, якія развіваліся ў беларускай архітэктуры пасля заняпаду стылю класіцызму. Назіраецца спалучэнне, імітацыя, паўтарэнне ранейшых стыляў, што і вызначала назву перыяду — эклектызм, або гістарызм. У гэты перыяд развіваюцца такія мастацкія кірункі, як неаготыка, неабарока, неакласіцызм, неарускі стыль, якія ў новых умовах імітавалі той ці іншы стыль ранейшага часу. У канцы 19 ст. сфарміраваўся новы мастацкі стыль — мадэрн, ён вылучаўся новым функцыянальным і арыгінальным мастацкім вырашэннем архітэктурнага будаўніцтва. Часам у архітэктуры аднаго будынка спалучалася некалькі кірункаў, што было характэрна для перыяду эклектызму. Архітэктура горада канца 19 — пачатку 20 ст. характарызавалася буйным росквітам будаўніцтва, з'яўленнем будынкаў новага тыпу: чыгуначны вакзал, гарадскі тэатр, гімназія, рэальнае вучылішча і інш. Культавых будынкаў узводзілася значна менш. Большасць помнікаў таго перыяду захавалася да нашых дзён.

Мужчынская гімназія (вул. Ленінская, 41, цяпер гімназія № 3). Яшчэ ў 1789 г. ў горадзе было адкрыта народнае 4-класнае вучылішча, адна з першых на Беларусі навучальных устаноў. У 1809 г. пераўтворана ў мужчынскую гімназію. Мураваны 2-павярховы Г-падобны ў плане будынак быў узведзены ў пачатку 19 ст., захаваў рысы класіцызму. Яго галоўны фасад вылучаны трыма несапраўднымі рызалітамі: цэнтральным з галоўным уваходам і двума бакавымі. Гладкія сцены рытмічна прарэзаны прамавугольнымі аконнымі ліштвамі. Унутраная планіроўка калідорнага тыпу.

Жаночая гімназія (вул. Першамайская, 24, цяпер сярэдняя школа № 1). Помнік архітэктуры позняга класіцызму. Мураваны 3-павярховы будынак узведзены ў 1875 г. Вырашаны ў простых архітэктурных формах, мае Г-падобную планіроўку са скошанай вуглавой плоскасцю сцяны. Сцены рытмічна прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі з простымі ліштвамі. Паверхі падзяляюць прафіляваныя карнізныя паяскі. Сцяна 1-га паверха дэкарыравана рустам. Будынак завершаны шырокім тонкапрафіляваным карнізам.

Аляксандраўскае рэальнае вучылішча (цяпер у ім размяшчаецца Магілёўскае педвучылішча імя Ушынскага). Пабудавана ў 1884—85 гг. паводле праекта губернскага інжынера У.С.Міляноўскага. 2-павярховы дом з паўпадвальным паверхам быў пабудаваны з цэглы і неатынкаваны, знаходзіцца на рагу сучасных вуліц Піянерскай і Камсамольскай, галоўным фасадам арыентаваны ў бок Дняпра. У плане будынак складанай формы, паўтарае вуглавую форму ўчастка і мае калідорную сістэму планіроўкі (у 1967 г. надбудаваны 3-і паверх і будынак атынкаваны). Галоўны фасад у цэнтры вылучаны несапраўдным рызалітам з фланкіраванымі 2 пілястрамі па баках, якія завершаны над карнізам невысокімі шпілямі і атыкавай сценкай над усімі рызалітамі. Сцены рытмічна прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі з простымі ліштвамі, будынак завершаны карнізам з сухарыкамі.

Жаночае епархіяльнае вучылішча (вул. Вароўскага, 29, дзе цяпер размешчана школа-інтэрнат). Помнік архітэктуры, у якім праявіліся рысы эклектызму. 3-павярховы мураваны будынак узведзены ў 1889—92 гг. паводле праекта грамадзянскіх інжынераў П.Р.Камбурава і М.М.Маркава. На высокім цокальным паверсе будынак мае ў плане Е-падобную форму: да цэнтральнага корпуса далучаюцца 2 больш кароткія бакавыя крылы, якія ўтвараюць унутраны дворык. У цэнтры дворыка па восі галоўнага ўвахода царква, якая злучана з будынкам крытым пераходам. Цэнтральны корпус калідорнай сістэмы планіроўкі: паабапал калідора былі класныя памяшканні. Бакавыя крылы змешанай планіроўкі, маюць самастойныя ўваходы, тут размяшчаліся жылыя памяшканні вучаніц. Галоўны фасад (цэнтральны корпус) насычаны разнастайнымі дэкаратыўнымі дэталямі, якія маюць рысы позняга класіцызму і эклектыкі. Вылучаны несапраўдным рызалітам і атыкам з трохвугольным завяршэннем, а таксама невялікім лучковым акном. Па баках атык дэкарыраваны руставанымі лапаткамі. Сцяна 1-га паверха пакрыта рустам, мае простыя прамавугольныя вокны, у цэнтры галоўны партал з лучковым франтонам. 1-ы паверх аддзелены ад двух іншых шырокім прафіляваным поясам. Вокны 2-га паверха больш высокія з паўцыркульным завяршэн-



Будынак былога жаночага епархіяльнага вучылішча. Цяпер школа-інтэрнат.



Будынак жаночага епархіяльнага вучылішча. Дваровы фасад.

нем, упрыгожаны лучковымі сандрыкамі з замковымі камянямі, руставанымі ліштвамі. Вокны 3-га паверха невысокія прамавугольныя з простымі ліштвамі і замковымі камянямі. Будынак завершаны тонкапрафіляваным карнізам з сухарыкамі і мае манументальны парадны выгляд.

Настаўніцкі інстытут (на вул. Ленінскай). Помнік архітэктуры эклектыкі і неарускага стылю. Пабудаваны ў 1853 г., тут размяшчалася жаночая гімназія, з 1913 г. — настаўніцкі інстытут, з 1919 г. — Інстытут народнай адукацыі, з 1930 г. — педінстытут. Цяпер гэта адзін з карпусоў Магілёўскага педагагічнага інстытута імя А.А.Куляшова. Будынак быў пашкоджаны ў гады Айчыннай *вайны*, адноўлены ў 1953 г., у выніку чаго зменены часткова ўнутраная планіроўка калідорнага тыпу і дэкор галоўнага фасада. Цяпер гэта мураваны 3-павярховы Г-падобны ў плане будынак. Галоўны фасад выцягнутай формы, арыентаваны на вул. Малая Садовая (былая Ветраная) і падзелены 3 неглыбокімі рызалітамі, у кожным — парадны ўваход. Рызаліты завершаны невысокімі атыкамі з паўцыркульнымі франтонамі (першапачаткова былі невысокія вежы над бакавымі і шатровае завяршэнне над цэнтральным рызалітамі). Прафіляваныя карнізныя паяскі падзяляюць галоўны фасад на тры ярусы, якія адпавядаюць тром паверхам: 1-ы трактуецца як цокаль, сцены аздоблены руставанымі пілястрамі. Рытм 2-га яруса ствараюць размешчаныя папарна арачныя аконныя праёмы, яны падзелены пілястрамі з геаметрычным скульптурным арнаментам архівольтаў паўцыркульных арак, падаконных уставак, міжаконных пілястраў і інш. 3-і ярус з прамавугольнымі аконнымі праёмамі кантрастна вылучаецца больш дробным маштабам архітэктурных дэталей. Планіроўка калідорная з 2-баковым размяшчэннем памяшканняў.

Гарадскі тэатр. Адзін з самых значных архітэктурных і інжынерных збудаванняў Магілёва канца 19 — пачатку 20 ст. Магілёўскі гарадскі тэатр — помнік архітэктуры, у якім спалучаны рысы эклектыкі і неарускага стылю. Праект тэатра распрацаваны епархіяльным архітэктарам П.Р.Камбуравым, будаўніцтва ажыццяўляў губернскі інжынер



Тэатральная плошча. Фота пачатку 20 ст.

У.С.Мільяноўскі. Мураваны будынак гарадскога тэатра пачалі будаваць у 1886 г., калі па ўсёй губерні былі сабраны неабходныя сродкі. Будаўніцтва яго скончана ў 1888 г., у 1889 г. адкрыты першы тэатральны сезон пастаяннай драматычнай трупы Дзергача. Месцам для тэатра выбраны цэнтр горада на скрыжаванні Дняпроўскага праспекта і вул. Дваранскай (цяпер Цэнтральная плошча). Але ў тэхнічных адносінах яно аказалася не зусім удалым: калісьці тут праходзіў старажытны абарончы вал і роў (скапаны ў 1809 г.). Таму патрабавалася закласці фундамент на вялікую глыбіню (да 15 аршын), што выклікала перарасход сродкаў, якія былі вылучаны на ўсё будаўніцтва. Неабходнае тэхнічнае абсталяванне тэатра (жалезны занавес, сістэма пажарных лесвіц, водаправодных труб і інш.) не было ажыццёўлена. Будынак у плане прамавугольнай формы, з правага боку да яго далучаны некалькі службовых памяшканняў. У цэнтры будынка размешчана глядзельная зала на 500 месцаў, па баках — службовыя памяшканні акцёраў, за залай — тэхнічная частка. Пабудаваны з мясцовай чырвонай цэглы, у белы колер пафарбаваны толькі асобныя дэкаратыўныя дэталі, якія кантрастна вылучаліся на цагляных сценах. Галоўны ўваход з шырокай 3-схільнай лесвіцай вылучаны тамбурам з трыма лучковымі арачнымі праёмамі на чатырох масіўных лупах. Зверху тамбура зроблены шырокі балкон з металічнай агароджай паміж цагляными слупамі. На балкон выходзяць тры высокія арачныя аконныя праёмы з дзвярамі, што акаймаваны лучковымі сандрыкамі. Паабапал тамбура ўзвышаюцца два 4-гранныя 4-яруснyя аб'ёмы (накшталт вежаў) і шатры з ажурнымі металічнымі завяршэннямі. Кожны ярус аддзелены карнізным поясам, мае свой адметны дэкор: плоскія і арачныя нішы, паўцыркульныя праёмы, вуглавыя пілястры. Асобныя дэкаратыўныя дэталі, што ўпрыгожваюць фасады будынка, характэрны для старажытнарускага дойлідства: какошнікі, закамары, нішы з арачнымі і зубчастымі завяршэннямі, дэкаратыўны арнамент парэбрык у карнізах і інш.

Вялікую цікаваць выклікае дэкаратыўнае афармленне інтэр'ера тэатра. У афармленні глядзельнай залы, напрыклад, выкарыстаны формы народнай разьбы па дрэве. Асабліва тонкай скразной разьбой вылучаецца цэнтральная ложа, якая раней звалася губернатарскай.

Гарадская управа (цяпер Дом культуры будтрэста № 1 на вул. Ленінскай, 1). Помнік эклектычнай культуры. Будынак узведзены ў 2-й палавіне 19 ст., дапаўняў ансамбль Губернатарскай плошчы. У яго архітэктуры спалучаюцца рысы позняга класіцызму і неарускага стылю, якія ствараюць своеасаблівы сінтэз. Складаецца з двух мураваных прамавугольных у плане карпусоў: невялікага 3-павярховага, галоўны тарцовы фасад якога арыентаваны на Савецкую плошчу, і 2-павярховага, што галоўным падоўжаным фасадам выходзіць на вул. Ленінскую, а тарцом далучаны да першага корпуса.

Фасады 3-паверховага корпуса насычаны дэкаратыўнымі элементамі: 1-ы паверх дэкарыраваны чатырма руставанымі пілонамі, абапал параднага ўвахода — спараныя арачныя вокны; 2-і паверх, дзе размешчаны парадныя памяшканні, вылучаюць высокія спараныя вокны з архівольтамі, паміж якімі падвойныя пілоны. 3-і паверх (дабудаваны пазней) праразаюць невялікія прамавугольныя вокны, паміж імі — шырокія лапаткі. Галоўны фасад 2-павярховага будынка расчлянёны прамавугольнымі і паўцыркульнымі аконнымі праёмамі з сандрыкамі, падзелены міжпаверхавым карнізным паяском. Будынак завершаны прафіляваным карнізам. У ім спалучаюцца анфіладная і калідорная ўнутраная планіроўка.

Дваранскі сход (на скрыжаванні вуліц Першамайскай і Крыленкі). Помнік грамадзянскай архітэктуры, у якім праявіліся рысы новага мастацкага стылю мадэрн. Пабудаваны ў 2-й палавіне 19 ст. (цяпер гарадскі Дом культуры). Спачатку існавалі два асобныя мураваныя будынкі: 3-павярховы і 2-па-



Былая вуліца Дваранская (цяпер К.Лібкнехта). У першым доме злева размяшчаўся Дваранскі сход.

вярховы, што ў пачатку 20 ст. былі аб'яднаны ў адзіны Г-падобны ў плане будынак, а да 2-павярховага надбудаваны 3-і паверх. Тады ж заменены і дэкор фасада.

Галоўны падоўжаны фасад арыентаваны на вул. Першамайскую, вылучаны двума рызалітамі з уваходамі. Рызаліты завершаны атыкамі з круглымі разеткамі. 1-ы паверх дэкарыраваны глыбокім рустам і расчлянёны прамавугольнымі аконнымі праёмамі. Плоскасць сцен 2-га і 3-га паверхаў аздоблены пілястрамі, паўкалонкамі. Вуглавая частка фасада скошаная. Дэталі дэкору афарбаваны ў белы колер і кантрастна вылучаюцца на цёмным фоне сцен фасада. Асноўная падоўжаная частка будынка мае калідорную сістэму планіроўкі, дзе абапал двухбаковага калідора размешчаны службовыя памяшканні.

Крэдытнае таварыства (на вул. Ленінскай, 36). Помнік грамадзянскай архітэктуры, вырашаны ў стылі мадэрн. Пабудавана ў пачатку 20 ст. Цяпер тут швейная фабрыка імя Валадарскага.

Будынак мураваны, 2-павярховы, Г-падобны ў плане. Вуглавая частка фасада скошаная, у ёй размешчаны галоўны ўваход. Асноўная падоўжаная частка выходзіць на вул. Ленінскую, больш кароткая — на вул. Мігая, дзе знаходзіцца скразны праезд у двор. Фасады рытмічна падзелены аконнымі праёмамі: на 1-м прамавугольнымі, на 2-м паўцыркульнымі, паміж аконнымі праёмамі — пілястры. Галоўны падоўжаны фасад з 2 неглыбокімі рызалітамі завершаны мансардамі. Падобная мансарда завяршае вуглавую частку, дзе на 2-м паверсе размешчаны паўкруглы балкон з балюстрадай, яго падтрымліваюць кансолі ў выглядзе паўфігур атлантаў. У дэкаратыўнай аздобе фасадаў шырока выкарыстаны ляпныя дэталі: гірлянды, картушы, разеткі, гермы, што характэрна для стылю ампір. Будынак мае калідорную сістэму планіроўкі, якая часткова зменена.

Чыгуначны вакзал. Помнік грамадзянскай архітэктуры стылю неакласіцызму. Мураваны будынак створаны ў 1902 г. разам з пракладкай Пецярбургска-Адэскай чыгункі. Размешчаны на вул. Першамайскай (былы Дняпроўскі праспект), фарміруе Прывакзальную плошчу з невялікім зялёным партэрам у цэнтры. У 1950-я гады будынак часткова рэканструяваны, пасля чаго зменена ўнутраная планіроўка і знешні выгляд.

Гэта 1-павярховы прамавугольны ў плане будынак з 2 невялікімі прыбудовамі па тарцах. Галоўны фасад вылучаны 3 рызалітамі: цэнтральным з галоўным уваходам і бакавымі, усе рызаліты завершаны паўцыркульнымі аконнымі праёмамі, паміж якімі руставаныя пілястры з атыкамі. Будынак завершаны прафіляваным карнізам з сухарыкамі. Асноўны архітэктурны акцэнт у прасторавай кампазіцыі стварае 8-гранны светлавы барабан з не-



Будынак чыгуначнага вакзала.

высокай вежай, размешчаны па цэнтры галоўнага фасада. У інтэр'еры вылучаецца двухсветлавы васьмігранны вестыбюль, размешчаны на восі цэнтральнага ўвахода. Да вестыбюля з 2 бакоў далучаюцца службовыя і адміністрацыйныя памяшканні.

Гарадскі банк (на вул. Ленінскай, 50). Помнік грамадзянскай архітэктуры, у якім спалучаюцца рысы эклектыкі і стылю мадэрн. Мураваны будынак створаны ў 1904—06 гг. паводле праекта архітэктара П.Камбурава як аддзяленне Маскоўскага міжнароднага банка. Першапачаткова ў комплекс уваходзілі 2 мураваныя жылыя будынкі і гаспадарчыя пабудовы, якія не захаваліся. Тэрыторыя была абкружана высокай мураванай сцяной (захавалася часткова). Будынак 2-павярховы, асноўная частка прамавугольная ў плане, з кароткім крылом з боку дваровага фасада. Галоўны фасад вылучаны шырокім цэнтральным рызалітам, завершаным высокім атыкам з 2 бакавымі тумбамі. Паверхі падзелены прафіляваным карнізным паяском, 1-ы паверх дэкарыраваны гарызантальным рустам, аконныя праёмы прамавугольныя, на 2-м паверсе вокны з гарызантальнымі сандрыкамі, у рызаліце — паўцыркульныя, паміж імі пілястры з карынфскімі капітэлямі. У цэнтры рызаліта — балкон з металічнай агароджай. Галоўны ўваход размешчаны асіметрычна, у левай частцы фасада. Першапачаткова быў вылучаны магутным парталам з карынфскімі пілястрамі, завершанымі трохвугольным франтонам. Планіроўка паверхаў калідорнага тыпу, абапал калідораў — службовыя памяшканні. На 2-м паверсе ў цэнтры — аперацыйная зала.

Пазямельна-сялянскі банк (размешчаны на вул. Міронава, 33). Помнік грамадзянскай архітэктуры стылю мадэрн. Узведзены ў 1903—14 гг. паводле праекта архітэктара А.В.Друкера. Цяпер у будынку знаходзіцца карцінная галерэя. Будынак 2-павярховы (3-і паверх цокальны). У плане Т-падобнай формы: да асноўнага прамавугольнага аб'ёму з боку дваровага фасада па цэнтры далучаецца невялікае крыло. Галоўны фасад, арыентаваны ў бок вул. Першамайскай, мае асіметрычную кампазіцыю (яе падкрэсліваюць 2 бакавыя рызаліты). Адзін з рызалітаў (левая частка фасада) завершаны атыкам у выглядзе какошніка з ляпной разеткай у цэнтры. Другі (правая частка фасада) вырашаны ў выглядзе невысокай двух'яруснай вежы (васьмярык на чацверыку) з вузкімі праёмамі. Паміж рызалітамі — галоўны ўваход, на 2-м паверсе — балкон, над якім атыкавая сценка дэкарыравана ляпным геаметрычным арнаментам. Аконныя праёмы прамавугольнай формы, на 2-м паверсе з лучковымі завяршэннямі. У дэкаратыўнай аздобе шырока выкарыстаны дэталі неарускага стылю: какошнікі, несапраў-



Будынак Пазямельна-сялянскага банка. Галоўны фасад.

дныя машыкулі, паўкалонкі з капітэлямі, архівольты, разеткі, раслінны арнамент. Унутраная планіроўка каліdорнага тыпу з аднабаковым і двухбаковым размяшчэннем памяшканняў, лесвіцы ў тарцах будынка.

Барысаглебская царква (размешчана ў зав. Брусава, 2). Мураваны будынак узведзены ў 1869 г. побач з існуючай Барысаглебскай царквой (перароблена з жылога дома 17 ст.). У яе архітэктуры спалучаюцца рысы позняга класіцызму і неарускага стылю.

Гэта 4-слуповы, 3-нефавы крыжова-купальны храм з трыма паўцыркульнымі апсідамі. У плане блізкі да квадрата, які ў інтэр'еры 4 крыжовымі калонамі, што падтрымліваюць барабан купала, падзелены на 3 нефы. 2 невялікія прамавугольныя калонкі пры ўваходзе падтрымліваюць хоры. У аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі дамінуе высокі светлавы цыліндрычны барабан, завершаны сферычным купалам. Па вуглах абапал барабана пастаўлены 4 невысокія галоўкі, якія імітуюць рускае пяцікупалле. Фасады багата аздоблены. На галоўным фасадзе вылучаецца цэнтральны партал з шырокай лесвіцай і трыма франтонамі: кілепадобным у цэнтры і трохвугольнымі па баках. На бакавых фасадах франтоны вырашаны ў выглядзе какошнікаў і накшталт закамар. У дэкаратыўным аздабленні фасадаў шырока выкарыстаны руставаныя пілястры, лучковыя і кілепадобныя сандрыкі, шырокія карнізныя паясы з сухарыкамі, прамавугольныя нішы.

Т.І.Чарняўская.

З гісторыі прамысловасці Магілёва

У 19 — пачатку 20 ст. ў Магілёве працавала шмат прамысловых прадпрыемстваў і мануфактур. У кнізе М.Ф.Болбаса «Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі» (Мн., 1988. С. 97—101) буйнейшымі з іх названы наступныя.

Магілёўскае дэпо з чыгуначнымі майстэрнямі. Дзейнічала ў 1906—18 гг. на чыг. ст. Магілёў Рыга-Арлоўскай чыгункі. Абслугоўвала і рамантавала паравозы і вагоны. Працавала 170 рабочых. У 1913 г. выканана работ на 156 тыс. руб.

Магілёўская алейная і лесапільная фабрыка. Дзейнічала ў 1900—14 гг. у Магілёве. Мела паравы рухавік: у 1905 г. — 50 к.с., у 1908 г. — 140 к. с. У 1900—10 гг. вырабляла льняны і канапляны алей, макуху, рабіла распілоўку драўніны, малола муку; у 1913 г. вырабляла льняны алей, макуху і пакост. У 1910 г. працавала 54 рабочыя, выраблена прадукцыі на 280 тыс. руб. У 1914 г. ф-ка пастаўляла для арміі алей і пакост.



Від на Падніколле ніжэй Дняпроўскага пад'ёму ў цэнтры горада. 1908 г.

Магілёўская панчошная фабрыка. Дзейнічала ў 1915 г. ў Магілёве. Была эвакуіравана з Варшавы. Працавалі 232 рабочыя, выпускалі шкарпэткі для ваеннага ведамства.

Магілёўская пенькатрапальная мануфактура Дзейнічала ў 1847—87 гг. у Магілёве. У 1881 г. было 199 рабочых, выпушчана 6 тыс. пудоў пянькі на 12 тыс. руб.

Магілёўская пенькатрапальная мануфактура. Дзейнічала ў 1876—81 гг. у Магілёве. Уладальнік — мешчанін Найштон. У 1881 г. працавала 50 рабочых, выпушчана 3 тыс. пудоў пянькі на 6 тыс. руб.

Магілёўская пенькатрапальная мануфактура Дзейнічала ў 1899—1905 гг. у прадмесці Магілёва Студзяніцы. Уладальнік — купец. У 1899 г. працавала 100 чал., выпушчана прадукцыі на 20 тыс. руб.

Магілёўская суконная мануфактура Дзейнічала ў 1808—11 гг. у Магілёве. У 1809 г. мела 5 станкоў, працавала каля 70 чал., выпушчана каля 17 тыс. аршынаў сукна.

Магілёўская тытунёвая мануфактура. Дзейнічала ў 1863—96 гг. у Магілёве. Уладальнік — фірма «Сімкін і К°». Перапрацоўвала тытунёвы ліст, які прывозілі з Бесарабіі, Крыма, Каўказа, Саратаўскай губ. Мела чыгунныя станкі і інш. абсталяванне, у 1879 г. кошт іх складаў 163 тыс. руб. За год вырабляла тытуню 1-га гатунку 3,5 тыс. фунтаў на 9 тыс. руб., 2—3-га гатункаў 212,4 тыс. фунтаў на 125,5 тыс. руб., папярос 2884 тыс. штук на 17,4 тыс. руб., цыгар 641 тыс. штук на 19,2 тыс. руб., усяго на 171 тыс. руб. У 1880 г. абарот капіталу — 200 тыс. руб., а мануфактура — адно з буйнейшых тытунёвых прадпрыемстваў Паўночна-Заходняга краю. У 1885 г. працавала 70 чал., у т.л. 59 мужчын, 11 жанчын. Рабочы дзень складаў 9—11 гадз., працавалі ў антысанітарных умовах. Заработная плата: крышыльшчыка (здзельна) — 12—20 руб., папяросніка — 12—15 руб., цыгарэтчыка (здзельна) — 30 руб., на вырабе табакі — 15 руб., упакоўшчыка — 6—14 руб. (мужчыны), 3—5 руб. (жанчыны) у месяц.

Магілёўская тытунёвая мануфактура Дзейнічала ў 1879—82 гг. у Магілёве Уладальнікі — купцы Магідсон і К°. У 1879 г. працавалі 88 чал., выпушчана 890 тыс. штук цыгар, 720 пудоў тытуню, 2370 тыс. штук папярос, усяго на 50 тыс. руб. У 1882 г. працавалі 74 рабочыя, выпушчана прадукцыі на 45 тыс. руб.

Магілёўская тытунёвая мануфактура «Дружына» Дзейнічала ў 1892—1914 гг. у Магілёве. Уладальнік — купец Бернштэйн. У 1900 г. працавалі 54 чал., выпушчана 200 пудоў курыльнага тытуню, 82,6 соцень штук папярос, усяго на 22,6 тыс. руб. У 1913 г. працавала 60 рабочых, выпушчана прадукцыі на 25 тыс. руб. У 1914 г. пастаўляла махорку для арміі.

Магілёўская тытунёвая фабрыка Дзейнічала ў 1870—90 гг. у Магілёве. Мела паравы і вадзяны рухавікі У 1890 г. працавалі 52 рабочыя, выпушчана 5500 пудоў махоркі, 1335 пудоў курыльнага тытуню, 27 тыс. штук цыгар, 2463 тыс. штук папярос, усяго на 40 тыс. руб.

Магілёўская цагельная мануфактура. Дзейнічала ў 1840—60 гг. у Магілёве. У 1854 г. мела 30 станкоў, 4 печы, дом для рабочых, 5 драўляных павецяў. У 1840 г. працавала 60, у 1854 г. — 57 рабочых, выраблена 1500 тыс. штук цэглы на 7,5 тыс. руб.

Магілёўская электрастанцыя. Дзейнічала ў 1909—25 гг. у Магілёве. У 1910 г. яе магутнасць была 90 кВт. У 1911 г. ўстаноўлена дынамамашына магутнасцю 120 кВт. У 1913 г. працавала 20 чал.; мела 2 дызель-маторы фірмы «Нобель» (55 і 50 к.с.) і 2 па 200 к.с., 2 дынамамашыны (37 і 53 кВт); магутнасць генератараў станцыі складала 330 кВт; была акумулятарная батарэя з 252 элементамі; выраблена электраэнергіі 322 тыс. кВт/гадз на 87 тыс. руб., кошт маёмасці складаў 273 тыс. руб., абсталявання — 206 тыс. руб. У часы пік станцыя магла развіваць магутнасць да 430 кВт. У 1913 г. абанентам адпушчана 261,6 тыс. кВт/гадз электраэнергіі; расход на ўтрыманне электрастанцыі складаў 28 тыс. руб., чысты прыбытак — 39,2 тыс. руб

Магілёўскі піваварны завод. Дзейнічаў у 1862—1914 гг. у Магілёве. Уладальнік — купец Лекерт. У 1879 г. размяшчаўся ў мураваным будынку з найноўшымі на той час машынамі і абсталяваннем, меў мураваны склеп. З 1880 г. быў тэлефанізаваны. У 1890 г. меў 2 паравыя машыны (72 к.с.), у 1895 г. паравы кацёл; зрасходавана 20 тыс. пудоў ячменю, на паліва затрачана 6 тыс. руб. У 1913 г. працавала 50 рабочых, выпушчана піва на 170 тыс. руб. У 1895 г. рабочы дзень складаў 8 гадз. У 1900 г. выпушчана 103 тыс. вёдзер піва. У пач. 20 ст. з-д быў у ліку буйнейшых на Беларусі.

Магілёўскі піваварны завод. Дзейнічаў у 1870—1914 гг. у Магілёве. Уладальніца —

купчыха Янік (1910—13). У 1908 г. меў паравы рухавік (20 к.с.), у 1910—13 гг. — 3 паравыя рухавікі (35 к.с.). У 1908 г. працаваў 51 рабочы, выпушчана піва на 113,1 тыс. руб., у 1910 г. — 45 рабочых, адпаведна 161 тыс. вёдзер піва на 170 тыс. руб., у 1913 — 50 рабочых, выпушчана піва на 170 тыс. руб.

Магілёўскі спіртаачышчальны склад-завод. Дзейнічаў у 1897—1908 гг. у Магілёве. У 1905 г. выпушчана 143,6 тыс. вёдзер гарэлкі на 1151,7 тыс. руб. У 1908 г. працавала 56 рабочых, меў паравую машыну (7 к.с.), выраблена прадукцыі на 609,1 тыс. руб.

Магілёўскі чыгуналіцейны завод. Заснаваны ў 1915 г. ў Магілёве. Створаны на базе металаапрацоўчых рамесных майстэрняў. У 1915—16 гг. вырабляў для арміі 3 тыпы гранат, снарады (9 см), браніраваныя ўтулкі, запасныя часткі для стралковай зброі. Працавала больш за 100 чал. З 1947 г. дзейнічае як Магілёўскі з-д «Строммашына» імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка.

Магілёў не абмінуў уздым рабочага класа

Першыя выступленні рабочых Магілёва вядомы з 1890-х гадоў. У верасні 1898 г. адбылася забастоўка (110 рабочых 9 гарбарных заводаў). Да часу забастоўкі сярод гарбароў дзейнічала буйная падпольная прафесійная арганізацыя са стачачнай касай (налічвала каля 500 руб. рабочых узносаў). Удзельнікі забастоўкі выступілі супраць звальнення сваіх таварышаў, а таксама патрабавалі дадатковую плату за звышурочную работу. Забастоўкай зацікавілася паліцыя, але арганізатараў яе не выявіла. Падпольная прафесійная арганізацыя гарбароў у Магілёве працягвала функцыянаваць. На мяжы 19—20 ст. яна ўваходзіла ў цэнтралізаваны прафесійны сацыял-дэмакратычны саюз гарбароў Заходняга краю, які знаходзіўся пад уплывам Бунда. У 2-й палавіне 1890-х гадоў з'явіліся гурткі сацыял-дэмакратычнага кірунку. З іх у 1898 г. ўтварылася сацыял-дэмакратычная група, якая вяла прапаганду марксізму, а ў канцы 1899 г. — сацыял-дэмакратычная арганізацыя з 80 чалавек.

У 1897 г. ў Магілёве 43 199 жыхароў (з іх 47,7% пісьменныя). Паводле перапісу 1905 г., у горадзе было 46 600 жыхароў, сярод іх 19 000 праваслаўных, 2800 католікаў, 24 000 іудзеяў, 200 пратэстантаў і 200 мусульман. Дзейнічалі 29 цэркваў, 3 касцёлы, 2 сінагогі, 36 яўрэйскіх малітоўных дамоў, 4 бібліятэкі, 354 мураваныя, 3864 драўляныя дамы, 412 мураваных, 790 драўляных крам. У горадзе працавала 220 заводаў, фабрык, рамесных майстэрняў, усяго 790 рабочых. Гандлявалі пераважна скурамі, салам, мёдам, воскам, збожжам на хлеб, канаплямі, паташам і інш. Даход ад яго складаў 127 600 рублёў. З навучальных устаноў у Магілёве былі 2 гімназіі, рэальнае вучылішча, семінарыя, 4 прыходскія вучылішчы, 7 царкоўнапрыходскіх і 2 прыватныя школы.

Эканамічны крызіс і дэпрэсія ў пачатку 1900-х гадоў прывялі да скарачэння вытворчасці, закрыцця дробных прадпрыемстваў. З 1901 г. да 1912 г. колькасць прадпрыемстваў скарацілася на 44, значна павялічылася канцэнтрацыя вытворчасці. У 1912 г. 170 прадпрыемстваў (712 рабочых) далі прамысловай прадукцыі на 1115 тысяч рублёў. У пачатку 20 ст. ў горадзе пушчана лінія конкі. У 1902 г. праз Магілёў пракладзена Пецярбургска-Адэская чыгунка. У 1913 г. ў Магілёве 69,7 тыс. жыхароў. Эканамічны крызіс абвастрыў класавыя супярэчнасці. У 1901 г. ў горадзе адбылася забастоўка рабочых маслабойнага завода, у 1903 г. — краўцоў. У 1901—04 гг. святкаванне 1 Мая адзначана палітычнымі стачкамі. Напярэдадні першамайскіх дзён 1904 г. былі арганізаваны 4 канспіратыўныя сходы (440 рабочых), якія прысвячаліся Дню міжнароднай пралетарскай салідарнасці, 1 Мая ў Магілёве баставала каля 600 чалавек.

Пасля II з'езда РСДРП (1903) узнікла група РСДРП у Лупалаве (задняпроўская частка Магілёва), якая да вясны 1904 г. аформілася як агульнагарадская арганізацыя і далучылася да Палескага камітэта РСДРП. Пад яе кіраўніцтвам, а таксама Магілёўскага сацыял-дэмакратычнага камітэта Бунда, 2(15).10.1904 г. ў знак пратэсту супраць суда над палітычнымі ссыльнымі ў Якуцку, расстрэлу рабочага мітынгу ў Беластоку (12.9.1904) руска-японскай вайны ў Магілёве праведзена дэманстрацыя працоўных. У ёй прынялі ўдзел каля 500 рабочых. Перад пачаткам дэманстрацыі распаўсюджваліся спецыяльна выдадзеныя пракламацыі. Пад чыр-

воным сцягам з воклічамі «Далоў вайну!», «Далоў самадзяржаўе!», «Няхай жывуць якуцкія і беластоцкія таварышы!», з песняй «Варшавянка» ўдзельнікі маніфестацыі прайшлі па Ветранай, Паштовай і Дваранскай вуліцах пад аховай узброенага баявога атрада, знішчылі некалькі паліцэйскіх заслонаў. Паміж паліцыяй, баявым атрадам адбылася перастрэлка. Ноччу вобыскам і арыштам падвергліся 100 чалавек. З-за ўдзелу ў дэманстрацыі яўрэйскіх рабочых паліцыя некалькі разоў спрабавала справакаваць у горадзе яўрэйскія пагромы. Для барацьбы з пагромшчыкамі да 11(24) кастрычніка з ліку рабочых быў сфарміраваны атрад дружыннікаў колькасцю 100 чалавек. На дапамогу яму прыбылі інтэрнацыянальныя атрады ўзброеных рабочых з Мінска, Шклова, Оршы, Копысі. 17(30) кастрычніка некалькі дзесяткаў беларускіх і рускіх рабочых, якія сабраліся каля брамы Брацкага кляштара, арганізавалі антыўрадавую дэманстрацыю і з рэвалюцыйнымі песнямі і заклікамі прайшлі па Шклоўскай вуліцы.

11(24).1.1905 г. пад кіраўніцтвам Магілёўскай арганізацыі РСДРП адбылася забастоўка пратэсту супраць крывавай расправы царызму над рабочымі Пецярбурга. Напярэдадні былі выдадзены 2 адозвы, створаны атрад агітатараў, які раніцай 11 студзеня пачаў абход прадпрыемстваў, тлумачыў змест забастоўкі, заклікаў спыніць работу. Заклік падтрымалі рабочыя друкарняў Фрыдлянда (25 чалавек) і Падземскага (28), тытунёвых фабрык Бернштэйна (39) і Ратнера (32), механічных, слясарных, кравецкіх майстэрняў. Да стачкі далучылася частка фармацэўтаў. Агульная колькасць склала каля 800 чалавек. Забастоўка працягвалася і 13(26) студзеня, але з меншай колькасцю ўдзельнікаў. 15(28) студзеня адбыўся сход, прысвечаны падзеям у Пецярбургу, у ім прынялі ўдзел больш як 200 чалавек, а праз некалькі дзён яшчэ адзін сход (каля 1 тысячы чалавек), на якім прынята рашэнне аб паўторным аб'яўленні ў горадзе 20 студзеня ўсеагульнай 2-дзённай палітычнай стачкі салідарнасці з рабочымі Пецярбурга. У гэтыя дні зноў дзейнічаў атрад агітатараў. Паліцыя затрымала і жорстка збіла 27 чалавек. 22 студзеня (4 лютага) ад імя Магілёўскай арганізацыі РСДРП была выдадзена пракламацыя «Таварышы!», прысвечаная ахвярам пецярбургскага расстрэлу. Дэманстрацыя адбылася 23 студзеня (5 лютага) на Вялікай Садовай вуліцы. У ёй удзельнічалі рабочыя, навучэнцы рэальнага вучылішча, гімназіі і фельчарскай школы. З чырвоным сцягам і рэвалюцыйнымі песнямі яны прайшлі частку вуліцы. Шэсце спыніла паліцыя, адбыліся сутычкі, перастрэлкі. Супраціўленне было ліквідавана (5 дэманстрантаў было паранена, 8 арыштавана).

Падрыхоўка студзеньскіх палітычных выступленняў патрабавала ўзгодненых дзеянняў 2 мясцовых сацыял-дэмакратычных арганізацый — групы РСДРП і камітэта Бунда. Да канца студзеня яны прыйшлі да пагадненння аб узаемадапамозе і стварэнні камісіі для вырашэння агульных палітычных пытанняў. Арганізацыя РСДРП абавязалася працаваць толькі сярод «хрысціянскага» пралетарыяту, а яўрэйскія рабочыя засталіся пад апекай Бунда. Такое пагадненне было рэзка раскрытыкавана на III з'ездзе РСДРП.

Для падрыхтоўкі першамайскіх выступленняў 1905 г. Магілёўская арганізацыя РСДРП і сацыял-дэмакратычны камітэт Бунда стварылі спецыяльную камісію. У пачатку красавіка 1905 г. адбыўся сход з удзелам 400 чалавек, прысвечаны 1 Мая. 17(30) красавіка ў майстэрнях горада распаўсюджваліся пракламацыі ЦК Бунда «1 Мая», лістоўкі з заклікам да ўсеагульнай першамайскай забастоўкі, якая была прызначана на 18 красавіка (1 Мая). Актывізавалася барацьба рабочых за паляпшэнне эканамічнага становішча і ўмоў працы. З патрабаваннямі скарачэння рабочага дня, павелічэння заработнай платы, аплаты забастовачнага часу, устанаўлення кантролю рабочых за наймам і звальненнем і інш. забаставалі рабочыя друкарні Фрыдлянда (гаспадары 2 інш. друкарняў пайшлі на ўступкі). З тымі ж патрабаваннямі выступілі рабочыя піваварных складаў, фарбоўшчыкі, печнікі, цырульнікі, кухаркі, прыказчыкі. Агульнагарадская забастоўка прыказчыкаў працягвалася 2 дні Яны патрабавалі ўвядзення 12-гадзіннага працоўнага дня (з 9 да 21 гадзіны з паўтарагадзінным перапынкам). Аднак губернатар не зацвердзіў гэта рашэнне, і хваляванні прыказчыкаў працягваліся. У знак пратэсту яны разбівалі вітрыны магазінаў і крам, білі гаспадароў, якія не жадалі выконваць іх патрабаванні.

Супярэчнасці паміж групай РСДРП і камітэтам Бунда зрабілі немагчымым правядзенне адзінай першамайскай дэманстрацыі 30 красавіка (12 мая), у выніку чаго адбыліся 2 дэманстрацыі. Аб адной з іх газета «Северо-Западный край» паведамляла, што ў Му-

раўёўскім скверы сабралася вялікая колькасць рабочых і пайшла на Дняпроўскі праспект. Дэманстранты паднялі чырвоны сцяг, чуліся рэвалюцыйныя заклікі, якія суправаджаліся стрэламі з рэвальвераў у паветра — своеасаблівы салют у гонар Дня міжнароднай салідарнасці працоўных. Удзельнікі дэманстрацыі аказалі ўзброенае супраціўленне паліцыі і салдатам, 4 дэманстранты былі паранены. Арганізатарам гэтай дэманстрацыі была Магілёўская група РСДРП. Бундаўцы ж правялі дэманстрацыю на Вялікай Садовай вуліцы, у якой удзельнічала каля 100 чалавек. Яна таксама суправаджалася рэвалюцыйнымі воклікамі і стрэламі ў паветра, 8 удзельнікаў дэманстрацыі арыштавана.

1(14) 5.1905 г. губернатар вымушаны быў заклікаць усіх гандляроў спыніць гандаль у 21 гадзіну. У пачатку мая 1905 г. з эканамічнымі патрабаваннямі выступілі рабочыя лесапільнага завода Млодзіка (13 чалавек), півавараага завода Яніка (20 чалавек), 116 рабочых кафельнага, маслабойнага, лесапільнага заводаў, млыноў Зільбермана і Жысліна, Эцінгера і Лур'е (30 чалавек).

7(20).5.1905 г. па закліку сацыял-дэмакратаў адбылася дэманстрацыя салідарнасці рабочых з палітвязнямі магілёўскай турмы. На тайнай масоўцы з удзелам 650 рабочых у прыгарадным лесе з антыўрадавымі прамовамі выступілі 4 чалавекі. Удзельнікі масоўкі калонай з чырвоным сцягам і рэвалюцыйнымі песнямі вярнуліся ў горад, прайшлі да будынка турмы і віталі палітзняволеных. Выступленне з'явілася нечаканым для ўлад і прайшло без перашкод. У канцы мая пад кіраўніцтвам мясцовых арганізацый РСДРП і Бунда адбылася агульнапрафесійная стачка 100 булачнікаў. Дружны націск рабочых спрыяў поспеху большасці забастовак. Як правіла, яны былі непрацяглыя і заканчваліся поўным або частковым задавальненнем патрабаванняў бастуючых.

25.6(8.7).1905 г. ў прыгарадным лесе арганізавана масоўка з удзелам 2 тысяч чалавек. Многія прамоўцы асвятлялі майска-чэрвеньскія выступленні рабочых Лодзі, Гарадоў Каўказа, расправы царызму з іх удзельнікамі. На сходзе прынята рашэнне аб правядзенні 27.6(10.7).1905 г. ўсеагульнай забастоўкі ў падтрымку пралетарыяту тых гарадоў. У прызначаны дзень атрады рабочых з заклікам да забастоўкі абышлі фабрыкі і заводы, майстэрні, крамы, канторы. Да 11 гадзін раніцы прамыслова-гандлёвая дзейнасць у горадзе прыпынілася, да забастоўкі далучыліся банкаўскія служачыя. Увечары ў горадзе адбыўся мітынг з удзелам 400 чалавек. У ліпені 1905 г. ў Магілёве, як і ў іншых гарадах і мястэчках, абвастрылася барацьба рабочых за права правядзення сходаў. На працягу месяца зафіксаваны 4 маніфестацыі пратэсту супраць разгону такіх сходаў. Ініцыятарамі і кіраўнікамі выступленняў былі сацыял-дэмакраты. 23 ліпеня (5 жніўня) адбылася антыўрадавая дэманстрацыя, у якой удзельнічала некалькі тысяч чалавек. Выступленне было задушана войскамі і паліцыяй. Адзін з удзельнікаў памёр ад пабояў салдацкага патруля, 28 ліпеня (10 жніўня) у пахаванні яго ўдзельнічала вялікая колькасць магіляўчан. У ходзе шэсця былі чутны антыўрадавыя воклічы, адбыліся сутычкі з паліцыяй і салдатамі, што адкрылі стральбу па дэманстрантах, адзін з іх быў забіты, шмат паранена, 30 арыштавана. Магілёўскаму губернатару і гарадской думе ад жыхароў горада паступілі скаргі на самавольства паліцмайстра, яны патрабавалі яго адстаўкі і аддачы пад суд. Гарадской думе прапаноўвалася спыніць выдаткаванне сродкаў на ўтрыманне паліцыі. Губернатар у сваёй заяве ад 18(31) жніўня 1905 г. адхіліў скаргі і прызнаў дзеянні паліцыі правільнымі.

Працоўныя Магілёва ўдзельнічалі ў Кастрычніцкай Усерасійскай палітычнай стачцы, якая праходзіла пад лозунгам звяржэння царскага самаўладства і ўстанаўлення дэмакратычнай рэспублікі. 7(21).10.1905 г. ў горадзе па ініцыятыве Магілёўскай арганізацыі РСДРП і сацыял-дэмакратычнага камітэта Бунда адбыўся паўтараты сячны мітынг. На ім прынята рэзалюцыя, якая вітала далучэнне да рэвалюцыі арміі, флоту і сялянства. 14(27) кастрычніка пачалася забастоўка чыгуначнікаў. Яе падтрымалі навучэнцы старэйшых класаў гімназіі і семінарыі. 18 кастрычніка (1 лістапада) забастоўка ў горадзе стала ўсеагульнай. Каля гарадской турмы на мітынгу сабраліся некалькі тысяч чалавек, якія потым правялі антыўрадавую дэманстрацыю на Вялікай Садовай вуліцы. У час дэманстрацыі адбыліся сутычкі з чарнасоценцамі. Увечары на 4-гадзінным мітынгу ў гарадскім тэатры выступілі прадстаўнікі РСДРП, эсэраў, Бунда, кадэтаў. Мітынг быў разагнаны ротай салдат. 19 кастрычніка (2 лістапада) на вуліцах горада праходзілі мітынгі і маніфестацыі, у цэнтры горада адбылася дэманстрацыя з удзелам 10 тысяч чалавек. Забастоўка скончылася 20 кастрычніка (3 лістапада) у адпа-

веднасці з рашэннем яе арганізатараў. Але і ў гэты дзень працоўныя збіраліся на антыўрадавыя мітынгі і сходы.

7(20).11.1905 г. магілёўская група РСДРП арганізавала мітынг салідарнасці рабочых Магілёва з пралетарыятам Польшчы, у якім удзельнічала 500 чалавек. Па закліку 8—10(21—23) снежня Цэнтральнага бюро Усерасійскага чыгуначнага саюза ў падтрымку Снежаньскага ўзброенага паўстання пралетарыяту Масквы адначасова з забастоўкамі чыгуначнікаў Оршы і Жлобіна была праведзена снежаньская забастоўка чыгуначнікаў Магілёва. У знак салідарнасці з барацьбой чыгуначнікаў былі спынены заняткі вучняў старэйшых класаў Магілёўскага рэальнага вучылішча. Да чыгуначнікаў далучыліся рабочыя іншых прадпрыемстваў.

У маі 1906 г. баставалі цырульнікі, шаўцы, краўцы, якія патрабавалі ўстанаўлення 9-гадзіннага рабочага дня. Летам 1906 г. ў Магілёве адбыўся з'езд сялянскіх камітэтаў, які выказаўся за канфіскацыю ўсіх зямель, у тым ліку памешчыцкіх, і перадачу іх у свабоднае карыстанне сялянам.

У студзені 1907 г. ў Лупалаве пад кіраўніцтвам прафсаюза гарбароў адбылася забастоўка. Патрабаванні былі пераважна эканамічныя, у тым ліку аплата часу забастоўкі. Удзельнічалі рабочыя ўсіх гарбарных заводаў, якіх, паводле афіцыйных звестак, у 1900 г. ў Магілёве было 71. Тут працавалі 224 рабочыя. Забастоўка працягвалася 4 тыдні і скончылася кампрамісам. Гаспадары паабяцалі ўнесці ў касу прафсаюза гарбароў 150 рублёў.

Апрача бундаўцаў і сацыял-дэмакратаў у Магілёве дзейнічалі і эсэры, арганізацыя якіх на Магілёўшчыне цалкам сфарміравалася ў 1905 г. Эсэры мелі свае друкарні, выдавалі і распаўсюджвалі сярод насельніцтва шмат агітацыйных лісткоў і іншай рэвалюцыйнай літаратуры. Адзін з кірункаў барацьбы сацыялістаў-рэвалюцыянераў — індывідуальны тэрор супраць урадавых чыноўнікаў. Магілёў як губернскі горад стаў адным з месцаў правядзення тэрактаў. 22.10.1905 г. ў Магілёве эсэрка Л.П.Язерская страляла на прыёме ў мясцовага губернатара Клінгенберга і паранiла яго. Нават калі рэвалюцыя пайшла на спад, эсэры працягвалі тактыку тэрору. 8.1.1907 г. яны паранілі ў Магілёве паліцмайстра Радзіёнава. Да канца першай расійскай рэвалюцыі ў Магілёўскай губерні было 97 арганізацый партыі эсэраў. Яны мелі высокі аўтарытэт у працоўных, асабліва сялянства.

Перыяд рэакцыі 1907—10 гг. змяніўся новым уздымам рэвалюцыйнага руху. У 1912 г. адбыліся мітынгі пратэсту супраць Ленскага расстрэлу і першамайская стачка рабочых 40 прадпрыемстваў, у якой удзельнічала каля 1000 чалавек, яна працягвалася 11 дзён і закончылася перамогай працоўных.

У 1912 г. ў Магілёве створана група праўдзістаў, куды ўваходзіла 50 рабочых горада. Яе ўзначаліла бюро ў складзе З.Г.Беленькага, В.І.Волчака, А.І.Чарніцкага, І.М.Чарнаглаза і інш. Група праводзіла падпіску на газету «Правда», збірала грашовыя сродкі ў яе фонд, арганізоўвала гурткі рабочых і работніц у прадмесцях Дубровенка і Лупалава, рэвалюцыйныя выступленні працоўных, а таксама садзейнічала ў пашырэнні марксізму. У 1912 г. стварыла прафсаюз гарбароў (каля 200 чалавек) і ўзначальвала прафсаюзы прыказчыкаў, краўцоў («Ігла»), пераплётчыкаў.

Праўдзісцкая група Магілёва падтрымлівала пастаянную сувязь з рэдакцыяй газеты. Праз асабістую перапіску з членам бальшавіцкай фракцыі IV Дзяржаўнай думы Бадаевым дасылала патрэбную інфармацыю аб справах на прадпрыемствах горада. Па ініцыятыве групы ў ходзе вострай барацьбы з бундаўцамі і сіяністамі-сацыялістамі адноўлены прафсаюз гарбароў, што быў распушчаны ў 1909 г. У яго бюро ўвайшлі праўдзісты Бараначнікаў, Беленькі, Іваноў, Чарніцкі, Чарнаглаз. Пад кіраўніцтвам гэтага прафсаюза ў маі 1913 г. на шэрагу гарбарных прадпрыемстваў адбылася двухтыднёвая стачка, у выніку якой адноўлены на сваіх месцах звольненыя рабочыя. У 1914 г. праўдзісты праследаваліся царскімі ўладамі. Быў арыштаваны Чарніцкі, многія актывісты высланы пад нагляд паліцыі ў Віцебскую губерню.

Напярэдадні 1-й сусветнай вайны, каб пазбавіць прыфрантавую паласу ад рэвалюцыйных элементаў, паліцыя 15(28).6.1914 г. зрабіла налёт на Палескі камітэт РСДРП, разграміла праўдзісцкія групы ў Магілёве і іншых гарадах Беларусі.

20.7.1914 г. Магілёўская губерня была аб'яўлена на ваенным становішчы. У Магілёве з 8(21).8.1915 г. да 26.2.1918 г. знаходзілася Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага — вышэйшы орган кіравання дзеючай рускай арміяй і месца знаходжання Вярхоўнага галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі Расіі. *Б.І.Сідарэнка.*

Дакументы сведчаць...

Кастрычнік 1898 г.

а) **Данясенне старшага фабрычнага інспектара Магілёўскай губ. у Дэпартамент гандлю і мануфактур.**

3/X 1898 г.

Имею честь донести Департаменту торговли и мануфактур, что рабочие 9 кожевенных заведений г. Могилева, числом 110 человек, о окончании 18 сентября 1898 г. годичного срока найма, до сих пор не пришли в соглашение с заводчиками относительно условий найма на текущий рабочий год. Рабочие требуют от хозяев обязательств не принимать в заведения новых рабочих и из их среды и не отдавать кож в отделку кустарям кожевникам. В отношении к сим последним рабочие заняли враждебное положение, которое обнаруживается единичными случаями драк и ссор между представителями рабочих и кустарей. Наиболее заметных кустарных кожевенных заведений, то есть таких, в которых владельцы работают при содействии нанятых ими 2, 3 и очень редко 6 человек рабочих, насчитывается в Могилеве 27. В течение прошлого года рабочие кожевенных заводов устроили негласную сберегательную кассу, в которой, по приблизительному расчету и по слухам, имеется наличными около 500 рублей. В виду наступающего холодного времени года, трудности достать поденную работу в городе и желания владельцев кожевенных заведений начать работы, а также в виду прихода из деревень крестьян в город на заработки, следует думать, что работы в кожевенных заведениях начнутся через непродолжительное время.

Исп. об. старшего фабричного инспектора А.Циммерман.

б) **Данясенне начальніка Магілёўскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў Дэпартамент паліцыі.**

10/X 1898 г.

Вследствие отношения от 20 ноября сего года, за № 2013, имею честь сообщить, что по окончании еврейских праздников «кущи», после которых у евреев-кожевников возобновляются договоры по найму мастеровых, получено было сведение, что в 8-ми еврейских кожевенных мастерских рабочие прекратили занятия

При негласном расследовании оказалось: хозяева заставляли работать позже определенного времени (8 часов вечера), а также объявили тем из рабочих, которые недобросовестно относились к делу, что с ними не будут возобновлены договоры; рабочие же требовали добавочной платы за лишнее время работы и принятия их всех без исключения, на что хозяева не согласились.

На время забастовки рабочие воспользовались собранными в продолжение года в каждой мастерской деньгами, в общей сложности около 500 рублей, предназначавшимися на случай увечья или болезни кого-либо из участников, и выдавали ежедневное вспомоществование беднейшим из себя. Полицией немедленно предложено было рабочим и хозяевам возобновить договоры, что они вскоре исполнили, к тому же запасный капитал исчерпался.

Участия в стачке лиц политически неблагонадежных не замечено, и забастовка произошла единственно по недоразумению между рабочими и хозяевами при заключении договора о найме.

Генерал-майор (подпіс).

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2. Мн., 1940. С. 855—856.

З ДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ЖАНДАРСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ

22 студзеня 1904 г.

... Командир 162 пехотного Ахтырского полка, расположенного в гор. Могилеве, препроводил ко мне 10 экземпляров преступной прокламации под заглавием «Товарищи новобранцы!» издания Военно-революционной организации, обнаруженных 6-го и 7-го сего января в коридоре и у наружного крыльца казарменных помещений 2-ой, 10-ой рот и сапожной мастерской названных рот. По получении сего сообщения мною было немедленно установлено негласное наблюдение и розыск, которые пока не дали должных результатов...

ЦДГА РФ, ф. ДП, ШОКЖ, 1904, спр. 33 792, л. 5.

ШЫФРАТЭЛЕГРАМА НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ

24 студзеня 1905 г.

23 января в 6 час. вечера в гор. Могилеве устроена демонстрация учащихся гимназии, реального училища и фельдшерской школы с флагами. Во время обоюдной перестрелки, при задержании, ранены два реалиста, рабочий и городовой. Задержано 10 лиц. Разбросаны прокламации. Приступил к дознанию...

ЦДГА РФ, ф. ДП, ОО, 1905, спр. 17, л. 89.

ШЫФРАГРАМА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА МІНІСТРУ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ

14 кастрычніка 1905 г.

В Могилеве забастовала семинария, брожение среди учебных заведений. Железная дорога бездействует...

ЦДГА РФ, ф. ВД, 1905, д. 1567, л. 142.

ТЭЛЕГРАМА НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ЖАНДАРСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ

6 лістапада 1905 г.

5-го, около 8-ми вечера, нижние чины 1-го и 2-го батальонов Кадниковского полка в Могилеве, преимущественно 161-го запасного батальона, латыши, 900 чел., произвели беспорядок скопом, требовали увольнения в запас, не посылать на учения, на усмирения, прибавки жалования и пр., временно усмирены. Общее настроение полка плохое, распущенность запасных вносит разброд даже в хорошие воинские части.

Полковник Поляков.

ЦДГА РФ, ф. ДП, ОО, 1905 г., спр. 1877, ч. 39, л. 9.

З ДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ

20 чэрвеня 1914 г.

12 сего июня рабочие кожевенной мастерской Шальмана, находящейся в предместье Могилева..., предъявили владельцу мастерских ряд требований экономического характера, и когда в удовлетворении им было отказано, они, прекратив работу, отправились по таким же кожевенным мастерским других хозяев, к ним присоединились еще рабочие.

Все они потребовали немедленного прекращения работ, вследствие чего все рабочие удалились из кожевенных мастерских и работа в 10 мастерских была прекращена...

ЦДГА РФ, ф. ДП, IV, 1914 г., спр. 41, ч. 2, л. 3.

Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

Гісторыі было пажадана, каб заштатны губернскі горад Магілёў набыў сусветную вядомасць. Менавіта тут з 8.8.1915 г. да 26.2.1918 г. размяшчалася Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага. У Цэнтральным ваенна-гістарычным архіве Расійскай Федэрацыі (Масква, ф. 2003) знаходзіцца 2440 спраў Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага рускай арміі, дзе захоўваецца каля 200 тыс. дакументаў (загады і распараджэнні, аператыўныя зводкі, тэлеграмы, даклады франтавых штабоў, пратаколы розных нарад, зводкі пра маральна-палітычнае становішча ў арміі і інш.).

Расказаць падрабязна пра ўсебаковую дзейнасць Галоўкаверха немагчыма, таму разгледзім найбольш знамянальныя падзеі.

8(21) жніўня 1915 г. У Магілёў прыбыла і размясцілася Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага, якая з'яўлялася органам вышэйшага палявога ўпраўлення дзеючай арміяй. У пачатку вайны ў штабе Стаўкі налічвалася ўсяго 9 генералаў, 36 афіцэраў, 12 ваенных чыноўнікаў і 125 салдат. У горад на Дняпры прыехала каля тысячы чалавек.



Былая Губернатарская плошча. Дамы, у якіх размяшчалася Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага. 1915—17 гг.

Пад штаб Стаўкі і жыллё Галоўкома, начальніка штаба, генерал-кватэрмайстра і некалькіх кіраўнікоў былі заняты ўсе дамы на Губернатарскай (цяпер Савецкай) плошчы. Пад жыллё служачых штаба прадстаўнікоў саюзных дзяржаў былі рэквізаваны ўсе гарадскія гасцініцы.

Для аховы Стаўкі ў горад прыбыло каля 1,5 тыс. салдат і афіцэраў.

16 жніўня. У 10 гадзін 38 мінут вялікі князь атрымаў тэлеграму ад Мікалая II, дзе гаварылася: «До моего приезда прошу тебя распоряжаться всеми вопросами по-прежнему. Перерыва в этом не должно быть. Же-



Вярхоўны галоўнакамандуючы рускай арміяй цар Мікалай II (у цэнтры) з прадстаўнікамі Антанты ў Стаўцы. 1915 г.

лаю, чтобы генерал Эверт вступил немедленно в командование Западным фронтом, а генерал Алексеев отбыл в Могилев для занятия должности начальника штаба. Назначением генерала Янушкевича... на Кавказ согласен. Николай».

23 жніўня. Імператар Мікалай II прыбыў у Магілёў з вялікай світай на чале з міністрам двара графам Фрэдэрыксам і дварцовым камендантам, яго зяцем генералам лейб-гвардыі Ваейкавым. Цар выдаў загад па арміі аб «узяцці на сябе» абавязкаў Вярхоўнага галоўнакамандуючага.

Генерал-кватэрмайстар Ю.Н.Данілаў заменены новым Галоўкомам генералам М.С.Пуставойценкам.

У штабе ўведзены парадак: служба пачыналася ў 10 гадзін раніцы, у 13.15 гадзін — снеданне, у 19.15 — абед, якія праходзілі ў вялікай зале гасцініцы «Брыстоль».

26 лістапада. Па ініцыятыве Мікалая II было праведзена «свята георгіеўскіх кавалераў». З усіх франтоў у Магілёў ад кожнага корпуса накіраваны афіцэр і два ніжэйшыя чыны. Імператар павіншаваў усіх прысутных кавалераў з прысваеннем ім чарговых воінскіх званняў.

9 лютага 1916 г. У Стаўку прыбылі камандуючыя франтоў і начальнікі штабоў.

11 лютага. У 18 гадзін пачалася нарада пад старшынствам Мікалая II. На нарадзе прысутнічалі генералы Аляксееў, Пуставойценка, Эверт, Іваноў і інш. Абмяркоўвалася пытанне аб магчымасці правядзення вялікай наступальнай аперацыі, як таго патрабавалі саюзнікі. Вырашана такую аперацыю пачаць у сакавіку.

1 красавіка. У 10 гадзін раніцы пад старшынствам Мікалая II пачалася нарада, на якой абмяркоўваліся пытанні: агульны стан на франтах, тэрмін пачатку наступлення.

Вырашана наступленне на ўсіх франтах пачаць у маі месяцы.

На гэты дзень на Заходнім фронце ў 111394 салдат і афіцэраў не было зброі.

5 красавіка. У Магілёў асабістым поездам з вялікай світай і ўсімі дзецьмі прыбыла імператрыца Аляксандра Фёдараўна. Яе сустра-



Георгіеўскія кавалеры — прадстаўнікі ўсіх франтоў у Стаўцы Вярхоўнага галоўнакамандуючага. 1915 г.

калі Мікалай II, галоўныя чыны Стаўкі, прадстаўнікі гарадской жаночай арганізацыі.

27 красавіка. Генерал Аляксееў і Вялікі князь Сяргей Міхайлавіч прымалі прыбыўшых у Стаўку французскіх міністраў Вівіана і Альберта Тома. Размова вялася пра сумесныя дзеянні на франтах, пра планы супрацоўніцтва ў ваенны і пасляваенны перыяд.

18 жніўня. У Магілёў прыехаў пасол Англіі сэр Д.Бюкінен для ўручэння Мікалаю II знакаў Вялікага Крыжа ордэна Бані.

10 лістапада. Мікалай II прыняў адстаўку Шцюрмера. На пасаду старшыні Савета Міністраў прызначаны А.Ф.Трэпаў.

1 снежня. Мікалай II выехаў на фронт.

З прыняццем імператарам абавязкаў Вярхоўнага галоўнакамандуючага, штаты Стаўкі павялічыліся. У склад яе ўваходзілі 16 упраўленняў, 3 канцылярыі і 2 камітэты (больш за 3 тысячы генералаў, афіцэраў, чыноўнікаў і салдат).

6 снежня. Мікалай II у Царскім Сяле, дзе планаваў сустрэцца з асабістай гвардыяй.

17 снежня. Раніцай пад старшынствам Мікалая II у штабе Стаўкі пачалася нарада прадстаўнікоў франтоў і некаторых армій. Вынікі нарады саюзнікаў былі заслуханы ў французскім горадзе Шанцільі, планавалася абмеркаваць планы ваенных дзеянняў у 1917 г.

Аднак пасля перапынку некаторыя ўдзельнікі нарады адчувалі сябе няўтульна: Імператар доўга не з'яўляўся на нараду, а ў 16 гадзін ён тэрмінова паехаў у сталіцу. Стала вядома, што ў ноч на 17 снежня ў Петраградзе быў забіты Рыгор Распуцін.

Прадстаўнікі франтоў і армій былі вельмі незадаволены зрывам нарады, не атрымаўшы ўказанняў, яны пакінулі Стаўку, асуджаючы незразумелую любоў імператара і імператрыцы да непісьменнага Рыгора Распуціна.

5 лютага 1917 г. Мікалаю II дакладваюць, што з кожным днём прадуктовае пытанне ў Расіі становіцца ўсё больш вострым. Калі насельніцтва яшчэ не наладжвае галодныя бунты, то гэта не азначае, што яно іх не наладзіць.

10 лютага. У Царскае Сяло да імператара з «усеподданнейшым дакладам» прыбыў Радзянка, які патрабаваў вывесці з урада Пратапопава. Калі цар гэтага не зробіць, то не пройдзе і 3 тыдняў, як успыхне рэвалюцыя, якая змяце самадзяржаўе.

22 лютага. У 14 гадзін Мікалай II выехаў у Стаўку, дзе было атрымана паведамленне, што ў Петраградзе «пачаліся хваляванні». Народ патрабаваў хлеба. На вуліцах з'явіліся чырвоныя сцягі За парадкам сачыла паліцыя. У горадзе заставала 87.500 рабочых.

25 лютага. Генерал Аляксееў аддаў загад Паўночнаму і Заходняму франтам аб падрыхтоўцы імі да адпраўкі ў Петраград па адной кавалерыйскай брыгадзе.

Камандуючы Петраградскай ваеннай акругай генерал Хабалаў даклаў у Стаўку, што з-за недахопу хлеба ў сталіцы бастуе каля 200 тысяч рабочых.

Мікалай II загадвае Хабалаву «заўтра спыніць у сталіцы беспарадкі, недапушчальныя ў цяжкія дні вайны з Германіяй і Аўстрыяй».

26 лютага Генерал Аляксееў атрымаў дзве тэлеграмы ад Радзянкі, у якіх гаварылася, што ў сталіцы анархія, урад паралізаваны, на вуліцах адбываецца хаатычная стральба, частка войск страляюць адзін у аднаго. Тэрмінова даручыць асобе, якая карыстаецца даверам, скласці новы ўрад. Марудзіць нельга...

Аб змесце тэлеграм Аляксееў далажыў цару.

27 лютага Генерал Аляксееў не адыходзіў ад тэлеграфа. Ён патрабаваў ад камандуючых Паўночнага і Заходняга франтоў выдзялення ўсё новых часцей і падраздзяленняў са зброяй і тэрміновага накіравання іх да генерала Іванова, якому даручана навесці парадак у Петраградзе.

Увечары Мікалай II выехаў у сталіцу.

У Петраградзе перамагла Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя. Дзейнічаў Часовы ўрад.

2 сакавіка. Мікалай II па патрабаванні прадстаўнікоў Часовага ўрада адрокся ад трона ў карысць свайго брата Міхаіла. Аднак і той не прыняў абавязкі самадзержца.

Палкоўнік М.Раманаў з Пскова паехаў у Магілёў, дзе развітаўся са штабам Стаўкі, маці Марыяй Фёдараўнай, якая была ў Магілёве праездам з Кіева, з Вялікімі князямі Сяргеем, Барысам і Аляксеем.

8 сакавіка. Палкоўнік М.Раманаў паехаў у Царскае Сяло.

1 красавіка. На нарадзе ў Стаўцы прынята канчатковае рашэнне: наступленне на ўсіх франтах пачаць у маі месяцы.

14 красавіка. Для «маральнага супакаення сталіцы» генерал Аляксееў загадаў накіраваць на Паўночны фронт 5 пяхотных дывізій.

17 красавіка. Стаўка атрымала праект рашэння Часовага ўрада аб увядзенні ў воінскіх часцях пасады камісараў. Генералітэт пага-

дзіўся пры ўмове, што камісары будуць падначалены камандзірам воінскіх часцей і злучэнняў і іх поўным неўмяшанні ў аператыўнае кіраўніцтва.

1 мая. На нарадзе, якая праходзіла пад старшынствам генерала Аляксеева, абмяркоўвалася пытанне: як адаб'ецца на становішча спраў у арміі аб'ява «Дэкларацыі правоў салдата»?

Амаль усе генералы адмоўна аднесліся да гэтай «Дэкларацыі».

7 мая. Магілёў. Тут пачаўся Усерасійскі з'езд афіцэраў арміі і флоту. З'езд падтрымаў думку генерала Аляксеева, што ідэя міру з'яўляецца «утапічнай фразай» і патрабаваў устанаўлення ў краіне «цвёрдай улады».

20 мая. У Стаўку прыбыў ваенны і марскі міністр Часовага ўрада А.Керанскі. На сустрэчы з журналістамі ён заявіў, што «армія да наступлення гатова».

22 мая. Часовы ўрад змясціў генерала Аляксеева з паста Вярхоўнага галоўнакамандуючага. На гэтую пасаду прызначаны генерал А.А.Брусілаў.

13 чэрвеня. Генерал Брусілаў аддаў загад па арміі аб пачатку фарміравання добраахвотніцкіх ударных батальёнаў «крайне карысных для ўзняцця рэвалюцыйнага натхнення і наступальнага парыву ў арміі Расіі».

7 ліпеня. Керанскі атрымаў тэлеграму камандуючага Паўднёва-Заходнім фронтам генерала Карнілава, у якой патрабаваў увядзення смяротнага пакарання за дэзерцірства і адмаўленне выконваць загады камандавання.

10 ліпеня. У войскі разасланы загад Керанскага, які ўжо стаў міністрам-старшынёй, аб прымяненні зброі да асоб, якія ўхіляюцца ад выканання загадаў камандавання.

16 ліпеня. Тут пачалася нарада пад старшынствам Керанскага. На ёй прысутнічалі: міністр замежных спраў Цярэшчанка, генералы Брусілаў, Рузскі, Клямбоўскі, Дзянікін, Вялічка.

Генералы ўхвалілі ўрадавае рашэнне аб увядзенні палявых судоў і смяротнага пакарання на фронце, даказвалі неабходнасць фарміравання адборных баявых часцей для барацьбы з наспяваючай рэвалюцыяй.

18 ліпеня. Часовы ўрад адхіліў ад пасады Галоўкома генерала Брусілава. Замест яго прызначаны генерал ад інфантэрыі Л.Г.Карнілаў.

24 ліпеня. Карнілаў, прыбыўшы ў Стаўку, патрабаваў ад камандуючых франтоў «пры аднаўленні парадку ў часцях... дзейнічаць рашуча, без ваганняў, не дапускаць стральбы ўверх».

1 жніўня. Карнілаў аддаў загад войскам, дзе патрабаваў, каб у выпадках адкрытага «братання нашых салдат» з праціўнікам, па іх неадкладна адкрываўся кулямётна-артылерыйскі агонь.

18 жніўня. У штабе Стаўкі адбылася сакрэтная нарада. На ёй абмяркоўваўся план абвяшчэння генерала Карнілава ваенным дыктатарам.

19 жніўня. Генерал Карнілаў ультыматыўна патрабаваў ад Керанскага перадачы яму ў аператыўнае падначаленне Петраградскай ваеннай акругі. Праз дзень ён аб'явіў Петраград на ваенным становішчы, куды накіраваў «асобную армію» генерала Крымава ў падпарадкаванне якога перадаваў шэраг падраздзяленняў 3-га коннага корпуса і «дзікай дывізіі».

Генерал Карнілаў тэлеграфаваў Керанскаму, у якой адкрыта заяўляў, што «выратаванне Радзімы ён бачыць толькі ў «перадачы яму ўсёй ваеннай і цывільнай улады».

27 жніўня. Керанскі і Карнілаў аб'явілі адзін аднаго ворагамі народа. Першы атэставаў другога контррэвалюцыянерам. Карнілаў Керанскага — пасобнікам анархіі.

Часовы ўрад адхіліў генерала Карнілава ад камандавання рускай арміяй, аб'явіўшы яго «мяцежнікам па-за законам».

У Стаўцы атрымана тэлеграма Керанскага аб прызначэнні Галоўкаверхам генерала Лукомскага. Але той адмовіўся ад прынящця «пасады ад Карнілава».

Адмаўленне генерала Карнілава аб падпарадкаванні Часоваму ўраду падтрымлівалася ўсімі камандуючымі франтамі — Дзянікіным, Шчарбаковым, Ваноўскім. Замежныя прадстаўнікі ў Стаўцы таксама жадалі Карнілаву поспехаў у барацьбе з урадам.

28 жніўня. Магілёў. У горадзе ўводзілася ваеннае становішча: быў распушчаны Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, забараняліся мітынгі, уводзілася цэнзура.

ЦДВГА РФ, ф. 2003.
Матэрыялы падрыхтаваў І.Скварцоў.

З загаду Мікалая II

23 жніўня 1915 г.

.. Сего числа я принял на себя предводительствование всеми сухопутными и морскими силами, находящимися на театре военных

действий, с твердой уверенностью в нашей победе.

Будем исполнять наш святой долг защиты Родины до конца и не посрамим земли русской. *Часопіс «Красный архив» 1928 г. № 2.*

З пісем начальніка дыпламатычнай канцылярыі Стаўкі вгк І.Кудашава

13 жніўня 1915 г.

... Вчера вечером часть штаба, в которую была включена дипломатическая канцелярия, прибыла в Могилев.

Перенос ее из Баранович в Могилев мне показался довольно странным...

Одной из особенностей этого переезда было то, что сам Великий князь и «стратег», часть его штаба, т.е. генерал-квартирмейстер выехала первыми, оставив всех позади... Результатом этого была путаница... Успел переговорить с генералом Янушкевичем. Он снова говорил о недостатке снарядов и вооружений. Он горько жаловался, что все его просьбы о присылке больше снарядов и вооружений остаются без внимания. Сухомлинов и союзникам доказывает, что у нас всего много. Плохо он отозвался и о генерале Маниковском, много говорящем и ничего не делающем.

Он сказал о замене Янушкевича Алексеевым. Янушкевич тоже говорил, что «голыми руками победить нельзя»...

17 жніўня 1915 г.

... Настроение в Ставке продолжает быть каким-то неопределенным, выжидательным. О предстоящей перемене все говорят, но под секретом, а в сущности никто не знает, что кого ожидает...

Говорил с генералом Даниловым — он подтвердил о недостатках боеприпасов.

Больно нервно держится генерал Янушкевич. Оба генерала как-то притихли и точно не находят себе места. Янушкевич, который, бывало, по целым суткам сидел за бумагами, теперь открыто говорит, что у него нет дела. А Данилов отсутствует часами...

20 жніўня 1915 г.

... К вечеру сюда прибыл генерал Алексеев и в тот же день Янушкевич сдал ему должность...

Янушкевича в штабе все любили и уважали. Алексеев же иронизирует: «Сдал все наши крепости и приехал в Ставку»...

24 жніўня 1915 г.

... Вчера, 23.8., событие — отрешение Великого князя от командования. Великий князь популярен в армии и стране. Уход его будет иметь отрицательное значение... Свергла его немецкая партия. Говорят, что она хочет мира и что он будет заключен в октябре.

26 жніўня 1915 г.

... Вчера были прощания — в 3 часа уехал Данилов, а в 6 часов Великий князь. Проводить его приехали начальник штаба и начальники некоторых управлений, в том числе и я.

Вечером все были приглашены на обед. Настроение было подавленное. Даже Воейков, который обыкновенно оживляет эти обеды шутливой болтовней, приуныл и молчал...

Государь один раз в день принимает доклад Алексеева, для чего приходит в Губернаторский дом. Остальное время со штабом разобщен...

Сам Алексеев огорчен отъездом Великого князя. Это передавал М.Куракин, который близок к Алексееву и приехал из штаба Иванова...

28 жніўня 1915 г.

... В общем, несмотря на непривлекательную наружность, Алексеев мне нравится своей простотой. С государем он обращается не по-придворному. Он отказался от ежедневных обедов у государя.

После утреннего доклада Алексеев провожает государя до соседней комнаты, а затем приказывает дежурному офицеру доставить императора до автомобиля.

Когда пришла телеграмма от Иванова об успехах армии Щербачева (у Тарнополя) Алексеев просто переслал ее императору.

Николай II убедился в неудобствах проживания в вагоне и сегодня переезжает в дом губернатора...

З успамінаў былога міністра царскага ўрада А.Ф.Рэдзігера

... Начало 1914 года ничем не предвещало близкого начала Мировой войны. Правда, всеобщее настроение было тревожным: биржевые сферы, наиболее чувствительные к возможным политическим осложнениям, были крайне угнетены и даже считали, что война была бы для них лучше того неопределен-

ного положения, в котором они находились, но само правительство не предвидело близкого кризиса... Наши правящие сферы полагали, что Германия все же войны не желает, а вооружается лишь для того, чтобы запугать Россию и заставить ее быть уступчивой при пересмотре в 1916—17 гг. торгового договора с ней...

По первоначальным предложениям, бывшим до объявления войны, Верховным Главнокомандующим должен быть государь. Он уже в то время, когда я был Министром, говорил мне, что в случае новой войны он ни за что не останется в тылу, а непременно сам будет командовать армиями... Между тем при объявлении войны верховное командование было поручено Великому князю Николаю Николаевичу, правда, с оговоркой, что это делается временно... Государь 15 августа 1915 года сам вступил в командование армиями, находящимися в то время в самом критическом положении... Может именно это побудило его сделать такой шаг... Великий князь был назначен главнокомандующим на Кавказ, вместо престарелого Воронцова-Дашкова.

... Дела в армии шли все хуже. Недостаток снарядов и многих видов вооружений не был устранен и положение армии становилось совершенно отчаянным. Это, наконец, и побудило государя расстаться с Сухомлиновым, к которому он обратился с личным письмом. Письмо это гласило:

«Владимир Александрович! После долгого раздумья я пришел к заключению, что в интересах России и армии ваш уход необходим в настоящую минуту... Передайте вашу должность генералу Вернардеру. Господь с вами. Уважающий вас Николай».

Военно исторический журнал 1991 г. № 1.

Кацярына Васільчыкава расказвае

... Моя родная тетя Мария Александровна Васильчикова (род Васильчиковых является одним из старейших дворянских родов России. Авт.) в 1915 году приезжала в Петроград из Германии к царю. Вильгельм предлагал заключить сепаратный мир, а в случае отказа обещал передать крупную сумму денег большевикам на нужды революции. Материалы об этом визите, написанные самой Марией Александровной, хранятся в госархивах.

— Почему же Россия не приняла этого предложения?

— Как почему? Россия не могла предать своих союзников. Это было немыслимо... Папа был так потрясен миссией своей сестры, что публично от родства с ней...

Часопіс «Работница» 1992 г. № 3—4.

З успамінаў генерала Ю.Данілава, надрукаваных у Ваенна-гістарычным часопісе

... Александра Фёдоровна по природе властолюбивая и, сознавая безволье и нерешительность своего царственного супруга, с годами стала все более и более входить в государственные дела, рассматривая их, впрочем, лишь с точки зрения царской власти.

С отъездом императора в Ставку, она стала приглашать к себе министров, требовать представления ей докладов и всемерно толкала своего мужа на проявление им самодержавной власти. «Помни больше всего, что ты самодержец». Этой фразой переполнены все ее письма в Ставку.

... В год вступления в главнокомандование действующей армией императору Николаю II исполнилось 47 лет. Он был в расцвете сил и здоровья. Это был человек среднего масштаба, которого, несомненно, должны были тяготить государственные дела и те сложные события, которыми было полно его царствование. Безответственное и спокойное житье, мне думается, должно было бы более отвечать его внутреннему складу. Простой в жизни и в обращении с людьми, безупречный семьянин, очень религиозный, любивший не слишком серьезное чтение, преимущественно исторического содержания, император Николай II безусловно, хотя и по-своему, любил Россию, жаждал ее величия и мистически верил в крепость своей царской связи с народом.

Царица, признавая слабости мужа, писала в Ставку: «милого всегда надо подталкивать».

... Будучи в Ставке, государь не пропускал ни одной церковной службы. Стоя впереди, он часто крестился широким крестом и в конце службы неизменно подходил под бла-

гословение протопресвитера отца Шавельского. Как-то особенно, по-церковному, они быстро обнимали друг друга и наклонялись к руке другого.

Рядом с религиозностью, суеверием и мистикой в натуре императора Николая II уживался и какой-то особый восточный фатализм, присущий всему русскому народу: «От судьбы не уйдешь»...

... Из всех впечатлений, охвативших меня в день пребывания (30.7.1916) в Могилеве наиболее ярким было впечатление грандиозности разросшего штаба Верховного Главнокомандующего.

Названный город был переполнен разного рода управлениями и отделами этого штаба. Ставка потеряла свой прежний походный характер и превратилась в крупный бюрократический центр.

Офицеры и чиновники штаба жили в Могилеве семьями с женами и детьми.

Какая разница, думалось мне, по сравнению с жизнью той первой Ставки, которая состояла из нескольких десятков офицеров и помещалась едва ли не вся в двух поездах...

Военно-исторический журнал 1991 г. № 11; 1992 г. № 3.

З пісьма імператрыцы Аляксандры Фёдараўны

Царское Село. 4 декабря 1916 года... Еще немного терпения и глубокой веры в молитвы и помощь нашего друга и все пойдет хорошо. Я глубоко убеждена, что близится великое и прекрасное у нас для твоего царствования и России.

... Покажи всем, что ты властелин и твоя воля будет исполнена. Миновало время великой снисходительности и мягкости — теперь наступает твое царство воли и мощи! Они будут принуждены склониться перед тобой и слушаться твоих приказов и работать так, как ты хочешь и с кем ты назовешь.

... Почему меня ненавидят? Потому, что им известно, что у меня сильная воля и что когда я убеждена в правоте чего нибудь и если меня благословил Гр., то я не меняю мнения и это невыносимо для них. Но это дурные люди... Наш дорогой Друг так усердно молится за тебя — близость божьего человека придает силу, веру и надежду, в которой так велика потребность... Алекс.

Военно-исторический журнал 1992 г. № 6—7.

З дзённікавых запісаў генерала Вярхоўскага

25 декабря 1916 г. Петроград... Внутри страны обстановка прямо угрожающая. Россия кипит от негодования, так как угадывает причины почему до сих пор не победили. Государственная Дума, реакционный Государственный Совет и даже съезд объединенного дворянства заговорили одним языком, настаивая на обновлении государственной жизни...

Царь не доверяет даже членам царской семьи. Великий князь Дмитрий выслан, за Николаем Николаевичем учрежден надзор, как за заговорщиком, между тем более преданного слуги у царя нет. Словом, царь и его правительство сейчас совершенно изолированы и потеряли всякую опору в стране. Они виноваты и народ их клеймит...

Военно-исторический журнал 1991 г. № 10.

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

Перыяд паміж Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыямі ў гісторыі Магілёва адзін з самых напружаных і разам з тым цікавых. Гісторык і публіцыст М.С.Альмінскі пісаў: «Магілёў быў у той час трэцім (пасля Петраграда і Масквы) цэнтрам, які вырашаў зыход рэвалюцыі». Адбывалася гэта таму, што тут размяшчалася Стаўка, вакол якой групаваліся ўсе контррэвалюцыйныя сілы.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі на прадпрыемствах Магілёва і ў воінскіх часцях быў выбраны Магілёўскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Ён размяшчаўся ў доме губернскага прадвадзіцеля дваранства. 22.3(4.4).1917 г. адбыўся ўстаноўчы сход аб'яднанага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Большасць месцаў у Савеце атрымалі эсэры, меншавікі і бундаўцы (больш за 90%). Старшынёй выканкома стаў меншавік Вятроў, з кастрычніка 1917 г. левы эсэр Тураў. Друкаваны орган — газета «Молот», з 10.1.1918 г. яна мела назву «Известия Могилевского Совета рабочих и солдатских депутатов».

У пачатку мая 1917 г. Савет складаўся з 10 тысяч гараджан і 7 тысяч салдат і афіцэраў. Дэпутаты Савета падтрымлівалі Часовы ўрад, Стаўку Вярхоўнага галоўнакамандуючага, лозунг пра вайну да пераможнага канца. Пад кіраўніцтвам Савета праводзіліся некаторыя дэмакратычныя пераўтварэнні, ствараліся прафсаюзы, салдацкія камітэты, устанаўліваўся 8-гадзінны рабочы дзень.

3(16).3.1917 г. на сходзе Магілёўскага сацыял-дэмакратычнага камітэта Бунда і меншавікоў была створана Магілёўская аб'яднаная арганізацыя РСДРП, так званая «аб'яднанка», але да жніўня бундаўцы стварылі самастойную арганізацыю, якая ўсё ж падтрымлівала сувязі з аб'яднанкай. У Савеце, прафсаюзах, органах кіравання Бунд разам з меншавікамі і эсэрамі падтрымліваў палітыку Часовага ўрада. Пасля выхаду з аб'яднанкі бундаўцаў у ёй засталіся ў асноўным меншавікі-інтэрнацыяналісты і «абаронцы», супярэчнасці паміж імі абвастрыліся. Пасля ліпеньскага крызісу колькасць Магілёўскай аб'яднанай арганізацыі павялічылася за кошт далучэння да бальшавісцкай платформы рэвалюцыйна настроеных рабочых і салдат, што выклікала размежаванне бальшавікоў з меншавікамі. У склад камітэта новай аб'яднанай арганізацыі ад бальшавікоў увайшлі А.Н.Залманзон і Чарніцкі, ад інтэрнацыяналістаў — Калмансон і З.Лазінскі.

У жніўні 1917 г. пачалася падрыхтоўка контррэвалюцыйнага мяцяжу пад кіраўніцтвам вярхоўнага галоўнакамандуючага Л.Г.Карнілава, які намерваўся ўстанавіць ваенную дыктатуру. У Магілёў сцягваліся найбольш верныя Стаўцы вайсковыя часці. Былі забаронены мітынгі, сходы, уведзена ваенная цэнзура, на дарогах у горад выстаўлены заслоны. Усе дзяржаўныя і грамадскія памяшканні занялі салдаты карнілаўскага ўдарнага палка. 25 жніўня (7 верасня) змоўшчыкі пачалі рухаць на Петраград 3-і конны корпус пад камандаваннем генерала Крымава. У ноч на 27 жніўня (9 верасня) Карнілаў аб'явіў сябе дыктатарам, заклікаў насельніцтва не выконваць рашэнняў Часовага ўрада. Палескі камітэт бальшавікоў стварыў у Магілёве надзвычайную «пяцёрку» для барацьбы з карнілаўшчынай. Пад уздзеяннем гэтай агітацыі салдаты батальёна Георгіеўскіх кавалераў, карнілаўскага ўдарнага палка і іншых вайсковых часцей адмовіліся падпарадкоўвацца сваім камандзірам. Змова генерала Карнілава была ліквідавана. Карнілава і яго паплечнікаў генералаў Дзянікіна, Лукомскага, Марка-

ва, Раманоўскага і іншых арыштавалі і ўзялі пад варту ў Магілёве ў гасцініцы «Метраполь», потым перавялі ў Быхаў, дзе зняволеныя знаходзіліся ў будынку былой гімназіі, адкуль былі пераведзены ў крэпасць.

З пачаткам карнілаўскага мяцяжу Стаўка аб'явіла пра роспуск Магілёўскага Савета. Сакратар і некаторыя члены Савета былі арыштаваны. Большасць дэпутатаў перайшла на нелегальнае становішча і стварыла рэвалюцыйнае бюро па барацьбе з контррэвалюцыяй. У адной з друкарняў тайна была надрукавана і распаўсюджана адозва «Да працоўных і салдат», якая заклікала да абароны рэвалюцыі. Пасля ліквідацыі карнілаўскага мяцяжу Савет узнавіў работу.

У верасні 1917 г. ў выканком Магілёўскага Савета былі кааптаваны бальшавік А.Н.Залманзон і сацыял-дэмакрат-інтэрнацыяналіст З.Лазінскі. Частка дэпутатаў ад мелкабуржуазных партый пачала падтрымліваць



Генерал Л.Г.Карнілаў.

бальшавісцкія лозунгі. Дэлегатамі на II Усерасійскі з'езд Саветаў выбраны сацыял-дэмакрат-інтэрнацыяналіст С.Л.Гонікман і левы эсэр В.В.Пятроў. Савет, асабліва яго кіраўніцтва, увогуле падтрымліваў палітыку Часовага ўрада. Гэта вызначыла адмоўныя адносіны большасці дэпутатаў да Кастрычніцкага ўзброенага паўстання ў Петраградзе. 26.10(8.11).1917 г. ў памяшканні губернскага земства адбылася надзвычайная нарада грамадзянскіх і палітычных арганізацый Магілёва, у якой удзельнічалі прадстаўнікі Магілёўскага Савета, гарадской управы, кадэты, эсэры, меншавікі, бундаўцы. Яны асудзілі дзеянні бальшавікоў у Петраградзе.

Пасля таго як бальшавікі і інтэрнацыяналісты неўзабаве пакінулі гэту нараду, быў створаны цэнтр аб'яднання сіл супраць кастрычніцкага пераварота — «Грамадскі камітэт выратавання рэвалюцыі». 28.10(10.11).1917 г. на пленуме Савета правы эсэр урач Капыцінскі, салдат Бялевіч, старшыня губернскага Савета сялянскіх дэпутатаў М.Л.Гольман заявілі, што пераварот у Петраградзе — «ваенная авантура». У прынятай на ім рэзалюцыі адхілялася палітыка бальшавікоў, рэкамендавалася стварыць «аднародны сацыялістычны ўрад». Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага дзейнічала ў цесным кантакце з Магілёўскім Саветам і адмовілася прызнаць Савет Народных Камісараў (СНК).

Выконваючы абавязкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага, генерал М.М.Духонін падцягваў да Магілёва верныя Стаўцы вайсковыя часці: ударныя батальёны, палкі польскага корпуса генерала Доўбар-Мусніцкага, казацкую дывізію. Абарону Магілёва і падрыхтоўку ваеннага выступлення супраць савецкага ўрада Духонін даручыў генералу Л.Г.Карнілаву, які знаходзіўся пад арыштам у Быхаве. У Магілёве згрупаваліся вядомыя дзяржаўныя і палітычныя дзеячы — былыя міністры Часовага ўрада Мілюкоў і Вярхоўскі, лідэры меншавікоў і эсэраў Чарноў, Цэрэтэлі, Скобелеў, Гац, а таксама прадстаўнікі Антанты, якія адмовіліся прызнаць савецкі ўрад. Усе яны аб'ядналіся вакол Стаўкі і агульнаармейскага камітэта і спрабавалі ператварыць горад у апорны пункт барацьбы супраць савецкай улады. У Магілёве распрацоўваліся палітычныя планы, у ажыццяўленні якіх разам з генералітэтам Стаўкі актыўна ўдзельнічаў Духонін. 7 лістапада камісар Часовага ўрада пры Стаўцы Станкевіч склікаў нараду лідэраў буржуазных і дробнабуржуазных партый, прадстаўнікоў агульнаармейска-

га камітэта, камітэта выратавання Радзімы, некаторых членаў Часовага ўрада, генералаў і афіцэраў Стаўкі, на якой было прынята рашэнне пра неадкладнае стварэнне новага ўрада Расіі на чале з эсэрам Чарновым.

Пасля нарады агульнаармейскі камітэт у сваёй адозве «Ад імя ўсіх франтоў» заявіў аб незаконнасці савецкага ўрада і прапанаваў усім армейскім арганізацыям прыняць удзел у стварэнні новага. Аднак разасланыя ва ўсе часці дзеючай арміі тэлеграмы, паводле якіх армейскія камітэты павінны былі браць на сябе ініцыятыву стварэння новай улады, уплыву не мелі, салдацкія масы не падтрымалі гэтыя дырэктывы.

Выконваючы абавязкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага, генерал М.М.Духонін адмовіўся выканаць распараджэнне савецкага ўрада ад 7(20).11.1917 г., дзе яму прадпісвалася неадкладна звярнуцца да германскага камандавання з прапановай спыніць ваенныя дзеянні і пачаць перагаворы аб перамір'і. 9(22).11.1917 г. загадам СНК ён быў зняты з гэтай пасады, а замест яго прызначаны бальшавік, прапаршчык М.В.Крыленка.

Нягледзячы на зняцце Духоніна, камандаванне Стаўкі спадзявалася сканцэнтраваць у Магілёве свае сілы супраць рэвалюцыі. 9 лістапада Духонін слаў па ўсіх франтах тэлеграмы: «Буду змагацца супраць гвалту да ўтварэння ўрада, які прапанаваны ўсёй краінай». Урады краін Антанты працягвалі падтрымліваць адносіны з Духоніным, яны патрабавалі ад Стаўкі невыканання распараджэнняў савецкага ўрада.

Для спынення контррэвалюцыйнай дзейнасці Стаўкі СНК накіраваў у Магілёў эшалоны зводнага атрада матросаў, салдат і чырвонагвардзейцаў пад камандаваннем М.В.Крыленкі, а таксама фарміраваныя Ваенна-рэвалюцыйным камітэтам (ВРК) Заходняга фронту паўночны атрад пад камандаваннем Р.І.Берзіна і паўднёвы атрад, які ўзначаліў член ВРК 2-й арміі Я.І.Лысякоў, баявыя атрады з Віцебска, Гомеля, Мінска, Оршы, Жлобіна, Полацка. У гэтых умовах Духонін загадаў камандуючаму 5-й арміяй генералу Болдыраву затрымаць цягнік Крыленкі на станцыі Дзвінск. Аднак салдаты адмовіліся выконваць загад генерала, а сам Болдыраў быў арыштаваны. Не ўдалося затрымаць і эшалоны рэвалюцыйных сіл у Віцебску, Оршы, Шклове. 17 лістапада ў Магілёве агульнаармейскі камітэт тэрмінова склікаў нараду франтавых камітэтаў, якія спрабавалі захаваць ваенную ўладу ў руках Стаўкі. Было вы-



Генерал М.М.Духонін.



М.В.Крыленка.

рашана эвакуіраваць Стаўку ў Кіеў, новага галоўкаверха не прызнаваць, а яго эшалоны адправіць назад у Петраград. Але рэальнай сілы, каб процістаяць рэвалюцыйным войскам, у Стаўкі не было. Адначасова была атрымана тэлеграма ад камандуючага Заходнім фронтам бальшавіка Каменшчыкава, якая заклікала магілёўскі гарнізон да разгрому Стаўкі і арышту Духоніна. Эвакуацыя Стаўкі ў Кіеў была спынена.

Бальшавікі актывізавалі работу сярод жыхароў горада і салдат гарнізона. Вечарам 18.11(1.12).1917 г. адбылося пашыранае пасяджэнне выканкома Магілёўскага Савета, які прыняў рашэнне аб прызнанні СНК і пераходзе ўсёй улады ў рукі Магілёўскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Старшынёй выканкома стаў левы эсэр Тураў. Новы выканком павінен быў забяспечыць перавыбары Савета. Да перавыбараў Савета ўся ўлада перадавалася ВРК. У склад ВРК увайшлі прадстаўнікі выканкома Савета, часцей Магілёўскага гарнізона і 111-й арміі. Старшынёй выбраны эсэр-максімаліст Усанаў, таварышы старшыні — бальшавік Феерабенд і левы эсэр Пятроў, сакратар — сацыял-дэмакрат-інтэрнацыяналіст Гонікман (абодва дэлегаты II Усерасійскага з'езда Саветаў). Члены ВРК — бальшавікі Брыльён, Забкоў, Хахлоў, Якаўлеў. 19.11(2.12).1917 г. ВРК заявіў пра ўзяцце ўлады ў Магілёве і губерні, прызнаў Вярхоўным галоўнакамандуючым прапаршчыка-бальшавіка Крыленку. Прадстаўнікі Часовага ўрада Духонін, Станкевіч, Вырубаў былі ўзяты пад хатні арышт. Агульнаармейскі камітэт, які быў варожа настроены да савецкай улады, быў распушчаны, яго функцыі ўзяў на сябе Магілёўскі ВРК як орган улады агульнафрантавога значэння. Для ажыццяўлення гэтых функцый, а такса-

ма для кантролю над Стаўкай Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве былі вылучаны камісары. 21.11(4.12).1917 г. для палітычнага і арганізацыйнага кіраўніцтва франтамі 1-й сусветнай вайны створаны часовы рэвалюцыйны орган — ВРК пры Стаўцы.

19.11(2.12).1917 г. у Магілёў прыбыў Крыленка са штабам новай Стаўкі. 20.11(3.12).1917 г. Стаўку занялі рэвалюцыйныя войскі. У той жа дзень раз'юшаны натоўп салдат і матросаў выцягнуў са штабнога вагона генерала М.М.Духоніна і забіў яго. Стаўка была рэарганізавана, начальнікам штаба Галоўкаверха прызначаны генерал М.Дз.Бонч-Бруевіч. 23.11(6.12).1917 г. пры рэвалюцыйнай Стаўцы створаны ВРК, які фарміраваў баявыя атрады супраць атамана Каледзіна, Украінскай рады і інш. Узначаліў ВРК У.А. Антонаў-Аўсеенка. 16(29).12.1917 г. ў Магілёве адбыўся агульнаармейскі з'езд, на якім ВРК рэарганізаваны ў Цэнтральны Камітэт дзеючай арміі і флоту, узначаліў яго М.У.Рагадзінскі. На гэтым жа з'ездзе М.В.Крыленка стаў Вярхоўным галоўнакамандуючым Узброенымі Сіламі Савецкай Расіі. У Магілёве з 26.11(9.12).1917 г. пачала выходзіць газета «Рэвалюцыйная Стаўка».

Вядомы імёны чатырох магіляўчан, якія ўдзельнічалі ў рэвалюцыйных падзеях 1917 г. ў Петраградзе. Гэта Уладзімір Аляксандравіч Альшэўскі, Аляксандр Нічыпаравіч Жабыка, Пётр Самуілавіч Макіянчык, Валерый Апалінарыевіч Снягоцкі.

28.11(11.12).1917 г. Магілёўскі ВРК выдаў загад пра ўзяцце на ўлік і перадачу зямельным камітэтам памешчыцкіх маёнткаў. Усе зямельныя камітэты губерні былі абавязаны апісаць і ўзяць на ўлік маёмасць, скласці спісы асоб, якія вінаваты ў парушэнні пастановы пра яе захаванасць. Былі праведзены мерапрыемствы па абмежаванні правоў буржуазіі, пачата работа па ліквідацыі ўстаноў Часовага ўрада.

У 2-й палавіне снежня 1917 г. адбылося размежаванне бальшавікоў Магілёва з меншавікамі-інтэрнацыяналістамі. 20.12.1917 г. (2.1.1918) створаны гарадскі камітэт Магілёўскай арганізацыі РСДРП(б) з 6 чалавек (старшыня М.Т.Максімаў).

У лістападзе — снежні 1917 г. склад Магілёўскага Савета папоўніўся дэпутатамі-бальшавікамі, прадстаўнікамі рэвалюцыйных вайсковых часцей. Выканком Савета пачаў праводзіць у жыццё дэкрэты СНК. Бальшавіцкая фракцыя ў Савеце была самая моцная, 2-е месца па колькасным складзе займала фракцыя Бунда. У Савет уваходзілі левыя эсэры, польскія сацыялісты (левіца), інтэрнацыяналісты, прадстаўнікі прафсаюзаў, вайсковых часцей. Створана кантрольна-рэвізій-



Атрад Р.І.Берзіна, які ўдзельнічаў у ліквідацыі Стаўкі ў Магілёве.

ная камісія, узяты пад кантроль стары апарат улады, забеспячэнне харчаваннем, банк, турма. Савет зняў з пасады камісара Часовага ўрада, скасаваў стары суд, фарміраваў атрады Чырвонай гвардыі. Савету падпарадкоўвалася казначэйства. Быў устаноўлены рабочы кантроль на некаторых прадпрыемствах, узяты на ўлік маёнткі ў наваколлях горада.

15—18(28—31).12.1917 г. ў будынку Магілёўскай гарадской управы адбыўся II Магілёўскі губернскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Дэлегаты прадстаўлялі розныя партыі — ад бальшавікоў да правых эсэраў, таму на з'ездзе вызначыліся левы і правы ўхілы. Бальшавікі пры падтрымцы левых эсэраў здолелі на з'ездзе правесці свае рэзалюцыі. Дэлегаты віталі перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі. З'езд выказаў давер СНК, прызнаў антынароднай дзейнасць Часовага ўрада, падтрымаў Устаноўчы сход. На з'ездзе выбрана губернскае бюро Саветаў салдацкіх і рабочых дэпутатаў.

На III Магілёўскім губернскім з'ездзе Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў 5—10(8—23).1.1918 г. і IV Магілёўскім губернскім з'ездзе Саветаў сялянскіх дэпутатаў [8—10(21—23).1.1918 г.] было прынята рашэнне пра аб'яднанне Саветаў. Сумеснае пасяджэнне выканкомаў адбылося 14(27).1.1918 г. На ім праведзена аб"яднанне Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў з Саветамі сялянскіх дэпутатаў, створаны Магілёўскі губернскі выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. У яго ўвайшлі бальшавікі Хахлоў, Марголін, левыя эсэры Тураў, Якаўлеў, Пеўзнер, Гольман і інш. Старшынёй выканкома выбраны Гольман. На гэтых з'ездах былі прыняты ўсе бальшавіцкія рэзалюцыі.

20.2.1918 г. ў Магілёве для арганізацыі ўзброенай барацьбы з інтэрвентамі і контррэвалюцыяй створаны Вярхоўны ваенны Савет, 22.2.1918 г. пасля нарады Вярхоўнага ваеннага савета з прадстаўнікамі Магілёўскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, Магілёўскага губернскага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, вайсковых часцей — Магілёўскі губернскі ВРК як вышэйшы надзвычайны орган савецкай улады на тэрыторыі губерні. Адной з першачарговых задач ВРК было фарміраванне чырвонаармейскіх атрадаў з рабочых і сялян і арганізацыя супраціўлення германскім інтэрвентам і мяцежнаму корпусу Ю.Р.Доўбар-Мусніцкага. Старшынёй ВРК быў абраны бальшавік П.Рамо, камісарамі па арганізацыі Чырвонай Арміі сталі С.І.Забкоў, М.Л.Гольман, Хахлоў.

Стварэнне Магілёўскага губернскага ВРК выклікана ўзброеным выступленнем супраць



Матросы рэвалюцыйнага атрада, якія занялі Стаўку 20.11.1917 г.

савецкай улады корпуса польскіх легіянераў генерала Доўбар-Мусніцкага і наступленнем немцаў пасля зрыву Брэсцкіх мірных перагавораў. Асноўныя сілы корпуса Доўбар-Мусніцкага размяшчаліся ў Магілёўскай, Віцебскай, Мінскай, Калужскай і Смаленскай губернях са штабам у Мінску, з канца 1917 г. — у Бабруйску. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі яны былі сканцэнтраваны ў раёне Жлобіна, Рагачова, Бабруйска.

У момант ліквідацыі Стаўкі Доўбар-Мусніцкі спрабаваў аказаць ваенную дапамогу Духоніну, садзейнічаў уцёкам з Быхава генерала Карнілава і іншых генералаў. Доўбар-Мусніцкі адмовіўся прызнаць савецкую ўладу, не выканаў пастанову савецкага ўрада аб дэмакратызацыі арміі, выступіў у абарону землеўладанняў польскіх памешчыкаў у Беларусі, падтрымаў патрабаванні польскіх нацыяналістаў аб далучэнні Мінскай і Магілёўскай губерняў да Польшчы. 12(25).1.1918 г. Доўбар-Мусніцкі падняў антысавецкі мяцеж і пачаў наступленне на Магілёў і Мінск. Легіянеры разганялі Саветы, расстрэльвалі савецкіх і партыйных работнікаў, вярталі маёнткі памешчыкам.

Выканком Магілёўскага губернскага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў прымаў рашучыя меры супраць мяцежнікаў, выдаў дэкрэт аб арышце прадстаўнікоў польскіх памешчыкаў і тых лідэраў кадэтаў і «Саюза зямельных уласнікаў», якія дапамагалі ці спачувалі корпусу Доўбар-Мусніцкага. У Магілёве былі арыштаваны і аддадзены пад суд рэвалюцыйнага трыбунала кіраўнікі контррэвалюцыйнай змовы [так іх кваліфікавалі бальшавіцкія ўлады, на самой жа справе гэта былі звычайныя заложнікі, пра што сведчыць і зварот губернскага Савета да польскіх салдат (гл. дакумент)] — каталіцкі епіскап князь Святаполк Мірскі, былы магілёўскі губернатар барон Карл Нолькен, польскі магнат Сігізмунд Лявіцкі і інш. 19 лютага ў час пасяджэння трыбунала група прыхільнікаў арыштаваных спрабавала, паводле афіцыйнай версіі, вызваліць сваіх аднадумцаў, але была разагнана чырвонагвардзейскім атрадам. Арыштаваных рэўтрыбунал прыгаварыў да расстрэлу.

Для барацьбы з польскімі легіянерамі Магілёўскі губрэўком сфарміраваў чырвонагвардзейскія атрады з рэвалюцыйных салдат, рабочых і сялян. Былы унтэр-афіцэр А.Е.Старасотнікаў узначальваў работу па фарміраванні 1-га Магілёўскага чырвонагвардзейскага палка. Аб'яднаныя сілы Магілёўскага, Мінскага і Віцебскага атрадаў, латышскіх стралкоў і рэвалюцыйных матросаў у сярэдзіне лютага 1918 г. ў раёне Жлобіна—Рагачова разгромілі 1-ю Польскую дывізію і нанеслі паражэнне 2-й дывізіі, прымусіўшы іх адступіць да Бабруйска. Магілёўскі губрэўком 16 лютага выступіў з адозвай да легіянераў корпуса, у якой заклікаў салдат пераходзіць на бок рэвалюцыйных сіл.

18.2.1918 г. пасля заканчэння тэрміну дагавору аб перамір'і Германія аднавіла ваенныя дзеянні супраць Савецкай рэспублікі. Разам з нямецкімі войскамі наступалі і часці польскага корпуса Доўбар-Мусніцкага. Паводле закліку ВРК у Магілёве і на тэрыторыі Магілёўскай губерні разгарнулася актыўная работа па фарміраванні падраздзяленняў Чырвонай гвардыі. З Магілёва, Петраграда ў паветы і воласці губерні было накіравана каля пяцідзесяці партыйных агітатараў і арганізатараў. 23.2.1918 г. газета «Правда» паведаміла, што на тэрыторыі Магілёўскай губерні фарміруецца некалькі чырвонагвардзейскіх палкоў. З набліжэннем да Магілёва германскіх войск на пасяджэнні губрэўкома паўстала пытанне пра абарону горада. Але губрэўком не меў дастатковай узброенай сілы, і было вырашана пакінуць горад без бою і пераехаць у Мсціслаў. Рэўком, губвыканком і іншыя губернскія ўлады, якія не апавясцілі насельніцтва горада пра сваё рашэнне, спешна пакінулі Магілёў і прыхапілі з сабой банкаўскую казну, у якой было больш за 64 млн. руб. Грошы тыя ў значнай меры былі растранжыраны. Частка іх трапіла ў банкі гарадоў Арол, Сімбірск, Сызрань. У далейшым новы Магілёўскі губвыканком, створаны ў Мсціславе, спрабаваў вярнуць вывезеныя грошы і пакараць вінаватых у казнакрадстве, але поспеху не меў. 12.3.1918 г. ў Магілёў увайшлі легіянеры генерала Доўбар-Мусніцкага, 26.5.1918 — германскія войскі.

У горадзе і губерні былі разагнаны савецкія і партыйныя органы, вернуты да ўлады дума і земская ўправа, забараняліся мітынгі і сходы, устаноўлены каменданцкі час, уведзена пакаранне смерцю за захаванне зброі, пашкоджанне тэлефонных правадоў, чыгункі. Пачалі выходзіць газеты «Могилевский вестник» эсэраўскага кірунку, «Труд» мясцовага белагвардзейскага афіцэрства, «Жизнь» і «Эхо» — друкаваныя органы магілёўскіх кадэтаў.

Ва ўмовах акупацыі ў маі — кастрычніку 1918 г. дзейнічаў Магілёўскі падпольны раённы камітэт РКП(б) на чале з А.А.Брэгманам

(Жалезняком), які кіраваў дзейнасцю Шклоўскага і Быхаўскага падраённых камітэтаў РКП(б). У будынку побач з Губернатарскай плошчай, які меў шыльду «Пральня», знаходзілася канспіратыўная кватэра камітэта, а ў будынку былога казначэйства — падпольная друкарня, кіраваў ёю старшыня рабочага камітэта друкароў П.Васільеў.

Магілёўскі раённы падпольны камітэт РКП(б) праводзіў актыўную работу сярод насельніцтва горада і нямецкіх салдат, распаўсюджваў бальшавісцкія лістоўкі, газеты, здабываў зброю, арганізоўваў і кіраваў партыйным падполлем і партызанскім рухам. Падпольны камітэт быў звязаны з партызанскімі атрадамі А.Ф.Арлова, Мельнікава, С.К.Дзергачова, Карпава, Ксяндзова, Карташова і інш., што дзейнічалі ў Магілёўскім, Быхаўскім і Шклоўскім паветах. Аб'яднаныя сілы партызанскіх атрадаў 23.5.1918 г. вызвалілі ад польскіх легіянераў задняпроўскую частку горада — Лупалава. Асабліва вылучыўся Чавускі атрад І.Якубава (камандзір, потым стаў ваенным камендантам Лупалава). 18.5.1918 г. быў створаны Лупалаўскі Савет рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

31.10.1918 г. пасля адыходу нямецкіх войск Магілёў занялі часці Чырвонай Арміі. Уся ўлада ў горадзе перайшла да губернскага рэвалюцыйнага камітэта, які адразу прыступіў да аднаўлення савецкіх органаў і навядзення рэвалюцыйнага парадку: была распушчана гарадская дума, забаронены апазіцыйныя газеты, якія выходзілі ў час акупацыі. Адначасова ўзмацнілася агітацыйна-прапагандысцкая работа. Губком РКП(б) стварыў агітацыйна-асветніцкія саветы, якія арганізоўвалі камуністычныя ячэйкі, розныя гуртки, хаты-чытальні, клубы, распаўсюджвалі палітычную літаратуру. Апрача барацьбы з ідэйна-палітычнымі праціўнікамі ўлады вялі рашучую барацьбу з бандытызмам, самагонаварэннем, спекуляцыяй хлебам. Насельніцтва забяспечвалася прадуктамі харчавання, рабіліся першыя крокі па наладжванні прамысловасці.

У снежні 1918 г. былі праведзены выбары ў гарадскі Савет, які пачаў працаваць 23 снежня. Большасць у Савеце належала бальшавікам і іх прыхільнікам. У выканком, што быў выбраны праз два дні, увайшлі выключна бальшавікі. З завяршэннем работ па аднаўленні савецкай улады на вызваленай тэрыторыі Магілёўшчыны губернскі ВРК быў скасаваны. Пасля спынення яго дзейнасці перастала выходзіць і газета «Известия Могилевского губернского революционного комитета». Апошні яе нумар выйшаў 31.12.1918 г. У далейшым газета друкавалася пад назвай «Соха и молот» як орган павятовых камітэта РКП(б), выканкома Савета і бюро прафсаюзаў.



Выступленне М.І.Калініна 14.6.1919 г. на мітынгу ў Магілёве.

Калі тэрыторыя Беларусі была вызвалена ад акупацыйных кайзераўскіх войск, паўстала пытанне аб нацыянальна-дзяржаўным ладзе Беларусі. 25.3.1918 г. ў Мінску Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда абвясціў аб утварэнні Беларускай Народнай Рэспублікі. 30.12.1918 г. 4-я Паўночна-заходняя канферэнцыя РКП(б) у Смаленску аб'явіла сябе І з'ездам КП(б)Б, а 1.1.1919 г. ў гэтым горадзе быў абвешчаны Маніфест Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі аб утварэнні БССР, куды ўвайшла і Магілёўская губерня. Аднак праз месяц на І Усебеларускім з'ездзе Саветаў, які адбыўся ў Мінску 2—3.2.1919 г. і на якім старшыня ВЦВК Я.М.Свярдлоў абвясціў пастанову Прэзідыума ВЦВК «Аб прызнанні незалежнасці Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі», была прынята дэкларацыя пра аб'яднанне савецкіх сацыялістычных рэспублік Літвы і Беларусі. Літоўска-Беларуская ССР (ЛітБел) стваралася з мэтай аб'яднання сіл для барацьбы з ваеннай інтэрвенцыяй з боку Польшчы і ўнутранай контррэвалюцыяй. Магілёўская губерня ў склад новага ўтварэння не ўвайшла, у красавіку скасавана наогул, а Магілёў стаў павятовым горадам Гомельскай губерні РСФСР.

Складанае становішча на франтах грамадзянскай вайны вымушала савецкае кіраўніцтва праводзіць масавыя мабілізацыі, у першую чаргу камуністаў і камсамольцаў. Вясной і летам 1919 г. на Усходні фронт працоўныя Магілёва праводзілі 3 маршавыя роты. Асабліва значнымі былі мабілізацыі на Заходні фронт. Для правядзення агітацыйна-прапагандысцкай і арганізацыйнай работы ў

Магілёў у ліпені 1919 г. прыбыў з агітпоездам «Кастрычніцкая рэвалюцыя» старшыня ВЦВК М.І.Калінін. Як член Рэўваенсавета 16-й арміі, штаб якой размяшчаўся ў Магілёве, летам таго ж года ў горадзе больш месяца працаваў Р.К.Арджанікідзе. У пачатку савецка-польскай вайны 1910 г. Магілёў стаў прыфрантавым горадам. На барацьбу з польскімі інтэрвентамі было накіравана каля 20% камсамольцаў Магілёва. Паводле закліку прафсаюзаў праводзілася мабілізацыя рабочых горада, а ў Магілёве ўведзена ваеннае становішча. У ліпені 1920 г., калі пасля наступлення польскіх войск склалася напружанае становішча на Заходнім фронце, у Магілёве была аб'яўлена чарговая мабілізацыя камуністаў і камсамольцаў. З іх ліку створаны батальён асобага прызначэння, некалькі партызанскіх атрадаў. У барацьбе з акупантамі многія магіляўчане праявілі самаадданасць і гераізм. Нямала іх загінула. Гераічны подзвіг здзейснілі байцы 35-га бронеатрада 16-й арміі пад камандаваннем ураджэнца Магілёва М.М.Грачова.

4.6.1920 г. атрад на 5 машынах выехаў на разведку па Бабруйскай шашы і спыніўся на ноч у раёне в. Тэйкавічы Бабруйскага павета. На досвітку польскія захопнікі забілі вартавых і напалі на бронеатрад. Камандзір атрада прыняў рашэнне з боем вырвацца з акружэння.

Экіпажы падбітых бронемашын М.М.Грачова і В.М.Усава, у якіх скончыўся ўвесь боезапас, уступілі ў рукапашны бой. У жорсткім і няроўным баі загінулі Грачоў, камандзір бронемашыны В.М.Усаў, кулямётчык Пакроўскі, Бальцэвіч і 13 байцоў атрада. Былі цяжка паранены вадзіцелі Пятроў і Недабітаў. 7.6.1920 г. камандзіраў і байцоў бронеатрада, што загінулі, пахавалі ў Магілёве ў брацкай магіле на Савецкай плошчы.

За мужнасць і гераізм у гэтым баі камандзір атрада М.М.Грачоў, камандзір бронемашыны В.М.Усаў, вадзіцелі Л.І.Альбаў і М.М.Філатаў, кулямётчыкі І.М.Кулагін і А.В.Міхайлаў паводле загаду Рэўваенсавета рэспублікі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга.

За час акупацыі Магілёў быў разрабаваны і разбураны. Пасля вызвалення пачалося аднаўленне прамысловых прадпрыемстваў, жылля. У горадзе праводзіліся камуністычныя суботнікі, працоўныя добраахвотна прадаўжалі рабочы дзень. У пачатку 1919 г. дзейнічалі чыгуналіцейна-механічны, маслабойны, піваварны і 2 мылаварныя заводы, лесапілкі, гарбарныя прадпрыемствы, тытунёвая і гільзавая фабрыкі, гарадская друкарня, электрастанцыя. У 1920 г. пасля капітальнага рамонту пачалі працаваць цагельны завод і каўбасная фабрыка, рамантаваліся старыя і новыя масты, шашэйныя дарогі і чыгункі. З улікам становішча на франтах грамадзянскай вайны ў горадзе праводзіліся пэўныя арганізацыйна-прапагандысцкія мерапрыемствы. У 1920 г. ў Магілёве прайшлі «Тыдзень Заходняга фронту», «Тыдзень Паўднёвага фронту», «Тыдзень фронту і транспарту», «Тыдзень хворага і параненага чырвонаармейца».

У час правядзення гэтых кампаній сабраны грашовыя сродкі, бялізна, перавязачныя матэрыялы, медыцынскія прэпараты, салдацкае адзенне, абутак, тытунь, харчовыя прадукты перадаваліся ў армію, шпіталі і маламаёмасным чырвонаармейскім сем'ям. Праводзіўся рамонт казармаў, бальніц, шпіталяў. Шавецкія майстэрні таксама працавалі пераважна на патрэбы фронту.

Значную дапамогу аказваў горад і сялянскім гаспадаркам, асабліва бяднейшым. Вясной 1919 г. і 1920 г. металаапрацоўчыя прадпрыемствы горада пачалі выпускаць і рамантаваць сельгасінвентар, адкрываліся спецыялізаваныя майстэрні. Праводзілі «дні» і «тыдні» дапамогі сялянству. У вёску для рамонту сельгасінвентару, узворвання палёў сялян, якія не мелі коней, і сем'яў франтавікоў выязджалі кавалі, слесары, рабочыя, чырвонаармейцы. Накіроўваліся брыгады па бытавым абслугоўванні насельніцтва — краўцы, шаўцы, рымары, бляхары і інш.

Гараджане дапамагалі і ў правядзенні палявых работ і ўборцы ўраджаю. Ішоў працэс інтэнсіўнага тавараабмену горада і вёскі, у выніку якога насельніцтва горада атрымлівала хлеб і іншыя прадукты сельскай гаспадаркі, а сяляне — прылады працы і некаторыя прамтавары.

Аднак цяжкія ваенныя гады ў Магілёве не спынілі развіцця культурнага жыцця. Значна павялічылася колькасць школ і іншых агульнаадукацыйных і культурных устаноў. У 1920 г. ў горадзе працавала 49 школ першай і 22 школы другой ступеней. Была аб'яўлена барацьба з непісьменнасцю, адкрыта 136 школ для непісьменных дарослых. Дзейнічалі трохгадовыя політэхнічныя курсы, створаны групы па вывучэнні друкарскай справы, падрыхтоўкі паштова-тэлеграфных работнікаў, каморнікаў, фармацэўтаў, настаўнікаў. У горадзе была адкрыта першая вышэйшая навучальная ўстанова — Інстытут народнай

адукацыі, які рыхтаваў настаўнікаў для школ. Працавалі музычная школа, краязнаўчы музей, некалькі чырвонаармейскіх і маладзёжных клубаў, хаты-чытальні, перасоўныя бібліятэкі, тэатральныя і музычныя гурткі, тэатр, студыя выяўленчага мастацтва і кінатэатр. У Магілёве наступілі гады аднаўлення і будаўніцтва. *М.Лысенка (частка артыкула).*

Стаўка ў Магілёве

У 1932 г. ў Вільні выйшла кніга М.Бялеўскай (Ляцятінай) «Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў Магілёве 1915—1918 г.» Аўтар на падставе асабістых уражанняў і ўспамінаў расказвае пра гістарычныя падзеі тых часоў. Увазе чытачоў прапануюцца найбольш цікавыя і важныя радкі з успамінаў М.Бялеўскай.

СТАВКА ВЕРХОВНОГО ГЛАВНОКОМАНДУЮЩЕГО

... При Николае Николаевиче Ставка была военным лагерем, деловым и строгим, с первых же дней приезда Государя она внешне потеряла этот облик. Сразу все изменилось. Приехала оперетка, которой не было при Николае Николаевиче, театр был до отказу набит дамами и ставочными офицерами...

Все распустилось, и стало видно всякому, что машина начинает давать перебои.

Приехали великие князья, которых раньше не было, а если и были, то незаметно работали в штабе. Теперь на улицах Могилева то и дело можно было видеть Царицу, наследника, князей: Дмитрия Павловича, Бориса Владимировича и других лиц Царского Дома и свиты. Место Ставки — Могилев приобрел вид резиденции царской семьи, и война отходила на второй план, забывалась... Самое ужасное, что вместе с приездом Государя появился и страшный слух о Распутине...

ЦАРСКАЯ СЕМЬЯ В МОГИЛЕВЕ

Первый приезд Государыни в Могилев произошел вскоре после того, как Его Величество Император Николай II принял на себя обязанности Главковерха. Произошло это очень торжественно. На перроне вокзала помимо военных встречали царскую семью представители города, благотворительных организаций и наскоро организованный губернаторшей дамский комитет. Царица в сопровождении дочерей вышла из поезда и медленно, еле передвигая ноги, пошла по направлению депутации. Дочери отошли в сторонку. Я видела Государыню в Красном Селе в дни моего детства, и перемена в ней меня поразила. Тогда это была... худая... блондинка со скорбными глазами и грустным меланхолическим лицом. Здесь двигалась к нам очень полная женщина, темная шатенка, злая и надменная. ... Явно Царица всем не понравилась...

Царская семья ежедневно на двух автомобилях ездила за город, а иногда делала и большие прогулки в соседние уезды. Могилевские окрестности всей семье очень нравились, и Государыня даже хотела купить для себя имение Жуковского «Дашковку»...

ПРЕДСТАВИТЕЛИ СОЮЗНЫХ ДЕРЖАВ В СТАВКЕ

Вплоть до выезда Ставки в Орел в Могилеве проживали иностранные военные представители. Каждый из них ... носил отпечаток своего народа и по-своему относился к России и к русским. Военный представитель Англии, генерал Бартельс, грузный старик, мрачный и насупленный, был всегда всем недоволен. Он брюзжал не переставая и ему все не нравилось... Сербы — наоборот, были в каком-то упоении от всего русского: от русской культуры, русских просторов, русских нравов и поровну делили свою любовь между Россией и Сербией... Французов я не знала. Они как-то незаметно сидели в своей гостинице, и ни один слух о них не проникал в город. Изредка их представителя, кажется, ген. Жа-

нена, можно было видеть на вокзале... Итальянцы красовались. Они выходили на наши маленькие улицы со специальной целью показать себя. И, действительно, было что посмотреть... и не одно женское сердце, постаревшее за эти годы, начинает усиленно биться при воспоминании об их генерале, графе Ромей. Выделялся из всех японец Обата... Он не страдал за наши неудачи и не радовался нашим успехам. Он наблюдал.

... Всем иностранцам нравился могилевский климат. Ровные зимы и ясное безоблачное лето. Могилев мог быть прекрасным курортом. Удивляла их бедность русского крестьянина.

НАЧАЛО РЕВОЛЮЦИИ В СТАВКЕ И ОТРЕЧЕНИЕ НИКОЛАЯ II

...23 февраля появились в Петербурге первые признаки волнений. 24-го во время митингов произошли вооруженные столкновения с полицией. 25-го весь Петербург вышел на улицу и на Знаменской площади произошло крупное столкновение полиции с народом, причем казаки приняли сторону народа. 27-го утром произошло восстание Литовского и Волынского полков, и толпы народа вместе с солдатами пошли к арсеналу, захватили оружие и освободили из тюрем заключенных, как политических, так и уголовных.

Началась великая русская революция... В Могилеве было иначе. Все эти дни ярко светило весеннее солнце, текли ручьи и веселая толпа наполняла улицы, радуясь наступлению весны. Переворота ждали давно, но когда он наступил, то никто этому не поверил...

Но уже ночью этого дня Государь выехал в Петербург и вернулся в Могилев из Пскова уже не Императором Всероссийским, а полковником Романовым.

БОЛЬШЕВИКИ В СТАВКЕ

Большевистский переворот никого в Могилеве не поразил. Многие даже как будто обрадовались, решив, что это начало конца революции. Мало кто из обывателей слышал до революции имя Ленина и знал программу большевистской партии. Казалось, что если Временное правительство продержалось всего девять месяцев, то большевики более месяца не просуществуют. А потом, после их падения, опять все пойдет по-старому... Более же прогрессивная часть населения твердо верила в Учредительное собрание, думая, что только оно может окончательно восстановить законность и порядок. Но все эти предположения и надежды очень быстро рассеялись, как дым.

В Могилев шли большевики во главе с Крыленко. ...Духонин предполагал на автомобилях выехать в Киев и перенести туда верховное командование, но Георгиевский батальон задержал уже нагруженные автомобили.

В тот же день было собрано общее собрание всех чинов Ставки... На этом собрании надо было решить: сдавать ли большевикам Ставку без боя, или же, пользуясь близостью к Могилеву частей ударного батальона, на которые еще можно было положиться, постараться в Ставку большевиков не допустить. Настроение было мрачное... Каждый понимал, что Ставка была последним опорным пунктом, после чего, всем тогда казалось, начнется неслыханная анархия и хаос. На собрание пришел главнокомандующий Духонин. Он, обрисовав общее положение, сказал, что, по его мнению, сопротивление невозможно и что он сам до последней минуты останется на посту...

На следующий день в Могилев пришли большевики во главе с главнокомандующим Крыленко. Всеми почувствовалось, что период слов кончился, начался период действия... На вокзале, несмотря на защиту Крыленко, толпа красноармейцев подняла на штыки генерала Духонина. Его изуродованный труп распяли в товарном вагоне, прибив руки гвоздями. В рот трупа вложили окурок, и вся чернь ходила смотреть на поруганное тело ген. Духонина, плюя ему в лицо и осыпая страшными ругательствами. В таком виде нашла его и жена, которая, узнав об убийстве мужа, приехала на вокзал. После этого все вдруг, как по мановению волшебного жезла, сразу смолкло, попряталось и город, только что живший шумной жизнью, замер.

Все увидели, что пришла страшная сила, сила нечеловеческая и что нельзя жить так, как жили до сих пор. Могилевцы заперлись по квартирам, закрыв ставни и опустив шторы. Даже в домах стали говорить шепотом. А разъяренные матросы и красногвардейцы из петербургских рабочих ходили по городу, стреляя по окнам и наводя ужас и на без того уже перепуганного обывателя. И стоя у окна квартиры, приоткрыв краешек шторы, я в волнении смотрела на двигавшихся по улицам красногвардейцев...

Вскоре фронт придвинулся к Могилеву, и Ставка во главе с Крыленко переехала в Орел. В Могилеве во главе большевистской власти стал прапорщик Гольман. Начались аресты...

Дакументы сведчаць...

ТЭЛЕГРАМЫ КН. Г.Е.ЛЬВОВУ И А.И.ГУЧКОВУ ОТ МОГИЛЕВСКОГО ЗЕМСКОГО СОБРАНИЯ.

Петроград. Первому министру князю Львову. Могилевское земское собрание демократизированное представительством всех слоев населения горячо приветствует Временное правительство в лице Вашем просит Вас принять от нас заверение в полной готовности идти рука об руку с Временным правительством в деле созидания новой России готовые жертвовать собой и своими детьми.

Председатель собрания.
Секретарь.

Петроград. Военному министру А.И.Гучкову. Первое свободное Могилевское уездное земское собрание представленное всеми слоями населения в лице Вашем шлет свой сердечный привет доблестной нашей армии и просит дорогих сынов и братьев сидящих в окопах верить в наше непоколебимое решение всем нашим трудом и достоянием обеспечить ее нужды веруя в ее богатырскую мощь к одолению врага. Ура! Дорогой армии.

Председатель собрания.
Секретарь.

ИЗ ПРОТОКОЛА УЕЗДНОГО ЗЕМСКОГО СОБРАНИЯ

...Член совета солдатских депутатов Дегтярев обратился к собранию с призывом помочь армии во всем том, в чем нуждается для того, чтобы ... закрепить завоеванную свободу от притязаний немецкого милитаризма и империализма; обращаясь к земледельцам, призвал содействовать искоренению дезертирства путем недопущения дезертиров в деревню... скорее и интенсивнее браться за полевые работы, так как армия, твердо стоя на защите Родины, может удержаться лишь при условии снабжения ее всем необходимым.

Председатель собрания.
Секретарь.
20.3.1917 г.

ЦАМА РФ, ф. 214, воп. 1, спр. 78, л. 18, 20, 21.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ «ПРАВДА» ПРА ВЫДАННЕ ГАЗЕТЫ «СЯЛЯНСКАЕ СЛОВА» Ў МАГІЛЁВЕ

25 мая (7 чэрвеня) 1917 г.

Вышел первый номер газеты «Крестьянское слово» — орган губернского Совета крестьянских депутатов. Газета рекомендует крестьянам читать газеты: «Правда», «Солдатская правда».

Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР. Мн., 1954. Т. 4. С. 82.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ «ПРАВДА» ПРА ЗАБАСТОЎКУ НАБОРШЧЫКАЎ ДРУКАРНІ ГУБЕРНСКАГА ЗЕМСТВА Ў МАГІЛЁВЕ

25 мая (7 чэрвеня) 1917 г.

Объявили забастовку наборщики типографии губернского земства вследствие неудовлет-

ворения управой требования наборщиков печатать в земской типографии газету «Крестьянское слово».

Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР. Т. 4. Мн., 1954. С. 82.

З ПАВЕДАМЛЕННЯ ГАЗЕТЫ «МОГИЛЕВСКАЯ ЖИЗНЬ» ПРА ПРАЦЯГ ЗАБАСТОЎКІ РАБОЧЫХ ТЫТУНЁВАЙ ФАБРЫКІ ЛІЎШЫЦА Ў МАГІЛЁВЕ

6 (19 кастрычніка) 1917 г.

...Продолжающаяся вот уже скоро 2 месяца забастовка рабочих и работниц табачной фабрики Лившица, причем бастуют свыше 120 чел., на этих днях едва-едва завершилась обоюдным соглашением. В решительный, однако, момент, как нам передают, владелец фабрики отказался подписать вновь выработанные условия, обусловливающие возможность прекращения забастовки, и последняя, таким образом, снова продолжается...

Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР. Т. 4. Мн., 1954. С. 208.

ГАЗЕТА «МАГІЛЁЎСКІ СЕЛЯНІН» ПАВЕДАМЛЯЕ

26—27 жніўня ў Магілёў прыбылі выкліканыя Карнілавым з фронту верныя яму «ўдарнікі» і «тэкінцы». Яны павінны ахоўваць Стаўку разам з корпусам польскага генерала Доўбар-Мусніцкага, які знаходзіўся ўжо тут. Горад быў аб'яўлены на асадным становішчы. Спыніліся мітынгі і сходы. Мясцовыя чарнасоценцы ўзнялі галовы.

№ 29 за 29.8.1917 г.

ГАЗЕТА «МОГИЛЕВСКАЯ ЖИЗНЬ» ПАВЕДАМЛЯЕ

... Камендантам Магілёва, аб'яўленага Карнілавым на вакантным становішчы, быў назначаны палкоўнік Квашнін-Самарын. Яму было загадана кіравацца ў сваіх дзеяннях артыкуламі ваеннага часу.

№ 31 за 29.8.1917 г.

ПРОКЛОМАЦИЯ

Могилевского Совета рабочих и солдатских депутатов о неповиновении Корнилову и поддержке Советов.

Исполнительный комитет Могилевского Совета рабочих и солдатских депутатов.

Ответственный президиум Исполнительного комитета заявляет честно и откровенно:

Все распространяемые телеграммы местным штабом лживы, преступны и не соответствуют духу революции.

Товарищи, мы много принесли жертв, много пролили крови, но свободы даром не отдадим.

К нам идут со всех сторон наши свободные революционные войска.

Держитесь крепко вокруг Советов рабочих и солдатских депутатов.

Да здравствует свобода!

НАРБ, ф. 2607, воп. 1, спр. 1, л. 112.

ТЕЛЕГРАММА АРМЕЙСКОГО КОМИТЕТА X АРМИИ

28-го августа 1917

Министру-Председателю Керенскому, в Смольный Институт Центральному Комитету, Искомсев, Искомзап, Румчерод, Искомитюз, Аркому 2 и 3.

Армейский Комитет X армии вместе с представителями всех дивизий, входящих в состав армии, приветствует твердую решительность, проявленную Временным правительством в ответ на контрреволюционное выступление генерала Корнилова.

Пусть вся Россия знает, что в революционной армии контрреволюционные стремления встретят только глубокое негодование и дружный отпор.

«Голос X армии», № 44 за 4.9.1917 г.

АРЕСТ КОРНИЛОВА

ПЕТРОГРАД, 1-го сентября.

В семь часов вечера Могилевский гарнизон заявил себя всецело преданным Временному правительству. В десять часов вечера арестованы генералы: КОРНИЛОВ, Лукомский, Романовский и полковник Плющевский Плющин. В одиннадцать часов вечера в Могилев выехала следственная комиссия во главе с прокурором Шарловским.

«Голос X армии», № 44 за 4.9.1917 г.

З ПАВЕДАМЛЕННЯ ГАЗЕТЫ «МОГИЛЕВСКАЯ ЖИЗНЬ» ПРА РЭАКЦЫЮ МАГІЛЁЎСКІХ УЛАД І ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ НА ПАДЗЕІ Ў ПЕТРАГРАДЗЕ

28 кастрычніка (10 лістапада) 1917 г.

Чрезвычайное совещание общественных и политических организаций

Обширный зал губернского земства полон-переполнен: налицо — представители города, земства, всех национальных, общественных и политических организаций:

Социалистическая партия, фракция ка-дэ, «польская рада», белорусский комитет, организация народных социалистов, союз земских служащих, почтово-телеграфный союз, совет крестьянских депутатов, армейский комитет, интернационалисты и, наконец, масса публики, привлеченной выдающимся интересом совещания, созванного губернским комиссариатом для обсуждения вопроса о том, как реагировать на переживаемые политические события, что делать, какой тактики держаться и, самое главное, как охранять порядок в городе и губернии в эту грозную минуту, когда на чашу весов брошена судьба революции...

В 8 часов вечера и.д. губернского комиссара Г.И. Певзнер открывает чрезвычайное совещание следующим сообщением...

Что произошло

События, — докладывает и.д. губернского комиссара, — приняли определенный характер: сообщения гласят, что временное правительство арестовано и все правительственные учреждения в Петрограде заняты большевиками. Создалось невероятное положение, на которое все граждане обязаны реагировать, ибо мы имеем дело здесь с преступным замыслом, могущим иметь своим последствием гибель всей революции, причем если события эти получат логическое завершение, то и цельность России как государства — в большой опасности...

Целый ряд центральных социалистических организаций высказался отрицательно к этому большевистскому заговору, а что касается армии, то ее голос не определился еще полностью, и положение таково: на северном фронте — раскол, часть за большевиков, на юго-западном фронте один корпус примкнул к большевикам, но зато вся западная армия — на стороне Временного правительства. Существуют далее сведения, что министр-председатель Керенский идет на Петроград в сопровождении многочисленных войсковых частей, имея в виду усмирить большевиков, на стороне которых 200-тысячный Петроградский гарнизон.

Линия поведения

Нам необходимо сейчас, предлагает докладчик, определить немедленно линию своего поведения, причем органы революционной демократии должны сказать свое слово, должны сказать его те, кто пользуется авторитетом в рядах армии — советы рабочих и солдатских депутатов и советы крестьянских депутатов. Их отношение к событиям, безусловно, отрицательное, что они и высказали уже, причем Мог. совет рабочих и солдатских депутатов сегодня же подтвердил эту резолюцию, приняв при этом ряд мер к тому, чтобы течение жизни в городе не нарушалось ни справа, ни слева. Таким образом, если существует сейчас угроза для города и губернии, то — со стороны черни, могущей проявить эксцессы. И вот, в этих видах общественные организации города имеют объединиться с комитетом охраны революции, дабы предотвратить всякие вспышки.

В губернии

Сегодня же, — продолжает губ. комиссар, — я разослал ряд телеграмм организациям дружно объединиться вокруг Временного правительства, причем с этой целью созвать на местах чрезвычайные собрания. На мое предложение первым откликнулся Рогачев, где, согласно полученной уже ответной телеграмме, собрание всех организаций, партий, представителей учреждений и др. осудило замысел большевиков в достаточно исчерпывающих выражениях.

Точка зрения Могилевских организаций

Председателем чрезвычайного совещания избирается и.д. губернского комиссара Г.И.Певзнер, в товарищи председателя председатель губернской земской управы Г.В.Выковский, причем, по избрании президиума, открываются прения.

Председатель нар. соц. партии Неклепаев:

«Здесь находятся представители различных учреждений, всех партий и организаций. Пусть же они выскажутся определенно...

Это будет более планомерно. Итак, предлагаю опросить всех. В частности, наша народно-соц. партия, которую я здесь представляю, решила сегодня всемерно поддерживать Временное правительство во главе с министром-представителем Керенским.

Проявления же этой поддержки Вр. правительства могут, например, выражаться в неисполнении распоряжений большевистского правительства и т.д.»

Предложение принимается, и первым выступает представитель профессиональных союзов г. Могилева:

«Профессиональные организации решили присоединиться к резолюции Совета рабочих и солдатских депутатов и, осуждая замысел большевиков, требуем вместе с тем передачи всей земли трудовому народу и принятия активных шагов в пользу скорого заключения мира».

Представитель Могилевского комитета Бунда: «Признаем выступление большевиков гибельным для дела революции и стоим на точке зрения поддержки Временного правительства!»

Очередь доходит до представителя соц.-интернационалистов и тут разыгрывается инцидент такого рода.

«Не желаем, — читает свою резолюцию представитель интернационалистов, — работать в настоящем совещании вместе с представителями кадетской партии, не смывшей еще с себя пятна корниловщины, мы воздерживаемся от всяких выступлений...»

Раздаются возгласы:

«Уходите!» и сейчас же водворяется известное замешательство, с которым борется звонок председателя.

— Вы здесь один? — спрашивает председательствующий у автора резолюции. Следует ответ: — Нет, нас целая группа...

Представитель губернского комитета Бунда Браун: «Мы бы желали выслушать прежде всего представителей цензовых элементов!»

— Еще большой вопрос, — отвечает на это представитель партии народной свободы Ю.Ю.Бехли, — должны ли быть отнесены члены нашей фракции к цензовикам? И горячо, с оттенком известной взволнованности, продолжает: — Со дня своего основания наша партия является глубоко демократической и, хотя мы еще не осуждали создавшегося ужасного положения, но соответствующая резолюция нами уже принята. Мы считаем выступление кучки большевиков национальным бедствием...

Могилевская жизнь. 1917. № 85. 28 кастр.

З ЗАГАДА МАГІЛЁЎСКАГА ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНАГА КАМІТЭТА ПРА ЎЗЯЦЦЕ ІМ УЛАДЫ Ў ГОРАДЗЕ І ЎСТАНАЎЛЕННЕ КАНТРОЛЮ НАД СТАЎКАЙ

19 лістапада (2 снежня) 1917 г.

В субботу 18 ноября Исполком Могилевского Совета рабочих и солдатских депутатов признал существующую власть, стоящую на платформе II съезда Советов рабочих и солдатских депутатов и ответственную перед органом, состоящим из представителей рабочих, солдат и крестьян, законной.

Вся власть в городе и контроль над Ставкой перешли в руки Военно-революционного комитета, состоящего из представителей Исполкома Могилевского Совета рабочих и солдатских депутатов, представителей Могилевского гарнизона и представителей армии.

Призываем всех к спокойствию и повиновению.

Всякая попытка нарушения общественного спокойствия будет подавлена решительными мерами.

Военно-революционный комитет.

Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР. Мн., 1954. Т. 4. С. 279.

ЗАГАД № 8 МАГІЛЁЎСКАГА ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНАГА КАМІТЭТА ПРА КАНТРОЛЬ НАД ДЗЕЙНАСЦЮ СТАЎКІ І АБ'ЯЎЛЕННЯ ПРАДСТАЎНІКОЎ ЧАСОВАГА ЎРАДА ПАД ДАМАШНІМ АРЫШТАМ

19 лістапада (2 снежня) 1917 г.

1. Могилевский Военно-революционный комитет признает единственным законным и на-

родным, выдвинутым самой революцией, Верховным главнокомандующим русской армии комиссара ныне существующего правительства.

2. Бывшего Верховного главнокомандующего ген. Духонина Военно-революционный комитет отныне не признает как уже отстраненного от занимаемой им должности и объявляет состоящим под домашним арестом с исполнением служебных обязанностей.

3. Комиссар низвергнутого коалиционно-буржуазного правительства Станкевич отстраняется от занимаемой им должности как комиссар несуществующего правительства, лишается получаемого им содержания и объявляется состоящим под домашним арестом.

4. Помощник начальника штаба Ставки по политическим делам Вырубов объявляется состоящим под домашним арестом.

5. Во исполнение приказа Правительства Народных Комиссаров общеармейский комитет объявляется распущенным и содержащимся под домашним арестом. Временно функции общеармейского комитета берет на себя Военно-революционный комитет и для принятия дел его посылает своего комиссара. Для образования Военно-революционного общеармейского комитета Военно-революционный комитет гор. Могилева созывает к 26 с.м. представителей от всех дивизий, избранных на основании равного, прямого, тайного и всеобщего голосования.

6. Для контроля над всей деятельностью Ставки Могилевский Военно-революционный комитет назначает своих комиссаров, без скрепы которых ни один приказ не исполняется.

7. Для наблюдения над автомобильными гаражами Военно-революционный комитет назначает своих комиссаров, без разрешения коих ни один автомобиль не может быть использован.

Военно-революционный комитет.

Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР. Мн., 1954. Т. 4. С. 279—280.

ЗАГАД № 7 МАГІЛЁЎСКАГА ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНАГА КАМІТЭТА ПРА ЎСТАНАЎЛЕННЕ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ПАРАДКУ

19 лістапада (2 снежня) 1917 г.

1. Во исполнение приказа Правительства Народных Комиссаров, волею Октябрьской революции поставленных, Могилевский Военно-революционный комитет, состоящий из представителей Исполкома Могилевского совета рабочих и солдатских депутатов и представителей Военно-революционного комитета Западного фронта и армий, объявляет себя высшей властью в гор. Могилеве и окрестностях и берет на себя контроль над деятельностью Ставки.

2. Все распоряжения Военно-революционного комитета подлежат немедленному и безусловному исполнению.

3. Всякий, не признающий и не исполняющий приказов и распоряжений Правительства Народных Комиссаров и Военно-революционного комитета, подлежит немедленному аресту и отстранению от занимаемой должности и лишению содержания.

4. Лица, противодействующие власти народных комиссаров и Военно-революционного комитета, будут немедленно арестовываться и предаваться военно-революционному суду.

Военно-революционный комитет

Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР. Мн., 1954. Т. 4. С. 279.

РАДЫЁГРАМА МАГІЛЁЎСКАГА ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНАГА КАМІТЭТА ПРА ПЕРАХОД УЛАДЫ Ў ЯГО РУКІ ПАВОДЛЕ ПУБЛІКАЦЫІ Ў ГАЗЕЦЕ «ЗВЕЗДА»

20 лістапада (3 снежня) 1917 г.

18 ноября в 11 час. ночи власть в гор. Могилеве и контроль над Ставкой переходят в ведение Военно-революционного комитета. Местный Совет рабочих и солдатских депутатов и представители армии объявили себя единственным органом, ведающим всей властью в городе.

Военно-революционный комитет заявляет, что интересы свободы и революции будут защищаться Военно-революционным комитетом всеми средствами, находящимися в его распоряжении. Все лица, замеченные в контрреволюционной деятельности и препятствующие разрешению основных задач, провозглашенных декретами II Всероссийского съезда Советов, будут преследоваться по всей строгости революционного времени.

Солдаты всех армий! Дело мира приближается к желаемому концу. Сохраните полный порядок в ваших рядах, удвойте вашу энергию и создайте революционную дисциплину.

Военно-революционный комитет.

Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР. Мн., 1954. Т. 4. С. 278.

ЗВАРОТ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА САВЕТА ДА ПОЛЬСКІХ САЛДАТ ПРА ПЕРАХОД НА БОК РЭВАЛЮЦЫІ, ПАВОДЛЕ ПУБЛІКАЦЫІ Ў ГАЗЕЦЕ «ИЗВЕСТИЯ МОГИЛЕВСКОГО СОВЕТА»

19 студзеня (1 лютага) 1918 г.

Товарищи польские солдаты!

Совет солдатских, рабочих и крестьянских депутатов Могилевской губ. обращается к вам, братья-товарищи, с братским призывом прислушаться к тому же солдатскому, крестьянскому и рабочему голосу, которому трудно проникнуть в осажденный мирный гор. Рогачев.

Позавчера революционной Ставкой было получено официальное извещение от генералов и офицеров ваших, командующих вашими отрядами в Смоленске о том, что нам объявляется священная война и что будто вы, товарищи, сами будете воевать против нас, т.к. желаете этой священной войны.

Товарищи, мы не потерпим, чтобы вы пошли на тот кровавый обман, на который ведут вас ваши офицеры, генералы и помещики — ваши вечные угнетатели и господа.

Одумайтесь и не поддавайтесь на преступное коварство ваших командиров, которые не страшны ни для нас, ни для вас, товарищи.

Русский революционный солдат в течение 9 месяцев революции уже доказал, что он не боится своего начальства и может сам управляться, и честь, совесть, братское чувство единения с польским солдатом требуют от нас единения с польским солдатом, требуют от нас оказания вам помощи в деле свержения власти вашей буржуазии, ваших врагов, ваших капиталистов и угнетателей.

Товарищи, Совет уже по соглашению с польскими социалистами и революционерами арестовал в течение вчерашней ночи всех богатых польских помещиков по всей Могилевской губ. и в гор. Могилеве, всех помещиков и лиц, состоявших с ними в союзе.

Товарищи, скажите же вашим офицерам и генералам, что если их преступный язык повернется отдать приказ стрелять по нашим солдатам, двигающимся с севера на Рогачев в количестве 4 корпусов, если ваши офицеры осмелятся наказывать вас за ваше законное неповиновение их распоряжениям, то все арестованные помещики и угнетатели ваши, равно как и наши, будут немедленно отправлены в Кронштадт, где их постигнет та же судьба, что и прислужников старого режима.

Товарищи, вы служите слепым орудием и дорогим средством для достижения корыстных целей ваших офицеров и генералов, которые хотят возвратить себе свои богатства и земли, принадлежащие в Белоруссии трудящимся крестьянам, рабочим и солдатам, а в Польше трудящимся польским рабочим, солдатам и крестьянам, но не помещикам, не капиталистам, не генералам, которые постоянно и у вас, и у нас были нашими угнетателями.

Товарищи! Оставляйте ваших офицеров и генералов, арестовывайте их и выбирайте себе из своей же среды командиров, подчиняйтесь революционной Ставке, тогда и революционная Ставка даст вам требуемое для вас довольствие и содержание, и вы поедете к себе на родину.

Распространяйте это обращение среди своих товарищей, присылайте к нам своих выборных солдат сейчас же, которые будут приняты радушно и которым будут даны подробные объяснения всего происходящего.

Тогда вы узнаете, что тот туман, которым старались окутать вас ваши начальники, является для вас ложным по своей преступной и кровавой затее. Тогда вы узнаете, кому выгодна та братоубийственная война, которую навязывают вам ваши генералы и офицеры.

Знайте, товарищи, что если вы не придете к нам только для того, чтобы самим узнать и разобраться в том, что вокруг вас происходит, то братская кровь прольется, и грех этот падет на головы вашего начальства, которое проклянут ваши дети, сожалея о вашей темноте, непонимании и рабском подчинении вашим кровавым начальникам. Немедля же присылайте ваших делегатов, чтобы самим узнать, пока не поздно, что делается за вашей спиной.

Совет крестьянских, рабочих и солдатских депутатов в Могилеве вас ждет.

Могилевский губернский Совет рабочих,
солдатских и крестьянских депутатов.

Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР. Мн., 1954. Т. 4. С. 366—367.

УЛЬТЫМАТУМ ВЫКАНКОМА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА САВЕТА РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І САЛДАЦКІХ ДЭПУТАТАЎ ДА ШТАБА КОРПУСА ГЕНЕРАЛА ДОЎБАР-МУСНІЦКАГА

Губернский исполнительный Комитет Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов в ответ на объявление вами священной войны российской революции имеет честь поставить вам на вид, что в своих действиях по отношению к представителям польской буржуазии, ксендзам, польским радам и всем остальным буржуазным организациям польской национальности оставляет за собой право поступать с ними так, как и вы осмелились поступать с русскими крестьянами, рабочими и солдатами в Рогачеве.

Губернский исполнительный Комитет предлагает вам в течение 24 часов исполнить нижеследующие требования: прекратить аресты и насилие...; прекратить всякую реквизицию хлеба и скота; прекратить расформирования земельных комитетов; прекратить... ограбление населения; снять осадное положение с города и уезда; заявить о полном подчинении Революционной Ставке; собрать общее собрание солдат и предоставить им возможность избрать делегацию в Могилев и, наконец, дать свои исчерпывающие объяснения по поводу выступления, отдавшись в руки русских властей.

Требуем немедленно выпустить всех арестованных.

Если в течение 24 часов не будет получено от вас никакого ответа или получится ответ неудовлетворительный, то арестованные ксендз кн. Святополк-Мирский, Обезерский, кн. Радзивил-Ольдэкоп, Тржецкий-Галлер будут немедленно отправлены в Петропавловскую крепость и по имеющимся материалам преданы суду по обвинению в соучастии в контрреволюционном буржуазно-польском мятеже...

Председатель губернского исполнительного Комитета Совета рабочих, крестьянских и солдатских депутатов Михаил Гольман, Комиссары военного отдела штаба Красной Гвардии Хохлов, Анопов, Красс.

«Известия Могилевского Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов». № 5 за 21.1.1918.

З ДАКЛАДА МАГІЛЁЎСКАГА ПАВЯТОВА-ГАРАДСКОГА КАМІТЭТА ПАРТЫІ ГОМЕЛЬСКАМУ ГУБЕРНСКАМУ КАМІТЭТУ РКП(б) ПРА РАБОТУ ЗА ЖНІВЕНЬ—ВЕРАСЕНЬ 1920 г.

22 кастрычніка 1920 г.

... Самым напряженным моментом в работе укома... были выборы в горсовдеп. При наличии тех партийных сил, каковые имеются сейчас в Могилеве, и при тех условиях, в каковых живут рабочие, нужно было напрячь все силы и энергию, чтобы не повторился март сего года, когда меньшевики завоевали все места в Совете. В предстоящем докладе было указано, что правые социалистические партии почти не существуют, но во время выборов оказалось как раз наоборот, они существуют и даже ведут свою работу, конечно, в тайне, спокойно, и эта работа дает им известные результаты, хотя до тех пор очень мизерные, о чем свидетельствуют выборы в горсовет.

В рабочих союзах, почти во всех, прошли наши списки, хотя должен указать, что эти списки были разбавлены беспартийными рабочими, и это отчасти давало нашим спискам перевес, линия укомом была намечена неправильная, было много уклонений и отсутствие твердой коммунистической линии. Отсутствие твердости объясняется тем, что нет хороших работников, которые бы работали в самых низах союзных масс, нет тесной связи с ними, масса страшно устала, измученная, голодная и для поднятия настроения и сознания требуется систематическая упорная работа в союзных массах. В последнее время уком принимает все меры к тому, чтобы повести работу в профсоюзах, снимаются работники с советских учреждений исключительно для союзной работы. Несмотря на самую подлую и низкую демагогию меньшевиков, в Совет прошли[1] только 12 делегатов из общего количества членов Совета — 70.

Во время выборов появились на могилевском горизонте С.Р. «меньшинства»[2], которые идут совместно с меньшевиками, но их работы не видно, только по полученным сведениям из Политбюро, они будто бы начали работу в уезде по организации крестьянских союзов. В настоящее время идет за ними усиленное наблюдение, и в скором времени вопрос будет выяснен.

Уездный съезд Советов прошел сверх всяких ожиданий спокойно, без шума и крика, несмотря на то, что меньшевики все время агитировали крестьянскую массу против нас, даже

[1]В документе — провела.

[2]Так в документе.

предлагали резолюцию по продовольственному вопросу. Делегатам съезда, которые ее не приняли, сказали, что такая резолюция не подходит. В общем съезд прошел хорошо, было только немножко «крестьянской критики», которая сводилась к мелочам.

Нужно отметить одно очень прискорбное явление, что крестьяне не верят нам, а только лишь идут за некоторыми личностями из партии. Это объясняется тем, что всякий агент, уполномоченный, ревизор, контролер и тому подобные, выезжающие в уезд, называют себя коммунистами и делают в деревне что им угодно. Крестьяне просят оградить их от подобного рода «коммунистов». После долгих разъяснений и убеждений соглашаются с нами, что это не коммунисты и даже последнее время поступает масса заявлений на действия того или другого агента или совработника. Кроме того, что много крестьян лично приходят в комитет с жалобами, видно из этого, что Коммунистическая партия в настоящее время в глазах крестьянства становится не сборищем «агентов коммунистов», а действительной защитницей интересов трудящихся, как они часто выражаются в своих письмах и заявлениях.

В уезде в общем настроение удовлетворительное, несмотря на проведенные разверстки и всякие другие повинности...

Борьба за Советскую власть в Белоруссии 1918—1920 гг. Т. 2. Мн., 1971. С. 507—509.

Магіляўчане, якія змагаліся за савецкую ўладу ў грамадзянскай вайне:

АБРАМОВІЧ Павел Кузьміч, н. ў 1903.
АЛАШКОЎ Емяльян Дзянісавіч, н. ў 1899.
АЛЯКСЕЕНКА Андрэй Іванавіч, н. ў 1901.
АЛЯКСЕЙЧЫКАЎ Давыд Лявонавіч, н. ў 1896.
АРЛОЎСКІ Іосіф Іванавіч, н. ў 1899.
АСТАПЕНКА Сцяпан Нікіціч, н. ў 1900.
АСТАПКАЎ Пётр Герасімавіч, н. ў 1899.
АЎЛАСАЎ Іван Якаўлевіч, н. ў 1900.
БАНДАРЭНКА Андрэй Емяльянавіч, н. ў 1895.
БАРЦЭВІЧ Дзмітрый Фаціевіч, н. ў 1900.
БАТУРА Сідар Пятровіч, н. ў 1899.
БЕДЫНЕРМАН Шая Лейбавіч, н. ў 1895.
БІБІЛЬНІК Сімон Маносавіч, н. ў 1896.
БІРНЕКС Аляксандр Сцяпанавіч, н. ў 1898.
БІРУКОЎ Яфім Паўлавіч, н. ў 1895.
БОНДАРАЎ Мікалай Іванавіч, н. ў 1895.
БОНДАРАЎ Фама Арцёмавіч, н. ў 1899.
БРОХІН Пейсах Мордухавіч, н. ў 1898.
БУКУЗЯКАЎ Захар Піліпавіч, н. ў 1899.
БУЛАЙ Георгій Ермалаевіч, н. ў 1899.
БУЯКОВІЧ Міхаіл Мікалаевіч, н. ў 1899.
БЫКАЎ Іван Савельевіч, н. ў 1900.
БЯЛЯЙ Аляксей Іванавіч, н. ў 1894.
ВАЛАДЗЕНКАЎ Сяргей Іванавіч, н. ў 1901.
ВАСІЛЬЕЎ Пётр Якаўлевіч, н. ў 1898.
ВАСІЛЬЕЎ Сямён Васілевіч, н. ў 1895.
ВІКТАРОЎСКІ Сяргей Георгіевіч, н. ў 1897.
ВІШНЯВЕЦКІ Мікалай Пятровіч, н. ў 1898.
ВЫСОЦКІ Аляксандр Цімафеевіч, н. ў 1901.
ВЯРБІЦКІ Кандрат Сямёнавіч, н. ў 1901.
ВЯРБІЦКІ Пётр Сямёнавіч, н. ў 1901.
ВЯРЛЫГА Іван Сігізмундавіч, н. ў 1901.
ГАЙС Іван Нікіціч, н. ў 1899.
ГАЛУБКОЎ Дзмітрый Пятровіч, н. ў 1899.
ГАМЗУНОЎ Фядот Афанасьевіч, н. ў 1900.
ГАНЧАРОЎ Сідар Мікалаевіч, н. ў 1893.
ГАРАНІН Віктар Пятровіч, н. ў 1894.
ГАРАЎЦОЎ Мікалай Цярэнцьевіч, н. ў 1899.
ГЕНЬКІН Ілья Юдавіч, н. ў 1896.
ГЕРШАНОВІЧ Абрам Лазаравіч, н. ў 1902.
ГІЛЬКОЎ Фёдар Іванавіч, н. ў 1901.
ГЛЕБАЎ Іван Іванавіч, н. ў 1899.
ГЛУШАНКОЎ Дзмітрый Яфімавіч, н. ў 1901.
ГЛУШАНКОЎ Іван Яфімавіч, н. ў 1896.
ГЛУШЫНСКІ Іван Паўлавіч, н. ў 1900.
ГОВАРКС Гаўрыла Аляксандравіч, н. ў 1901.
ГОНТАРАЎ Віктар Пятровіч, н. ў 1899.
ГРАМЫКА Аляксандр Яфімавіч, н. ў 1897.
ГРУШЭЦКІ Павел Мікалаевіч, н. ў 1895.
ГРЫБАЙЛА Стафан Іванавіч, н. ў 1894.
ГУСАРЭВІЧ Анісім Дзмітрыевіч, н. ў 1895.
ГУСАРЭВІЧ Міхаіл Фёдаравіч, н. ў 1900.
ГУСІН Рувім Якаўлевіч, н. ў 1901.
ГУЦІН Самуіл Ільіч, н. ў 1895.
ДАМАРАЦКІ Мікалай Сцяпанавіч, н. ў 1893.
ДЗЕМ'ЯНКОЎ Мікалай Гаўрылавіч, н. ў 1900.
ДЗІМЯНКОЎ Рыгор Канстанцінавіч, н. ў 1899.
ДЗЯМ'ЯНАЎ Мікалай Іванавіч, н. ў 1902.
ДЗЯНІСАЎ Дзмітрый Іванавіч, н. ў 1886.
ЕЛІСЕЕЎ Мікалай Сяргеевіч, н. ў 1905.
ЖДАНОВІЧ Пракоп Васілевіч, н. ў 1894.
ЗАБРАНСКІ Якаў Ізраілевіч, н. ў 1899.
ЗАЙКО Мікалай Іванавіч, н. ў 1894.
ЗАТМАН Іосіф Ізраілевіч, н. ў 1906.
ЗАХАРАНКА Пракоп Дарафеевіч, н. ў 1900.
ІВАНОЎ Рыгор Паўлавіч, н. ў 1901.

ІВАНОЎ Усевалад Фаміч, н. ў 1899.
ІГНАЦЬЕЎ Мікалай Сямёнавіч, н. ў 1897.
ІСКОЛЬСКІ Міхаіл Абрамавіч, н. ў 1899.
КАВАЛЕНКА Барыс Сяргеевіч, н. ў 1898.
КАЖАРСКІ Аляксандр Яфімавіч, н. ў 1889.
КАЗЛОЎ Іван Сцяпанавіч, н. ў 1898.
КАЗЮЧЫЦ Канстанцін Клімавіч, н. ў 1898.
КАМЕНШЧЫКАЎ Мітрафан Ісакавіч, н. ў 1899.

КАМІНСКІ Дзям'ян Фёдаравіч, н. ў 1900.
КАНДРАТОВІЧ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1898.
КАНДРАЦЕНКА Міхаіл Нічыпаравіч, н. ў 1900.
КАНЬКОЎ Іван Дзмітрыевіч, н. ў 1900.
КАРАБІЦКІ Іван Іванавіч, н. ў 1900.
КАРАТКЕВІЧ Гсоргій Венядзіктавіч, н. ў 1900.

КАРДОБНЕЎ Аўрам Ягоравіч, н. ў 1901.
КАСІРАЎ Мацвей Іванавіч, н. ў 1890.
КАСЦЕНКАЎ Ілья Мінавіч, н. ў 1899.
КАТЫШАЎ Васіль Мітрафанавіч, н. ў 1897.
КАЧУРЫН Барыс Лазаравіч, н. ў 1898.
КІРКІЖ Емяльян Аляксеевіч, н. ў 1898.
КІСЯЛЁЎ Уладзімір Васілевіч, н. ў 1893.
КЛІМАЎ Сяргей Прохаравіч, н. ў 1900.
КОЛЕСНЕЎ Васіль Сяргеевіч, н. ў 1900.
КРАСНОЎ Данііл Емяльянавіч, н. ў 1891.
КУЗЬМІН Аляксандр Арцёмавіч, н. ў 1899.
КУЗЬМЯНКОЎ Парфен Уладзіміравіч, н. ў 1900.

КУКАРЫН Пётр Гардзеевіч, н. ў 1893.
КУРУЛЕНКАЎ Георгій Барысавіч, н. ў 1901.
ЛАБКОЎ Іосіф Францавіч, н. ў 1898.
ЛАПІЦКІ Кузьма Міхайлавіч, н. ў 1901.
ЛЕВЕРТАЎ Барыс Веньямінавіч, н. ў 1899.
ЛЕВІН Абрам Беркавіч, н. ў 1900.
ЛЕВІЦКІ Берка Ёоселевіч, н. ў 1900.
ЛІТВАК Юда Беніцыянавіч, н. ў 1893.
ЛІЎШЫЦ Мецель Ізрайлевіч, н. ў 1900.
ЛУР'Е Анатоль Якаўлевіч, н. ў 1901.
ЛЫСЕНКА Фёдар Емяльянавіч, н. ў 1899.
МАКАРКІН Рыгор Ільіч, н. ў 1901.
МАКСІМАЎ Сяргей Якаўлевіч, н. ў 1898.
МАЛЬКОЎ Аляксей Ільіч, н. ў 1904.
МАРОЗАЎ Пётр Мацвеевіч, н. ў 1892.
МАХОРКІН Пракоп Прохаравіч, н. ў 1899.
МАЦВЕЕЎ Сямён Якаўлевіч, н. ў 1899.
МІНАШКІН Фёдар Антонавіч, н. ў 1896.
МІРЭР Ізраіль Гілевіч, н. ў 1902.
МОЛДУНАЎ Сямён Рыгоравіч, н. ў 1901.
МУРЗІН Дзмітрый Ніканоравіч, н. ў 1904.
НЕСЦЯРОВІЧ Фёдар Іванавіч, н. ў 1898.
НІКІЦІЧ Трафім Іванавіч, н. ў 1901.
ПАДЛОБКА Арцём Васілевіч, н. ў 1900.
ПАЛАШЭЎСКІ Архіп Васілевіч, н. ў 1896.
ПАЛУПАНАЎ А.С., н. ў 1900.

ПАПЛЁЎКІН Аляксандр Несцеравіч, н. ў 1904.
ПАСЯЛЕНЦАЎ Фёдар Фядотавіч, н. ў 1901.
ПАТАПЦЕЎ Логін Нікіфаравіч, н. ў 1891.
ПЕТУХОЎ Сямён Мацвеевіч, н. ў 1899.
ПІНСКІ Міхаіл Майсеевіч, н. ў 1902.
ПЛОТКІН Барыс Яўсеевіч, н. ў 1898.
ПРАЯВЕНКА Міхаіл Васілевіч, н. ў 1901.
ПУСІКАЎ Іван Фаміч, н. ў 1900.
РАГОЎСКІ Мікалай Міхайлавіч, н. ў 1900.
РАГОЎСКІ Сямён Сямёнавіч, н. ў 1894.
РАХЛІН Якаў Мендзелевіч, н. ў 1900.
РУБАНАЎ Марк Міхайлавіч, н. ў 1901.
РЫЖКОЎ Ісак Беркавіч, н. ў 1896.
РЫМША Аляксандр Кузьміч, н. ў 1906.
РЭМЕЗ Завель Іцкавіч, н. ў 1892.
САВІЦКІ Валянцін Стафанавіч, н. ў 1902.
САКАЛОЎ Павел Сідаравіч, н. ў 1889.
САЛДАЦЕНКА Міхаіл Яфрэмавіч, н. ў 1901.
САМУЙЛЕНКА Іларыён Савосцьевіч, н. ў 1898.

САПЕЖЫНСКІ Ілья Мінавіч, н. ў 1900.
САРОКІН Ісак Міхайлавіч, н. ў 1898.
СЕРАДА Яўціхій Лазаравіч, н. ў 1896.
СІВАКОЎ Цімафей Сцяпанавіч, н. ў 1900.
СІЛЬЧАНКА Андрэй Іванавіч, н. ў 1897.
СІНІЦКАЯ Варвара Стафанаўна, н. ў 1901.
СІНКЕВІЧ Стафан Мікалаевіч, н. ў 1900.
СНАПКОЎ Рыгор Сямёнавіч, н. ў 1901.
СОРКІН Леў Самуілавіч, н. ў 1898.
СТАНКЕВІЧ Арцём Рыгоравіч, н. ў 1901.
СТАНКЕВІЧ Яфім Баніфатавіч, н. ў 1898.
СТАРАДУБАЎ Фёдар Сямёнавіч, н. ў 1897.
СТАФАНОЎСКІ Аляксей Ільіч, н. ў 1898.
СЫРАМАЛОТАЎ Васіль Іванавіч, н. ў 1900.
ТАРАСАЎ Пракоп Пракопавіч, н. ў 1901.
ТАРАСАЎ Сяргей Міхайлавіч, н. ў 1904.
ТАРШЫКАЎ Васіль Фёдаравіч, н. ў 1901.
УЛЬЯНАЎ Антон Сямёнавіч, н. ў 1901.
ФАЕНКАЎ Ілья Іванавіч, н. ў 1896.
ФІЛІПАЎ Ілья Андрэевіч, н. ў 1899.
ФІЛІПАЎ Рыгор Мікалаевіч, н. ў 1900.
ФІЛІПАЎ Яўген Мікалаевіч, н. ў 1906.
ХАХЛОЎ Кірыл Маркавіч, н. ў 1894.
ХРАМЦОЎ Гаўрыла Цімафеевіч, н. ў 1896.
ЦАРЫКАЎ Андрэй Клімавіч, н. ў 1898.
ЦЕЦЕРУКОЎ Максім Макаравіч, н. ў 1899.
ЦІМАФЕЕЎ Гсоргій Пятровіч, н. ў 1899.
ЦІТКОЎ Васіль Кірылавіч, н. ў 1903.
ЦІТОЎ Рыгор Іларыёнавіч, н. ў 1900.
ЧАБОХА Цімафей Іванавіч, н. ў 1893.
ЧЫГІР Сцяпан Міхайлавіч, н. ў 1900.
ШАПІНАЎ Васіль Антонавіч, н. ў 1900.
ШАДРЫНА Марфа Ігнатаўна, н. ў 1898.
ШАНДЗІК Ханон Генухавіч, н. ў 1898.
ШУШКЕВІЧ Вацлаў Вікенцьевіч, н. ў 1897.
ШЫЦІК Міхаіл Паўлавіч, н. ў 1900.
ЮДЗІСОН Ханон Генухавіч, н. ў 1899.

ЮРАЎСКІ Ісак Мендзелевіч, н. ў 1901.
ЯГОРАЎ Нічыпар Лявонавіч, н. ў 1900.
ЯФІМАЎ Панцялей Філіпавіч, н. ў 1898.
Падрыхтавалі: Л.Бурдзіна, Б.Гардзееў.

У рытме першых пяцігодак

За час акупацыі Магілёва інтэрвентамі горад быў разрабаваны і разбураны. З першых дзён вызвалення пачаліся работы па аднаўленні і будаўніцтве прамысловых прадпрыемстваў, жылля, устаноў культурнага і сацыяльна-бытавога прызначэння. Разам з холадам і голадам людзей даймалі хваробы, эпідэміі. Тавары першай неабходнасці прадаваліся па высокіх цэнах. Пайка ў 200 г хлеба магіляўчанам, якія працавалі, выдавалася нерэгулярна. У горадзе панавала транспартная разруха, большасць прадпрыемстваў было спынена з-за адсутнасці сыравіны, паліва і абсталявання, больш як 2 тыс. рабочых былі беспрацоўныя.

Да лета 1921 г. становішча яшчэ больш пагоршылася. Не хапала прадуктаў, з-за адсутнасці грошай месяцамі не выплачвалі зарплату. З-за голаду многія гараджане падаліся ў вёску, іншыя заняліся саматужнымі промысламі. Практычна замёр гандаль, аб чым сведчаць вось такія лічбы: са 139 крам у павеце працавалі толькі 4 у Магілёве. На рынку існаваў просты тавараабмен. Адзін пуд жыта, напрыклад, абменьвалі на 8—9 аршынаў паркалю або на 2—3 фунты цукру, на 18—19 фунтаў солі і інш. Да восені на рынку з'явіліся некаторыя сельгаспрадукты, але па вельмі высокіх цэнах. Можна было набыць пуд бульбы за 15, ячных круп за 120, круп грэцкіх за 200, мукі жытнёвай за 80, пшанічнай за 160, фунт свінога сала за 10, бараніны за 10 тыс. руб. Тое-сёе было і ў крамах, фунт солі каштаваў 4, селядцоў — 10, запалак — 0,5, аршын паркалю — 12 тыс. руб. Такія цэны былі не па кішэні нават гараджанам, якія працавалі. Эканамічныя цяжкасці выклікалі незадаволенасць насельніцтва, што, натуральна, спрабавалі выкарыстаць у сваіх мэтах апазіцыйныя камуністам партыі. Яны заклікалі рабочых і служачых не падтрымліваць бальшавікоў, не галасаваць за іх на выбарах у органы ўлады, лічылі іх няздольнымі вывесці з разрухі і голаду. Адказам улад на гэта было ўзмацненне барацьбы з «контррэвалюцыйнымі вылазкамі». Так, у лютым 1921 г. органамі ЧК была раскрыта варожая савецкай уладзе арганізацыя пад кіраўніцтвам польскіх афіцэраў маёра Равіч-Мыслоўскага і падхарунжага Язерскага. У яе склад уваходзілі асобы дваранскага саслоўя, ксяндзы і некалькі служачых, якія працавалі ў савецкіх установах.

Ва ўмовах эканамічнай нестабільнасці ў горадзе пашырыўся арганізаваны бандытызм. Банды дэзерціраў і крымінальнікаў рабавалі гандлёвыя крамы, прадуктовыя склады, забівалі савецкіх актывістаў. У барацьбе з імі гінулі чэкісты і супрацоўнікі міліцыі. Пра адзін такі выпадак, які адбыўся ў ноч з 20 на 21.12.1921 г. магіляўчанам паведаміла павятовая газета «Соха и молот». Аператыўны камісар павятовай ЧК васемнаццацігадовы А.Хоцін быў пасланы на Лупалава для высвятлення сітуацыі ў адным з дамоў. Там аказалася некалькі падазроных асоб. Зразумеўшы, што аднаму з імі не справіцца, Хоцін вырашыў вярнуцца ў ЧК за дапамогай, але ў цёмным завулку бандыты забілі яго, а цела кінулі ў калодзеж. Толькі ў сярэдзіне 1920-х гадоў бандытызм быў ліквідаваны.

Вялікія надзеі па выхадзе з гаспадарчага тупіка і палітычнага крызісу ўскладаліся на нэп. 17.2.1921 г. павятовая партканферэнцыя ўхваліла сутнасць і мэты нэпа, іх падтрымалі многія прафсаюзныя арганізацыі горада і беспартыйныя на агульнагарадскім сходзе рабочых і служачых, агульным дэпутацкім сходзе. Першыя крокі ажыццяўлення нэпа пачалі даваць свае станоўчыя вынікі. Ажывілася грамадскае і гаспадарчае жыццё, задымелі трубы кацельняў прадпрыемстваў, перададзеных у арэнду прыватным уладальнікам, а тыя, што знаходзіліся ў падпарадкаванні мясцовых і рэспубліканскіх органаў кіравання, атрымалі значныя субсідыі.

У 1922 г. пасля капітальнага рамонту дала ток гарадская электрастанцыя, пачалі выпускаць прадукцыю швейныя і шавецкія майстэрні, цагельны і тарфяны заводы, каўбасны цэх мясакамбіната. У гады аднаўлення народнай гаспадаркі шырокі размах у горадзе набыла работа на суботніках і нядзельніках. У адной са справаздач павятовага камітэта РКП(б) адзначалася, што да сакавіка 1923 г. ў горадзе і на чыгунцы адбылося 5 суботнікаў і нядзельнікаў. У іх прынялі ўдзел 1960 ка-

муністаў і 450 беспартыйных, якія выканалі работы на суму 1,6 млн. руб.

Прыкметны пералом у рабоце прамысловасці горада наступіў у 1923 г. Да канца года было адноўлена каля 70% даваенных вытворчых магутнасцей. Пачалі працаваць тытунёвая і гільзавая фабрыкі, чыгуналіцейны завод «Чырвонае адраджэнне», лесапільны завод, прадпрыемства прыватнага прадпрымальніка Лакерта і маслабойны завод. Актыўна працавала дробная вытворчасць саматужнікаў па 40 відах. Расла зарплата рабочых і служачых. У верасні 1923 г. ў параўнанні з 1921 г. яна вырасла на 40% і склала ў сярэднім 64,4 руб. На спад пайшло і беспрацоўе. На прадпрыемствах мясцовага падпарадкавання было занята 580 рабочых. Ужо ў 1924 г. рост прадукцыйнасці працы пачаў апярэджваць рост заработнай платы. Набіраў сілу кааператыўны рух у гандлёва-збытавой сферы.

3.3.1924 г. Магілёў быў перададзены з РСФСР у БССР, што стварыла спрыяльныя ўмовы для далейшага развіцця горада, для атрымання больш значных сродкаў на капітальнае будаўніцтва, на расшырэнне прамысловай вытворчасці. Рэалізуючы ідэі нэпа, магіляўчане пераважна развівалі лёгкую і харчовую прамысловасць на базе мясцовай сыравіны. Гэта былі дробныя прадпрыемствы, якія працавалі на ўстарэлым абсталяванні. На большасці прадпрыемстваў працавала малая колькасць рабочых. Так на электрастанцыі было 48 чалавек, на абутковай фабрыцы «1 Мая» — 88, металазаводзе — 44, цагельна-бетонным заводзе — каля 83 чалавек. У канцы 1927 г. мукамольны завод «Чырвоная зорка» штодзённа выпускаў 7 тыс. пудоў мукі, працавала на ім 85 чалавек, месячная зарплата якіх складала ў сярэднім 48 руб. Чыгуналіцейны завод «Чырвонае адраджэнне» братоў Маззя ў 1925 г. перайшоў у падпарадкаванне кіраўніцтва гарадскімі прадпрыемствамі пры камунальнай гаспадарцы. У 1926—27 гг. ён быў рэканструяваны. Тут працавала 87 чалавек, якія атрымлівалі ў сярэднім 80 руб. зарплаты. Прадпрыемства выпускала некаторыя часткі для сельгасмашын, вагі, конныя прыводы, абсталяванне для вінакурных заводаў. У далейшым прадпрыемства было перапрафілявана ў металаапрацоўчы завод, але яшчэ доўгі час працавала на старым абсталяванні.

У такой складанай эканамічнай і палітычнай сітуацыі горад знаходзіў магчымасць аказваць дапамогу тым, каму яна была вельмі патрэбна. Працоўныя Магілёва прынялі рашэнне аддаць у фонд дапамогі галадаючым Паволжа 20% заробку, працавалі звышуроч-



Удзельнікі Пленума Магілёўскай акруговай камсамольскай арганізацыі. 1926 г.

на, каб сума дапамогі была больш значнай. Так было сабрана 1,2 млн. руб. Рабочыя аказвалі пасільную дапамогу вёсцы. З вясны 1921 г. яны ўдзельнічалі ў правядзенні Тыдня чырвонага аратага. У вёску выязджалі кавалі, слесары, сталяры, якія рамантавалі сялянскі інвентар, вялі асветную работу. Да лета 1925 г. прамысловыя прадпрыемствы ажыццяўлялі шэфства над 40 вёскамі Магілёўскага павета. Вайна пакінула нявырашанай яшчэ адну праблему — дзіцячую беспрытульнасць. У горадзе быў арганізаваны Камітэт дапамогі дзецям, а з 17.2.1924 г. праведзены Тыдзень дапамогі беспрытульнаму дзіцяці. Пачаўся збор сродкаў па падпісных лістах ад грамадзян, прадпрыемстваў і кааператываў на арганізацыю ў горадзе Дома беспрытульнага дзіцяці і сельскагаспадарчай камуны. Для камуны было выдзелена 64 дзесяціны ворыва, 20 — сенажаці, 9 дзесяцін саду каля в. Дашкаўка. Уладальнікі фермы Цэнтральнага рабочага кааператыва перадалі камунарам частку сельгасінвентару, некалькі галоў буйной рагатай жывёлы. Камуну ўрачыста адкрылі 1 Мая. Членамі яе сталі 50 беспрытульных дзяцей.

Ва ўмовах складанай эканамічнай і палітычнай абстаноўкі пачынала фарміравацца адміністрацыйна-камандная сістэма з жорсткім цэнтралізмам, заснаваным на безагаворачным выкананні рашэнняў вышэйстаячых органаў, пачала абмяжоўвацца ўнутрыпартыйная дэмакратыя.

З уваходам Магілёва ў БССР у 1924 г. паўсталі праблемы нацыянальнага адраджэння з улікам гістарычных традыцый, сацыяльных і этнаграфічных умоў. У якасці раўнапраўных дзяржаўных моў былі прызнаны беларуская, яўрэйская, руская і польская.

Шырокае распаўсюджанне на прадпрыемствах горада ў 1924 г. атрымалі так званыя вытворчыя нарады. Як адзначала ў лістападаўскія дні газета «Звязда», вытворчыя нарады на магілёўскіх заводах увайшлі ў побыт, яны садзейнічаюць рацыяналізатарству, росту прадукцыйнасці працы, больш эфектыўнаму выкарыстанню вытворчых магутнасцей і мясцовых рэсурсаў. Нягледзячы на прыкметныя зрухі, становішча ў прамысловасці заставалася складаным, паўсталі праблемы са збытам прадукцыі, цэны на яе завышаліся і яна асядала на складах. Купляць сыравіну не было за што, зарплата рабочым таксама не выплачвалася. Крыху палегчыла сітуацыю грашовая рэформа. Калі ў 1923 г. на рынках Магілёва пуд жыта каштаваў 40 кап., пуд гатунковага жалеза — 3,4 кап., аршын паркалю — 60 кап., пачак запалак — 16 кап., то ў 1925 г. пуд жыта прадаваўся за 1,3 руб., аршын паркалю — за 32 кап.

У 1925 г. прамысловасць горада дасягнула даваеннага ўзроўню па аб'ёме валавой прадукцыі. Доля дзяржаўнага сектара ў агульным аб'ёме вытворчасці склала 70%, прыватнага — 25%, кааператыўнага — 5%, дзе працавала адпаведна 1379, 648 і 265 рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў. Расла і заработная плата, паляпшаліся ўмовы працы і побыту гараджан. У 1925 г. было пабудавана 140 камунальных кватэр. Рабочым упершыню сталі даваць адпачынкі з захаваннем зарплаты, за лета ў дамах адпачынку пабывала 596 магіляўчан. У 1925 г. гарадскія расходы на сацыяльнае страхаванне павялічыліся ў параўнанні з папярэднім годам на 54 тыс. руб., на ахову здароўя — на 111,8 тыс.

У канцы 1925 г. партыя аб'явіла курс на індустрыялізацыю народнай гаспадаркі. План індустрыялізацыі быў установкай на бясспрэчнае выкананне і правядзенне яго ў жыццё. Ставілася мэта найхутчэй, любымі сродкамі, пераадолець адсталасць у эканоміцы, забяспечыць надзейную абарону краіны, павысіць жыццёвы ўзровень народа. Ідэі нэпа пакрысе адыходзілі на другі план, больш актыўна пачала праводзіцца палітыка выцяснення прыватніка з прамысловасці. Часам яна не знаходзіла падтрымкі ў працоўных калектывах. Так, кіраўніцтва кампаніі «Днепрагандаль», у распараджэнні якога былі піваварны і гарбарны заводы, не згаджалася перадаваць прадпрыемствы ў рабочае кіраванне. Да 1928 г. прыватны капітал быў выцеснены з прамысловасці, валавы аб'ём прадукцыі на прадпрыемствах дзяржаўнага сектара склаў 88,1%, у кааперацыі — 6,2, на прадпрыемствах, што знаходзіліся ў распараджэнні рабочых калектываў, — 5,7%. У Магілёве дзейнічала 21 прадпрыемства.

За гады першай пяцігодкі на развіццё прамысловасці горада было накіравана 38 млн. руб. Галоўным аб'ектам, які быў уведзены ў строй у гэтыя гады, стала фабрыка штучнага шоўку. 1.5.1929 г. 200 дэлегатаў акруговага з'езда Саветаў разам з прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый заклалі першы камень у фундамент фабрыкі. Будаўніцтва ішло ўдарнымі тэмпамі. Навізна справы натхняла людзей. Былі і цяжкасці, звязаныя з недахопам цэглы, цэменту, вопытных спецыялістаў. Пафас камуністычнай працы і энтузіязму лунаў

над будаўнічай пляцоўкай. Рабочыя адмовіліся ад выхадных, працавалі па 10—12 гадзін у суткі. Дапамагалі будоўлі пасланцы Віцебска, Гомеля, іншых гарадоў і сёл рэспублікі. Начальнік будаўніцтва В.І.Вараб'ёў, галоўны інжынер Е.М.Магілёўцаў, рабочыя Вінаградаў, Зак, Богун, Сацін, Шавялёў, Ткачоў і іншыя працавалі творча, з выдумкай, вялі за сабою другіх. Электрык Леанід Шчыт па ўласнай ініцыятыве зманціраваў часовую сілавую ўстаноўку, што вырашыла складаную праблему з недахопам энергіі. Праз год да 1.5.1930 г. была ўведзена ў эксплуатацыю доследная ўстаноўка, а 3 лістапада будаўнічыя работы ў асноўным былі завершаны. 7.11.1930 г. адбыўся ўрачысты пуск фабрыкі. У будаўніцтва прадпрыемства было ўкладзена 19,1 млн. руб. Многія будаўнікі засталіся працаваць на фабрыцы, 700 з іх аб'ядналіся ў дзяржразліковыя брыгады. Да канца 1932 г. на фабрыцы працавала 1942 рабочыя, за год імі было выпушчана прадукцыі на 31,2 млн. руб. У студзені 1934 г. за паспяховае выкананне плана 1933 г., высокую якасць работы і авалоданне тэхнікай Магілёўская фабрыка штучнага шоўку была занесена на Чырвоную дошку імя XVII з'езда партыі.

Партыйнае кіраўніцтва горада рапартавала беларускаму і савецкаму ўраду, што пяцігадовы план выкананы датэрмінова. За гады 1-й пяцігодкі колькасць прадпрыемстваў Магілёва павялічылася з 21 да 38, выпуск валавой прадукцыі на іх вырас з 3,1 млн. руб. у 1927 г. да 87,2 млн. руб. у 1933 г. Сярод буйных прадпрыемстваў адзначаліся трубаліцейны завод імя А.Ф.Мяснікова, які асвоіў выпуск чыгунных водаправодных труб дыяметрам 100—300 мм, швейная фабрыка імя Валадарскага. На базе дробных гарбарных арцелей вырас гарбарны завод імя Сталіна. Спецыялістамі завода былі распрацаваны новыя тэхналагічныя метады апрацоўкі скур, што дазволіла павялічыць тэмпы выпуску сыравіны для вытворчасці абутку. Выкарыстанне сульфітцэлюлознага экстракту ў дубільнай вытворчасці дазволіла скараціць час дублення скур з 14 да 3 сутак. Рабочы-рацыяналізатар Д.Л.Калеснікаў вынайшаў і ўкараніў у вытворчасць шчаціннарвальную машыну. На заводзе працавала 400 чалавек, гадавы аб'ём вытворчасці дасягнуў у канцы 1-й пяцігодкі 5,6 млн. руб.

Расшырыліся магутнасці, павысілася механізацыя вытворчых працэсаў практычна на ўсіх прадпрыемствах горада. Вялікія аб'ёмы прамысловага будаўніцтва патрабавалі нарошчвання выпуску будматэрыялаў. На цагельным заводзе № 1 быў укаранёны новы



Яны будавалі фабрыку штучнага шоўку. 1931 г.



Фабрыка штучнага шоўку. Агульны выгляд. Канец 1930-х гадоў.

абразны станок, конская цяга заменена механізаванай. Гэтыя мерапрыемствы дазволілі павялічыць дзённы выпуск цэглы з 12 да 20 тыс. штук. На цагельным заводзе № 2 за кошт павелічэння сушыльнай плошчы выпрацоўка павялічылася з 18 да 22 тыс. штук цэглы ў дзень. Рэканструкцыя на лесапільным заводзе «Чырвоная зорка» дазволіла павялічыць прапускную здольнасць лесапільных рам у 1,5 раза.

За гады 1-й пяцігодкі Магілёў стаў адным з буйных прамысловых цэнтраў рэспублікі. Насельніцтва горада выросла амаль удвая, у асноўным за кошт вяскоўцаў, што прыехалі ў горад на будаўніцтва прадпрыемстваў, а пасля засталіся працаваць на іх. Гэта патрабавала значнага будаўніцтва аб'ектаў сацыяльна-бытавой сферы. Але сродкі на гэтыя мэты адпускаліся мізэрныя. За пяць гадоў у горадзе было здадзена ў эксплуатацыю толькі 20 тыс. $м^2$ жылля, пабудаваны дзіцячыя яслі на шаўковай фабрыцы, рэканструяваны будынак цэнтральнай амбулаторыі, зроблены капітальны рамонт бальніцы, крыху расшырана пральня.

Гэтыя вынікі адлюстроўвалі і цэнтралізацыю кіравання эканомікай. Выкананне пяцігадовага плана ішло фарсіраванымі тэмпамі, перавага аддавалася росту аб'ёмаў вытворчасці. Каб забяспечыць выкананне высокіх паказчыкаў вытворчасці, планаў партыі, прадпрыемству патрэбна было ўсё больш і больш рабочых рук. У аснове ж працы заставаліся цяжкія фізічныя затраты. Невыкананне тых або іншых заданняў аб'яўлялася падкопамі правых апазіцыянераў і іншых «ворагаў народа», якія быццам толькі і думалі, як нашкодзіць і сарваць планы партыі. Барацьба са шкодніцтвам, безумоўна, праводзілася пры «шырокай падтрымцы» насельніцтва.

Палітыку партыі па калектывізацыі вёскі магіляўчане падтрымалі таксама. Гараджане аб'яўлялі паходы «За ўраджай», камуністы і камсамольцы стваралі ўдарныя брыгады для выезду ў падшэфныя вёскі на дапамогу ў рамонце тэхнікі, зборы попелу, вялі ідэалагічную работу, каб давесці вяскоўцам дырэктывы партыі і ўрада. З лютага 1930 г. Магілёў сустракаў на прывакзальнай плошчы дваццаціпяцітысячнікаў з далёкага волжскага завода «Чырвонае Сормава». У вёскі Магілёўскай акругі накіроўвалася 65 рабочых, у гарадскім тэатры адбыліся ўрачыстыя провады. Пасланцы Расіі абяцалі выканаць заданне партыі па ўздыме сельскай гаспадаркі, правядзенні паспяховай калектывізацыі. Не адставалі ад іх і магіляўчане. На пастаянную работу ў вёску Магілёўская гарадская партарганізацыя накіравала 190 камуністаў. У ходзе ўборачнай кампаніі 1930 г. гараджане адпрацавалі ў калгасах акругі каля 700 тыс. чалавека-дзён, сфарміравалі і накіравалі ў вёскі 250 брыгад.

Пад лозунгамі барацьбы за выкананне і перавыкананне планаў партыі прайшлі і гады 2-й пяцігодкі. У 1934 г. ўсе прадпрыемствы горада былі ахоплены сацыялістычным спаборніцтвам. 15 лістапада кіраўніцтва горада рапартавала ўраду аб датэрміновым выкананні прамфінплана. Да канца года было выпу-



Будаўнікі і эксплуатацыйнікі фабрыкі штучнага шоўку ў прадзільным корпусе. 1934 г.

шчана прадукцыі звыш задання на 7 млн. руб. Галоўнай будоўляй 2-й пяцігодкі стаў аўтарамонтны завод. 9.7.1935 г. ён быў уведзены ў дзеянне на 4 месяцы раней установленага тэрміну. Узначаліў завод былы камандзір Дняпроўскай ваеннай флатыліі А.В.Панамароў. У 1937 г. ўступіў у строй косцеперапрацоўчы (клеявы) завод, які пачаў выпускаць клей, касцявую муку і азотныя ўгнаенні. Да канца пяцігодкі былі расшыраны магутнасці ўжо дзеючых прадпрыемстваў. На кандытарскай фабрыцы, трубаліцейным і металаапрацоўчым заводах быў асвоены выпуск новых відаў прадукцыі, у т.л. электраматораў, ліставога жалеза. З кааператыва, які аб'ядноўваў бляхароў, шаўцоў, краўцоў, вылучыліся ўзбуйненыя арцелі «20 год Кастрычніку», імя Крупскай, «Металахім». Павялічыўся асартымент тавараў народнага ўжытку на буйных прадпрыемствах. Гарбарны завод наладзіў выпуск тавараў каляровай галантарэі, швейная фабрыка імя Валадарскага асвоіла вытворчасць коўдраў, дзіцячага адзення, галаўных убораў, мэблевая — тумбачак, вешалак, аўтарамонтны завод — бытавых інструментаў, вучэбных дапаможнікаў, трубаліцейны — жаровень, бітонаў, вёдзер і інш.

У 1938 г. ў горадзе дзейнічалі 53 прадпрыемствы саюзнага, рэспубліканскага і мясцовага падпарадкавання, дзе працавала 14 109 чалавек. Паколькі ў аснове развіцця прамысловасці ляжалі па-ранейшаму экстэнсіўныя метады, расла і колькасць занятых у прамысловасці: у параўнанні з 1928 г. яна вырасла ў 4 разы. У горадзе было ліквідавана яўнае беспрацоўе. Сталі расці фонды сацыяльнага страхавання, заработная плата. Але давалася ўсё гэта цяжкай і напружанай працай. Для павышэння яе прадукцыйнасці шырока выкарыстоўваліся ідэалагічныя метады і працоўны энтузіязм: сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва, стаханаўскі рух і інш. Ударніцтвам і стаханаўскім рухам былі ахоплены многія прадпрыемствы. У пачатку 1936 г. было 1590 стаханаўцаў, ці 21% ад усіх працуючых. Праз год гэта лічба складала ўжо 39,8%, а ў першы год 3-й пяцігодкі за права звацца стаханаўцамі змагалася 89,3% рабочых. Вядома, што было тут шмат паказухі, казёншчыны і фармалізму, аднак былі і прыклады працоўнай кемлівасці, рацыяналізатарства і нават гераізму. Прадзільшчык шаўковай фабрыкі Камароў перайшоў на абслугоўванне трох машын і выконваў нормы выпрацоўкі на 200—215%. Маталышчыцы фабрыкі Новікава, Шумская, Шувалава за змену намотвалі па 900 і больш бабін шоўку замест 700 па норме. Прыклады ўзорнай працы паказвалі камсамольцы-наватары Майсей Сярэбраны і Аляксей Наважонаў. Усё гэты сведчыла аб тым, што на фабрыцы была добра арганізавана тэхнічная вучоба. Многія рабочыя, якія асвоілі тэхніку і тэхналагічныя працэсы вытворчасці, былі назначаны кіраўнікамі на адказныя ўчасткі работы. На трубаліцейным заводзе, напрыклад, начальнікамі змен сталі стаханаўцы А.П.Батурын, Ц.В.Драздоў, Р.Р.Германовіч, майстрамі змен А.С.Бачкоў, П.М.Вішнякоў, узначаліла брыгаду М.К.Чуйко. У паравозным дэпо сваёй працай

вызначыўся машыніст Альберт Грушніцкі, ён узначаліў стаханаўскі рух, за высокія паказчыкі быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. На аўтарамонтным заводзе працавала 7 ударных маладзёжных брыгад. Маладыя рабочыя Нязнанскі, Рыбакоў, Кубанаў, Фёдараў выконвалі нормы выпрацоўкі на 250—300%, інжынер Бутэнка ў асабісты час падрыхтаваў каля 100 шафёраў-аматараў.

Вялікія планы па развіцці эканомікі і сацыяльнай сферы намячаліся на 3-ю пяцігодку. Па ініцыятыве прафсаюзаў былі перагледжаны ўстарэлыя нормы выпрацоўкі, зменены расцэнкі, прыняты меры па павышэнні тэхнічных ведаў рабочых і служачых. Практычна на ўсіх фабрыках і заводах працавалі вытворча-тэхнічныя гурткі, цэхавыя школы па навучанні і здачы тэхмінімуму, былі створаны ўмовы для завочнага навучання ў тэхнікумах і інстытутах. Дзякуючы гэтым мерапрыемствам значна ўзрасла прадукцыйнасць працы. За 1934—39 гг. на трубаліцейным заводзе яна павялічылася ў 2,3 раза, на заводзе імя Дзімітрава — у 2,1, на швейнай фабрыцы — у 1,4, на гарбарным заводзе — у 1,7 раза.

Бурна праходзіла ў даваенныя гады і палітычнае жыццё горада. Усе мерапрыемствы праводзіліся з вялікім уздымам і ідэалагічным пафасам. На сходах працоўныя абмяркоўвалі праект новай Канстытуцыі СССР, уносілі свае заўвагі і прапановы. 39 магіляўчан былі ўдастоены ўрадавых узнагарод у сувязі з 20-годдзем утварэння БССР. Ганаровыя граматы атрымалі Р.І.Іваноў, Л.Ф.Гінзбург, Ф.М.Фёдараў, С.Т.Каланіцкі, Р.Ф.Андрэеўскі, М.А.Хазанаў і інш.

Адной з формаў грамадскага прызнання аўтарытэту і заслуг лепшых людзей горада было вылучэнне іх кандыдатамі ў дэпутаты Саветаў розных узроўняў. 12.12.1937 г. ў Вярхоўны Савет СССР былі выбраны намеснік дырэктара гарбарнага завода А.І.Іваноў і рабочая шаўковай фабрыкі Н.П.Лісунова. На выбарах у Вярхоўны Савет БССР 26.6.1938 г. магіляўчане прагаласавалі за машыніста дэпо станцыі Магілёў Х.А.Качмарова, рабочую швейнай фабрыкі А.І.Акулёнак, дырэктара шаўковай фабрыкі М.Н.Шэвелева, сакратара гаркома ЛКСМБ І.І.Сакалова, сакратара гаркома КП(б)Б Р.Я.Шуба. У абласны Савет 24.12.1939 г. выбралі старшыню гарвыканкома Д.І.Астрова, слесара аўтарамонтнага завода Г.І.Іванова, машыніста дэпо станцыі Магілёў М.А.Гарбузова і інш.

У канцы 1930-х гадоў абвастрылася міжнародная абстаноўка. Кіраўніцтва краіны прымала меры па павышэнні мабілізацыйнай гатоўнасці краіны, узмацненні дысцыпліны і парадку. На прадпрыемствах устанаўліваліся абавязковыя нормы выпрацоўкі, ужываліся рэпрэсіўныя меры за разгільдзяйства, прагулы, спазненні. Многія прамысловыя прадпрыемствы перайшлі на выпуск прадукцыі ваеннага прызначэння. Так аўтарамонтны завод стаў авіярамонтным, металаапрацоўчы — авіяцыйным. Ваенныя заказы выконвалі і іншыя прадпрыемствы. Горад умацоўваў сувязі з Чырвонай Арміяй, на больш высокі ўзровень была ўзнята работа спартыўных і абарончых арганізацый, якія рыхтавалі моладзь да абароны Айчыны.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці і складанасці даваеннага часу, магіляўчане паспелі зрабіць многае. 15.1.1938 г. Магілёў набыў новы статус — стаў цэнтрам вобласці. За перыяд з 1926 г. да 1941 г. падвоілася насельніцтва горада, яно складала больш за 100 тыс. чалавек. Гэта патрабавала значных укладанняў у інфраструктуру горада. За 12 км ад цэнтра па Віцебскай шашы вырас рабочы пасёлак аўтарамонтнага завода. Побач з жылымі дамамі размясціліся магазіны, школы, дзіцячыя сады і яслі, Палац культуры. Больш прыгожымі сталі вуліцы і плошчы горада, узводзіліся масты і пераходы праз яры і рэкі, ствараліся новыя архітэктурныя ансамблі. Многія з гэтых мерапрыемстваў праводзіліся бяздумна і безадказна. У той час былі знішчаны некаторыя помнікі архітэктуры — будынкі калегіума езуітаў, Іосіфаўскі сабор і Пакроўская царква.

З абвастрэннем міжнароднага становішча 19.4.1938 г. СНК СССР і ЦК ВКП(б) прынялі пастанову аб пераводзе сталіцы БССР з Мінска ў Магілёў. Вядучыя архітэктары рэспублікі распрацавалі праект рэканструкцыі горада. Планавалася за 10—15 гадоў ператварыць горад у буйны індустрыяльны і культурны цэнтр. На ажыццяўленне гэтага праекта было выдзелена 42,3 млн. руб. За кароткія тэрміны ў цэнтры горада ўзведзены Дом Саветаў, 66-кватэрны жылы дом, будынак сучаснага машынабудаўнічага інстытута, гасцініца «Дняпро», завершана будаўніцтва кінатэатра «Радзіма». З уз'яднаннем Заходняй Беларусі з БССР адпала неабходнасць пераносу сталіцы ў Магілёў і работы па рэкан-

струкцыі горада былі практычна спынены. Але зроблена было ўжо нямала. Да пачатку вайны ў горадзе вырашана пытанне водазабеспячэння, па галоўнай магістралі, вуліцы Першамайскай, пайшлі першыя аўтобусы, расшырылася сетка медыцынскіх устаноў. У 1940 г. — 4 бальніцы на 1345 ложкаў, 9 дзіцячых кансультацый, амбулаторый і паліклінік, Дом дзіцяці, 3 дыспансеры, станцыя хуткай медыцынскай дапамогі, працавала 188 урачоў, 67 фельчараў, 28 акушэрак і 307 медсясцёр (у 1924 г. было толькі 11 урачоў і 14 акушэрак на ўвесь Магілёўскі павет). Значнае развіццё атрымаў спорт. У канцы 1930-х гадоў створаны фізкультурна-спартыўныя таварыствы «Дынама», «Спартак» і ДСТ «Лакаматыў», дзе займалася больш за 10 тыс. магіляўчан.

На пачатак 1941 г. ў Магілёве працавалі 22 сярэднія школы, дзе навучалася каля 15 тыс. дзяцей. Больш за 1000 чалавек займаліся ў 4 сярэдніх спецыяльных навучальных установах — культурна-асветным і музычным вучылішчах, медыцынскім і педагагічным тэхнікумах. У 1930 г. быў адноўлены педагагічны інстытут (раней называўся Інстытут народнай адукацыі). У 1937 г. на базе Магілёўскай музычнай школы імя Рымскага-Корсакава заснавана музычнае вучылішча імя Рымскага-Корсакава. Тут працавалі фартэпіяннае, вакальнае, струннае, духавых інструментаў і інструктарскае аддзяленні, выкладалі высокакваліфікаваныя педагогі Л.І.Юшкевіч, А.Ф.Яўстратаў, І.Г.Каранеўская, А.Ф.Боркус. Першы выпуск спецыялістаў у 1941 г. не адбыўся — пачалася вайна.

У Магілёве працягвалі адукацыю і пачыналі шлях у літаратуру Сяргей Фамін, Кастусь Губарэвіч, Леанід Юркевіч (псеўданім — Юрка Лявонны). Іх творы друкаваліся ў часопісах «Полымя», «Маладняк», у газетах «Магілёўскі селянін», «Соха и молот», «Камунар Магілёўшчыны». У 1923 г. маладыя літаратары стварылі акруговае літаб'яднанне — Магілёўскую філію «Маладняка». У філію ўваходзілі 24 паэты і празаікі. У лістападзе 1928 г. ў сувязі з рэарганізацыяй «Маладняка» яна была пераўтворана ў філію Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў, якая ўжо праз год выдала альманах «Ранне». У 1939 г. ўзнікла літаб'яднанне «Прыдняпроўе», якое ўзначаліў выкладчык пединстытута І.В.Гутараў. Касцяк аб'яднання склалі студэнты пединстытута. Літаратары праводзілі значную культурна-асветную работу, арганізоўвалі літаратурна-музычныя вечары, сустрэчы з чытачамі, вучобу творчай моладзі.

Пастаяннай тэатральнай трупы ў Магілёве не было, але горад наведвалі з гастролямі тэатры рэспублікі. Працавала з перапынкамі Руская перасоўная трупа, на базе якой у 1932 г. створаны Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР. У 1935—41 гг. ён працаваў у Магілёве. Былі створаны і паспяхова дзейнічалі народныя тэатры Палацаў культуры аўтарамонтнага завода і чыгуначнікаў. У перадваенныя гады ў горадзе дзейнічала 12 клубаў, 2 кінатэатры, 13 бібліятэк, краязнаўчы музей і яго філіялы — музей гісторыі і атэізму, мемарыяльны музей Р.К.Арджанікідзе.

У 1930-я гады Савецкі Саюз рабіў першыя крокі ў асваенні Паўночнага марскога шляху. Магіляўчане ганарацца, што сярод першаадкрывальнікаў Поўначы ёсць і іх землякі — сусветна вядомы вучоны О.Ю.Шміт і ўдзельнік дрэйфу на караблі «Георгій Сядоў» І.М.Нядзвецкі.

Безумоўна, 20-я і 30-я гады былі росквітам у жыцці Магілёва: развівалася эканоміка, пэўных поспехаў дасягнулі асвета, культура, ахова здароўя. Але гэтыя гады былі і вельмі трагічнымі. Сотні лепшых прадстаўнікоў народа сталі ахвярамі беззаконнасці, былі загублены ў ходзе масавых рэпрэсій. Ваяўнічы атэізм быў важным кірункам у рабоце камсамола. У розны час былі зачынены Барыса-Глебская, Пакроўская і Лупалаўская цэрквы, 2 сінагогі. Палітыка беларусізацыі, пачатая ў 20-я гады, завяршылася ў 30-я гады барацьбой з «нацдэмаўшчынай». У горадзе было арыштавана і засуджана больш за 30 прадстаўнікоў інтэлігенцыі, сярод іх настаўнікі школ, выкладчыкі навучальных устаноў, літаратары, журналісты, работнікі навуковых і культурных устаноў.

І ўсё ж магіляўчане жылі надзеямі на лепшае. Хваляванні і трывогі ў паўсядзённыя клопаты ўнеслі савецка-фінляндская вайна, ваенныя канфлікты на возеры Хасан і рацэ Халхін-Гол. У гэтых баях загінула больш за 20 магіляўчан. Ля заходніх межаў рэспублікі разгараўся пажар 2-й сусветнай вайны. Не хацелася ў гэта верыць, але было зразумела, што вайны не пазбегнуць.

А.Косцераў.

Горад майго дзяцінства

З успамінаў М.Гардзіна, старэйшага жыхара Магілёва

Бацькі прывезлі мяне ў Магілёў зусім маленькім у пачатку 1920-х гадоў. Тут і прайшло ўсё маё жыццё. Горад тады ўяўляўся мне вялізнай вёскай з шматлікімі вуліцамі і завулкамі, у якіх можна было заблудзіцца. Гэтыя вуліцы і завулкі былі забудаваны ў асноўным драўлянымі дамамі. Небаскробам выглядаў чатырохпавярховы цагляны дом Самоўскага, што ўзвышаўся на рагу Дняпроўскага бульвара і Афіцэрскай вуліцы (цяпер вуліцы Першамайская і Міронава). Дзесьці ў 60-я гады яго знеслі.

Асноўным відам гарадскога пасажырскага транспарту быў гужавы. Лёгкія рамізнікі, у асноўным, працавалі на маршруце чыгуначны вакзал — плошча каля тэатра. Грузавымі перавозкамі займаліся так званыя ламавыя рамізнікі, ці «балаголы», як іх называлі гараджане. Дажывала свой век і «конка», што цягнулася ад вала да вакзала. Крыху пазней па гэтым маршруце пусцілі аўтобус, малаўмяшчальны, але для гараджан гэта быў цуд, яны натоўпам выходзілі паглядзець на аўтобус. У горадзе была толькі адна гасцініца. Яна стаяла амаль побач з Васкрасенскай царквой. Пазней у будынку гасцініцы размясціўся аблваенкамат, а ў 60-я гады яе знеслі, хоць магла яшчэ доўга служыць людзям. Толькі ў лічаных дамах былі каналізацыя, водаправод і паравое ацяпленне. Задняпроўе — Лупалава, таксама забудаванае драўлянымі дамамі, было звязана з горадам драўляным мостам.

Магілёў славіўся садамі. Добра памятаю кірмашы, дзе крамы былі поўныя садавіны і рознай сельгаспрадукцыі. У горадзе працавалі тры базары: Сянны (цяпер плошча Леніна), Шклоўскі (цяпер Камсамольскі сквер) і Быхаўскі. Тут можна было набыць літаральна ўсё неабходнае для жыцця: жывёлу, сена, дровы, салому, мяса, яйкі ды ўсё, што душы пажадана. У дамах, якія абкружалі базары, размяшчаліся ў асноўным яўрэйскія крамы, дзе прадаваліся прамысловыя тавары — ад іголкі да адзення.

З аб'ектаў культурнага прызначэння мне помніцца кінатэатр «Чары», дзе амаль кожны дзень ішлі нямыя фільмы пад акампанемент трыо музыкантаў (скрыпача, віяланчэліста і піяніста). Многія гараджане хадзілі ў тэатр, калі прыязджалі на гастролі артысты з Масквы, Петраграда і іншых гарадоў. Сваіх артыстаў у нас не было. Недзе ў сярэдзіне 20-х гадоў у рабочых клубах сталі паяўляцца кінаўстаноўкі. На іх сцэнах нярэдка выступаў аркестр навучэнцаў музычнай школы. Радыё ў жылых дамах не было. Толькі ў 1926—27 гг. сталі ўстанаўліваццa рэпрадуктары ў клубах, але паслухаць радыё можна было толькі па білетах, якія выдаваліся актывістам — грамадскім работнікам і перадавікам вытворчасці. Праўда, некаторыя ўмельцы канструявалі свае дэтэктарныя прыёмнікі, але чутнасць у іх была дрэнная, ды і настроіцца на хвалю можна было толькі вечарам або ноччу.

Вось такім быў наш Магілёў у першай палавіне 20-х гадоў і так жылі магіляўчане.

Газеты паведамлялі...

ПА СТАРОНКАХ ГАЗЕТЫ «СОХА И МОЛОТ» ЗА 1921 г.

27 лютага

ГОРОД РАЗДВИГАЕТ ГРАНИЦЫ

На заседании городского исполкома 21 февраля был заслушан доклад о включении в черту города некоторых деревень Полыковичской, Княжицкой и Вейнянской волостей ввиду их тесной связи с городом. На заседание явились представители означенных деревень и приняли участие в обсуждении вопроса. При этом выяснилось, что жители деревень стремятся остаться вне границ города.

Заслушав мнение делегатов и обсудив вопрос, исполком постановил включить в черту города хутора Половинный Лог, земли около Святого озера, Броды, Холмы, 1-ю Тишовку, 2-й

совхоз «Краснополье» и Машековку. Остальные деревни: Малый Печерск, Карабановку, Затишье, Горки, хутор Городищана оставить в черте уезда.

8 сакавіка

ОТ КОМЕНДАНТА МОГИЛЕВА

Мною замечено, что многие из лиц, занимающих ответственные посты, будучи задержаны в городе после 24 часов без установленных пропусков, позволили себе предъявить требования как патрульным, так дежурным по гарнизону и управлению о немедленном освобождении, угрожая при этом в случае неисполнения их требований, арестом и т.п. мерами.

Предупреждаю, что подобные явления будут преследоваться мною в корне и виновные будут отданы под суд в строгости революционного закона в условиях военного времени за нарушение порядка и дисциплины.

27 сакавіка

БОЛЬШЕ ВНИМАНИЯ ПРОПАГАНДЕ ЗДОРОВОГО БЫТА

В марте лекционная пропаганда, начатая осенью прошлого года санэпидемиологическим подотделом Могилевского горздрава проходит слабее, чем прежде. Причины — отсутствие достаточных лекционных сил, подходящих аудиторий и во многом индеферентизм со стороны рабочих, особенно в тех случаях, когда аудиториями служат фабрики, заводы и иные предприятия.

В марте было проведено несколько лекций народной аудитории при клубе «Коммунар». Врач Копаневич прочитал две лекции «Алкоголь и его вред» и «Венерические заболевания». Две лекции прочитал и врач Меркин на конференции делегаток женотдела «Проституция и меры борьбы с ней» и на конференции делегатов народного питания «Санитария и гигиена в общественных столовых».

НАКАЗАНИЕ ЗА ТРУДДЕЗЕРТИРСТВО

Сотрудники ЕПО (еврейский подотдел уездного отдела народного образования) в числе 16 человек (Репкин, Локшин, Гуревич и др.) за отказ от работы по очистке улиц подвергнуты аресту с несением служебных обязанностей на 5 суток каждый.

Председатель по очистке улиц Овчинников.

15 красавіка

БУДЕТ НОВЫЙ СКВЕР

Президиум Могилевского исполкома на заседании 12 апреля, приняв во внимание, что Шкловский базар вследствие расположения его в центре, является очагом заразы, постановляет базар закрыть, поручить коммунотделу снести все постройки и к 1 мая с.г. оборудовать сквер.

19 кастрычніка

ОБЪЯВЛЕНИЕ

В воскресенье 20 ноября в 12 часов дня в Комклубе состоится «Утро книги». Будет разобрана новая книга Троцкого «Новый этюд». Ввиду громадного интереса, представляющего эту книгу, желательно присутствие всех членов партии.

Агитпром.

ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ

Я сын бедняка-селяніна. Атрымаў адукацыю настаўніка. 6 год настаўнічаў. У 1913 г. стаў папом. Робячы гэта, я думаў шырока весці асветніцкую работу сярод сялян, аднак глыбока памыляўся. За ўвесь час сана папа я паступова пераканаўся, што рэлігія дурманіць людзей. Яна ўказвае шлях не да святла, а наадварот, да цемры і ашуканства.

Усвядоміўшы ўсё гэта, я далей папом быць не магу. Я не контррэвалюцыянер і не сын буржуяў і не хачу стаяць на шляху няпраўды. Скідваю сан папа і парываю ўсялякую сувязь з царкоўнай іерархіяй.

Былы свяшчэннік Ігнат Аўчыннікаў.

ПА СТАРОНКАХ ГАЗЕТЫ «МАГІЛЁЎСКІ СЕЛЯНІН»

19 студзеня 1927 г.

НАС СТАЛА БОЛЬШ

Па перапісе 1926 года ў Магілёве пражывала 50 219 чалавек, у тым ліку 25 614 мужчын і 24 605 жанчын. У акрузе налічвалася амаль 531 тыс. жыхароў, сярод якіх сельскае насельніцтва склала 450,5 тыс., гарадское — 80,4 тыс.

22 лютага 1927 г.

КОНКУРС ГАРМАНІСТАЎ

13—14 лютага ў Магілёве адбыўся конкурс гарманістаў. У конкурсе прыняло ўдзел 38 музыкантаў з раёнаў і гарадоў акругі. Для пераможцаў прызначаліся 3 прэміі і 3 ганаровыя граматы. У ходзе конкурсу яго ўдзельнікі не толькі паказалі сваё ўменне і майстэрства ігры, але і слухалі даклады, гутаркі па тэорыі музыкі і развіццю народных інструментаў. Першае месца ў конкурсе заваяваў гарманіст Панамараў.

16 чэрвеня 1927 г.

НОВЫ ЛЕТНІ ТЭАТР

У Магілёве ў садзе (на валу) закончана будаўніцтва летняга тэатра. Існуючы стары будынак абваліўся ў выніку натуральнага зносу. Новы тэатр, кошт якога абышоўся ў 17—18 тыс. руб. мае залу ўмяшчальнасцю 900 месц, добрую акустыку. Першыя гастролі адбудуцца ў тэатры з удзелам украінскай трупы. Кошт месца ў партэры 30—40 капеек.

11 верасня 1927 г.

ЦЭНЫ НА РЫНКУ

На 1 верасня цэны на магілёўскім рынку (за 1 кг): мука жытняя — 9,4 капейкі, жытні печаны хлеб — 11,25 кап., пшанічны хлеб — 30, крупы (пшано або грэчка) — 24, сала свіное — 1 рубель 50 кап., масла сметанковае — 2 рублі, свініна — 83 кап., астраханскія селядцы — 57 капеек.

3 студзеня 1929 г.

СВЯТУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Свята 10-годдзя ўтварэння БССР адзначана ў Магілёве канкрэтнымі дасягненнямі. Адбылася закладка чыгуначнага моста цераз Дняпро. Цэрабкаап адчыніў механічную каўбасную майстэрню, а таксама некалькі гандлёвых лавак і магазін. Пры дзяржаўным музеі абсталявана выстаўка, прысвечаная юбілейнай даце.

15 сакавіка 1929 г.

НА СУСТРЭЧУ З МАРАКАМІ

Гарадская камсамольская арганізацыя вядзе шырокую кампанію па збору сродкаў для паездкі дэлегацыі на падшэфны лінкор «Парыжская камуна». Мяркуецца ўключыць у састаў дэлегацыі 20 лепшых камсамольцаў горада для сустрэчы з экіпажам судна, купіць падарункі для маракоў на суму 200 рублёў.

22 сакавіка 1929 г.

АБ'ЯВА

Магілёўскай акруговай біржы на 22 сакавіка патрабаваліся рабочыя наступных кваліфікацый: малатабойцаў — 4, сартавальнікаў скур — 2, каўбаснікаў — 3, сталяроў — 20, чорнарабочых: жанчын і мужчын адпаведна 15 і 12 чалавек.

ІМ НЯМА МЕСЦА СЯРОД НАС

Днямі адбыўся агульны сход рабочых і служачых працоўных калектываў абутнікоў і шорнікаў, на якім абмяркоўвалася пытанне аб паводзінах рабочых Юдзіна і Фрэйдзіна. Высветлілася, што яны выключаны з камсамола за ўдзел у трацкісцкай апазіцыі. У час работы яны займаліся контррэвалюцыйнай дзейнасцю, падрывалі працоўную дысцыпліну, перашкаджалі культасветрабоце. Агульны сход асудзіў іх дзейнасць як шкодніцкую ў сацыялістычнай вытворчасці і пастанавіў зняць іх з работы і выключыць з прафсаюза.

3 красавіка 1929 г.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ВЫБІРКАМА

У ходзе выбараў у гарсавет у яго саставе рабочыя складаюць 51,4% агульнай колькасці дэпутатаў. Колькасць камуністаў і камсамольцаў склала адпаведна 50,9 і 6,1%, жанчын — 18,5%.

ПА СТАРОНКАХ ГАЗЕТЫ «КАМУНАР МАГІЛЁЎШЧЫНЫ»

4 снежня 1929 г.

...На будаўніцтве ф-кі штучнага валакна працуе 1136 рабочых. Вельмі недастаткова кваліфікаваных рабочых і інжынераў. Усяго на будаўніцтве 2 інжынеры і 2 тэхнікі.

***

Характэрным паказчыкам бурнага росту шавецкай прамысловасці ў Магілёве сведчаць лічбы: у чэрвені месяцы налічвалася ў Магілёве ўсяго 84 швачкі, на сённяшні дзень маем ужо 600 чалавек, выпрацоўка ў тым жа месяцы састаўляла 1238 паліто, а зараз — 20 880.

5 мая 1939 г.

ЗАБОТА О ТРУДЯЩИХСЯ

Администрация, общественные организации авторемзавода им. Кирова постоянно заботятся об отдыхе трудящихся. Среди тех, кто получил путевки на курорты Геленджик, Сочи, Сухуми рабочие-стахановцы Астанов, Кленков, Иванов, Бугаев. Около 150 рабочих проведут свой отпуск в Доме отдыха. На организацию летней детской оздоровительной компании завком и дирекция завода выделили 19,5 тыс. рублей. В пионерские лагеря получено 40 путевок, 10 детей поправят здоровье в детском санатории, силами заводчан создана детская площадка на 70 малышей.

20 мая 1939 г.

МОЛОДЕЖЬ — НА САМОЛЕТ

С 1935 года в Могилеве работает авиационно-спортивный клуб. Ежедневно здесь проводятся занятия, под руководством опытных пилотов совершаются учебные полеты. Среди будущих летчиков — 96% комсомольцев. Огромное трудолюбие при овладении профессией сильных и смелых проявляют рабочие машиностроительного завода им. Димитрова Семен Журов и многие другие комсомольцы города, в том числе девушки — Вера Борыс, Вера Ковалева и др.

КОМСОМОЛ НА СТРОЙКАХ МОГИЛЕВА

Сотни комсомольцев трудятся на стройках города каменщиками, бетонщиками, штукатурами, шоферами, показывают примеры стахановской работы и овладения техникой.

Каменщик 4-го стройучастка Болотов выполняет нормы на 300%. Авторитетом и уважением пользуются у товарищей по работе комсомольцы участка Кожемякин, Кушнеров. Ударно трудится комсомольская бригада подсобных рабочих в составе т.т. Ярошенко, Волкова, Романова, Яскевича. Недавно лучшие комсомольцы-строители были премированы билетами на просмотр в театре пьесы «Годы испытаний»...

М.Зимянин.

15 чэрвеня 1939 г.

НОВЫЙ ОТРЯД УЧИТЕЛЕЙ

Днями в пединституте состоялся выпуск нового отряда учителей для школ области. Среди выпускников немало ребят, отлично окончивших исторический, литературный, географический факультеты. В течение всей учебы Антон Ломако прилежно изучал исторические дисциплины и получил высокие оценки. Инна Гусарова, обучавшаяся на литфаке, была постоянной участницей республиканских и областных олимпиад по художественному чтению. Петя Лярский, выпускник геофака, в этом году выезжает с экспедицией на Северный полюс.

З ПАСТАНОВЫ СНК БССР І ЦК КП(б)Б АБ ГАРАДСКІМ БУДАЎНІЦТВЕ Ў МАГІЛЁВЕ Ў СУВЯЗІ З ПЕРАВОДАМ СТАЛІЦЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

19 красавіка 1938 г.

I. По административному и жилищно-коммунальному строительству.

1. Отпустить в 1938 г. на административное и жилищно-коммунальное строительство в г. Могилеве из резервного фонда СНК СССР 19,27 млн. рублей, за счет утвержденного лимита Белорусской ССР — 1,66 млн. рублей. Всего 20,93 млн. руб.

2. Обязать Совнарком Белорусской ССР:

а) приступить в 1938 г. к строительству Дома Правительства, общей стоимостью на свыше 8,0 млн. руб. с окончанием его в первом полугодии 1939 г.

б) начать строительство жилого дома стоимостью 3,25 млн. рублей с окончанием строительства в 1-м полугодии 1939 г.

в) построить в 1938 г. 50-квартирный дом, два 24-квартирных, 20 восьмиквартирных и произвести надстройку жилых домов на 4,4 тыс. кв. метров с затратами перечисленного 3,5 млн. руб.

г) приступить к строительству гостиницы на 12 номеров общей стоимостью не свыше 3,5 млн. руб.

д) произвести расширение водопровода до 6 тыс. куб. м. подачи воды в сутки.

е) начать в 1938 г. сооружение городской канализации с вводом в эксплуатацию в 1939 г.

ж) построить в 1938 г. баню на 100 мест с объемом работ 550 тыс. руб.

3. Разрешить СНК БССР израсходовать в 1938 г. по республиканскому бюджету 2,5 млн. руб. на работы по замощению улиц города.

4. Установить размер строительства НКВД в 9 млн. руб.

II. По просвещению и искусству.

6. Отпустить в 1938 г. на культурное строительство по городу из резервного фонда СНК СССР и за счет лимита БССР ... 4,45 млн. руб.

7. Обязать СНК БССР:

а) построить в 1938 г. 2 школы на 1280 мест и один детсад на 125 мест.

б) начать строительство городской библиотеки стоимостью 1,5 млн. руб.

в) произвести ремонт театра с затратами на эти цели на 150 тыс. руб.

д) начать в 1938 г. строительство кинотеатра на 700 мест общей стоимостью 1—2 млн. руб.

III. По здравоохранению.

8. Отпустить в 1938 г. на строительство учреждений здравоохранения в городе... 2,41 млн. руб.

9. Обязать СНК БССР:

а) приступить к строительству новой городской больницы на 200 коек с вводом в эксплуатацию в 1939 г.

б) построить в 1938 г. поликлинику, роддом на 35 коек и детские ясли на 60 коек.

IV. По торговле.

10. Выделить на строительство торговой сети и общественного питания в г. Могилеве 1,5 млн. руб.

V. По строительству индустрии.

11. Выделить в 1938 г. СНК БССР для Могилевстроя 3 млн. руб. на приобретение стройнадзора и достройку общежитий для строительных рабочих.

12. Обязать СНК БССР разработать и представить в СНК СССР к 20 апреля 1938 г. схему планирования г. Могилева.

(подписи)

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобл., ф. 33987, воп. 3, спр. 1048.

Вернутыя імёны

Трагічныя старонкі ў летапіс Магілёва ўпісалі палітычныя рэпрэсіі. «Здраднікі», «ворагі народа», «шкоднікі», «шпіёны» — такія ярлыкі атрымлівалі не толькі многія прадстаўнікі інтэлігенцыі, але і простыя, часам малапісьменныя людзі. Мірныя, сумленныя людзі страчвалі не толькі свабоду, а часта і жыццё. Многія з іх пасля былі рэабілітаваны, але застаецца яшчэ нямала і такіх, чый лёс неабходна высветліць.

Чорнай старонкай у жыцці беларускай інтэлігенцыі назаўсёды застануцца 1930-я гады — барацьба з так званай нацдэмаўшчынай. Слова «нацдэм» было амаль сінонімам слоў «контррэвалюцыянер». У спісе ахвяр рэпрэсій сустракаюцца прозвішчы настаўнікаў гарадскіх школ, выкладчыкаў пединстытута і вучылішчаў.

У лістападзе—снежні 1936 г. органамі НКУС былі арыштаваны выкладчыкі Магілёўскага пединстытута Прудніка Павел Рыгоравіч, выконваючы абавязкі дацэнта, Чудовіч Валянцін Уладзіміравіч, выкладчык беларускай мовы, Васілеўскі Даніла Мінавіч, выкладчык. Усе яны абвінавачваліся ў прыналежнасці да контррэвалюцыйнай групы і ў тым, што «працягвалі контррэвалюцыйную нацдэмаўскую кантрабанду ў працэс выкладання», ідэалізавалі контррэвалюцыянера Смоліча, яго нацдэмаўскія падручнікі, «выхоўвалі студэнтаў у контррэвалюцыйным духу». На папярэднім дазнанні ўсе яны вінавацтымі сябе не прызналі. 20—21.4.1937 г. ў Мінску адбылося пасяджэнне калегіі Вярхоўнага Суда БССР, якая вынесла прыгавор. П.Р.Прудніка ў і В.У.Чудовіч былі засуджаны ў папраўча-працоўны лагер на 6 гадоў кожны, пасля адбыцця пакарання яны пазбаўляліся на 3 гады выбарчых правоў. Д.М.Васілеўскага калегія прыгаварыла да пазбаўлення волі на 5 гадоў, а пасля адбыцця тэрміну яму забаранялася на 3 гады ўдзельнічаць у выбарах. Пасля гэта рашэнне пайшло ў Маскву. Там здзівіліся мяккасці прыгавору. 7.2.1938 г. ён быў апратэставаны намеснікам старшыні Вярхоўнага Суда СССР В.Ульрыхам. 27—29.10.1938 г. справа пераглядалася судовай калегіяй Магілёўскага абласнога суда. П.Р.Прудніка ву, В.У.Чудовічу, Д.М.Васілеўскаму вынеслі прыгавор: пазбавіць волі тэрмінам на 10 гадоў. І толькі 13.6.1956 г. справа гэтых людзей была перагледжана Прэзідыумам Вярхоўнага Суда БССР, які адмяніў прыгавор з-за недаказанасці прад'яўленых ім абвінавачванняў.

У ліпені 1937 г. ў Магілёве была арыштавана яшчэ адна група работнікаў асветы. Сярод іх Сямён Цімафеевіч Радкевіч, дацэнт, выконваючы абавязкі дэкана гістарычнага факультэта Магілёўскага пединстытута, Сцяпан Міхайлавіч Юркевіч, выкладчык педагогікі гэтай жа ўстановы, Георгій Лявонцьевіч Наркевіч і Іван Данілавіч Туміловіч, настаўнікі Магілёўскага педагагічнага вучылішча.



Памятны знак на месцы масавых пахаванняў ахвяр рэпрэсій (каля скрыжавання дарог Орша—Гомель і Магілёў—Слаўгарад).

Усе яны абвінавачваліся ў тым, што «былі членамі контррэвалюцыйнай фашысцка-нацдэмаўскай арганізацыі, сістэматычна праводзілі сярод студэнтаў і выкладчыкаў педагагічных устаноў падрыўную антысавецкую дзейнасць». 26.3.1938 г. ў Магілёве адбылося выязное судовае пасяджэнне спецыяльнай судовай калегіі Вярхоўнага Суда БССР, дзе С.Ц.Радкевіча прыгаварылі да 8 гадоў пазбаўлення волі, а Г.Л.Наркевіча і І.Д.Туміловіча — да 6 гадоў. Пасля адбыцця пакарання яны пазбаўляліся на 5 гадоў выбарчых правоў. І.Д.Туміловіча рэабілітавалі 9.7.1939 г., а Г.Л.Наркевіча і С.Ц.Радкевіча — 26.1.1940 г. Справа С.М.Юркевіча ў судзе не разглядалася таму, што ён памёр у турме пасля допытаў. Толькі 14.5.1958 г. Прэзідыумам Вярхоўнага Суда БССР ён быў пасмяротна рэабілітаваны.

Рэпрэсіям падвяргаліся не толькі беспартыйныя. Каля 40% у гэтым спісе — члены КПСС. Партыйныя дакументы тых часоў сведчаць, што грамадска-палітычная актыўнасць камуністаў свядома накіроўвалася ў рэчышча татальнай падазронасці і жаху. Партыйцаў заклікалі пакончыць з палітычнай слепатой, бестурботнасцю, павысіць рэвалюцыйную пільнасць і рашуча ачысціць свае рады ад класава далёкіх элементаў. «Вінаватых» выключалі з партыі. Так, камуністы 16-й дыстанцыі пуці Магілёўскага аддзялення чыгункі выключылі з партыі дзесятніка Сталярова за тое, што ён слухаў палітычныя анекдоты, якія расказваў адзін з тэхнікаў (яго пазней арыштавалі як «ворага народа»), але не астанавіў антысаветчыка і не паведаміў органам НКУС.

Рабочую Магілёўскай шаўковай фабрыкі Фрыдлянд выключылі з партыі за тое, што «своечасова не заявіла, што яе муж трацкіст і быў ім яшчэ да жаніцьбы».

Супрацоўнікам НКУС дастаткова было аднаго сігналу аб тым, што дырэктар Магілёўскай канторы «Белдзяржтранса» Адольф Іванавіч Ліпскі з'яўляецца польскім шпіёнам і быў ім яшчэ тады, калі працаваў шафёрам 1-га сакратара ЦК КП(б)Б Шаранговіча, арыштаванага як «ворага народа». А.І.Ліпскага выключылі з партыі і расстралялі. Пазней было ўстаноўлена, што справу на яго сфабрыкаваў следчы НКУС, якому хацелася найхутчэй выканаць план, даведзены з Мінска.

Цяжкі лёс напаткаў і галоўнага механіка завода «Чырвоная зорка» Сігізмунда Рамановіча Рудкоўскага. У канцы 1937 г. ён быў арыштаваны, а ў сакавіку 1938 г. расстраляны. Пералік абвінавачанняў у яго адрас складаўся з некалькіх пунктаў:

— у 1928 г. завербаваны ў якасці агента польскай разведкі;

— у 1930 г. вывеў са строю трансмісійны вал на заводзе, у выніку чаго вытворчасць стаяла 2 дні;

— у 1932 г. паламаў трубы і талеркі цэнтрабежнага насоса вады;

— у 1936 г. паламаў дыск гітарнай рамы, у выніку чаго машына прастаяла два тыдні;

— у 1937 г. дапусціў паломку дышля лесапільнай рамы, паламаў яе галоўны вал, у выніку чаго завод спыніўся на 12 дзён.

Акрамя гэтага, Рудкоўскі быццам перадаваў палякам сакрэтныя зводкі аб рабоце прадпрыемстваў горада. Гэтага было больш чым дастаткова, каб прыгаварыць чалавека да расстрэлу. Праз 40 гадоў выявілася, што ўсе абвінавачанні былі наўмыснай фальшыўкай.

Аналагічных «грахоў» нацягалі следчыя НКУС і на старшага майстра Грабянеўскага торфазавода Матэаса Насімавіча Насацкага, майстра трубаліцейнага завода Паўла Фаміча Аўгусціняка, начальніка вагоннага ўчастка станцыі Магілёў Пятра Андрэевіча Аўдзеева, выкладчыка педінстытута Хаіма Ісакавіча Шэймана. Усе яны пасля допытаў прызналіся ў «зробленым» і былі пакараны. Найбольш прынцыповыя камуністы нярэдка выступалі ў абарону сваіх таварышаў, звярталіся ў вышэйшыя партыйныя органы, спрабавалі дабіцца перагляду іх спраў, але і самі абаронцы пасля падвяргаліся арыштам. Ніжэй прыводзяцца прозвішчы рэабілітаваных, якія сталі вядомы ў працэсе работы над кнігай «Памяць».

АБУШКЕВІЧ Канстанцін Нічыпаравіч, н. ў 1895. Рэпрэсіраваны ў 1945. Рэабілітаваны ў 1991.

АЖАХОЎСКІ Міхаіл Мар'янавіч. Працаваў у санітарнай інспекцыі. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1992.

АЖАХОЎСКІ-КАВАЛЕЎСКІ Люцыян Мар'янавіч. Працаваў загадчыкам пункта санітарнай інспекцыі. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны.

АЛЁХІН Якаў Іванавіч, н. ў 1904. Працаваў сталяром на мэблевай фабрыцы. Прыгавораны да высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны ў 1989.

АЛЁШКІН Гаўрыла Мітрафанавіч, н. ў 1886. Працаваў эканамістам на металазаводзе. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

АЛЁШКІН Гаўрыла Нічыпаравіч, н. ў 1886.

Працаваў галоўным кандуктарам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

АЛІСЯЮК Казімір Іосіфавіч, н. ў 1877. Працаваў у гархарчгандлі. Прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1989.

АМЯЛЬЧУК Віктар Сцяпанавіч, н. ў 1900. Працаваў электрамеханікам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

АНДРОНАЎ Іосіф Сяргеевіч, н. ў 1870. Прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1989.

АНДРОНАЎ Уладзімір Данілавіч, н. ў 1906. Працаваў машыністам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

АНДРЭЕВА-МАРЦІНКОЎСКАЯ Людвіга Іосіфаўна, н. ў 1900. Працавала эканамістам на металургічным заводзе імя 14-га Кастрычніка. Рэпрэсіравана ў 1938. Рэабілітавана.

АНОШКА Яўген Раманавіч, н. ў 1909. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

АНТОНЕНКА Уладзімір Данілавіч, н. ў 1906. Працаваў машыністам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны.

АПІДОВІЧ Аляксандр Мікалаевіч, н. ў 1892. Працаваў машыністам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

АРКАДЗЬЕЎ Емяльян Пятровіч. Працаваў намеснікам начальніка аддзела забеспячэння шаўковай фабрыкі. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

АРЛОЎ Барыс Аляксеевіч, н. ў 1900. Працаваў у Белплодагароднінагандлі. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

АРХІПЕЦ Васіль Дзмітрыевіч, н. ў 1911. Студэнт педінстытута. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

АРЦІШЭЎСКІ Мікалай Уладзіміравіч, н. ў 1891. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

АСІНКА Аляксандр Аляксеевіч, н. ў 1890. Працаваў бухгалтарам у раймлынаўпраўленні. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

АСКІНАЗІ Ісак Навумавіч, н. ў 1887. Працаваў нарыхтоўшчыкам ОРЗ у аддзеле рабочага забеспячэння станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

АЎГУСЦІНЯК Павел Фаміч. Працаваў майстрам трубаліцейнага завода. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

АЎДЗЕЕЎ Дзмітрый Аляксандравіч, н. ў 1896. Працаваў поварам. Засуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны ў 1989.

АЎДЗЕЕЎ Пётр Андрэевіч. Працаваў начальнікам вагоннага ўчастка станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

АЎСЕЙ Іосіф Сцяпанавіч, н. ў 1899. Працаваў кладаўшчыком на хлебазаводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

АЎСЕЙ Іосіф Сцяпанавіч, н. ў 1899. Працаваў кладаўшчыком на хлебазаводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

АФАНАСЬЕВА Агафія Мікітаўна, н. ў 1903. Працавала санітаркай у шпіталі. Рэпрэсіравана ў 1945. Рэабілітавана ў 1990.

БАБРОЎСКІ Уладзімір Ігнатавіч, н. ў 1908. Працаваў завучам у школе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

БАБУЛІН Мікалай Кандратавіч, н. ў 1904. Працаваў бухгалтарам у аблспажыўсаюзе. Рэпрэсіраваны ў 1945. Рэабілітаваны ў 1990.

БАГДАНАВА Агафія Міхайлаўна, н. ў 1914. Хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1992.

БАГДАНОВІЧ Іосіф Іванавіч, н. ў 1891. Працаваў цырульнікам у 1-й бальніцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

БАГУСЛАЎСКІ Яўген Станіслававіч, н. ў 1904. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

БАДЫКА Іван Іларыёнавіч, чырвонаармеец. Рэспрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1990.

БАЗЫЛЕНКА Настасся Дзянісаўна, н. ў 1888. Арыштавана 27.10.1945. Прыгаворана да 5 гадоў ссылкі. Рэабілітавана 8.8.1991.

БАЛЬЦЭВІЧ Эдуард Паўлавіч, н. ў 1903. Палітрук палкавой школы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

БАРАВІК Эмілія Францаўна, н. ў 1889. Хатняя работніца. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана ў 1989.

БАРАНОЎСКІ Віталь Інакенцьевіч, н. ў 1913. Працаваў настаўнікам. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

БАРАНОЎСКІ Людвіг Юльянавіч, н. ў 1904. Працаваў у архіве. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

БАРНШТЭЙН Мендаль Якаўлевіч, н. ў 1913. Працаваў выкладчыкам у педінстытуце. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

БАРЫСАЎ Аляксандр Васілевіч, н. ў 1913. Працаваў выкладчыкам у школе механізацыі сельскай гаспадаркі. Рэпрэсіраваны ў 1945. Рэабілітаваны ў 1991.

БАРЫСАЎ Іван Фёдаравіч, н. ў 1880. Пенсіянер. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1992.

БЕДУЛЕНКА Іван Сцяпанавіч, н. ў 1915. Працаваў намеснікам дырэктара школы. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1990.

БЕЕЎ Мікалай Любімавіч, н. ў 1891. Працаваў кантралёрам ашчаднай касы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

БЕЛАНДЗЕР Якаў Іосіфавіч, н. ў 1901. Працаваў рамізнікам у гарсавеце. Рэпрэсіраваны ў 1939. Рэабілітаваны ў 1990.

БЕЛІКОВІЧ Леанід Міхайлавіч, н. ў 1905. Працаваў землямерам. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны.

БЕРЗАН Абрам Гіршавіч. Працаваў слесарам

на аўтарамонтным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

БІБІКАВА Валянціна Паўлаўна, н. ў 1930. Арыштавана 15.1.1948, прыгаворана да 5 гадоў ссылкі. Рэабілітавана 15.8.1991.

БІБІКАВА Варвара Акімаўна, н. ў 1892. Арыштавана 15.1.1948, прыгаворана да 5 гадоў высылкі. Рэабілітавана 15.8.1991.

БІБІКАЎ Аляксандр Паўлавіч, н. ў 1927. Працаваў слесарам. Арыштаваны 15.1.1948, прыгавораны да 5 гадоў высылкі. Рэабілітаваны 15.8.1991.

БІБІЯ Іван Міхайлавіч, н. ў 1888. Працаваў у арцелі «Металіст». Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

БІДЗЕЛЬНІКАЎ Барыс Аркадзевіч, н. ў 1905. Працаваў інжынерам у аблкамунгасе. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны.

БІКАСАЎ Ерафей Ягоравіч, н. ў 1898. Рэпрэсіраваны ў 1934. Рэабілітаваны ў 1991.

БІЦУКОВА Алена Кузьмінічна, н. ў 1916. Арыштавана 1.9.1945, прыгаворана да 5 гадоў высылкі. Рэабілітавана 28.5.1992.

БІЦУКОВА Лідзія Кузьмінічна, н. ў 1928. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана.

БЛУСАЎ Браніслаў Данілавіч, н. ў 1901. Працаваў на аўтарамонтным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны.

БОГДАН Міхаіл Сільвестравіч. Працаваў на шаўковай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1992.

БРАВЫ Уладзімір Паўлавіч, н. ў 1896. Працаваў на гарбарным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

БРАЗОЎСКІ Леанід Іларыёнавіч, н. ў 1905. Працаваў прарабам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

БРУХОЎСКІ Іосіф Лявонавіч, н. ў 1907. Працаваў загадчыкам гаража ў бальніцы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

БУДНАЯ Еўдакія Міхайлаўна, н. ў 1901. Арыштавана 28.7.1945, прыгаворана да 5 гадоў высылкі. Рэабілітавана 22.6.1992.

БУЖЫНСКАЯ Мальвіна Сцяпанаўна, н. ў 1918. Працавала поварам на мясакамбінаце. Рэпрэсіравана ў 1941. Рэабілітавана ў 1990.

БУЗНІЦКІ Васіль Рыгоравіч, н. ў 1903. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1991.

БУЗНІЦКІ Павел Рыгоравіч, н. ў 1882. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1991.

БУЙКО Уладзімір Іосіфавіч, н. ў 1904. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

БУЛАЙ Іван Ільіч, н. ў 1872. Арыштаваны 19.1.1921, прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны 16.9.1992.

БУТКЕВІЧ Аляксей Захаравіч, н. ў 1900. Працаваў пажарнікам. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1990.

БЯЛОХА Андрэй Васілевіч, н. ў 1896. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1990.

БЯЛОХА Канстанцін Іванавіч, н. ў 1901. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1990.

БЯЛЬКЕВІЧ Леанід Міхайлавіч, н. ў 1905. Працаваў землямерам. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1991.

БЯЛЬЦЭВІЧ Іван Уладзіміравіч, н. ў 1907. Працаваў кандуктарам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

БЯНЬКО Уладзімір Іванавіч, н. ў 1911. Студэнт пединстытута. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1990.

ВАЙГІНЭС Алена Мацвееўна, н. ў 1895. Працавала поварам у дзіцячым садзе. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана.

ВАКАР Уладзімір Дзмітрыевіч, н. ў 1887. Працаваў слесарам у дэпо станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ВАЛАДЗЬКО Раман Сцяпанавіч, н. ў 1900. Працаваў тэхнікам у паравозным дэпо станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1991.

ВАЛЕНЦІЁНАК Цімафей Якаўлевіч, н. ў 1907. Працаваў на цагляным заводзе № 9. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

ВАН Ляншай, н. ў 1909. Працаваў слесарам на аўтарамонтным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1935. Рэабілітаваны ў 1992.

ВАНЧЫНЭЕС Алена Мацвееўна, н. ў 1895. Працавала поварам у дзіцячым садзе. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана ў 1992.

ВАНЬКОВІЧ Віктар Іванавіч, н. ў 1887. Працаваў цесляром. Рэпрэсіраваны ў 1945. Рэабілітаваны ў 1992.

ВАРАНЬКО Іван Іларыёнавіч, н. ў 1911. Студэнт пединстытута. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1990.

ВАРДОМСКІ Васіль Андрэевіч, н. ў 1903. Працаваў на цагляным заводзе № 9. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

ВАРОНІН Міхаіл Дзмітрыевіч, н. ў 1902. Працаваў настаўнікам. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ВАСІЛЕЎСКІ Даніла Мінавіч, н. ў 1899. Выкладчык Магілёўскага пединстытута. Рэпрэсіраваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1990.

ВАСІЛЬЕЎ Сямён Васілевіч, н. ў 1895. Працаваў цесляром на трубаліцейным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

ВАСІЛЬЕЎ Тарас Фёдаравіч, н. ў 1884. Працаваў цесляром на хлебазаводзе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

ВАШКЕВІЧ Пётр Емяльянавіч. Працаваў дырэктарам архіва. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ВІЛЕЦКІ Ісак Моўшавіч, н. ў 1900. Працаваў

печніком на заводзе імя Дзімітрава. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1990.

ВІЛЬЧЫНСКАЯ Лізавета Іванаўна, н. ў 1889. Арыштавана 15.12.1929, прыгаворана да 3 гадоў высылкі. Рэабілітавана 19.3.1992.

ВІРШЫЦ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1895. Працаваў у паравозным дэпо. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

ВОЙНІЧ Іосіф Іосіфавіч, н. ў 1905. Працаваў на аўтарамонтным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

ВОЛКАЎ Мікалай Міхайлавіч, н. ў 1914. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1992.

ВОРАНАЎ Міхаіл Мікалаевіч, н. ў 1912. Лейтэнант вайсковай часці. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1990.

ВРОНСКІ Іван Якаўлевіч, н. ў 1878. Працаваў на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЫГАНАЎСКІ Франц Адамавіч, н. ў 1897. Працаваў на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны.

ВЯРБІЦКІ Адам Іванавіч, н. ў 1895. Працаваў начальнікам паравознага аддзялення дэпо станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

ВЯРБІЦКІ Дзмітрый Платонавіч, н. ў 1880. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

ВЯРЛЫГА Іван Сігізмундавіч, н. ў 1901. Працаваў памочнікам машыніста на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ГАДЗЕЎСКІ Валянцін Фаміч, н. ў 1889. Працаваў землямерам. Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1990.

ГАЙДУЧЭНКА Іван Рыгоравіч, н. ў 1896. Працаваў дзесятнікам у водаканалтрэсце. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛАВЕНЧЫК Пётр Мікалаевіч, н. ў 1921. Працаваў бухгалтарам у банку. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1992.

ГАНЧАРЫК-КУДРОВА Софія Аляксандраўна, н. ў 1911. Працавала сакратаром-машыністкай. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана.

ГАРБАЧЭЎСКІ Аляксей Іосіфавіч, н. ў 1887. Працаваў прадаўцом у гархарчгандлі. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАРЭЛІК Майсей Якаўлевіч, н. ў 1896. Працаваў інжынерам на трубаліцейным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЎРЫЛАВА Любоў Лявонаўна, н. ў 1926. Працавала ў гарадскім Доме народнай творчасці. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1992.

ГВОЗДЗЕВА Вольга Канстанцінаўна, н. ў 1902. Працавала тэлеграфісткай. Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана ў 1990.

ГЕЛЬФАРБ Шмула Абрамавіч, н. ў 1919. Працаваў маляром на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1990.

ГЕРБКА Канстанцыя Іосіфаўна, н. ў 1910. Працавала стрэлачніцай на станцыі Магілёў. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана.

ГІВОН Іосіф Іосіфавіч, н. ў 1893. Працаваў на аўтарамонтным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1991.

ГІЛЬ Эдуард Баляслававіч, н. ў 1889. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны.

ГІЧНІЦКІ Баляслаў Адольфавіч, н. ў 1888. Працаваў выкладчыкам у Адэскім індустрыяльным інстытуце. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

ГЛАЗІНО Міхаіл Цярэнцьевіч. Працаваў загадчыкам склада. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны.

ГЛУЗДАКОЎ Сяргей Іванавіч, н. ў 1906. Працаваў рабочым на ЦЭЦ. Рэпрэсіраваны ў 1938. Засуджаны на 5 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны ў 1989.

ГЛУШАКОЎ Васіль Фёдаравіч, н. ў 1922. Працаваў у Магілёўбудтрэсце. Рэпрэсіраваны ў 1939. Рэабілітаваны.

ГОДЗЕЛЬ Вацлаў Вікенцьевіч, н. ў 1896. Працаваў кінамеханікам. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны.

ГОЛЬДФАЙН Шмуля Абавіч, н. ў 1919. Працаваў фармацэўтам у аптэцы. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1990.

ГОМАНАВА Валянціна Савельеўна, н. ў 1926. Працавала ў камунбанку. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана.

ГОНІЧ Фрыдрых Аўтуставіч, н. ў 1882. Працаваў загадчыкам гаспадаркі на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

ГРАМЫКА Васіль Васілевіч, н. ў 1887. Працаваў на станцыі Лупалава. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1991.

ГРАХОЎСКАЯ Канстанцыя Аляксандраўна, н. ў 1880. Хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана ў 1938. Рэабілітавана ў 1990.

ГРУБЕРТ Браніслаў Антонавіч, н. ў 1892. Працаваў слесарам на аўтарамонтным заводзе. Рэабілітаваны.

ГРУДЗІНСКІ Васіль Феафанавіч, н. ў 1885. Працаваў касірам. Рэпрэсіраваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1990.

ГРЫНКЕВІЧ Софія Антонаўна, н. ў 1897. Працавала сакратаркай у натарыяльнай канторы. Рэпрэсіравана ў 1938. Рэабілітавана ў 1991.

ГРЫНКЕВІЧ Франц Іванавіч, н. ў 1882. Працаваў вартаўніком у канторы па нарыхтоўцы лёну. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ГРЫНЦВАЙГ Морыс Навумавіч, н. ў 1904. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

ГРЫНЮК Міхаіл Аляксандравіч, н. ў 1890. Працаваў на клеезаводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны.

ГРЫШПАН Сімон Давыдавіч, н. ў 1891. Пра-

цаваў майстрам па рамонце гадзіннікаў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ГУБАРАЎ Браніслаў Антонавіч, н. ў 1892. Працаваў слесарам на аўтарамонтным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ГУБАРАЎ Мікалай Тарасавіч, н. ў 1885. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1990.

ГУРЭВІЧ Мордух-Ёсель Абелевіч, н. ў 1882. Працаваў на гарбарным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны.

ГУСАКОЎ Сяргей Дарафеевіч, н. ў 1911. Працаваў дырэктарам шаўковай фабрыкі. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны.

ГУЦІН Якаў Саламонавіч, н. ў 1902. Працаваў дырэктарам псіхіятрычнай лячэбніцы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны.

ДАВЕЙНІС Канстанцін Іосіфавіч, н. ў 1910. Працаваў токарам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны.

ДАВОНІНА Ганна Фёдараўна, н. ў 1909. Хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана ў 1945. Рэабілітавана.

ДАМБЕРГ Фёдар Францавіч, н. ў 1902. Працаваў на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ДАМБРОЎСКІ Віктар Сцяпанавіч, н. ў 1881. Працаваў сталяром у Доме адзення. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

ДАМБРОЎСКІ Павел Дзмітрыевіч, н. ў 1911. Працаваў слесарам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

ДАНІЛАВА Марыя Навумаўна, н. ў 1886. Працавала сакратаркай у райфінаддзеле. Рэпрэсіравана ў 1945. Рэабілітавана ў 1989.

ДАНІЛАЎ Альберт Андрэевіч, н. ў 1925. Чырвонаармеец. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1992.

ДАНІЛАЎ Дарафей Кандратавіч, н. ў 1888. Працаваў дзесятнікам у гаркамгасе. Рэпрэсіраваны ў 1934. Рэабілітаваны ў 1989.

ДАШКЕВІЧ Валянціна Сцяпанаўна. Працавала ўрачом на швейнай фабрыцы. Рэпрэсіравана ў 1946. Рэабілітавана.

ДВОРНІКАВА Софія Іосіфаўна, н. ў 1911. Рэпрэсіравана ў 1938. Рэабілітавана ў 1989.

ДЗЕГЛЕ Пётр Бяртульевіч, н. ў 1879. Працаваў вартаўніком. Рэпрэсіраваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1989.

ДЗЕМЯНЮК Аляксандр Маркавіч, н. ў 1892. Працаваў на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны.

ДЗІВОНІНА Ганна Фёдараўна, н. ў 1909. Хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана ў 1945. Рэабілітавана ў 1992.

ДОДЗІН Леў Барысавіч, н. ў 1904. Працаваў загадчыкам магазіна «Белплодагародніна». Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ДОЎНАР Аляксандра Іванаўна, н. ў 1881. Служачая. Рэпрэсіравана ў 1936. Рэабілітавана ў 1989.

ДОЎНАР Вікенцій Уладзіміравіч, н. ў 1901. Працаваў загадчыкам гаража на аўтарамонтным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны.

ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКІ Венядзікт Венядзіктавіч, н. ў 1908. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. У 1937 прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1989.

ДУБАВІЦКІ Мікалай Рыгоравіч, н. ў 1887. Працаваў бухгалтарам земаддзела. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ДУБРОЎСКІ Мікалай Пятровіч, н. ў 1902. Працаваў загадчыкам вытворчасці шаўковай фабрыкі. Рэпрэсіраваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1989.

ДУШКЕВІЧ Якаў Іпалітавіч, н. ў 1872. Рабочы. Засуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны ў 1989.

ЕМЯЛЬЯНІЧАЎ Фёдар Аляксандравіч, н. ў 1893. Працаваў бухгалтарам у Магілёўбудзе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ЕРМАКОЎ Марк Лаўрэнавіч, н. ў 1902. Працаваў дыспетчарам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЖАБЕНКА Васіль Міхайлавіч, н. ў 1891. Працаваў на гарбарным заводзе. Засуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны ў 1989.

ЖАБІНСКІ Віктар Вікенцьевіч, н. ў 1884. Працаваў настаўнікам. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЖАВАРАНАК Максім Іванавіч, н. ў 1902. Працаваў на цагляным заводзе № 7. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЖАВАРАНАК Рыгор Харытонавіч, н. ў 1883. Працаваў на цагляным заводзе № 7. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЖАРАБЦОЎ Дзяніс Карпавіч, н. ў 1907. Працаваў слесарам на заводзе № 459. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1989.

ЖАРОНКІНА Еўдакія Іванаўна, н. ў 1885. Хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана ў 1945. Рэабілітавана ў 1992.

ЖДАН-ПУШКІН, н. ў 1879. Арыштаваны 17.11.1921. Прыгавораны да 3 гадоў высылкі. Рэабілітаваны 1.12.1992.

ЖУКОЎСКІ Сяргей Іпалітавіч, н. ў 1891. Працаваў начальнікам дыстанцыі пуці на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Расстраляны 31.3.1938. Рэабілітаваны ў 1957.

З успамінаў Л.С.Далговай, дачкі С.І.Жукоўскага

Бацьку, Сяргея Іпалітавіча Жукоўскага, арыштавалі, калі мне было 10 гадоў. У той час, вядома, я многага не разумела, але тое-сёе памятаю добра, нешта ведаю з расказаў

мамы. Бацька нарадзіўся ў сям'і чыгуначніка і лёс свой таксама звязаў з чыгункай. Пачынаў пасля вучылішча працаваць брыгадзірам пуці, на момант арышту быў ужо начальнікам дыстанцыі пуці на станцыі Магілёў. Ішоў 1937 г. Адзін за адным знікалі па начах кіраўнікі розных службаў Беларускай чыгункі. Часта за мужамі адыходзілі ў невядомасць жонкі, а дзяцей-сірот адпраўлялі ў спецыяльныя дзіцячыя дамы. Бацька быў чалавекам прыстойным, добрым сем'янінам, выдатным спецыялістам, карыстаўся заслужанай павагай сярод таварышаў. За добрую работу неаднаразова атрымліваў граматы і грашовыя прэміі, нават была грамата за подпісам Варашылава за выдатнае ўтрыманне пуці (бацька суправаджаў на сваім участку цягнік, у якім нарком ехаў на манеўры). У снежні 1937 г., калі на чыгуначным вузле былі рэпрэсіраваны амаль усе кіраўнікі, бацьку зволілі з работы без усякіх падстаў. Ён не згадзіўся і паехаў да начальніка Беларускай чыгункі, а пасля ў Маскву да Кагановіча. Нарком, вядома, яго не прыняў. Як толькі бацька вярнуўся дамоў, хвілін праз 15 у кватэру пастукаліся работнікі НКУС. Правялі вобыск, нічога не знайшлі, але забралі ўсе дакументы бацькі, ганаровыя граматы і загады з падзякамі за добрасумленную працу. У ноч з 6 на 7 студзеня 1938 г. бацьку павялі пад канвоем. Мама не магла змірыцца з тым, што мужа палічылі ворагам народа. Яе бацька быў бальшавіком з 1905 г., прайшоў грамадзянскую вайну, аддана служыў народу. Такой бацькі выхавалі і яе; такім лічыла яна і свайго мужа. Неаднойчы звярталася мама ў органы НКУС, да следчага, спрабавала даказаць і пераканаць, што Сяргей Іпалітавіч быў сумленным чалавекам, любіў сваю Радзіму і не мог зрабіць злачынства. Ёй нарэшце сказалі, каб не хадзіла і не прасіла, а то сама трапіць у турму да мужа. Пасля яна баялася ўжо пісаць сама, дыктавала нам пісьмы на імя начальніка НКУС БССР. Адказаў не было. Адразу пасля арышту бацькі нам загадалі вызваліць ведамасную кватэру. Знайсці жыллё для сям'і з 4 чалавек (мама, бабуля, я і брат) было вельмі цяжка. Тым больш што людзі баяліся пускаць на кватэру сем'і рэпрэсіраваных. Неяк мы ўсё ж знайшлі халодны пакой. Купілі жалезную печку, яна абагравала і памяшканне, на ёй гатавалі ежу. Не было работы, з-за арышту бацькі нідзе не хацелі браць. Нарэшце мама ўладкавалася касірам у цырульню, а вечарамі нешта шыла, каб зарабіць лішнюю капейку.



С.І.Жукоўскі.

У пачатку сакавіка 1938 г. раніцай да нас зайшоў таварыш бацькі па службе і сказаў, што той знаходзіцца ў таварным цягніку на станцыі Магілёў. Мы пабеглі туды. Таварняк стаяў у тупіку, акенцы былі забіты кратамі, уздоўж вагонаў хадзілі ўзброеныя салдаты. Бацька ўбачыў нас і крыкнуў: «Пішыце ў Маскву, пішыце Яжову, Сталіну, мае паказанні недакладныя. Усё, што было добрае, зрабілі дрэнным». Больш ён не паспеў нічога сказаць, ахоўнік, пагражаючы штыком, адагнаў нас ад вагонаў. Гэта былі апошнія словы бацькі. Ён, як і другія ахвяры рэпрэсій, думаў, што трапіў у нейкую пастку, што выйшла непаразуменне, і, калі пра гэта паведаміць «наверх», усё пераменіцца, зло будзе пакарана, праўда пераможа. Верылі ў гэта і мы, пісалі зноў і зноў, пісалі Сталіну, Яжову. Аднойчы мяне выклікалі ў НКУС. Пайшла і бабуля, бо мама баялася паказвацца на вочы энкавэдэшнікам. Там нам сказалі, што бацька засуджаны на 10 гадоў без права перапіскі і высланы на Поўнач. Параілі больш нікуды не пісаць. Вось і ўсё. З кляймом «дачка ворага народа» прайшло маё дзяцінства, праляцела юнацтва. Было балюча і крыўдна адчуваць сябе бяспраўнай, непаўнацэннай, ізгоем.

Ішлі гады. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, 17-гадовы брат добраахвотнікам пайшоў на фронт, быў цяжка паранены, 6 месяцаў лячыўся ў шпіталі, вярнуўся дамоў інвалідам 1-й групы і ў 1948 г. памёр. Я, мама і бабуля эвакуіраваліся з горада, эшалон наш трапіў пад бамбёжку каля Крычава, адтуль мы пехатой пайшлі на ўсход. Каля Бранска трапілі ў акружэнне і 2 гады жылі ў акупацыі сярод чужых людзей, церпячы і голад, і холад. Калі б не ўменне мамы шыць, мабыць, не выжылі б.

Скончылася вайна, я паступіла ў інстытут, стала настаўніцай і 30 гадоў аддала дзецям.

У 1957 г. мы атрымалі паведамленне аб пасмяротнай рэабілітацыі бацькі. Здавалася, чорная пляма нарэшце назаўжды знікне і мы ўздыхнём свабодна. Але яшчэ доўгія гады мы заставаліся людзьмі другога сорту, якім многае не давяралася, на нас паглядалі з недаверам і асцярогай. У свой час мне вельмі хацелася стаць камсамолкай, як мае сяброўкі, але я баялася абразы і знявагі, якія магла атрымаць у час прыёму ў члены ВЛКСМ. Толькі ў 1948 г., на 2-м курсе інстытута, я стала камсамолкай.

21 снежня 1957 г. мы атрымалі пасведчанне пра смерць бацькі, дзе гаварылася, што памёр ён 29 красавіка 1944 г. ад гемакаліту. Ужо ў 1989 г. з упраўлення КДБ па Магілёўскай вобласці паведамілі, што бацька не памёр, а 31 сакавіка 1938 г. быў расстраляны.

Цяпер, праз гады, комплекс непаўнацэннасці знік. Я вельмі ганаруся бацькам, лічу, што быў ён сярод лепшых людзей нашай краіны. Шкада, што гэты час наступіў так позна, але мы, дзеці ахвяр сталінскіх рэпрэсій, удзячныя лёсу, што дачакаліся гэтых дзён...

ЖЫВАТКЕВІЧ Васіль Герасімавіч, н. ў 1885. Працаваў касірам у рэдакцыі газеты «Камунар Магілёўшчыны». Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЖЫГАЛКА Галіна Адамаўна, н. ў 1923. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1992.

ЖЫЛІН Васіль Іванавіч, н. ў 1914. Працаваў слесарам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1990.

ЗАБАРОЎСКАЯ Лідзія Канстанцінаўна, н. ў 1921. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1989.

ЗАДУШЭЎСКАЯ Ніна Ісакаўна, н. ў 1887. Хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана ў 1938. Рэабілітавана ў 1989.

ЗАДУШЭЎСКІ Аляксей Іосіфавіч, н. ў 1890. Працаваў інжынерам на гарбарным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЗАЙЦАЎ Лука Іванавіч, н. ў 1889. Працаваў на трубаліцейным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1989.

ЗАКАБЛУК Андрэй Міхайлавіч, н. ў 1889. Працаваў цесляром у працоўнай калоніі. Рэпрэсіраваны ў 1939. Рэабілітаваны ў 1990.

ЗАЛЕСКАЯ Станіслава Іванаўна. Працавала настаўніцай у СШ № 1. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана ў 1989.

ЗАЛУЦКІ Юльян Вацлававіч, н. ў 1900. Працаваў слесарам на сушыльным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны.

ЗАМЕЦІН Якаў Васілевіч, н. ў 1916. Студэнт педінстытута. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЗАМСКІ Вольф Львовіч, н. ў 1904. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЗАПОЛЬСКІ Венядзікт Венядзіктавіч, н. ў 1880. Працаваў на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЗАХАРАНКА Іван Іванавіч, н. ў 1895. Працаваў настаўнікам у вячэрняй школе. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ЗВЕРАЎ Дзмітрый Пятровіч, н. ў 1901. Працаваў выкладчыкам у педінстытуце. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1989.

ЗЕЛЬКАВЕР Мордка Цэлікавіч, н. ў 1914. Працаваў цырульнікам. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1989.

ЗЕП Іван Іванавіч, н. ў 1913. Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ЗІНКЕВІЧ Пётр Іосіфавіч, н. ў 1901. Працаваў стрэлачнікам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

ЗІСМАН Іцка Евелевіч, н. ў 1880. Працаваў сталяром у арцелі «Пралетарыят». Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

ЗОРЫН Фёдар Гаўрылавіч, н. ў 1916. Працаваў у канторы па нарыхтоўцы лёну. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЗУЗЯНКОЎ Давыд Сямёнавіч, н. ў 1869. Пенсіянер. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ЗУМЕНТ Тэадор Пятровіч, н. ў 1894. Працаваў інкасатарам у Дзяржбанку. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

ІВАНОЎ Васіль Рыгоравіч, н. ў 1887. Працаваў бухгалтарам у псіхіятрычнай бальніцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

ІВАНОЎ Георгій Міхайлавіч, н. ў 1895. Працаваў на піўзаводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ІВАНОЎ Дзмітрый Сямёнавіч. Працаваў на трубаліцейным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1990.

ІГНАЦЬЕЎ Георгій Аляксандравіч, н. ў 1898. Працаваў рахункаводам. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ІГНАЦЬЕЎ Георгій Аляксандравіч. Арыштаваны 15.12.1929, прыгавораны да 3 гадоў высылкі. Рэабілітаваны 19.3.1992.

ІГНАЦЬЕЎ Сямён Захаравіч, н. ў 1869. Служыў старастам у царкве. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ІЗРАІЛЬСКІ Куся Саламонавіч, н. ў 1908. Працаваў адвакатам. Рэпрэсіраваны ў 1951. Рэабілітаваны.

ІЛЬІН Дзмітрый Рыгоравіч. Працаваў слесарам на трубаліцейным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

ІЛЬІН Сяргей Дзмітрыевіч, н. ў 1869. Працаваў дворнікам у СШ № 3. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ІОДКА Адам Рамуальдавіч, н. ў 1893. Працаваў архітэктарам. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

ІОФЕ Абрам Львовіч, н. ў 1902. Працаваў рэдактарам газеты «Камунар Магілёўшчыны». Рэпрэсіраваны ў 1935. Рэабілітаваны ў 1989.

ІСАЕЎ Кірыла Фёдаравіч, н. ў 1887. Пенсіянер. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

КАБАНАЎ Барыс Парфенавіч, н. ў 1914. Працаваў на аўтарамонтным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

КАВАЛЕНКА Рыгор Антонавіч, н. ў 1900. Працаваў на металургічным камбінаце. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1992.

КАВАЛЕРАЎ Леанід Пятровіч, н. ў 1885. Арыштаваны 15.12.1929, прыгавораны да 3 гадоў высылкі. Рэабілітаваны 19.3.1992.

КАВЕРЫН Валяр'ян Цімафеевіч, н. ў 1893. Працаваў загадчыкам кафедры пединстытута. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1992.

КАДАН Сара Юдаўна, н. ў 1914. Працавала на заводзе імя Дзімітрава. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана ў 1990.

КАЗАКЕВІЧ Цімафей Васілевіч, н. ў 1898. Служачы. Рэпрэсіраваны ў 1935. Рэабілітаваны ў 1989.

КАЗАКЕВІЧ Цімафей Васілевіч, н. ў 1898. Рабочы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

КАЗЕПАЛЯНСКІ Іван Сямёнавіч, н. ў 1898. Працаваў на аўтарамонтным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

КАЗЛОЎСКІ Іосіф Вікенцьевіч, н. ў 1903. Працаваў бухгалтарам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1991.

КАЗМЕР Ян Якубавіч, н. ў 1897. Працаваў на Казіміраўскай МТС. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1965.

КАКАШЫНСКАЯ Марыя Савельеўна, н. ў 1890. Працавала дэзінфектарам на санстанцыі. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1992.

КАЛЕНДА Антон Юльянавіч, н. ў 1907. Працаваў рахункаводам на лесаскладзе. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1965.

КАЛІСТРАТАЎ Макар Дарафеевіч, н. ў 1873. Працаваў вартаўніком. Рэпрэсіраваны ў 1935. Рэабілітаваны ў 1989.

КАМЕНСКІ Франц Мацвеевіч, н. ў 1891. Працаваў дворнікам у пединстытуце. Рэпрэсіраваны ў 1935. Рэабілітаваны ў 1989.

КАМКОЎ Міхаіл Радзівонавіч, н. ў 1907. Працаваў ветурачом у саўгасе «Вейна». Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1970.

КАМКОЎ Радзівон Лаўрэнавіч, н. ў 1877. Працаваў вартаўніком. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

КАНОПЛІН Мацвей Яфімавіч, н. ў 1898. Працаваў эканамістам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1934. Рэабілітаваны ў 1965.

КАНТАРОВІЧ Шмерка Евелевіч, н. ў 1906. Працаваў настаўнікам у СШ № 1. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

КАНЦЭВІЧ Парфірый Іванавіч, н. ў 1896. Працаваў слесарам на шаўковай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1940. Рэабілітаваны ў 1975.

КАРАБАН Каліст рат Пятровіч, н. ў 1892. Працаваў электраманцёрам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1965.

КАРАБЕЙНІКАЎ Леанід Канстанцінавіч, н. ў 1888. Працаваў начальнікам аддзела ў Захаджылдарбудзе. Рэпрэсіраваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1975.

КАРАЛЕЦКІ Аляксандр Вікенцьевіч, н. ў 1884. Працаваў на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

КАРАМАЗІН Максім Захаравіч, н. ў 1869. Арыштаваны 15.12.1929, прыгавораны да 3 гадоў высылкі. Рэабілітаваны 20.10.1992.

КАРАНЕЎСКАЯ Іраіда Георгіеўна, н. ў 1903. Арыштавана 16.8.1946, прыгаворана да 5 гадоў высылкі. Рэабілітавана 27.5.1992.

КАРАТКЕВІЧ Вікенцій Фаміч, н. ў 1899. Працаваў грузчыкам у харчгандлі. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

КАРЖАНЕЎСКІ Іосіф Антонавіч, н. ў 1887. Працаваў цесляром на хлебазаводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

КАРНЕЕЎ Андрэй Рыгоравіч, н. ў 1869. Працаваў настаўнікам у СШ № 7. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

КАРОЛЬ Данат Людвігавіч, н. ў 1877. Працаваў бухгалтарам. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

КАРПЕНКА Іван Іванавіч, н. ў 1897. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

КАРПОВІЧ Пётр Дарафеевіч, н. ў 1884. Працаваў экспедытарам на трубаліцейным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

КАСІНСКІ Аляксандр Пятровіч, н. ў 1899. Працаваў машыністам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

КАЎТУНОВІЧ Антон Станіслававіч, н. ў 1883. Працаваў бухгалтарам на шаўковай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1989.

КАХАНОЎСКІ Міхаіл Лукіч, н. ў 1898. Працаваў у кнігагандлі. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

КАШМЕТ Лаўрэнцій Фёдаравіч, н. ў 1867. Арыштаваны 15.12.1929, прыгавораны да 3 гадоў высылкі. Рэабілітаваны 20.10.1992.

КАШЫН Саламон Вульфавіч, н. ў 1897. Працаваў дырэктарам аблгандлю. Рэпрэсіраваны ў 1951. Рэабілітаваны ў 1991.

КЕЛЛЕР Ніска Хаймавіч, н. ў 1913. Праца-

ваў слесарам у дарожна-эксплуатацыйным упраўленні. Рэпрэсіраваны ў 1935. Рэабілітаваны ў 1970.

КЁПЛІНА Марыя Адольфаўна, н. ў 1916. Працавала фармацэўтам у аптэцы № 4. Рэпрэсіравана ў 1945. Рэабілітавана ў 1992.

КІНЖАЛАВА Наталля Мікалаеўна, н. ў 1920. Працавала на птушкакамбінаце. Рэпрэсіравана ў 1945. Рэабілітавана ў 1992.

КІРЫН Вера Паўлаўна, н. ў 1922. Арыштавана 21.11.1945, прыгаворана да 3 гадоў высылкі. Рэабілітавана 12.10.1992.

КІСЯЛЁЎ Цімафей Іванавіч, н. ў 1888. Працаваў на аўтарамонтным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

КЛАДО Мікалай Сяргеевіч, н. ў 1907. Чырванаармеец. Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1960.

КЛЕПІК Вікенцій Іосіфавіч, н. ў 1890. Быў музыкантам у вайсковай часці. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

КЛІМЕНКА Ілья Дзмітрыевіч, н. ў 1895. Працаваў загадчыкам аддзялення ў бальніцы. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1970.

КЛІНЦОЎ Ілья Сямёнавіч, н. ў 1886. Працаваў механікам млына. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

КЛЯБАНАЎ Самуіл Іцкавіч, н. ў 1878. Працаваў наборшчыкам у друкарні. Рэпрэсіраваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1975.

КЛЯЎС Уладзімір Пятровіч, н. ў 1915. Ваеннаслужачы. Рэпрэсіраваны ў 1943. Рэабілітаваны ў 1965.

КНОРАЗ Павел Антонавіч, н. ў 1892. Працаваў бухгалтарам на торфазаводзе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

КНЯЗЕЎ Канстанцін Пятровіч, н. ў 1884. Працаваў вартаўніком на базе па нарыхтоўцы збожжа. Рэпрэсіраваны ў 1934. Рэабілітаваны ў 1992.

КОПЫСЦЬ Даніла Іванавіч, н. ў 1886. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

КОСЦІН Аляксей Сцяпанавіч, н. ў 1874. Працаваў цесляром на шаўковай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

КОСЦІН Васіль Сцяпанавіч, н. ў 1873. Працаваў вартаўніком на шаўковай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

КРАВЕЦ Любоў Дзямідаўна, н. ў 1922. Працавала бухгалтарам у аблмясцпраме. Рэпрэсіравана ў 1945. Рэабілітавана ў 1992.

КРАСАЧКА Міхаіл Іосіфавіч, н. ў 1898. Працаваў сакратаром парткома. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

КРАСНІКАЎ Уладзімір Мікітавіч, н. ў 1875. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

КРАСНІЦКІ Аляксандр Афанасьевіч, н. ў 1890. Працаваў настаўнікам у СШ № 1. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

КРАСНІЦКІ Барыс Вавілавіч, н. ў 1906. Працаваў рэжысёрам у драмтэатры. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1965.

КРАЎЦОЎ Сцяпан Іванавіч, н. ў 1879. Працаваў на птушкакамбінаце. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1991.

КРУТАЛОЎСКАЯ Марыя Сямёнаўна, н. ў 1907. Працавала манікюршай у цырульні. Рэпрэсіравана ў 1945. Рэабілітавана ў 1992.

КРЫВЯНКОЎ Пётр Навумавіч, н. ў 1879. Працаваў дворнікам на аўтарамонтным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

КРЫЛОЎ Уладзімір Андрэевіч, н. ў 1916. Працаваў загадчыкам склада. Рэпрэсіраваны ў 1946. Рэабілітаваны ў 1975.

КРЫЦКІ Мікалай Аляксандравіч, н. ў 1902. Працаваў тэхнікам у водаканалтрэсце. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1970.

КРЭЙДЗІН Георгій Мікітавіч, н. ў 1885. Працаваў у працоўнай калоніі. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

КУЛЬБАЦКІ Міхаіл Андрэевіч, н. ў 1903. Працаваў майстрам арцелі «Чырвоны металіст». Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

КУРЫЛОВІЧ Фёдар Данілавіч, н. ў 1911. Працаваў у рачным порце. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1968.

КУТОРГА Іосіф Ігнатавіч, н. ў 1882. Працаваў машыністам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

КУТОРГА Рыгор Канстанцінавіч, н. ў 1860. Пенсіянер. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

КУТЫРЛА Пётр Ігнатавіч, н. ў 1892. Працаваў слесарам на аўтарамонтным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

КУХАРЭНКА Еўдакія Пятроўна, н. ў 1897. Працавала бухгалтарам у Асаавіяхіме. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

КУЦЫ Ілья Міхайлавіч, н. ў 1903. Працаваў пажарнікам. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1992.

КУЧАРАВЫ Іван Іванавіч, н. ў 1887. Служачы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

КУШКА Антон Іванавіч, н. ў 1883. Працаваў конюхам у псіхіятрычнай бальніцы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

ЛАБАНОЎСКІ Авель Андрэевіч, н. ў 1884. Працаваў настаўнікам у СШ № 1. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны.

ЛАГУН Рыгор Лазаравіч, н. ў 1902. Працаваў сталяром у псіхіятрычнай бальніцы. Рэпрэсіраваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАМАНСКАЯ Алена Аляксандраўна, н. ў 1917. Працавала на маслазаводзе. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана ў 1989.

ЛАЎРЫК Аляксей Назаравіч, н. ў 1889. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАЎРЫК Іван Дзмітрыевіч, н. ў 1886. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛАЎРЭНЦЬЕЎ Канстанцін Цімафеевіч, н. ў 1894. Працаваў настаўнікам. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1975.

ЛАЎСКАЯ Ганна Міхайлаўна, н. ў 1908. Хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1989.

ЛАЎСКІ Іосіф Міхайлавіч, н. ў 1896. Працаваў дзяжурным на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛЕВАНОВІЧ Мікалай Мацвеевіч, н. ў 1904. Ваеннаслужачы. Рэпрэсіраваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1990.

ЛЕВІК Самуіл Гіршавіч, н. ў 1889. Працаваў у арцелі. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

ЛЕЙЗАРОВІЧ Шмуля Мендзелевіч, н. ў 1905. Працаваў шафёрам у Белпрамбудзе. Рэпрэсіраваны ў 1940. Рэабілітаваны ў 1975.

ЛЕЙСНЕР Ян Крышавіч, н. ў 1890. Служачы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1961.

ЛЕЛІК Пётр Іларыёнавіч, н. ў 1883. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛІВАРАНЦЭВІЧ Фёдар Сямёнавіч, н. ў 1870. Пенсіянер. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ЛІНЧЭЎСКАЯ Анэля Ігнатаўна, н. ў 1887. Рэпрэсіравана ў 1938. Рэабілітавана ў 1992.

ЛІПСКІ Адольф Іванавіч, дырэктар канторы «Белдзяржтранс». Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛІСЕЦКІ Вітольд Людвігавіч, н. ў 1909. Працаваў загадчыкам склада на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны.

ЛІСУНОВА Ніна Пятроўна, н. ў 1914. Арыштавана 11.5.1945, прыгаворана да 3 гадоў папраўчапрацоўных работ. Рэабілітавана 22.6.1992.

ЛІЎШЫЦ Захар Барысавіч, н. ў 1906. Працаваў сталяром у аблбудтрэсце. Рэпрэсіраваны ў 1949. Рэабілітаваны ў 1991.

ЛІХТЭНБЕРГ Веніамін Мееравіч, н. ў 1909. Працаваў на прамкамбінаце. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1965.

ЛІХУНОЎ Мікалай Дзмітрыевіч, н. ў 1907. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1990.

ЛІЦВІНАЎ Сцяпан Феліксавіч, н. ў 1896. Працаваў загадчыкам склада. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1992.

ЛУЦКІ Васіль Сяргеевіч, н. ў 1880. Працаваў у арцелі інвалідаў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛУЦУН Васіль Сяргеевіч, н. ў 1880. Працаваў у арцелі інвалідаў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛУШЧЫКАЎ Сяргей Іванавіч, н. ў 1909. Працаваў педагогам. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1975.

ЛЮБОВІЧ Дзмітрый Іванавіч, н. ў 1883. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

ЛЮДКОЎСКАЯ Марыя Канстанцінаўна, н. ў 1884. Працавала краўчыхай. Рэпрэсіравана ў 1929. Рэабілітавана ў 1975.

ЛЮКСЕМБУРГ Абрам Лейзеравіч, н. ў 1908. Працаваў бухгалтарам у швейнай арцелі. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛЮТЭР Карл Фрыдрыхавіч, н. ў 1914. Працаваў дырэктарам МТС. Рэпрэсіраваны ў 1945. Рэабілітаваны ў 1960.

ЛЮШЫНСКІ Веніямін Абрамавіч, н. ў 1921. Працаваў грузчыкам на шаўковай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1975.

ЛЯЛЕБІНА Надзея Андрэеўна, н. ў 1919. Хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1989.

ЛЯСНЕЎСКАЯ Еўдакія Адольфаўна, н. ў 1895. Працавала бухгалтарам. Рэпрэсіравана ў 1941. Рэабілітавана ў 1990.

ЛЯЎДАНСКІ Аляксандр Іосіфавіч, н. ў 1899. Працаваў інжынерам сувязі ў вайсковай часці. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1975.

ЛЯХ Сільвестр Маркавіч, н. ў 1874. Працаваў у музеі. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛЯХОВІЧ Канстанцін Адамавіч, н. ў 1864. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

МАЖАРАЎ Пётр Максімавіч, н. ў 1902. Працаваў начальнікам ветслужбы ў вайсковай часці. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

МАЗОЛЬ Іван Канстанцінавіч, н. ў 1887. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

МАЙСЕЕНКА Карней Міхайлавіч, н. ў 1868. Служачы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

МАКАРАЎ Пётр Аляксеевіч, н. ў 1902. Працаваў начальнікам ветслужбы ў вайсковай часці. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны.

МАКСІМАЎ Дзмітрый Сямёнавіч, н. ў 1894. Працаваў на мэблевай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

МАЛАРАД Міхаіл Васілевіч, н. ў 1889. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

МАЛОЧКА Дзяніс Сафронавіч, н. ў 1883. Працаваў настаўнікам. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1989.

МАНДЭЛЬБАЎМ Макс Самуйлавіч, н. ў 1899. Працаваў начальнікам цэха на кандытарскай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

МАНУЙЛА Георгій Цімафеевіч, н. ў 1912. Працаваў машыністам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1945. Рэабілітаваны ў 1970.

МАНЬКОЎСКІ Станіслаў Адольфавіч, н. ў 1899. Працаваў слесарам на трубаліцейным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

З успамінаў Э.Манькоўскага

Мае тры браты і сястра нарадзіліся ў Магілёве. На вуліцы Кальцова, непадалёку ад гарадскіх Карабанаўскіх могілак, стаяў наш дом, насупраць жыў вартаўнік могілак Дударэнка. Неяк летам 1934 г. ці 1935 г. мы са старэйшым братам Бронікам гулялі на вуліцы і бачылі, як да Дударэнкі прыйшлі важныя ваенныя людзі. Адзін са «шпаламі» ў пятліцах, трое з «кубікамі». Хвілін праз 10—15 усе яны пайшлі на могілкі. Нам хацелася ведаць, каго і дзе будуць хаваць ваенныя. Крадучыся за кустамі, мы перабягалі ад аднаго надмагільнага помніка да другога. Дударэнка прывёў ваенных на паўднёва-заходнюю абрывістую частку могілак, дзе яшчэ не было пахаванняў. Начальнік са «шпаламі» адышоў ад абрыву метраў на трыццаць і спыніўся каля дрэва. Пасля строга прыказаў Дударэнку гэту частку могілак не займаць і трымаць язык за зубамі. Тады мы з братам нічога не зразумелі. Недзе праз паўгода я падслухаў размову бацькі з маці пра тое, што энкавэдэшнікі летам на калёсах, зімой на санях прывозяць трупы людзей і закопваюць на могілках. Я расказаў Браніславу. І мы зноў рашыліся пайсці туды. На некалі свабодным месцы ўжо былі свежыя магілы. Адна з іх пакуль пуставала. Пасля мы неяк згубілі цікавасць да могілак, ведалі, што калі-нікалі там хаваюць людзей з турмы.

Восенню, мы ўжо хадзілі ў школу, да нас прыйшлі тры мужчыны. Усю сям'ю сагналі ў адзін пакой і нешта ўзяліся шукаць. Перавярнулі ложкі, зламалі некалькі стулаў і адзіную шафу. Нічога не знайшлі. Бацьку, Манькоўскага Станіслава Адольфавіча, забралі з сабой. З той пары мы яго не бачылі і пра лёс яго нічога не ведалі. Суседзі паглядалі на нас коса, да нас ніхто не заходзіў у нашу хату, бо лічылі сям'ёй ворага народа. Мы з братам ведалі, што ворагаў народа расстрэльваюць і хаваюць на нашых могілках, а таксама ў равах каля скрыжавання дарог Орша—Гомель і Магілёў—Прапойск. Нам хацелася ведаць, дзе будзе пахаваны бацька. Мы не прапускалі ніводнай турэмнай падводы. Звычайна хадзілі на могілкі вечарам, хоць часам атрымлівалі па карку ад энкавэдэшнікаў, якія суправаджалі вознікаў. Прывозілі мерцвякоў зусім голымі ці ў ірванай сподняй бялізне, часам у скрынях з негабляваных дошак ці аполкаў. Скідвалі іх як дровы ў выкапаныя загадзя магілы...

У 1939 г. некалі пустое месца на могілках было занята вялікімі і малымі магіламі. З гадамі надмагільныя ўзгоркі станавіліся ніжэй і ніжэй. У канцы 60-х гадоў гарадскія ўлады дазволілі хаваць тут памерлых магіляўчан. Пад абрыў выкідваліся косці і чарапы ахвяр рэпрэсій. Куды я толькі не пісаў пра гэтае вар'яцтва. Ніякага адказу... Прыходзілі некалькі разоў рабочыя з камунгаса. Збіралі астанкі, недзе зноў закопвалі. Цяпер на касцях расстраляных і закатаваных новыя пахаванні...

У 1960 г. мы нарэшце даведаліся пра лёс бацькі. Яго сапраўды расстралялі. Шмат было слёз, калі атрымалі паведамленне з пракуратуры, што Манькоўскі Станіслаў Адольфавіч рэабілітаваны і справа яго спынена з-за адсутнасці саставу злачынства...

МАРДАКОВА Надзея Карпаўна. Працавала на станцыі Магілёў. Рэпрэсіравана ў 1945. Рэабілітавана ў 1989.

МАРКОВІЧ Аляксандр Паўлавіч, н. ў 1896. Працаваў настаўнікам. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

МАРФЕЛЬ Іван Піянавіч, н. ў 1896. Працаваў загадчыкам склада. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

МАРЭК Іцка-Хаім Рафаілавіч, н. ў 1898. Працаваў брыгадзірам на шаўковай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1965.

МАСІЕВІЧ Аркадзь Нікадзімавіч, н. ў 1901. Працаваў грузчыкам на трубаліцейным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

МАСЮКЕВІЧ Мікалай Ануфрыевіч, н. ў 1887. Працаваў у канторы «Белплодаагародніна». Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

МЕРМАН Ізраіль Гіршавіч, н. ў 1909. Служачы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

МІГУРСКІ Севасцьян Іванавіч, н. ў 1908. Працаваў пажарнікам. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

МІКЛОЎСКІ Іовель Фёдаравіч, н. ў 1896. Працаваў у абласным упраўленні сувязі. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

МІКЛУШОЎ Мікалай Аляксандравіч, н. ў 1906. Працаваў стрэлачнікам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

МІКУЛІЧ Емяльян Пятровіч, н. ў 1888. Пра-

цаваў планавіком у гарсавеце. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1992.

МІЛАЎЗОРАЎ Андрэй Герасімавіч, н. ў 1874. Працаваў на цагельным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

МІНЬКОЎ Сцяпан Сямёнавіч, н. ў 1882. Працаваў рамізнікам у транспартнай арцелі. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

МІХАЙЛАЎ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1913. Працаваў на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1939. Рэабілітаваны ў 1990.

МІХАЙЛАЎ Якаў Ільіч, н. ў 1896. Ваеннаслужачы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

МОКРЫ Сямён Фёдаравіч, н. ў 1880. Працаваў рамізнікам у транспартнай канторы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

МОНІЧ Іван Паўлавіч, н. ў 1901. Рабочы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1939.

МОЦКІН Залман Майсеевіч, н. ў 1893. Працаваў бухгалтарам на заводзе імя Дзімітрава. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1975.

МОЦНЫ Іван Фаміч, н. ў 1889. Працаваў настаўнікам. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

МЯНЬКОВІЧ Мітрафан Іванавіч, н. ў 1877. Працаваў вартаўніком у гаржылсаюзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

МЯНЬКОВІЧ Мітрафан Іванавіч, н. ў 1874. Працаваў вартаўніком у гаржылсаюзе. Прыгаворана да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 15.5.1989.

НАВІЦКАЯ Ніна Гаўрылаўна, н. ў 1924. Арыштавана 8.7.1950, прыгаворана да 5 гадоў папраўча-працоўных работ. Рэабілітавана 11.10.1992.

НАВІЦКІ Гаўрыла Данілавіч, н. ў 1896. Працаваў слесарам у псіхіятрычнай бальніцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

НАДТАЧЭЕЎ Дасіфей Іванавіч, н. ў 1912. Студэнт інстытута палітасветы. Рэпрэсіраваны ў 1934. Рэабілітаваны ў 1989.

НАРКЕВІЧ Георгій Лявонцьевіч, н. ў 1893. Выкладчык Магілёўскага педагагічнага вучылішча. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1940.

НАСАЦКІ Матэас Насімавіч, старшы майстар Грабянёўскага торфазавода. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

НАТАЛЕНКА Пётр Аляксандравіч, н. ў 1908. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1934. Рэабілітаваны ў 1990.

НЕШКІС Гірша Саламонавіч, н. ў 1901. Старшыня арцелі інвалідаў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

НІКІЦЕНКА Марыя Антонаўна, н. ў 1915. Дырэктар дзіцячага дома. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1989.

НІКІЦІН Аляксандр Максімавіч, н. ў 1889. Працаваў машыністам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

НОВІКАЎ Піліп Яўменавіч, н. ў 1875. Працаваў вартаўніком у зелянгасе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

НЯДЗВЕЦКАЯ Уладзіслава Аляксандраўна, н. ў 1926. Навучэнка. Рэпрэсіравана ў 1945. Рэабілітавана ў 1992.

НЯЗБЕЦКІ Іосіф Якаўлевіч, н. ў 1921. Працаваў на гарбарным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1940. Рэабілітаваны ў 1991.

ПАГУЛЯЕВА Аляксандра Лук'янаўна, н. ў 1898. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1991.

ПАДАЛКОЎ Васіль Іванавіч, н. ў 1889. Працаваў цесляром у Магілёўбудзе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

ПАДАПРЫГОР'ЕЎ Мяленцій Цімафеевіч, н. ў 1892. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ПАЛЫНІНА Валянціна Іванаўна, н. ў 1925. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1992.

ПАЛЯКОЎ Ціхан Міканоравіч, н. ў 1910. Працаваў у пажарнай ахове на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

ПАНЦЯЛЕЕЎ Андрэй Цімафеевіч, н. ў 1879. Працаваў цесляром. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ПАПЛЫКА Юлія Іванаўна, н. ў 1895. Працавала бібліятэкарам. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана ў 1989.

ПАПОЎ Мікалай Міхайлавіч, н. ў 1881. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

ПАЎЛОВІЧ Антон Іосіфавіч, н. ў 1906. Працаваў у псіхіятрычнай бальніцы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ПАЎЛОВІЧ Павел Іванавіч, н. ў 1910. Камандзір аддзялення аховы станцыі Асіповічы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1992.

ПАШКЕВІЧ Вітольд Іосіфавіч, н. ў 1882. Ксёндз. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ПАШКЕВІЧ Софія Іосіфаўна, н. ў 1877. Хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана ў 1938. Рэабілітавана ў 1989.

ПЕТРАЖЫЦКІ Аляксандр Васілевіч, н. ў 1898. Працаваў загадчыкам гаспадаркі драмтэатра. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1992.

ПЕТУХОВА Марыя Аляксандраўна, н. ў 1892. Працавала сястрой-гаспадыняй у доме адпачынку. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана ў 1990.

ПЕТЭРСОН Іван Іванавіч, н. ў 1903. Працаваў электраманцёрам на ЦЭЦ. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ПЕЎЗНЕР Ілья Калманавіч, н. ў 1900. Працаваў настаўнікам. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ПІНДУС Браніслаў Уладзіміравіч, н. ў 1919. Арыштаваны 17.5.1941, прыгавораны да 3 гадоў турэмнага зняволення. Рэабілітаваны 4.12.1992.

ПІШЧАНКА Аляксандра Міхайлаўна, н. ў

1890. Арыштавана 22.6.1929, прыгаворана да 3 гадоў высылкі. Рэабілітавана 29.9.1992.

ПІЯНТОЎСКІ Франц Феліксавіч, н. ў 1893. Працаваў камендантам пединстытута. Рэпрэсіраваны ў 1935. Рэабілітаваны ў 1970.

ПЛАСКОННЫ Іван Васілевіч, н. ў 1885. Працаваў рамізнікам на шаўковай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ПЛАСНОЎСКІ Станіслаў Уладзіміравіч, н. ў 1910. Працаваў тэхнікам на фабрыцы «Спартак». Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1991.

ПЛАТКОЎСКІ Іван Пятровіч, н. ў 1902. Працаваў грузчыкам на тарфяной базе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ПЛАХЧЫНСКІ Беньямін Шлёмавіч, н. ў 1913. Працаваў краўцом у арцелі «20 гадоў Кастрычніка». Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1992.

ПРАВАЛОЦКІ Кірыла Сцяпанавіч, н. ў 1875. Служачы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1992.

ПРАКОФ'ЕЎ Мікалай Мікалаевіч, н. ў 1896. Працаваў на шаўковай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

ПРАМЫСЛЕР Харытон Майсеевіч, н. ў 1910. Працаваў намеснікам начальніка аддзела забеспячэння на будаўніцтве ЦЭЦ. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1975.

ПРАХАРЭНКА Васіль Абрамавіч, н. ў 1879. Арыштаваны 14.3.1938, прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны 12.10.1989.

ПРОКУЛ Франц Карлавіч, н. ў 1899. Працаваў электраслесарам у Белхарчгандлі. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ПРУДКО Навум Паўлавіч, н. ў 1887. Працаваў кандуктарам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ПРУДНІКАВА Марыя Паўлаўна, н. ў 1910. Хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1992.

ПРУДНІКАЎ Павел Рыгоравіч, н. ў 1900. Працаваў в.а. дацэнта Магілёўскага пединстытута. Рэпрэсіраваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1975.

ПУНІНСКІ Андрэй Сямёнавіч, н. ў 1891. Працаваў казначэем у 1-й дзіцячай камуне. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ПУНЦЕЛЬ Пётр Антонавіч, н. ў 1904. Працаваў кладаўшчыком у Белдзяржзабеспячэнні. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

ПУСІКАЎ Сцяпан Нічыпаравіч, н. ў 1882. Працаваў цесляром у вайсковай часці. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ПУСТАВАР Васіль Якаўлевіч, н. ў 1914. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ПУСТАВАР Іван Іванавіч, н. ў 1897. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ПУСТАВАР Пётр Пятровіч, н. ў 1901. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ПУСТАВАР Савелій Сямёнавіч, н. ў 1897. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ПУСТАВАР Якаў Дзянісавіч, н. ў 1894. Працаваў брыгадзірам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ПУХОЎСКІ Георгій Фаміч, н. ў 1892. Працаваў рахункаводам у ашчаднай касе № 972. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ПУШКАЧ Яўген Ільіч, н. ў 1895. Працаваў на цагельным заводзе № 8. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1992.

ПШЫЦІК Абрам-Аба Лейбавіч, н. ў 1913. Працаваў рымарам у арцелі «1 Мая». Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1992.

ПЯСЧАНСКІ Мітрафан Іванавіч, н. ў 1883. Працаваў на цагельным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ПЯТКОВІЧ Фейвель Залманавіч, н. ў 1915. Працаваў краўцом у арцелі «20 гадоў Кастрычніка». Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1991.

ПЯТРОЎ Пётр Якаўлевіч, н. ў 1895. Працаваў электраманцёрам на ЦЭЦ. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ПЯТРОЎ Пракоп Навумавіч, н. ў 1880. Працаваў тынкоўшчыкам у жылбудзе № 9. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ПЯТРОЎСКІ Канстанцін Іванавіч, н. ў 1898. Працаваў на мэблевай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

ПЯЧОРА Станіслаў Антонавіч, н. ў 1877. Арыштаваны 15.12.1929, прыгавораны да 3 гадоў высылкі. Рэабілітаваны 26.10.1992.

ПЯЧЭРА Апалінарыя Іванаўна, н. ў 1886. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана ў 1990.

РАБАКОНЬ Іосіф Васілевіч, н. ў 1898. Працаваў начальнікам дэзактывацыйнага завода. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

РАГАНДЗЕЛЬ Меер Ізрайлевіч, н. ў 1918. Працаваў цырульнікам. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1991.

РАГОЎСКІ Мікалай Міхайлавіч, н. ў 1989. Рэпрэсіраваны ў маі 1937. Рэабілітаваны 7.4.1956.

Нарадзіўся Мікалай Міхайлавіч Рагоўскі ў Магілёве. У грамадзянскую вайну ваяваў на фронце, артылерыст. Пасля вайны служыў у Чырвонай Арміі ў Магілёве. У 1923 г. яго прызначылі начальнікам артылерыі 5-га стралковага корпуса ў Бабруйску, у 1924 г. быў камандзіраваны ў Ваенную акадэмію імя Фрунзе. Яшчэ ў 1918 г. Мікалай Міхайлавіч стаў камуністам. Арыштавалі яго ў маі 1937 г. на аснове сфабрыкаваных звестак аб прыналежнасці да так званай «змовы Тухачэўска-

га». Той трагічны дзень назаўсёды застаўся ў памяці Зінаіды Паўлаўны Рагоўскай. З мужам яна адпачывала ў санаторыі. Раптоўна ў іх нумар уварваліся людзі НКУС, перавярнулі ўсё дагары нагамі. Мікалая Міхайлавіча забралі з сабой. Быў ён у піжаме, нават не далі пераапрануцца. Як жонку «ворага народа» Зінаіду Паўлаўну накіравалі ў Цепякоўскі лагер на Разаншчыне, дзе ўжо адбывалі тэрміны жонкі Рыкава, Тухачэўскага, Алксніса... Як стала вядома пазней, М.М.Рагоўскага расстралялі ў 1937 г.

Захаваліся дзесяткі водгукаў тых, хто добра ведаў Рагоўскага. Адзін з іх, член КПСС з 1918 г. генерал-лейтэнант А.І.Тадорскі, пісаў у ЦК КПСС у 1955 г., настойваючы на перагляде справы Мікалая Міхайлавіча. Ён адзначаў, што Рагоўскі быў бездакорным камуністам. Добрападрыхтаваны ў агульнаадукацыйных адносінах, быў самым выдатным слухачом акадэміі ў сэнсе засваення тэорыі, якую дапаўняў багатым баявым і практычным вопытам. Пазней на кіруючых пасадах у артылерыі ім былі перагледжаны старыя канцэпцыі з улікам патрабаванняў навукі і тэхнікі, вытворча-эканамічных магчымасцей. Пад яго кіраўніцтвам былі распрацаваны прынцыпы баявога выкарыстання артылерыі на выпадак ваенных дзеянняў, сканструяваны новыя сістэмы артылерыйскай зброі, закладзены трывалы фундамент падрыхтоўкі каманднага і радавога саставу гэтага роду войск. Адбылася і рэарганізацыя самога артылерыйскага ўпраўлення. Рагоўскі шмат увагі аддаваў падрыхтоўцы камандных і інжынерных кадраў. Пры яго актыўным удзеле на базе артылерыйскага факультэта Ваеннай акадэміі ў 1932 г. створана Артылерыйская акадэмія, у Ваеннай акадэміі імя Фрунзе было арганізавана артылерыйскае аддзяленне. Жонка памятае Мікалая Міхайлавіча заўсёды ў клопатах пра справу. І разам з тым быў ён жыццярадасным, вясёлым, дапытлівым чалавекам. Ніхто і ніколі не мог яго папракнуць у несправядлівасці або прадузятасці. Гэта быў кіраўнік цвёрдых партыйных і агульначалавечых прынцыпаў, інтэлігент у самым высокім разуменні гэтага слова...

7 красавіка 1956 г. ваенная калегія Вярхоўнага Суда СССР разгледзела справу па абвінавачанні М.М.Рагоўскага і адмяніла прыгавор ад 10 верасня 1937 г. з-за адсутнасці саставу злачынства...

РАГОЎСКІ Мяфодзій Раманавіч, н. ў 1898. Ваеннаслужачы. Рэпрэсіраваны ў 1945. Рэабілітаваны ў 1992.

РАДЗЕВІЧ Сямён Фядотавіч, н. ў 1868. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

РАДЗІВОНАВА Галіна Яўгенаўна, н. ў 1906. Працавала лабаранткай у бактэрыялагічнай лабараторыі. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана ў 1990.

РАДКЕВІЧ Сямён Цімафеевіч, н. ў 1902, дацэнт Магілёўскага педінстытута. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1940.

РАДКЕВІЧ Франц Канстанцінавіч, н. ў 1916. Працаваў нарыхтоўшчыкам у Белкаапгандлі. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

РАДОЎСКІ Канстанцін Вікенцьевіч, н. ў 1902. Ваеннаслужачы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

РАЕЎСКІ Аляксандр Сямёнавіч, н. ў 1868. Епіскап. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

РАЖДЗЕСТВЕНСКІ Яўген Уладзіміравіч, н. ў 1885. Працаваў бухгалтарам у водаканалтрэсце. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

РАКОП Канстанцін Канстанцінавіч, н. ў 1904. Працаваў слесарам на гарбарным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1992.

РАМАНДЗЕЛЬ Меер Ізрайлевіч, н. ў 1918. Працаваў цырульнікам. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1991.

РАМАНДЗЕЛЬ Неах Ізрайлевіч, н. ў 1917. Працаваў краўцом у арцелі «20 гадоў Кастрычніка». Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1991.

РАМАНОЎСКАЯ Юлія Станіславаўна, н. ў 1910. Хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана ў 1938. Рэабілітавана ў 1991.

РЖАВУЦКІ Пётр Стафанавіч, н. ў 1867. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

РОЙЗНЕР Ефраім Зэлікавіч, н. ў 1916. Працаваў у працоўнай калоніі. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1991.

РОКАП Антон Іванавіч, н. ў 1910. Працаваў слесарам на шаўковай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

РУБАНОЎСКІ Андрэй Васілевіч, н. ў 1904. Працаваў урачом у 1-й бальніцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

РУБАНОЎСКІ Андрэй Васілевіч, н. ў 1906. Працаваў слесарам-машыністам на гарбарным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны.

РУДКОЎСКІ Сігізмунд Раманавіч, н. ў 1892. Працаваў слесарам у лясгасе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1992.

РУДКОЎСКІ Сігізмунд Раманавіч. Працаваў галоўным механікам завода «Чырвоная зорка». Рэпрэсіраваны ў 1937, у сакавіку 1938 расстраляны. Рэабілітаваны ў 1977.

РУДНІЦКІ Франц Уладзіміравіч, н. ў 1911.

Працаваў на цагельным заводзе № 9. Рэпрэсіраваны ў 1927. Рэабілітаваны ў 1989.

РУДКОЎСКІ Казімір Антонавіч, н. ў 1902. Працаваў бухгалтарам на шаўковай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

РЫЖКОЎ Мікалай Іванавіч, н. ў 1885. Працаваў механікам на цагельным заводзе № 4. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

РЫЛЕЕВА Ганна Васілеўна, н. ў 1885. Працавала ў дзіцячым доме. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана ў 1989.

РЭАНТОВІЧ Антон Аляксандравіч, н. ў 1879. Пенсіянер. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1992.

САБІЛА Сяргей Іванавіч, н. ў 1903. Працаваў кандытарам на хлебазаводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

САВЕЛЬЕВА Настасся Рыгораўна, н. ў 1908. Працавала майстрам на швейнай фабрыцы. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана ў 1990.

САВЕЧКІН Уладзімір Андрэевіч, н. ў 1916. Працаваў майстрам у арцелі інвалідаў. Рэпрэсіраваны ў 1946. Рэабілітаваны ў 1990.

САВІНІЧ Іосіф Якаўлевіч, н. ў 1895. Працаваў у гаркамунгасе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

САВІНІЧ Станіслаў Мікалаевіч, н. ў 1885. Працаваў вартаўніком у Белхарчгандлі. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

САВІЦКАЯ Капярына Стафанаўна, н. ў 1881. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана ў 1992.

САВІЦКІ Пётр Мікалаевіч, н. ў 1890. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

САВОЦКІ Іван Іванавіч, н. ў 1899. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

САВОЦКІ Рыгор Іванавіч, н. ў 1893. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

САКАЛОВА Нінэль Логінаўна, н. ў 1916. Працавала бухгалтарам у ваенгандлі. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1991.

САКАЛОЎ Васіль Канстанцінавіч, н. ў 1877. Працаваў рахункаводам у харчгандлі. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1992.

САКАЛОЎ Міхаіл Феафанавіч, н. ў 1876. Працаваў інжынерам у вайсковай часці. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

САКАЛОЎСКІ Браніслаў Пятровіч, н. ў 1888. Працаваў слесарам на аўтарамонтным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

САКСОН Людвіг Вікенцьевіч, н. ў 1876. Працаваў швейцарам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1992.

САЛАПЕК Пётр Пятровіч, н. ў 1898. Працаваў настаўнікам у СШ № 1. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

САЛОПАЎ Георгій Пракопавіч, н. ў 1921. Чырвонаармеец. Рэпрэсіраваны ў 1942. Рэабілітаваны ў 1990.

САПІР Ісай Давыдавіч, н. ў 1897. Працаваў сталяром на сушыльным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

САРАТОЎСКІ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1883. Працаваў настаўнікам. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1990.

САРАЧЫНСКІ Павел Віктаравіч, н. ў 1915. Працаваў рахункаводам на трубаліцейным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

САРКІСАЎ Вартан Георгіевіч, н. ў 1902. Працаваў інжынерам на шаўковай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

САСНОЎСКАЯ Стафанія Іосіфаўна, н. ў 1914. Рэпрэсіравана ў 1934. Рэабілітавана ў 1992.

САЎЧАНКА Ціхан Кірылавіч, н. ў 1882. Рэпрэсіраваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1990.

СВЯТЛОЎ Мікіта Пятровіч, н. ў 1886. Працаваў конюхам у гарадскім аддзеле НКУС. Рэпрэсіраваны ў 1945. Рэабілітаваны ў 1992.

СЕЛЮКОЎ Сямён Данілавіч, н. ў 1904. Працаваў слесарам у дэпо станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

СЕСІН Васіль Іванавіч, н. ў 1903. Працаваў заатэхнікам у саўгасе «Вейна». Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1990.

СІВІЦКІ Яўген Ігнатавіч, н. ў 1908. Працаваў урачом-тэрапеўтам. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

СІДАРАЎ Улас Дзмітрыевіч, н. ў 1909. Працаваў на сушыльным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1991.

СІДАРОВІЧ Васіль Фёдаравіч, н. ў 1907. Працаваў інжынерам у аблбудтрэсце. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1990.

СІДАРОВІЧ Вера Рыгораўна, н. ў 1903. Працавала інжынерам у аблкамунгасе. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1992.

СІДАРЭНКА Самуіл Мяфодзьевіч, н. ў 1877. Працаваў на швейнай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

СІДЛЕР Мацвей Іларыёнавіч, н. ў 1880. Працаваў краўцом у арцелі «Аб'яднанне». Рэпрэсіраваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1990.

СІН Ван Ю., н. ў 1900. Працаваў на заводзе імя Дзімітрава. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

СІНІЦКІ Фелікс Іванавіч, н. ў 1887. Працаваў пекарам. Прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны 15.5.1989.

СІЦАЙЛА Антон Іванавіч, н. ў 1872. Працаваў токарам у дэпо на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

СІРОТКІН Ізраіль Ісаевіч, н. ў 1912. Працаваў фоталабарантам. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

СЛОСКАН Баляслаў, н. ў 1898 у Латвіі. Каталіцкі епіскап і адміністратар Магілёўскай і Мінскай епархій. У 1926 узведзены Ватыканам у сан епіскапа з месцам знаходжання ў Магілёве. У 1930 ён быў арыштаваны органамі НКУС і асуджаны на 3 гады ссылкі. Пасля адбыцця тэрміну вярнуўся ў Магілёў, дзе працягваў рэлігійную дзейнасць. Праз паўгода інтэрніраваны за мяжу. Памёр у 1981.

СМАТРЫЦКІ Сямён Паўлавіч, н. ў 1880. Працаваў цесляром на хлебазаводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

СМІЛЯРОЎ Арыстарх Якаўлевіч, н. ў 1883. Працаваў сталяром у ваенгандлі. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

СМЫЧОК Лізавета Самуілаўна, н. ў 1926. Арыштавана 15.10.1945, прыгаворана да 10 гадоў папраўча-працоўных работ. Рэабілітавана 30.11.1992.

СОЛАДАЎ Антон Трафімавіч, н. ў 1905. Працаваў экспедытарам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

СОРЫН Майсей Хаймавіч, н. ў 1894. Працаваў майстрам на хлебазаводзе. Рэпрэсіраваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1990.

СОТЧАНКА Андрэй Фёдаравіч, н. ў 1918. Рэпрэсіраваны ў 1950. Рэабілітаваны ў 1992.

СПІЦЫН Цімафей Карпавіч, н. ў 1893. Працаваў санітарам у псіхіятрычнай бальніцы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

СТАНКЕВІЧ Дзмітрый Францавіч, н. ў 1907. Працаваў слесарам на шаўковай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

СТАНКЕВІЧ Сцяпан Іванавіч, н. ў 1889. Працаваў дворнікам у пединстытуце. Рэпрэсіраваны ў 1935. Рэабілітаваны ў 1990.

СТРАДЗІНА Казіміра Францаўна, н. ў 1882. Арыштавана 22.6.1929. Прыгаворана да 3 гадоў высылкі. Рэабілітавана 29.9.1992.

СТУПАК Даніла Сазонавіч, н. ў 1888. Арыштаваны 15.12.1929. Прыгавораны да 3 гадоў высылкі. Рэабілітаваны 26.10.1992.

СТЫЧЭНКА Марыя Іосіфаўна, н. ў 1890. Рэпрэсіравана ў 1938. Рэабілітавана ў 1991.

СУДЗЯНКОЎ Рыгор Кірылавіч, н. ў 1911. Працаваў шафёрам у канторы па нарыхтоўцы лекавых траў. Рэпрэсіраваны ў 1945. Рэабілітаваны ў 1992.

СУПІТАЛЁЎ Кузьма Якаўлевіч. Працаваў цесляром у канторы «Дабрабыт». Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

СУШКО Рыгор Марцінавіч, н. ў 1885. Працаваў касірам на тарным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

СЦЕПЧАНКОЎ Барыс Сцяпанавіч, н. ў 1905. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

СЫТНІК Карп Ільіч, н. ў 1889. Служачы ваенгандлю. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

СЯМЁНАВА Алена Аляксандраўна, н. ў 1925. Рэпрэсіравана ў 1945. Рэабілітавана ў 1992.

СЯМЁНАВА Ірына Васілеўна, н. ў 1903. Працавала настаўніцай. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1992.

СЯМЁНАВА Марыя Аляксандраўна, н. ў 1905. Працавала ў дзіцячых яслях. Рэпрэсіравана ў 1938. Рэабілітавана ў 1992.

СЯНЬКОЎСКІ Яўген Пятровіч, н. ў 1887. Працаваў юрыстам на швейнай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

СЯЎБО Іван Іванавіч, н. ў 1865. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

ТАНКЕВІЧ Вольга Іванаўна, н. ў 1923. Студэнтка музычнага вучылішча. Рэпрэсіравана ў 1945. Рэабілітавана ў 1992.

ТАРАНАВА Вольга Пятроўна, н. ў 1919. Працавала выкладчыцай у пединстытуце. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1992.

ТАТАЛОВІЧ Марыяна Іванаўна, н. ў 1882. Рэпрэсіравана ў 1938. Рэабілітавана ў 1991.

ТРАФІМЕНКА Павел Фёдаравіч, н. ў 1888. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны.

ТРАФІМЕНКА Павел Фёдаравіч, н. ў 1890. Працаваў вартаўніком. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

ТРАЦЦЯКОВА Раіса Фёдараўна, н. ў 1896. Хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана ў 1989.

ТРУСАЎ Андрэй Мацвеевіч, н. ў 1890. Працаваў вартаўніком у гархарчгандлі. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ТУМАНАЎ Аляксандр Васілевіч, н. ў 1914. Працаваў на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1950. Рэабілітаваны ў 1991.

ТУМІЛОВІЧ Іван Данілавіч, н. ў 1899. Выкладчык педагогікі Магілёўскага педагагічнага вучылішча. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1939.

ТУРАЎ Мітрафан Данілавіч, н. ў 1876. Святчэннік. Рэпрэсіраваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1990.

ТЫМАНСКІ Сямён Іванавіч, н. ў 1880. Працаваў інжынерам на заводзе № 459. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1992.

УЮШКІН Уладзімір Сяргеевіч, н. ў 1890. Працаваў начальнікам аддзела ў Заходжылдарбудзе. Рэпрэсіраваны ў 1931. Рэабілітаваны ў 1990.

ФЁДАРАЎ Васіль Васілевіч, н. ў 1884. Працаваў машыністам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ФЁДАРАЎ Міхаіл Якімавіч, н. ў 1888. Працаваў у арцелі інвалідаў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ФЁДАРАЎ Панцеляймон Сяргеевіч, н. ў 1889. Працаваў на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ФІШМАН Міхаіл Самуілавіч, н. ў 1898. Старшыня прафкома харчгандлю. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ФОН-АГТА Надзея Іванаўна, н. ў 1900. Арыштавана 15.12.1929. Прыгаворана да 6 месяцаў турэмнага зняволення. Рэабілітавана 19.3.1992.

ФОНГАЎЗ Леў Ісакавіч, н. ў 1893. Працаваў фармацэўтам у аптэкаўпраўленні. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

ФРЫД Фаній Якаўлевіч, н. ў 1905. Працаваў эканамістам на швейнай фабрыцы. Засуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі ў 1937. Рэабілітаваны 24.10.1989.

ФРЫДМАН Малка Хаімавіч, н. ў 1903. Працаваў бухгалтарам на цагельным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1991.

ФРЭЙДЗІН Залман Мендэлевіч, н. ў 1906. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1990.

ФЯСЕНКА Антон Сямёнавіч, н. ў 1900. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ХАБЕРСКІ Уладзіслаў Уладзіміравіч, н. ў 1882. Працаваў землямерам у гаркамунгасе. Прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны 15.5.1989.

ХАДАРКЕВІЧ Рыгор Пятровіч, н. ў 1906. Пажарнік. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

ХАРКЕВІЧ Станіслаў Ігнатавіч, н. ў 1885. Пенсіянер. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ХАРКЕВІЧ Яфім Аляксандравіч, н. ў 1879. Пенсіянер. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

ХАРНАС Эфроім Абрамавіч, н. ў 1905. Ваеннаслужачы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ХАРЫТАНОВІЧ Мечыслаў Браніслававіч, н. ў 1909. Працаваў аграномам у канторы па нарыхтоўцы жывёлы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ХАРЫТОНАЎ Віктар Рыгоравіч, н. ў 1900. Працаваў на аўтарамонтным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

ХАСКОЛЬБЕРГ Іосіф Шлёмавіч, н. ў 1906. Працаваў бухгалтарам у друкарні. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1992.

ХМЯЛЬНІЦКІ Рыгор Іванавіч, н. ў 1880. Працаваў рахункаводам у жыллёвай канторы на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ХОЗЕРАЎ Ілья Апанасавіч, н. ў 1869. Арыштаваны 19.12.1927. Прыгавораны да высылкі. Рэабілітаваны 16.9.1992.

ХРАБТОВІЧ Мацвей Герасімавіч, н. ў 1918. Курсант пяхотнага вучылішча. Рэпрэсіраваны ў 1940. Рэабілітаваны ў 1991.

ХРУЦКАЯ Станіслава Ігнатаўна, н. ў 1868. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана ў 1992.

ХРУЦКІ Сямён Лявонцьевіч, н. ў 1874. Служачы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ХРЫТАНКОЎ Мікалай Парфенавіч, н. ў 1914. Старшыня музузвода воінскай часці. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1992.

ХУДАЛЕЙ Альберт Яфімавіч, н. ў 1894. Працаваў рамізнікам. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1992.

ЦВІРАНБРУХЕР Лейба Холевіч, н. ў 1914. Працаваў на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦЕХАНАВЕЦКАЯ Наталля Станіславаўна, н. ў 1894. Працавала рэгістратарам у паліклініцы. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана ў 1991.

ЦЕХАНАВЕЦКІ Ігар Іванавіч, н. ў 1912. Працаваў рэнтгенатэхнікам у 1-й бальніцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

ЦІМБАРЭВІЧ Станіслаў Іванавіч, н. ў 1891. Працаваў намеснікам дырэктара мясакамбіната. Рэпрэсіраваны ў 1945. Рэабілітаваны ў 1990.

ЦІМБАРЭВІЧ Фама Ільіч, н. ў 1884. Працаваў майстрам на хлебазаводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

ЦІМКОЎСКІ Мордух Гільевіч, н. ў 1892. Працаваў дырэктарам канторы па нарыхтоўцы жывёлы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ЦІТОЎ Якаў Дзмітрыевіч, н. ў 1872. Працаваў інжынерам у дэпо на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

ЦІХАНАЎ Васіль Сцяпанавіч, н. ў 1876. Пенсіянер. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

ЦОЕР Мендэль Герцавіч, н. ў 1874. Працаваў сталяром на хлебазаводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦЫБУЛЬКІН Кірыла Еўдакімавіч, н. ў 1918. Працаваў слесарам на аўтарамонтным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ЦЫМБАРЭВІЧ Станіслаў Іванавіч, н. ў 1890. Працаваў намеснікам дырэктара мясакамбіната. Рэпрэсіраваны ў 1945. Рэабілітаваны.

ЦЫРКУНОЎ Мікіта Паўлавіч, н. ў 1891. Працаваў вартаўніком на заводзе імя Дзімітрава. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

ЦЮЛЬПО Кірыла Трыфанавіч, н. ў 1884. Працаваў на базе «Саюзшвейзбыт». Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦЯЛЕЦКІ Павел Аляксандравіч, н. ў 1989. Працаваў тэлеграфістам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1927. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧАБУЧОЎ Аляксандр Аляксандравіч, н. ў 1892. Працаваў шафёрам у дарожным будаўніцтве. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧАРАПАНАВА Марыя Пятроўна, н. ў 1909. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана.

ЧАРКАСАЎ Пётр Іванавіч, н. ў 1907. Працаваў землеўпарадчыкам у аблвыканкоме. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1991.

ЧАРНОЎ Мікалай Уладзіміравіч, н. ў 1906. Рэпрэсіраваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1992.

ЧУДОВІЧ Валянцін Уладзіміравіч, н. ў 1896. Выкладчык беларускай мовы Магілёўскага педінстытута. Рэпрэсіраваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1956.

ЧЫГІР Міхаіл Міхайлавіч, н. ў 1895. Працаваў настаўнікам. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧЭПЕЛЕЎ Васіль Васілевіч, н. ў 1883. Працаваў вартаўніком у Белхарчгандлі. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧЭРСКІ Генрых Мар'янавіч, н. ў 1914. Працаваў электрыкам у вайсковай часці. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

ШАБЕКА Іосіф Сямёнавіч, н. ў 1881. Працаваў вартаўніком-асенізатарам. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

ШАЙМАЙ Ганна Мікалаеўна, н. ў 1900. Працавала ўрачом у 1-й бальніцы. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1992.

ШАНТАР Антон Іванавіч, н. ў 1909. Працаваў слесарам у дэпо станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ШАЎЧЭНКА Іван Піліпавіч, н. ў 1881. Працаваў інспектарам у лагеры НКУС. Рэпрэсіраваны ў 1947. Рэабілітаваны ў 1991.

ШАХАЎ Кірыла Георгіевіч, н. ў 1902. Працаваў бухгалтарам. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

ШВЕДКА Станіслава Іванаўна, н. ў 1909. Працавала тэлефаністкай на гарадскім тэлеграфе. Рэпрэсіравана ў 1945. Рэабілітавана ў 1992.

ШКІРОК Аляксандр Іванавіч, н. ў 1885. Рэпрэсіраваны ў 1945. Рэабілітаваны ў 1992.

ШКУРЫНСКАЯ Вікторыя Станіславаўна, н. ў 1908. Працавала поварам у дзіцячай бальніцы. Рэпрэсіравана ў 1949. Рэабілітавана ў 1991.

ШКУРЫНСКАЯ Стафанія Леапольдаўна, н. ў 1891. Працавала швачкай на швейнай фабрыцы. Рэпрэсіравана ў 1938. Рэабілітавана ў 1991.

ШКУРЫНСКІ Аляксандр Васілевіч, н. ў 1894. Працаваў на трубаліцейным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

ШКУРЫНСКІ Аляксандр Севасцьянавіч, н. ў 1894. Працаваў інспектарам у сельгасбанку. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ШМАЛЕЎСКІ Цімафей Піліпавіч, н. ў 1890. Працаваў у паравозным дэпо. Рэпрэсіраваны ў 1939. Рэабілітаваны ў 1992.

ШНЭЙДАР Лейба Гдалевіч, н. ў 1903. Працаваў сталяром у арцелі «Музхімпрам». Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1992.

ШОСТАК Сцяпан Якаўлевіч, н. ў 1899. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1991.

ШОСТАК Цімафей Якаўлевіч, н. ў 1898. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1991.

ШПІЛЕЎСКІ Вікенцій Вікенцьевіч, н. ў 1880. Рэпрэсіраваны ў 1934. Рэабілітаваны ў 1991.

ШТЭРНБЕРГ Герц Лявонавіч, н. ў 1912. Працаваў механікам на трубаліцейным заводзе. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ШУЛЬМАН Янкель Хаімавіч, н. ў 1867. Служачы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ШУМАКОЎ Максім Рыгоравіч, н. ў 1886. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ШУМАХЕР Зіновій Рыгоравіч, н. ў 1903. Працаваў слесарам у водаканалтрэсце. Рэпрэсіраваны ў 1941. Рэабілітаваны ў 1992.

ШКУРЫНСКІ Аляксандр Васілевіч, н. ў 1894. Працаваў майстрам на бетонным заводзе. Засуджаны на 3 гады пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 23.6.1989.

ШЧАРБАКОЎ Рыгор Андрэевіч, н. ў 1905. Працаваў у канторы «Белплодаагародніна». Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ШЧОРС Мікалай Канстанцінавіч, н. ў 1905. Працаваў планавіком на заводзе імя Халтурына. Рэпрэсіраваны ў 1947. Рэабілітаваны ў 1992.

ШЫМАНОЎСКАЯ Антаніна Станіславаўна, н. ў 1891. Хатняя гаспадыня. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1992.

ШЭЙМАН Хаім Ісакавіч, выкладчык Магілёўскага педінстытута. Рэпрэсіраваны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1958.

ШЭПЕЛЕЎ Цімафей Іларыёнавіч, н. ў 1869. Працаваў бухгалтарам у псіхіятрычнай бальніцы. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ШЭРМАН Вульф Абрамавіч, н. ў 1884. Працаваў на швейнай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1934. Рэабілітаваны ў 1991.

ЭЙСМАНТ Дзмітрый Іванавіч, н. ў 1887. Працаваў у медтэхнікуме. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

ЭПШТЭЙН Гірша Самуілавіч. Працаваў бухгалтарам-рэвізорам на шаўковай фабрыцы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

ЮРКЕВІЧ Сцяпан Міхайлавіч, н. ў 1897. Прарэктар Магілёўскага педінстытута. Рэпрэсіраваны ў 1937. Памёр 26.2.1938 у час допыту. Рэабілітаваны ў 1958.

ЯКУБОВІЧ Генрых Зэлікавіч, н. ў 1902. Рабочы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1991.

ЯКУБОВІЧ Гілель Эльевіч, н. ў 1887. Працаваў бухгалтарам на нафтабазе. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1992.

ЯКУШАЎ Ілья Рыгоравіч, н. ў 1892. Працаваў бухгалтарам у гарвыканкоме. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯНЧЫК Канстанцін Рыгоравіч, н. ў 1906. Працаваў прадаўцом у арцелі «Прасвет». Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

ЯНЮК Варвара Ігнатаўна, н. ў 1887. Хатняя

гаспадыня. Рэпрэсіравана ў 1944. Рэабілітавана ў 1992.

ЯРАШЭВІЧ Васіль Ільіч, н. ў 1907. Працаваў дыспетчарам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1991.

ЯРОМЕНКА Іван Фёдаравіч, н. ў 1899. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯРОМЕНКА Марк Фёдаравіч, н. ў 1896. Працаваў грузчыкам на станцыі Магілёў. Рэпрэсіраваны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯРОШЧАНКА Савасцьян Яўменавіч, н. ў 1904. Працаваў слесарам на заводзе штучнага валакна. Рэпрэсіраваны ў 1951. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯРЭНІН Іван Антонавіч, н. ў 1896. Рабочы. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны.

ЯФІМАЎ Аўрам Іванавіч, н. ў 1884. Рэпрэсіраваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1989.

***

Беларус І.М.Кузняцоў, выпускнік Томскага вышэйшага ваеннага каманднага вучылішча, падпалкоўнік, працуючы над кандыдацкай дысертацыяй «Масавыя рэпрэсіі на тэрыторыі Заходняй Сібіры ў 30-я гады і рэабілітацыя ахвяр тэрору», склаў спіс беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі, якія падверглісяся рэпрэсіям у Томскай вобласці (на тэрыторыі былога Заходне-Сібірскага краю). Ёсць у гэтым мартыралогу і ўраджэнцы г. Магілёва.

БАРНАТЫ Мікалай Іванавіч, н. ў 1912, жыў у г. Томск. Студэнт 1-га курса медінстытута. Арыштаваны ў 1935. Асуджаны на 3 гады папраўча-працоўных лагераў.

БУТОМА Аляксандр Міхайлавіч, н. ў 1883, жыў у г. Томск. Працаваў качагарам у друкарні «Саюзтрансдрук». Арыштаваны ў 1938, расстраляны.

ГОЛЬДБЕРГ Іосіф Міхайлавіч, н. ў 1876, жыў у г. Томск. Працаваў майстрам гадзіннікаў у асабістай майстэрні. Арыштаваны ў 1937, расстраляны.

ДЗЯНІСЕНКА Андрэй Мікалаевіч, н. ў 1910, жыў у г. Томск. Працаваў электрамайстрам ваенучастка № 376. Арыштаваны ў 1942. Асуджаны на 6 гадоў папраўча-працоўных лагераў.



А.І.Гаўрыловіч.

ЗМЕГАРОЎСКІ Антоній Феліксавіч, н. ў 1876, жыў у г. Томск. Працаваў тэхнікам у праектна-каштарысным бюро будтрэста. Арыштаваны ў 1937, расстраляны.

КАРЖАНЕЎСКІ Рыгор Уладзіслававіч, н. ў 1896, жыў у г. Томск. Працаваў загадчыкам сталовай працоўнай калоніі № 2. Арыштаваны ў 1937, расстраляны.

МІГАЙ Канстанцін Аляксандравіч, н. ў 1904, жыў у г. Томск. Працаваў рахункаводам. Арыштаваны ў 1937, расстраляны.

ПАШЭРСНІК Майсей Мендэлевіч, н. ў 1902, жыў у г. Томск. Працаваў эканамістам у Томскім дзяржплане. Арыштаваны ў 1937, вызвалены ў ліпені 1939.

СЕРГІЕНКА Канстанцін Іванавіч, н. ў 1890, жыў у г. Томск. Працаваў на фабрыцы «Чырвоная зорка». Арыштаваны ў 1937, расстраляны.

СЯНЬКОЎСКІ Мітрафан Адольфавіч, н. ў 1880, жыў у в. Малінаўка Томскай вобласці. Калгаснік. Арыштаваны ў 1937, расстраляны.

ШАРАЕЎ Сяргей Арцёмавіч, н. ў 1895, жыў у в. Н.-Успенка Томскай вобласці. Старшыня калгаса «Чырвоны барацьбіт». Арыштаваны ў 1937, расстраляны.

***

ГАЎРЫЛОВІЧ Альберт Ігнатавіч, н. 5.12.1880 у Магілёве. Арыштаваны Томскай ЧК у маі 1920. Расстраляны 25.6.1920. Рэабілітаваны 15.5.1993.

Назаўсёды ў памяці землякоў

ПАВЕЛ БАРЫСАВІЧ АКСЕЛЬРОД

Нарадзіўся ў 1850 г. ў Магілёве. Вучыўся ў Кіеўскім універсітэце. Адзін з лідэраў партыі меншавікоў. З пачатку 1870-х гадоў народнік. З 1883 г. член групы «Вызваленне

працы». З 1900 адзін з рэдактараў газеты «Искра». Пасля II з'езда РСДРП меншавік. У гады рэакцыі выступаў як ліквідатар — вораг бальшавікоў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў эміграцыі, заклікаў да ўзброенай інтэрвенцыі супраць Савецкай Расіі. Памёр у 1928 г.

МІКАЛАЙ ПЯТРОВІЧ ВІШНЯВЕЦКІ

Нарадзіўся ў 1897 г. ў Магілёве. Ваенны дзеяч. Скончыў Маскоўскую школу прапаршчыкаў (1916), Ваенную акадэмію імя Фрунзе. У 1917 г. па даручэнні ваеннай арганізацыі Петраградскага камітэта РСДРП(б) вёў антываенную прапаганду сярод салдат. За ўдзел у ліпеньскіх падзеях 1917 г. арыштаваны. Напярэдадні Кастрычніцкага ўзброенага паўстання старшыня штаба Чырвонай гвардыі Выбаргскага раёна Петраграда, камісар гвардыі Маскоўскага рэзервовага палка. У 1918 г. ўдзельнічаў у ліквідацыі мяцяжу Доўбар-Мусніцкага, у барацьбе супраць германскіх акупантаў, член Вышэйшай ваеннай інспекцыі, член РВС Рэзервовай арміі. З студзеня 1919 г. член РВС Украінскага фронту, з лета 1919 г. ў 1-й Коннай арміі, камісар 11-й кавалерыйскай дывізіі. У 1930-я гады на дыпламатычнай рабоце ў Японіі, потым на камандных пасадах у Чырвонай Арміі. У 1938 г. беспадстаўна арыштаваны і засуджаны на ссылку ў лагерах. Памёр у 1941 г. У 1956 г. рэабілітаваны. Яго імем названа вуліца ў Магілёве.

НАДЗЕЯ ДАВЫДАЎНА ВОЛЬПІН

Нарадзілася 6 лютага 1900 года ў Магілёве ў заможнай яўрэйскай сям'і, скончыла яўрэйскую школу і паступіла ў Маскоўскі універсітэт, але праз два гады пакінула яго. Добра валодала англійскай, нямецкай, французскай і іншымі мовамі, захапілася перакладамі прац класікаў сусветнай літаратуры. Яшчэ зараз можна сустрэць у бібліятэках яе пераводы твораў П.Мерыме, Д.Галсуорсі, Т.Мана, Г.Уэлса, В.Скота, Г.Фільдынга і іншых пісьменнікаў. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1934 г.

УЛАДЗІМІР ПІЛІПАВІЧ ГОРЫН-ГАЛКІН

Нарадзіўся 22.1.1861 г. ў Магілёве ў сям'і юрыста. Скончыў мужчынскую гімназію і Санкт-Пецярбургскі універсітэт. Удзельнік расійскага рэвалюцыйнага руху, філосаф-марксіст. У 1882 г. за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях выключаны з Харкаўскага ветэрынарнага інстытута. Стварыў нарадавольскія гурткі ў Сімферопалі, Адэсе. У 1887 г. як член Паўднёвай нарадавольскай арганізацыі арыштаваны і сасланы на 10 гадоў у Верхаянск. У 1895 г. далучыўся да сацыял-дэмакратаў. Адзін са стваральнікаў Сібірскага сацыял-дэмакратычнага саюза (1901), член Саратаўскага камітэта РСДРП (1902—03), працаваў у сацыял-дэмакратычных арганізацыях Растова-на-Доне, Баку, Тыфліса, Кутаісі. Супрацоўнічаў у газеце «Искра». Дэлегат II з'езда РСДРП (1903). Пасля з'езда застаўся за мяжой. У 1910 г. пад псеўданімам Н.Грабоўскі выдаў кнігу «Далоў матэрыялізм!: (Крытыка эмпірыякрытычнай крытыкі)». Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. вярнуўся ў Расію, са жніўня 1917 г. ў Петраградскім камітэце РСДРП(б), удзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні Кастрычніцкага паўстання. Вядомы як арганізатар Наркамата замежных спраў Расійскай Федэрацыі. З 1918 г. на кіруючай ваенна-палітычнай рабоце ў Чырвонай Арміі, з 1920 г. на навукова-педагагічнай рабоце ў Маскве. Памёр 22.7.1925 г.

МІКАЛАЙ МІКАЛАЕВІЧ КРАСЦІНСКІ

Нарадзіўся ў 1883 г. ў Магілёве. Савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, дыпламат. Удзельнік рэвалюцыі 1905—07 гг. на Беларусі, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. Скончыў Пецярбургскі універсітэт (1907), працаваў прысяжным павераным (да 1917). У рэвалюцыйны рух уключыўся з 1901 г., у 1903 г. ўступіў у Віленскую арганізацыю РСДРП, з 1907 г. працаваў у Пецярбургу ў сацыял-дэмакратычнай фракцыі Дзяржаўных дум і ў бальшавіцкім друку. За рэвалюцыйную дзейнасць неаднаразова арыштоўваўся. У 1914 г. быў высланы ў Екацярынбург, потым у Кунгур. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. член Уральскага і Екацярынбургскага камітэтаў РСДРП(б). Выбраны ва Устаноўчы сход паводле спіса бальшавікоў ад Пермскай губерні. З 1917 г. старшыня Екацярынбургскага ВРК, з таго ж года ў Петраградзе: член калегіі Наркамфіна Расійскай Федэрацыі, галоўны камісар Народнага банка, з сакавіка 1918 г. таварыш старшыні Народнага банка і адначасова каміс-



М.М.Красцінскі.



В.М.Нядзведскі.

сар юстыцыі Петраградскай працоўнай камуны і Саюза камун Паўночнай вобласці, у 1918—22 гг. народны камісар фінансаў РСФСР, у снежні 1919 — сакавіку 1912 гг. сакратар ЦК РКП(б). У 1921—30 гг. паўнамоцны прадстаўнік Савецкага ўрада ў Германіі, у 1922 г. ўдзельнічаў у Генуэзскай канферэнцыі. З 1930 г. намеснік наркома замежных спраў СССР. Член ЦК РКП(б) у 1917—21 гг., член Палітбюро ЦК РКП(б) у 1919—21 гг. Член ВЦВК з 1917 г., ЦВК СССР з 1922 г. У 1937 г. незаконна рэпрэсіраваны, расстраляны 15.3.1938 г. Рэабілітаваны пасмяротна.

САЛАМОН ЯКАЎЛЕВІЧ ЛУР'Е

Нарадзіўся 8.1.1891 г. ў Магілёве ў заможнай яўрэйскай сям'і. Да пятага класа Саламон разам са сваім братам Анатолем вучыўся ў Паланзе (Літва). Вярнуўшыся ў Магілёў, паступіў у мужчынскую гімназію, якую скончыў з залатым медалём і дадатковай пяцёркай па старагрэчаскай мове. Пасля паступіў на класічнае аддзяленне гісторыка-філалагічнага факультэта Пецярбургскага універсітэта. За выдатную дыпломную работу «Беарыйскі саюз» Саламон Якаўлевіч узнагароджваецца залатым медалём. Яго пакідаюць працаваць на кафедры. У дні Лютаўскай рэвалюцыі ён у Магілёве, быў выбраны ў Магілёўскі Савет. Пасля закрыцця газеты вярнуўся ў Петраград і ў час Кастрычніцкай рэвалюцыі працаваў у Архіве рэвалюцыі, заснаваным на базе архіва царскай ахранкі. Паводле Брэсцкага міру 1918 г. заходняя граніца прайшла па Дняпры. У Магілёве аказаліся немцы. Саламон Якаўлевіч вярнуўся ў Магілёў, дзе заснаваў газету «Рэха». У 1920-я гады ў С.Я.Лур'е праяўляецца талент усебаковага вучонага. Адна за другой паяўляюцца яго манаграфіі і кнігі: «Гісторыя антычнай грамадскай думкі» (1929), «Гісторыя Грэцыі» (т. 1, 1940), «Нарысы па гісторыі антычнай навукі» (1947), пераклады твораў Ксенафонта (1935), Плутарха (1940) і іншых антычных аўтараў. Незадоўга да Вялікай Айчыннай вайны памерла яго жонка і Саламон Якаўлевіч пакінуў родны горад. Працаваў у Ленінградскім універсітэце, выкладаў у Адэсе, загадваў кафедрай Львоўскага універсітэта. Сусветную вядомасць Лур'е прынесла кніга «Мова і культура мікенскай Грэцыі» (1957). Памёр 30.10.1964 г. *Т.Палажэнцава.*

ВОСІП МАРКАВІЧ НЯДЗВЕДСКІ

Нарадзіўся 23.6.1908 г. ў Магілёве ў сялянскай сям'і. Герой Савецкага Саюза (1940), палярнік. Працаваў качагарам, потым машыністам кацельні на Магілёўскай цукерачнай фабрыцы «10 год Кастрычніка». У 1935 г. па вярбоўцы паехаў у Ленінград, паступіў машыністам на ледакол «Ярмак». У 1937 г. ў Арктыцы зімавала 25 розных суднаў. У навігацыю 1938 г. большасць з іх было выведзена з лядовага палону, а ледакольныя параходы «Садко», «Малыгін», «Георгій Сядоў» працягвалі дрэйфаваць. Лётчыкі палярнай авіяцыі вывезлі на мацярык 184 члены экіпажа, на параходзе заставалася яшчэ 33 палярнікі. Да канца лета 1938 г. караблі дасягнулі 83-й паралелі. І ў гэты час да іх прабіўся «Ярмак», які і вывеў з ільдоў «Садко» і «Малыгіна». На ледаколе «Георгій Сядоў» было зламана рулявое кіраванне, ісці самастойна за «Ермаком» ён не мог. Вывесці параход на буксіры праз ільды не ўдалося, і яго пакінулі на новую зімоўку. На борце карабля засталося 15 добраахвотнікаў, у тым ліку і механік-машыніст В.М.Нядзведскі. 29.8.1938 г. «Сядоў» застаўся адзін і дрэйфаваў у льдах 812 дзён. Экіпаж правёў цыкл назіранняў у недаследаванай частцы Арктыкі. Праз год «Георгій Сядоў» дасягнуў самага паўночнага пункта, а пасля карабель раптам панесла на поўдзень у праліў паміж астравамі Шпіцберген і Грэнландыя. Шмат цяжкіх выпрабаванняў выпала на долю сядоўцаў, неаднойчы карабель быў на грані гібелі. Аднойчы льдзіны нахілілі яго на 30° і вада хлынула ў машыннае аддзяленне. Гераізм і вытрымка ма-

шыннай каманды дапамаглі выратаваць карабель. Толькі 12.1.1940 г. «Георгій Сядоў» сустрэўся з караблямі, пасланымі яму на дапамогу. 1 лютага сядоўцы сышлі на зямлю, а 3.2.1940 г. ўсім ім было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну Восіп Маркавіч з 1943 г. на Беларускім, 1-м Беларускім франтах. Пасля вайны працаваў у Запаляр'і. Трагічна загінуў 26.12.1959 г. пры выкананні службовых абавязкаў на палярнай станцыі. Пахаваны В.М.Нядзведскі ў Маскве. *Б.Гардзееў.*



О.Ю.Шміт.

ОТА ЮЛЬЕВІЧ ШМІТ

Нарадзіўся 30.9.1891 г. ў Магілёве ў сям'і прыказчыка. Савецкі вучоны ў галіне матэматыкі, астраноміі, геафізікі, даследчык Савецкай Арктыкі, грамадскі дзеяч, акадэмік АН СССР (1935), член-карэспандэнт (з 1933), АН УССР (1934), Герой Савецкага Саюза (1937). Тры гады вучыўся ў Магілёўскай мужчынскай гімназіі. У 1905 г. сям'я пераехала ў Адэсу, дзе будучы вучоны скончыў гімназію і паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Кіеўскага універсітэта, які скончыў у 1913 г. З 1916 г. прыват-дацэнт гэтага універсітэта. З 1920 г. прафесар Лесатэхнічнага інстытута ў Маскве, з 1923 г. — 2-га Маскоўскага універсітэта, з 1926 г. — Маскоўскага універсітэта імя Ламаносава. У 1921—24 гг. загадчык Дзяржаўнага выдавецтва, у 1932—39 гг. начальнік Галоўнага ўпраўлення Паўночнага марскога шляху. У 1926—33 гг. член, потым старшыня экспертнай камісіі Камуністычнай акадэміі па прысуджэнні прэмій імя У.І.Леніна, у 1938—49 гг. дырэктар Інстытута тэарэтычнай геафізікі АН СССР, у 1939—42 гг. віцэ-прэзідэнт АН СССР. Адзін з заснавальнікаў і галоўны рэдактар Вялікай Савецкай Энцыклапедыі (1924—41 гг.). Матэматычныя работы О.Шміта па тэорыі груп атрымалі сусветную вядомасць. Яго даследаванні па тэорыі канечных груп прадоўжаны пераважна на Беларусі ў працах Гомельскай алгебраічнай школы. Распрацаваў новую касмаганічную тэорыю паходжання Зямлі і планет Сонечнай сістэмы. Значнае месца ў жыцці О.Ю.Шміта займала экспедыцыйная дзейнасць. У 1929 г. ён узначаліў экспедыцыю на ледаколе «Георгій Сядоў», якая арганізавала на зямлі Франца-Іосіфа першую навукова-даследчую станцыю. Праз год экспедыцыя паўтарыла свой шлях, а потым абследавала заходнія берагі Паўночнай Зямлі. У 1932 г. на чале экспедыцыі на ледаколе «Сібіракоў» прайшоў упершыню за адну навігацыю з Архангельска ў Ціхі акіян. У 1933—34 гг. О.Ю.Шміт узначаліў экспедыцыю, якая спрабавала прайсці па Вялікім Паўночным маршруце за адну навігацыю на параходзе «Чэлюскін». Гэтая эпапея стала шырока вядома ва ўсім свеце як прыклад мужнасці і гераізму савецкіх людзей, іх дружбы і ўзаемавыручкі. Зацёрты льдамі «Чэлюскін» патануў, палярная льдзіна стала для чэлюскінцаў на нейкі час домам. Як успамінаў сам Ота Юльевіч, з першымі самалётамі былі адпраўлены жанчыны і дзеці, пасля старыя і хворыя. 13.4.1934 г. з ільдзіны на мацярык былі дастаўлены апошнія чэлюскінцы, удалося выратаваць нават восем сабак. Масква цёпла і ўрачыста сустракала герояў. У маі 1937 г. О.Ю.Шміт кіраваў экспедыцыяй па арганізацыі дрэйфуючай станцыі «Паўночны полюс», а ў лютым 1938 г. аперацыяй па зняцці персаналу станцыі з



Мемарыяльная дошка П.М.Лепяшынскаму і О.Ю.Шміту на доме № 41 па вуліцы Ленінскай.

ільдзіны. Узнагароджаны 3 ордэнамі Леніна, 3 іншымі ордэнамі. Памёр О.Ю.Шміт 7.9.1956 г., пахаваны ў Маскве. Імем О.Ю.Шміта названы востраў у Карскім моры, мыс у заходняй частцы Чукоцкага мора, гарадскі пасёлак і раён у Чукоцкай нацыянальнай акрузе, яго імя прысвоена Інстытуту фізікі Зямлі АН Расіі. У Магілёве яго імем названы праспект, Магілёўскі цэнтр па гідраметэаралогіі, на будынку школы № 3 (былая мужчынская гімназія, дзе ён вучыўся) і на доме № 6 па праспекце Шміта ўстаноўлены мемарыяльныя дошкі. З 1975 г. ў Магілёўскім палацы піянераў і школьнікаў працуе музей О.Ю.Шміта. Тут сабрана больш за 2 тыс. экспанатаў, якія расказваюць пра яго жыццё і навуковую дзейнасць, дэманструецца дакументальны фільм. *Б.Гардзееў.*

Імёны, якія засталіся ў гісторыі Магілёва

АГІЕВІЧ Уладзімір Іванавіч. Беларускі крытык і літаратуразнавец. Нарадзіўся 26.9.1910 г. ў в. Пухавічы Жыткавіцкага р-на. У 1937 г. скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут. Неаднаразова наведваў Магілёў, выступаў з лекцыямі і дакладамі.

АНІСАЎ Сяргей Рыгоравіч. Дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, публіцыст. Нарадзіўся 19.10.1906 г. ў в. Тур'я Краснапольскага р-на. У 1930—32 гг. жыў і працаваў у Магілёве.

БОНЧ-БРУЕВІЧ Міхаіл Дзмітрыевіч. Ваенны дзеяч, генерал-лейтэнант рускай арміі, генерал-лейтэнант Чырвонай Арміі, геадэзіст. Нарадзіўся 8.3.1870 г. ў Маскве. Доктар ваенных і тэхнічных навук. З сям'і каморніка, выхадца з дваран Магілёўскай губерні. З 10.10.1917 г. начальнік Магілёўскага гарнізона, член выканкома Магілёўскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. 20.10.1917 г. СНК РСФСР прызначаны начальнікам штаба Вярхоўнага галоўнакамандуючага, стаўка якога тады знаходзілася ў Магілёве.

БУЛАХАЎ Міхаіл Гапеевіч. Беларускі мовазнавец, доктар філалагічных навук, прафесар. Нарадзіўся 22.7.1919 г. ў в. Маслакі Горацкага р-на. У 1940 г. скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут.

ВАРАКСІН Уладзімір Мікалаевіч. Беларускі архітэктар, педагог. Нарадзіўся 5.7.1901 г. ў Омску. У 1939 г. ў Магілёве паводле яго праекта ўзведзены кінатэатр «Радзіма». У 1940—41 гг. жыў тут і працаваў, ажыццяўляў архітэктурны нагляд за будаўніцтвам кінатэатра і жылога пасёлка аўтарамонтнага завода.

ГУТАРАЎ Іван Васілевіч. Беларускі літаратуразнавец і фальклярыст, прафесар, доктар філалагічных навук, член-карэспандэнт АН БССР. Нарадзіўся 15.4.1906 г. ў в. Воўкаўка Мсціслаўскага р-на. Да Вялікай Айчыннай вайны працаваў выкладчыкам у Магілёўскіх палітыка-асветным і педагагічным інстытутах.

КУМЕЛЬСКІ Уладзімір Уладзіміравіч. Нарадзіўся ў 1884 г. ў Томску, але ўсё сваё жыццё аддаў беларускаму тэатральнаму мастацтву. Творчую дзейнасць Уладзімір Уладзіміравіч пачаў у 1904 г., а ўжо у 1910—16 гг. ён прыязджае на гастролі ў Магілёў. Арганізаваная ім гастрольная група ў 1927 г. асела ў Бабруйску. У 1935 г. ён канчаткова становіцца мастацкім кіраўніком і акцёрам Магілёўскага тэатра.

Артыст шырокага творчага дыяпазону, моцнага тэмпераменту і мастацкай праўды, майстар пераўвасаблення, ён стварыў нямала яркіх роляў.

Памёр У.У.Кумельскі 14.4.1939 г. Пахаваны ў Магілёве на Карабанаўскіх могілках.

Воіны-землякі, якія загінулі ў савецка-фінляндскую вайну 1939—40 гг. і ў час ваенных канфліктаў на Далёкім Усходзе

АГРЭСТ Аляксандр.

АФАНАСЕНКА Мікалай Сільвестравіч, н. ў 1908, загінуў 2.2.1940.

БЯЛЯЦКІ Канстанцін Мікалаевіч, загінуў у 1939.

ВАВІЛАЎ Васіль Міхайлавіч, загінуў 5.2.1940.

ГІЛЕВІЧ Мацвей.

ЖАДЗЕЦКІ Міхаіл Севасцьянавіч, загінуў 27.12.1939.

ЖАРЫКАЎ Антон Васілевіч, н. ў 1905, загінуў у лютым 1940.

ЗАДУШЭЎСКІ Анатоль.

ЗАЙЦАЎ Арцём Дзям'янавіч, н. ў 1909, загінуў у сакавіку 1940.

КАРЖОЎ Іван Міхайлавіч, н. ў 1909, загінуў 9.3.1940.

КУХАРАЎ Міхаіл Аляксандравіч, н. ў 1905, загінуў 6.2.1940.

ЛІПАВІЦКІ Марат.

МАКАРЭВІЧ Сцяпан Фёдаравіч, н. ў 1907, загінуў у сакавіку 1940.

МАКРОВІЧ Барыс.

МАЛОЧКА Міхаіл.

МАМКІН Іван Нічыпаравіч.

НАБОКАЎ Фёдар Арцёмавіч, н. ў 1909, загінуў 27.12.1939.

НОВІКАЎ Барыс.

ПІМОШКІН Аляксей Сямёнавіч, н. ў 1905, загінуў у 1940.

ПЯТРОЎСКІ Дзмітрый Цімафеевіч, н. ў 1908, загінуў у снежні 1939.

РАДЗЬКОЎ Васіль Сідаравіч, н. ў 1911, загінуў 15.2.1940.

РЫБЧАНКА Фёдар Аляксеевіч, н. ў 1911, загінуў 15.2.1940.

СМАЛЯКОЎ Іван Майсеевіч, загінуў 2.2.1940.

ФУРМАН Аляксандр Майсеевіч, загінуў у 1939.

ЧАРНЯКОЎ Іван Ільіч, н. ў 1903, прапаў без вестак.

ЧЭПЕЛЕЎ Рыгор Васілевіч, прапаў без вестак.

ШУГАЛЕЎ Рыгор Іванавіч, н. ў 1904, загінуў у лютым 1940.

ЮДЗЯНКОЎ Сідар Яфімавіч, н. ў 1909, загінуў 11.1.1940.

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

Незлічонымі матэрыяльнымі стратамі, палаючымі гарадамі і вёскамі, неймавернымі людскімі пакутамі і мільёнамі заўчасна абарваных чалавечых жыццяў увайшла ў нашу гісторыю Вялікая Айчынная вайна. 22 чэрвеня 1941 г., у нядзелю, стаяў спякотны летні дзень. Магіляўчане адпраўляліся адпачываць на Дняпро. Моладзь рыхтавалася да фізкультурнага парада. Вайна ўварвалася ў мірнае жыццё савецкіх людзей настолькі знянацку, што не ўсім адразу ўдалося асэнсаваць, што ж адбываецца. У 12 гадзін па радыё перадалі ўрадавае паведамленне аб вераломным нападзе фашысцкай Германіі на СССР. На пасяджэнні бюро Магілёўскага абкома партыі былі пастаўлены задачы пераходу ад мірнага жыцця на ваеннае становішча. Пачаўся масавы прызыў ваеннаабавязаных у армію, адначасова паступалі заявы з просьбамі адправіць на фронт добраахвотнікамі. На рабочых сходах і мітынгах узнікла прапанова аб стварэнні атрадаў народнага апалчэння.

Пачатак вайны быў надзвычай цяжкі. Ведучы цяжкія кровапралітныя баі, нашы войскі вымушаны былі адступаць пад націскам колькасна перавышаючага і больш вопытнага праціўніка. За 12 дзён вайны гітлераўцы здолелі прайсці ад Брэста да Бярэзіны і нават перайсці яе. У міжрэччы Бярэзіны і Дняпра (за 35—50 км ад Магілёва) яны сутыкнуліся з войскамі 172-й стралковай дывізіі (генерал-маёр М.Ц.Раманаў). З ліпеня яе разведвальныя атрады, якімі камандавалі капітан М.В.Мяцельскі і старшы лейтэнант А.П.Ваўчок, уступілі ў сустрэчныя баі з перадавымі падраздзяленнямі гітлераўскага 46-га танкавага корпуса 2-й танкавай групы Гудэрыяна. Савецкія воіны знішчылі 14 танкаў і каля роты варожай пяхоты. 5 ліпеня камандзір артдывізіёна Б.Л.Хігрын, што замяніў параненага наводчыка, асабіста знішчыў яшчэ 6 танкаў. На цэлыя суткі затрымалі воіны гітлераўцаў на гэтым участку. Так пачалася абарона Магілёва, якая доўжылася 23 дні: з 3 да 26 ліпеня 1941 г. У адным з артыкулаў, апублікаваным у газеце «Красная звезда» за 4.6.1953 г., Маршал Савецкага Саюза А.І.Яроменка пісаў, што абарона Магілёва заслугоўвае таго, каб аб ёй сказаць у поўны голас.



Жыхары Магілёва капаюць процітанкавыя равы каля горада. 1941 г.

Абарона Магілёва 1941 г.

Праводзілася часцямі 61-га стралковага корпуса (генерал-маёр Ф.А.Бакунін) 13-й арміі (генерал-лейтэнант П.М.Філатаў, з 9.7.1941 г. генерал-лейтэнант Ф.М.Рэмізаў, з 14.7.1941 г. генерал-лейтэнант В.П.Герасіменка) Заходняга фронту і апалчэнцамі 3—26 ліпеня. На абарончых работах вакол горада з 26 чэрвеня да 10 ліпеня штодзённа працавала ад 30 да 40 тысяч гараджан і жыхароў навакольных вёсак. За кароткі тэрмін быў выкапаны процітанкавы роў больш як на 25 км, пабудаваны бліндажы, дзоты, траншэі і эскарпы, пастаўлены мінныя проціпяхотныя і процітанкавыя палі, на некаторых вуліцах — барыкады, у асобных дамах абсталяваны артылерыйскія і кулямётныя агнявыя кропкі, у сценах прабіты байніцы. На прадпрыемствах, ва ўстановах і навучальных установах фарміраваліся атрады народнага апалчэння. У адпаведнасці з планам непасрэдная абарона горада ўскладалася на 172-ю стралковую дывізію (генерал-маёр М.Ц.Раманаў) з прыдадзенымі ёй часцямі і асобнымі падраздзяленнямі. На заходнім беразе Дняпра, перакрыўшы шашу Магілёў—Бабруйск і Магілёў—Мінск, абарону ажыццяўлялі 388-ы (палкоўнік С.Ф.Куцепаў) і 514-ы (падпалкоўнік С.А.Боніч), на ўсходнім беразе Дняпра, прыкрываючы левы фланг і тыл дывізіі, — 747-ы (падпалкоўнік А.В.Шчаглоў) стралковыя палкі. Разведвальныя атрады дывізіі пад камандаваннем капітана М.В.Мяцельскага і старшага лейтэнанта А.П.Ваўчка 3 ліпеня ў міжрэччы Бярэзіны і Дняпра (за 35—50 км ад Магілёва) уступілі ў сустрэчныя баі з перадавымі падраздзяленнямі нямецкага 46-га танкавага корпуса 2-й танкавай групы генерала Гудэрыяна. У баях каля в. Чачэвічы і г.п. Бялынічы савецкія воіны знішчылі 14 танкаў і каля роты варожай пяхоты. 5 ліпеня камандзір артдывізіёна капітан Б.Л.Хігрын, які замяніў параненага наводчыка, асабіста знішчыў 6 варожых танкаў; прасоўванне варожых войск на гэтым участку было затрымана на суткі. 6 ліпеня пад націскам намнога большых сіл праціўніка атрады адышлі ў глыб абароны дывізіі. Дыслакацыя часцей, што абаранялі Магілёў, крыху змянілася: замест 514-га стралковага палка, адведзенага ў рэзерв камандзіра корпуса, у аператыўнае падпарадкаванне 172-й дывізіі перададзены 394-ы полк 110-й стралковай дывізіі, які заняў абарону на ўсходнім беразе Дняпра. На пазіцыі Казіміраўка—Пашкава—Гаі—Мікалаеўка—Палыкавічы выведзены зводны полк пад камандаваннем маёра В.А.Кацюшына, куды ўвайшлі знішчальны батальён пад камандаваннем М.І.Калугіна, батальён супрацоўнікаў міліцыі пад камандаваннем капітана К.Р.Уладзіміра ва і інш. Разведкай было ўстаноўлена, што на Магілёў наступалі 4 пяхотныя і танкавыя дывізіі з 2-й танкавай групы нямецка-фашысцкіх войск: на Бабруйска-Магілёўскім напрамку палкі 23-й і 7-й пяхотнай дывізій, на Мінска-Магілёўскім — 263-й і 15-й пяхотнай дывізій. Іх падтрымлівала 3-я



Збройная майстэрня 172-й дывізіі. 1941 г.



Агнявыя пазіцыі на Буйніцкім полі.

танкавая дывізія. Пазней, калі гітлераўцы фарсіравалі Дняпро, у тыл 172-й стралковай дывізіі выйшлі 258-я і 78-я пяхотныя, а з 17 ліпеня на горад былі кінуты часці 34-й і 10-й пяхотных дывізій. З кожным днём праціўнік узмацняў націск, горад падвяргаўся шматлікім бамбардзіроўкам. У час 14-гадзіннага бою на Буйніцкім полі было падбіта, спалена бутэлькамі з гаручай сумессю і падарвана на мінах 39 танкаў і бронетранспарцёраў, знішчана больш за батальён салдат і афіцэраў праціўніка; каля в. Сідаравічы воіны 747-га стралковага палка знішчылі 20 танкаў і бронетранспарцёраў і больш за роту гітлераўцаў. За 10 дзён баёў, паводле звестак штаба 172-й дывізіі, адбіта 27 варожых атак, падбіта і спалена 179 танкаў і бронетранспарцёраў, захоплены 2 танкі, 12 мінамётаў, 25 кулямётаў, узята ў палон 600 і знішчана не менш як 4 тыс. салдат і афіцэраў праціўніка. 14 ліпеня дывізія страціла сувязь са штабам корпуса, пасля захопу ворагам г. Чавусы спыніўся падвоз боепрыпасаў, харчоў і медыкаментаў, абаронцы горада апынуліся ў аператыўным акружэнні. Баі адбываліся па ўсім фронце абароны, воіны і апалчэнцы неслі цяжкія страты, з кожным днём вакол горада сціскалася кальцо акружэння. На паўночны захад, захад, паўднёвы захад ад горада гітлераўцы захапілі вёскі Буйнічы, Цішоўка, Зацішша, Казіміраўка, Пашкава, Гаі, Мікалаеўка, Палыкавічы, на ўсходнім беразе Дняпра — Халмы, Лупалава, Грабянёва і інш. 24 ліпеня праціўнік прарваўся на ўскраіны Магілёва, вулічныя баі адбываліся каля дняпроўскага моста, чыгуначнага вакзала, станцыі Магілёў-Таварны, фабрыкі штучнага шоўку і інш. Воіны і апалчэнцы адхілілі ультыматум захопнікаў аб капітуляцыі і вырашылі з баямі выходзіць з акружэння. У ноч на 26 ліпеня воіны 388-га стралковага палка з прыдадзенымі часцямі і падраздзяленнямі прарваліся з Магілёва на Захад, воіны 747-га, 394-га і зводнага палкоў — на Усход і за раку Сож, злучыліся з часцямі савецкай 13-й арміі. 23-дзённымі баямі савецкія воіны і апалчэнцы скавалі буйныя сілы ворага ў перыяд Смаленскай бітвы 1941 г. і нанеслі значныя страты ўдарным сілам нямецкай групы армій «Цэнтр».

Б.П.Гардзееў.

Магілёўскае народнае апалчэнне 1941 г.

26.6.1941 г. на партыйна-камсамольскім сходзе Магілёва створаны знішчальны батальён, у які запісалася 500 камуністаў і камсамольцаў. Камандзірам яго прызначаны начальнік школы НКУС М.І.Калугін, камісарам — загадчык аддзела прапаганды і агітацыі гаркома КП(б)Б С.К.Бандарэнка. Гэта стала пачаткам фарміравання атрадаў народнага апалчэння. Да 10 ліпеня ў апалчэнне ўступіла больш за 12 тыс. чалавек, у тым ліку на фабрыцы штучнага шоўку 600, трубаліцейным заводзе 250, мясакамбінаце 180, ца-

гельным заводзе 120 чалавек. Атрады народнага апалчэння створаны на гарбарным, аўтарамонтным, косцеперапрацоўчым заводах, чыгуначным вузле, у педінстытуце і інш. З супрацоўнікаў абласнога ўпраўлення НКУС і міліцыі сфарміраваны батальён пад камандаваннем капітана К.Р.Уладзіміра ва і атрад капітана Дз.С.Вольскага. Рашэннем абкома і гаркома КП(б)Б створаны штабы народнага апалчэння: абласны, у які ўвайшлі намеснік старшыні аблвыканкома І.М.Кардовіч (начальнік), сакратар абкома КП(б)Б Н.Т.Ваўнянка, сакратар абкома ЛКСМБ Ф.А.Сурганаў, і гарадскі, куды ўвайшлі сакратар гаркома КП(б)Б А.І.Марозаў (начальнік), М.Ю.Шпалянскі, П.Ф.Валожын, П.Я.Цярэнцьеў і інш. Камандаваў народным апалчэннем абласны ваенны камісар І.П.Ваяводзін. Апалчэнцы вялі барацьбу з нямецкімі дыверсантамі і шпіёнамі, ахоўвалі прамысловыя аб'екты і лініі сувязі, удзельнічалі ў эвакуацыі насельніцтва, прамысловага і транспартнага абсталявання, у стварэнні абарончых рубяжоў. З 3 да 26 ліпеня разам з воінамі Чырвонай Арміі абаранялі горад атрады фабрыкі штучнага шоўку, гарбарнага і косцеперапрацоўчага заводаў у радах 388-га стралковага палка, які абараняў Магілёў з захаду, атрады чыгуначнага вузла, трубаліцейнага завода, батальёны знішчальны і супрацоўнікаў міліцыі, атрад завода «Адраджэнне» ў складзе зводнага палка пад камандаваннем маёра В.А.Кацюшына, які трымаў абарону горада з паўночнага захаду; атрады аўтарамонтнага завода, мясакамбіната і іншых прадпрыемстваў, педінстытута і атрад Дз.С.Вольскага ў складзе 747-га і 394-га стралковага палкоў, якія прыкрывалі флангі і тыл 172-й дывізіі на левым беразе Дняпра. Апалчэнцы самаддана змагаліся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З 250 байцоў батальёна супрацоўнікаў міліцыі ў жывых засталося толькі 19 чалавек, у баі за дняпроўскі мост загінулі ўсе апалчэнцы атрада Дз.С.Вольскага, больш за палавіну складу страціў забітымі атрад фабрыкі штучнага шоўку. У ноч на 26 ліпеня частка апалчэнцаў разам з воінамі 172-й дывізіі вырвалася з акружэння і працягвала барацьбу ў радах Чырвонай Арміі, частка — у партызанскіх атрадах і падполлі. На брацкіх магілах апалчэнцаў у Магілёве і пасёлку Гаі пастаўлены помнікі, у Магілёве ўстаноўлены мемарыяльныя дошкі, ёсць вуліца Народнага апалчэння.

Б.П.Гардзееў.

Дваццаць тры дні стаялі насмерць

З успамінаў Маршала Савецкага Саюза, Героя Савецкага Саюза А.І.Яроменкі

...Оборону Могилева можно разделить на три этапа.

Первый этап продолжался с 3 по 9 июля 1941 года, когда отходившие части 13-й армии, а также корпусов, занявших оборону на днепровском рубеже, разведывательные и передовые отряды вели напряженные бои на дальних и ближних подступах к городу. Соединения, получившие задачу оборонять днепровский рубеж, выслали разведывательные группы и отряды с задачей собрать необходимые данные о противнике. Вслед за разведгруппами выдвигались передовые отряды в составе усиленного батальона, каждый с задачей разведки боем. Эти отряды на выгодных рубежах в 20—25 км впереди основной линии обороны встречали противника, дерзкими ударами заставляли его развернуться в боевой порядок и тем самым замедляли продвижение гитлеровцев, выигрывали драгоценное время, необходимое для создания оборонительного рубежа по Днепру и сосредоточения войск, подтягивавшихся из тыла.

С 9 по 16 июля упорные оборонительные бои шли уже в предполье, на основной полосе обороны перед Могилевом, и предпринимались многочисленные контратаки с целью ликвидировать плацдармы, захваченные противником на восточном берегу Днепра на обоих флангах корпуса. Важнейшим результатом боев этого, второго, этапа было изматывание и переламывание живой силы врага и его техники.

Третий этап продолжался с 16 по 27 июля, когда войска, героически оборонявшие Могилев, оказались в полном окружении. Соединения корпуса были окружены и расчленены врагом. 172-я стрелковая дивизия и один полк 110-й стрелковой дивизии оказались отрезанными от остальных сил корпуса.

На этом этапе с особой силой проявились самоотверженность и героизм защитников



А.П.Ваўчок.



Г.І.Златаўстаўскі.

днепровского рубежа, сражавшихся с врагом, который обладал по меньшей мере пятикратным превосходством. К этому же этапу относятся и попытки вырваться из кольца. Несмотря на громадные жертвы, сражение в замкнутом кольце оказало немалую услугу нашим основным войскам, ибо части непокоренного могилевского гарнизона приковали к себе целый армейский корпус врага, что нарушило на определенный срок взаимодействие механизированных и общевойсковых соединений вермахта, сбило их наступательный порыв на главном направлении.

Вокруг Могилева протяженностью 25 км был создан оборонительный обвод с более или менее широкой полосой предполья. Оборона была, таким образом, круговой и имела целью не дать врагу ворваться в город ни с ходу ударом в лоб, ни обходным маневром с флангов или тыла.

Планом обороны города и построением боевых порядков полков предусматривалось прежде всего отражение танков врага на наиболее вероятных направлениях ударов, а также тесное взаимодействие и прямая взаимопомощь как между стрелковыми частями дивизии, так и между ними и артиллерией. Тщательно был разработан план прикрытия с воздуха важнейших объектов и боевых порядков частей.

Осуществление запланированных мероприятий было связано с громадным напряжением сил всего личного состава, ибо действовать приходилось против превосходящих сил противника при полном отсутствии танков и фактически обходясь полковой и дивизионной артиллерией, так как дивизии был придан лишь 601-й корпусной артиллерийский полк. Положение усугублялось тем, что левый фланг был прикрыт крайне слабо, а авиация противника господствовала в воздухе.

Части 172-й дивизии заняли оборону по рубежу Днепра. На западном берегу, в районе деревень Затишье—Тишовка, — 514-й стрелковый полк под командованием подполковника С.А.Бонича. Его поддерживал 493-й гаубичный артиллерийский полк. В районе деревень Тишовка—Буйничи — 388-й полк под командованием полковника С.Ф.Кутепова с 340-м легким артиллерийским полком. По восточному берегу Днепра во втором эшелоне занял оборону 747-й полк под командованием подполковника А.В.Щеглова, поддерживаемый 601-м гаубичным корпусным артиллерийским полком. 341-й отдельный зенитный дивизион прикрывал аэродром и мост через Днепр.

Генерал-майор Романов в соответствии с указаниями командира 61-го корпуса уточнил задачи, организовал взаимодействие между частями, систему огня и снабжение всеми видами боевого обеспечения.

Для разведки линии обороны командир дивизии выделил стрелковый батальон 514-го полка под командованием старшего лейтенанта А.П.Волчка. Такую же задачу имел и отдельный разведывательный батальон под командованием капитана М.В.Метельского. Они начали действовать 3 июля.

4—5 июля наши передовые отряды вступили в бой с разведывательными частями противника 24-го и 46-го танковых корпусов танковой группы Гудериана, форсировавших реку Березину и занявших города Борисов и Бобруйск.

Батальон Волчка уничтожил несколько гитлеровских танков возле Белынич, за рекой Друть. Воины использовали на полную силу не только противотанковые орудия, которые были у них, но и связки гранат и бутылки с горючей жидкостью. Об опыте отважного батальона была выпущена листовка «Жги немецкие танки». В ней писалось о дерзких и умелых действиях бойцов, вступивших в единоборство с танками. Этот опыт широко изучался во всех подразделениях. В полках зародилась идея создания команд истребителей танков. На добровольных началах они были созданы в каждом полку. В эти команды вступали также бойцы народного ополчения, хорошо знающие местность. Истребители нападали на пункты сосредоточения гитлеровских танковых войск и наносили им большой

урон, особенно успешными их действия были ночью.

5—8 июля бои стали еще ожесточеннее. Противник оттеснил наше боевое прикрытие и вышел на ближние подступы к городу. Четыре дня фашистские танки с мотопехотой непрерывно атаковали позиции 388-го полка.

Несколько раз вражеские танки прорывались через передний край обороны полка (был даже такой случай, когда танки противника вышли к командному пункту), но каждый раз атака противника захлебывалась, танки уничтожались или отбрасывались назад. Воины полка нанесли большие потери врагу и удержали свои позиции. Попытки танковых частей гитлеровцев с ходу захватить Могилев были сорваны.

Затем наступило временное затишье. Поскольку гитлеровцам не удалось лобовой атакой сломить оборону, они начали искать слабые места на соседних участках.

После продолжительной бомбардировки и обстрела из дальнобойных орудий и налетов авиации гитлеровцы 11 июля снова начали сильное наступление на всем фронте дивизии. Три дня шли непрерывные бои. Глубина нашей обороны была примерно до 25 км. Враг вклинился местами километров на 16. Однако, используя резервы, умело маневрируя силами, генерал Романов организовал ряд контратак, в итоге которых враг был отброшен и линия обороны выровнена.

11 июля гитлеровцы форсировали Днепр южнее Быхова, стали расширять плацдарм в районе деревни Сидоровичи. Особенно ответственная задача легла на 747-й полк. Гитлеровское командование решило отрезать части, находившиеся в самом Могилеве, от частей, оборонявшихся на стадии Луполово. 747-й полк встретил наступление танковых войск на шоссе Орша—Гомель восточнее Днепра.

На участке 388-го стрелкового полка в эти дни обстановка также крайне обострилась. В районе деревни Буйничи противник ежедневно по нескольку раз яростно атаковал позиции оборонявшегося здесь батальона капитана Абрамова. Батальон был почти полностью уничтожен, пал смертью храбрых и его командир.

С 17 июля бои развернулись в глубине обороны. Здесь враг был остановлен и не смог прорваться к городу. 747-й полк во главе с командиром А.В.Щегловым, начальником штаба Г.И.Златоустовским, секретарем партбюро С.П.Монаховым проявил исключительное упорство и подлинный героизм.

Положение дивизии все более осложнялось. Особенно больным вопросом стало боепитание. Потерпев неудачу при попытке захватить Могилев с ходу и понеся большие потери, части 24-го и 46-го танковых корпусов Гудериана, обойдя город с двух сторон, соединились в Чаусах. Наши войска в районе Могилева оказались в полном окружении, были отрезаны от баз снабжения, но продолжали ожесточенные, неравные бои 15—19 июля. В это время враг ворвался уже в Смоленск.

Характерно, что противник после неудачных танковых атак применил иную тактику и стал наступать пехотой, усиленной танками. Под прикрытием двух-трех танков небольшие группы автоматчиков по ночам стремились просочиться в нашу оборону и автоматным огнем создать панику в наших рядах.

Когда противник отрезал базы снабжения, войдя в Чаусы, в частях стал все сильнее ощущаться недостаток боеприпасов и продук-



Помнік у гонар 172-й стралковай дывізіі.



М.Ц.Раманаў.



Л.К.Чарнічэнка.

тов. По распоряжению командования Западного фронта наша авиация сбрасывала с самолетов необходимые грузы.

В ходе длительных жестоких боев на подступах к Могилеву защитники городов — воины 172-й стрелковой дивизии, 394-го стрелкового полка 110-й стрелковой дивизии и бойцы отрядов народного ополчения — нанесли врагу большой урон.

К 25 июля материальные возможности обороны Могилева были полностью исчерпаны, хотя моральный дух в значительно поредевших рядах доблестных защитников города по-прежнему оставался высоким. Несмотря на огромные потери, те, кто остался в строю, были преисполнены мужества и готовности продолжать неравную борьбу. Однако командир дивизии понял, что в ходе сражения наступил такой момент, когда дальнейшая оборона днепровского рубежа на ограниченном участке не могла уже более иметь оперативного значения. Попытка оставаться далее на занимаемых позициях угрожала истреблением подчиненных ему войск.

Боеприпасы и продовольствие были израсходованы, пополнить их не было никакой возможности. Линия фронта откатилась далеко на восток.

Командир дивизии М.Т.Романов, посоветовавшись с командирами полков, отдал приказ с наступлением темноты в ночь на 26 июля нанести удар по врагу и вырваться из окружения. Но силы были слишком неравными, большинство при прорыве погибло, остальные вынуждены были пробираться лесами на восток. М.Т.Романов был тяжело ранен. Погибли командиры 388-го стрелкового полка полковник С.Ф.Кутепов, 340-го легкоартиллерийского полка полковник И.С.Мазалов и многие, многие другие.

Друкуецца па кн.: Еременко А.И. Героический Могилев // Солдатами были все. 2 изд. Мн., 1972. С. 55—62.

Успамінае Іван Мікалаевіч Макараў, былы сакратар абкома КП(б)Б

Часці 172-й стралковай дывізіі размеркаваліся для абароны на наступных участках: у раёне вёсак Цішоўка — Буйнічы заняў абарону 388-ы полк С.Ф.Куцепава. Яго падтрымліваў 340-ы лёгкі артылерыйскі полк І.С.Мазалава. Рубеж іх абароны пачынаўся ў в. Цішоўка і заканчваўся ў в. Сяльцы. На заходнім беразе Дняпра (раён вёсак Пашкава—Цішоўка) дзейнічалі 514-ы стралковы і 493-і гаўбічны артылерыйскі палкі. На паўднёвы ўсход ад Магілёва, на левым беразе Дняпра, заняў абарону 747-ы стралковы полк А.В.Шчаглова. Ён меў задачу абараняць участак на поўдзень ад Магілёва — у раёне в. Дашкаўка. Занялі свае агнявыя пазіцыі артылерысты 340, 443 і 601-га палкоў. Процітанкавая артылерыя асядлала ўсе дарогі, якія падыходзілі да абласнога цэнтра. Гэтыя часці і адбілі першы, лабавы ўдар гітлераўцаў. Калі з 3 да 9 ліпеня баі ішлі на далёкіх подступах да Магілёва, то з 9 ліпеня абаронцы горада змагаліся ўжо на асноўным рубяжы.

Фашысцкія войскі разгарнулі наступленне на акружэнне горада. Пад прыкрыццем артылерыйскага агню 12 ліпеня яны паспрабавалі прарвацца ў Магілёў з поўдня, у раёне в. Буйнічы. Стаўка рабілася галоўным чынам на ашаламляльнай моцы танкавы ўдар. Жорсткі бой працягваўся 14 гадзін. Браніраваныя пачвары, здавалася, занялі ўсё поле, але ні жахлівы роў матораў, ні кулямётна-гарматны агонь не пахіснуў баявога духа байцоў палкоўніка Куцепава і народных апалчэнцаў. Падпусціўшы машыны на блізкую адлегласць, яны закідвалі іх гранатамі і бутэлькамі з гаручай сумессю, ва ўпор расстрэльвалі пяхоту непрыяцеля. Выключную адвагу праявілі ў гэтым баі артылерысты палкоўніка І.С.Мазалава.

Адразу пасля таго, як варожая атака захлынулася, мы з І.П.Ваяводзіным прыбылі сюды, на Буйніцкае поле, выказаць падзяку, сваё захапленне стойкасцю, мужнасцю, уменнем змагацца тым, хто ўтрымаў тут абарону. Апалчэнцы таксама дзякавалі — за добра на-

ладжаную сувязь, за боепрыпасы, медыцынскую дапамогу.

Гледзячы на палаючыя танкі, я думаў аб выключнай мужнасці нашых байцоў і камандзіраў. Адна з варожых машын застыла ля самага бліндажа. Расказвалі, што фашысты выпусцілі па ім амаль ці не ўвесь боекамплект, але разбурыць так і не змаглі. Затое не вытрымаў сам танк — яму хапіла некалькі гранат.

16 ліпеня непрыяцель акружыў Магілёў. Пачалася барацьба за важныя прыгарадныя населеныя пункты: Пашкава, Гаі, Казіміраўку, Цішоўку, Буйнічы, Вейна, Грабянёва, Любуж, Халмы, Лупалава. Некалькі разоў за дзень з рук у рукі пераходзілі Грабянёва і Вейна. 17 ліпеня штаб 172-й дывізіі і яго тылавыя падраздзяленні, медсанбат перамясціліся ў горад. Варожыя войскі накіравалі ўдар на Палыкавічы, Пашкава, Лупалава. Раніцай пасля бамбёжкі і артпадрыхтоўкі пачалося наступленне непрыяцеля і на ўчастку 388-га палка С.Ф.Куцепава. Вечарам немцы атакавалі зводны полк В.А.Кацюшына. 18 ліпеня жорсткія баі праходзілі па ўсёй паласе абароны дывізіі. Увесь час узнікалі рукапашныя схваткі. Дывізія несла значныя страты, але свае пазіцыі адстаяла. На правым беразе Дняпра ў цяжкім баі адбілі танкавую атаку, знішчыўшы 19 танкаў, але праціўніку амаль удалося разрэзаць нашу абарону па Дняпры. Адзін толькі мост злучаў цяпер артылерыйскі полк Шчаглова з правым берагам. 19 ліпеня варожыя войскі зноў атакавалі полк Кацюшына і, страціўшы 20 танкаў, занялі в. Гаі. Атрымаўшы дапамогу, кацюшынцы ў гэты ж дзень выбілі непрыяцеля з Гаёў, але 20 ліпеня фашысты зноў авалодалі в. Гаі, захапілі Нова-Пашкава, Казіміраўку. З вялікімі стратамі зводны полк адышоў да в. Яснае... 21 ліпеня паўсюды панавала зацішша: немцы хавалі загінуўшых. Горад апаясаўся могілкамі з бярозавымі крыжамі. 22—23 ліпеня Магілёў днём і ноччу бамбілі. Гарэлі дамы ў цэнтры і па ваколіцах. Каб стрымаць ворага, палкоўнік І.П.Ваяводзін паслаў да р. Дубровенкі рэзервную роту апалчэнцаў і выдзеліў ім лёгкі танк. 24 ліпеня з вялікімі стратамі немцам удалося заняць станцыю Лупалава і выйсці на шашу Магілёў—Орша. Уздоўж яе абарону трымала ўзмоцненая група лейтэнанта Пугачова, якой дапамагалі батарэі двух гаўбічных палкоў — 473-га і 601-га. 25—26 ліпеня баі вяліся ўжо на вуліцах горада. У штабе дывізіі адбылася нарада. Камісар дывізіі Л.К.Чарнічэнка зачытаў загад Генштаба:



С.Ф.Куцепаў.



А.В.Шчаглоў.

«Пакінуць горад». Генерал М.Ц.Раманаў прапанаваў план прарыву: зводнаму палку В.А.Кацюшына працягваць вулічныя баі і прыкрываць адыход калоны; перад світаннем, 26-га, узарваць мост. Аперацыю назначылі ў ноч на 26 ліпеня. Пасля выхаду асноўных сіл з акружэння бой у Магілёве працягваўся яшчэ да 28 ліпеня. Затым рэшткі абаронцаў горада пераправіліся цераз раку і аб'ядналіся пазней з войскамі 13-й арміі.

З успамінаў Маршала Савецкага Саюза Г.К.Жукава

Против войск Западного фронта в первом эшелоне начали наступление 2-я и 3-я танковые группы армий «Центр»... Танковые соединения Гудериана рвались к Могилеву. Четыре пехотные дивизии, танковая дивизия, полк «Великая Германия» и другие немецкие части наступали на город. Соединения 13-й армии, упорно оборонявшие Могилев, были окружены.

Круговую оборону города держал 61-й корпус генерала Ф.А.Бакунина. Особенно отличилась в боях за Могилев 172-я стрелковая дивизия под командованием генерал-майора М.Т.Романова. Около 45 тысяч жителей Могилева вышли на строительство оборонительных сооружений. 23 дня отбивали атаки врага мужественные защитники города... В боях под Могилевом гитлеровцы потеряли 30 тысяч солдат и офицеров...

Упорная оборона 13-й армии в районе Могилева, наступательные действия 21-й армии под Бобруйском значительно затормозили

продвижение врага на рославльском направлении.

Друкуецца па кн.: Жуков Г.К. Воспоминания и размышления. М., 1968. С. 295.

Успамінае былы 1-ы сакратар Магілёўскага гаркома ЛКСМБ, член штаба народнага апалчэння П.Ф.Валожын

У час абароны роднага горада я аддаваў усе свае сілы мабілізацыі камсамольцаў і моладзі на барацьбу з ненавісным ворагам. Моладзь ішла ўсюды, куды яе клікалі гаркомы партыі і камсамола. Згадваюцца такія выпадкі. Каля 10 тысяч маладых рабочых і студэнтаў актыўна ўдзельнічалі ў будаўніцтве абарончых рубяжоў. Больш за 300 камсамольцаў добраахвотна ўступілі ў знішчальны батальён. Яны шмат зрабілі ў барацьбе па знішчэнні нямецкіх дыверсантаў, лазутчыкаў і сігнальшчыкаў, па навядзенні парадку ў горадзе. Калі пачаліся сістэматычныя бамбёжкі горада, мы тэрмінова арганізавалі з ліку моладзі некалькі атрадаў па барацьбе з пажарамі. І яны выдатна спраўляліся са сваімі задачамі, выратавалі шмат будынкаў ад знішчэння. Вось яшчэ адзін прыклад. У сувязі з эвакуацыяй насельніцтва горада і прытокам масы людзей з заходніх абласцей рэспублікі прыпынілі сваю работу многія магазіны, сталовыя і рэстараны, не было каму прадаваць хлеб. І за гэтую справу ўзялася моладзь. Студэнты працавалі загадчыкамі магазінаў, сталовых і рэстаранаў, прадаўцамі і афіцыянтамі. У магазінах з'явіўся хлеб, у сталовых і рэстаранах змаглі харчавацца народныя апалчэнцы. Вельмі добра працавалі студэнткі П.Букетава, Н.Васількова, Т.Коган і многія іншыя маладыя патрыёты. Шмат карыснага зрабіла моладзь горада ў час баёў па аказанні дапамогі параненым воінам. Пазней, у час акупацыі Магілёва гітлераўцамі, большасць з іх уключылася ў падпольную барацьбу з акупантамі, змагалася з ворагам у партызанскіх атрадах.

У адным страі

З запісной кніжкі І.П.Ваяводзіна

Іван Пятровіч Ваяводзін — палкоўнік, былы абласны ваенны камісар. У пачатку вайны быў начальнікам гарнізона Магілёва, камандаваў народным апалчэннем. Памёр у 1962 г.

Суетливые первые дни войны. Получена телеграмма о мобилизации в армию. Областной, городской и районный военкоматы работают круглые сутки. Множество добровольцев. Сотни людей отправляем на формировочные пункты.

Большой поток людей из западных областей республики через Могилев. Старики, женщины, дети. Автомашины и телеги. А сверху надсадно воющие вражеские самолеты. Они расстреливают людей на дорогах, бомбят.

Разговаривал по телефону с Москвой. Генерал Г.К.Маландин приказал начать подготовку города к обороне. Об этом уже шла речь и на собраниях партийного и комсомольского актива. Предстоят большие работы.

Гитлеровцы выбрасывают десанты. В Могилев просачиваются вражеские лазутчики. Они ночью ракетами указывают самолетам объекты бомбежки. С чердаков обстреливают улицы, убивают командиров Красной Армии. По указанию секретаря обкома партии И.Н.Макарова создаются оперативные группы для борьбы со шпионами и диверсантами. Формируются истребительные отряды.

В город прибыл командующий Западным фронтом генерал Д.Г.Павлов. Зашел в облвоенкомат. В моем присутствии его вызвали к прямому проводу. Д.Г.Павлов доложил Генеральному штабу о положении на фронте. Доложил туманно и путано. По сути дела, не знает, где его войска, где фронт.

Штаб фронта разместился в лесу около авиамоторного завода. Вызвали меня туда дать сведения о ходе мобилизации в армию, о наличии оружия и снаряжения. Тут сделаны большие землянки, окопы, ходы сообщения. Фашистские самолеты бомбили лес. Ущерб незначительный. Но, видимо, врагу известно расположение штаба фронта.

Начали прибывать части 172-й стрелковой дивизии. Занимают оборону на подготовленных рубежах. Моральное состояние воинов высокое. Надеюсь, что под Могилевом враг получит должный отпор.

Штаб фронта переместился на восток.

Связь с ним поддерживаем через летчика Татаринцева. Неуловимый пилот. Летает на своем У-2 днем и ночью.

После совещания с участием маршалов К.Е.Ворошилова и Б.М.Шапошникова секретарь ЦК партии Белоруссии П.К.Пономаренко занимается организацией партизанского движения в тылу врага. Формируются отряды, которые посылаются на запад. Собираем оружие для партизан.

Настоящий казус. Наш И-16 сел верхом на гитлеровский транспортный самолет. Оба упали. Вражеские летчики захвачены в плен.

Сформирована военная комендатура. Комендант — полковник Горячев, заместитель — подполковник Иванов. Нам, работникам военкомата, большое облегчение.

Город как бы настороженно ощетинился, всюду укрепленные точки, траншеи, окопы. Нет паники, суеты — просто суровое напряжение. Партийные и советские органы работают с нечеловеческой нагрузкой. Секретарей обкома и горкома партии можно встретить и на заводах, и на передовой, и в военкомате. Особенно неоценима помощь партийно-советских органов в снабжении гарнизона.

Много раненых. Расширяем госпитали. Изыскиваем медикаменты и перевязочные материалы.

В военкомат прибывают группами и в одиночку солдаты и командиры Красной Армии из частей, отступающих из западных районов республики. Формируем резервные подразделения для пополнения 172-й дивизии. Отправлено на линию фронта два батальона под командованием майора-пограничника Ковалева и работника Барановичского военкомата капитана Максимова.

Из работников органов милиции, НКВД, НКГБ, курсантов школ также сформировано два батальона. Подобраны боевые командиры: начальник школы НКГБ майор Калугин и капитан милиции Владимиров.

Кроме того, мы, по сути дела, располагаем дивизией народного ополчения. Правда, не хватает оружия. Не все ополченцы имеют винтовки.

Удивляюсь работоспособности офицеров военкомата. Начальники отделов Перминов, Буйничев, Федоров и многие другие сутками на службе. Когда они спят или отдыхают, не знаю.

На передовой позиции встретился седой старик на лошади. Под непрерывным обстрелом он доставил защитникам города горячую пищу. Поистине, все у нас солдаты.



І.П.Ваяводзін.

Четко работает комендатура по эвакуации населения. В советский тыл отправляются ежедневно эшелоны с женщинами, детьми. Для них организовано питание. Большую работу по эвакуации населения ведет Дом Красной Армии. Как меняются функции!

«Могилев оборонять до последнего патрона», — отъезжая из города, сказал мне 13 июля П.К.Пономаренко. Это было в предместье Луполово на шоссе. И последний его наказ: «Теснее связь с партийными организациями, опирайтесь на коммунистов!»

Машина удалялась. А справа доносилась ружейно-пулеметная стрельба. На Гомельском шоссе 747-й полк вел бои с переправившимися через Днепр гитлеровскими частями.

В кабинет зашел майор Ковалев — командир отряда заграждений. Доложил о выполнении заданий командования по подрыву мостов и минированию. Дал ему указание готовить ко взрыву мост через Днепр.

Могилев окружен со всех сторон. Но держим связь со штабом фронта по-прежнему через летчика Татаринцева. Это большая моральная поддержка.

Татаринцев доставил приказ на имя командира корпуса — продолжать оборону Могилева. Мне, как начальнику гарнизона, угрозы — расстрел.

В штабе 172-й дивизии проведено совещание. Все поклялись оборонять Могилев до последнего патрона, до последней капли крови.

Бои идут на улицах города. Жестокое сражение в районе шелковой фабрики. Мужество воинов беспредельно. На левом фланге за труболитейным заводом погибло около батальона ополченцев — в основном работники НКВД и НКГБ.

24 июля. Идут жестокие бои за днепров-

ский мост. Бессчетное количество раз противник атакует двумя батальонами автоматчиков, поддерживая их артиллерией и танками. Убито около 700 гитлеровцев. Стоны раненых на левом берегу, захваченном врагом, были слышны до взрыва моста.

Погиб исполняющий обязанности начальника политотдела облвоенкомата старший политрук Николаев. Это было 24 июля. Противник вклинился в центр города по Виленской улице. Прикрываясь группой пленных из отрядов самообороны, гитлеровцы двинулись к Театральной площади, стремясь расчленить защитников Могилева. Старший политрук Николаев повел группу бойцов резерва в атаку, но на крутом спуске к мосту через реку Дубровенку был сражен вражеской пулей.

Гитлеровцы у реки Дубровенки скопили большие силы. Чтобы задержать их, направил туда 45-миллиметровую пушку, три пулеметчика и танкетку, закрепленную за облвоенкоматом. В неравном бою все расчеты погибли.

Обстановка осложнилась. Лично возглавляю группу работников военкомата и милиции. Удалось отрезать врага от прикрытия и уничтожить.

Николаева похоронили в сквере около драматического театра. На траурном митинге поклялись отомстить за его смерть.

Большинство зданий города, в том числе и облвоенкомат, пострадало от бомбежек и обстрела артиллерии. Штаб начальника гарнизона переместился в подвал костела, возле драматического театра. Рядом с нами ютятся старики, женщины, дети.

Накал боев неописуем. Всюду раненые. Девушки и подростки на руках таскают их в госпиталь. Под госпиталь занято и здание культпросветучилища.

Ощущается недостаток продовольствия. Размололи последние 400 пудов овса. Это наш резерв.

Обнаружено 400 седел. Передал их генералу Романову для конного отряда.

Отдал приказ о выходе из осажденного Могилева. Возле нашего штаба собралось много жителей. Группами отправляю их к штабу дивизии.

Последний бой в районе шелковой фабрики. Все-таки удалось прорваться из осажденного города в леса.

Друкуецца па кн.: Солдатами были все. Мн., 1968. С. 104—108.

Успамінае былы старшы сяржант Ф.І.Самбук, удзельнік абароны Магілёва

Сразу по прибытии в Могилев в частях и штабах началась горячая подготовка к обороне города.

В обороне особую роль сыграла артиллерия нашей дивизии. В дивизии было два полка 340-й легкой и 493-й гаубичной артиллерии. Кроме этого, в Могилев прибыл полк корпусной артиллерии, а в каждой стрелковой части была батарея полковой артиллерии и батареи противотанковых орудий. Следует сказать, что начальник артиллерии полковник Соловьев пополнял свое боевое хозяйство еще и теми орудиями и пушками, которые оставляли отступающие части.

В дни обороны мне часто приходилось встречаться с Федором Ивановичем Соловьевым. Полковник в деталях знал всю огневую систему обороны на участке дивизии. За короткое время успел побывать на каждой огневой позиции. Особенно заботился об экономии снарядов...

Иногда полковник Соловьев сам показывал пример, как нужно бить врага без промаха. Однажды он прибыл в 388-й полк и задержался на позиции минометчиков. В это время в стороне противника на опушке леса показалась машина с солдатами. Полковник начал корректировать огонь миномета. Две мины из трех точно попали в цель и от машины с фашистами ничего не осталось.

Особенно мне запомнился день 13 июля 1941 года. Это, пожалуй, один из знаменательных боевых дней... Фашисты обрушили на город и линию обороны 388-го стрелкового полка в районе деревень Буйничи, Бутримовка и Барсуки столько огня, что все превратилось в стену пыли и дыма... Но когда в атаку пошли танки, заговорила наша артиллерия. Прямой наводкой с открытых позиций, а гаубичная — заградительным огнем... уничтожили около 80 танков и много живой силы врага...

Наши части вели ежедневно бои с превосходящими силами противника и оставляли позицию за позицией. Изо дня в день росли потери. Чувствовалась нехватка боеприпасов...

К исходу дня 25 июля мы узнали, что командир дивизии генерал-майор М.Т.Романов отдал приказ прорвать фашистское кольцо, форсировать Днепр и пробиваться с частями

Красной Армии... Мы шли на смерть, прощались друг с другом...

Друкуецца па кн.: Солдатами были все. Мн., 1968. С. 109—110.

Успамінае былы кулямётчык малодшы сяржант В.А.Пяткоў

22 июня 1941 года. Этого дня я ждал с нетерпением. Должна была состоятся моя первая встреча с тульской девушкой Ксенией Ремневой... И вдруг война. Встреча не состоялась. Вскоре я оказался далеко от Тулы на могилевских оборонительных рубежах. 6 июля наш эшелон разгрузился на станции Буйничи. По сторонам от железной дороги на полях зрел обильный урожай. Хлеба выше моего роста... Скрепя сердце, мы уничтожали урожай, копали землю лопатами, рыли окопы, траншеи. Часто у нас бывал командир полка С.Ф.Кутепов. Он нас подбадривал: тяжело в учении, легко в бою. И вот началась наша «легкая» жизнь. Это было 11 июля... В небе появились фашистские стервятники. Непрерывно падали и рвались бомбы. Наш рубеж обороны окутался завесой дыма и пыли... На нас ползли лавиной танки... Заговорили наши 45- и 76-миллиметровые пушки, летели связки гранат, как костры горели танки, забросанные бутылками с горючей смесью... Я нажимал на гашетку и счетверенный пулемет яро дрожал в моих руках.

К утру подвели итоги боя. Перед нашей линией обороны стояло 20 подбитых танков. Трупы своих солдат гитлеровцы убрали ночью и похоронили. Утром мы увидели поле, утыканное березовыми крестами. Утром и мы похоронили 11 своих павших товарищей. Полковник Кутепов и батальонный комиссар Зобнин выступили с краткими речами. Мы торжественно поклялись, что будем сражаться до последней капли крови, отомстим за погибших товарищей, не позволим врагу топтать нашу землю...

13 июля с утра враг начал артиллерийский обстрел, затем из-за леса вынырнули самолеты, пробомбили наш передний край. Еще рвались бомбы, еще мы не успели стряхнуть с себя комья земли, как со стороны деревни Тумановка вышли колонны немецкой пехоты. Они шагали, словно на параде, с развернутыми знаменами и скрещенными руками на автоматах.

Мы замерли у пулеметов... Три колонны приближались... Наконец раздалась команда:

— По фашистам огонь!

И все потонуло в грохоте пулеметов и минометов. Колонны противника некоторое время пытались двигаться вперед. Затем смешались. Ни одному вражескому солдату не удалось уйти назад в лес. Наутро недалеко от леса выросло новое кладбище. Белели кресты с металлическими касками...

Несколько дней мы слышали канонаду на флангах и в тылу. Мы понимали, что там, за Днепром, идут бои. К нам перестали подвозить боеприпасы, был урезан и продовольственный паек...

С 18 июля наш полк подвергался ежедневным атакам пехоты и танков фашистов. А у нас все меньше и меньше становилось бойцов и командиров, недоставало боеприпасов, а немцы буквально волнами накатывались на наши позиции... Наконец пришлось отступить в город, а затем ночью прорываться из вражеского кольца. Во время этого решающего сражения я был ранен. Местные жители выходили меня, помогли встать на ноги и найти путь к партизанам.

Солдатами были все. Мн., 1968. С. 142—145.

Сведчыць вораг

З дзённікавых запісаў гітлераўскага генерала Ф.Гальдэра

22 июня 1941 года. Наступление наших войск, по-видимому, явилось для противника на всем фронте полной фактической неожиданностью. Можно еще больше ожидать влияния внезапности на дальнейший ход событий.

24 июня 1941 года. Танковые группы Гудериана и Гота должны подтянуть и сосредоточить свои силы в районе Минска, выбросив одновременно вперед сильные авангарды для захвата переправ в верхнем течении Днепра у Могилева и Орши и в верхнем течении Западной Двины у Витебска и Полоцка.

29 июня 1941 года. Гудериан — и это

вполне правильно с оперативной точки зрения — наступает 2-мя танковыми дивизиями (3-й и 4-й) на Бобруйск и ведет разведку в направлении Днепра явно не для того, чтобы наблюдать за районом Бобруйска, а для того, чтобы форсировать Днепр... Я надеюсь, что еще сегодня овладеет мостами у Рогачева и Могилева и тем самым откроет дорогу на Смоленск и Москву.

30 июня 1941 года. 2-я и 3-я танковые группы должны как можно скорее выйти на рубеж Рогачев, Могилев, Орша, Витебск, Полоцк...

Танковая группа Гудериана... скована южнее Минска... Но несмотря на это правый фланг... группы может овладеть переправами через Днепр у Могилева и южнее.

2 июля 1941 года. На фронте группы армий «Центр»... производится перегруппировка для дальнейшего наступления на рубеж Могилев...

4 июля 1941 года. Группа Гудериана своим правым флангом форсировала Днепр у Рогачева и создала плацдарм. Севернее... соединения танковой группы форсировали Березину (!) и с боем наступают в направлении верхнего течения Днепра.

5 июля 1941 года. Главные силы танковой группы Гудериана медленно продвигаются, ведя упорные бои между Березиной и Днепром.

6 июля 1941 года. Продолжаются бои между Березиной и Днепром... Центр 2-й танковой группы вышел к Днепру.

8 июля 1941 года. Продолжаются бои в предполье Днепра. Наступление начнется 10.7.

9 июля 1941 года. ...Наилучшим участком для нанесения удара, видимо, является район южнее Могилева.

10 июля 1941 года. В 5.00 ударная группа начала наступление в районе Стар. Быхов. (Более позднее донесение: наши войска закрепились на восточном берегу Днепра; донесение, полученное в середине дня: начато строительство моста). 11.7. в районе Шклова начнет наступление переброшенная сюда 17-я танковая дивизия.

15 июля 1941 года. Русские войска сражаются, как и прежде, с величайшим ожесточением.

16 июля 1941 года. Отдельные группы противника продолжают оказывать сопротивление в районе западнее Днепра.

18 июля 1941 года. В районе восточнее Могилева (!) противник (5-я армия) продолжает энергичные контратаки южного фланга армий «Центр».

20 июля 1941 года. Нашим войскам, очевидно, удастся прочно закрепиться восточнее Смоленска, что дает возможность в течение известного времени ликвидировать... мешок, образовавшийся западнее Смоленска...

21 июля 1941 года. Отмечается... все более резкое обострение обстановки западнее Смоленска. В районе Могилева противник продолжает оказывать ожесточенное сопротивление.

25 июля 1941 года. Оставление пехотных дивизий западнее Смоленска. Желательно оставить 268-ю, 23-ю и 256-ю пехотные дивизии.

28 июля 1941 года. Район Могилева окончательно очищен от остатков войск противника. Судя по количеству захваченных пленных и орудий, можно считать, что здесь, как и предполагалось, первоначально находились шесть дивизий противника.[1]

Друкуецца па кн. Гальдер Ф. Военный дневник. М., 1971. Кн. 2. Т. 3.

[1](Ад гарадской камісіі па стварэнні кнігі.) Вось так і з'явіліся ў Магілёве «шэсць дывізій працаўніка», а не адна, і 12 тысяч апалчэнцаў. Інакш як было б апраўдацца перад фюрэрам, які патрабаваў хутчэй узяць Смаленск і рухацца на Маскву.

Дакументы сведчаць...

Пасля ўпартых пошукаў у архівах прадстаўнікамі гарадской камісіі па стварэнні кнігі «Памяць» пашчасціла знайсці рэдкія дакументы, якія яскрава сведчаць аб гераічных 23 днях абароны Магілёва, аб мужнасці і адвазе савецкіх воінаў. Гэта штабныя дакументы 601-га гаўбічна-артылерыйскага палка, які змагаўся сумесна з 747-м стралковым палком 172-й дывізіі.

ИЗ БОЕВОГО ПРИКАЗА

Б. приказ № 1. Группа ПП747. Ю. опушка рощи «Редкая». 3.7.41 г. Карта 50 000.
1. Появление мотомехчастей пр-ка возможно на Рогач. шоссе в движении на Могилев.

2. 172 сд переходит к обороне на з. берег р. Днепр с целью удержать подступы к Могилеву и не допустить пр-ка переправиться на в/берег р. Днепр.

3. 1/747 сп обороняет уч-к Рогач. шоссе, лес «Редкий», отд. домики сев. лес. «Редкий». Справа обороняется 388 сп, гранича с ним через р. Днепр.

4. 2/601 ГАП поддержать 1 роту. Задачи: подготовить НЗО по с. опушке лес «Дальний», по безым. выс. ю. роща «Редкая» 600 м. Не допустить атаки танков и пехоты по шоссе в направлен. Могилев и уничтожить пр-ка на подступах к пер. краю.

5. 3/601 ГАП поддержать 2 роту. Задачи: подготовить НЗО от леса «Выступ» на восток по обр. скатам безым. выс., не допустить атаку пехоты и танков вдоль проселочных дорог и уничтожить пр-ка на подступах к пер. краю. В случае обхода л/фланга д-на подготовить НЗО по ю/опушках лес «Темный».

НП: ю-в опушка лес «Редкий».

6. Ввод в бой 3 роты 2/747 поддержать тремя батареями.

7. ПТО по особому указанию.

8. Мой КП лес «Редкий», западнее лес «Темный».

Расход снарядов по особому указанию.

Ком-р группы ПП-747 п-к Якушев
НШ к-н Алешин.

ИЗ ДОКЛАДА КОМАНДИРУ 601-ГО ГАП

4/7 — 41 г. Дивизион 2/601 ГАП занял боевой порядок на ю. опушке леса «Сосновый». Готов к открытию огня.

К-р д-на к-н Шпаков.
Адъютант ст. ст. л-т Пушков.

ИЗ ДОКЛАДА ПОМ. НАЧ. ШТАБА 172-Й СТРЕЛКОВОЙ ДИВИЗИИ МАЙОРА В.А.КАТЮШИНА

В р-не Барсуки прорвалось до 100 танков пр-ка на уч-ке 187 сд. Во взаимодействии с б-нами 172-й уничтожает пр-ка в р-не Сидоровичи.

Занимают рубежи:

388 сп направление Салтановка Бобруйское шоссе... Усилен. б-н занимает вост. берег р. Лохва...

394 сп после ночного боя удерживает рубеж...

747 сп занял и удерживает рубеж Сидоровичи... Рота полка ведет бой с авиадесантом пр-ка сев. Лыково... 1/747 с 2/601 ГАП без одной батареи р-н сев. Сидоровичи в бою успеха не имел...

Потери:

— ранен к-р отд-я связи взв. управления кр-ц Вайман,
— из 4-й батареи потерялись 2 ездовых кр-ца: Сердюк и Шрайнер,
— из 5-й батареи ранен к-р батареи л-т Дергач,
— ранено 2 кр-ца.

ИЗ БОЕВОГО ДОНЕСЕНИЯ КОМАНДИРА 2-ГО ДИВИЗИОНА 601-ГО ГАП КАПИТАНА ШПАКОВА.

На ю/опушке ур. Шаблевщина, к 19.00 11.07.41.

С рассветом 11/7.41 на руб. Сидоровичи обн-но до б-на пехоты пр-ка с 2-мя артбатареями и минометами. Боем выявлено 16—17 пулем. гнезд в лощинах и высотах, прилег. к д. Сидоровичи.

В 3.30 11/7 1/747 сп со 2/601 ГАП заняли б/пор. и приступили к вып. поставленных б. задач. Бой продолжался непрерывно до 13.00 по уничтож. пр-ка. Пр-к открыл сильный руж.-пулеметн. и арт. огонь, который длился в течение всего дня. Ввиду превосх. сил у пр-ка овладеть Сидоровичи нам не удалось. Б-н, неся потери от руж.-пулем. огня и авиации, отошел к д. Слободка. Д-н был оставлен без пехоты на ОП и находился в окружении в течение 3-х часов... Д-н вступил в неравную схватку, 3 орудия прямой наводкой шрапнелью и гранатами оскол. действия отражал...

Искл. героизм проявил огневой взвод 4 бат. л-та Романенко. Точно был выполнен приказ ком. д-на не отступать, а поставить ор. на прямую наводку. Громили пр-ка во всех напр-ях шрапнелью и гранатой.

Отважно действовал одьютант старший ст. л-т Пушков — организовал группы стрелков и пулеметчиков, к-рые вели огонь... с огн. взводом...

Мат. часть исправна. Обеспечен вывод полковой и ПТ артиллерии 747 сп, которая находилась в руках пр-ка без ком. состава и бойцов. П/прикрытием огня д-на были вынесены с поля боя раненые пульроты и стрелки 747 сп и отправлены в ПМП. Д-н организованно вышел из боя на шоссе Слободка д/перегруппировки сил.

Потери.

Геройски погиб нач. связи д-на мл. л/т Барсуков (взвод упр-я) — исключительно стойкий, умелый, беспредельно преданный Родине командир, б/большевик. Ранен (4-я бат.) красноармеец Гацуляк Степ. Ив. На 5 бат. 6 чел. ранено.

Прошу представить к правит. награде:

1. Ст. адьют. д-на л-та Пушкова
2. К-ра 4-й бат. л-ра Романенко Ив. Тимоф.
3. К-ра орудия серж. Гришина Алексея Вас.
4. Кр-ца Савичева Ив. Вас. — взв. упр.
5. Наводчика 1 ор. к-ца Келлера Ив. Март.
6. Наводчика 3 ор. кр-ца Губера Давида Давид.
7. К-ра взвода мл. л-та Тригуб.
8. К-ра отд-я разведки с-та Карпенко Фед. М.
9. Мл. политрука Анохина Викт. Мих. (4 бат.).
10. Оруд. номера к-па Бибикова.
11. К-ца ездового Крейнера Эмануила Александровича.

Прошу объявить благ. в приказе по полку отличившимся в бою: 11/07 к-ру огн. взвода Ружичу А-ндру Вас.

Бано Степ. Ив. — к-ру орудия.
Канцурову Фед. Иосиф. — кр-цу, оруд. номер.
Хасамутдинову Зайнуле Гумаровичу — кр-цу, езд.
Бобылеву Никол. Ив.
Дейтхе Ив. Ив. — кр-ц, ор. номер.
Калмыков Никол. Григ.
Рыжеволосов Ив. Вас. — кр-ц, связист.
Гуцуляк Стеф. Ив. — кр-ц, ор. №.
Аипов Катай — кр-ц, езд.
Кунгурцев Никол. Андр. — кр-ц, езд.
Сухомлин Петр Зинов. — кр-ц, связной.

ИЗ БОЕВОГО ДОНЕСЕНИЯ ДНШ-1 601-ГО ГАП И ГРУППЫ ПП-747 СП КАПИТАНА ЛОКТИОНОВА

15/07.1941 г. 747 сп на ю/зап. опушке леса юго-вост. Затишье.

1. 11.7.41 г. группа ПП занимает б/порядок на прежнем месте. В 11.00 высланы 1/747 сп со 2/601 ГАП д/ликвидации десантов пр-ка в р-не Сидоровичи. В 16.00 ...вошел в подчинение группы 747 З/493 ГАП.

2. 12.07.41 г. в 21.00 1/747 сп с 2/601 ГАП вошел в соприкосновение с пр-ком и утром вступил в бой на рубеже Ново-Милеевка. В рез-те боя под воздействием сильного руж.-пулем. и арт. огня, а также обстрела с самолетов 1/747 сп, не предупредив д-на, отошел, в рез-те чего 4-й батарее 2/601 ГАП пришлось вести бой с фашистами одной... Батарея вела огонь прямой наводкой, нанеся большие потери пр-ку. В это время НШ группы ПП 747 к-н Алешин ехал к дивизиону. Получив сведения о состоянии дивизиона, принял меры д/вывода д-на на новый рубеж, заставив прикрывать отход д-на собранные им подразделения 1/747 сп.

Благодаря стойкости и решительности л/с 4-й батареи, возглавляемой л-том Романенко и его заместителем по п/ч мл. политруком Анохиным и принятых реш. мер нач-ком штаба, дивизион был выведен на новый рубеж и сохранен д/дальнейших действий.

Потеряно: один убит и 6 ч. ранено. Убито 2 лошади, уничтожена 1 автомашина с боеприпасами. Повреждено 1 орудие.

13.07.41. Пр-к силой до батареи и 8 танков занимал рощу «Квадратная», что юго-западнее Буйничи в 1 км. (квадрат 1970). В рез-те обстрела 6-й батареи подбито 1 орудие и 2 танка.

ИЗ ДОКЛАДА НАЧ. ШТАБА 601-го ГАП И ПП-747 КАПИТАНА АЛЕШИНА

14.7.41. 15.00. Группа ПП занимает прежний боевой порядок. 1/747 со 2/601 ГАП под давлением превосходящих сил пр-ка отошел на основной рубеж обороны. Пр-к занял д. Вильчицы, Затишье, Быстрик. По сведениям местных жителей в р-не Сидоровичи танки пр-ка неустановленной численности. Пр-к одиночными выстрелами обстреливает р-н 7-й батареи 3/601 ГАП/ четыре выстрела снарядами 155 мм калибра. Стрельба велась в направлении д. Лыково и по р-ну с радиомачтами, что 1 км зап. д. Гребенево.

Наши части отошли на рубеж: д. Новоселки — совхоз Вейно — опушка рощи, что с/западнее д. Подгорье. Артиллерия группы ПП в р-не Затишье, Колос.

Потери на 14.7.41 г.: ранено ср. комсостава 2 чел., рядовых 3 чел., без вести пропавших 2 чел. При отходе на основной рубеж обороны подорвана автомашина с оборудованием — артмастерская, 2 ор. 122 м/м, уничтожен пр-ком один зар. ящик, повреждена одна стереотруба и 2 буссоли...

ИЗ БОЕВОГО ДОНЕСЕНИЯ ПНШ-1 601-ГО ГАП И ПП-747 СП КАПИТАНА ЛОКТИОНОВА

...15.07.41. Пр-к силой до 2-х б-нов с артиллерией и 60 танков занимают Вильчицы, Князевка, Быстрик.

1/747 сп со 2/601 ГАП наступает совхоз «Вейно» — зап. окраина Князевки, Запрудье (ближайшая задача овладеть Запрудьем, в дальнейшем овладеть южной окраиной леса севернее Ново-Милеевка).

В 12.30 по донесению штаба 747 сп сосед справа 507 сп (из 187 сд 45 ск — авт.) успеха не имел, залег и окопался. Ввели в действие 3/93 ГАП для поддержки 507 сп. Идет ожесточенный бой. Сведений о потерях и трофеях нет.

Опер. сводки и донесения высылаем ежедневно через опер. дежурного 172 сд.

ИЗ ДОНЕСЕНИЯ В ШТАДИВ НШ КАПИТАНА АЛЕШИНА

17.07.41 г.

...Группа ПП 747 вполне боеспособна. Политико-моральное состояние бойцов и командиров хорошее.

Группа нуждается в пополнении материальной частью: 152 м/м орудий — 10,122 м/м —3, трехтонных автомашин ЗИС — 5; в пополнении рядовых — 25 чел., арт. лошадей — 6...

Группа имеет в наличии: 122 м/м орудий — 11 шт., 152 м/м — 2 шт.

НШ 601 ГАП к-т Алешин.

ИЗ БОЕВОГО РАСПОРЯЖЕНИЯ КОМАНДОВАНИЯ 601-ГО ГАП

Штаб группы ПП. Лес ю-в Затишье 1 км. 19.07.41 г. 20.00 Карта 50 000.

К-рам 2/601 ГАП, 3/601 ГАП, штабной батарее 3/493 ГАП.

Объявляю б/распоряжение № 13 штаба НАД 172 сд.

«Н-ку артиллерии боевого участка № 3 п-ку Якушеву, боевое расп-е № 13, штаб НАД 172 сд южн. окр. Могилева, ул. Менж. шк. № 11. 19.7.41 г. карта 50 000.

Во исполнение приказания нач-ка артиллерии 61 ск приказываю:

1. Д/борьбы с танками, бронемашинами и автомашинами пр-ка немедленно организовать в артполках и отд. д-нах по 1 истребит. группе в составе: 1 ср. к-р и 4 кр-ца (жел. добровольцы).

Вооружение истребит. группы: пистолеты-автоматы, автом. винтовки, р-е п-ты, связки гранат, бутылки с бензином или «КС».

Задача: п/рук-вом и по указ-ю шт. див-ии уничтожение танков и бронемашин в полосе об-ны див-ии путем активного выдв-я истребит. отрядов в районы сосред-я пр-ка.

2. Создать в артполках и отд. д-нах по одной диверс. группе в составе: 1. ср. к-р и 3—4 кр-ца. Вооружение группы: винтовки-автоматы, р. пулеметы, мины, ВВ.

Задачи: п/рук-вом и по указ. шт. дивизии минирование дорог и путей сооб-я на терр-ии, занятой пр-ком в полосе обороны дивизии, подрыв складов, хранилищ боеприпасов, горючего и т.д.

3. О сформ-ии групп донести мне к 4.00 20.7.41.

Нач. арт. 172 сд п-к Соловьев.

Нач. штаба арт. 172 сд под-к Перминов.

Во исп-е данного б/распоряжения приказываю:

1. назначить к-ром истребит. группы полка, изъявившего добр. согласие ком-ра взвода ПВО шт. батареи мл. л-ра Куменкова.

2. Назначение к-ра диверс. группы до изъявления добр. согласия со стор. к-ров оставить открытым.

3. Объявить всему л/с д-нов настоящее расп-е и составить списки добр-цев, желающих вступить в организуемые группы, и составленные списки представить в штаб полка к 2.00 20.7.41.

Окончательно отобранные добр-цы в группы будут объявлены доп-ным распор-ем.

К-р полка п-к Якушев.
Военком полка бат. ком-р Милютин.
НШ полка к-н Алешин.

Из боевого донесения ПНШ-1 601-го ГАП капитана Локтионова

Р-н Луполово
23.07.41 г. 21.00

На участке полка в районе колхоза (неразборчиво — авт.) сбиты 2 фашистских бомбардировщика типа «Юнкерс». Самолеты сгорели, взято в плен 3 герм. летчика. Во время взрыва бомбы под горящим самолетом ранено 4 чел.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, ф. 12884, спр. 280436, л. 1—111

Дакументы выявіў і падрыхтаваў Б.П.Гардзееў.

Магілёўскае патрыятычнае падполле

1—2.7.1941 г. каля Магілёва адбылася нарада камандавання Заходняга фронту з удзелам маршалаў Савецкага Саюза К.Я.Варашылава і Б.М.Шапашнікава, дзе абмяркоўвалася пытанне аб стварэнні моцнай абароны на р. Дняпро. На нарадзе прысутнічалі сакратары ЦК і абкома КП(б)Б П.К.Панамарэнка і І.М.Макараў. К.Я.Варашылаў звярнуў увагу на неабходнасць арганізацыі на часова акупіраваных ворагам тэрыторыях шырокага падпольнага і партызанскага руху. «У Магілёве, — успамінае былы 2-і сакратар абкома партыі Д.С.Маўчанскі, — па рашэнні бюро заставалася група партыйных і савецкіх работнікаў, якая павінна была стаць ядром партыйна-камсамольскага падполля. Гэта былі сакратары гаркома КП(б)Б А.І.Марозаў і І.Л.Хаўкін, сакратар гаркома ЛКСМБ П.Ф.Валожын, адказны работнік Ф.Т.Дзевятчонак і інструктар ЦК партыі магіляўчанін Р.Дз.Казлоў. Члену бюро абкома, начальніку НКУС палкоўніку П.С.Чарнышову было даручана «добра папрацаваць» з гэтымі людзьмі, пазнаёміць іх з метадамі работы ва ўмовах канспірацыі...

Але адбылося непрадбачнае. У ноч на 26.7.1941 г., вяртаючыся з нарады ў генерала М.Ц.Раманава, які камандаваў абаронай Магілёва, было вырашана часцям, што засталіся, і падраздзяленням 172-й дывізіі ісці на прарыў з акружэння. Марозаў і Хаўкін былі схоплены немцамі на вул. Віленскай (цяпер вул. Лазарэнкі), збіты і кінуты ў турму. Потым іх адправілі ў Германію. На тэрыторыі Брэсцкай вобласці яны сумелі ўцячы з эшалона. Марозаў пайшоў у партызаны, Хаўкін быў зноў схоплены немцамі і расстраляны. Дзевятчонак разгубіўся і ўцёк у адну з глухіх вёсак Шклоўскага раёна, дзе адседжваўся ўвесь час акупацыі Магілёўшчыны. Валожын, які не быў звязаны з Казловым, пайшоў у свой родны Уздзенскі раён Мінскай вобласці і прымаў актыўны ўдзел у партызанскім руху.

Такім чынам, Раман Дзмітрыевіч Казлоў быў у Магілёве адзіным арганізатарам падполля з усіх пакінутых камуністаў. Яму спатрэбіўся час для таго, каб пазнаёміцца з «новым парадкам», прыстасавацца да яго, аформіць дакументы жыхара Магілёва, пазнаёміцца з надзейнымі людзьмі. І ён знайшоў такіх людзей — чатырох ваеннаслужачых, што апынуліся ў горадзе. Яны сталі ядром яго падпольнай групы, якая ў якасці сантэхнікаў з канца жніўня 1941 г. абслугоўвала «крэслазарэт» нямецкіх афіцэраў, што

размяшчаўся ў будынку школы «НКУС—КДБ» (цяпер 1-ы корпус ММИ), да якога прымыкала турма.

Праўда, група Рамана Дзмітрыевіча была ў горадзе ўжо другой. Першая падпольная група практычна дзейнічала з першага дня акупацыі Магілёва ў ваенным шпіталі, дзе параненыя савецкія воіны станавіліся ваеннапалоннымі. Ваенныя ўрачы У.П.Кузняцоў, А.І.Паршын, Ф.І.Пашанін з дапамогай малодшага медперсаналу напярэдадні захопу горада за адну ноч знішчылі гісторыі хвароб усіх камандзіраў, зрабіўшы іх радавымі, камуністаў — беспартыйнымі, яўрэяў — беларусамі, грузінамі і людзьмі іншых нацыянальнасцей.

З нашэсцем нямецка-фашысцкіх захопнікаў больш як 100-тысячны Магілёў ператварыўся ў малалюдны горад, дзе налічвалася каля 30 тыс. жыхароў. Аднак і сярод іх было нямала сапраўдных патрыётаў Радзімы, якія не скарыліся ворагу і гатовы былі змагацца з акупантамі ўсімі даступнымі сродкамі да апошняй кроплі крыві. І не дзіўна, што ўжо ў жніўні — верасні 1941 г., як паказала праверка, праведзеная Магілёўскімі гаркомам і абкомам КП(б)Б у 1945—47 гг., практычна стыхійна пачалі з'яўляцца падпольныя патрыятычныя групы на чыгуначным вузле [кіраўнікі: П.І.Бялько (Анісовіч), А.В.Гарошка, П.В.Дракаў, В.М.Жывапісцава, І.С.Малашкевіч, В.І.Пудзін (Папоў), Г.С.Трактатава], на заводзе імя Кірава (кіраўнікі В.І.Батура і М.І.Харкевіч), на фабрыцы штучнага шоўку, у канторы «Рыбзбыт» (кіраўнік В.П.Станкевіч), у абласной бальніцы (кіраўнік М.П.Куўшынаў).

Групы патрыётаў працягвалі стварацца. На хлебазаводзе стварыў падпольную групу механік М.М.Яўціхіеў. Аб'яднаў некалькі сяброў па камсамольскай арганізацыі Ваня Лысіковіч. Ужо ў пачатку 1942 г. ў горадзе дзейнічалі партыйна-камсамольскія патрыятычныя групы М.К.Гваздыровай, Д.І.Дзерваедава, А.П.Заусцінскага, П.І.Крысевіча, М.Ф.Лабяк, У.І.Лусто, В.Л.Лусцянкова, С.М.Шакура, М.Я.Новікава, В.М.Карпінскай, У.П.Шалюты, А.І.Шубадзёрава. Актыўна дзейнічалі групы ваеннаслужачых, якія вымушаны былі застацца ў Магілёве. Імі кіравалі І.Г.Гурыеў, П.А.Пяхоцін, П.Хахлоў і В.Дз.Швагрынаў. Група апошняга скора пакінула горад і далучылася да партызан. Усе яе члены ў далейшым займалі там камандныя пасты.



Мемарыяльная дошка на будынку культасветвучылішча.

Прыкладна праз паўгода ў Магілёве ўжо былі 42 падпольныя групы, у склад якіх уваходзіла нямногім больш за 250 патрыётаў. Гэта былі ў асноўным малалікія аб'яднанні людзей, што блізка ведалі адзін аднаго, сяброў па працы і нават сем'яў. Самыя вялікія групы ад 18 да 22 чалавек былі створаны на заводзе імя Кірава і фабрыцы штучнага шоўку.

У першыя месяцы «гаспадарання» акупантаў у горадзе патрыёты распаўсюджвалі сярод насельніцтва лістоўкі, у якіх заклікалі жыхароў горада да барацьбы з ворагамі і здраднікамі радзімы, а хто меў радыёпрыёмнікі — зводкі Саўінфармбюро. Ваеннаслужачыя, група Вані Лысіковіча, член групы завода імя Кірава Лёня Лорчанка і іншыя збіралі



Мемарыяльны знак на будынку білетных кас на Прывакзальнай плошчы.



В.І.Батура.



В.П.Станкевіч.

і часова хавалі зброю і боепрыпасы, якія засталіся пасля баёў з гітлераўцамі нашай 172-й дывізіі.

Па меры магчымасці наносілі шкоду акупантам патрыёты чыгуначнага вузла — засыпалі ў буксы вагонаў пясок і металічную стружку, што выводзіла са строю цягнікі, водазаборныя калонкі. Гэта вымусіла акупантаў ганяць паравозы для запраўкі вадой на бліжэйшыя станцыі. Аднойчы член групы Гарошкі Н.Чарапанава арганізавала крушэнне паравоза насупраць вакзала. У выніку была затрымана адпраўка вайсковага эшалона на фронт амаль на суткі. Столькі ж часу спатрэбілася акупантам на аднаўленне чыгуначных пуцей. Шаўковікі, як называлі сябе патрыёты з фабрыкі штучнага шоўку, вывелі са строю падвясны транспарцёр падачы торфу на ЦЭЦ. Галоўны ўрач абласной бальніцы М.П.Куўшынаў шмат рабіў для выратавання



Мемарыяльная дошка ў гонар падпольшчыкаў хлебазавода.

моладзі ад вывазу ў Германію. Афармляў юнакоў і дзяўчат у бальніцу нібыта з-за заразных захворванняў і выдаваў ім фальшывыя даведкі.

Вялікую работу вяла сямейная падпольная група Марыі Кузьмінічны Гваздыровай. Акрамя распаўсюджвання зводак Саўінфармбюро яна была звязана сваім знаёмым П.І.Крысевічам з членам КПЗБ С.І.Файнцайг, якая паводле рашэння ЦК КПЗБ уладкавалася на працу ў нямецкі шпіталь, паколькі добра валодала нямецкай мовай, пад прозвішчам Лявонава. Разам са шпіталем яна апынулася ў Магілёве. Прыслухоўваючыся да размоў параненых салдат і афіцэраў вермахта, яна збірала карысныя звесткі пра дыслакацыю і перамяшчэнне варожых войск, пра ваенныя аб'екты ў Магілёве. Усё гэта яна перадавала малалетняй дачцэ Гваздыровай Клары, а тая — П.І.Крысевічу. Ад апошняга гэтыя звесткі перапраўляліся кіраўніку дыверсійна-разведвальнай групы Заходняга фронту маёру І.Навумовічу. Капітан Чырвонай Арміі Ф.Я.Юраў, які прабіваўся з акружэння на ўсход, застаўся ў Магілёве і адзін начамі знішчаў нямецкіх патрульных. Днём нечакана ўрываўся ў акупацыйныя ўстановы, расстрэльваў іх служачых, знішчаў дакументацыю і бясследна знікаў.

З цягам часу ўзнікла патрэба стварэння адзінай кіруючай арганізацыі, якая б магла накіроўваць дзейнасць кожнай падпольнай групы, зыходзячы з яе практычных магчымасцей. Так, па ініцыятыве Р.Дз.Казлова ў красавіку 1942 г. разведчыкі яго групы Калугін і Сакалоў у падвале разбуранага дома па вул. Ленінскай сабралі вядомых ім кіраўнікоў найбольш актыўных патрыятычных груп. Прысутныя пагадзіліся, што такая арганізацыя патрэбна, і назвалі яе «Камітэт садзейнічання Чырвонай Арміі». У кіруючае ядро камітэта ўвайшлі: П.І.Крысевіч (кіраўнік), А.В.Гарошка, М.П.Куўшынаў, С.М.Шакара, У.П.Шалюта і ад камсамола І.М.Лысіковіч.

На нарадзе гаварылася пра захаванне канспірацыі, пра ўзаемаадносіны кіруючага складу камітэта з кіраўнікамі груп. Былі вызначаны явачныя кватэры, канкрэтныя задачы барацьбы з акупантамі вядомых да таго часу патрыятычных груп. На жаль, ухвалілі стварэнне камітэта далёка не ўсе кіраўнікі падпольных груп, хаця і пагаджаліся «прымаць да ведама і кіраўніцтва» яго парады і рэкамендацыі. Сярод іх былі групы М.К.Гваздыровай, В.М.Карпінскай, П.І.Бялько (Ані-



І.С.Малашкевіч.



І.Л.Хаўкін.



В.Дз.Швагрынаў.



А.І.Шубадзёраў.

совіча), В.І.Пудзіна (Папова), В.І.Станкевіча, А.І.Шубадзёрава, У.І.Лусто, завода імя Кірава і фабрыкі штучнага шоўку і інш. Усе астатнія працягвалі дзейнічаць на свой страх і рызыку. Такім чынам, камітэт, створаны з прычыны шэрагу абставін, не дасягнуў намечаных мэт, хоць многа зрабіў для актывізацыі дзейнасці ўсяго гарадскога падполля, арганізаваўшы выданне машынапіснай, а потым друкаванай на гектографе газеты «За Родину», а з восені 1942 г. «За Советскую Родину».

Барацьба Магілёўскага патрыятычнага падполля з акупантамі з кожным днём узмацнялася. Гэтаму ў значнай ступені садзейнічала развіццё партызанскага руху і дастаўка на Магілёўшчыну разведвальна-дыверсійных груп Заходняга фронту. Пашыраліся сувязі падполля з імі, а партызанскіх і франтавых разведчыкаў — з падпольшчыкамі. Напрыклад, група завода імя Кірава была звязана з шэрагам партызанскіх атрадаў, якія дзейнічалі ў Чавускім раёне, падпольшчыкі груп А.І.Шубадзёрава, В.І.Станкевіча, М.П.Куўшынава і іншыя — з 121-м палком А.Касаева, патрыёты з груп І.С.Малашкевіча, П.В.Дракава і іншыя — з брыгадай «Чэкіст», што дзейнічала на Шклоўшчыне, група В.І.Пудзіна (Папова), І.М.Лысіковіча, М.Я.Новікава, П.І.Крысевіча, А.В.Гарошкі — з партызанскімі атрадамі 600-й брыгады і разведчыкамі маёра І.Навумовіча.

Па сціплых падліках у той час падпольшчыкі Магілёва перадалі партызанам мінамёт, каля 60 станковых і ручных кулямётаў, больш за тысячу вінтовак, аўтаматаў і пісталетаў, 100 тысяч патронаў, значную колькасць мін і снарадаў, не менш за 200 кг толу. Перадаваліся партызанам медыкаменты і перавязачныя матэрыялы, накіроўваліся ў атрады медыцынскія работнікі — урачы і медсёстры. Сувязныя падполля і партызанскія разведчыкі толькі ў 1942 г. вывелі ў партызанскія атрады каля тысячы ваеннапалонных з лагера смерці і шпіталя.

Значную дапамогу ў арганізацыі і правядзенні дыверсій аказвала патрыётам Магілёва разведвальна-дыверсійная група Заходняга фронту пад камандаваннем І.Навумовіча. Яе разведчыкі П.С.Бірукоў, М.А.Паўлаў, Я.Я.Слёзкіна (Бандарэнка) даволі часта пранікалі ў Магілёў і пастаянна дастаўлялі міны. Я.Я.Слёзкіна магнітныя міны прыносіла сваёй цёткі Вользе Мікалаеўне Карпінскай, якая перапраўляла іх П.І.Крысевічу. Ён размяркоўваў іх па групах, каб выкарыстоўваць найбольш эфектыўна.

У 1942 г. магілёўскія патрыёты ажыццявілі цэлы шэраг значных дыверсій і правялі шмат нечаканых для акупантаў смелых аперацый. Падпольныя групы чыгуначнага вузла [Малашкевіча, Бялько (Анісовіча), Дракава, Гарошкі і інш.] арганізавалі больш за дзесяць крушэнняў нямецкіх эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай на чыгуначных перагонах Магілёў—Крычаў, Магілёў—Жлобін, Магілёў—Орша, узарвалі пяць эшалонаў з гаручым. Але гэта не вельмі хвалявала акупацыйныя ўлады Магілёва: такое здаралася паўсядзённа ў розных месцах, захопленых нямецка-фашысцкімі войскамі. Калі ж загрымелі выбухі ў унтэр-афіцэрскай школе, падрыхтаваныя В.Готвальдам і П.Біруковым, на ЦЭЦ, здзейсненыя патрыётамі фабрыкі штучнага шоўку, агітацыйнай аўтамашыны, замініраванай М.М.Мяцёлкіным (Каровіным) з групы П.Хахлова, склада гаруча-змазачных матэры-



У.І.Лусто.



У.П.Шалюта.

ялаў, вялікага гаража, дзе было знішчана 12 аўтамашын і больш за 20 т бензіна, воданапорная вежа на станцыі Магілёў-1, то гітлераўцы проста ашалелі. Яны пачалі масавае знішчэнне яўрэяў, расстрэльвалі ні ў чым не павінных жыхароў горада, якіх хапалі на вуліцах па самых нязначных падазрэннях. Нягледзячы на тэрор акупантаў, які ўсё больш узмацняўся, патрыёты працягвалі ажыццяўляць задуманыя раней дыверсіі і аперацыі. Напрыклад, кіраўнік падпольнай групы на хлебазаводзе М.М.Яўціхіеў вывеў са строю ўсю сістэму водазабеспячэння. Патрыёты фабрыкі штучнага шоўку адправілі да партызан некалькі нямецкіх грузавых аўтамашын, спалілі водазмягчальную станцыю, што забяспечвала вадой ЦЭЦ, вывелі са строю ўсю кабельную сістэму. М.Я.Новікаў са сваімі сябрамі ў пасёлку імя Чапаева знішчыў ахову, разграміў паліцэйскую школу і распусціў сагнаных туды маладых людзей. Многія з іх пайшлі ў партызаны. Многія падпольныя групы правялі вялікую агітацыйную работу ў гарадской пажарнай камандзе, у выніку ўвесь яе склад у адну ноч перабраўся да партызан і вывез з сабой усё абсталяванне.

Акупанты ўзмацнілі вусную і друкаваную прапаганду. Па горадзе цэлымі днямі раз'язджала перасоўная радыёстанцыя, па вуліцах вялікімі тыражамі раскідвалася газета «Наша жизнь», па сценах дамоў і па агароджах расклейваліся лістоўкі, што заклікалі гараджан да падпарадкавання ўладам, якія прынеслі ім «свабоду ад бальшавізму». Але фашысцкая газета не прывабліваала гараджан, праз аднудзве ночы на нямецкія лістоўкі былі наклеены карыкатуры на Гітлера і яго акружэнне, над якімі, зрываючы іх, смяяліся нават паліцэйскія. Гэта была работа мастака-падпольшчыка Д.І.Дзерваедава і яго памочніка А.Г.Зоціева.

Аднойчы акупанты развесілі ў горадзе вялікія партрэты Гітлера, назваўшы яго вызваліцелем. За ноч, нягледзячы на даволі моцную ахову, на «вызваліцелю» з'явіліся надпісы, што былі відаць далёка: «Забойца», «Душыцель». Паліцэйскім было загадана як мага хутчэй зняць гэтыя партрэты.

Доўга не маглі выйсці з шоку акупанты, калі раптам былі вызвалены з турмы прыгавораныя да смерці савецкія грамадзяне. Гэту смелую аперацыю паспяхова ажыццявіў падпольшчык В.І.Варчук, які працаваў у турме слесарам-сантэхнікам, разам з вязнем М.У.Маркавым. Знішчыўшы ахову, яны павялі ў партызаны асуджаных на смерць падпольшчыкаў, партызан і ні ў чым не павінных мірных грамадзян.

Як гром сярод яснага неба быў разгром Пашкаўскага гарнізона, куды немцы зганялі папаўненне для ўласаўскай арміі. Дакладная разведка гарнізона была праведзена разведчыкамі з групы А.І.Шубадзёрава і маёра І.Навумовіча, а бліскучую аперацыю ў ноч на 10.1.1943 г. ажыццявілі партызаны 600-й брыгады пад камандаваннем начальніка штаба С.Г.Сідарэнкі-Салдаценкі. У выніку аперацыі больш за 200 кандыдатаў ва ўласаўскую армію далучыліся да партызан, было знішчана больш за 50 гітлераўцаў і паліцэйскіх, узяты значныя трафеі.

Масавы налёт на Магілёў савецкіх бамбардзіроўшчыкаў і іх дакладныя ўдары па ваенных аб'ектах і месцах дыслакацыі гітлераўскіх часцей і падраздзяленняў пераканалі каменданта горада генерала Эрдмансдорфа ў тым, што нягледзячы на намаганні аддзелаў СД-7Б, СД-8, спецкамісій на чале з фрау Бос і Г.Кульманам і паліцыі па знішчэнні шэрагу падпольных груп і разгрому «Камітэта», расстрэлу не менш як 50 яго членаў, падполле ў горадзе існуе і дзейнічае па-баявому. Генерал патрабаваў ад карных органаў прыняцця самых рашучых мер да поўнага знішчэння «бандытаў». Але патрыёты неслі вялікія страты. Ужо ў канцы 1941 г., выданыя здраднікам, былі публічна павешаны на Савецкай плошчы ваенныя ўрачы У.П.Кузняцоў, А.І.Паршын, Ф.І.Пашанін і нарэшце схоплены змагар-адзіночка капітан Ф.Я.Юраў. Акрамя цудам уцалелых І.М.Лысіковіча і У.П.Шалюты, якія ўцяклі ў партызаны, быў знішчаны ўвесь кіруючы склад «Камітэта» з членамі іх груп. І.М.Лысіковіч, што вярнуўся

ў горад, быў арыштаваны і расстраляны. В.П.Шалюта, які пайшоў у Чырвоную Армію пасля вызвалення Магілёва, загінуў на фронце. Былі арыштаваны патрыёты фабрыкі штучнага шоўку разам з кіраўнікамі, але ім пашанцавала: яны былі вызвалены з турмы В.І.Варчуком. Групы Д.І.Дзерваедава, В.М.Карпінскай, А.П.Заусцінскага, М.К.Гвоздыровай, М.М.Яўціхіева, Г.С.Трактатавай, В.М.Жывапісцава, яе маці і дочка, М.Я.Новікаў і яго маці і іншыя прынялі пакутніцкую смерць у газавых душагубках, турэмных засценках ці былі расстраляны.

Як было ўстаноўлена Магілёўскімі гаркомам і абкомам КП(б)Б адразу ж пасля вайны, у Магілёве фашыстамі было знішчана 178 падпольшчыкаў. 16 падпольшчыкаў, якія паспелі пайсці з Магілёва ў партызаны ў час арыштаў, загінулі ў баях з карнікамі.

Такім чынам, ужо ў першыя месяцы 1943 г. магілёўскае патрыятычнае падполле, што дзейнічала ў 1941—42 гг., практычна спыніла сваё існаванне.

У сакавіку 1943 г. ЦК КП(б)Б на Магілёўшчыне быў створаны падпольны абком партыі, які ў сваю чаргу ўтварыў шэраг райкомаў КП(б)Б, у т.л. і Магілёўскі, якому і даручалася аднавіць падпольную барацьбу ў горадзе, цесна ўвязваючы яе з баявымі дзеяннямі партызан. Цяпер падполле стала будавацца на іншай аснове, партызанскія разведкі пранікалі ў горад, стваралі групы па 2—3 чалавекі, што не былі звязаны адзін з адным, і выконвалі канкрэтныя заданні камандавання партызанскіх атрадаў і партыйных органаў. Актыўна дзейнічалі такія групы ў паравозным дэпо, на трубаліцейным заводзе, у шэрагу нямецкіх сталовых, прадуктовых і зброевых складах, у падсобнай гаспадарцы. Усе яны былі звязаны пэўнымі партызанскімі атрадамі і злучэннямі, у асноўным з 121-м партызанскім палком і 600-й партызанскай брыгадай.

Ва ўмовах жорсткага акупацыйнага рэжыму падпольшчыкам даводзілася добра абдумваць кожны свой учынак і яны дакладна выконвалі гэта правіла. Не ўсё задуманае



П.С.Бірукоў.

ўдавалася ажыццявіць, але летам 1943 г. патрыётамі была ўзарвана рухомая радыёстанцыя, некалькі трансфарматарных кіёскаў, дызельная ўстаноўка ў чыгуначнай майстэрні, бензасклад, падпалена паравознае дэпо, з падсобнай гаспадаркі было выкрадзена 6 скакавых коней, за што генерал Эрдмансдорф адправіў на фронт усю ахову. Нярэдка ў партызанскія атрады з горада дасталяўліся табак, соль, прадукты харчавання і зброя.

Савецкая Армія імкліва ішла наперад. 28.6.1944 г. ў ходзе Магілёўскай аперацыі горад быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У гады іх «гаспадарання» Магілёў зусім абязлюдзеў. У ім засталося ўсяго 13 тыс. жыхароў, было разбурана больш за палавіну жылля, не працавалі ўсе прамысловыя прадпрыемствы.

Нягледзячы на цяжкасці жыцця, магіляўчане не забылі гераічных подзвігаў патрыётаў-падпольшчыкаў. Многія з іх былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР, а падпольшчыку-партызану Л.Дз.Лорчанку прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У Магілёве на будынках чыгуначнага вакзала, гарадской бальніцы, культасветвучылішча, педагагічнага інстытута, адміністрацыйнага корпуса завода імя Кірава, на доме № 47 па Першамайскай вуліцы на ўшанаванне памяці патрыётаў-падпольшчыкаў устаноўлены мемарыяльныя дошкі. *Б.П.Гардзееў.*

Іх ведалі нямногія

У гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Магілёўшчыны дзейнічалі разведвальна-дыверсійныя групы «Мароз» (вайсковай часці 61379) і І.Р.Навумовіча. У Цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі захоўваюцца дакументы (ф. 14112, воп. 201, спр. 3285, л. 437—438), звязаныя з дзейнасцю гэтых груп. На іх падставе і падрыхтаваны гэты матэрыял.

Групу «Мароз» узначальваў І.А.Паўлаў. Магілёўскія падпольшчыкі называлі разведчыкаў гэтай групы проста паўлаўцы.

БАТУРА Н.П., н. ў 1919 у в. Голені Магілёўскага раёна, радавая, трапіла ў палон, лёс невядомы;

БЕГІЯШВІЛІ Д.М., н. ў 1916 у г. Сігнахі, Грузія, радавы, загінуў.

БЕЛАВУСАЎ А.А., н. ў 1920 у в. Кумаўскос Бабынінскага раёна Калужскай вобл., Расія, яфрэйтар, загінуў.

ДВОРНІКАЎ І.В., н. ў 1920 у г. Дрэзна Маскоўскай вобласці, радавы, загінуў.

ДОБЫШ Віктар Іванавіч, н. ў 1922, старшына.

КОСЦІНА С.В., н. ў 1925 у в. Шэўскае Лебядзінскага раёна Ліпецкай вобласці, радавая, загінула.

КРАСНІКАЎ І.Е., н. ў 1919 у в. Пагаева Гайваронскага раёна Кіраваградскай вобласці, старшына, загінуў.

НАВАЛОДСКАЯ К.М., н. ў 1922 у в. Кудара Кабанскага раёна, Бурацыя, яфрэйтар, загінула.

ПАНФЕРАЎ К.І., н. ў 1924 у в. Платонаўка Казлоўскага раёна Варонежскай вобласці, радавы;

ПАЎЛАЎ І.А., н. ў 1916 у в. Коцны Магілёўскага раёна, старшы лейтэнант, камандзір групы, загінуў.

ХАЛЬЧЫЦКІ А.І., н. ў 1924 у г. Магілёў, радавы.

ХАРЫТОНЕНКА А.С., н. ў 1924 у в. Г.Слабада Серадзіна-Будскага раёна Сумскай вобласці, Украіна, яфрэйтар, загінуў.

ЧАРНЫШОЎ Дзмітрый Фёдаравіч, н. ў 1919 у в. Каўрыгіна Дзмітраўскага раёна Маскоўскай вобласці, яфрэйтар, загінуў.

Пры выкананні баявога задання загінулі Дворнікаў І.В., Навалодская К.М., месцы іх пахавання не ўстаноўлены. Н.П.Батура трапіла ў палон і далейшы яе лёс невядомы. Пасля вызвалення Магілёўшчыны ад нямецка-фашысцкіх акупантаў в/ч 61379, у т.л. і група І.А.Паўлава, была перападпарадкавана разведупраўленню 3-га Беларускага фронту і хутка закінута ў тыл ворага ва Усходняй Прусіі, дзе загінулі І.А.Паўлаў, С.В.Косціна, Д.М.Бегіяшвілі, А.Ф.Харытоненка, І.Е.Краснікаў, А.А.Белавусаў і Д.Ф.Чарнышоў. К.І.Панфераў, А.І.Хальчыцкі і В.І.Добыш выйшлі з варожага тылу. Намеснік камандзіра в/ч 61379 Е.Сальнікаў лічыў, што група была выкінута не на цэль і разбіта фашыстамі.

У лютым 1942 г. ў раён Магілёва была закінута і разведвальна-дыверсійная група Заходняга фронту пад камандаваннем Ігната Рыгоравіча Навумовіча. Першапачаткова ў склад групы ўваходзілі 12 разведчыкаў, пасля яна папоўнілася за кошт байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, што трапілі ў партызанскія атрады Касаева і Белавусава, а таксама мясцовых патрыётаў-падпольшчыкаў. 22.3.1944 г. са складу групы быў вылучаны самастойны дыверсійны атрад пад камандаваннем старшага лейтэнанта В.І.Канстанціна-ва, куды ўвайшлі А.Філіна, А.Цямноў, Р.Калюжны, І.Кірылаў, Адамян, П.Чэпак, І.Слёзкін. Па ўказанні разведупраўлення фронту атрад быў перабазіраваны ў раён г. Барысаў. За перыяд з чэрвеня 1942 да чэрвеня 1944 г. ў баях з нямецка-фашысцкімі акупантамі загінулі капітан Р.І.Гарпіновіч (пахаваны ў в. Хатуршчына Бялыніцкага раёна), радыстка В.С.Зотава, якая канспіратыўна працавала ў Магілёве (пахавана ў в. Сярмяжанка Бялыніцкага раёна), лейтэнант Ф.Пірагоў і радавы І.Літвіненка (месцы іх пахаванняў не ўстаноўлены).

Склад групы І.Р.Навумовіча

АДАМЯН, радавы, быў у палоне, уцёк, залічаны ў групу ў кастрычніку 1942.

АНІСІМАВА Ганна Міхайлаўна, н. ў 1922, сяржант, радыстка.

БУКРЭЕЎ Васіль Іванавіч, н. ў 1904 на станцыі Бранск-2, радавы.

ВАКУЖЫНА Вера Ігнатаўна, н. ў 1922, радавая.

ГАРПІНОВІЧ Рыгор Іванавіч, н. ў 1918 у Жытомірскай вобласці, Украіна, капітан.

ГУРАЎ Уладзімір, ваенны фельчар.

ЗОТАВА Вера Сцяпанаўна, радавая, радыстка.

ЗУБАРАЎ Антон Емяльянавіч, н. ў 1925 у в. Палуянава Омскай вобласці, Расія, радавы.

КАЛЮЖНЫ Рыгор, н. ў 1915, радавы.

КАНСТАНЦІНАЎ Віктар Іванавіч, старшы лейтэнант, намеснік камандзіра.

КАРАНЕНКА Мікалай Максімавіч, н. ў 1919 у в. Пятровічы Гомельскай вобласці, тэхнік-інтэндант.

КІРЫЛАЎ Іван, н. ў 1918, радавы.

ЛІТВІНЕНКА Іван, быў у партызанах, радавы.

МАЛЧАНАЎ, н. ў 1921, быў у партызанах, радавы, падрыўнік.

МАТАЧКІН Васіль Піліпавіч, н. ў 1914, малодшы лейтэнант.

МАЛЕШЫН Іван Рыгоравіч, н. ў 1922, старшы сяржант.

НАВУМОВІЧ Ігнат Рыгоравіч, н. ў 1914 у г.п. Копысь Аршанскага раёна Віцебскай вобласці, маёр.

ПАЛІКАРПАЎ Аляксандр Фёдаравіч, н. ў 1922, старшы сяржант.

ПІРАГОЎ Фёдар, н. ў 1917, камандзір дыверсійнага аддзялення, лейтэнант.

РАДЗЮШКІНА Яўгенія Пятроўна, н. ў 1923, радавая.

РАДЦАН Вітольд Іванавіч, н. ў 1925 на станцыі Копысь Аршанскага раёна Віцебскай вобласці, радавы.

САМУСЕВІЧ Уладзімір Васілевіч, н. ў 1926 на станцыі Нясята Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці.

СКЛЯРАЎ Цімафей Іосіфавіч, радавы.

СЛЁЗКІН Ігар Яфімавіч, н. ў 1922 у в. Кавалікі Магілёўскага раёна, радавы.

СЛЁЗКІНА Яўлампія Яфімаўна, н. ў 1925 у в. Кавалікі Магілёўскага раёна, радавая.

СТОЛЯР Афанасій Паўлавіч, н. ў 1914, радавы.

СЯМЁНАЎ Мікалай Пятровіч, н. ў 1922, сяржант.

ФАЙФЕР Іван Іванавіч, н. ў 1919, сяржант.

ФІЛІНА Аляксандра, сяржант.

ЦЯМНОЎ Аляксандр, н. ў 1918, радавы.

ЧЭПАК Пётр, н. ў 1919 у в. Семукачы Магілёўскага раёна, радавы.

ШАКІРАЎ Закір, н. ў 1917 у в. Балжач, Башкірыя, радавы.

ШУБАДЗЁРАЎ Алімпій, н. ў 1925 у Магілёве, радавы.

У дні акупацыі

З успамінаў І.Р.Навумовіча, былога камандзіра разведвальна-дыверсійнай групы

У лютым 1942 г. наша група была закінута, як і планавалася, у раён Магілёва. Прызямліліся каля в. Пільшычы ў Бялыніцкім раёне, месцам дыслакацыі выбралі Аксенькаўскія лясы. Мы прыбылі з баявым заданнем кантраляваць і ўсяляк зрываць перамяшчэнне ворага па чыгунцы, а таксама стварыць шырокую разведвальную сетку ў Магілёве, каб весці назіранне за перамяшчэннем варожых часцей на фронт і назад. Для гэтага нам неабходна было ўстанавіць у горадзе, як мінімум, дзве радыёстанцыі для прамой сувязі з разведупраўленнем фронту. У нашу задачу ўваходзіла таксама арганізаваць у Магілёве дыверсійныя групы для ажыццяўлення дыверсій на найбольш важных прамысловых і транспартных прадпрыемствах, якія працавалі на акупантаў.

Для выканання такога адказнага задання патрэбны былі людзі смелыя, адданыя сваёй Радзіме. Мы пачалі сваю работу ў тыле ворага з пошуку такіх людзей. У гэтай справе вялікую дапамогу аказалі нам камандзіры партызанскіх атрадаў А.М.Касаеў і К.М.Белавусаў. Ужо ў 1943 г. ў Магілёве мы мелі 60 чалавек сваіх разведчыкаў, некалькі дыверсійных груп, якія нанеслі фашыстам вялікія страты. Часта днём і ноччу бясследна знікалі нямецкія салдаты і афіцэры, у розных канцах горада гарэлі або ўзляталі ў паветра аб'екты.

Асабліва цесную сувязь разведчыкі трымалі з падпольнай групай Вольгі Мікалаеўны Жывапісцавай, якая дзейнічала на станцыі Магілёў з ліпеня 1941 г. У склад гэтай групы ўваходзіла ўся сям'я Вольгі Мікалаеўны: дочкі Аза 17 гадоў, 13-гадовая Дзіна і 65-гадовая маці — Эмілія Гаўрылаўна Мізко. У групу ўвайшлі таксама працаваўшыя да вайны на чыгуначнай станцыі Магілёў Валянціна Бухавец, Феадосія Палевікова, Аляксандр Агурэчнікаў, Варвара Барчук, Іван Верамееў, Усевалад Ідалевіч, сёстры Валя і Тася Калбянок, Восіп Несцяровіч.

У маі 1942 г. акупанты пачалі праводзіць пашпартызацыю насельніцтва. Азе Жывапісцавай удалося выкрасці пачку нямецкіх бланкаў, якія дадаваліся да нашых савецкіх пашпартоў. Гэта ў многім аблегчыла работу групы. Усе яе члены былі забяспечаны неабходнымі дакументамі. Да таго ж была магчымасць забяспечваць такімі дакументамі патрэбных групе новых людзей.

У лютым 1942 г. мы даручылі Вользе Мікалаеўне ўладкавацца на працу ў першы паліцэйскі ўчастак. Працуючы там, яна своечасова інфармавала партызанскія атрады, што дзейнічалі вакол Магілёва, аб часе карных аперацый супраць народных мсціўцаў, што давала ім магчымасць таксама своечасова сустракаць карнікаў. Непасрэднай сувязной у той час паміж групай В.М.Жывапісцавай і дэсантнай групай была старэйшая дачка

Вольгі Мікалаеўны — Аза, праз якую кіраўніцтва дэсантнікаў перадавала заданні для падпольшчыкаў.

Вольга Мікалаеўна па-майстэрску арганізавала назіранні за вайсковымі эшалонамі і аўтакалонамі праціўніка, што праходзілі праз чыгуначную станцыі і па шашэйшых дарогах. Улік эшалонаў і аўтакалон быў арганізаваны круглыя суткі. Усе гэтыя звесткі да пачатку работы ў Магілёве нашай радыёстанцыі Вольга Мікалаеўна перадавала нам праз Азу, адкуль яны тэрмінова накіроўваліся ў штаб фронту. За такія каштоўныя звесткі маці і дачка Жывапісцавы, а таксама іншыя члены групы неаднаразова атрымлівалі ад камандавання фронту падзякі.

Вельмі шмат зрабіла для нас і Валя Калбянок, якая ўладкавалася па нашым заданні прыбіральшчыцай у штаб нямецкай вайсковай часці. Ёй выпаў цяжкі лёс. Валя і яе сястрычка Тася былі арыштаваны гестапаўцамі і закатаваны ў турме.

Актыўна дапамагала дэсантнікам і Валянціна Бухавец. Працуючы на чыгунцы, яна збірала каштоўныя звесткі і перадавала нам праз нашых сувязных Склярова і Мялешына. Вельмі каштоўныя звесткі прыносіў да нас і член групы В.М.Жывапісцавай Іван Верамееў, ён працаваў у той час дзяжурным па станцыі. Патрыёт не толькі перадаваў дакладныя даныя руху ваенных эшалонаў праз станцыю Магілёў з указаннем колькасці ў іх салдат і афіцэраў і баявой тэхнікі, але і сам удзельнічаў у дыверсіях. Вялікую разведвальную работу праводзіла член падпольнай групы Феадосія Палевікова. Акрамя збору даных аб вялікай колькасці нямецкіх войск яна распаўсюджвала сярод насельніцтва лістоўкі і газеты, з якіх жыхары горада даведваліся пра становішча на франтах.

У жніўні 1943 г. была арыштавана В.М.Жывапісцава, яе дачка Дзіна і маці. У засценках гестапа яны трымаліся мужна, перанеслі ўсе пакуты і загінулі. Аза цудам пазбегла арышту. Калі яна вярталася дамоў, яе папярэдзілі, што там акупанты пакінулі засаду.

Вольга Мікалаеўна пасмяротна была ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Такую ўзнагароду, а таксама медаль «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» I ступені і іншыя медалі атрымала Аза Мікалаеўна Жывапісцава.



Жители гор. Могилева!

В субботу 25 апреля в 16 часов после обеда будут на площади против местной комендантуры публично повешены следующие партизаны:

1. МЕТЕЛКИН (Коровин) Михаил,
2. РОЖКОВ Анатолий,
3. ХОХЛОВ Павел.

Жители гор. Могилева собирайтесь на площади к вышеуказанному времени и посмотрите на этих преступников.

Эти осужденные в свое время образовали партизанские отряды в гор. Могилеве с целью вредить и подорвать работу немцев и внести беспокойство в страну.

В интересах общей безопасности и плодотворной работы в местностях, занятых германскими войсками, а также для защиты местного населения от таких негодяев, германские власти должны были принять самые решительные меры. Германские власти знают, что всякий благоразумный и порядочный русский человек не хочет иметь никакого дела с такими нарушителями общественного порядка.

Только в мирной и спокойной стране, в которой все помогают, могут все найти работу и может быть всего достаточно.

Поэтому германские власти в своей умиротворяющей работе ожидают сотрудничества всего населения гор. Могилева и окрестностей.

Помогите нам в ваших же интересах таких преступников и нарушителей общественного порядка уничтожить

Падобнымі аб'явамі суправаджалася ўстанаўленне «новага парадку».

З успамінаў былой падпольшчыцы А.М.Жывапісцавай

У ноч з 27 на 28 ліпеня 1941 г. ў Магілёве змоўклі гукі страляніны: апошнія яго абаронцы пакінулі горад і пайшлі на ўсход. Наступіла злавесная цішыня. Але ні адзін магіляўчанін, напэўна, не спаў. Ды іх і засталося ў горадзе не больш як 50 тысяч: хтосьці эвакуіраваўся, шмат людзей падалося ў вёскі і лясы.

І вось пачуўся грукат нямецкай ваеннай тэхнікі, рэзкія каманды акупантаў. Яны займалі сады, агароды, дамы, з якіх выштурхоўвалі жыхароў, кудысьці гналі арыштаваных яўрэяў і цыган. Як потым стала вядома, іх усіх гітлераўцы знішчылі. На другі ці на трэці дзень акупанты пачалі зганяць жыхароў горада ў розныя месцы, дзе гітлераўцы-перакладчыкі чыталі загады акупацыйных улад аб увядзенні «новага парадку» і як мы павінны сябе паводзіць пры гэтым. Памятаю, што

ўсе гэтыя загады заканчваліся адзіным словам — «расстрэл».

У хуткім часе на вуліцах з'явілася паліцыя. І такіх здраднікаў аказалася нямала. Бургамістрам гарадской управы стаў урач Філіцын, загадчыкам аддзела аховы здароўя ўправы аддана служыў урач Сцяпанаў, які выдаў акупантам ваенных урачоў і ў 1944 г. ўцёк на захад, загадчыкам аддзела гандлю — былы завуч СШ № 1 Касцюшка. Пры ўправе быў арганізаваны пашпартны стол, усім гараджанам выдавалі ўкладыш на нямецкай мове, дзе ўказваўся рост, колер вачэй і валасоў, асабістыя прыкметы... Жыхары горада называлі гэты ўкладыш «конскім пашпартам».

Управа паводле загаду акупантаў адкрыла так званую «Біржу працы». Працаздольныя мужчыны павінны былі з'яўляцца туды кожны дзень, жанчыны — па выкліках. Гітлераўцы падрабязна распытвалі іх пра спецыяльнасць, род заняткаў. Калі патрэбны былі тыя або іншыя спецыялісты для работы на рамонтных прадпрыемствах, іх адпраўлялі пад аховай.

Напрыклад, на заводзе імя Дзімітрава («Строммашына») рамантавалі гарматы, кулямёты, вінтоўкі і аўтаматы, рабілі абутак і салдацкае адзенне, розныя афіцэрскія прылады. На аўтарамонтным заводзе і ў пасёлку Ямніца рамантавалі танкі, аўтамашыны, гарматы. Людзей, якія там працавалі, дамоў не адпускалі. У 1943 г., калі гітлераўцы перавозілі далей на захад прадпрыемствы, спецыялістаў-яўрэяў, абутнікаў, шаўцоў, а таксама слабых здароўем работнікаў і іншых расстрэльвалі.

Акупанты з дапамогай управы і яе службаў рабілі ўсё магчымае, каб адрадзіць работу іншых прадпрыемстваў горада. Тое-сёе ім удавалася. Сталі працаваць косцеперапрацоўчы, цагельны, скураны, мылаварны і 2 хлебазаводы. На месцы, дзе зараз размешчаны мясакамбінат, працавала жывёлабойня, куды гітлераўцы прыганялі або прывозілі рэквізаваную ў вяскоўцаў жывёлу. На гэтых прадпрыемствах гараджане працавалі пад строгім наглядам, але і ў такіх умовах падпольшчыкі выводзілі са строю абсталяванне або ўзрывалі яго разам з памяшканнямі. Акупанты вельмі хацелі аднавіць работу шаўковай фабрыкі, але кожны раз падпольшчыкі перашкаджалі яе адкрыццю, тады яны вырашылі вывесці рэштки абсталявання фабрыкі ў Германію.

Вельмі запомніўся мне выпадак з «узяццем Масквы». 31.8.1941 г. па вуліцах Магілёва раз'язджалі аўтамашыны з гучнагаварыльнікамі і з вялікім уздымам паведамлялі, што сталіца бальшавікоў захоплена, Чырвоная Армія канчаткова знішчана. Але на другі ж дзень па горадзе былі расклеены лістоўкі, у якіх гаварылася, што акупанты выдаюць жаданае за рэальнасць і падманваюць народ. Зімою акупанты сцвярджалі, што пад Масквой у стратэгічных мэтах яны выраўноўваюць фронт.



А.М.Жывапісцава.



Н.І.Пшыркова.

У час акупацыі па настойлівых хадайніцтвах настаўнікаў-патрыётаў было пачата навучанне дзяцей. 2 навучальныя гады дзейнічалі 5 няпоўных сярэдніх школ. У 1943 г. іх закрылі. Напэўна, таму, што сярод арыштаваных падпольшчыкаў было шмат настаўнікаў. Працавалі кінатэатры «Чырвоная зорка» і «Радзіма». Першы — для гараджан, другі — для акупантаў, чыноў управы і паліцыі. Дэманстраваліся нямецкія фільмы, кіначасопісы аб перамогах гітлераўскай арміі. З ахвотай наведвалі магіляўчане гарадскі драматычны тэатр, які працаваў у былым парткабінеце гаркома КП(б)Б. Ставіліся п'есы «Навальніца» Астроўскага, «Тры сястры» А.Чэхава. А потым нечакана з'явілася п'еса пад назвай «Павуціна». Аўтарам яе быў былы артыст тэатра Ігнатаў. О, што гэта за драма! Ні адзін магіляўчанін пасля першага прагляду ў тэатр больш не хадзіў.

І яшчэ пра некаторыя «культурныя» ўстановы хацелася б расказаць. У 1942 г. на Ленінскай вуліцы ў Доме Чырвонай Арміі гітлераўцы адкрылі так званае «афіцэрскае казіно», насупраць — адборны пункт, куды прыводзілі дзяўчат ва ўзросце 17—20 гадоў, якія павінны былі абслугоўваць яго. Па заключэнні спецыяльнай камісіі частку дзяўчат



І.Р.Гурыеў.



Л.Ф.Еўдакіменка.

рэкамендавалі «выкарыстоўваць» у доме для салдат і унтэраў.

Памятаецца яшчэ прыезд у Магілёў вясной 1943 г. генерала Уласава. Па радыё і ў газеце паведамілі, што ён будзе выступаць перад гараджанамі ў кінатэатры «Чырвоная зорка». І што ж атрымалася? Акрамя паліцаяў там нікога не аказалася. Уласаву так і не ўдалося сустрэцца з магіляўчанамі.

Я ў час акупацыі горада з'яўлялася членам падпольнай групы, кіраўніком якой была мая маці. Група дзейнічала на чыгуначным вузле, цесна супрацоўнічала з разведвальна-дыверсійнай групай Заходняга фронту. Калі маці, бабулю і маю малодшую сястрычку летам 1943 г. арыштавалі, а потым знішчылі, я засталася зусім адна. І як я радавалася, калі гітлераўцы ўцякалі з горада! 28.7.1944 г. са слязамі на вачах сустракала доўгачаканых чырвонаармейцаў.

З успамінаў І.Р.Гурыева, былога кіраўніка падпольнай групы «Няскораныя»

19.7.1941 г. ў час чарговага налёту варожай авіяцыі каля в. Салтанаўка я ў другі раз быў паранены, кантужаны і засыпаны зямлёй у траншэі. Апрытомнеў на пятыя суткі ўжо ў шпіталі. Пачуў знаёмыя галасы галоўнага ўрача У.П.Кузняцова, медсястры Лізы Еўдакіменка і зразумеў, што зноў знаходжуся ў шпіталі, адкуль выпісаўся 10 дзён назад. Вечарам да мяне зайшлі Захаран і Бойка. Яны паведамілі, што на першым паверсе ляжыць лейтэнант Ралдугін, камандзір батарэі нашага батальёна. Ад яго даведаліся, што наш камбат капітан Юраў таксама паранены ў галаву, аднак дзе ён — невядома. Вырашылі паднімаць маральны дух параненых, у чым яны асабліва мелі патрэбу. Група ўрачоў пад кіраўніцтвам У.П.Кузняцова лячыла параненых абаронцаў Магілёва і вяла вялікую падпольную работу. У сярэдзіне жніўня 1941 г. нам удалося стварыць ядро антыфашысцкай падпольнай групы шпіталя. У яе ўвайшлі абаронцы Магілёва старшы лейтэнант Андрэй Васільеў, малодшы лейтэнант Генрых Захаран, лейтэнант Рыгор Бойка і Ліза Еўдакіменка. 1.9.1941 г. зацвердзілі назву групы «Няскораныя», далі клятву вернасці адзін аднаму. У хуткім часе ў групу ўвайшлі ўрач Б.І.Бурмістраў, медсястра Ганна Зубовіч, работніца кухні Ніна Пшыркова і Аня Агароднікава. Група хутка расла, да яе далучаліся ўсё новыя патрыёты, сярод іх падпалкоўнік П.Я.Калеса, урач В.І.Тарасенка, лейтэнант І.Карпенка, настаўніца Т.П.Агароднікава і іншыя. Былы работнік грамадскага харчавання А.І.Рынкевіч па нашым заданні адкрыў буфет у кінатэатры «Чырвоная зорка», перайменаванага акупантамі ў «Прамень». Ноччу 7.11.1941 г. над будынкам шпіталя патрыёты паднялі чырвоны сцяг. Самаадданая дзейнасць урачоў шпіталя была перапынена ў лістападзе 1941 г. У шпіталь быў падасланы агент па прозвішчы Каснакі. Патрыёты былі схоплены. Зверскія катаванні ў засценках гарадской турмы не зламалі волі сапраўдных патрыётаў, яны перанеслі нечалавечыя пакуты і засталіся ў нашай памяці прыкладам вернага служэння Бацькаўшчыне. 17.11.1941 г. на Савецкай плошчы ў Магілёве былі пакараны смерцю ваенныя ўрачы У.П.Кузняцоў, А.І.Паршын, Ф.І.Пашанін і схоплены капітан Юраў. Патрыёты горада працягвалі няроўную і небяспечную барацьбу з акупантамі ў падполлі. Захаран сабраў радыёпрыёмнік і на кватэры Лізы Еўдакіменкі прымаў весткі з Вялікай зямлі, іх чыталі ў шпіталі, горадзе і ў лагеры ваеннапалонных. З морга нам удалося зрабіць патайны выхад. Начальнік шпіталя Церамецкі, рызыкуючы жыццём, спісваў воінаў як памерлых, а мы адпраўлялі іх невялікімі групамі ў партызанскія атрады. На працягу ўсяго 1942 г. падпольшчыкі працягвалі актыўна дзейнічаць. Толькі ў пачатку лістапада на таварнай станцыі Магілёў-2 удалося падпаліць некалькі вагонаў з хлебам, падрыхтаваных для адпраўкі ў Германію. На гэтай жа станцыі Бойка і Ралдугін устанавілі магнітныя міны на двух эшалонах з танкамі, боепрыпасамі і жывой сілай,

якія ішлі на поўдзень. Партызанам 600-й Магілёўскай брыгады былі перададзены праз А.І.Якубава больш за 8 тыс. патронаў, 3 ручныя кулямёты, 4 камплекты сілкавання для рацыі і шмат медыкаментаў, больш за 80 кілаграмаў узрыўчаткі і каля 40 м бікфордава шнура.

Нам стала вядома, што гітлераўцы збіраюцца эвакуіраваць у Польшчу і Германію хворых і параненых, якія яшчэ заставаліся ў шпіталі. Трэба было іх тэрмінова ратаваць. Для гэтага патрыёты распрацавалі аператыўны план і стварылі 4 баявыя групы. 13.3.1942 г. ў 23 гадзіны па ўмоўным сігнале «пара спаць» з маланкавай хуткасцю, без адзінага выстралу была знішчана ахова. Ралдугін паведаміў усім, што шлях свабодны і можна рухацца. Пад покрывам зорнай ночы ўсе, хто мог хадзіць, пакінулі горад. Пасля дзесяцікіламетровага пераходу нас сустрэла разведка 600-й Магілёўскай партызанскай брыгады...

З успамінаў В.І.Варчука

Радавы Васіль Іванавіч Варчук у баях на подступах да Магілёва быў паранены і трапіў у шпіталь. Уладкаваўся працаваць слесарам-водаправодчыкам у турме, быў актыўным удзельнікам гарадскога падполля.

Восенню 1942 г. па даносе правакатара Гельмана былі арыштаваны падпольшчыкі шаўковай фабрыкі М.Ісакаў, А.Абрамкін, Т.Парэбка, С.Сабалеўскі і многія іншыя. Іх чакалі катаванне і смерць. Параіўшыся з таварышамі па падполлі, я вырашыў паспрабаваць вызваліць іх і звесці з партызанамі.

Вызваляць арыштаваных з турмы было вырашана на каталіцкія Каляды. Пад вечар 24 снежня накіраваўся ў турму. Разлік быў верны — у той перадсвяточны вечар турэмныя ахоўнікі з ліку паліцэйскіх былі «пад мухай». Нібыта для праверкі каналізацыі і ацяплення я паказаў пропуск двум-тром паліцэйскім, якія сустрэліся на маім шляху, без перашкод трапіў на другі паверх. Там стары, дзяўчына і Мікалай Маркаў, былы камандзір падрыўной роты, з якім я быў знаёмы, раздавалі вячэрнюю баланду. Я падышоў да Мікалая і непрыкметна падаў знак ісці за мной. Працуючы да арышту ў пашпартным стале, ён многім, у тым ліку і мне, дапамог атрымаць пашпарт жыхара Магілёва. Я сунуў яму пісталет і сказаў: «Сёння будзеш на свабодзе, дзейнічай па маіх указаннях». Пасля вячэры да мяне падышлі двое паліцэйскіх і пачалі



В.І.Варчук.



Н.М.Лугаўцова.

скардзіцца, што напярэдадні свята даводзіцца несці службу, прапанавалі адзначыць яго, я ўспомніў, што ў мяне з сабой ёсць бутэлька. «Рыхтуйце вячэру, а Маркаў хай дапаможа мне паправіць ракавіну», — прапанаваў я.

Каляды сустракалі ў камеры, дзе сядзеў Маркаў і яшчэ адзін стары. Выбраўшы момант, пусціў у ход малаток, паліцэйскія ў непрытомнасці засталіся ляжаць. З іх зброяй мы пабеглі да камеры, дзе знаходзіўся С.С.Сабалеўскі. Далі яму зброю, адкрылі іншыя камеры і выпусцілі людзей. Сярод іх я ўбачыў прыгаворанага да смерці сувязнога 600-й Магілёўскай брыгады Нічыпара Галушкіна. Без шуму мы спусціліся ўніз, дзе размяшчалася турэмная ахова. І тут нам пашанцавала — паспелі яшчэ спаліць турэмныя дакументы.

Ад турмы разыходзіліся групамі, у розных напрамках. Разам са мной па схіле лагчыны да Дзебры спусціліся Сабалеўскі, Гусакоў, Галушкін, Маркаў і інш. Наша група дабралася да лесу і трапіла да партызан.

З успамінаў Н.М.Лугаўцовай, члена Магілёўскага падполля

У чэрвені 1941 г. пасля дзесяці класаў я ўладкавалася працаваць чарцёжніцай у тэхаддзел дыстанцыі пуці Магілёўскага аддзялення Беларускай чыгункі. Амаль у гэты ж час прыехаў у свой родны горад і Альгерд Гарошка, студэнт Маскоўскага чыгуначнага інстытута. Аднак праходзіць практыку давялося зусім нядоўга — пачалася вайна. Добра валодаючы нямецкай мовай, Альгерд хутка пазнаёміўся са служачымі канторы вузла. Яго



А.Ф.Магілявец-Чуліцкая.

ўзялі на інжынерную пасаду ў тэхнічны аддзел, які не быў укамплектаваны. Па рэкамендацыі Альгерда ў аддзел на работу была прынята і я. Хутка ў доме № 9 на вуліцы Валадарскага, дзе жыў У.М.Процкі, загаварыў прыёмнік. Гарошка, Карыткін і Процкі слухалі Маскву. Так пачала дзейнічаць падпольная група, лідэрам якой быў адукаваны і энергічны Альгерд Гарошка. Для актыўнага і дзейснага правядзення аперацыі вырашылі наладзіць кантакты з надзейнымі людзьмі з ліку дарожных майстроў, машыністаў, рабочых дэпо.

У хуткім часе да групы далучыліся інжынер М.А.Сакалоў, пуцявая рабочая Н.В.Чарапанава, майстар Г.В.Тамкоў, настаўніца А.Ф.Магілявец-Чуліцкая і інш. Тамкоў, выконваючы заданне групы, на перагоне развінціў рэйкі, і эшалон на вялікай скорасці пайшоў пад адхон. Чарапанава змагла развінціць рэйкі прама насупраць вакзала. Толькі на трэці дзень удалося ліквідаваць вынікі аварыі. Падпольшчык Карыткін дзесьці раздабыў толавую шашку з капсулем і падкінуў яе ў тэндэр. Шашка трапіла ў топку паравоза. Пазней падобная дыверсія каштавала жыцця падпольшчыку Пячорыну — у момант закідвання міны ў тэндэр паравоза яго заўважыў начальнік дыстанцыі пуці Лапо, які верна служыў немцам. Пячорын кінуўся на здрадніка, але той паспеў выхапіць пісталет і стрэліць у патрыёта. Мы адпомсцілі за смерць таварыша — сярод белага дня ўспыхнула вялізнае полымя над пакгаузам. Пажарнікі так і не змаглі ўратаваць склад, дзе захоўваліся матэрыяльныя каштоўнасці. А праз некалькі дзён згарэла паравознае дэпо разам з шасцю паравозамі. Гэту акцыю ажыццявіў член групы, былы дырэктар Лунінецкага лесазавода П.І.Бялько (псеўданім Г.І.Анісовіч).

Дыверсіі на чыгункі прыцягнулі ўвагу «Камітэта садзейнічання Чырвонай Арміі». Яго кіраўніцтва праз Т.І.Шабанскую ўстанавіла сувязь з нашай групай. Альгерд Віктаравіч даваў нам ўсё новыя і новыя заданні. 600-й партызанскай брыгадзе спатрэбіліся пасведчанні. Гарошка даручыў мне выкрасці пячатку, якая знаходзілася ў стале генерала. Два дні я хадзіла каля яго кабінета, аднак так і не змагла пранікнуць да запаветнага стала. Помню, Альгерд не асудзіў мяне за нерашучаць і перадаручыў гэту справу Сакалову, які і выкраў пячатку. У канторы падняўся страшэнны перапалох, аднак, калі пячатка «знайшлася» пасля праштампаваных пасведчанняў, генерал супакоіўся.

Тым часам падпольшчыкі працягвалі дыверсіі на чыгункі. Буйное крушэнне арганізавалі Гарошка і Тамкоў. Калі ваенны эшалон падыходзіў да станцыі, каля дэпо пад парай стаяў паравоз (машыніст кудысьці адлучыўся). Г.В.Тамкоў ускочыў на паравоз, павярнуў ручку рэверса. Паравоз, набіраючы хуткасць, пачаў адыходзіць ад станцыі. Падпольшчык перавёў стрэлку і паравоз памчаў насустрач ваеннаму эшалону. Узрывы магутнай сілы скаланулі наваколле. У вагонах доўга рваліся снарады...

Нашы дзеянні не маглі не ўстрывожыць гітлераўцаў. Узмацніўся нагляд за ўсімі работнікамі дэпо. Акупантам удалося схапіць Карыткіна і П.І.Бялько. Яны загінулі, але таварышаў не выдалі. Праз некаторы час арыштавалі Тамкова і Ястрабава. Гарошка запэўніваў нас, што яны стойкія людзі і нікога не выдадуць з групы. Аднак Ястрабаў не змог перанесці катаванняў і выдаў падпольшчыкаў. Карнікі ачапілі чыгуначны вузел і прама на рабоце схапілі Гарошку, Процкага, Чарапанаву, Сакалова. Гэтых мужных людзей закатавалі ў турме. У той ракавы дзень, на шчасце, мяне не было дома. Папярэджаная аб правале групы, я адразу пайшла ў партызанскі атрад.

Іх прымусова вывезлі ў Германію

У гады акупацыі Магілёва каля паўтары тысячы яго жыхароў, пераважна моладзі, а таксама дзяцей і пажылых людзей, прымусова былі вывезены ў Германію, прайшлі праз усе жахі і выпрабаванні, якія выпалі на долю вязняў фашысцкіх канцлагераў. Нямногім з тых, хто перанёс страшэнныя здзекі, голад, хваробы, непасільную працу, удалося ўратавацца ад вогненных печаў крэматорыяў. Жывымі засталіся цудам. Вярнуліся, адкуль не вяртаюцца...

З пісьма Л.Петрыча ў камісію па падрыхтоўцы кнігі «Памяць»

Я з тых, каго ў гады Вялікай Айчыннай вайны напаткаў лёс быць вывезеным у фашысцкую Германію і называцца там «остарбайтэрам». Так называлі іншаземцаў, якіх гітлераўцы прывезлі з усіх акупіраваных краін. Мяне яны схапілі ў г. Ковель, што на Украіне.

Чаму я пішу ў магілёўскую «Памяць»? У г. Глаўхаў у адным з баракаў лагера за калючым дротам, што быў пабудаваны пры тэкстыльнай фабрыцы, пасябраваў з магілёўскім хлопцам Васілём Рубяжом. З ім мы на адных двухпавярховых нарах спалі, разам сёрбалі два разы на дзень бураковую баланду, грызлі чэрствы хлеб з усялякімі раслінамі і драўлянымі дабаўкамі, ад якіх хлеб і не пах хлебам. Працавалі на фабрыцы па 12—14 гадзін у суткі пад наглядам ахоўнікаў. Не, мы не былі кваліфікаванымі рабочымі. Рабілі толькі тое, што загадваў майстар. Часцей за ўсё былі грузчыкамі, якім не давалі ні мінуты перадыху. Гэта была катаржная праца. Да канца змены мы ўжо не маглі перастаўляць ногі. І вось тады пачыналіся здзекі майстроў. Жанчыны-немкі, якія працавалі за станкамі, адносіліся да нас жаласліва. Ім таксама нялёгка было ў вайну.

Калі ў 1945 г. да Глаўхаў наблізіліся амерыканцы, нам з Васілём і Уладзімірам Астаповічам з Бабруйска ўдалося ўцячы з лагера. Ішлі на ўсход толькі начамі. Днём адседжваліся ў лясах. Снедалі крадзенай у баўэраў бульбай. Але ўберагчыся не ўдалося. Праз некалькі дзён нас затрымалі ўзброеныя гітлер-югенды. Хацелі расстраляць. Нам жа пашанцавала: наляцелі амерыканскія ці англійскія самалёты, пачалася бамбёжка і гітлер-югенды разбегліся. Скончылася ўсё тым, што мы трапілі да амерыканскіх салдат. Потым сустрэліся з чырвонаармейцамі і папрасіліся ў армію. Мяне ўзялі, Васілю з Уладзімірам адмовілі — вельмі ўжо маладымі былі. Ды і выгляд... Лепшым для іх была б бальніца ці шпіталь...

Дзе яны цяпер, не ведаю. Пісаў у газеты Магілёва і Бабруйска. Не адклікаюцца. Вось і вырашыў: няхай магіляўчане ведаюць, што адзін іх зямляк прайшоў у вайну цяжэйшы шлях «остарбайтэра». Мяркую, што з Магілёва такіх было шмат. І ўпэўнены, што сотні не вярнуліся дамоў. Магу сцвярджаць: многія назаўсёды засталіся ў нямецкай зямлі...

Нас не лічылі за людзей

З успамінаў Марыі Уладзіміраўны Яноўскай

У 1940 г. я прыехала з Бярэзінскага раёна ў Магілёў і паступіла ў медыцынскае вучылішча. Жыла ў сваёй цёткі па вул. Правая Дубравенка. Пасля заканчэння першага курса меркавала паехаць дамоў. Але пачалася вайна. Ужо ў канцы ліпеня 1941 г. акупанты ўварваліся ў горад. Усюды развесілі загады аб тым, што жыхары павінны абавязкова зарэгістравацца на біржы працы, інакш — расстрэл. Пайшлі туды са стрыечнай сястрычкай. Чыноўнік запоўніў на нас уліковыя карткі і папярэдзіў: быць гатовымі ехаць у Германію.

Прайшоў год. Нас не трывожылі. Чаму?

Потым мы даведаліся: магілёўскія падпольшчыкі спалілі тую біржу. Згарэлі там і ўліковыя карткі. Фашысты вельмі раззлаваліся і сталі хапаць людзей, у асноўным моладзь, на вуліцах, у час аблаў. Мяне яны схапілі на Быхаўскім рынку вясной 1943 г. Прывезлі на станцыю і кінулі ў таварны вагон, дзе ўжо было поўна дзяўчат і хлопцаў. Праз 5 ці 6 дзён нас амаль непрытомных ад голаду і смагі прывезлі ў Кёльн на размеркавальны пункт. Мяне з некалькімі дзяўчынкамі павезлі ў г. Аберхаўзен, у лагер пры металургічным заводзе, дзе я займалася разгрузкай вагонаў з цэглай. Цяжэйшая праца! Кармілі ж нас адзін раз у суткі баландой з бручкі. Сілы пакідалі «остарбайтэраў», так нас звалі. Людзі хутка сталі паміраць. Мяне таксама чакала магіла...

Аднойчы, у час разгрузкі вагонаў, калі ахоўнік з майстрам кудысьці пайшлі, я вырашыла: паміраць дык паміраць. Кінулася ў лес, прасядзела там да ночы. Мяне чамусьці не шукалі. Потым дабралася да г. Бохум, дзе на ферму прыняў стары баўэр Ганс Лемке. Даіла кароў, карміла свіней, палола агарод... За сталом з баўэрам не снедала, але ў параўнанні з лагерам харчавалася куды лепш. Ды і сам гаспадар, такі жылісты, хударлявы і працавіты, адносіўся да мяне добра. Калі яго жонкі не было дома, падкормліваў мяне. Гаварыў «Гут, гут, Машка». Дзесьці ў апошнія дні красавіка 1945 г. ў Бохум прыйшлі амерыканцы. Ганс паклаў мне ў мяшок каўбас, сардэлек, хлеба і сказаў: «Добры працаўнік ты, Машка. Дзякуй табе. Ідзі зараз дамоў...»

І вось прыйшла. Бацька загінуў у партызанах. Маці з брацікам фашысты расстралялі... Вярнулася да цёткі. У той таксама гора: на фронце загінуў муж, дзесьці ў Германіі прапала дачка. Праз некалькі гадоў пахавала цётку. Засталася адна. І хварэла, хварэла... Два гады катаргі паўплывалі на здароўе.

Урыўкі з успамінаў былых вязняў

В.Мікіцін:

Я быў гвалтоўна пагнаны ў фашысцкую Германію, калі мне было ўсяго дзевяць гадоў. Прывезлі нас у г. Мільхаўзен і памясцілі ў бараках за калючым дротам, што быў пабудаваны пры швейнай фабрыцы. Помню толькі, што днём і ноччу, у сне і наяве я вельмі хацеў есці...

А.Гарноўская:

Мяне фашысты і паліцэйскія адправілі ў Германію яшчэ ў 1941 г. Даставілі нас — два вагоны хлапчукоў і дзяўчат — у г. Нюрнберг, на металаапрацоўчы завод. Жыць памясцілі ў цёмныя баракі з двайнымі нарамі. Наглядалі за намі злыя фрау: як што — б'юць нагайкай, кулакамі і нагамі... Калі прывялі ў цэх, майстар падвёў да станка і паказаў, што і дзе націскаць... І пайшоў страшэнны грукат, сталі выскокваць нейкія балты. Калі што сапсуецца, майстар па шыі надае. Рэдкі дзень абыходзіўся без пабояў. Норму не выконвалі. Аб якой жа норме можна было гаварыць, калі ніякіх сіл не было...

Е.Судзянкова:

Злавілі мяне на вуліцы ў чэрвені 1944 г. Чырвоная Армія ўжо пачала наступаць. Было страшна балюча. Прывезлі цэлы таварны састаў у самы Берлін. Аддзялілі хлопчыкаў ад дзяўчынак. Усім павесілі на грудзі шыльды з нумарамі, узялі адбіткі пальцаў, кожнага сфатаграфавалі. Толькі тады прыгналі на кардонна-папяровую фабрыку. Што рабілі? Ды ўсё, што цяжка і непрыемна было рабіць самім немцам. Спачатку было вельмі цяжка: кожны стары фрыц, кожная фрау, праходзячы міма, лічыла неабходным цябе штурхнуць, ударыць... А мы невінаватыя, што іх дзяды, бацькі, сыны гінулі на франтах...

Столькі гадоў прайшло, але і зараз з'яўляюцца ў сне жудасныя выпадкі тых кашмарных дзён...

***

Рыгор Лаўрэнавіч Галубіцкі ў ваенны час таксама перанёс усе пакуты і жахі канцлагернага жыцця. Сям'я Галубіцкіх жыла тады ў Бабруйскім раёне. Дзевяцігадовы Рыгорка быў заўзятым свінапасам. Калі пачалася вайна, працягваў з дня ў дзень выганяць свой статак за ваколіцу. Толькі стараўся трымацца воддаль ад балышака. Але аднойчы ад калоны, што рухалася па ім, аддзялілася машына і накіравалася прама да Рыгоркі. Акупанты на глазах у хлапчука застрэлілі двух лепшых парсюкоў і кінулі ў кузаў. Так упершыню Рыгор Галубіцкі ўбачыў немцаў. А над сям'ёй Галубіцкіх навісла рэальная пагроза расправы. Гаспадар дома Лаўрэн Андрэевіч быў старшынёй калгаса, з актывістамі акупанты пачалі распраўляцца ў першыя месяцы свайго гаспадарання. Відаць, ад расстрэлу выратава-

ла бацьку толькі тое, што напярэдадні вайны ён па лжывым даносе быў арыштаваны і зведаў увесь жах сталінскіх рэпрэсій. Тры гады былы старшыня быў сувязным партызанаў і падпольшчыкаў. Але знайшоўся здраднік і Лаўрэна Андрэевіча разам з іншымі патрыётамі схапілі і адвезлі ў Бабруйск. Што з імі сталася — ніхто не ведаў. А тут новая бяда — у адзін з дзён раптоўна наехалі гітлераўцы і пачалі хапаць падлеткаў, якія сустракаліся на вуліцы. Рыгор таксама трапіўся на вочы. Так ён апынуўся ў адным вагоне разам з трыма сваімі равеснікамі з вёскі. Дзяцей везлі на Захад. Спачатку былі лагеры на тэрыторыі Беларусі, потым — Польшчы. Жудасная вандроўка ў закрытым наглуха вагоне пад аховай аўчарак скончылася ў нямецкім горадзе Лертс. Дзяцей загналі ў лагер для малалетніх. Насупраць іх таксама арганізавалі лагер, куды прывозілі дарослых вязняў. Дзеці днямі прастойвалі каля калючага дроту, спадзеючыся на цуд, — раптам убачыць знаёмых ці нават родных. Аднойчы прывялі каманду не ў паласатым адзенні, як звычайна, а ў цывільным. Рыгорка пільна ўглядаўся ў новенькіх. І тут да яго падбеглі падлеткі-аднавяскоўцы, і, самі не верачы ў тое, што бачылі, закрычалі: «Грыша, бацьку твайго бачылі ў калоне. Ён — там!»

Так за тысячы кіламетраў ад дому хлопчык даведаўся, што бацька, якога ўжо даўно аплакалі ўсёй сям'ёй, жывы.

Нягледзячы на тое, што дзіцячы лагер быў ізаляваны ад канцлагера ваеннапалонных, усё ж да Лаўрэна Галубіцкага дайшла чутка пра сына. У адчаі бацька звярнуўся да каменданта лагера і, на здзіўленне, атрымаў дазвол на сустрэчу. Такі выпадак быў даволі рэдкі ў лагерным жыцці, таму на спатканні бацькі з сынам прысутнічала спецыяльная камісія. А тым часам на змену бязмежнай радасці ў душы хлопчыка пасялілася глыбокая трывога — раптам гэта сустрэча з'яўляецца правакацыяй. Ён вырашыў не выдаваць сваіх пачуццяў пры сустрэчы. Гітлераўцаў такія паводзіны хлопчыка ўразілі. Камендант лагера праз перакладчыка сказаў, што «шчаслівыя тыя дзеці і бацькі, якія сустрэліся ў чужой дзяржаве, таму камісія дазваляе вам быць разам».

Якое гэта было шчасце! Іх пасялілі ў адным бараку, ноччу бацька саграваў сына сваім цяплом і быў шчаслівы ад таго, што мог аддаць галоднаму сыну частку лагернай пайкі. Выжылі яны ў ліку нямногіх, бо былі накіраваны ў лагер Пермазенс, дзе над вязнямі праводзіліся медыцынскія вопыты. Гэта было страшнае месца — усіх апрацоўвалі нейкай вакцынай. Тых, хто не вытрымліваў і адразу паміраў, вывозілі на тачках у горы. Рыгор з бацькам і іншымі вязнямі ў чаканні сваёй чаргі на правядзенне эксперымента штотыдня хавалі нябожчыкаў у гарах. Лазарэт, дзе праводзілі далейшыя медыцынскія вопыты над тымі, хто перанёс вакцыну, вязні называлі пеклам. Трапіць у яго лічылася страшней, чым трапіць у крэматорый — столькі неймаверных пакут даводзілася пераносіць яго насельнікам.

Аднак варотам пекла не суджана было закрыцца назаўжды за сынам і бацькам — набліжаўся фронт, і гітлераўцы спешна перапынілі свае даследаванні. Вызвалілі вязняў англійскія салдаты. Калі яны пачалі рваць калючы дрот, натоўпы знясіленых людзей кінуліся ім насустрач.

Гэты момант лічаць Галубіцкія сваім другім нараджэннем на свет. Аднак не адразу трапілі яны на радзіму, зведаўшы ўсе нягоды і пакуты канцлагернага жыцця. Пасля васьмі месяцаў знаходжання ў савецкіх фільтрацыйных пунктах суровай зімой бацька і сын дабраліся нарэшце дамоў. Каля апоўначы, змораныя і замёрзлыя, пастукалі яны ў акно. Рыгор ужо, як у сне, чуў голас бацькі: «Адчыняй маці, гэта я, Лаўрэн, а са мною — наш сынок...» Жанчына, пазнаўшы голас мужа, страціла прытомнасць...

Пасля вайны жыццёвыя пуцявіны прывялі Рыгора Лаўрэнавіча Галубіцкага ў Магілёў, надзейна звязалі яго лёс з нашым горадам. 27 гадоў адпрацаваў Рыгор Лаўрэнавіч выкладчыкам у машынабудаўнічым інстытуце. Калі выйшаў на пенсію, працягваў выкладаць у інстытуце.

Э.Вяржбіцкі.

Азарыцкія вязні

У пачатку сакавіка 1944 г. нямецка-фашысцкія захопнікі стварылі на тэрыторыі былога Даманавіцкага раёна Палескай вобласці канцэнтрацыйныя лагеры. Паводле загаду камандуючага 9-й нямецкай арміі генерала Харце недалёка ад пярэдняга краю абароны каля

г.п. Азарычы, вёсак Дзерць і Падасіннік узніклі 3 лагеры смерці. Пад выглядам эвакуацыі сюды было прывезена больш за 50 тыс. непрацаздольных савецкіх грамадзян. Сярод вязняў гітлераўцы размясцілі сыпна-тыфозных хворых з мэтай пашырыць эпідэмію на часці Чырвонай Арміі і тым самым стрымаць наступленне савецкіх войск. Для пашырэння эпідэміі сыпна-тыфозных хворых пераводзілі з аднаго лагера ў другі. Зняволеных трымалі на адкрытых балоцістых мясцінах (пабудоў нават лёгкага тыпу на тэрыторыі лагера не было), абгароджаных калючым дротам. Вакол канцлагераў былі пастаўлены кулямётныя вышкі, падыходы замініраваны. Вязняў марылі голадам, забаранялі распальваць агонь, яны вымушаны былі піць балотную ваду. За пратэст расстрэльвалі. Да дня вызвалення (18—19.3.1944 г.) жывымі засталіся 33 480 чал., з іх дзяцей да 13 гадоў — 15 960, жанчын — 13 072, старых — 4448 чалавек.

У 1965 г. на ўшанаванне памяці вязняў на месцы лагера смерці каля гарадскога пасёлка Азарычы Калінкавіцкага раёна ўзведзены мемарыяльны комплекс.

Сярод вязняў лагераў смерці аказаліся і жыхары Магілёва. З першых дзён акупацыі горада нямецка-фашысцкія захопнікі пачалі ўводзіць «новы парадак», быў устаноўлены жорсткі рэжым беззаконня, рабаўніцтва, гвалту. Каб пазбегнуць галоднай смерці, многія магіляўчане падаліся да сваякоў у вёскі, аселі ў Быхаўскім, Кіраўскім і Чавускім раёнах. У пачатку 1944 г. многія з іх былі схоплены, кінуты ў Азарыцкія лагеры смерці і пасля загінулі. Устанавіць імёны тых, хто загінуў, камісія па падрыхтоўцы кнігі «Памяць», на жаль, не змагла. Некаторым з вязняў пашчасціла дачакацца светлага дня вызвалення. Ніжэй прыводзіцца спіс тых, хто выжыў і пасля вайны жыў у Магілёве.

АРЦЁМ'ЕВА (СЯМЁНАВА) Марыя Мікітаўна, н. ў 1938.

АФАНАСЕНКА Ніна Сямёнаўна, н. ў 1936.

БАЙДАКОЎ Міхаіл Андрэевіч, н. ў 1931.

БЕКЕР Ганна Рыгораўна, н. ў 1933.

БРАЦЕННІКАЎ Мікалай Андрэевіч, н. ў 1939.

БУГЛАКОВА Аўдоцця Сямёнаўна, н. ў 1918.



Вязні Азарыцкага лагера смерці праз 50 гадоў на месцы, дзе іх выратавала Чырвоная Армія.

ВАЙЦЯНКОВА (ФЁДАРАВА) Ніна Анісімаўна, н. ў 1940.
ДЗЕГЦЯРОВА Марыя Рыгораўна, н. ў 1918.
ДЗЯМЕШКА Вольга Іванаўна.
ДРАПЕЗА Валянціна Іванаўна, н. ў 1934.
ДРЫЗГО Лідзія Сцяпанаўна, н. ў 1908.
ІВАНОЎ Уладзімір Мацвеевіч, н. ў 1938.
КАЗЛОВА Юлія Канстанцінаўна, н. ў 1912.
КАРПЕЧАНКОВА (БУГЛАКОВА) Галіна Пятроўна, н. ў 1941.
КАРСАКОВА Людміла Фёдараўна, н. ў 1938.
КАСПЯРОВІЧ Іван Іосіфавіч, н. ў 1931.
КРУГЛІКАЎ Анатоль Аляксандравіч, н. ў 1925.
КУЧЫНСКІ Даніла Рыгоравіч, н. ў 1939.
КУШНЯРОЎ Міхаіл Аляксандравіч, н. ў 1929.
ЛЁГАНЬКАЯ (ПАСЕКАВА) Галіна Фёдараўна, н. ў 1936.
ЛЁГАНЬКАЯ (ПАНЧУК) Нэлі Фёдараўна, н. ў 1930.
МІРОНАВА Кацярына Цярэнцьеўна, н. ў 1930.
НАВІЦКІ Аляксандр Астапавіч, н. ў 1931.
ПАЛЯКОВА (БАХАНЬКОВА) Зінаіда Сяргееўна, н. ў 1928.
ПАШКОЎСКІ Уладзімір Іванавіч, н. ў 1938.
ПРЭНЗ Ніна Піліпаўна, н. ў 1938.
РЫДЗЕЎСКІ Уладзімір Іосіфавіч, н. ў 1932.
САВАСЦЕЕВА Агрыпіна Дзянісаўна, н. ў 1927.
САВАСЦЕЕВА Аўдоцця Дзянісаўна, н. ў 1932.
САЛАЎЁВА Валянціна Канстанцінаўна, н. ў 1930.
САФРОНАВА (МАКАРАНКА) Ніна Фёдараўна, н. ў 1927.
СІНЬКЕВІЧ Ульян Фёдаравіч, н. ў 1930.
СНЫТКОВА Зоя Сільвестраўна, н. ў 1928.
ТКАЧОВА Ніна Іванаўна, н. ў 1935.
УСЦІМЕНКА Фёдар Васілевіч.
ФЁДАРАВА Кацярына Цярэнцьеўна, н. ў 1931.
ФУРМАНАВА (ДРЫЗГА) Дзіна Іванаўна, н. ў 1935.
ЧМЫХУНОЎ Рыгор Парфенавіч, н. ў 1937.
ШАНТУРАЎ Уладзімір Мацвеевіч.
ШАПІРА Зоя Фёдараўна, н. ў 1933.
ШАПЯЛЕВІЧ Надзея Якаўлеўна, н. ў 1910.
ШАПЯЛЕВІЧ Тамара Яфімаўна, н. ў 1925.
ЯРАСЛАВАВА Марыя Ціханаўна, н. ў 1930.

Дакументы сведчаць...

ИЗ ОТЧЕТА ГРУППЫ ГФП[1] № 723 О ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ЗА ЯНВАРЬ 1943 ГОДА

Перевод с немецкого 26.1.43

В тюрьме СД[2] в Могилеве работающий там слесарь молотком убил охранника и открыл все камеры арестованных. Последние напали на охрану и обезоружили ее. Двое полицейских службы порядка были тяжело ранены; один из них скончался по дороге в лазарет, а второй умер после операции 27.12. Ефрейтор вермахта, который находился в этом же здании, был смертельно ранен выстрелом в шею. Число бежавших арестованных составляет 7 чел., но, возможно, много больше, так как бежавшие заключенные захватили с собой все регистрационные книги и тюремные документы. Бежавшие заключенные присоединились к бандам[3].

[1] ГФП (гехаймефельдпаліцай — ням., тайная палявая паліцыя) — выканаўчы орган ваеннай контрразведкі ў дзеючай арміі гітлераўскай Германіі. Займалася барацьбой супраць падполля і партызан. Група № 723 дзейнічала ў Магілёўскім, Аршанскім і інш. раёнах.

[2] СД (зіхерхайстдзінст — ням.) палітычная служба бяспекі нацыянал-сацыялісцкай партыі гітлераўскай Германіі. Ахоплівала ўсе сферы грамадскага і дзяржаўнага жыцця як у Германіі, так і ў захопленых краінах. На часова акупіраваных тэрыторыях былога Савецкага Саюза гэта фашысцкая арганізацыя кіравала масавым знішчэннем грамадзян, рабаваннем і спусташэннем гарадоў і вёсак.

[3] Каб дыскрыдэтаваць партызанскі рух, гітлераўцы называлі партызан і падпольшчыкаў «бандытамі», а іх фарміраванні — «бандамі».

ИЗ ОТЧЕТА ГРУППЫ ГФП № 723 О ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ЗА АПРЕЛЬ 1943 ГОДА

Перевод с немецкого 26.04.43

Местная комендатура Могилева доставила в периферийную команду ГФП Могилева русских Терещенко Александра и Смирнова Юрия, которые изъявили желание вступить в национальную армию. В ходе их проверки было установлено, что речь идет о бандитах, которые получили задание вступить в национальную армию для проведения там разложенческой работы, а также для вербовки новых людей в банду. Подробных показаний о лицах, давших им задание, от них нельзя было добиться. Названные лица были расстреляны...

Местная комендатура Могилева передала периферийной команде ГФП в Могилеве арестованную по подозрению в связи с бандитами русскую Артюш Анну. Осенью прошлого года, не выписавшись, она выехала из Могилева, но время от времени снова стала появляться в городе. После первоначального вранья она вынуждена была сознаться, что работает на бандитов, в частности, имеет задание доставлять для них оружие. По ходу следствия были арестованы русские Старовойтов Симон и Николай, которые поддерживали связь с Артюш и передали ей в обмен на продовольствие одну винтовку. Все трое отказались давать какие-либо показания об известных им связниках и лицах, давших им задание, и на основании приказа были расстреляны.

Комиссар тайной полевой полиции и начальник группы Робраде.

ИЗ ОТЧЕТА ЗА ИЮЛЬ 1943 ГОДА

5-м эскадроном 600-го батальона в секретариат ГФП в Могилеве были доставлены 6 русских из бандитского района, которые подозревались в поддержке банд и антинемецкой агитации. Во время обыска их домов был обнаружен станковый пулемет, а также антинемецкие пропагандистские материалы. Один из арестованных обвинялся также в уводе казаков в бандиты. 4 арестованных на основании собранных улик, свидетельских показаний, допросов и показаний возвратившегося от бандитов уведенного казака были изобличены в преступной деятельности и на основании приказа расстреляны.

ИЗ ОТЧЕТА ЗА АВГУСТ 1943 ГОДА

10.8.1943 г. на бензоскладе «Бригитта» в Могилеве совершена диверсия. Ночью со стороны дороги в проволочном заграждении была проделана дыра и заложена взрывчатка в штабель из 50 бочек с бензином. Взрывом полностью уничтожены 6 бочек и 4 бочки повреждены. Потеряно примерно 1000 литров бензина. Бензин не вспыхнул.

Комиссар тайной полевой полиции и начальник группы Робраде.

ИЗ ОТЧЕТА ЗА СЕНТЯБРЬ 1943 ГОДА

На рассвете 5.9.43 г. на электростанции в Могилеве произошли 2 взрыва. Командой секретариата в Могилеве установлено, что взрывами полностью разрушены подвесные дороги. Взрывы совершены минами замедленного действия, которые со знанием дела были заложены в приводные механизмы. Исходя из этого факта и того, что посторонний человек был бы замечен, следует предполагать, что преступника или преступников следует искать среди русских рабочих или охраны. Возникший в результате взрыва пожар был быстро потушен. Со времени взрыва город на длительное время оставлен без электроэнергии, тем более что доставка запасных частей взамен выведенных из строя связана с большими трудностями. До восстановления электростанции город должен ориентироваться на электроснабжение через кабель с гомельской электростанции, а это требует усиленной охраны кабеля.

В ходе расследования, проведенного Могилевским секретариатом ГФП, был арестован один рабочий электростанции, который в ночь диверсии самовольно ушел с работы. Вследствие передачи дел группы 716 группе ГФП следствие по этому делу не закончено. Оно передано упомянутой группе.

12.9.43 г. секретариату ГФП в Могилеве сообщили о возникшем пожаре на вокзале в Могилеве. Проведенным расследованием установлено, что речь идет о диверсии. Пожаром уничтожено одно депо полностью, а второе сгорело частично. Проведенным расследованием во втором депо выяснено, что преступник поджег депо в нескольких местах, использовав для этой цели масло, масленые тряпки, стружки и т.п., а также порох... В диверсии подозревается работающий на железной дороге вагонный мастер, а также 5 семей, которые проживали на территории станции, а затем со всем своим скарбом бежали к бандитам. Следствие по делу ко времени передачи дел группе ГФП 716 не было закончено. Причиненный ущерб оценивается примерно в 100 000 марок.

Графундер комиссар полевой полиции и заместитель начальника группы.

Квартирное расположение, 26.9.43.

НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 963, л. 10—11, 49—50, 70, 77, 130—131, 150, 175—176.

Дакументы выявіў і падрыхтаваў да друку доктар гістарычных навук У.Лемяшонак.

Вызваленне

З аператыўнай зводкі за 28 ліпеня 1944 г.

Войска 2-го Белорусского фронта, форсировав реку Днепр на участке протяжением в 120 километров, прорвали вторую оборонительную полосу немцев, подготовленную ими по западному берегу реки, и штурмом овладели крупным областным центром Белоруссии — городом Могилев...

В бою за город Могилев разгромлена 12 пехотная дивизия немцев, командир которой генерал-лейтенант Бамлер взят в плен вместе с его штабом. Взят также в плен комендант города Могилев генерал-майор Эрдмансдорф.

***

Войска 2-го Белорусского фронта всю ночь на 28 июня вели ожесточенные бои на улицах Могилева. Мощные удары наших пехотных частей с востока и стремительная атака бронетанковых сил с севера решили исход сражения в пользу советских войск. Сегодня утром воины Красной Армии освободили город Могилев от немецко-фашистских захватчиков. В боях за город наши войска уничтожили 12 немецкую пехотную дивизию, нанесли тяжелые потери танково-гренадерской дивизии СС «Фельдхерихалле» и другим немецким частям. Взято много пленных. В числе пленных — командир 12 пехотной дивизии генерал-лейтенант Бамлер, немецкий комендант города Могилев генерал-майор Эрдмансдорф, командир 89-го пехотного полка полковник Дайтентиш и другие офицеры. Захвачены большие трофеи — много вооружения, десятки складов с боеприпасами, продовольствием, медикаментами и 7 железнодорожных эшелонов с различными военными грузами.

Сообщения Советского Информбюро. М., 1945. Т. 7. С. 265.

Як акупанты ўтрымлівалі Магілёў

З паказанняў генерал-маёра Г.Эрдмансдорфа савецкаму камандаванню, зробленых 12.7.1944 г.

Генерал-маёр Г.Эрдмансдорф загадам Галоўнага камандавання сухапутных сіл Германіі 15.3.1944 г. быў прызначаны камендантам умацаванага раёна г. Магілёў. 20 сакавіка па дарозе на Усходні фронт ён наведаў Стаўку Галоўнага камандавання сухапутных сіл, дзе яму быў уручаны загад аб назначэнні на пасаду каменданта ўмацаванага раёна і ён быў азнаёмлены з загадам Гітлера № 11 ад сакавіка 1944 г. аб пераўтварэнні шэрагу гарадоў на Усходнім фронце ва ўмацаваныя раёны і абсталяванні іх усімі сродкамі і сіламі ў крэпасці.

Эрдмансдорф праходзіў на судовым працэсе ў Мінску 15—29.1.1946 г. па справе аб злачынствах, учыненых нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Беларускай ССР, як ваенны злачынец і быў прыгавораны да пакарання смерцю праз павешанне. Прыгавор быў прыведзены ў выкананне 30.1.1946 г. на іпадроме ў Мінску.

Ніжэй прыводзяцца паказанні, якія даў савецкаму камандаванню фон Эрдмансдорф праз некалькі тыдняў пасля таго, як здаўся ў палон савецкім салдатам на вуліцах Магілёва. Гэты архіўны матэрыял падрыхтаваў да друку і зрабіў адпаведныя каментарыі да яго доктар гістарычных навук У.І.Лемяшонак. (Даецца на мове дакументаў.)

...21.3 я вылетел в Минск, фельдмаршала Буша (камандуючы групай армій «Цэнтр» — У.Л.) не было, он был у фюрера. Поэтому после обеда я представился начальнику штаба Центральной группы армий генерал-лейтенанту Кребсу. Я пробыл у него 10—15 минут. Он ознакомил меня с содержанием приказа фюрера, сказал мне, что я буду подчиняться 4-й армии и что как-нибудь потом фельдмаршал Буш поговорит со мной поподробнее. Он тоже был того мнения, что задача моя незавидная, но что, однако, и здесь существует возможность пожать лавры.

Приказ фюрера о создании укрепленных районов на Востоке имеет № 11. Дата, как я

припоминаю, первой половины марта 1944. Этот приказ был «совершенно секретным» и был доведен до сведения армий включительно и офицеров, которых он касался, т.е. комендантов укреп. районов...

Содержание приказа фюрера № 11 от марта 1944 г. примерно следующее:

«Ряд городов на Восточном фронте предназначается для создания укрепленных районов и оборудуются всеми силами и средствами в крепости.

Укрепленными районами командуют генералы. Управление личных дел назначает начальников штабов. Остальные офицеры, унтер-офицеры и солдаты откомандировываются от армий. Укрепленные районы могут быть подчинены только армии. Войска, находящиеся в укрепрайонах, обучить. Группам армий определить, сколько войск должно состоять в постоянном гарнизоне и сколько должно быть подброшено при наступлении противника. Комендант укрепрайона получает дисциплинарные права командующего корпусом только в случае окружения. При этом он ручается своей офицерской честью, что укрепрайон будет удержан во что бы то ни стало, даже при полном окружении его. Один лишь фюрер по ходатайству группы армий может дать приказ об оставлении укрепрайона».

Коменданты укрепрайонов должны дать обязательство выполнить эту задачу перед командующим их группы армий.

22.3 я выехал на автомашине в штаб армии. Генерал-полковник Хейнрици (камандуючы 4-й арміяй — *У.Л.*) принял меня только вечером. Штаб армии находился в то время в лесу северо-восточнее Орши, непосредственно к югу от шоссе Смоленск—Минск, вблизи километрового столба 201. Генерал-полковник Хейнрици с самого начала отстаивал мнение, что устраивать из Могилева крепость и дать себя там окружить не имеет никакого смысла. Если нельзя будет удержать теперешнюю линию фронта, следовало бы держать рубеж по Днепру. Там, якобы, уже строятся позиции. Если и эту линию нельзя будет удержать, следует держать Березину, но в этом случае бессмысленно будет позволить противнику окружить города Могилев и Оршу. Он посоветовал мне не делать наружное кольцо обороны слишком большим. В остальном, сказал он, я подчиняюсь 12-му корпусу, за исключением круга тактических вопросов. Эта подчиненность стояла в противоречии с приказом фюрера, по которому я мог быть подчинен только армии. Несмотря на это, было сделано именно таким образом, так как штаб корпуса, якобы, имел большие возможности выделить мне все необходимое: офицеров, солдат и материалы. Однако это мнение не оправдалось. Начальником штаба я должен был взять подполковника Шербаума, бывшего до сих пор военным комендантом Могилева.

23.3 я выехал в Могилев.

В начале апреля пришел руководящий приказ Центральной группы армий. В нем было указано, что к строительству укрепрайонов приступить немедленно. Учитывая условия местности, следует соорудить несколько укрепленных рубежей, а именно центральный, окраинный и наружный рубежи города. К очистке поля обстрела приступить немедленно[1]. Затем начать строительство сооружений, прежде всего, с противотанковых препятствий на улицах и дорогах подготовить мосты к взрыву, создать бетонированные наблюдательные пункты, убежище для раненых, хранилище боеприпасов, горючего и продовольствия. Подготовить командные пункты для различных командных инстанций, наладить проволочную связь, превратить отдельные дома и группы домов в опорные пункты и тому подобное.

Расчет работ, подготовительных мероприятий по снабжению и организации обороны произвести по календарным срокам. Для обороны, строительства сооружений в распоряжение предоставляются все силы германской армии, в том числе и вольнонаемные. Каждый немец в неделю должен работать на 10 часов больше, чем прежде. Гражданские силы привлекать без всяких ограничений и от войсковых частей изъять до 3% наличного состава. Далее было указано, что для Могилева в качестве постоянного гарнизона выделяются 2 охранных батальона; на случай наступления или же окружения — 2 дивизии. (Ни того, ни другого я никогда не получал). Кроме того, составить список предприятий, имеющих военное значение и требующих подрыва, и предъявить этот список штабу армии[2].

[1] Паводле слоў Эдмансдорфа, для ачысткі поля абстрэлу па яго загаду ў Магілёве было знішчана больш за 600 дамоў, гэта акцыя мела на мэце знішчэнне самога горада. У ліку ўзарваных будынкаў былі Спаская, Уваскрасенская, Успенская цэрквы, школы і іншыя буйныя адміністрацыйныя і жылыя будынкі.

7.4 я был вызван в Минск для дачи обязательства фельдмаршалу Бушу. Насколько я припоминаю, там присутствовали, кроме меня, комендант Витебска (генерал пехоты Гольвитцер), Минска (незнакомый мне), Орши (полковник Ратклифф) и Борисова (генерал-майор Ликман). Кроме того, там были и другие. Сначала фельдмаршал приказал зачитать приказ фюрера № 11. Затем он дал разъяснение к нему. Он подчеркнул, что как при строительстве, так и при обучении войск, а также позднее в бою, нам следует действовать с беспощадной суровостью. При назначении офицеров на штабные должности, на должности командиров районов и любые другие, — сказал он, — чин не играет никакой роли. Старшие офицеры, если надо, подчиняются и младшим... Затем нам были прочитаны доклады начальника инженерной службы, начальника артиллерии, начальника связи, обер-квартирмейстера, главного судьи, начальника ПТО и офицера ВВС.

7.4.1944 г. я вместе с другими комендантами подписал в штабе Центральной группы армий обязательство примерно следующего содержания: «С приказом фюрера № 11 я ознакомился. Обязуюсь удерживать укрепрайон Могилев до последнего солдата, даже при условии окружения».

Это обязательство, данное мною, было подписано в трех экземплярах. Первый экземпляр, предназначенный для фюрера, был, вероятно, отослан в Верховное командование вооруженных сил Германии или в Управление личных дел; второй экземпляр оставался в штабе Центральной группы армий; третий экземпляр получил я и хранил его в своих делах до 27.6.44 г. 28.6.44 я сжег его вместе с другими документами.

Причину того, что Гитлер отдал приказ о создании укрепрайонов, я вижу в том, что благодаря этому наиболее продолжительное время противник не может использовать железнодорожные и шоссейные пути, большая часть которых пересекает города, что благодаря этому как можно дольше сковываются значительные неприятельские силы и этим облегчается натиск их на другие войска, которым предоставляется возможность занять новые рубежи, находящиеся в тылу. В конце концов, это нужно и для того, чтобы иметь базу, использовав которую, при наличии достаточных сил, можно будет вернуть потерянную позицию...

Сооружение укрепрайона Могилев продолжалось до последних дней и выстроено было порядочно. С 15 по 26.6.44 меня в Могилеве не было, я был в Германии[3].

Когда я вернулся, то узнал, что Красная Армия приближается к Днепру с севера от города, что с востока русские вклинились за передний край обороны и только на юго-востоке фронт еще держится.

Решения, что Могилев должен быть наконец объявлен на осадном положении, получено все еще не было.

26.6 утром мне было объявлено, что я полностью подчинен 39-му корпусу. Около полудня я пошел на КП корпуса, однако, генерала Мартинека не застал, а встретил только начальника штаба подполковника Мариуса. От него я узнал, что примерно в 10 км севернее города части противника форсировали Днепр. Все, что можно было собрать — собрано, чтобы эти части отбросить или, по крайней мере, создать против них заслон. Перед самым г. Могилевом положение еще не очень опасно. Стало известно, что русские находятся уже на большом удалении к западу от города. В этот момент нашей беседы в комнату вошел командующий 4-й армией генерал пехоты фон Типпельскирх.[4] Он подчеркнул еще раз, что борьба должна происходить не за Могилев, а за рубеж у Днепра. Таким образом, он сказал мне, что я еще не начинаю действовать. Ответственность за это он берет на себя. Таким образом, я все еще ничего не мог предпринять.

26.6 пополудни, первые русские снаряды стали бить по городу. На складе боеприпасов был поражен один отсек со взрывчатыми веществами, который взлетел в воздух. Я занял свой КП в специальном оборудованном для этого подвале.

Если я правильно припоминаю, только в полночь прибыл приказ о том, что 12-я дивизия без 48-го полка предусмотрена для занятия обороны укрепрайона.

[2]Гаворка ішла пра 25 прамысловых прадпрыемстваў Магілёва, што належала ўзарваць. Для гэтага былі прызначаны спецыяльныя каманды.

[3]У гэты час Эрдмансдорф знаходзіўся ў Германіі на палітычных курсах, куды былі запрошаны 200 генералаў і адміралаў узброеных сіл Германіі. На курсах сярод іншых выступалі Гітлер, Гімлер, Гебельс, Кейтэль.

[4]У гэты час камандуючы 4-й арміяй генерал-палкоўнік Хейнрыцы знаходзіўся ў адпачынку, яго замяшчаў генерал пяхоты фон Ціпелькірх.

В то время, как командир 12-й пд генерал Бамлер находился на моем КП, к нам явился генерал пехоты фон Типпельскирх. Он был очень серьезен. Генерал Бамлер доложил ему о состоянии своей дивизии, генерал фон Типпельскирх в ответ на это хотел послать еще одно ходатайство, чтобы Могилев не выступал в роли укрепрайона. Он надеялся, что решение придет до полудня. Однако все должно быть подготовлено. Точно также он хотел получить решение, кто же из нас двоих получит в руки командную власть. Меня он не мог освободить от обязательства, данного фюреру, генерала Бамлера в таком тяжелом положении он не мог отнять от его дивизии. Когда он прощался с нами, мне казалось, что он убежден, что больше нас не увидит. Около десяти часов 27.6 я получил радиограмму от 39-го корпуса примерно следующего содержания:

«Дивизиям, находящимся вне укрепрайона Могилева, пробиваться к западу. Действовать самостоятельно. Выношу благодарность и желаю солдатской удачи.

Мартинек».

Прочитав это, я догадался, что по какой-то причине штаб корпуса осуществлять единого командования не может, что Красная Армия, по-видимому, подходит к нам и с запада. Затем, часам к одиннадцати, была получена радиограмма, что Могилев надо держать, порядок подчиненности указан не был.

28.6 примерно в 3.15 ночи мне доложили, что противник вторгся в город с юга и востока. Связи с какими-либо частями у меня уже не было.

Считая дальнейшее сопротивление бессмысленным, я и генерал-майор Бамлер сдались в плен первому же русскому солдату...

Вышеизложенное написано мною собственноручно. фон Эрдмансдорф, генерал-майор.

Начальник следственного отдела разведуправления Генштаба Красной Армии подполковник юстиции (Иванов). *16 июля 1944 г.*

ЦАМА РФ, ф. 32, воп. 11309, спр. 211, л. 277—180.

Магілёўская аперацыя 1944 г.

Магілёўская наступальная аперацыя войск 2-га Беларускага фронту (генерал-палкоўнік Г.Ф.Захараў) 23—28 чэрвеня была састаўной часткай Беларускай аперацыі 1944.

У аперацыі ўдзельнічалі арміі: 49-я (генерал-лейтэнант І.Ц.Грышын), 50-я (генерал-лейтэнант І.В.Болдзін), 33-я (генерал-лейтэнант В.Дз.Кручонкін); 4-я паветраная (генерал-палкоўнік авіяцыі К.А.Вяршынін). Войскам 2-га Беларускага фронту ставілася задача — ва ўзаемадзеянні з войскамі левага крыла 3-га і правага крыла 1-га Беларускага франтоў разграміць магілёўскую групоўку праціўніка, вызваліць Магілёў і выйсці на р. Бярэзіна. Партызаны Магілёўскай і ўсходніх раёнаў Мінскай абласцей атрымалі заданне разбурыць камунікацыі праціўніка і аказваць садзеянне савецкім войскам пры фарсіраванні водных перашкод.

На Магілёўскім напрамку Чырвонай Арміі процістаялі 8 пяхотных і 2 матарызаваныя дывізіі 4-й арміі нямецка-фашысцкай групы армій «Цэнтр», якія займалі глыбокаэшаланіраваную (60 км) абарону. Магілёў быў аразаны трыма абарончымі рубяжамі. Праціўнік падрыхтаваўся да кругавой абароны. За 6—10 сутак да пачатку наступлення савецкая авіяцыя далёкага дзеяння правяла аперацыю па знішчэнні варожых самалётаў на аэрадромах. У ноч напярэдадні аперацыі часці авіяцыі далёкага дзеяння і бамбардзіроўшчыкі нанеслі ўдар па вузлах абароны і артылерыйскіх пазіцыях праціўніка.

Галоўны ўдар у напрамку на Магілёў наносілі войскі 49-й арміі. Для ажыццяўлення прарыву на гэтым участку была створана франтавая рухомая група, у якую ўвайшлі 2 танкавыя брыгады, самаходны артполк, стралковая дывізія, штурмавая сапёрная і знішчальна-процітанкавая арт. брыгада. Рухомая група павінна была фарсіраваць Днепр на поўнач ад Магілёва, захапіць плацдарм і ўтрымліваць яго да падыходу галоўных сіл 49-й арміі. Войскі 33-й і 50-й армій трывала ўтрымлівалі рубяжы, якія займалі і былі гатовы праследаваць праціўніка пры яго адыходзе.

23 чэрвеня раніцай войскі 49-й арміі перайшлі ў наступленне: фарсіравалі р. Проня, прарвалі абарону ворага на 12-кіламетровым

участку, аднак прасунуліся толькі на глыбіню 5—8 км. Узнікла пагроза леваму флангу 49-й арміі з боку чавускай групоўкі праціўніка, і 24 чэрвеня ў бой быў уведзены правафланговы 121-ы стралковы корпус 50-й арміі. У ноч на 24 чэрвеня часці корпуса пераправіліся цераз Проню, зламалі супраціўленне праціўніка, разам з часцямі 49-й арміі фарсіравалі р. Бася і 25 чэрвеня вызвалілі Чавусы.

Войскі 49-й арміі да зыходу 25 чэрвеня дасягнулі р. Рэста; на гэты ж рубеж падышлі і правафланговыя часці 50-й арміі. У выніку 3-дзённых цяжкіх баёў пазіцыі праціўніка былі прарваны па фронце да 70 км і на глыбіню да 30 км. 26 чэрвеня, пасля прарыву абарончага рубяжа праціўніка на р. Рэста, войскі 33-й і 49-й армій праследавалі праціўніка ў напрамку Шклова і Магілёва. Увечар 49-я армія выйшла на поўнач ад Магілёва да Дняпра і часткай сіл фарсіравала яго з ходу на захад ад Плешчыцы. У той жа дзень праследаванне праціўніка пачалі весці войскі 50-й арміі. 27 чэрвеня яны фарсіравалі Дняпро на поўдні ад Магілёва, авалодалі прадмесцем Лупалава і злучыліся з часцямі 49-й арміі. Спробы праціўніка затрымаць наступленне савецкіх войск поспеху не мелі. У вулічных баях за Магілёў вызначыліся камандзіры батальёнаў капітаны В.В.Фацін і А.Г.Філонаў, камандзір узвода 830-га палка малодшы лейтэнант М.А.Замулаеў, камандзір узвода 1270-га палка малодшы лейтэнант І.В.Жудаў. Калі загінуў камандзір батальёна 843-га палка, пад моцным агнём праціўніка салдаты разгубіліся і заляглі. Санітарка Васільева, заўважыўшы замяшанне, узнялася ва ўвесь рост і крыкнула:

— Таварышы! За Радзіму, уперад! За мной!

Воіны кінуліся за смелай дзяўчынай і не толькі захапілі плацдарм на правым беразе Дняпра, але і ўварваліся на вуліцы Магілёва.

Пераадольваючы ўпартае супраціўленне ворага, раніцай 28 чэрвеня 290-я стралковая дывізія фарсіравала Дняпро і авалодала паўночнай часткай горада, да 11 гадзін дня яе 855-ы стралковы полк прабіўся ў цэнтр горада і злучыўся з падраздзяленнямі 238-й дывізіі, якая штурмавала Магілёў з захаду. Праціўнік страціў каля 6 тыс. забітымі, каля 3400 палоннымі.

Чырвонай Арміі дапамагалі партызаны: за тры дні да аперацыі метадам «рэйкавай вайны» яны пачалі разбураць чыгуначныя камунікацыі ворага, паралізавалі яго перавозкі (толькі на чыгункі Орша—Магілёў падарвалі больш за 5 тыс. рэек і два масты), захоплівалі і ўтрымлівалі да падыходу савецкіх войск зручныя рубяжы, пераправы, плацдармы на рэках.

У ходзе Магілёўскай аперацыі войскі 2-га Беларускага фронту скавалі на Магілёўскім напрамку значныя сілы ворага, пазбавіўшы яго магчымасці ажыццявіць манеўр рэзервамі на галоўным напрамку — у паласе наступлення 1-га і 3-га Беларускіх франтоў, а таксама арганізавана адвесці свае часці за Бярэзіну, што ў далейшым садзейнічала акружэнню і знішчэнню групоўкі праціўніка ў раёне на ўсход ад Мінска.

За гераізм у Магілёўскай аперацыі 92 савецкім воінам прысвоена званне Героя Савецкага Саюза; 21 вайсковае злучэнне і часць атрымалі ганаровыя найменні «Магілёўскіх»; 32 — «Верхнедняпроўскіх». Ордэнам Чырвонага Сцяга ўзнагароджаны 139-я стралковая дывізія 50-й арміі, 238-я стралковая дывізія 50-й арміі, 290-я і 369-я стралковыя дывізіі 49-й арміі, 43-я асобная гвардзейская танкавая брыгада, 233-ы асобны гвардзейскі танкавы полк, 144-я армейская пушачная ар-



Памятны знак у гонар савецкіх часцей, якія вызвалялі Магілёў.

тылерыйская брыгада, 1819-ы самаходны артылерыйскі полк. Ордэнам Суворава II ступені ўзнагароджана 230-я штурмавая авіяцыйная Чырванасцяжная дывізія, ордэнам Суворава III ступені — 4-я асобная знішчальна-процітанкавая артылерыйская брыгада.

Вайсковыя злучэнні і часці, якія атрымалі найменне «Магілёўскіх».

У ходзе Магілёўскай аперацыі 1944 г. загадам ВГК ад 10.7.1944 г. ганаровае найменне «Магілёўскіх» за вызваленне Магілёва (28.6.1944) атрымала 21 злучэнне і часць 49-й і 50-й армій 2-га Беларускага фронту.

Часці і злучэнні, якім нададзены ганаровыя найменні «Магілёўскіх»: 64-я (генерал-маёр Ц.К.Шкрылёў); 290-я (генерал-маёр І.Г.Гаспаран) і 330-я (палкоўнік У.А.Гусеў) стралковыя дывізіі; 1-я гвардзейская штурмавая інжынерна-сапёрная брыгада (палкоўнік А.Ф.Візіраў); 2-я карпусная артылерыйская брыгада (палкоўнік А.І.Малафееў); 5-я асобная знішчальная процітанкавая артылерыйская брыгада (палкоўнік Дз.У.Ушакоў); 143-я армейская гарматная артылерыйская брыгада (палкоўнік Я.К.Цюрын); 11-я інжынерна-сапёрная брыгада (палкоўнік Г.Ц.Сакалоў); 33-я асобная матарызаваная інжынерная брыгада (палкоўнік І.М.Гурэеў); 50-я інжынерна-сапёрная брыгада (палкоўнік І.А.Логінаў); 16-ы (падпалкоўнік З.М.Сундакаў) і 55-ы (падпалкоўнік М.Р.Грыголія) гвардзейскія гаўбічныя артылерыйскія палкі; 77-ы (падпалкоўнік П.А.Ялесін) і 325-ы (падпалкоўнік А.М.Кавалевіч) гвардзейскія мінамётныя палкі; 233-і асобны танкавы полк (палкоўнік Л.С.Тулоўскі); 722-і самаходны артылерыйскі полк (падпалкоўнік С.І.Капылоў); 1830-ы цяжкі самаходны артылерыйскі полк (падпалкоўнік В.С.Гаеўскі); 1099-ы карпусны артылерыйскі полк (падпалкоўнік М.С.Пянцяшкін); 1321-ы армейскі знішчальны процітанкавы артылерыйскі полк (палкоўнік А.А.Сцяпанаў); 96-ы асобны полк сувязі (падпалкоўнік І.С.Цярэшчанка); 414-ы асобны лінейны батальён сувязі (падпалкоўнік Ф.Р.Корбут). Пайменны спіс гэтых вайсковых часцей і злучэнняў золатам гарыць на белым мармуры «Знака памяці» на цэнтральнай вуліцы горада. Войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за вызваленне Магілёва, загадам ВГК ад 28.6.1944 г. абвешчана падзяка, у Маскве дадзены салют 20 артылерыйскімі залпамі з 224 гармат.

З франтавой газеты 49-й арміі
Смерть немецким оккупантам!

СЛАВА СОВЕТСКИМ БОГАТЫРЯМ — ОСВОБОДИТЕЛЯМ ГОРОДОВ МОГИЛЕВА, БЫХОВА, ЧАУСЫ!

Товарищи красноармейцы, сержанты и офицеры!

Дважды салютовала столица нашей Родины Москва в честь освободителей старинных белорусских городов — Чаусы, Быхов и Могилев.

Высокие образцы храбрости и героизма проявили бойцы и офицеры наших частей в этих боях.

Особенно упорные бои были за город Могилев. Фашистское командование превратило этот город в крепость. Гарнизону было приказано умереть, но не сдавать город, всеми мерами задержать наступление Красной Армии.

Но ничто не остановило стремительного штурма наших войск.

Все подручные средства были использованы для форсирования крупной водной преграды — реки Днепр.

Первыми форсировали реку 12 бойцов и командиров под командованием отважного и смелого офицера товарища Филонова, кавалера ордена Ленина и Отечественной войны. Стремительным броском ворвались они на окраину города, преследуя огнем отступавших фашистов.

Красноармейцы **Малкоедов, Забродский, Туровцев и Мельничук** во главе с помощником командира взвода сержантом **Буяновым** окружили на одной из улиц здание, в котором засело 150 гитлеровцев. Метким огнем они уничтожили 30 фашистов, а остальных принудили сдаться в плен.

Умелым обходным маневром с флангов город Могилев был взят в клещи и после решительного штурма полностью очищен от врага. Захвачены большие трофеи. Взято в плен свыше 1000 солдат и офицеров, среди которых 2 немецких генерала и 3 полковника. Разгромлена 12 немецкая пехотная дивизия и захвачен штаб дивизии во главе с командиром дивизии.

Над городом Могилевом снова взвился красный советский флаг.

Новые боевые задачи поставлены перед ними. Для успешного выполнения этих задач каждый боец и офицер должен еще больше напрячь свои силы, проявлять находчивость, стремительность и смелость.

Еще быстрее прдвигаться вперед и неотступно преследовать немецко-фашистских захватчиков!

Окружайте и уничтожайте живую силу и технику врага днем и ночью!

Не выпускайте живым с нашей земли ни одного фашистского гада!

Очистим нашу советскую землю и добьем фашистского зверя в его собственной берлоге.

Слава вам, доблестным воинам, слава советским богатырям, прорвавшим сильно укрепленную оборону немцев!

Вперед за нашу окончательную победу!

Политотдел
2-го Белорусского фронта
29.6.44.

Прочти и передай товарищу.

***

СЛАВА ГЕРОЯМ МОГИЛЕВА!

Товарищи красноармейцы, сержанты и офицеры!

Нашими частями освобожден Могилев, крупный областной центр Белоруссии, оперативный узел обороны немцев на Минском направлении.

Мы одержали большую и славную победу

В боях за Могилев прославили себя бойцы всех родов оружия.

ПЕХОТИНЦЫ!

Гордитесь такими орлами, как красноармеец Яков Герасимов!

Когда на подступах к Днепру выбыл из строя командир взвода, Герасимов не растерялся. «Вперед, бойцы! Отомстим гадам за смерть командира!» — воскликнул он и повел взвод за собой. Герасимов первым переправился на правый берег Днепра. Под его командой взвод блокировал ДЗОТ и уничтожил целую роту немецких штрафников.

Дерзкий и смелый подвиг совершил разведчик Владимир Рыженков. Ночью он ворвался на командный пункт немецкого полка, убил офицера и захватил фашистское полковое знамя.

АРТИЛЛЕРИСТЫ!

Воюйте так, как воюет старший сержант Петр Акимов!

На своей самоходной пушке Акимов первым ворвался в город Могилев с северной окраины. Его машина врезалась в немецкую колонну. Метким огнем он уничтожил 3 орудия противника. Акимов и его боевые друзья одни удерживали улицу до тех пор, пока не подоспели подкрепления.

Образец находчивости и воинского мастерства показал младший сержант Константин Цветков, командир 45-миллиметровой пушки. Пехотинцам долго не удавалось выбить большую группу гитлеровцев из рощи возле полотна железной дороги. Тогда Цветков выкатил свое орудие на полотно и стал оттуда бить по роще прямой наводкой. Немцы начали разбегаться. Было взято в плен 203 гитлеровских бандита.

ТАНКИСТЫ!

Берите пример с кавалера ордена Отечественной войны гвардии старшины Ивана Милосердова. Иван Милосердов на своем танке прорвался к большому дому, где засели остатки сопротивлявшегося гарнизона. Из-за дома стрелял «фердинанд». Милосердов вывел «фердинанд» из строя, а потом ударил по скоплению гитлеровцев. В этой схватке он уничтожил 30 солдат и 17 взял в плен.

ГЕРОИ МОГИЛЕВА!

Своей беспримерной отвагой и мужеством вы вписали еще одну яркую страницу в книгу побед Красной Армии. **Вы завоевали для своих дивизий почетное право именоваться «Могилевскими». Ваш пример воодушевляет всех бойцов на новые подвиги, на новые победы.**

ДОБЛЕСТНЫЕ ВОИНЫ!

За великим наступлением Красной Армии с горячим восхищением и восторгом следит весь советский народ, весь мир.

Дорог каждый час. Если мы замешкаемся — немец сожжет последние города Белоруссии. Если мы задержимся — погибнут еще тысячи женщин, детей и стариков в Минске, Барановичах, Белостоке, Гродно.

Неутомимо, день и ночь преследуйте, окружайте и уничтожайте врага. Бейте немцев, как их били и бьют герои Могилева!

БЫСТРЕЕ ЗАВЕРШАЙТЕ ОСВОБОЖДЕНИЕ ВСЕЙ БЕЛОРУССИИ, ВСЕЙ СОВЕТСКОЙ ЗЕМЛИ!

Сделаем 1944 год годом нашей окончательной победы!

Мщение и смерть немецким захватчикам!

Военный Совет 49-й Армии.
Политический отдел Армии.
29.6.1944 г.

Прочитай и передай товарищу.

Прайшлі чорныя дні

25 тысяч жыхароў Магілёва з удзелам воінаў-вызваліцеляў і партызан сабраліся 1 ліпеня 1944 года на мітынг, прысвечаны вызваленню горада. На трыбуне прысутнічалі Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Н.Я.Наталевіч, першы сакратар Магілёўскага абкома партыі І.М.Макараў, старшыня аблвыканкома І.М.Кардовіч, камандуючы войскамі 2-га Беларускага фронту генерал арміі Г.Ф.Захараў.

Жыхары горада выказалі пачуцці вялікай падзякі воінам і партызанам за вызваленне з фашысцкага рабства. У пісьме воінам 2-га Беларускага фронту, прынятым на мітынгу, яны запэўнілі савецкіх воінаў, што не пашкадуюць сіл для аднаўлення разбуранай фашыстамі народнай гаспадаркі, дапамогі Чырвонай Арміі. «Прайшлі чорныя дні нямецка-фашысцкай акупацыі, — пісалі ўдзельнікі мітынгу. — Мы зноў уліліся ў дружную сям'ю народаў вялікага Савецкага Саюза, зноў сталі свабоднымі і шчаслівымі грамадзянамі любімай сацыялістычнай Радзімы... Мы запэўніваем Вас, доблесныя воіны, што цяпер на вызваленай зямлі мы аддадзім усе нашы сілы і здольнасці на дапамогу Чырвонай Арміі, на аднаўленне разбуранага ворагам горада. Будзем працаваць з такімі намаганнямі, з якімі Вы, франтавікі, граміце на фронце гітлераўскую нечысць.

НАРБ, ф. 4, воп. 29, спр. 7, л. 51—52.
Падрыхтаваў да друку У.Лемяшонак.

Навечна ў памяці

У час жорсткіх баёў за вызваленне Магілёва савецкія воіны праявілі масавы гераізм і адвагу. Тысячы салдат, афіцэраў і генералаў 49-й і 50-й армій былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, а тым, хто найбольш вызначыўся, было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.



Сустрэча жыхароў Магілёва з воінамі-вызваліцелямі.



І.Я.Андрэеў.



М.К.Буянаў.



П.Я.Вараб'ёў.



В.І.Грышаеў.

АНДРЭЕЎ Іван Яфімавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 9.2.1908 г. ў в. Вежкі Судагодскага раёна Уладзімірскай вобласці. З 1929 г. працаваў у калгасе, леспрамгасе. З ліпеня 1941 г. на Паўднёва-Заходнім, Бранскім, Беларускім, 1-м і 2-м Беларускіх франтах. Камандзір сапёрнага аддзялення старшы сяржант І.А.Андрэеў вызначыўся ў чэрвені 1944 г. пры навядзенні моста цераз р. Проня і пры фарсіраванні Дняпра каля Магілёва. Першым пераплыў на правы бераг ракі, здабыў 2 рыбацкія лодкі і на іх пераправіў цераз раку штурмавую групу, якая захапіла плацдарм. Потым пад агнём праціўніка з сапёрамі навёў пантонны мост, па якім пераправіліся савецкія войскі. Пасля вайны І.Я.Андрэеў жыў на радзіме, працаваў у калгасе. Памёр 27.5.1976 г.

БУЯНАЎ Міхаіл Кандратавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 28.11.1924 г. ў с. Жадзенеўка Хамутоўскага раёна Курскай вобласці. З 1943 г. на Заходнім, 2-м Беларускім франтах. Камандзір аддзялення сяржант М.К.Буянаў вызначыўся пры вызваленні Магілёва. 28.6.1944 г. першым у палку ўплаў пераадолеў Дняпро ў раёне горада, уварваўся ў траншэю праціўніка і знішчыў кулямётны разлік, які перагароджваў дарогу наступленню. У бітве на вуліцах горада павёў аддзяленне ў рукапашны бой, замяніў камандзіра ўзвода, які выбыў са строю. М.К.Буянаў загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў Магілёве, дзе яго імем названы завулак.

ВАРАБ'ЁЎ Пётр Ягоравіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 4.7.1908 г. ў в. Танькіна Кукмарскага раёна Татарстана. Перад вайной працаваў старшынёй калгаса на радзіме. Са жніўня 1941 г. на Заходнім, 2-м Беларускім франтах. Камандзір стралковага аддзялення сяржант П.Я.Вараб'ёў вызначыўся пры вызваленні Магілёўскай вобласці і Магілёва. 24.6.1944 г. аддзяленне пад агнём праціўніка пераправілася цераз р. Проня на поўнач ад г. Чавусы і ўварвалася ў варожую траншэю, знішчыла аддзяленне праціўніка і станковы кулямёт. 26.6.1944 г. выйшла да р. Бася, ліквідавала ахову моста і прадухіліла яго ўзрыў, чым садзейнічала пераправе ўсяго батальёна; 27.6.1944 г. фарсіравала Дняпро на поўдзень ад Магілёва і знішчыла групу гітлераўцаў, якія вялі агонь па падраздзяленнях палка на пераправе. Пасля вайны П.Я.Вараб'ёў працаваў старшынёй калгаса на радзіме.

ГРЫШАЕЎ Віктар Іванавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 29.9.1909 г. ў г. Саратаў. У Чырвонай Арміі з 1931 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У час Вялікай Айчыннай вайны на фронце з 22.6.1941 г. Вызначыўся ў чэрвені 1944 г. ў час прарыву абароны праціўніка і фарсіравання рэк Проня, Бася, Рэста, Дняпро ў Магілёўскай вобласці. 28.6.1944 г. полк пад камандаваннем палкоўніка В.І.Грышаева ўварваўся ў Магілёў і ва ўзаемадзеянні з іншымі часцямі вызваліў горад. У гэтых баях быў захоплены штаб нямецкай пяхотнай дывізіі, 14 ваенных складоў, шмат зброі і боепрыпасаў, узята ў палон 697 гітлераўцаў, у тым ліку 2 генералы. Да 1957 г. В.І.Грышаеў служыў у Савецкай Арміі. Жыў і працаваў у Маскве. Памёр 26.4.1980 г.

ГРЫШЫН Іван Ціханавіч. Герой Савецкага Саюза (10.4.1945). Генерал-палкоўнік (1945). Нарадзіўся 16.12.1901 г. ў в. Унукавічы Рослаўскага раёна Смаленскай вобласці.



І.Ц.Грышын.



М.А.Замулаеў.



М.А.Ісайка.



П.В.Каваленка.

Скончыў пяхотную школу (1928), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1936). У Чырвонай Арміі з 1920 г. З чэрвеня 1941 г. на Заходнім, Бранскім, 2-м Беларускім франтах — камандзір стралковай дывізіі, начальнік штаба 50-й, потым 11-й гвардзейскай армій, з чэрвеня 1943 г. — камандуючы 49-й арміяй. Удзельнік Смаленскай, Беларускай, Усходне-Прускай і Берлінскай аперацый. Армія пад камандаваннем І.Ц.Грышына вызначылася ў баях за вызваленне Магілёва, пры фарсіраванні Дняпра, Друці і Бярэзіны. Пасля вайны камандуючы арміяй, потым начальнік Упраўлення баявой падрыхтоўкі сухапутных войск, з 1950 г. начальнік Галоўнага ўпраўлення баявой і фізічнай падрыхтоўкі сухапутных войск. Памёр 20.6.1951 г. Імем І.Ц.Грышына названы вуліцы ў Маскве і Магілёве.

ДАКУЧАЕЎ Міхаіл Паўлавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 27.9.1921 г. ў г. Дарагабуж Смаленскай вобл. Скончыў 2-е Краснадарскае пяхотнае вучылішча (1941), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1949). У Чырвонай Арміі з 1939 г. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г., савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У Айчынную вайну з кастрычніка 1941 г. на Заходнім і 2-м Беларускім франтах. Маёр М.П.Дакучаеў вызначыўся пры вызваленні Магілёўшчыны. 25—30.6.1944 батальён пад яго камандаваннем наступаў ад г. Чавусы на захад, нанёс ворагу вялікія страты, з ходу фарсіраваў р. Рэста, на поўдзень ад Магілёва захапіў мост цераз Дняпро, чым забяспечыў пераправу нашых часцей. Удзельнічаў у вызваленні Магілёва, Мінска. Да 1966 г. служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік.

ЗАМУЛАЕЎ Міхаіл Апанасавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 20.11.1924 г. ў в. Паляна Перамышльскага раёна Калужскай вобласці. На фронце з 1943 г. Вызначыўся пры вызваленні Магілёва. 27.6.1944 г. стралковы ўзвод пад камандаваннем малодшага лейтэнанта М.А.Замулаева першым фарсіраваў Дняпро і вызваліў в. Ніжні Палавінны Лог. Праследуючы праціўніка, узвод уварваўся ў Магілёў. М.А.Замулаеў загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў Магілёве. Імем героя названа школа на радзіме.

ІСАЙКА Міхаіл Анісімавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 23.11.1908 г. ў в. Міхайлаўка Ямпольскага раёна Вінніцкай вобласці. На фронце з 1942 г. Камандзір узвода пешай разведкі старшына М.А.Ісайка вызначыўся ў чэрвені 1944 г. ў баі каля Магілёва. Замяніў камандзіра роты, якая фарсіравала Дняпро ў в. Калесішча. Рота на чале з М.А.Ісайкам захапіла плацдарм, адбіла 5 контратак праціўніка. М.А.Ісайка знішчыў варожы танк і шмат гітлераўцаў. Пасля вайны да 1955 г. служыў у войсках МУС.

КАВАЛЕНКА Павел Васілевіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 11.2.1917 г. ў в. Яўленка Ленінскага раёна Паўночна-Казахстанскай вобласці. Працаваў шафёрам пажарнай часці ў г. Сватава Луганскай вобласці, потым матарыстам на чыгунцы. На фронце з чэрвеня 1941 г. Камандзір мінамётнага ўзвода старшы лейтэнант П.В.Каваленка вызначыўся пры вызваленні Магілёўскай вобласці і Магілёва. У снежні 1943 г. ўзвод пад яго камандаваннем выявіў і знішчыў каля в. Скварск Чавускага раёна вялікую колькасць варожых войск, якія рыхтаваліся да атакі. Праследуючы праціўніка, П.В.Каваленка з групай аўтаматчыкаў першы уварваўся ў в. Барышаўка. 23.6.1944 г. ў час



І.А.Калашнікаў.



В.Р.Карпенка.



А.М.Касаеў.



А.М.Круташынскі.

прарыву варожай абароны на р. Проня ўзвод агнём мінамётаў стварыў 2 праходы ў драцяных загародах праціўніка і знішчыў 3 кулямётныя кропкі. 28.6.1944 г. ўзвод першым прабіўся на ўскраіну Магілёва. Калі скончыліся міны, байцы ўзвода ў рукапашным баі захапілі батарэю 122-міліметровых мінамётаў і адбілі контратаку праціўніка. З 1946 г. П.В.Каваленка капітан ў запасе. Жыў і працаваў у г. Сватава Луганскай вобласці. Памёр 24.8.1949 г. Імем героя названа вуліца ў г. Сватава.

КАЛАШНІКАЎ Іван Абрамавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся ў лютым 1922 г. на хутары Ступіна Паўлаўскага раёна Варонежскай вобласці. Працаваў у калгасе. На фронце з лістапада 1941 г. Вызначыўся ў час прарыву добра ўмацаванай абароны праціўніка на р. Проня ў Магілёўскай вобласці і ў баях за Магілёў. У чэрвені 1944 г. байцы стралковага аддзялення пад камандаваннем сяржанта І.А.Калашнікава першымі пераправіліся цераз раку, захапілі плацдарм, знішчылі 2 агнявыя кропкі ворага і 24 гітлераўцы. У баі на шашы Магілёў—Мінск І.А.Калашнікаў замяніў камандзіра ўзвода. Пад яго камандаваннем узвод адрэзаў праціўніку шлях да адступлення, адбіў 2 контратакі і ўтрымліваў участак дарогі да прыбыцця падмацавання. Загінуў 27.7.1944 г. ў час вызвалення Польшчы. На радзіме героя пастаўлены помнік.

КАРПЕНКА Васіль Рыгоравіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 1.1.1910 г. ў г. Навашахцінск Растоўскай вобласці. З чэрвеня 1941 г. на Паўднёва-Заходнім, Заходнім, Паўночна-Заходнім, Беларускім, 1-м і 2-м Беларускім франтах. Намеснік камандзіра батальёна па палітычнай частцы гвардыі капітан В.Р.Карпенка вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра і Проні, вызваленні Магілёва. У чэрвені 1944 г. кіраваў пераправай войск цераз Дняпро. На захопленым плацдарме падраздзяленні пад яго камандаваннем адбілі контратакі праціўніка і перайшлі ў наступленне. На чале стралковай роты В.Р.Карпенка першым уварваўся ў Магілёў і вёў бой да поўнага вызвалення горада. Загінуў у баі 27.7.1944 г. Пахаваны ў г.п. Смілавічы Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці.

КАСАЕЎ Асман Мусаевіч. Герой Савецкага Саюза (1965). Нарадзіўся ў ауле Хурзук Карачаеўскага раёна Карачаева-Чаркескай рэспублікі. У 1939 г. скончыў Кіеўскае артылерыйскае вучылішча. У Чырвонай Арміі з 1937 г. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г. У пачатку Айчыннай вайны на Заходнім фронце: начальнік артылерыі стралковага палка. У партызанах з жніўня 1941 г. З мая 1942 г. камісар, з ліпеня 1942 г. камандзір 121-га партызанскага атрада, з лістапада 1943 г. — 121-га партызанскага палка, у жніўні — лютым 1944 г. член Магілёўскага падпольнага райкома КП(б)Б. Загінуў у час варожай бамбардзіроўкі 18.2.1944 г. Пахаваны ў Магілёве. У яго гонар в. Сярмяжанка Бялыніцкага раёна перайменавана ў в. Асман-Касаева. Яго імем названы вуліцы ў Магілёве, в. Хрыпянічы Магілёўскага раёна; у г. п. Бялынічы Магілёўскай вобласці ўстаноўлены бюст А.М.Касаева.

КРУТАШЫНСКІ Андрэй Міхайлавіч. Герой Савецкага Саюза (26.10.1944). Нарадзіўся 28.1.1918 г. ў г. Перм. У Чырвонай Арміі з 1941 г. На фронце з ліпеня 1942 г. Памочнік начальніка штаба артылерыі стралковай дывізіі капітан А.М.Круташынскі вызначыўся пры вызваленні Магілёва. 27.6.1944



М.Ц.Курбатаў.



І.С.Лазарэнка.

г. пры фарсіраванні р. Рэста арганізаваў кіраванне агнём артпалка, які адбіў 2 контратакі, захапіў пераправу, чым забяспечыў хуткае прасоўванне пяхоты; 28.6.1944 г. фарсіраваў Дняпро, у Магілёве ўдзельнічаў у захопе штаба нямецкай дывізіі, на ўскраіне горада з воінамі выбіў праціўніка з рубяжа абароны, захапіў мост. Загінуў у баі 9.9.1944 г. пры вызваленні Полыпчы.

КУРБАТАЎ Міхаіл Ціханавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 15.1.1924 г. ў г.п. Магдагачы Амурскай вобласці. На фронце з 1942 г. Памочнік камандзіра ўзвода малодшы сяржант М.Ц.Курбатаў вызначыўся ў час прарыву абароны праціўніка на р. Проня і вызвалення Магілёва. 23.6.1944 г. ўзвод пад яго камандаваннем выбіў праціўніка з траншэй, знішчыў мінамёт і кулямёт разам з разлікамі. У баі за в. Будзіна Чавускага раёна М.Ц.Курбатаў з воінамі захапіў гармату і агнём з яе падавіў 18 агнявых кропак і 3 дзоты праціўніка. 28.6.1944 г. пры вызваленні Магілёва гранатамі знішчыў варожы дзот. Загінуў 18.7.1944 г. пры фарсіраванні Нёмана. Пахаваны ў Гродне, дзе яго імем названа вуліца. У г.п. Магдагачы яго імем названы вуліца і школа.

ЛАЗАРЭНКА Іван Сідаравіч. Герой Савецкага Саюза (21.7.1944). Генерал-маёр (1940). Нарадзіўся 8.10.1895 г. ў рабочым пасёлку Валаконаўка Белгарадскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1918 г. Удзельнік 1-й сусветнай, грамадзянскай, савецка-фінляндскай 1939—40 гг. войнаў. У час Вялікай Айчыннай вайны з 1941 г. на Заходнім, Бранскім, 2-м Беларускім франтах. Камандзір 369-й стралковай Карачаўскай дывізіі. І.С.Лазарэнка вызначыўся ў час прарыву абароны праціўніка ў Магілёўскай вобласці. 23—25.6.1944 г. дывізія фарсіравала рэкі Проня і Бася, прасунулася наперад на 25 км, нанесла вялікія страты ворагу. 25.6.1944 г. адбіла контратаку праціўніка каля в. Халмы Чавускага раёна. І.С.Лазарэнка асабіста падбіў з гарматы некалькі танкаў. Загінуў у гэтым баі. У Магілёве яго імем названы вуліца і сквер, у скверы на магіле ўстаноўлены помнік герою.

З успамінаў М.Д.Максімцава, генерал-маёра ў адстаўцы

...Генерал-маёр І.С.Лазарэнка прабіваецца з перадавымі часцямі да Дняпра, каб захапіць пераправы. Такое заданне атрымана ад камандуючага 2-м Беларускім фронтам генерала арміі Г.Ф.Захарава.

Уехалі ў падпаленую ворагам вёску Халмы. Яшчэ некалькі мінут назад тут былі фашысты. Жыхары бягуць з лесу ратаваць свае хаты. Лазарэнка спыняе машыну і дае ўказанне тушыць пажар. Генерала акружаюць старыя і дзеці. Іван Сідаравіч распытвае пра Дняпро, пра пераправы...

З боку Драчкова данеслася ружэйна-кулямётная стральба, разрывы снарадаў. Іван Сідаравіч дзякуе жыхарам за звесткі і імчыць туды. Дарэмна ад'ютант спрабуе пераканаць камандзіра дывізіі пачакаць падыходу галоўных сіл. Генерал рашуча махае рукой.

...Пяць варожых танкаў выпаўзлі з лесу, за імі беглі аўтаматчыкі. Генерал-маёр накіроўваецца да назіральнага пункта камандзіра батальёна. Спакойна выслухаўшы даклад капітана пра сілы праціўніка, загадвае свайму ад'ютанту вярнуцца ў Халмы і падагнаць падыходзячыя часці дывізіі, перш за ўсё процітанкавую артылерыю.

Першая контратака адбіта, поле заслана варожымі трупамі. Заканчваецца дзень. Ярка-аранжавы дыск сонца асядае за Дняпро. Вораг распачынае яшчэ адну контратаку. Камандзір батальёна смяротна паранены. Да вёскі падходзяць танкі з чорнымі крыжамі. Байцы пачынаюць адыходзіць да хат. Адна батарэя замоўкла. Агонь па ворагу аслаб. Іван Сідаравіч бачыць, што прама на процітанкавую гармату ідзе танк. Разлік гарматы загінуў. Толькі паранены артылерыст спрабуе падняць снарад. Некалькі хвілін — і супраціўленне батальёна будзе зламана. Іван Сідаравіч спяшаецца на дапамогу параненаму ар-



В.І.Панкоў.



М.П.Пятроў.



С.А.Разінкін.



А.К.Разумаў.

тылерысту, хапае ў яго снарад, хутка заражае гармату.

Першы снарад лажыцца перад нямецкім танкам, другі пралятае над вежай. Толькі трэці трапляе ў цэль. Танк загараецца. Генерал працягвае страляць, не адчуваючы, што паранены. Некалькі танкаў падбіта, астатнія паварочваюць да лесу. Натхнёныя поспехам, байцы кідаюцца ў атаку, з вёскі Халмы імчаць на дапамогу нашы танкі з пяхотай на брані. Ззаду разрываецца варожая міна. Іван Сідаравіч падае на лафет гарматы...

Вестка пра гібель камандзіра дывізіі ўзрушыла байцоў. Іх ужо не магло нішто спыніць. У той жа дзень яны фарсіравалі Дняпро на поўнач ад Магілёва.

ПАНКОЎ Васіль Ігнатавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 27.9.1925 г. ў в. Кавылянка Атабасарскага раёна Цалінаградскай вобласці. На фронце з 1943 г. Камандзір стралковага аддзялення малодшы сяржант В.І.Панкоў вызначыўся пры вызваленні Магілёва. 28.6.1944 г. пад агнём праціўніка на чале аддзялення фарсіраваў Дняпро, на захопленым плацдарме знішчыў 3 варожыя агнявыя кропкі, чым садзейнічаў пераправе падраздзяленняў палка. У рукапашных баях на вуліцах Магілёва аддзяленне знішчыла і ўзяло ў палон некалькі дзесяткаў гітлераўцаў. В.І.Панкоў загінуў у жніўні 1944 г. ў Бярэзінскім раёне. Пахаваны ў Магілёве. Яго імем названа вуліца ў Магнітагорску.

ПЯТРОЎ Міхаіл Пятровіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 17.11.1904 г. ў в. Старыя Шарашлы Бакалінскага раёна Башкартастана. Скончыў курсы «Выстрал» (1944), Вышэйшую афіцэрскую бранятанкавую школу (1949). У Чырвонай Арміі з 1926 г. З 1941 г. на Заходнім і 2-м Беларускім франтах. Вызначыўся пры вызваленні Магілёўскай вобласці і Магілёва ў чэрвені 1944 г. Стралковы полк пад камандаваннем падпалкоўніка М.П.Пятрова фарсіраваў рэкі Проня, Бася, Рэста, вызваліў 217 населеных пунктаў; у ноч на 28.6.1944 г. пад агнём праціўніка пераправіўся цераз Дняпро на поўдзень ад Магілёва і абхадным манёўрам адрэзаў ворагу шлях да адступлення. У баі захапіў 120 гармат, 60 кулямётаў і аўтаматаў, 235 аўтамашын, 9 складоў, знішчыў 1200 і ўзяў у палон каля 250 гітлераўцаў. Да 1954 г. М.П.Пятроў служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. Жыў у Вінніцы. Памёр 5.8.1967 г.

РАЗІНКІН Сямён Аляксеевіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 15.2.1907 г. ў г. Феадосія. Скончыў аб'яднаную школу артылерыйскіх і зброевых тэхнікаў (1936). У Чырвонай Арміі з 1929 г. З 1941 г. на Паўднёва-Заходнім фронце, у 1942—43 гг. у партызанах — начальнік боезабеспячэння партызанскай брыгады, потым на 2-м Беларускім фронце. Вызначыўся пры вызваленні Магілёўскай вобласці і Магілёва. 25.6.1944 г. рота, у складзе якой быў С.А.Разінкін, першай у палку фарсіравала р. Бася, уварвалася ў в. Каменка Чавускага раёна, захапіла 4 варожыя гарматы; 26.6.1944 г. фарсіравала р. Рэста, выбіла праціўніка з траншэй, працягваючы наступаць, выйшла да Дняпра; 27.6.1944 г. пераправілася цераз яго і ўдзельнічала ў вызваленні Магілёва. Пасля вайны С.А.Разінкін жыў у г. Жалезнагорск Курскай вобласці. Памёр 27.4.1987 г.

РАЗУМАЎ Аляксандр Кірылавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 5.3.1909 г. ў в. Малюшына Кацельніцкага ра-



І.П.Раманаў.



М.В.Рамашка.



І.Ц.Рыжоў.



С.А.Саркісян.

ёна Кіраўскай вобл. Скончыў Кіраўскі прамыслова-эканамічны тэхнікум імя Красіна (1929), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1941), Ваенную акадэмію Генштаба (1948). Працаваў у сельскагаспадарчай камуне, інструктарам спажыўсаюза, інструктарам-рэвізорам, загадчыкам гандлёвага аддзела лесрабкапа Кіраўскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1931 г. З кастрычніка 1941 г. на Заходнім, Бранскім, 2-м Беларускім франтах. Камандзір стралковага палка падпалкоўнік А.К. Разумаў вызначыўся 25—29.6.1944 г. ў баях пры фарсіраванні рэк Бася, Рэста, Дняпро, у час прарыву абароны праціўніка на поўнач ад Чавусаў і пры вызваленні Магілёва. Полк першым уварваўся ў Магілёў, разграміў рэшткі варожай дывізіі, у вулічных баях знішчыў больш за тысячу гітлераўцаў, узяў у палон 440 салдат і афіцэраў, у тым ліку 2 генералаў. Да 1959 г. А.К.Разумаў служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. Ганаровы грамадзянін Магілёва (1985).

РАМАНАЎ Іван Пятровіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 16.1.1923 г. ў в. Гнеўкава Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці. Скончыў Мурамскі радыётэхнікум (1965). З чэрвеня 1942 г. на Заходнім, 2-м Беларускім франтах. Камандзір аддзялення разведкі сяржант І.П.Раманаў вызначыўся ў баях за вызваленне Магілёўскага раёна і Магілёва. 27.6.1944 г. аддзяленне на чале з ім фарсіравала Дняпро, выбіла праціўніка з ускраіны в. Ніжні Палавінны Лог, захапіла ў палон 27 гітлераўцаў; перарэзала ворагу шлях да адступлення на паўночны захад ад Магілёва, захапіла станцыю Магілёў і ўтрымлівала яе да падыходу падмацавання. Пасля вайны І.П.Раманаў працаваў на радыёзаводзе ў г. Мурам Уладзімірскай вобласці.

РАМАШКА Мікалай Васілевіч. Герой Савецкага Саюза (1944). Нарадзіўся 13.10.1913 г. ў в. Дусаеўшчына Капыльскага раёна. З 1941 г. на Паўночна-Заходнім, 2-м Беларускім франтах. Намеснік камандзіра зенітнага артпалка па палітрабоце маёр Рамашка вызначыўся ў Беларускай аперацыі. 30.6.1944 г. ў час абароны чыгуначнага моста і пераправы цераз р. Бярэзіну каля в. Свіслач Асіповіцкага раёна зенітны полк з удзелам Рамашкі адбіў некалькі контратак ворага. У баі замяніў камандзіра кулямётнай роты, знішчыў каля 200 фашыстаў. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў Магілёве. Яго імем названы вуліцы ў Капылі і Магілёве, пастаўлены помнікі ў р. п. Ялізава Асіповіцкага раёна і на радзіме.

РЫЖОЎ Іван Ціханавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 19.10.1914 г. ў в. Чэрнікава Калпнянскага раёна Арлоўскай вобласці. Працаваў у калгасе, на прадпрыемстве. У Чырвонай Арміі з 1938 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У час Вялікай Айчыннай вайны на фронце з 1941 г. Разведчык старшы сяржант І.Ц.Рыжоў вызначыўся пры вызваленні Магілёва. Пад агнём праціўніка ў ліку першых фарсіраваў Дняпро, уварваўся ў варожую траншэю. На подступах да горада прабраўся да варожага дзота, закідаў яго гранатамі. У вулічных баях за Магілёў знішчыў гітлераўскага снайпера.

САРКІСЯН Сурэн Арташэсавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 31.10.1924 г. ў с. Васкеваз Аштаракскага раёна Арменіі. Скончыў Ерэванскі політэхнічны інстытут імя К.Маркса (1951). З 1942 г. на Калінінскім, Заходнім, Бранскім, Беларускім, 2-м Беларускім франтах. Сувязіст яф-

рэйтар С.А.Саркісян вызначыўся ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні Магілёва і Магілёўскай вобласці. Пад агнём праціўніка ў ліку першых пераправіўся цераз Дняпро каля Магілёва, наладзіў сувязь камандавання з перадавымі падраздзяленнямі, ліквідаваў некалькі пашкоджанняў сувязі. Пасля вайны жыве і працуе ў Ерэване.

СМІРНОЎ Дзмітрый Іванавіч. Герой Савецкага Саюза (21.7.1944). Генерал-лейтэнант (1945). Нарадзіўся 26.7.1901 г. ў в. Клімава Астроўскага раёна Кастрамской вобласці. У Чырвонай Арміі з 1920 г. На фронце з 1941 г. Вызначыўся ў Магілёўскай аперацыі. 24.6.1944 г. стралковы корпус пад камандаваннем генерал-маёра Дз.І.Смірнова пераправіўся цераз р. Проня, вызваліў г. Чавусы і, пераадольваючы ўпартае супраціўленне ворага, за 4 дні прасунуўся на захад на 50 км, нанёс праціўніку вялікія страты ў тэхніцы і жывой сіле, з ходу фарсіраваў Дняпро і 28.6.1944 г. вызваліў Магілёў, разграміў рэшткі 12-й нямецкай дывізіі, захапіў у палон больш за 3 тыс. салдат і афіцэраў, у тым ліку штаб нямецкай дывізіі. Да 1960 г. служыў у Чырвонай Арміі. Ганаровы грамадзянін Магілёва (1970). Жыў у Маскве. Памёр 17.3.1975 г.



Дз.І.Смірноў.

З успамінаў Дз.І.Смірнова

Летам 1944 г. 2-і Беларускі фронт павінен быў прарваць абарону ворага на ўчастку Халопы—Каменка, нанесці галоўны ўдар у напрамку Затоны—Барсукі, на пяты дзень 28.6.1944 г. фарсіраваць Дняпро і авалодаць Магілёвам.

121-му стралковаму корпусу падпарадкавалі 238-ю (камандзір генерал-маёр І.Д.Краснаштанаў), 139-ю (камандзір генерал маёр І.К.Кірылаў), 330-ю (камандзір генерал-маёр В.А.Гусеў) стралковыя дывізіі і часці ўзмацнення: танкавы і артылерыйска-процітанкавы армейскія палкі і армейскую гарматную брыгаду.

...Раніцай 23 чэрвеня злучэнні 49-й арміі пасля артылерыйскай падрыхтоўкі атакавалі праціўніка і да 15—16 гадзін прасунуліся на 5—7 кіламетраў. Мне было загадана ўвесці корпус у бой. На досвітку 27 чэрвеня 238-я і 139-я дывізіі ўступілі ў прадмесце Магілёва Лупалава і з ходу на падручных сродках пачалі пераправу цераз Дняпро.

На бочках, сарваных варотах, бярвёнах, на рыбацкіх лодках і проста ўплаў з кулямётамі і мінамётамі, з палкавой і батальённай артылерыяй нашы падраздзяленні фарсіравалі Дняпро і да 12 гадзін дня занялі плацдарм пад Магілёвам. Вораг сустрэў нас моцным артылерыйскім, мінамётным і кулямётным агнём.

Да 17 гадзін наша пяхота і процітанкавая артылерыя занялі зыходнае становішча для штурму горада. Праз 30 мінут пачаўся агнявы налёт. Пасля паднялася ў атаку пяхота, яе падрымлівалі агнём прамой наводкі танкі з Лупалава. Праціўнік абараняўся ўпарта. Баі ішлі за кожны дом, за кожную вуліцу. Байцы праяўлялі мужнасць і адвагу, а камандзіры — уменне манеўраваць і дакладна ўзаемадзейнічаць у складанай абстаноўцы.

Камандзір аддзялення сапёрнага батальёна малодшы сяржант Іван Яфімавіч Андрэеў першым пераплыў Дняпро і даставіў з правага берага дзве лодкі, на якіх пераправіў штурмавую групу і забяспечыў захоп плацдарма. Камандзір кулямётнага разліку сібірак Іван Сямёнавіч Панамарэнка зрабіў невялікі плыт і са сваім аддзяленнем фарсіраваў Дняпро, паказваючы прыклад для ўсіх воінаў корпуса.

Камандзір коннай разведкі 830-га палка старшы лейтэнант М.І.Яшын, які фарсіраваў Дняпро, акапаўся са сваімі разведчыкамі і агнём забяспечыў пераправу палка. У жорсткай схватцы з ворагам храбры воін загінуў.

Пры фарсіраванні Дняпра і ў вулічных баях за Магілёў вызначыліся байцы батальёна пад камандаваннем капітана Валянціна Васілевіча Фаціна. Яго батальён адным з першых пераправіўся цераз Дняпро, акружыў у горадзе групоўку праціўніка і прымусіў яе здацца.

Кожная гадзіна баёў называла новых геро-



В.В.Тамілоўскіх.



В.В.Фацін.

яў. Цэлыя падраздзяленні прымножылі баявую славу нашага корпуса.

На досвітку 28.6.1944 г. камандзіры дывізій, генералы Краснаштанаў, Кірылаў і Гусеў паведамілі, што горад поўнасцю ачышчаны ад ворага, у палон узята больш за 3 тыс. салдат і афіцэраў, захоплены штаб 12-й нямецкай пяхотнай дывізіі на чале з генерал-лейтэнантам Бамлерам і камендантам Магілёўскага ўмацаванага раёна генералам фон Эрмансдорфам. Для мяне, як для камандзіра, а таксама для ўсіх войск, якія ўваходзілі ў склад 121-га корпуса, гэта была першая вялікая перамога.

ТАМІЛОЎСКІХ Віталь Васілевіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 10.3.1911 г. ў г.п. Навауткінск Першаўральскага раёна Свярдлоўскай вобласці. Да вайны працаваў аб'ездчыкам у лясгасе. На фронце з 1941 г. Камандзір стралковага аддзялення сяржант В.В.Тамілоўскіх вызначыўся ў баях за вызваленне Магілёўскай вобласці. 23.6.1944 г. з групай байцоў фарсіраваў р. Проня, на захопленым плацдарме ўдзельнічаў у адбіцці контратак праціўніка, чым садзейнічаў паспяховай пераправе часцей дывізіі. У баі за Магілёў падбіў варожую самаходную гармату. Пасля вайны жыў на радзіме. Памёр 12.4.1986 г.

З успамінаў В.В.Тамілоўскіх

Да Дняпра мы выйшлі ў канцы дня. Сонца ўжо садзілася недзе за Магілёвам. Горад змрочны, насцярожаны. Што нас там чакае?

Разбіраем баню і збіваем плыт. Чакаем, калі зусім схаваецца сонца.

Размясціліся на плыце і адштурхнуліся ад берага. Здавалася, што Дняпро ў гэтым месцы вузкі і смірны, але моцнае цячэнне нас зносіць уніз, да горада. З таварышамі, якія засталіся на левым беразе, нас звязвае тэлефонны провад. На плыце палявы тэлефонны апарат. Нарэшце насунуліся на пясчаную водмель. Вораг адкрыў хаатычны агонь. Загадваю пакуль не страляць, каб не выдаць сябе. Калі заляглі і акапаліся (на зямлі заўсёды адчуваеш сябе больш упэўнена), адказалі доўгімі аўтаматнымі чэргамі.

Па тэлефоне дакладваю, што пераправіліся паспяхова, вядзём перастрэлку.

За намі сталі перапраўляцца другія падраздзяленні палка. Наш плыт ходзіць ад берага да берага па Дняпры. Адчуваючы за спіной падтрымку аднапалчан, з боем прасоўваемся наперад.

На досвітку мы ўжо прабраліся на ўскраіну горада, вораг люта контратакуе. На наша аддзяленне паўзе самаходная гармата «фердынанд». Адступаць нельга і няма куды. Кідаю звязку гранат. Нахіліўшыся, «фердынанд» застыў. Члены экіпажа выскокваюць адзін за адным, як мышы з карабля, які тоне. Кулі байцоў даганяюць іх.

Сонца асвяціла горад. Незнаёмы, але свой, блізкі і родны. Не толькі наш полк, а ўжо ўся дывізія, якая пераправілася цераз Дняпро, рухаюцца наперад, адбіваючы ў ворага дом за домам, вуліцу за вуліцай. Маё падраздзяленне па-ранейшаму ў першых радах атакуючых... Каля мяне разрываецца снарад. Воблака пылу, дыму. Аддзяленне ў небяспецы, хачу падаць каманду, каб укрыліся ў дварах, але не чую свайго голасу. Агнём прыкрываю іх і... трачу прытомнасць.

Прыйшоў у сябе, калі Магілёў ужо быў вызвалены ад ворага.

ФАЦІН Валянцін Васілевіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 9.4.1921 г. ў Маскве. У Чырвонай Арміі з 1939 г. На фронце з 1941 г. Камандзір стралковага батальёна гвардыі капітан В.В.Фацін вызначыўся пры вызваленні Магілёўскай вобласці і Магілёва. 25.6.1944 г. батальён пад яго камандаваннем фарсіраваў р. Рэста, выбіў праціўніка з умацаванага пункта; 28.6.1944 г. пераправіўся цераз Дняпро, уварваўся ў Магілёў, у горадзе, адбіваючы контратакі праціўніка, вёў рукапашныя баі, захапіў 16 гармат, 2 самаходныя артылерыйскія ўстаноўкі «фердынанд», 200 аўтамашын, 8 складоў, узяў у палон штаб дывізіі, 2 генералаў, 35 афіцэраў, больш за 500 салдат.



А.Я.Шамшурын.



Г.І.Шаўкуноў.



П.Д.Юрчанка.



А.М.Ягораў.

В.В.Фацін загінуў у баі 17.7.1944 г. Пахаваны ў г. Скідзель Гродзенскай вобласці.

ШАМШУРЫН Аляксандр Якаўлевіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 25.11.1923 г. ў г. Іжэўск. На фронце з 1943 г. Камандзір аддзялення стралковага палка сяржант А.Я.Шамшурын удзельнічаў у баях на тэрыторыі Магілёўскай вобласці пры прарыве варожай абароны на рэках Проня і Бася. 26.6.1944 г. на чале аддзялення першым пераправіўся цераз Дняпро на поўнач ад Магілёва, на правым беразе ракі ўдзельнічаў у адбіцці 2 контратак праціўніка, з байцамі закідаў варожую пяхоту гранатамі, знішчыў 55 гітлераўцаў. Пасля вайны з 1947 г. працаваў на Іжэўскім механічным заводзе. З 1955 г. працаваў у г. Глазаў ва Удмурціі. Памёр 15.1.1988 г.

ШАЎКУНОЎ Георгій Іванавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 9.8.1913 г. ў г. Шадрынск Курганскай вобласці. Працаваў будаўніком, шахцёрам. У Чырвонай Арміі з 1941 г. З лютага 1943 г. на Заходнім і 2-м Беларускім франтах. Сапёр асобнага сапёрнага батальёна стралковай дывізіі Г.І.Шаўкуноў вызначыўся ў час Магілёўскай аперацыі. 27.6.1944 г. пад моцным артылерыйскім і кулямётным агнём праціўніка ў кароткі тэрмін з групай сапёраў пабудаваў мост цераз Дняпро, што садзейнічала паспяховаму правядзенню аперацыі. Загінуў 22.8.1944 г. пры вызваленні Польшчы. Пахаваны ў Беластоцкім ваяводстве. Імем героя названа вуліца ў Якуцку.

ЮРЧАНКА Панцялей Данілавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 31.7.1911 г. ў с. Пятроўка Кыштаўскага раёна Новасібірскай вобласці. У Чырвонай Арміі ў 1933—35 гг. і з 1939 г. На фронце з 1943 г. Памочнік камандзіра стралковага ўзвода сяржант П.Д.Юрчанка вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра каля Магілёва. 27.6.1944 г. пад агнём праціўніка пераплыў раку, знайшоў 4 лодкі, паранены, даставіў іх на левы бераг і ўдзельнічаў у пераправе перадавых падраздзяленняў палка. Пасля вайны жыў у пасёлку Возера-Карачы Чанаўскага раёна Новасібірскай вобласці. Памёр 3.9.1975 г.

ЯГОРАЎ Аляксей Міхайлавіч. Герой Савецкага Саюза (10.4.1945). Нарадзіўся 3.3.1912 г. ў г. Іванава (Расія). Скончыў Ленінградскае ваенна-інжынернае вучылішча (1936), паскораны курс Ваенна-інжынернай акадэміі (1958). У Чырвонай Арміі з 1933 г. З чэрвеня 1941 г. на Заходнім, Калінінскім і 2-м Беларускім франтах. Дывізійны інжынер падпалкоўнік А.М.Ягораў вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра ў раёне Магілёва. 27.6.1944 г. пад агнём праціўніка правёў інжынерную разведку берага ракі і выбраў зручнае месца для пераправы. Пад яго кіраўніцтвам на працягу сутак былі збудаваны штурмавы мост для пяхоты і мост для тэхнікі, што садзейнічала паспяховаму наступленню дывізіі. Пасля вайны да 1960 г. А.М.Ягораў служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. Жыве ў Калінінградзе.

ЯШЫН Мікалай Іванавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 23.2.1923



М.І.Яшын.

г. ў в. Ніжняя Гнілуша Малаархангельскага раёна Арлоўскай вобласці. Скончыў Тамбоўскае кавалерыйскае вучылішча (1942). На фронце з 1942 г. Камандзір узвода коннай разведкі старшы лейтэнант М.І.Яшын вызначыўся ў баях за вызваленне Магілёва. 27.6.1944 г. з узводам у ліку першых фарсіраваў Дняпро каля горада, разведаў распалажэнне праціўніка і яго агнявых кропак, уступіў з гітлераўцамі ў бой і выбіў іх з умацаванняў, чым садзейнічаў поспеху наступлення роты. Загінуў у баі 28.6.1944 г. Пахаваны ў в. Мікалаеўка Магілёўскага раёна.

Пасля вызвалення

З успамінаў Г. Аргірапула, былога акцёра Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра Беларусі імя М.Горкага.

У Магілёве я жыў менш года, але гэта была яркая, цікавая і ў той жа час цяжкая паласа ў маім жыцці.

У 1944 г. савецкія войскі ачышчалі ад фашысцкай нечысці горад за горадам. Як толькі быў вызвалены Мінск, па рашэнні ўрада пачаў сваю работу Рускі драматычны тэатр. Рэпетыцыі спектакляў мы пачыналі ў Маскве, а працягвалі ў Магілёве.

Калі мы прыехалі, горад ашаламіў мяне.

На разбураных дамах яшчэ былі надпісы: «Не входить!», «Дом не разминирован!» Парушэнне гэтага загаду вяло да гібелі людзей, якія спрабавалі трапіць у глыб руін, каб узяць там якую-небудзь дошку ці бервяно для ацяплення жылля. Памятаю, неяк цёмным вечарам я нечакана сустрэў хлопчыка гадоў 12—14, які асцярожна выходзіў з руін дома, хаваючы за спіной невялікую дошку. Хлапец, відаць, прыняў мяне за нейкую афіцыйную асобу і спалохана прагаварыў: «Вось... спёр... яна абгарэлая...»

Я падумаў: як жа неабходна было яму цяпло ў доме, дзе, магчыма, ляжыць хворая маці, якая, рызыкуючы жыццём сына, паслала яго прынесці хоць бы крышку паліва.

Як часта даводзілася бачыць сведчанні жахаў нядаўняй акупацыі горада!

І сёння не магу забыць убачанае ў спартыўнай зале разбуранай школы. Сцены там былі спісаны дзецьмі, якіх гітлераўцы лавілі на вуліцах для адпраўкі ў Германію. Сэнс гэтых надпісаў памятаю і сёння — гэта развітанне з Радзімай, з блізкімі і роднымі людзьмі.

Адзін з надпісаў правяду амаль даслоўна, бо ён назаўжды ўрэзаўся ў памяць: «Дорогие друзья! Меня схватили на рынке — хотел поменять мамину фуфайку на продукты. Мама лежит больная и не знает, что случилось со мной. Сходите к ней и расскажите, что со мной случилось».

Падобных надпісаў было многа. Адна дзяўчына развітвалася з сяброўкамі, другая з каханым. Ды што там Шэкспір! Прайшло столькі гадоў, а ўспамінаць гэта без слёз немагчыма...

Тэатр прыступіў да работы. Падрыхтаваныя ў Маскве спектаклі хутка былі вынесены на суд гледачоў, большасць з якіх былі ваенныя, шмат было лётчыкаў. Часам, калі ўжо ішоў спектакль, у зале раздаваўся гучны голас: «Капітана такога-та, лейтэнанта такога-та... на выхад!» Капітаны, маёры, лейтэнанты, так і не дагледзеўшы спектакль, ляцелі на заданні.

На той час, як маглі, нам ствараліўмовы для работы і быту. Дом для супрацоўнікаў тэатра быў размешчаны непадалёку ад тэатра. Праўда, многія вокны тут былі «зашклёны» ржавымі жалезнымі лістамі. У пакоі, дзе я жыў з сябрамі, была зашклёна толькі адна фортка, прычым трыма кавалкамі шкла.

Ацяпленне — «буржуйка», цяпла яна не давала, таму што нормы дроў хапала толькі на тое, каб сагрэць чайнік.

За вадой хадзілі на Дняпро. Вячэрняе асвятленне — газоўка са снараднай гільзы. Так жылі не толькі мы, а і ўсё насельніцтва Магілёва.

Ужо адчувалася дыханне хуткай Перамогі. У горадзе прыкметна стала абуджацца жыццё. Усё часцей чуліся галасы людзей на руінах дамоў і прамысловых аб'ектаў — насельніцтва горада працавала на будоўлях. Гукі малаткоў і піл былі даражэй за любую музыку. Пачала выходзіць абласная газета «За Радзіму», стаў працаваць дзіцячы сад, адчыніла дзверы першая бібліятэка. Як усё гэта радавала людзей!

Героі Савецкага Саюза — ураджэнцы Магілёва, якія вызначыліся ў баях за Радзіму

За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны, тысячы магіляўчан былі ўзнагароджаны многімі ордэнамі і медалямі, траім з іх прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, адзін стаў кавалерам трох ордэнаў Славы.

ЯФІМ ІЗРАЙЛЕВІЧ ЗЛАЦІН

Нарадзіўся 20.8.1913 г. ў Магілёве ў рабочай сям'і. Скончыў рабфак у Днепрапятроўску, у 1944 г. — Ленінградскае ваенна-палітычнае вучылішча імя Энгельса. У Чырвонай Арміі з 1935 г. У 1937—41 гг. працаваў у Магілёве. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 г. на Варонежскім, Сцяпным, 1-м і 2-м Украінскіх франтах. Камандзір мінамётнага ўзвода сяржант Я.І.Злацін вызначыўся 24—25.9.1943 г. пры фарсіраванні Дняпра на тэрыторыі Украіны. Узвод пад яго камандаваннем фарсіраваў раку на поўдзень ад Краменчуга, адбіў некалькі контратак ворага, знішчыў 9 кулямётных і 3 мінамётныя кропкі і каля роты гітлераўцаў. Цяжка паранены, Я.І.Злацін не пакінуў поля бою. Званне Героя Савецкага Саюза Я.І.Злаціну прысвоена 26.10.1943 г. Да 1964 г. на гаспадарчай рабоце ў Маскве. Памёр 23.8.1965 г.

У хадайніцтве камандавання 78-й гвардзейскай стралковай дывізіі перад штабамі 7-й арміі і Сцяпнога фронту на ўзнагароджанне І.Я.Злаціна апісаны яго подзвіг і аднапалчан.

У верасні 1943 г. падраздзяленні 225-га гвардзейскага стралковага палка ў раёне пасёлка Верхнедняпроўск, што ў Днепрапятроўскай вобласці, выйшлі да Дняпра. Узвод мінамётчыка Злаціна, які заняў пазіцыю на востраве Глінск-Барадаеўскі, актыўна падтрымліваў агнём пехацінцаў, што высаджваліся на крутым процілеглым беразе.

Поспех захопу плацдарма на правым беразе ракі ў немалой ступені быў забяспечаны мінамётчыкамі сяржанта Злаціна. У час бою імі было знішчана 9 кулямётных кропак, 3 мінамётныя батарэі і каля роты салдат і афіцэраў праціўніка.

Пачаўся жортскі бой за ўтрыманне плацдарма. Дзякуючы трапнаму агню «самапалаў», як любоўна называлі воіны мінамёты, было адбіта 7 контратак гітлераўцаў.

Камандзір батальёна капітан Касаткін папластунску дабраўся да агнявой пазіцыі мінамётчыкаў, даведаўся, што яшчэ ў пачатку бою за ўтрыманне плацдарма Яфім Ізрайлевіч быў цяжка паранены, а ў час артпадрыхтоўкі праціўніка да трэцяй контратакі — кантужаны.

На ўсё жыццё Яфім Ізрайлевіч запомніў той момант, калі сам І.С.Конеў, тады яшчэ генерал, прыехаў у франтавы шпіталь, каб уручыць высокія ўзнагароды Радзімы воінам, што вызначыліся пры фарсіраванні Дняпра. Пасля камандаванне фронтам рэкамендавала яго на вучобу ў Ленінград. Не раз быў у Магілёве, радаваўся, што горад яго дзяцінства і юнацтва з кожным годам квітнеў. *Б.Гардзееў.*



Я.І.Злацін.



Л.Дз.Лорчанка.

ЛЕАНІД ДЗМІТРЫЕВІЧ ЛОРЧАНКА

Нарадзіўся 24.7.1923 г. ў Магілёве. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны быў байцом гарадскога народнага апалчэння, потым членам падпольнай групы ў Магілёве. Пісаў і распаўсюджваў лістоўкі, удзельнічаў у дыверсіях, збіраў і перапраўляў партызанам зброю. З красавіка 1943 г. ў 600-м партызанскім атрадзе, які дзейнічаў на тэрыторыі Бялыніцкага, Бярэзінскага, Шклоўскага і Магілёўскага раёнаў. 18.7.1943 г. каля в. Антонава Буда Бялыніцкага раёна на групу партызанскага дазору, у якой быў Лорчанка, напалі карнікі. У няроўным баі ён апошняй гранатай падарваў сябе і гітлераўцаў, якія яго акружылі. Пахаваны каля в. Антонава Буда, на магіле пастаўлены абеліск. Званне Героя Савецкага Саюза Л.Дз.Лорчанка прысвоена 8.5.1965 г. Імем героя названы вуліцы ў Магілёве і г.п. Бялынічы, дзе на алеі Герояў пастаўлены бюст. Штогод у Бабруйску і Магілёве праводзяцца спартыўныя спаборніцтвы на прыз яго імя.

Бясконца доўгімі здаваліся трывожныя летнія дні 1941 г. Лёня праводзіў іх на сваім пасту ў атрадзе проціпаветранай абароны. Яго не пакідала думка, што ён знаходзіцца ў тыле, у той час як ідуць баі. Нарэшце настаў яго час. Калона добраахвотнікаў, сярод якіх быў і Лёня, з вінтоўкамі ўзору 1891 г. накіравалася на захад. Каля в. Чачэвічы сустрэлі калону фашыстаў. Яны запрудзілі ўсе дарогі танкамі і машынамі, ішлі па жытнёвых палях.

Трапіўшы ў акружэнне, Лёня начамі блукаў па лясах. Бачыў, як самалёт са свастыкай на брыючым палёце расстрэльваў бежанцаў, як гарэлі вёскі, бачыў забітых старых, жанчын, дзяцей. За гэтыя некалькі дзён у яго сэрцы накапілася столькі гневу, што ён вырашыў дзейнічаць.

Раніцай, схаваўшы сваю вінтоўку на могілках, ён пастукаў у дзверы сваёй кватэры. Адчыніла маці:

— Лёня! Жывы!

Яна расказала сыну, як мужна змагаліся салдаты і жыхары, якія больш як тры тыдні трымалі абарону.

— Я бачыла, як наш салдат з ратушы расстрэльваў гэтых гадаў. Усю плошчу заслаў імі. Можа, даведаўся б, хто ён такі? Адзін жа заставаўся, не адступіў...

Калі сцямнела, Лёня па задворках прабраўся да старажытнай ратушы. Стараючыся не выдаць сябе неасцярожным рухам, пачаў



Т.Р.Карпінская.



В.М.Карпінская.

падымацца па крутых ступеньках на вежу. І тут ён убачыў... кулямёт. Так, кулямёт! Радасна і гулка забілася сэрца. Якая патрэбная знаходка! Лёня пачаў асцярожна спускацца ўніз. Дамоў вярнуўся толькі пад раніцу.

З гэтага дня ён часта знікаў па начах. Ды і ўдзень дома не сядзеў — хадзіў па горадзе, прыглядаўся.

Хутка на кватэру да Лорчанкі прыйшоў госць — Цімафей Іванавіч Крываносаў. Ён расказваў навіны. Ды яшчэ якія! Фашысцкай арміі нанесены ўдар пад Ельняй. У беларускіх лясах пачалі дзейнічаць партызанскія атрады.

— А адкуль вы ўсё гэта ведаеце? — спытаўся Лёня.

— Маскву слухаем, — шчыра прызнаўся Цімафей Іванавіч. — І хочам, каб больш людзей праўду ведалі.

— Дык трэба расказваць! — гарачыўся юнак.

— Палітінфармацыі зараз праводзіць забаронена — за гэта расстрэл. А вось лістоўкі ў нас ёсць. Дапаможаш?

— З вялікім задавальненнем!

З гэтага часу ў Леаніда Лорчанкі наладзілася сувязь з адной з падпольных груп. Яе стваральнікамі былі рабочыя аўтарамонтнага завода Васіль Батура і Мікалай Харкевіч.

Падпольшчыкі ўручалі Леаніду вялікую кіпу лістовак. Ноччу ён асцярожна прабіраўся па задворках і пакідаў на парканах, на сценах дамоў і ў пад'ездах аркушы паперы са словамі, якія клікалі да барацьбы, расказвалі людзям праўду аб падзеях на фронце. У адной з лістовак Леанід Лорчанка пісаў: «Таварышы! Гітлер хваліцца сваімі перамогамі. Не верце яму. Чырвоная Армія пераходзіць у наступленне. Партызаны ўсё больш разгор-

тваюць барацьбу ў тыле ворага. Фашысты будуць разбіты! Савецкія патрыёты! Што вы зрабілі для вызвалення роднага Магілёва?»

Дні яго жыцця не былі падобныя адзін на адзін. Ён ведаў кожны куток свайго горада і з'яўляўся ў самых нечаканых месцах. Забяспечваў лістоўкамі падпольшчыкаў Любужскага млына, а вяртаючыся адтуль, пакідаў на дарозе калючкі са стальнога дроту. І нярэдка машыны, набітыя гітлераўцамі, спынялі свой бег, аглушальна лопаліся шыны, гучалі праклянцці, лаянка. Леанід запамінаў, колькі машын прайшло па шашы, які груз і ў якім напрамку яны везлі. Ведаў размяшчэнне варожых часцей у горадзе, стараўся даведацца, што збіраюцца рабіць фашысты ў бліжэйшыя дні. І ўсе гэтыя даныя перадаваў кіраўнікам падпольнай групы...

Студзеньскай ноччу 1943 г. Леанід Лорчанка развітаўся з родным горадам і таварышамі па падполлі: нарэшце споўнілася яго жаданне — ён ішоў у партызанскі атрад.

Хутка ў атрад прыбылі яго маці і сястра. Яны расказалі пра гібель падпольнай групы «Патрыёт» Васіля Батуры і Мікалая Харкевіча, пра зверскую расправу гітлераўцаў над падпольшчыкам другой групы — Вольгай Мікалаеўнай Карпінскай і яе дачкой Таняй...

У чэрвені 1943 г. партызаны зрабілі налёт на Бялыніцкі фашысцкі гарнізон. Усю ноч яны вялі вулічныя баі ў гарадскім пасёлку. Гітлераўцы і іх прыслужнікі неслі вялікія страты. Адстрэльвалася толькі група гітлераўцаў, якія схаваліся за метровымі сценамі манастыра. Там жа схавалася і ўправа.

Пасля гэтай бурнай ночы народныя мсціўцы адышлі ў сваю зону — вёскі Рудня, Буда, Межанец і Лебядзянка. Тут яны вырашылі адпачыць, паставіўшы групы аховы. У адной з іх быў прызначаны і Лорчанка.

Іх было чацвёра. Усе яны былі маладыя. Усе страшэнна стаміліся пасля цяжкага начнога бою.

Заняўшы са сваёй групай пост аховы, Лёня пачуў гул матораў. Хутка паказалася калона машын. Яна звярнула на прасёлачную дарогу і спынілася. З машыны пачалі выскокваць узброеныя фашысты. Адступаць было позна — гітлераўцы паспелі акружыць чацвёрку храбрацоў. Яны адстрэльваліся да апошняга патрона. А калі патроны скончыліся — пусцілі ў ход гранаты. Хутка Лёня застаўся адзін. З апошняй гранатай у руках ён падняўся і крочыў насустрач ворагам...

У.Чэпікаў.

МІХАІЛ ВАСІЛЕВІЧ ЛУСТО

Нарадзіўся 21.9.1921 г. ў Магілёве. Вучыўся ў школе, адначасова займаўся ў аэраклубе. У 1940 г. ў Чырвонай Арміі, быў накіраваны ў Армавірскую ваенную авіяцыйную школу пілотаў, якую паспяхова скончыў у 1942 г. З сакавіка 1943 г. на Сцяпным, Варонежскім, 2-м і 1-м Украінскіх франтах. Удзельнік Курскай бітвы, баёў на Украіне, у Малдавіі, Румыніі, Польшчы, Германіі. Лётчык, камандзір звяна, эскадрыллі знішчальнага авіяпалка старшы лейтэнант Лусто зрабіў 251 баявы вылет, правёў 49 паветраных баёў, збіў 19 самалётаў і 1 у групавым баі. Эскадрылля Лусто са студзеня да красавіка 1945 г. збіла 48 самалётаў праціўніка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 27.6.1945 г. Пасля вайны М.В.Лусто скончыў Ваенна-паветраную акадэмію (1954) і акадэмію Генштаба (1961). Да 1974 г. ў Савецкай Арміі, палкоўнік. Жыў у Маскве. Памёр 16.3.1979 г.

Калі ён упершыню сур'ёзна задумаўся аб жыцці? Напэўна, гадоў у семнаццаць. Яны ішлі гуртом па цяністай дарозе з Магілёўскага аэраклуба. Да горада тады было добрых кіламетраў пяць. Гэта цяпер у 1938 г. Магілёў раздаўся ўшырыню, увабраў у сябе аэраклуб. Ішлі і марылі, як стануць лётчыкамі. Ніхто з іх, пацаноў, не сумняваўся, што вайна не за гарамі. Аднаго баяліся, што пакуль перасядуць за штурвалы баявых самалётаў, вораг усюды будзе пераможаны...

Не, Міхаіл Лусто ўправе лічыць сябе шчасліўчыкам. Вайну ён сустрэў ужо сталым, падрыхтаваным пілотам, за плячыма была Армавірская ваенная авіяшкола пілотаў.

І хоць хваляваўся ў першы свой баявы вылет у сакавіку 1943 г., была і ўпэўненасць у майстэрстве. Ён шчасліва мінаваў ракавыя лічбы 10 і 3 (колькасць вылетаў і баёў).

— А ўсё ж вайна ёсць вайна, — успамінаў М.Лусто. — Кожны з 251 баявога вылету мог аказацца і апошнім. Цікава, які разумнік з такой «дакладнасцю» прыдумаў лічыць год вайны за два звычайныя. Не за тры, чатыры, дзесяць, а менавіта за два. Бывала, чалавек за адзін бой старыўся на дваццаць-трыццаць гадоў. Сорак дзевяць паветраных баёў. Кожны непадобны адзін на адзін. На яго рахунку дваццаць збітых самалётаў праціўніка. Усё ж ён нядрэнна ваяваў.

У 24 гады ён стаў Героем Савецкага Саюза. Да канца вайны старшы лейтэнант Міхаіл



М.В.Лусто.



Я.Л.Мінкін.

Лусто ўжо быў камандзірам эскадрыллі авіязнішчальнага палка.

Змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, запішуць у яго лётнай кніжцы, у саставе знішчальных часцей Сцяпнога, Варонежскага, 2-га і 1-га Украінскіх франтоў. Прайшоў праз пекла баёў на Курскай дузе, удзельнічаў у баях за вызваленне Украіны, Польшчы, Румыніі. І вось яно — неба гітлераўскай Германіі...

Пасля вайны М.В.Лусто не вагаўся, як жыць далей. Авіяцыя. Вырашыў цвёрда і назаўсёды. Без неба ён сябе не ўяўляў. Скончыў Ваенна-паветраную акадэмію, потым Ваенную акадэмію Генштаба.

Кароткай была жыццёвая сцежка хлопца з Магілёўскага аэраклуба Міхаіла Лусто. На пяцьдзесят восьмым годзе яго не стала...

В.Казлоўскі.

ЯФІМ ЛЬВОВІЧ МІНКІН

Нарадзіўся 22.1.1922 г. ў Магілёве. Поўны кавалер ордэна Славы. З лістапада 1942 г. на Сталінградскім, Заходнім, 1-м, 2-м Украінскіх франтах. Разведчык яфрэйтар Я.Л.Мінкін вызначыўся ў баях на тэрыторыі Румыніі, Венгрыі і Аўстрыі. 12.9.1944 г. ў Трансільваніі ў час разведкі захапіў палоннага, які паведаміў каштоўныя звесткі. 17.12.1944 г. ў Венгрыі з групай разведчыкаў з боем прайшоў абарону праціўніка, у варожым тыле злучыўся з партызанскім атрадам французаў, якія ўцяклі з палону, і вывеў яго да савецкіх войск. 3.4.1945 г. каля г. Бадэн (Аўстрыя) у варожым тыле ўступіў у бой з разлікам батарэі з 4 шасціствольных мінамётаў і знішчыў іх. Пасля вайны працаваў на будаўніцтве Валгаградскай і Куйбышаўскай ГЭС, Волга-Данскога і Галоўнага Туркменскага каналаў. Скончыў Маскоўскі геолага-разведачны інстытут (1950). У 1968 г. абараніў дысертацыю і стаў доктарам геолага-мінералагічных навук. Працаваў у Маскве ў Інстытуце водных праблем АН СССР.

Магіляўчане на франтах Вялікай Айчыннай

Рана ці позна ў памяці згладжваюцца падзеі далёкіх гадоў. Але ёсць і такія, якія застаюцца ў народнай памяці на доўгія часы. Мінулая вайна адносіцца да іх. Вельмі дорага каштавала яна нашаму народу. І таму памяць аб ёй не могуць прыглушыць гады. Яна жыве ў сэрцах жывых удзельнікаў тых падзей, іх нашчадкаў, у бронзе, камені, бетоне манументаў і абеліскаў, у кнігах, газетных публікацыях, кінафільмах і інш. Гартаючы падшыўкі «Магілёўскай праўды» за пасляваенныя гады, можна сустрэць шмат прозвішчаў воінаў-магіляўчан, іх успаміны аб нялёгкіх днях вайны, яе крутых дарогах, што вялі да доўгачаканай перамогі. У нас былі свае генералы, палкоўнікі, капітаны, лейтэнанты і, зразумела, дзесяткі тысяч салдат.

АНАТОЛЬ МІКАЛАЕВІЧ ГАРАНІН

Нарадзіўся 20.11.1898 г. ў Магілёве. З рабочых. Удзельнік грамадзянскай вайны. Скончыў артылерыйскую школу (1923). Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У Айчынную вайну начальнік управлення ППА, намеснік камандуючага артылерыяй па ППА Карэльскага і Паўднёва-Заходняга франтоў. Удзельнік абароны Савецкага Запаляр'я. Са снежня 1943 г. намеснік начальніка Цэнтральнага штаба войск ППА Савецкай Арміі. У 1944 генерал-лейтэнант артылерыі. З верасня 1946 г. ў запасе. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 7 іншымі ордэнамі, медалямі. Памёр 16.9.1970 г.

МІКАЛАЙ СІЛЬВЕСТРАВІЧ ЛАБЕЗНІКАЎ

Нарадзіўся 22.7.1914 г. ў Магілёве. Прайшоў шлях ад радавога чырвонаармейца да генерал-лейтэнанта. У Айчынную вайну на Карэльскім, Волхаўскім, Цэнтральным і 1-м Беларускім франтах, камандаваў ротай, батальёнам, быў начальнікам штаба, камандзірам палка. Удзельнік абароны Савецкага Запаляр'я, вызвалення Гомельскай вобласці, Польшчы, штурму Берліна. Пасля вайны скончыў Акадэмію імя Фрунзе (1948), Ваенную акадэмію Генштаба (1956). З 1964 начальнік штаба і намеснік камандуючага войскамі акругі. У 1969—74 гг. генерал-лейтэнант М.С.Лабезнікаў на камандных пасадах у Савецкай Арміі.

ВАЛЯНЦІН АНТОНАВІЧ ПЯНЬКОЎСКІ

Нарадзіўся 14.4.1904 г. ў Магілёве. У Чырвонай Арміі з 1920 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. У Айчынную вайну на Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, Данскім, Варонежскім, Ленінградскім, 1-м і 2-м Прыбалтыйскіх, 1-м Далёкаўсходнім франтах: начальнік штаба ўпраўлення ППА фронту, начальнік ППА арміі, камандзір дывізіі, начальнік штаба арміі. Удзельнік Сталінградскай і Курскай бітваў, вызвалення Украіны, Беларусі (Віцебск, Полацк), разгрому японскіх агрэсараў. Пасля вайны начальнік штаба ваенных акруг. З 1961 г. камандуючы войскамі БВА, генерал арміі. З 1964 г. намеснік міністра абароны СССР, з 1968 г. ў складзе групы генеральных інспектараў Міністэрства абароны СССР. Кандыдат у члены ЦК КПСС з 1961 г. Член ЦК КПБ у 1961—66 гг., кандыдат у члены Прэзідыума ЦК КПБ у 1962—64. Дэпутат ВС СССР з 1958 г., ВС БССР у 1963—67 гг. Ганаровы грамадзянін г. Полацка. Памёр 26.4.1969 г.

ВАСІЛЬ МІХАЙЛАВІЧ ФРАЛОЎ

Нарадзіўся 24.8.1904 г. ў Магілёве. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобласці. У 1931 г. скончыў Камуністычны універсітэт Беларусі. З 1932 г. на партыйнай і адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце, з 1940 г. 1-ы сакратар Сіроцінскага РК КП(б)Б. У жніўні 1941 г. накіраваны ЦК КП(б)Б у тыл ворага: з кастрычніка 1941 г. камандзір групы, у чэрвені 1942 г. камісар атрада, у чэрвені 1942 — сакавіку 1943 гг. — партызанскай брыгады імя С.М.Кароткіна, адначасова ў кастрычніку 1941 — сакавіку 1943 гг. сакратар Сіроцінскага падпольнага РК КП(б)Б, сакратар Магілёўскага абкома, Шклоўскага РК КП(б)Б. У 1952—60 гг. на партыйнай і савецкай рабоце.

МІКАЛАЙ ІВАНАВІЧ ЦВЯТКОЎ

Нарадзіўся 16.12.1904 г. ў Магілёве. З 1922 г. ў ВМФ. У 1929 г. скончыў ваенна-марское інжынернае вучылішча. З 1930 г. камандзір эсмінца, лінкора, флагманскі сувязіст ваеннай флатыліі і флоту. З 1940 г. начальнік аддзела ўпраўлення сувязі ВМФ, у сакавіку—маі 1945 г. ў Балтыйскім флоце, начальнік сувязі флоту. З 1947 г. начальнік сувязі ВМФ. У 1951 г. Мікалаю Іванавічу прысвоена званне інжынер-віцэ-адмірал. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 2 іншымі ордэнамі, медалямі. Памёр 21.1.1955 г.

ПЁТР МІКАЛАЕВІЧ ЧАРНЫШОЎ

Нарадзіўся 8.12.1901 г. ў Магілёве. У Чырвонай Арміі з 1918 г. на Заходнім фронце, палітрук роты. Скончыў курсы «Выстрал» (1929), Вышэйшыя курсы пры Ваеннай акадэміі Генштаба (1950). У Айчынную вайну з 1941 г. на Заходнім, Волхаўскім, 3-м Беларускім франтах. Камандаваў 152-й стралковай дывізіяй, якая ўваходзіла ў 16-ю армію генерала М.Ф.Лукіна і насмерць змагалася на подступах да Смаленска. У тых баях Пётр Мікалаевіч быў цяжка паранены. У 1942 г. яму прысвоена званне генерал-маёр. Свой баявы шлях П.М.Чарнышоў скончыў пад Кёнігсбергам у 1945 г. З 1956 г. ў адстаўцы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 4 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Ганаровы грамадзянін Смаленска.

МАКСІМ ВАСІЛЕВІЧ ШПАК

Нарадзіўся ў 1903 г. ў Магілёве. З 1916 г. чыгуначны рабочы ў Магілёве. З 1920 г. ў Чырвонай Арміі, на Балтыйскім флоце. У 1928—34 гг. сакратар Лупалаўскага райкома КП(б)Б, парторг ЦК ВКП(б) на Днепра-Дзвінскім рачным параходстве. У 1929 г. скончыў Ленінградскі камуністычны універсітэт. З 1934 г. ў сістэме Наркамлесу БССР — начальнік сплаўкантор у Бабруйску, Рагачове, Гомелі, кіраўнік Беластоцкага лесанарыхтоўчага трэста. У Айчынную вайну партызан, член «Камітэта садзеяння Чырвонай Арміі ў Магілёве», з красавіка 1943 г. ўпаўнаважаны Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б у паўночна-ўсходніх раёнах вобласці, у краса-

віку—чэрвені 1944 г. сакратар Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б. З ліпеня 1944 г. намеснік міністра лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасці БССР, дырэктар леспрамгасаў. На XIV з'ездзе КП(б)Б выбраны кандыдатам у члены ЦК. Узнагароджаны 2 ордэнамі, медалямі.

У Сталінградскай бітве вызначыліся камандзір 822-га аўтабатальёна капітан Мікалай Аляксеевіч Лініч, камандзір узвода малодшы лейтэнант Леанід Міхайлавіч Лукін, падпалкоўнік Міхаіл Пракопавіч Маскалёў, капітан Аляксандр Цімафеевіч Пазнякоў, які камандаваў узводам, ротай, а потым батальёнам. Падпалкоўнік Георгій Сцяпанавіч Пілі пенка таксама ўдзельнік Сталінградскай бітвы, яго франтавы шлях ад камандзіра ўзвода да камандзіра палка, ад сцен Сталінграда да Варшавы і Берліна. Абарона Сталінграда і вызваленне Будапешта — найбольш запамінальныя старонкі франтавой біяграфіі камандзіра стралковага палка падпалкоўніка Ілы Рыгоравіча Ліпскага.

Маёр Аляксей Сямёнавіч Мацвееў і капітан Іван Мікітавіч Мікіцін вызначыліся пры абароне Масквы, потым баявы шлях першага прайшоў праз Курскую дугу ў Еўропу, дзе ён удзельнічаў у вызваленні Венгрыі і Чэхаславакіі. Мікіцін вызначыўся пры штурме Кёнігсберга. Там жа, пад Кёнігсбергам, а таксама ў баях за гарады Данцыг і Шчэцін вызначыўся камандзір батальёна капітан Уладзімір Васілевіч Малашкевіч.

Ад Крыма і Каўказа да Румыніі і Чэхаславакіі прайшоў з баямі падпалкоўнік Іосіф Ісакавіч Дулечын. У Румыніі, Венгрыі, Чэхаславакіі заканчваў ваяваць камбат маёр Іосіф Мікалаевіч Пукінскі.

За актыўныя дзеянні ў баях за вызваленне Польшчы былі адзначаны ўзнагародамі камандзір 25-й асобнай знішчальнай процітанкавай брыгады падпалкоўнік Георгій Нічыпаравіч Паддубскі (яго брыгада ўдзельнічала і ў штурме Берліна) і радавы 613-га асобнага батальёна сувязі Уладзімір Мацвеевіч Харкевіч, які забяспечваў бесперапынную сувязь пры фарсіраванні Віслы. Адным з першых выйшаў са сваім 693-м артпалком да Эльбы яго камандзір маёр Рыгор Іванавіч Лосеў.

Поспех многіх ваенных аперацый забяспечвалі разведчыкі старшы сяржант Канстанцін Мікалаевіч Гаравінаў, радавыя Уладзімір Іосіфавіч Грудзянкоў, Міхель Ісакавіч Леў, Мікалай Раманавіч Махоркін і Барыс Аляксандравіч Курнуковіч, які здабыў 10 «языкоў».

Магіляўчане змагаліся з ворагам у небе, як старшы сяржант 44-га знішчальнага авіяпалка Мікалай Фёдаравіч Блінні каў, паветраны стралок 955-га штурмавога авіяпалка Ціхан Фёдаравіч Бялоў, старшына 198-га бамбардзіровачнага авіяпалка Меер Лейбавіч Фейлін. На моры змагаліся з ворагам матарыст тарпеднага катэра Балтфлота старшына 1-й статці Анатоль Лявонцьевіч Цыркуноў. У артылерыі служылі лейтэнант Майсей Мордухавіч Мароз, старшыны Якаў Лейбавіч Мейлін і Васіль Трафімавіч Кузмянкоў, старшыя сяржанты Васіль Ільіч Гаўрыленка, Георгій Анісімавіч Лечкін, Мікалай Васілевіч Сідараў, Сяргей Васілевіч Фёдараў, сяржант Дзмітрый Рыгоравіч Гайс, малодшыя сяржанты Уладзімір Васілевіч Калістратаў, Рыгор Яфімавіч Любінін, радавыя Казімір Апанасавіч Далжэнка, Іван Васілевіч Елісееў, Васіль Паўлавіч Платонаў, Сямён Юр'евіч Шэндзераў. У танкавых часцях змагаліся з ворагам старшына Фёдар Васілевіч Крукоўскі, Ісак Рыгоравіч Нахбо і Васіль Спірыдонавіч Пятроўскі, старшы сяржант Мікалай Карнеевіч Цыплякоў, сяржант Мікалай Мікалаевіч Кастрыца. Але найбольш магіляўчан ваявала ў складзе пяхоты. Сярод іх былі радавыя аўтаматчыкі, кулямётчыкі Мікалай Кузьміч Бунько, Уладзімір Парфіравіч Канцэвіч, Майсей Цімафеевіч Макаранка, яфрэйтар Сяргей Аляксандравіч Сянькевіч, Аляксандр Аляксандравіч Дзем'янюк (вызначыўся пры прарыве ленінградскай блакады), сяржант Гаўрыла Панцялеевіч Пракапенка (вызначыўся пры вызваленні Беларусі), Аляксандр Карпавіч Скокаў, Юрый Вікенцьевіч Харашуноў, Міхаіл Васілевіч Пухаўскі, Яўген Іванавіч Якаўлеў, Мікалай Максімавіч Мацвееў, Маас Львовіч Мандэльштам, старшыны Пётр Сцяпанавіч Моцны, Віктар Нічыпаравіч Патрусаў і многія іншыя...

Тут названа ўсяго некалькі дзесяткаў прозвішчаў, некалькі фрагментаў з мноства біяграфій. А колькі іх было, жыхароў Магілёва, якія пранеслі на сваіх плячах цяжкую ношу салдата Вялікай Айчыннай. Кожны з іх, хто дажыў і не дажыў да доўгачаканай перамогі, хто названы і не названы ў гэтай кнізе, зрабіў свой уклад у агульную справу перамогі. Усім ім вялікая і шчырая ўдзячнасць нашчадкаў за іх ратны подзвіг у імя будучага.

Крутыя дарогі вайны прайшлі праз Магілёў

Так сталася, што праз нашу Бацькаўшчыну прайшлі франтавыя пуцявіны тысяч і тысяч яе абаронцаў рознага рангу. Сярод іх было нямала вядомых людзей, якімі ганарацца суайчыннікі.

Пад Магілёвам сустрэў першыя баі рускі пісьменнік Канстанцін Сіманаў, тады ваенны карэспандэнт газеты «Известия». Тут, можна сказаць, нарадзіўся славуты ваенны паэт К.Сіманаў, які на ўсё жыццё застаўся франтавіком. Апошнім жаданнем паэта было — каб яго прах развеялі над Буйніцкім полем. Там засталася яго душа...

У першыя дні вайны ў Магілёў прыязджаў Кліменцій Яфрэмавіч Варашчылаў. Ён кіраваў тут нарадай камандавання Заходняга фронту па пытанні арганізацыі новага рубяжа абароны па Дняпры.

На той жа нарадзе ўдзельнічаў і распрацоўваў мерапрыемствы па абароне Магілёва і Маршал Савецкага Саюза Барыс Міхайлавіч Шапашнікаў.

З Магілёвам звязаны і трагічны лёс генерала арміі Дзмітрыя Рыгоравіча Паўлава, камандуючага Заходнім фронтам. У горадзе знаходзіўся яго камандны пункт. У час знаходжання ў Магілёве К.Я.Варашылава і Б.М.Шапашнікава Паўлаў быў вызвалены ад пасады, а праз некаторы час асуджаны і расстраляны.

Пасля Паўлава камандаванне Заходнім фронтам прыняў генерал-лейтэнант Андрэй Іванавіч Яроменка, войскі якога абаранялі Магілёў. Маршал Савецкага Саюза А.І.Яроменка наведваў горад у 1961 і 1966 гг.

У ліпені 1941 г. ў абарончых баях пад Магілёвам удзельнічаў Іван Ігнатавіч Якубоўскі, будучы Маршал Савецкага Саюза. Летам 1964 г. ён зноў наведаў горад, сустракаўся з працоўнымі і моладдзю. Сёння яго імем у Магілёве названа вуліца, на доме № 23 устаноўлена мемарыяльная дошка.

У 1941 г. ў Магілёве быў і камандуючы аператыўнай групай войск Заходняга фронту Іван Васілевіч Болдзін. Пад яго камандаваннем у чэрвені 1944 г. 50-я армія ўдзельнічала ў вызваленні горада на Дняпры. Адна з вуліц Магілёва названа яго імем.

У чэрвені 1944 г. войскі 2-га Беларускага фронту пад камандаваннем генерал-палкоўніка Георгія Фёдаравіча Захарава вызвалялі



Мемарыяльны знак на ўшанаванне памяці К.Сіманава.

Магілёў, некаторы час генерал арміі знаходзіўся ў горадзе.

У баях за вызваленне Магілёва вызначылася 49-я армія, якой камандаваў Іван Ціханавіч Грышын. Пасля ён дапамагаў насельніцтву горада харчаваннем, выдзеліў значную колькасць транспартных сродкаў для правядзення аднаўленчых работ. Сёння ў Магілёве адна з вуліц носіць імя Героя Савецкага Саюза І.Ц.Грышына.

Летам 1955 г. ў час правядзення штабных вучэнняў Савецкай Арміі з кароткатэрміновым візітам ў Магілёве пабываў Маршал Савецкага Саюза Георгій Канстанцінавіч Жукаў.

Неаднаразова наведвалі Магілёў, дзе жылі сваякі, Герой Савецкага Саюза генерал арміі Васіль Піліпавіч Маргелаў і двойчы Герой Савецкага Саюза генерал арміі Іосіф Іракліевіч Гусакоўскі. Апошні нарадзіўся ў Крычаўскім раёне, пасля рэвалюцыі сям'я пераехала ў Магілёў. Адсюль у 1918 г. Іосіф Іракліевіч добраахвотнікам пайшоў у Чырвоную Армію. У Магілёве яму ўстаноўлены бюст.



Родныя вы нашы.
У смутку вялікім схіліўшы галовы,
стаім перад Вамі.
Вы не скарыліся лютым забойцам,
у чорныя дні фашысцкай навалы
Вы смерць прынялі,
ды полымя сэрцаў Вашай любові
да Савецкай Радзімы
навек незгасальна.
Памяць пра Вас у нас заўсёды,
як неўміручая наша зямля
і як вечна яркае сонца над ёю!

Удзельнікі антыфашысцкага падполля, партызанскага руху, якія загінулі ці прапалі без вестак, і мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору

Мінуць гады, не застанецца сведак тых трагічных падзей, але наступныя пакаленні магіляўчан ніколі не забудуць імёны герояў-падпольшчыкаў, якія прынялі пакутніцкую смерць у турэмных гітлераўскіх засценках і душагубках:

АВЯРКОВА В.П.
АВЯРКОВА З.П., навучэнка.
АГАРОДНІКАВА Т.П., настаўніца.
АГУРЭШНІКАЎ Аляксандр, рабочы.
АКУЛІЧ Генадзь, рабочы.
АЛЯШКЕВІЧ Анатоль, навучэнец.
АЎДЗЕЕВА М.А., рабочая.
АЎДЗЕЕЎ П.А., рабочы.
АЎСЯННІКАЎ Мікалай.
АРЭХАЎ А., рабочы.
БАЗЫЛЁВА В.І., настаўніца.
БАЛАШЭНКА П.П., служачы.
БАРБАШОВА Варвара, настаўніца.
БАТУРА Ніна, навучэнка.
БАЦЫЙ Леанід, навучэнец.
БУГЛАЕЎ П.М., рабочы.
БЯЛЬКО (Анісовіч) П.І., служачы.
БЯЛЯЙ В., навучэнец.
БЯЛЯНКА В., навучэнец.
БЯЛЯЎСКІ Л.А., настаўнік.
БЯЛЯЦКІ Д.Л., служачы.
ВАЖНІКАЎ І., інжынер.
ВАЛЧКОЎ М.І., рабочы.
ВАРАНОВІЧ-САГАЛІН С., служачы.
ВАРАПАЕВА Наталля, навучэнка.
ВАРАПАЕЎ Н.С., рабочы.
ВЕРАМЕЕВ І., навучэнец.
ВІШНЯВЕЦКАЯ Е., навучэнка.
ВІШНЯВЕЦКІ А.А., рабочы.
ВІШНЯВЕЦКІ А.П., рабочы.
ВЛАГІНА К.А., урач.
ВОСТРЫКАЎ Д., рабочы.
ГАРБАЧОЎ М.Ц.
ГАРБУЗ Р., рабочая.
ГАРОШКА А.В., інжынер.
ГАРУЛЁВА Вера Антонаўна.
ГАРУЛЁЎ Валянцін Пятровіч.
ГАРУЛЁЎ Пётр Паўлавіч.
ГАРУЛЁЎ Уладзімір Пятровіч.
ГАТАЛЬСКАЯ Ю.І., хатняя гаспадыня.
ГВАЗДЫРОВА М.К., настаўніца.
ГЛУЗМАН Я.І., навучэнец.
ГОЛЬДБЕРГ С.Я., капітан медслужбы.
ГРЫБАЙЛА Віктар, студэнт.
ГУСАРЭВІЧ Канстанцін, студэнт.
ДАНІЛЕНКА А.Л., рабочы.
ДАНІЛЕНКА Ф.П., служачая.
ДЗЕРВАЕДАЎ Д.І., мастак.
ДЗІДЗЕНКА Ю., сяржант.
ДРАКАЎ П.В., капітан.
ЕЎДАКІМАЎ Мікалай, рабочы.
ЖЫВАПІСЦАВА В.М., бухгалтар.
ЖЫВАПІСЦАВА Дзіна, навучэнка.
ЖЫТНІКАЎ Г.П., ваеннаслужачы.
ЗАІКІН В.І., рабочы.
ЗАЙЦАЎ Міхаіл, рабочы.
ЗАЙЦАЎ Сямён, рабочы.
ЗАЎСЦІНСКАЯ Е.А., настаўніца.
ЗАЎСЦІНСКІ А.П., медработнік.
ЗАХАРАЎ Іван, навучэнец.
ЗАХАРАЎ Міхаіл, рабочы.
ЗАХАРАН Г.А., мал. лейтэнант.
ЗУБОВІЧ Анна А., фельчар.
ІВАНОВА Г.А., настаўніца.
ІВАНОВА Надзя, рабочая.
ІВАНОЎ Н.А., рабочы.
ІСАКАЎ М.І., рабочы.
ІСАКАЎ Мікалай, рабочы.
КАВАЛЕЎ І.Ф., рабочы.



Т.П.Агароднікава.



В.І.Базылёва.



П.І.Бялько.



А.В.Гарошка.



М.К.Гваздырова.



Д.І.Дзерваедаў.



П.В.Дракаў.



В.М.Жывапісцава.



Г.А.Іванова.



Г.А.Захаран.



П.І.Крысевіч.



У.П.Кузняцоў.

КАЗАРЫЦКІ Альберт, навучэнец.
КАЗЛОВА Галя, навучэнка.
КАЛБЯНОК Валянціна, навучэнка.
КАЛБЯНОК Таіса, навучэнка.
КАМАНАШВІЛІ Г., рабочы.
КАМАНСКАЯ С.В., настаўніца.
КАМАРОЎСКАЯ Паліна, навучэнка.
КАРАБОК Лена, навучэнка.
КАРАЛЁЎ Павел, рабочы.
КАРАСЦЕЛІН Г.
КАРМАЧОВА Ніна, рабочая.
КАРНАЧОНАК Марыя, служачая.
КАРПІНСКАЯ В.М., настаўніца, яе дачка
КАРПІНСКАЯ Таццяна, навучэнка.
КАРЫТКІН М., рабочы.
КАРЭНІК М.А., рабочы.


М.П.Куўшынаў.


В.Л.Лусцянкоў.


І.М.Лысіковіч.


Э.Г.Мізко.


В.Я.Мотуз.


М.Я.Новікаў.


К.А.Новікава.


Ф.І.Пашанін.


У.М.Процкі.


А.І.Паршын.


Р.Дз.Радзівонаў.


В.А.Гарулёва.

КАЦЮБІНСКІ С.Д., настаўнік.
КАЧАНАЎ Я., служачы.
КАШАМАШВІЛІ Г., рабочы.
КНЯЗЕЎ П.І., служачы.
КОРШЫК М.А., рабочы.
КРЫСЕВІЧ Е.Д., хатняя гаспадыня.
КРЫСЕВІЧ П.І., педагог.
КУБАР В.С., рабочы.
КУЗНЯЦОЎ У.П., капітан мед. службы.
КУЎШЫНАЎ М.П., урач.
ЛЕБЕДЗЕЎ Ягор, служачы.
ЛЕВІН М.І., рабочы.
ЛУСТА М.К., рабочы.
ЛУСЦЯНКОЎ В.Л., ляснік.
ЛУТКОЎСКАЯ Н.М.
ЛЫСІКОВІЧ Іван, навучэнец.

МАДЗЕНАВА Марыя, рабочая.
МАЗНІКАВА Э.К., настаўніца, яе двое дзяцей і маці.
МАЗНІКАЎ М.С., рабочы.
МАЙБАРАДА Сяргей, навучэнец.
МАЛОЧКА Міша, навучэнец.
МАРМУЛЕЎСКІ С.В., урач.
МАЦВЕЕЎ Р.С., рабочы.
МЕЛЬНІК С.А., урач.
МІЗКО О.І., служачая.
МІЗКО Э.Г., хатняя гаспадыня.
МІХАЙЛАЎ Н.С., служачы.
МОТУЗ Валянціна Ягораўна, н. ў 1924, загінула 1.6.1944.
МУРЫЧОЎ Т.М., рабочы.
МЯЦЁЛКІН (КАРОВІН) М.М., лейтэнант.
НАДЗІРАДЗЕ Г., ваеннаслужачы.
НЕВЯДОМСКІ І.І., рабочы.
НОВІКАВА К.А., хатняя гаспадыня.
НОВІКАЎ М.Я., лейтэнант.
НОВІКАЎ Т.Н., рабочы.
ПАРШЫН А.І., капітан мед. службы.
ПАРЭБКА Т.В., рабочы.
ПАШАНІН Ф.І., капітан мед. службы.
ПЕЧКУРЭНКА Л.Т., рабочы.
ПІВУНОЎ Барыс, рабочы.
ПРОЦКІ У.М., інжынер на чыгунцы.
ПРЫБЫТОК І.Т., урач.
ПЫНЦІКАЎ А.Е., рабочы.
ПЯТРОВА А.Г., настаўніца.
ПЯХОЦІН (Хахлоў) П.А., капітан.
ПЯЧОРЫН І.М., рабочы.
РАГОЎСКАЯ (Сямёнава) З.С.
РАДЗІВОНАЎ Р.Дз.
РАДКЕВІЧ І.Х., пенсіянер.
РАДКЕВІЧ М.М., пенсіянерка.
РАДЦАН М.А., рабочы.

З успамінаў Тамары Мікалаеўны Філіпавай, 1925 года нараджэння, жыхаркі г. Мінска

Наша сям'я нічым асаблівым не вылучалася ў Магілёве. Маці, Марыя Пятроўна, працавала касцюмеркай у Магілёўскім рускім драмтэатры, бацька, Мікалай Піліпавіч, бухгалтарам у бальніцы, сястра Ларыса скончыла 7-ю гарадскую школу. У нас дома часта бывалі сябры бацькоў, аднакласнікі Ларысы. Усе мы, зразумела, жылі надзеяй на лепшую будучыню, нават думак не дапускалі, што можа быць вайна. У першыя дні лета да нас з Вязьмы прыехаў стрыечны брат Яўген Сямёнавіч Карабкоў (дарэчы, ён прайшоў па франтах Вялікай Айчыннай вайны, потым скончыў Мінскі медыцынскі інстытут, працаваў у клініках Беларусі і Расіі). Вясёлымі, шчаслівымі і зафіксаваў нас фатограф. А пасля ўсё пераблытала вайна, прынесла ў нашы лёсы выпрабаванні, гора і пакуты. У пачатку



Т.М.Філіпава (злева), Л.М.Філіпава, Я.С.Карабкоў. 1941 г.

вайны ішлі жорсткія баі за Магілёў, горад бясконца бамбілі фашысцкія самалёты. Пад бамбёжкай загінулі мае самыя дарагія — маці, бацька, сястра. Я засталася адна з бядою, але добрыя людзі не далі загінуць і мне. Ніколі не забуду Гарулёву (Бірбасаву) Веру Антонаўну. Гэта яна, рызыкуючы жыццём, выкупіла мяне ў фашыстаў, калі ў снежні 1941 г. мяне схапілі для адпраўкі ў Германію. Яна была і застаецца для мяне прыкладам чалавечнасці, дабрыні, міласэрнасці. Вясной 1943 г. яе арыштавалі, казалі, за сувязь з падпольшчыкамі, больш ніколі я яе не бачыла. 17 мая 1943 г. пад бамбёжкай загінулі яе сыны Уладзімір і Валянцін, муж Пётр Паўлавіч Гарулёў. Згарэў іх дом, я зноў засталася без даху над галавой. Зноў знайшліся добрыя людзі, прыгрэлі мяне. 6 жніўня 1943 г. фашысты схапілі мяне зноў, цяпер пазбегнуць няволі не змагла. Апынулася ў Аўстрыі, спачатку ў г. Штэйр, пасля ў г. Лінц. Атрымала і персанальны нумар — А3831198, жылі ў бараках, працавалі на заводзе пад зямлёй. Вызвалілі толькі 5 мая 1945. Гэты дзень ніколі не забуду. Хворыя, знясіленыя, мы плакалі ад шчасця. Пасля вярнулася ў Магілёў, дзе мяне ніхто ўжо не чакаў, не было даху над галавой, ні прытулку. Толькі хваробы, але зноў знайшліся добрыя людзі. У Мінск трапіла ў 1947, з таго часу і жыву тут. Шмат давялося перажыць, на ўсё жыццё засталася інвалідам. Пра сябе не хочацца гаварыць. Жыву ўспамінамі пра тое шчаслівае, даваеннае жыццё. Я памятаю і люблю той, даваенны, Магілёў, дзе ўсе былі жывыя, маладыя, поўныя ўзнёсласці і надзей, такімі і ідуць яны са мною па жыцці.

РАЖКОЎ А., ст. лейтэнант.
РАЙКОЎ І.М., рабочы.
РАМАНАВА А.В., хатняя гаспадыня.
РОЗМАН А.Ш., рабочы.
РУСАВА Т.І., навучэнка.
САБАЛЕЎСКАЯ М.С., рабочая.
САГАЛІН С.С., служачы.
САКАЛОЎ М.А., ваеннаслужачы.
САКАЛОЎ Н.П., настаўнік.
САЛАЎЁЎ Рыгор, рабочы.
САЧКОЎСКІ М.У., служачы.
СВЕНАПЯДКОЎСКІ Веня, навучэнец.
СВІДЗЕРСКІ Мікалай, рабочы.
СЦЕПАНЧУК Барыс, навучэнец.
СЯМЁНАВА З.С. (Рагоўская), рабочая.
ТАМКОЎ Г.В., рабочы.
ТРАКТАРАВА М.С., служачая, яе дачка і маці.



М.А.Сакалоў.



І.М.Чыксто.

ТРЫФАНАВА Зіна, навучэнка.
УЛАГІНА К.А., урач.
ФІЛІПАВА Марыя Пятроўна, н. 1.4.1900.
ФІЛІПАВА Ларыса Мікалаеўна, н. 27.5.1923.
ФІЛІПАЎ Мікалай Піліпавіч, н. 9.5.1888.
ФІЛІПАЎ Ф.І., рабочы.
ФРАЛОЎ Міша, навучэнец.
ХАЦЕНКА Марыя, рабочая.
ЦІМАШЭНКА Людміла, навучэнка.
ЦІХАНОВІЧ В.В., урач.
ЦІХАНОВІЧ П.Т., урач.
ЦЫБУЛЬКІН М.А., рабочы.
ЧАРАПАНАВА Н.В., рабочая.
ЧАРНЫШОВА Вера.
ЧУЛІЦКАЯ-МАГІЛЯВЕЦ А.Ф., настаўніца.
ЧЫЖЭЎСКІ Юра, навучэнец.
ЧЫЖЭЎСКІ Юрый, навучэнец.
ЧЫКСТО І.М., навучэнец.
ЧЫСТОЎ Рыгор, рабочы.
ШАБАНСКАЯ Т.І., настаўніца.
ШАГІНАЎ Г.П., рабочы.
ШАНКАРСКАЯ Н.А., урач.
ШАРАВЫ Мікола.
ШАРАНКОВА Лідзія, настаўніца.
ШАРАНКОЎ М., рабочы.
ШАРАХОЎСКАЯ А.Д., рабочая.
ШАСТАКОЎ Васіль, навучэнец.
ШМІТ Якаў, навучэнец.
ШПАКАЎ Д., рабочы.
ШУНАЙ Т.М., рабочы.
ЮРАЎ Ф.Я., капітан.
ЯЎЦІХІЕЎ М.М., механік хлебазавода.

***

ГАПОНЕНКА Вольга, загінула пры выкананні задання.

ІСАЕЎ І.Ф., рабочы, загінуў у час дыверсіі на чыгунцы.

ШУГАЛЕЙ С.Л., служачы, загінуў у час дыверсіі на чыгунцы.



М.М.Яўціхіеў.



Ю.Лінкус (Ліўшыц).

ЯБЛАЧКІНА Соня, загінула ў час дыверсіі на чыгунцы.

***

У час акупацыі многія гараджане пайшлі ў партызанскія атрады і мужна змагаліся з ворагам. Не ўсе з іх дажылі да светлых дзён Перамогі.

АЗАРОНАК Іван, навучэнец, падпольшчык.

АЛЯНКОЎ С.М., загінуў у лютым 1943.

АЛЬШАНІК Е.Ш., загінуў у студзені 1944.

АНДРЫЕВІЧ Мікалай Паўлавіч, н. ў 1924, загінуў 28.2.1944.

АНТОНАЎ Цімафей Пятровіч, н. ў 1910, загінуў 18.8.1943, пахаваны ў Чавускім р-не.

АЎСЕЕНКА Уладзімір Сцяпанавіч, н. ў 1905, загінуў у верасні 1943.

БАБУРА Васіль Іванавіч, н. ў 1903, загінуў 15.9.1943.

БАРАНОЎСКАЯ Людміла Міхайлаўна, н. ў 1924, загінула 17.4.1941, пахавана ў в. Дручаны Бялыніцкага р-на.

БАРАНОЎСКІ М.У., загінуў у лютым 1943.

БАТУРА В.І., рабочы, кіраўнік падпольнай групы.

БАЦЫЙ Леанід.

БЛІЗНЯЦОЎ І.І., загінуў у кастрычніку 1943.

БОЙКА Р.І., загінуў у жніўні 1943, падпольшчык.

БОРБІКАЎ А.Я.

БУЛАЧКАЎ Рыгор Мікітавіч, н. ў 1906, загінуў 20.10.1944.

БУЛКАЎ І.Я., загінуў у верасні 1942.

БУЛКАЎ Міхаіл Іванавіч, н. ў 1928, загінуў 25.3.1943, пахаваны ў Мінскай вобл.

ВАТАЛЕЕЎ Піліп Барысавіч, н. ў 1910.

ВАШЧЫЛА І.Ф., загінуў у верасні 1943.

ВЕРАЦЕННІКАЎ Мікалай Іванавіч, н. ў 1913, загінуў 20.6.1944, пахаваны ў в. Ямніца Магілёўскага р-на.

ВОРАНАЎ Г.Г., загінуў у студзені 1943.

ВОСТРЫКАЎ Г.Е., лейтэнант, загінуў у маі 1943, падпольшчык.

ВЯЖЭВІЧ Міхаіл Сцяпанавіч.

ГАНКЕ Уладзімір Данілавіч, н. ў 1923, загінуў 30.7.1944, пахаваны ў в. Дручаны Бялыніцкага р-на.

ГАНЧАРОЎ Сяргей Яўгенавіч, загінуў 20.4.1944.

ГАНЧАРЭНКА Юрый Сямёнавіч, н. ў 1900, загінуў у сакавіку 1942.

ГАПЕЕЎ Васіль, загінуў 13.7.1942, пахаваны ў в. Цяхцін Бялыніцкага р-на.

ГАРБАЦЕНКА Віктар Аляксеевіч, падпольшчык.

ГРЫБАЙЛА Віктар, падпольшчык.

ГУРЭВІЧ Майсей Львовіч, н. ў 1912, загінуў 21.1.1942.

ГУСАРЭВІЧ Канстанцін, навучэнец, загінуў у 1943.

ГУСАРЭВІЧ Сяргей Андрэевіч, н. ў 1924, загінуў 12.3.1943 у в. Дубінка Магілёўскага р-на.

ГУСЕЎ Мікалай Міхайлавіч, н. ў 1927, загінуў у чэрвені 1944, падпольшчык.

ДАМАРАЦКІ Канстанцін Мікалаевіч, загінуў 24.11.1944.

ДЗЕХЦЯРОЎ Рыгор Яўціхіевіч, загінуў 9.7.1944.

ДЗІДЗЕНКА Юрый, сяржант, удзельнік магілёўскага падполля.

ДУБОВІК Антон Сцяпанавіч, н. ў 1899, загінуў 25.9.1943.

ДУБРОЎСКІ Аляксандр Мікалаевіч, загінуў у сакавіку 1943.

ДУДЧАНКА Канстанцін Іванавіч, н. ў 1906, загінуў 20.2.1943.

ЕЎДАКІМЕНКА Л.Ф., сяржант мед. службы, удзельнік магілёўскага падполля.

ЖАРЫКАЎ Міхаіл Іванавіч, н. ў 1917, загінуў 8.2.1944.

ЖАРЫН Браніслаў Андрэевіч, загінуў 8.2.1943.

ЖЫДКОЎ Васіль Якаўлевіч, загінуў 3.2.1943.

ЗАХАРАЎ Іван, навучэнец.

ЗВЯРКОВА Лілія Паўлаўна, н. ў 1928, загінула ў сакавіку 1944.

ІВАНОЎ Віктар Аляксандравіч, н. ў 1920, загінуў 24.4.1944.

ІВАНОЎ Цярэнцій Якаўлевіч, н. ў 1904, загінуў 20.9.1943.

ІВАШКІН Міхаіл Канстанцінавіч, н. ў 1918, загінуў 28.6.1944, пахаваны ў г. Магілёў.

КАЖАМЯКІН Ф.П., рабочы, удзельнік магілёўскага падполля.

КАЗЛОВА Іраіда, настаўніца, удзельніца магілёўскага падполля.

КАЗЛОЎСКІ Міхаіл Пахомавіч, н. ў 1903, загінуў у ліпені 1943.

КАЗЫРНІЦКІ Альберт Паўлавіч, н. ў 1909, загінуў у 1943.

КАЛМАГОРАЎ Юрый Іванавіч.

КАМАРОЎСКАЯ Паліна, навучэнка, удзельніца магілёўскага падполля.

КАНДРАЦЕНКА Дзмітрый Сямёнавіч, н. ў 1918, загінуў 25.4.1944.

КАПЕЦ Васіль Фёдаравіч, н. ў 1923, загінуў 11.2.1944, пахаваны ў в. Аксенькавічы Бялыніцкага р-на.

КАПЫЛОЎ Антон Дзям'янавіч, н. ў 1899, загінуў 16.9.1942.

КАПЫЛОЎ Васіль Георгіевіч, н. ў 1916, загінуў 26.4.1944, пахаваны ў в. Іванаўка Віцебскай вобл.

КАРАЎКА Віктар Васілевіч, н. ў 1898, загінуў 13.5.1943.

КАРЖАНЕЎСКІ Васіль Міхайлавіч, н. ў 1910, загінуў 19.4.1944.

КАСТРОВА Клаўдзія Іванаўна, загінула 10.4.1944.

КАСТРЫЧКА Іван Кузьміч, загінуў 12.1.1943.

КАСТУСЁЎ Аляксей Паўлавіч, н. ў 1910, загінуў 10.7.1944, пахаваны ў в. Рэчкі Брэсцкай вобл.

КЛІМКОЎ Павел Клімавіч, загінуў у лютым 1943, пахаваны ў Хоцімскім р-не.

КОЖАРАЎ Міна Пятровіч, н. ў 1918, загінуў 27.6.1944, пахаваны ў г. Магілёў.

КРОТАЎ Міхаіл Мінавіч.

КРУГЛІКАЎ Міхаіл Андрэевіч, н. ў 1909, загінуў у лютым 1943.

КРЫСКАВЕЦ Сяргей Піліпавіч, н. ў 1904, загінуў 20.3.1942, пахаваны ў в. Перасопня Клічаўскага р-на.

КУРБАЦКАЯ Яўгенія Пятроўна, загінула ў кастрычніку 1943.

КУХАРАЎ Міхаіл Міхайлавіч, н. ў 1917, загінуў 1.4.1943.

КУХЦЯНКОЎ, н. ў 1924, загінуў 25.4.1942.

ЛАТЫШАЎ Іван Аляксеевіч, н. ў 1918, загінуў 6.9.1943, пахаваны ў в. Дубінка Магілёўскага р-на.

ЛЕАНОВІЧ Павел Мітрафанавіч, н. ў 1908, загінуў 5.6.1944, пахаваны ў в. Дубінка Магілёўскага р-на.

ЛІНКУС (ЛІЎШЫЦ) Юрый, навучэнец, удзельнік магілёўскага падполля.

ЛІТВІНАЎ Самуіл, загінуў 5.5.1943.

ЛІХУНОЎ Н.А., студэнт, удзельнік магілёўскага падполля.

ЛОРЧАНКА Леанід Дзмітрыевіч, н. ў 1923, загінуў у чэрвені 1943, пахаваны ў Бялыніцкім р-не.

ЛОСЕЎ Аляксандр Сяргеевіч, н. ў 1909, загінуў 30.12.1943.

ЛУКТО О.Я., служачая, удзельніца магілёўскага падполля.

ЛУСЦЯНКОЎ Васіль Лазаравіч, загінуў у маі 1943.

ЛЯЦКО Пётр Рыгоравіч, н. ў 1928, загінуў 17.8.1944, пахаваны ў Быхаўскім р-не.

МАЗНІКАЎ М.С., служачы, удзельнік магілёўскага падполля.

МАЛІКАЎ Іосіф Лазаравіч, н. ў 1914, загінуў 5.8.1943.

МАРОШЫН І.С., рабочы, удзельнік магілёўскага падполля.

МАРЧАНКА Мікалай Іванавіч, н. ў 1905, загінуў 25.2.1944, пахаваны ў в. Свяцілавічы Бялыніцкага р-на.

МАЦВЕЕНКА Уладзімір Сцяпанавіч, н. ў 1926, загінуў 26.6.1944.

МАЦЮШЫН М.С.

МІНЧАНКА Павел Яфімавіч.

МЯХАНІКАЎ Пётр Іванавіч, н. ў 1910, загінуў 15.3.1944.

НАВУМАЎ Мікалай Рыгоравіч, н. ў 1915, загінуў 23.1.1943, пахаваны ў в. Мамаеўка Бранскай вобл.

НЕВЯДОМСКАЯ З.І., удзельніца магілёўскага падполля.

НОВІКАЎ Рыгор Міхайлавіч.

ПАТАПЕНКА Аляксандр Мацвеевіч, н. ў 1922, загінуў 19.5.1944, пахаваны ў в. Яловая Ганцавіцкага р-на.

ПЕЧКУРОЎ Максім Рыгоравіч, н. ў 1898, загінуў у лютым 1943.

ПІЦУКОЎ Павел Мінавіч, н. ў 1913, загінуў 15.6.1943, пахаваны ў в. Барок Магілёўскага р-на.

ПЛЮШЧЭЎСКАЯ Тамара Васілеўна.

ПУПКО Фрыдрых Іосіфавіч, н. ў 1927, загінуў 29.12.1943.

РАК Васіль Сцяпанавіч.

РОТМАН Рыгор Мінавіч, н. ў 1909, загінуў 29.6.1944.

РУСАЎ І.В., служачы, удзельнік магілёўскага падполля.

РЭПІН Д.В., служачы, удзельнік магілёўскага падполля.

РЭЎТ Казімір Іванавіч, н. ў 1924, загінуў 26.4.1944.

САВІЦКІ Антон Іванавіч, н. ў 1926, загінуў 3.4.1944.

САВІЦКІ Фелікс Станіслававіч, н. ў 1914, партызан 121-га палка А.Касаева, загінуў, выратаючыся з баявога задання, якое выконваў у Магілёве.

Змагаліся ўсёй сям'ёй

З успамінаў Леакадзіі Уладзіславаўны Мірвада (Савіцкай), стрыечнай сястры Ф.С. Савіцкага

ЯНУШКА Іван Іванавіч, н. ў 1917, рад., прапаў без вестак у чэрв. 1941.

ЯНУШКА Парфірый, н. ў 1911, рад., загінуў у фашысцкім палоне 1.2.1945.

ЯНЧАНКА Аляксандр Сцяпанавіч, н. ў 1919, мал. лейт., памёр ад ран 24.2.1943.

ЯНЧАНКА Павел Яфімавіч, рад., загінуў у жн. 1944.

ЯНЧАНКА Сяргей Пятровіч, рад., загінуў 27.12.1944 у Латвіі.

ЯНЧЭЎСКІ Антон Станіслававіч, н. ў 1908, гв. маёр, загінуў 7.7.1943 у Курскай вобл., Расія.

ЯРЭШЭНКА Андрэй Іванавіч, рад., загінуў у жн. 1944.

ЯРМАК Іван Максімавіч, рад., загінуў у снеж. 1943 у г. Днепрапятроўск, Украіна.

ЯРМОЛЕНКА Адам Аляксеевіч, н. ў 1903, рад., памёр ад ран 21.4.1945 у Польшчы.

ЯРМОЛЕНКА Аляксандр Емяльянавіч, мал. сярж., загінуў 10.10.1944 у Польшчы.

ЯРМОЛЕНКА Аляксандр Ягоравіч, рад., загінуў у снеж. 1943 каля г. Фастаў Кіеўскай вобл., Украіна.

ЯРМОЛЕНКА Даніла Антонавіч, рад., загінуў у вер. 1944.

ЯРМОЛЕНКА Міхаіл Іванавіч, н. ў 1912, рад., загінуў у жн. 1944.

ЯРМОНІК Лаўр Мендзелевіч, рад., загінуў у снеж. 1943.

ЯРМОНІК Моця Мендзелевіч, н. ў 1915, рад., прапаў без вестак у вер. 1944 у Польшчы.

ЯРЭПКА Анатоль Рыгоравіч, н. ў 1910, рад., загінуў 12.7.1942 у Ленінградскай вобл., Расія.

ЯСЕВІЧ Уладзімір Іванавіч, рад., загінуў 18.2.1945 ва Усх. Прусіі.

ЯСКЕВІЧ Дзмітрый Васілевіч, рад., загінуў у жн. 1943 у Арлоўскай вобл., Расія.

ЯСНІЦКІ Васіль Іванавіч, н. ў 1917, рад., загінуў у 1944 у Карэліі, Расія.

ЯСЮКОВІЧ Барыс Фаміч, н. ў 1909, рад., прапаў без вестак у чэрв. 1944 у г. Выбарг Ленінградскай вобл., Расія.

ЯЎМЕНАЎ Іван Андрэевіч, рад., загінуў у кастр. 1944.

ЯЎМЕНАЎ Уладзімір Кузьміч, рад., загінуў 29.1.1945 ва Усх. Прусіі.

ЯЎМЯНКОЎ Цімафей Фядосавіч, рад., загінуў у жн. 1944 каля г. Мярэфа Харкаўскай вобл., Украіна.

ЯЎНЕВІЧ Іосіф Іванавіч, рад., загінуў у кастр. 1941 каля г. Адэса, Украіна.

ЯЎНЕВІЧ Франц Іванавіч, н. ў 1922, рад., прапаў без вестак у вер. 1944.

ЯЎСЕЕЎ Аляксей Іосіфавіч, рад., загінуў у жн. 1944 у г. Гродна.

ЯЎСЕЕЎ Елісей Іосіфавіч, н. ў 1905, рад., загінуў 19.10.1942.

ЯЎСЕЕЎ Якаў Антонавіч, н. ў 1918, загінуў 16.3.1942.

ЯЎСТРАТАЎ Савелій Майсеевіч, рад., загінуў у жн. 1944.

ЯФАНАЎ Мікалай Васілевіч, н. ў 1919, рад., прапаў без вестак у чэрв. 1941.

ЯФАНАЎ Мікалай Васілевіч, н. ў 1924, рад., загінуў у жн. 1944.

ЯФІМАЎ Аляксандр Ціханавіч, н. ў 1913, старш., загінуў у 1943 у Арлоўскай вобл., Расія.

ЯФІМАЎ Іван Абрамавіч, н. ў 1893, лейт., загінуў у жн. 1944 у г. Плоцк, Польшча.

ЯФІМАЎ Сяргей Цімафеевіч, н. ў 1924, рад., загінуў 11.8.1944 у Польшчы.

ЯФРЭМАЎ Васіль Міхайлавіч, н. ў 1907, рад., прапаў без вестак 12.8.1942.

ЯФРЭМАЎ Кузьма Міхайлавіч, н. ў 1907, рад., загінуў у вер. 1944.

ЯФРЭМЕНКА Аляксей Цімафеевіч, рад., загінуў 17.12.1944 ва Усх. Прусіі.

ЯФРЭМЕНКА Максім Сцяпанавіч, рад., прапаў без вестак у ліп. 1941.

ЯФРЭМЕНКА Рыгор Міхайлавіч, н. ў 1918, рад., загінуў у сак. 1944 на ст. Дно Ленінградскай вобл., Расія.

ЯХНОВІЧ Лейба Элевіч, н. ў 1886, рад., прапаў без вестак у кастр. 1944.

ЯЦКЕВІЧ Антон Іосіфавіч, рад., загінуў у вер. 1944 у г. Лодзь, Польшча.

ЯЦКЕВІЧ Фёдар Якаўлевіч, н. ў 1901, рад., загінуў 27.8.1944 у Беластоцкай вобл.

ЯЧМЕНЕЎ Рыгор Цімафеевіч, н. ў 1907, рад., прапаў без вестак у вер. 1941.

ЯЧЫРКА Дзмітрый Мітрафанавіч, н. ў 1923, рад., загінуў 6.8.1944 у Гродзенскай вобл.

ВЁСКА КАЗІМІРАЎКА (цяпер у межах Магілёва)

АГАРОДНІКАЎ В.Т.
АСТРОЎСКІ І.Г.
АСТРОЎСКІ Ф.Г.
АЎСЕЕНКА А.С.
АЎСЕЕНКА В.Д.
АЎСЕЕНКА В.С.
АЎСЕЕНКА Г.В.
АЎСЕЕНКА Д.С.
АЎСЕЕНКА Е.С.
АЎСЕЕНКА М.Г.
АЎСЕЕНКА М.Г.
АЎСЕЕНКА Н.С.
БАБАЕЎ Т.А.
БАБЕЕЎ М.А.
ВАРОНА Я.С.
ВАРФАЛАМЕЕЎ Д.
ВОРАНАЎ Н.
ВЫСОЦКІ Л.Э.
ГАЛІТАРАЎ А.С.
ГАЛІТАРАЎ С.Л.
ГЛУШАКОЎ Н.І.
ДАРАШЭНКА С.Г.
ЗУБАРАЎ А.С.
ЗУБАРАЎ Е.С.
ЗУБАРАЎ С.С.
КАВАЛЁЎ Н.П.
КАВАЛЁЎ П.Б.
КАВАЛЁЎ Т.Б.
КАЖАМЯКІН А.А.
КАЖАМЯКІН М.Н.
КАПЕЙЧАНКА Л.І.
КОЗЫРАЎ Т.А.
КРУКОЎСКІ Ф.І.
КУНЦОЎ В.Д.
ЛЕБЕДЗЕЎ А.Е.
МАЗНІКАЎ М.С.
МАРГУНОЎ Д.М.
МЕДУНІЦА Д.М.
ПАДАШЭЎСКІ А.Ф.
ПЕХЦЕРАЎ В.С.
СЕВУЛЬЧАНКА В.А.
СЕВУЛЬЧАНКА Н.А.
СКВАЕЎ І.А.
СЛІЎКІН К.Т.
СМАЛЯКОЎ
ТАМАШКОЎ М.І.
ФАМІН Г.П.
ЧУПРЫНСКІ П.М.
ШАРШНЁЎ А.Н.
ШАРШНЁЎ Н.
ШУРМІЛАЎ П.А.
ЯКІМЕНКА А.С.

Падрыхтавалі да друку М.Бурдзін, Б.Гардзееў, У.Кадзет.

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

У МІРНАЙ ПРАЦЫ

28 чэрвеня 1944 г. да 10 гадзін вечара Магілёў быў поўнасцю вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Горад патанаў у дыме пажарышчаў. Усюды руіны, кучы бітай цэглы, шчэбеню, скарожанага жалеза. На галоўных вуліцах — варонкі ад снарадаў і бомбаў.

9 ліпеня на стадыёне «Спартак» адбыўся мнагалюдны мітынг. Яго ўдзельнікі — магілёўчане, партызаны і прадстаўнікі воінскіх часцей — паклляліся аднавіць разбураны горад. Мітынг закончыўся парадам партызан і воінаў Чырвонай Арміі.

Магілёўчане з энтузіязмам узяліся за справу. Іх чакала гіганцкая работа. Яна ўскладнялася тым, што вайна яшчэ працягвалася і шмат сіл патрабавалася на тое, каб наблізіць канчатковую перамогу. Заклік «Усё для фронту! Усё для перамогі!» стаў законам для жыхароў Магілёва, колькасць якіх вельмі скарацілася: на 2.6.1944 г. ў горадзе заставалася 10 120 чалавек у параўнанні з 112 тысячамі перад пачаткам вайны. За час акупацыі фашысты знішчылі больш як 10 тысяч мірных жыхароў і звыш 70 тысяч ваеннапалонных, больш за 2000 чалавек, пераважна моладзі, вывезлі ў Германію. Да вайны ў горадзе працавалі 58 прадпрыемстваў і 142 прамысловыя арцелі, на якіх было занята звыш 16 тысяч рабочых. Уцалелі толькі тры — хлебазавод, мясны і малочны заводы. Часткова захаваліся 15 прадпрыемстваў. У руінах быў і чыгуначны вакзал.

Вялікія страты панесла жыллёва-камунальная гаспадарка. З 6653 жылых дамоў за вайну разбурана і спалена 3220 (больш за 150 тыс. м²). 40% жылля, якое яшчэ захавалася, патрабавала капітальнага рамонту. Такім чынам, жылая плошча горада скарацілася больш чым на 80%. У руіны ператварылі акупанты і многія адміністрацыйныя будынкі. У Магілёве адсутнічалі святло і вада, бо захопнікі прывялі ў непрыгоднасць электрастанцыю і водаправод. Яны знішчылі таксама 5 лазняў, пральню, гарадскую гасцініцу, аўтаматычную тэлефонную станцыю, паштовую кантору, 196 магазінаў, 48 сталовых і рэстаранаў і іншыя будынкі сферы абслугоўвання. Не працаваў гарадскі транспарт.

Напярэдадні вайны ў Магілёве існавала шырокая сетка культурна-асветных устаноў. Акупанты развалілі яе дашчэнту. З 25 агульнаадукацыйных школ захавалася 3. Былі разбураны ўсе 10 вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, 2 кінатэатры, 12 клубаў, 2 музеі, 15 бібліятэк, Палац піянераў і школьнікаў. Непапраўнай стратай для рэспублікі стала знікненне экспанатаў з Магілёўскага дзяржаўнага музея, у тым ліку Крыжа Ефрасінні Полацкай — нацыянальнай святыні беларусаў.

Горад амаль цалкам пазбавіўся лячэбных устаноў. З трох бальніц захавалася толькі адна, з 155 урачоў засталіся ўсяго 20. Матэрыяльныя страты, нанесеныя гораду, склалі 487 830 439 рублёў (у цэнах 1940 г.).

Дзяржаўныя, партыйныя і іншыя арганізацыі пачалі дбаць пра адраджэнне Беларусі яшчэ да выгнання фашысцкіх захопнікаў. Аднавілі работу некаторыя архітэктурныя і інжынерна-будаўнічыя арганізацыі (напрыклад, у студзені 1944 г. стаў працаваць Магілёўскі абласны будаўнічы трэст, які спачатку размяшчаўся ў г. Крычаве). Ужо 29 чэрвеня пачаў дзейнічаць гарадскі выканаўчы камітэт Савета дэпутатаў працоўных. Старшынёй яго стаў Б.Л.Муха, былы балтыйскі матрос, удзельнік вызвалення Магілёва. Выканком адразу заняўся ўлікам насельніцтва і матэрыяльных каштоўнасцей, папярэджаннем эпідэмій, мабілізацыяй насельніцтва на аднаўлен-

не гарадской гаспадаркі. 10 ліпеня 1944 г. было прынята рашэнне аб утварэнні выканаўчага камітэта ў такім саставе: старшыня В.Л.Муха, сакратар А.М.Зільберман, члены выканкома — сакратар гаркома КП(б)Б А.І.Марозаў, дэпутаты Е.П.Воранава і Я.М.Глазшнейдэр.

У першы ж дзень пасля вызвалення пачалі працаваць хлебазавод, бальніца на 250 ложкаў, 12 магазінаў, 2 сталовыя, а праз 5 дзён — паліклініка, станцыя хуткай дапамогі і аптэка. На трэці дзень часткова аднавілі тэлефонную сувязь. Пачаліся работы па аднаўленні драматычнага тэатра. На дзесятыя суткі былі пабудаваны часовы чыгуначны мост і чыгуначнае палатно, на станцыю Магілёў прыбыў першы паравоз з г. Крычава. Яго вялі машыністы-магіляўчане Аркадзь Карпілаў і Пётр Авярковіч.

Але аднаўленне разбуранага Магілёва патрабавала актыўнага ўдзелу ўсіх гараджан. 8 жніўня 1944 г. абласная газета «За Радзіму» надрукавала зварот да жыхароў горада народнага артыста БССР Дз.А.Арлова, у якім ён адзначаў, што лепшай дапамогай магіляўчан Чырвонай Арміі будзе хутчэйшае аднаўленне прамысловых прадпрыемстваў, вуліц, дамоў, устаноў культуры. 27 кастрычніка 1944 г. пасля трохгадовага перапынку адбылася 7-я сесія Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных, якая сфарміравала выканаўчы камітэт. Старшынёй яго быў выбраны М.П.Каралёў, Герой Савецкага Саюза, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Магілёўшчыне. Сесія прыняла пастанову далучыць усё працаздольнае насельніцтва да работ па аднаўленні горада.

12 лістапада, у першы дзень масавых работ, у іх удзельнічала 5530 жыхароў, старых і малых. Яны разабралі, ачысцілі і склалі ў штабелі 53 500 штук цэглы, 5 кубаметраў каменю і іншага будаўнічага матэрыялу, ачысцілі 3200 м^2 гарадскіх вуліц і плошчаў. Усю восень і зіму гараджане пастаянна выходзілі на работу. Да 20 снежня яны адпрацавалі на адраджэнні роднага Магілёва 15,5 тысячы працадзён. Па прыкладу сталінградцаў стварылі добраахвотныя брыгады, якія ў вольны час працавалі на будоўлях. У пачатку 1945 г. было больш за 200 такіх брыгад.

Аднавіць за кароткі тэрмін разбураную народную гаспадарку было немагчыма без падтрымкі рэспублік Савецкага Саюза. У Магілёў, як і ў іншыя гарады і вёскі вызваленай Беларусі, бясконцым патокам ішлі эшалоны з розных рэгіёнаў: яны везлі будаўнічыя матэрыялы і абсталяванне, медыкаменты і падручнікі, хатняе начынне, сюды ехалі высококваліфікаваныя спецыялісты і вопытныя рабочыя.

Строгая дысцыпліна і суровыя патрабаванні пасляваеннага часу, памножаныя на ўдарную працу і энтузіязм насельніцтва, далі плён. На трубаліцейным заводзе, напрыклад, дзе ўцалела толькі невялікая частка цэха і домік для кіраўніцтва, асноўны аб'ём аднаўленчых работ выконваў сам калектыў прадпрыемства. Па прапанове майстра Круталевіча металургі вырашылі вырабіць неабходныя канструкцыі, дэталі і прыстасаванні. Рабочыя Яромчанка, Юркоў, Семікова і многія іншыя пастаянна перавыконвалі дзённыя заданні на 30—50%.

Такую ініцыятыву праяўлялі і іншыя працоўныя калектывы. Работніцы швейнай фабрыкі Н.Нікалаева, А.Корнева, К.Тарасава, О.Сілеверстава нават прапанавалі перадаць прадпрыемству на часовае карыстанне ўласныя швейныя машыны, пакуль не будуць атрыманы фабрычныя.

Праца магіляўчан у той час была высокапрадукцыйная. Вядомы машыніст, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР Х.А.Качмароў правёў свой паравоз 3500 км без аварый і капітальнага рамонту і сэканоміў больш за 15 т вугалю. Амаль на кожным прадпрыемстве ці будоўлі былі свае лідэры, раўненне на якіх лічылася справай гонару для кожнага.

У 1946 г. ў працоўных калектывах Магілёва, як і ва ўсёй краіне, разгарнуўся рух за датэрміновае выкананне пяцігодкі. Гэтая пяцігодка стала рашаючай у пераадоленні цяжкіх наступстваў вайны. На металургічным заводзе імя Мяснікова (былы трубаліцейны) працягваліся аднаўленчыя работы. Брыгада былога франтавіка Івана Караткевіча адбудоўвала пракатны цэх, у якім не ўцалелі нават вокны і дзверы. Нягледзячы на цяжкія ўмовы, холад, яна апярэджвала графік. Па выніках спаборніцтва заводскаму калектыву былі ўручаны пераходны Чырвоны сцяг Савета Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б і грашовая прэмія. 12 мая 1947 г. завод даў першую прадукцыю. Наступны год ён ужо рэканструяваў адноўленыя цэхі, каб павысіць прадукцыйнасць працы. 28 лістапада ў цэхах з'явілася «маланка»: «Сёння ў 10 гадзін 30 мінут здадзена на склад апошняя тона пракату ў лік 1948 г. Пракатчыкі! Выканаем абавязацельствы, узятыя ў гонар 30-годдзя БССР! Дадзім краіне сотні тон звышпланавага металу!»

У тую першую пяцігодку (1946—50) завo-

ды і фабрыкі аснашчаліся новай тэхнікай, мяняўся іх профіль. На пляцоўцы металаапрацоўчага завода імя І.Дзімітрава ўзводзілася прадпрыемства па выпуску машын і механізмаў для будаўнічай індустрыі «Строммашына». У снежні 1946 г. на ім былі выраблены першыя раствора- і бетонамяшалкі. Павелічэнне выпуску прадукцыі на заводзе дасягалася найперш за кошт паляпшэння арганізацыі працы і ўдасканалення тэхналагічнага працэсу. Тут 10 рабочых адначасова абслугоўвалі па 2—3 станкі. У 1947 г. 252 чалавекі датэрмінова справіліся з гадавым планам, 75 — з паўтарагадовым, а 20 чалавек — з двума гадавымі планамі. У 1948 г. электразваршчык В.Тарасенка выканаў 3,5 гадавой нормы. У 1949 г. заводскі калектыў працаваў ужо без дзяржаўнай датацыі.

Шмат сіл патрабавала адраджэнне буйнейшага ў рэспубліцы хімічнага прадпрыемства — шаўковай фабрыкі імя В.У.Куйбышава (пазней — завод штучнага валакна). Гітлераўцы разбурылі звыш палавіны вытворчых карпусоў фабрыкі, вывезлі ў Германію ўсё абсталяванне, ператварылі ў кучу цэглы і жалезнага лому ЦЭЦ, практычна быў знішчаны рабочы пасёлак. Як і на іншых будоўлях, людзі працавалі тут з поўнай аддачай. На 150—200% выконваў заданне будаўнік Міхалёў. Па 3—4 нормы выдавалі штодзень слесары Жукаў, Нядзведзкі, Нікіцін, Шапіра. У 1947 г. былі атрыманы першыя кілаграмы шоўку на адноўленай доследнай устаноўцы, а ў канцы 1948 г. пушчана першая чарга завода.

Рабочыя фабрыкі імя В.Валадарскага імкнуліся як мага хутчэй задаволіць попыт насельніцтва ў адзенні. У часова прыстасаваным памяшканні яны ўстанавілі чатыры машыны і пачалі выпускаць прадукцыю. Хутка ў строй уступіў цэх масавага пашыву. У 1946 г. калектыў фабрыкі выканаў гадавы план на 105,3% і даў народу тавараў на 20 мільёнаў 200 тысяч рублёў.

У горадзе з'явіліся новыя прадпрыемствы. На месцы аўтарамонтнага ўзнік лакамабільны завод, будаваўся металаапрацоўчы камбінат. Буйныя прамысловыя гіганты не толькі павялічвалі аб'ём прадукцыі, але і бралі шэфства над прадпрыемствамі мясцовай прамысловасці і арцелямі.

Магіляўчане з энтузіязмам успрымалі ўсё перадавое, што нараджалася тады ў краіне. На лакамабільным заводзе 36 токараў асвоілі новы рэжым рэзання металу, а токар П.М.Колбаў стаў выконваць норму аж на 270%. На заводзе «Строммашына» токар Смалякоў давёў норму выпрацоўкі да 300%. Стаханаўская змена з 6 брыгад швейнай фабрыкі імя Валадарскага (начальнік змены К.Х.Давыдава) дакладнай арганізацыяй працы, удасканаленнем тэхналагічнага працэсу, павышэннем кваліфікацыі рабочых дабівалася выканання заданняў на 125—135%. Калектыў фабрыкі паставіў задачу ўзняць усіх рабочых да ўзроўню перадавікоў і дабіўся таго, што 445 з іх узялі гэты рубеж. Датэрмінова выканала гадавое заданне рабочая Веліканава. На металакамбінаце 66 працаўнікоў выконвалі нормы на 125—150%, 81 — на 150% і больш. На шаўковай фабрыцы 68 рабочых спраўляліся з заданнем на 110—120%, 71 — на 120—150%, 48 — на 150—200%, 11 чалавек перакрывалі двайную норму.

У пачатку 1945 г. 48 брыгад у Магілёве давалі прадукцыю выдатнай якасці. На агульнагарадскім сходзе членаў брыгад выдатнай якасці было прынята рашэнне пашыраць рух за выпуск высакаякасных тавараў. Да верасня 1949 г. за права называцца брыгадамі выдатнай якасці змагаліся 120 калектываў, якія аб'ядноўвалі больш за 3000 чалавек, або 25% усіх прамысловых рабочых.

Значны ўклад у ажыццяўленне пяцігадовай праграмы ўнеслі рацыяналізатары і вынаходнікі Магілёва. Толькі ў 1950 г. імі было пададзена 527 прапаноў, укараненне якіх сэканоміла 1,7 мільёна рублёў. Рабочыя шаўковай фабрыкі Жураўлёў і Зязюлін, напрыклад, у парадку эксперыменту рэканструявалі 2 прадзільныя станкі, што дазволіла павысіць прадукцыйнасць працы на іх у 10 разоў, а сабекошт прадукцыі знізіць у 5 разоў. Рабочы гарбарнага завода Д.Л.Калеснікаў, які з маладосці працаваў на заводах Рыгі і Пецярбурга, за пасляваенныя гады сканструяваў 9 машын і даў заводу каля 4 млн. рублёў эканоміі. За наватарства ён быў удастоены двух ордэнаў Леніна і звання Заслужаны вынаходнік БССР.

Дзякуючы рацыянальнай арганізацыі працы А.Г.Валюжанец, слесар-інструментальшчык металаапрацоўчага камбіната, дэпутат абласнога Савета, кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга, за змену выконваў па 3 нормы. На лакамабільным заводзе каваль М.С.Рабкін з дапамогай спецыяльных прыстасаванняў давёў выкананне штодзённага задання да 450%. На тым жа прадпрыемстве былы франтавік, расточнік І.Губанаў за 14 месяцаў выканаў 3 гадавыя нормы.

Высокую адзнаку атрымала праца магілёўскіх хімікаў: за асваенне вытворчасці віскоз-

нага корду інжынеры А.Н.Карасёва, С.Н.Галадок і А.В.Ястржэмскі былі ўдастоены Сталінскай прэміі.

За першую пасляваенную пяцігодку ў Магілёве было ўзведзена і адноўлена 18 буйных вытворчасцей, і к канцу яе дзейнічалі 82 прамысловыя прадпрыемствы і арцелі. Колькасць рабочых павялічылася з 4800 да 15 000 чалавек. У 1949 г. аб'ём вытворчасці ў горадзе дасягнуў узроўню 1940 г., да канца пяцігодкі перавысіў яго на 6%, а ў 1945 г. ў 8,3 раза. Быў асвоены выпуск новых відаў прадукцыі: лакамабіляў, віскознага корду для аўтамабільных шын, натуральнага каўчуку і іншых. Завод «Электрарухавік», што вырас на базе металакамбіната, пачаў выпускаць электраматоры. Забяспечанасць горада электраэнергіяй дасягнула даваеннага 1940 г. Прамысловасць Магілёва датэрмінова выканала заданні пяцігадовага плана.

Уздым народнай гаспадаркі ў многім залежаў ад стабільнай работы транспарту. За пераўнальна кароткі тэрмін у рэспубліцы былі адноўлены пуці і рамонтная база чыгуначнага вузла, падрыхтаваны кадры машыністаў, качагараў, токараў і слесараў-рамонтнікаў. Магілёўскае аддзяленне Беларускай чыгункі таксама паспяхова справілася з пяцігадовай праграмай. Яму двойчы прысвойваўся пераходны Чырвоны Сцяг ВЦСПС і Міністэрства шляхоў зносін СССР. Па выніках работы ў пяцігодцы магіляўчане занялі 2-е месца па сетцы чыгунак Савецкага Саюза. Узоры стаханаўскай працы паказвалі машыністы Х.А.Качмароў, С.І.Палашэўка, Г.І.Кулакоў, Н.А.Гарбузоў і іншыя. Токар паравознага дэпо Ф.Т.Талако выканаў за пяцігодку 11 гадавых нормаў. Вялікай павагай у таварышаў па працы карысталася сям'я машыніста П.Л.Марозава. Галава сям'і Пётр Мацвеевіч прыйшоў на чыгунку яшчэ ў 1922 г. Перадавымі машыністамі сталі яго сыны Міхаіл і Уладзімір.

Вялікая ўвага надавалася адраджэнню сацыяльнай сферы Магілёва. З году ў год павялічваўся аб'ём капітальных укладанняў у рамонт і будаўніцтва жылля, аб'ектаў культуры і аховы здароўя. Калі ў 1944 г. на гэта было выдзелена і асвоена 4,5 млн. рублёў, то ў 1947 г. — 33,8 млн., а ў цэлым за пяцігоддзе звыш 290 млн. рублёў. Больш як 38 млн. рублёў пайшло на ўзвядзенне жылля. За пяцігодку ўдалося аднавіць і пабудаваць 120 тыс. м^2 жылой плошчы. Аднак жыллёвая праблема заставалася вострай. Да 1951 г. 13 сем'яў усё яшчэ жылі ў зямлянках, 30 — у падвалах, 514 — у прыстасаваных пад жыллё памяшканнях, 223 сям'і — на прыватных кватэрах.

За гады пяцігодкі былі адноўлены Дом Саветаў, іншыя адміністрацыйныя будынкі, пяціпавярховая гасцініца «Днепр». Аўтаматычная тэлефонная станцыя мела 2300 абанентных нумароў замест некалькіх соцень у 1944 г. Вузел радыёвяшчання абслугоўваў 8000 кропак (да вайны — 7000).

Да канца 1949 г. працягласць водаправоднай сеткі складала 57 км, асветленасць вуліц — 17 км (13 км — да вайны). Было адрамантавана і забрукавана больш чым 40 тысяч м^2 маставых. Перад вайной 13 км вуліц было абсаджана дрэвамі. У 1944—47 гг. іх высаджана 83 тысячы, адноўлены парк імя М.Горкага, разбіты сквер на вуліцы Лазарэнкі. У студзені 1946 г. адкрыўся першы аўтобусны маршрут — ад чыгуначнага вакзала да Савецкай плошчы. Да канца пяцігодкі гараджан абслугоўвалі ўжо 18 аўтобусаў на некалькіх маршрутах.

Наогул за першую мірную пяцігодку Магілёў значна змяніўся, адбудаваўся, але сляды вайны яшчэ былі прыкметныя. Вельмі цяжка ішло аднаўленне школ, тэхнікумаў і культурнаасветных устаноў. Акупанты разбурылі вучэбны корпус і інтэрнат педагагічнага і настаўніцкага інстытутаў, спалілі шматтомную бібліятэку. У ліпені 1944 г. было вырашана пачаць іх аднаўленне. У лістападзе пачаліся першыя заняткі на трох факультэтах педагагічнага інстытута: мовы і літаратуры, геаграфіі і гісторыі. Студэнтам гэтай ВНУ даводзілася займацца ў дзве змены ў памяшканні СШ № 3, а настаўніцкага інстытута — у памяшканні педвучылішча. Абодва будынкі амаль не ацяпляліся, не мелі электраасвятлення. Не хапала вучэбных дапаможнікаў і літаратуры, а сталы і лаўкі студэнты пераносілі з адной аўдыторыі ў другую. Па ініцыятыве дацэнта І.С.Шнітко адміністрацыя інстытута нават вымушана была звярнуцца да насельніцтва з просьбай здаваць кнігі для бібліятэк. Не хапала і выкладчыкаў. Нягледзячы на такія цяжкія ўмовы, заняткі ішлі, і ў 1945 г. адбыўся выпуск 64 настаўнікаў. Паступова ўмацоўвалася матэрыяльная база інстытутаў, павялічваўся прафесарска-выкладчыцкі састаў (у 1946 г. амаль удвая), павышалася яго кваліфікацыя. Зразумела, больш станавілася і студэнтаў: у 1946 г. ў педінстытуце на стацыянары займаліся 700 чалавек, больш за 500 — завочна. У 1947 г. быў пра-

ведзены першы набор на аддзяленне фізікі і матэматыкі (з 1950 г. фізіка-матэматычны факультэт).

Магіляўчане змаглі не толькі аднавіць даваенныя вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, але і адкрылі 3 новыя тэхнікумы: машынабудаўнічы, будаўнічы і сельскага і калгаснага будаўніцтва. Да 1950 г. была адноўлена і павялічана сетка школ і дашкольных устаноў, прафесійна-тэхнічных вучылішчаў.

У Магілёве працавалі 2 кінатэатры, абласная бібліятэка, 15 гарадскіх і ведамасных бібліятэк. У 1945 г. адкрыў сезон абласны драматычны тэатр. Пачаліся заняткі ў музычных школе і вучылішчы, дзе займаліся 300 навучэнцаў, у 1946 г. — 450.

За пасляваеннае пяцігоддзе значна пашырылася сетка лячэбных устаноў: у 1950 г. ўжо працавалі 5 бальніц, 3 амбулаторыі і паліклінікі, 28 урачэбных і фельчарскіх участкаў.

Гарадскія ўлады, камсамол вялікую ўвагу надавалі развіццю фізкультуры і спорту. Толькі добраахвотнае спартыўнае таварыства педагагічнага і настаўніцкага інстытутаў «Бальшавік» аб'ядноўвала 200 чалавек. У 1946 г. прайшла першая пасля вайны гарадская спартакіяда. А на Усебеларускай спартакіядзе студэнтаў педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў магілёўскія студэнты занялі першае месца.

У тыя гады гараджане аказвалі бескарыслівую дапамогу сельскаму насельніцтву Магілёўшчыны, якое пасля вайны апынулася ў выключна цяжкім становішчы. Нямецка-фашысцкія акупанты разбурылі і спалілі 9200 сёл і вёсак (інакш кажучы, была спалена амаль кожная другая вёска), знішчылі 40 207 гаспадарчых пабудоў, 2201 культурна-бытавы будынак, 67 242 жылыя дамы. Сотні тысяч сялян засталіся без прытулку. Магіляўчане ўзялі шэфства над самымі беднымі гаспадаркамі раёна (у 1947 . — над 66 калгасамі і 4 МТС). У будаўніцтве жылых дамоў для вяскоўцаў толькі ў кастрычніку 1947 г. ўдзельнічалі 6 тысяч рабочых і служачых; да канца года ўдалося аднавіць і пабудаваць 57 059 дамоў і перасяліць туды 66 235 сем'яў.

Горкая «спадчына» вайны яшчэ доўга нагадвала пра сябе. Калі ў цэлым горад паспяхова справіўся з пяцігадовым планам (звыш 1600 рабочых выканалі яго да сярэдзіны 1949 г.), то асобным прадпрыемствам і будоўлям не пад сілу былі планавыя заданні. І ўсё ж наступную пяцігодку (1951—55) Магілёў пачынаў на трывалым фундаменце. Прадугледжвалася вялікая работа па рэканструкцыі прадпрыемстваў, удасканаленні прамысловай структуры і развіцці гарадской гаспадаркі.

У ліпені 1951 г. Савет Міністраў БССР зацвердзіў генеральны план развіцця горада Магілёва. 28 лістапада 9-я сесія гарадскога Савета намеціла канкрэтныя меры па яго ажыццяўленні. Па-ранейшаму вядучымі галінамі прамысловасці заставаліся машынабудаванне, металаапрацоўка і хімічная вытворчасць. На гэтых прадпрыемствах павялічваўся аб'ём выпуску прадукцыі, удасканальваўся або мяняўся асартымент. Магутнасць машын, якія ствараліся на лакамабільным заводзе, узрасла з 20 да 75 і нават 100 конскіх сіл. «Строммашына» асвоіла выпуск многіх відаў новага абсталявання: драбільна-размольных станкоў, агрэгатаў для вытворчасці цэглы, электракерамічных вырабаў, шыферу, азбестацэментных труб і руберойду. Металургічны завод акрамя асноўных відаў сваёй прадукцыі (чыгунных водаправодных і каналізацыйных труб) за першыя два гады наладзіў выпуск тонкага стальнога ліста, а ў 1955 г. быў устаноўлены тоўсталіставы стапель, на якім працэс пракату стаў поўнасцю механізаваны. Завод штучнага валакна ў 1954 г. з выпуску віскознага шоўку для корду быў пераведзены на вытворчасць шоўку для тэкстыльнай і трыкатажнай прамысловасці, тут уступіла ў строй другая чарга па вытворчасці штапелю.

Развівалася і харчовая прамысловасць, у горадзе сталі дзейнічаць мяса- і млынкамбінаты, макаронная фабрыка, малочны завод. У 1953 г. адноўлены клеявы завод. Сыравіну для яго пастаўлялі мясакамбінаты Беларусі, Украіны і Малдавіі, а прадукцыя завода ішла далёка за межы рэспублікі. Швейная фабрыка імя В.Валадарскага спецыялізавалася на пашыве жаночага і дзіцячага верхняга адзення.

У гэтыя гады барацьба за высокапрадукцыйную працу набыла масавы характар. На заводзе «Строммашына» больш за 80% токараў авалодалі скорасным метадам рэзання металу. Токары Смалякоў, Токараў, Гудкоў перавыконвалі норму ў 2—2,5 раза. На чыгунцы шырока распаўсюджваўся рух «пяцісотнікаў». Машыністы Дубінін, Вінаградаў, Аляскюк, Чарнышоў у 1951 г. правялі больш за 600 цяжкавагавых паяздоў і перавезлі сотні тысяч тон грузаў звыш плана, а Печкуроў і Ганшэвіч давялі сярэднясутачны прабег паравозаў да 338 км пры норме 285.

Прыкметную ролю на вытворчасці адыгрывала моладзь. На прамысловых прадпрыемствах, транспарце і ў будаўніцтве больш за 6 тысяч юнакоў і дзяўчат спаборнічалі за павышэнне прадукцыйнасці працы і якасці прадукцыі. У горадзе было 176 камсамольска-маладзёжных брыгад. Моладзь вызначалася наватарствам і ініцыятывай (як, напрыклад, маладыя прадзільшчыцы шаўковай фабрыкі Лазавікова і Галайда).

У 1955 г. выпуск прамысловай прадукцыі ў Магілёве павялічыўся ў параўнанні з 1950 г. ў 2,3 раза, а з 1946 г. — у 20,6 раза. Завод штучнага валакна да канца 5-й пяцігодкі даў у 10 разоў больш прадукцыі, чым уся прамысловасць дарэвалюцыйнага Магілёва. На яго долю прыпадала 1/3 валавой прадукцыі ўсёй прамысловасці вобласці.

За пасляваенныя гады прыкметна змянілася і камунальная гаспадарка. У горадзе пабудавана і ўведзена ў эксплуатацыю больш чым 55 тысяч м^2 жылля, добраўпарадкаваны вуліцы, палепшылася транспартнае абслугоўванне. У 1956 г. тут было ўжо 410 гандлёвых прадпрыемстваў, у тым ліку 170 магазінаў, 2 рэстараны, 31 сталовая, 16 закусачных. Дзейнічалі 71 майстэрня бытавога абслугоўвання і 15 аддзяленняў сувязі. У 1955 г. ў 21-й школе навучалася 13 825 дзяцей (у 1945 у 12-і — 7200). Але і такая колькасць школ не задавальняла патрэб горада. У 1953 г. ў сувязі з ліквідацыяй настаўніцкага інстытута падрыхтоўкай кадраў займаліся педінстытут і педагагічнае вучылішча. Спецыялістаў для народнай гаспадаркі і культуры рыхтавалі яшчэ 9 тэхнікумаў і спецыяльных вучылішчаў.

Штогод пашыралася сфера ўстаноў культурнага абслугоўвання. Да паслуг магіляўчан былі драмтэатр, 3 кінатэатры, 5 дамоў культуры і рабочых клубаў, каля 100 чырвоных куткоў на прадпрыемствах, 138 масавых і прафсаюзных бібліятэк. 13.1.1952 г. адкрыўся абласны тэатр народнай творчасці. У 144 гуртках мастацкай самадзейнасці займаліся 4090 гараджан.

У 1956 г. Магілёў за высокія тэмпы і аб'ёмы будаўніцтва жылля і аб'ектаў культуры быў прызнаны пераможцам у сацыялістычным спаборніцтве сярод гарадоў рэспублікі.

Пасля вераснёўскага (1953) пленума ЦК КПСС па пытаннях уздыму сельскай гаспадаркі на работу ў вёску з Магілёва паехалі 883 чалавекі. У 1954 г. гарадскія прадпрыемствы, установы і арганізацыі шэфствавалі над 56 калгасамі і 11 МТС вобласці. 24 кастрычніка таго ж года ў горадзе адкрылася абласная сельскагаспадарчая выстаўка, на якой больш за 150 калгасаў, МТС і саўгасаў дэманстравалі свае дасягненні.

Працоўныя Магілёва, як і ўсе савецкія людзі, удзельнічалі ў асваенні цалінных і залежных зямель. У Казахстан і Алтай выехалі 3950 чалавек; на цаліну накіроўваліся будаўнічыя матэрыялы, электраматоры, мэбля, швейныя вырабы.

Далейшага ўдасканалення патрабавала матэрыяльна-тэхнічная база горада. Дзеля гэтага былі ажыццёўлены 152 буйныя мерапрыемствы па мадэрнізацыі абсталявання і ўкараненні новай тэхналогіі. Вялікую ролю адыгралі тут рацыяналізатары і вынаходнікі. Рух наватараў у тыя гады стаў масавым. У Магілёўскім паравозным дэпо, напрыклад, кожны дзесяты з'яўляўся рацыяналізатарам, на заводзе «Строммашына» — кожны пяты. Работніца завода штучнага валакна імя Куйбышава М.Пехцерава ўдасканаліла свой вытворчы працэс і пачала здымаць за змену па 10 кг шоўку звыш нормы. За кошт укаранення ў вытворчасць рацыяналізатарскіх прапаноў і вынаходстваў у прамысловасці, будаўніцтве і на транспарце ў 1959 г. была атрымана ўмоўная эканомія 15,1 млн. рублёў.

Спаборніцтва хутка атрымала новы напрамак: на ўсіх прадпрыемствах разгарнулася барацьба за права называцца калектывамі камуністычнай працы. У 1960 г. ў Магілёве ў гэтым руху ўдзельнічалі каля 15 тысяч чалавек. Брыгадзір інструментальнага цэха металургічнага завода імя Мяснікова М.Т.Кузьмянкоў першым у горадзе па прыкладу В.Гаганавай перайшоў у адстаючую брыгаду. Услед за ім такія калектывы ўзначалілі 26 перадавых майстроў і брыгадзіраў. Лепшы вопыт перадавікоў укараняўся ў вытворчасці. У Магілёўскім паравозным дэпо, напрыклад, у пачатку пяцігодкі цяжкавагавыя грузавыя саставы вадзіў толькі адзін машыніст Качмароў, а ў 1959 г. так працавалі ўсе машыністы. Брыгада І.С.Самусевіча на ўчастку Магілёў—Асіповічы правяла з апярэджаннем графіка і механічнай хуткасці здвоены поезд вагой 3533 т, перавысіўшы норму ў 2,5 раза.

Змяніўся і профіль гарадскіх прадпрыемстваў. Лакамабільны завод упершыню ў краіне пачаў выпускаць электрапад'ёмныя краны і быў перайменаваны ў завод пад'ёмна-транспартнага абсталявання імя Кірава. Завод «Электрарухавік» стаў выпускаць прадукцыю больш шырокага прызначэння, розныя тавары народнага спажывання. На «Строммашыне» з'явіліся доследныя ўзоры канвеера

для беспракладнай вытворчасці шыферу, што дазволіла давесці яго прадукцыйнасць да 820 лістоў у гадзіну і аўтаматызаваць увесь працэс. Скансгруявана і запушчана ў вытворчасць адна з першых у краіне машын па вырабу азбестацэментавых труб, якая дазваляла поўнасцю аўтаматызаваць тэхналагічны працэс. На заводзе штучнага валакна ў 1957 г. адкрылася вытворчасць цэлафану, у 1960 г. — штапельнага валакна. Скрэперы і пад'ёмныя краны, машыны і агрэгаты для будаўнічай індустрыі, электраматоры, штучны шоўк, цэлафан і многія іншыя тавары народнага спажывання ішлі ва ўсе рэспублікі. А прадпрыемствы Магілёва атрымлівалі сыравіну і камплектуючыя вырабы.

Паводле перапісу насельніцтва 1959 г., у Магілёве было 121 712 жыхароў. Рост насельніцтва ставіў новыя задачы перад гарадской гаспадаркай. У лютым 1958 г. 7-я сесія гарадскога Савета дэпутатаў працоўных абмеркавала і адобрыла новы план развіцця абласнога цэнтра. Вялікая ўвага ў ім надавалася далейшаму павелічэнню жыллёвага будаўніцтва, расшырэнню матэрыяльна-тэхнічнай базы будаўнічых арганізацый і ўмацаванню іх кадрамі.

На заводзе жалезабетонных вырабаў, які быў узведзены ў 1957 г., праз 3 гады пачаў працаваць цэх буйнапанельнага домабудавання. На рыштаванні горада прыйшло больш як 2000 маладых добраахвотнікаў. За пяцігоддзе будаўнікі здалі ў эксплуатацыю 71 877 м^2 жылой плошчы. Каля 1500 сем'яў атрымалі кватэры. Горад непазнавальна змяніўся. У яго добраўпарадкаванш актыўны ўдзел прымалі самі магіляўчане. Яны адпрацавалі на пасадцы дрэў і кустоў, ачыстцы вуліц і плошчаў звыш 74 тысяч чалавека-дзён. 10.10.1959 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё новага жалезабетоннага моста цераз Дняпро замест драўлянага.

У завяршальным годзе пяцігодкі ў Магілёве прымалі наведвальнікаў 179 магазінаў, 2 рэстараны, 2 кафэ, 34 сталовыя, дамавая кухня і шэраг іншых гандлёва-бытавых устаноў. На Першамайскай вуліцы гасцінна адчыніў дзверы Цэнтральны універмаг.

Актыўна развівалася і сфера народнай адукацыі, пашыралася сетка культурных устаноў. У горадзе працавалі 32 дзённыя і вячэрнія школы, якія наведвалі больш чым 25 тысяч дзяцей, юнакоў і дзяўчат. Акрамя гэтага, звыш 10 тысяч чалавек займаліся ў 3 будаўнічых школах, у тэхнічным і чыгуначным вучылішчах, у 2 вучылішчах механізацыі сельскай гаспадаркі, фельчарска-акушэрскай і фармацэўтычнай школах, музычным, дашкольным, педагагічным і культурна-асветным вучылішчах, машынабудаўнічым і будаўнічым тэхнікумах, педінстытуце. Каб забяспечыць патрэбу ў інжынерных кадрах, у верасні 1960 г. пры педінстытуце быў адкрыты агульнаадукацыйны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута. Магілёў стаў горадам студэнтаў і школьнікаў: кожны трэці яго жыхар вучыўся. І, натуральна, патрабавалася ўсё больш педагагічных кадраў. Калі ў 1944 г. ў горадзе было 176 настаўнікаў, то ў 1958/59 навучальным годзе — больш за 700. Большасць з іх мела вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю. Звыш паловы настаўнікаў — выпускнікі Магілёўскага педінстытута. Шмат педагогаў-магіляўчан былі ўдастоены ганаровага звання Заслужаны настаўнік Беларусі і ўзнагароджаны значком «Выдатнік народнай адукацыі». Сярод іх Г.С.Плотнікаў — дырэктар СШ № 11, В.Г.Часцякова — настаўніца пачатковых класаў СШ № 3 і іншыя.

За 1956—60 гг. значна пашырылася сетка культурна-асветных устаноў. Пабудаваны дамы культуры на заводах штучнага валакна імя Куйбышава, пад'ёмна-транспартнага абсталявання імя Кірава, на швейнай фабрыцы імя Валадарскага і чыгуначным вузле. Працавала 12 клубаў прафсаюзаў, больш за 100 чырвоных куткоў. У гарадскіх установах культуры былі створаны 32 харавыя, 25 танцавальных, 25 драматычных, 34 музычныя і больш за 70 іншых гурткоў мастацкай самадзейнасці, у якіх займаліся 5000 маладых рабочых і навучэнцаў. Адкрыўся новы, 4-ы ў горадзе, кінатэатр.

Расшырылася і бібліятэчная сетка. Акрамя 2 абласных і 6 гарадскіх у Магілёве адкрыліся 2 дзіцячыя і 138 ведамасных бібліятэк. Кніжны фонд іх складаў 500 тысяч тамоў. Гараджане часта сустракаліся з вядомымі беларускімі паэтамі і пісьменнікамі. Не раз наведваў Магілёў К.Сіманаў, які лічыў яго сваёй другой радзімай, прыязджалі С.С.Смірноў, І.П.Шамякін і іншыя літаратары.

Паляпшалася медыцынскае абслугоўванне насельніцтва. У 1960 г. ў горадзе працавалі 5 бальніц, 4 паліклінікі, 14 урачэбных і 35 фельчарскіх пунктаў, медсанчасць на заводзе штучнага валакна, 6 дыспансераў, станцыя хуткай дапамогі, дом дзіцяці, 2 санэпідстанцыі і 14 аптэк. Колькасць медработнікаў вы-

расла ў параўнанні з 1941 г. больш чым удвая.

За паўтара дзесяцігоддзя з руін і попелу ўзняўся практычна новы Магілёў, які стаў адным з буйнейшых індустрыяльных і культурных цэнтраў рэспублікі. І перспектывы яго развіцця здаваліся светлымі.

Аднак грамадства існавала ва ўмовах камандна-адміністрацыйнай сістэмы кіравання, калі напрамак развіцця народнай гаспадаркі краіны, духоўнае жыццё народа вызначаліся дырэктыўнымі ўстаноўкамі з'ездаў КПСС. Да сярэдзіны 70-х гадоў гэта сістэма стала тормазам эканамічнага, сацыяльнага і духоўнага развіцця краіны, у тым ліку і Магілёва.

Горад у 1960—80-я гг. развіваўся ў поўнай адпаведнасці з планавымі заданнямі сямігодкі (1959—65), восьмай (1966—70), дзевятай (1971—75), дзесятай (1976—80), адзінаццатай (1981—85) і дванаццатай (1986—90) пяцігодак.

У гады сямігодкі ў гаспадарцы г. Магілёва адбывалася паскоранае развіццё прамысловасці, будаўніцтва, гарадскога транспарту, ішла рэканструкцыя фабрык і заводаў, якія асвойвалі новыя віды вырабаў. Прадпрыемствы набылі вялікія магчымасці для выкарыстання мясцовых рэсурсаў.

У пачатку 60-х гадоў у горадзе было ўжо больш як 20 буйных прамысловых прадпрыемстваў: ЦЭЦ, заводы пад'ёмна-транспартнага абсталявання (пазней аўтазавод) імя Кірава, «Строммашына», металургічны імя Мяснікова, «Электраруховік», рамонтны, цагельны № 8, буддэталей, жалезабетонных вырабаў, клеявы, штучнага валакна імя Куйбышава, гарбарны, малочны, рэгенератарны, піваварны, «Чырвоны металіст» і інш., швейная імя Валадарскага, трыкатажная, стужкаткацкая, абутковая, мэблевая фабрыкі, млын- і мясакамбінаты, будтрэст № 12 і друкарня імя Свярдлова. На многіх з іх вялася рэканструкцыя, мяняўся характар вытворчасці, шырока механізавалася праца. На металургічным заводзе імя Мяснікова, напрыклад, у кастрычніку 1961 г. ўпершыню ў СССР асвоены паўняспынны спосаб адліўкі чыгунных водаправодных труб. Ініцыятарамі і актыўнымі ўдзельнікамі яго былі Р.С.Архіпаў, на той час галоўны інжынер завода, інжынеры К.Мыславец, Е.Самусеў, І.Н.Ціхаміраў, рабочыя С.Бегуноў і П.Нікіфараў. Паўняспынная адліўка водаправодных труб дазволіла ўтрая павысіць прадукцыйнасць працы, у 4 разы скараціць колькасць рабочых, занятых у вытворчым працэсе, значна павысіць якасць труб і карэнным чынам палепшыць умовы працы.

Пасля рэканструкцыі змяніў свой профіль завод пад'ёмна-транспартнага абсталявання. Ён быў ператвораны ў трэці Беларускі аўтазавод (МаАЗ). Калектыў «Строммашыны» асвоіў вытворчасць аўтаматычных паточных ліній для вырабу падвясных электраізалятараў і ролікаў, прэс-аўтаматаў для прасавання электраўстановачнага фарфору, станкоў для ўпакоўкі мяккадахавых матэрыялаў і пасажырскіх ліфтоў, вытворчасць якіх пазней была перададзена спецыялізаванаму ліфтабудаўнічаму заводу.

Трэба сказаць, што «Строммашына» была унікальным прадпрыемствам СССР па вытворчасці машын і абсталявання для азбацэ-



Дом быту.

ментнай і шыфернай прамысловасці, а аўтаматычныя лініі для беспракладачнага вырабу азбестацэментных лістоў лічыліся самымі лепшымі не толькі ў краіне, але і за мяжой. На аўтазаводзе адкрылася вытворчасць скрэпераў і аўтацягачоў аднавосевых, на заводзе «Электрарухавік» — асінхронных электрарухавікоў 5-га габарыту з алюмініевай абмоткай. Акрамя таго, у Магілёве здадзены ў эксплуатацыю завод па рамонце складанай бытавой тэхнікі.

Такія поспехі ў развіцці эканомікі горада былі дасягнуты дзякуючы самаадданай працы рабочых, інтэлігенцыі, служачых. У прамысловасці толькі за 7 гадоў атрымалі распаўсюджанне больш за 40 розных пачынаў; найбольшае — рух брыгад і ўдарнікаў камуністычнай працы. Першымі ў Магілёве ўключыліся ў гэта спаборніцтва брыгады Андрэя Хадзько, Данілы Лабкоўскага з аўтазавода імя С.М.Кірава, Васіля Тарасевіча з завода «Строммашына». Рабочыя, ІТР і служачыя выкарыстоўвалі любыя магчымасці, каб павысіць веды, прафесійнае майстэрства.

На многіх прадпрыемствах быў падхоплены пачын стругальшчыка Мінскага завода аўтаматычных ліній Леаніда Патаповіча: «Вывучыўся сам — навучы іншага», накіраваны на масавае ўкараненне перадавых метадаў працы, павышэнне кваліфікацыі. Члены адной з брыгад завода «Электрарухавік» Н.Навіцкі, С.Навіцкі, С.Гольдзін, І.Зуеў, П.Какарэнка навучылі перадавым метадам працы 11 чалавек. У 1964 г. на заводзе перадавалі свой вопыт маладым рабочым ужо 142 перадавікі вытворчасці. Вялікі ўклад у развіццё гэтага пачыну ўнёс брыгадзір слесараў завода імя С.М.Кірава Георгій Шпакоўскі, які асабіста падрыхтаваў 15 рабочых высокай кваліфікацыі. На гэтым жа заводзе ініцыятыву Г.С.Шпакоўскага падтрымалі брыгадзіры А.Н.Астапенка і В.І.Копышаў, майстар участка І.А.Караткевіч. У 1963 г. 157 высококваліфікаваных рабочых завода дапамаглі павысіць майстэрства 211 рабочым. Рацыяналізатары завода «Электрарухавік» сканструявалі электраматор АО-2 і кампактны малагабарытны прайгравальнік ЭПУ-15с, якія не ўступалі лепшым замежным узорам. Рабочыя Е.М.Дзегцяроў і В.К.Гаўрыленка стварылі паўаўтамат для зачысткі завусеніц на пластмасавых дэталях (электравыключальніках, разетках і г.д.). З яго дапамогай адзін рабочы апрацоўваў за змену 18 тысяч дэталей замест 600. Е.М.Дзегцярову за гэта было прысуджана 1-е месца ў рэспубліканскім спаборніцтве рацыяналізатараў. У 1964 г. паўаўтамат дэманстраваўся на ВДНГ у Маскве. На тым жа прадпрыемстве ўпершыню ў Беларусі ў маі 1961 г. створана брыгада па ўкараненні рацыяналізатарскіх прапаноў, якая працавала на грамадскіх асновах. Узначаліў яе слесар Ф.Д.Завіша. За 5 наступных гадоў брыгада ўкараніла ў вытворчасць 52 рацыяналізатарскія прапановы з эканамічным эфектам 31,6 тыс. рублёў. У 1965 г. па прыкладу Ф.Д.Завішы працавала 11 комплексных брыгад. Былі яны і на аўтазаводзе імя С.М.Кірава, металургічным заводзе імя Мяснікова, «Строммашыне» і г.д. Крыху пазней Ф.Д.Завіша атрымаў ордэн Леніна, а аднаму з актыўных наватараў вытворчасці завода Р.Ш.Століну было прысуджана ганаровае званне Заслужаны рацыяналізатар БССР. Бронзавымі медалямі ВДНГ СССР узнагароджаны рацыяналізатары В.П.Ляляеў і Г.Я.Лішанскі.

На заводзе «Строммашына» рабочы В.Я.Лелікаў сканструяваў пнеўматычную машыну для слясарна-даводачных работ, якая цалкам механізавала працы інструментальшчыкаў, а таксама пнеўматычныя нажніцы для рэзкі металу (гэта вынаходства ўкаранілі і на іншых металаапрацоўчых прадпрыемствах горада). Вынаходнікі-строммашаўцы А.М.Наўменка, Ю.В.Мацвееў, І.Ф.Сарока стварылі паточную аўтаматычную ротарную лінію па вытворчасці ўстановачнага фарфору. Агрэгат, які займаў усяго 1,5 м^2, забяспечваў вытворчасць. Наватары аўтазавода імя С.М.Кірава Ф.Н.Райкоў, В.С.Рагачоў, С.В.Сакалоўскі за распрацоўку тэхнічных навінак былі ўзнагароджаны бронзавымі медалямі ВДНГ. Рацыяналізатар В.С.Вяжэвіч сканструяваў станок па вырабу крыл аўтацягача і тым самым ліквідаваў ручную працу на гэтай аперацыі.

Першая палова 1960-х гг. адзначана далейшым развіццём горадабудаўніцтва, камунальнай гаспадаркі, медыцынскага абслугоўвання, народнай адукацыі і культуры. У гэты час пачалася забудова мікрараёнаў Мір-1, Мір-2, пр. Пушкіна. У 1968 г. з'явілася першае жыллё ва ўсходнім прамысловым раёне (мікрараён Юбілейны). За 6 гадоў (1960—65) быў узведзены 91 шматкватэрны дом з агульнай жылой плошчай 141 200 м^2. Працягваліся добраўпарадкаванне і рэканструкцыя вуліц горада, былі здадзены ў эксплуатацыю 2 масты (цераз Дняпро і Дубровенку), 4 пуцеправоды. Праўда, рэканструкцыя вуліц вялася даволі марудна: з 344,3 км было заасфальтавана ў той час толькі 50,4 км. У гэтыя

гады пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю бальніца на 150 ложкаў і паліклініка на чыгуначным вузле, інфекцыйная бальніца на 200 ложкаў, паліклінікі № 2, 3, 4, 5, абласная і гарадская санэпідстанцыі, харчблокі медсанчасці завода штучнага валакна і псіханеўралагічнай бальніцы, дапаможны корпус гарадской бальніцы, дыягнастычны корпус дзіцячай бальніцы, шэраг аптэк, зроблена прыбудова да дома дзіцяці на 75 месцаў.

На 1 студзеня 1967 г. ў Магілёве дзейнічалі 11 бальніц (з улікам стацыянараў, дыспансераў і дзіцячага санаторыя, агульная колькасць ложкаў у іх складала 4025), 17 паліклінік, 6 дыспансераў, 3 санэпідстанцыі, 3 жаночыя кансультацыі, станцыі хуткай дапамогі і пералівання крыві, 52 урачэбныя і фельчарскія пункты.

У горадзе працавалі 704 урачы, 2040 чалавек сярэдняга медперсаналу і больш як 200 чалавек малодшага і рабочага медперсаналу. І ўсё ж, нягледзячы на гэта, у ахове здароўя заставалася шмат вострых праблем.

Развіваліся народная адукацыя і культура. У 1966/67 навучальным годзе ў 27 сярэдніх школах горада навучалася 28 611 дзяцей, акрамя таго, працавалі 2 школы-інтэрнаты (624 выхаванцы), 11 вячэрніх школ рабочай моладзі (3705 юнакоў і дзяўчат), а таксама 55 дзіцячых дашкольных устаноў (у іх выхоўваліся больш за 3 тысячы малышоў). У гэтых установах працавалі 1500 настаўнікаў і выхавальнікаў. У сярэдзіне 60-х гадоў у Магілёве дзейнічалі 4 кінатэатры, драматычны тэатр, 16 дамоў культуры і рабочых клубаў, 46 бібліятэк, 2 музеі, 4 народныя самадзейныя мастацкія калектывы.

У 1967 г. жыхары горада выпісвалі 193 тысячы экзэмпляраў газет і часопісаў, у кватэрах было больш як 20 тысяч тэлевізараў і 31 тысяча радыёкропак.

Гандлёвая сетка г. Магілёва ў сярэдзіне 60-х гадоў складалася з 207 прадуктовых, прамтаварных, агароднінных, кніжных і іншых магазінаў, 178 ларкоў, 10 павільёнаў. У грамадскім харчаванні дзейнічалі 51 сталовая, 6 рэстаранаў, 5 кафэ, 6 магазінаў кулінарыі, 2 дамавыя кухні, 106 чайных-закусачных. На прадпрыемствах гандлю, грамадскага харчавання і на аптовых базах было занята 5967 магіляўчан.

У 1967 г. пачалося ўзвядзенне прыбудовы да Цэнтральнага універмага, а на вул. Цімірязеўскай — будынка Цэнтральнага рынку.

З 1966 г. на прадпрыемствах Магілёва, як і па ўсёй краіне, стала праводзіцца гаспадарчая рэформа, якая павінна была пры захаванні цэнтралізаванага кіравання ўзмацніць ролю эканамічных рычагоў, пашырыць гаспадарчую самастойнасць і разняволіць ініцыятыву прадпрыемстваў, павысіць іх матэрыяльную зацікаўленасць у выніках сваёй дзейнасці. У тым жа годзе на новую сістэму планавання і эканамічнага стымулявання перайшлі ў эксперыментальным парадку аўтамабільны завод імя С.М.Кірава і Магілёўскі млынкамбінат. Гэты пераход значна павысіў эфектыўнасць вытворчасці. За першы год работы ў новых умовах калектыў МаАЗа атрымаў на 24% больш прыбытку, чым у 1965 г., рэнтабельнасць павялічылася на 23%, а адлічэнні ў фонд матэрыяльнага заахвочвання — у 2 разы. На жаль, у 9-й і наступных пяцігодках гаспадарчая рэформа была згорнута і зноў узялі верх камандна-адміністрацыйныя метады кіравання эканомікай.

У 8-й жа пяцігодцы ў Магілёве высокімі тэмпамі працягвала развівацца прамысловасць: будаваліся буйнейшыя ў краіне прадпрыемствы, асвойваліся новыя віды прадукцыі; разам з ростам насельніцтва паскаралася будаўніцтва жылля, устаноў народнай адука-



Палац культуры і тэхнікі вытворчага аб'яднання «Хімвалакно».

цыі, культуры, навукі, удасканальвалася камунальная гаспадарка.

За 30 гадоў (1960—90) у горадзе з'явіліся больш як 40 прамысловых прадпрыемстваў. У вялікіх маштабах рэканструяваліся, тэхнічна пераазначаліся, мянялі профіль прадпрыемствы, пабудаваныя да 1960 г. Найбольш прыкметныя з іх — хімкамбінат «Зара», завод «Чырвоны металіст», стужкаткацкая фабрыка, будаўнічы трэст № 17 «Лаўсанбуд», які пабудаваў буйнейшы ліфтавы завод, завод зборнага жалезабетону № 7, камбінат сілікатных вырабаў, Магілёўская ЦЭЦ-2, заводы жалезабетонных вырабаў, «Тэхнаприбор», тэхналагічных металаканструкцый, «Зеніт», «Магілёўсельмаш», адзін з першых у СССР завод па перапрацоўцы бытавых адходаў, завод напіткаў, клеявы (жалацінавы), штучнага валакна, металургічны, піўны, «Электрарухавік», «Строммашына», аўтамабільны, маторарамонтны, а таксама швейная і абутковая фабрыкі.

Самым буйным з прамысловых прадпрыемстваў, уведзеных у строй у 1971 г., стаў камбінат сінтэтычнага валакна (зараз МВА «Хімвалакно»). На ім працавалі каля 28 тысяч рабочых, ІТР і служачых. Камбінат «Хімвалакно» дапамагалі будаваць спецыялісты з многіх рэспублік (больш за 6 тысяч чалавек 17 нацыянальнасцей). У студзені 1970 г. лонданскі штотыднёвік «Сандзі Таймс» у артыкуле «Гігант пад Магілёвам» пісаў, што пераўтварэнне Магілёва ў буйнейшы прамысловы цэнтр, ды яшчэ ў такія тэрміны — справа нялёгкая, асабліва калі ўлічыць, што ўсё пачыналася з нуля. У заключэнне прыводзілася выказванне кіраўніка праекта Магілёўскага камбіната ад фірмы «Сі-Джы-Бі» Рэліса: «Зрабіць тое, што рускія зрабілі ў Магілёве, — гэта сапраўды подзвіг». 5.10.1968 г., праз 2 гады пасля закладкі «першага каменя» ў фундамент прадпрыемства, у цэху доследных установак было атрымана першае сінтэтычнае валакно. 30.3.1970 г. дзяржаўная камісія падпісала акт аб прыёмцы галоўнага корпуса, які ўключаў звыш 70 аб'ектаў. Асноўныя фонды ВА «Хімвалакно» склалі больш чым 1,2 млрд. рублёў. Кіраваў узвядзеннем камбіната і будаўнічым трэстам № 17 «Лаўсанбуд» цудоўны арганізатар П.П.Цімашэнка, які стаў потым Героем Сацыялістычнай Працы, Заслужаным будаўніком Беларусі, ганаровым грамадзянінам г. Магілёва.



Медыцынскі цэнтр.

Бясспрэчна, такі хімічны гігант адмоўна паўплываў на экалогію горада. Але калі паглядзець на справу інакш, відавочна, што яго дзейнасць значна паскорыла развіццё Магілёва, чаго гарадскі бюджэт не змог бы адолець. Так з'явіліся гарадскія ачышчальныя збудаванні, абласная бальніца, дзіцячая паліклініка № 4, паліклініка № 8, 2 стаматалагічныя паліклінікі, Палац культуры і тэхнікі, дзіцячы парк, камбінат грамадскага харчавання са сталовымі і рэстаранам «Ясень», універсам, універмаг, 25 дзіцячых садоў, мноства жылых дамоў у Задняпроўі (кватэрамі ў іх забяспечана сёмая частка насельніцтва Магілёва), АТС, санаторый-прафілакторый «Сосны», дзіцячая малочная кухня. Камбінат выдзеліў 17 млн. рублёў на будаўніцтва тралейбуснага дэпо і яго ліній, вучэбна-лабараторнага корпуса машынабудаўнічага і памяшкання тэхналагічнага інстытутаў.

За апошнія 25 гадоў у наменклатуры прадукцыі прадпрыемстваў Магілёва з'явіліся лаўсан, які прымяняецца як заменнік футра, штучнай скуры, а таксама пластмасы і сінтэтычныя смолы. Завод «Электрарухавік» за 8-ю пяцігодку асвоіў 52 новыя віды прадукцыі, завод штучнага валакна — вытворчасць віскознай абалонкі для сасісак, двухколернага штучнага шоўку і штапельнага валакна,

моцнай поліэтылцэлафанавай плёнкі (для цяпліц). Металургічны завод імя Мяснікова пачаў выпускаць танкасценныя электразварныя трубы; «Магілёўсельмаш» — універсальныя прычэпы ПІМ-40, раскідвальнікі цвёрдых угнаенняў, пагрузчыкі, аўтамабільныя паўпрычэпы; завод «Зеніт» з 1989 г. — касетныя стэрэамагнітафоны «Беларусь-410«С»; аўтазавод імя Кірава — 18-тонныя аўтасамазвалы грузападымальнасцю 23 тоны, прызначаныя для кар'ераў горназдабываючай прамысловасці (МаАЗ-7505).

Усяго за 11-ю пяцігодку (1981—85) прамысловасцю горада асвоены серыйны выпуск 560 новых відаў вырабаў. Завод «Строммашына» адзін забяспечваў будаўнічую індустрыю высокапрадукцыйнымі тэхналагічнымі лініямі па вырабу цэглы, шыферу, руберойду, азбацэментных труб. Аўтазавод імя Кірава асвоіў выпуск самазвальных аўтапаяздоў для падземных работ. За іх распрацоўку аўтарскі калектыў на чале з галоўным канструктарам, кандыдатам тэхнічных навук М.А.Сідаравым (М.К.Балюта, Г.М.Міронаў, В.В.Воўк, І.З.Лесман, М.Ф.Казей, А.Ф.Асіпчук, Л.Д.Літакоў, І.І.Пінчук і В.В.Карпінскі) удастоены Дзяржаўнай прэміі БССР.

Прадпрыемствам выдатнай якасці стала стужкаткацкая фабрыка. Тут дзейнічае савет па вывучэнні попыту на прадукцыю, якая накіроўваецца па 500 адрасах.

Магілёўскія пасажырскія ліфты можна ўбачыць у многіх адміністрацыйных будынках і жылых дамах соцень гарадоў Беларусі і за яе межамі.

Шырока вядома прадукцыя буйнейшага ў Магілёве вытворчага аб'яднання шаўковых тканін, а таксама Магілёўскай доследна-эксперыментальнай абутковай фабрыкі (штогод тут асвойваецца 65—70 новых мадэлей для дзяцей).

Да канца 80-х гадоў Магілёў вырас у буйны індустрыяльны цэнтр Беларусі. Яго энергетычная база забяспечваецца дзвюма ЦЭЦ. Машынабудаванне і металаапрацоўка базіруюцца на 16 буйных прадпрыемствах, хімічная і нафтахімічная прамысловасць — на 6. Будаўнічая індустрыя мае 12 найбольш важных вытворчасцей. Лёгкая, харчовая прамысловасць і бытавое абслугоўванне (акрамя сталовых, рэстаранаў і г.д.) прадстаўлены 22 аб'яднаннямі, заводамі і камбінатамі.

Шэраг прадпрыемстваў за высокія вытворчыя дасягненні, поспехі ў асваенні новай прадукцыі ўзнагароджаны ордэнамі СССР (завод «Электрарухавік» і камбінат «Хімвалакно» імя Леніна — ордэнамі Леніна, завод штучнага валакна імя Куйбышава — ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, завод «Строммашына» — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга). Ліфтабудаўнічаму заводу прысвоена званне прадпрыемства высокай культуры вытворчасці.

За вялікія дасягненні ў працы больш як 15 тысяч рабочых і служачых Магілёва ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР і каля 29 тысяч — Ганаровымі Граматамі Вярхоўнага Савета Беларусі. Тут шмат слаўных працаўнікоў. Добра вядомы імёны брыгадзіраў трэста № 17 «Лаўсанбуд» Е.Г.Екацярынічава, Т.Н.Прохарава і Героя Сацыялістычнай Працы А.У.Шатухінай; Героя Сацыялістычнай Працы, Заслужанага будаўніка Рэспублікі Беларусь, Ганаровага грамадзяніна горада, брыгадзіра комплекснай брыгады будтрэста



Вуліца Першамайская.



Фрагмент забудовы вуліцы Першамайскай. Рэстаран «Габрава».

№ 12 А.П.Старавойтава; вядомай ткачыхі вытворчага аб'яднання шаўковых тканін Т.Р.Дземідовіч; поўнага кавалера ордэнаў Славы, слесара завода «Электрарухавік» М.Ф.Сафонава; Героя Сацыялістычнай Працы, памочніка майстра завода штучнага валакна імя Куйбышава А.Н.Пінчук; перамотчыцы гэтага ж завода, заслужанага работніка прамысловасці Беларусі Н.П.Каралёвай; брыгадзіра слесараў трэста «Белэнерганаладка» Героя Сацыялістычнай Працы А.А.Падабеда; Героя Сацыялістычнай Працы Е.С.Белавусавай; лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР А.М.Ларыёнава; машыніста-інструктара лакаматыўнага дэпо, Героя Сацыялістычнай Працы В.А.Дзем'янкова; былых дырэктараў заводаў «Стромаўталінія» А.П.Таракіна і «Тэхнапрыбор» В.А.Шыбекі, швейнай фабрыкі І.С.Цітова і многіх іншых.

Да 1985 г. эканоміка і ўся гаспадарка Магілёва развіваліся вельмі хуткімі тэмпамі. Але ў наступныя пяць гадоў гэтыя тэмпы рэзка знізіліся, хаця па выніках работы 1983, 1984 і 1985 гг. горад выходзіў пераможцам ўсесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва і ўзнагароджваўся пераходнымі Чырвонымі Сцягамі ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ.

Насельніцтва Магілёва ў 1989 г. дасягнула 359 тыс. чалавек. У горадзе вялося вялікае жыллёвае будаўніцтва. У сувязі з гэтым у снежні 1979 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларусі быў утвораны трэці, Цэнтральны раён, які насяляла 107 тыс. чалавек. У яго межах размяшчаліся заводы «Электрарухавік», «Тэхнапрыбор», «Зеніт», гарбарны, рэгенератарны, рамонтны, сантэхзагатовак, будтрэст № 12, домабудаўнічы камбінат, амаль усе спецыялізаваныя мантажныя ўпраўленні, педагагічны інстытут, педагагічнае, музычнае і культурна-асветнае вучылішчы, бібліятэчны і будаўнічы тэхнікумы, шэраг ПТВ.

Значна расшырыліся старыя мікрараёны, выраслі новыя: Усход па пр. Дзімітрава, у раёне вытворчага аб'яднання шаўковых тканін, камбіната сілікатных вырабаў і «Магілёўсельмаша», завода «Тэхнапрыбор» і пас. Казіміраўка, які ўвайшоў у гарадскую мяжу.

Жыллёвы фонд г. Магілёва ў 1990 г. склаў 5225 тыс. м^2, г. зн. ён стаў у 5 разоў большы, чым у 1960 г. Тым не менш у 1989 г. будаўніцтва пачало скарачацца і ў пачатку 1990-х гг. Магілёў па забеспячэнні гараджан жыллём займаў апошняе месца ў рэспубліцы. У 1990 г. план па яго ўводзе быў выкананы ўсяго на 68%. Амаль спынілася ўзвядзенне дзіцячых устаноў, хоць толькі 3 школы з 39-і працуюць у адну змену і ў горадзе не хапае 29 тысяч вучнёўскіх месцаў. Ахова здароўя папоўнілася толькі лячэбна-дыягнастычным цэнтрам. Пачата, але амаль спынена рэканструкцыя гістарычнай часткі горада ў пешаходную зону. Большасць помнікаў архітэктуры на мяжы поўнага разбурэння.

Да 1987 г. даволі хутка развіваліся гарадскія транспартныя зносіны — перш за ўсё за кошт уводу новых і прадаўжэння старых тралейбусных і аўтобусных маршрутаў. Аднак ужо праз год практычна перастаў папаўняцца

парк тралейбусаў і аўтобусаў, з-за адсутнасці запасных частак склалася катастрафічнае становішча з іх рамонтам.

Няпростыя працэсы, якія пачаліся ў нашым грамадстве ў канцы 1980-х — пачатку 1990-х гг. — разрыў эканамічных сувязей паміж рэгіёнамі, што складваліся дзесяцігоддзямі, нарастанне інфляцыйных працэсаў, цяжкасці з грашовым абарачэннем, — адбіліся на ўсіх галінах народнай гаспадаркі, культурна-бытавым і сацыяльным жыцці насельніцтва ўсіх былых савецкіх рэспублік і, зразумела, горада Магілёва.

Крызісная сітуацыя склалася на спажывецкім рынку. Рост намінальных грашовых даходаў насельніцтва, не забяспечаных тавараміі, узмацніў ажыятажны попыт. Абвастрыліся інфляцыйныя працэсы, павялічвалася сярэднемесячная заработная плата працоўных, але яна не паспявала за ростам цэн. У снежні 1991 г. ў параўнанні са снежнем 1990 г. цэны ў дзяржаўным і кааператыўным гандлі выраслі больш чым удвая, а на калгасным рынку — у 2,7 раза.

На агульным падзенні жыццёвага ўзроўню гараджан адбіваліся рэзкае зніжэнне вытворчасці тавараў народнага спажывання і новыя з'явы, уласцівыя рыначнай эканоміцы, у прыватнасці беспрацоўе.

У 1991 г. аб'ём прамысловай вытворчасці Магілёва ў параўнанні з 1990 г. зменшыўся на 2,4%. Скарацілі выпуск прадукцыі 19 прадпрыемстваў, у тым ліку аб'яднанне шаўковых тканін (на 10,6%), ліфтабудаўнічы завод (на 7%), «Электрарухавік» (на 14,2%), металургічны (на 6,2%) і інш. Зніжэнне аб'ёму вытворчасці было характэрна для ўсіх прадпрыемстваў усіх галін прамысловасці. Прычына заставалася ранейшая — недапастаўка прадпрыемствамі-сумежнікамі сыравіны, матэрыялаў, камплектуючых вырабаў. Працэс станаўлення новых формаў гаспадарання не мог адразу радыкальна палепшыць дынаміку эканамічнага развіцця.

У параўнанні з 1990 г. на 1,8% знізіўся аб'ём вытворчасці харчовых тавараў. Зніжэнне вытворчасці тавараў народнага спажывання дапусцілі 18 прадпрыемстваў горада, ці 34,6%. Асноўная прычына — недахоп матэрыяльных рэсурсаў. У выніку насельніцтва Магілёва страціла 855 чалавека-дзён працоўнага часу.



Фантаны на Першамайскай вуліцы.

У гаспадарчым развіцці горада ў 1991 г. асаблівая роля адводзілася капітальнаму будаўніцтву. Агульная плошча жылых дамоў, уведзеных у дзеянне, склала 152 850 м^2. На сродкі грамадзян пабудаваны 9264 м^2 індывідуальнага жылля.

У 1992 г. працягваўся спад вытворчасці. Яе аб'ём скараціліся 37 прадпрыемстваў горада. Тавараў народнага спажывання было выпушчана (разам з алкагольнымі напіткамі) на 1 млрд. рублёў, ці на 0,5% менш мінулагоднягa. Вытворчасць харчовых тавараў скарацілася на 9,8%, нехарчовых — на 0,3%. Зменшылі вытворчасць спажывецкіх тавараў 33 прадпрыемствы горада.

Выпуск прадукцыі стрымліваўся не толькі разрывам гаспадарчых сувязей, незабяспечанасцю матэрыяльна-тэхнічнымі рэсурсамі, але і высокімі цэнамі, якія ўскладнілі яе збыт. Па-ранейшаму адчувальнымі былі страты працоўнага часу з-за недапастаўкі сыравіны, матэрыялаў, камплектуючых вырабаў і інш. Толькі за студзень—кастрычнік 1992 г. гэтыя страты склалі 59 168 чалавека-дзён, а з-за цяжкасцей са збытам прадукцыі — 73 214 чалавека-дзён. Усяго ж у той год вытворчасцю Магілёва не выраблена прадукцыі на 1082,9 млн. рублёў.

З 1993 г. практычна на ўсіх прадпрыемствах ішло падзенне вытворчасці. З буйных прадпрыемстваў ніводнае не павялічыла выпуск прадукцыі. «Хімвалакно» скараціла яго на 45%, «Магатэкс» — на 54%, завод імя Кірава — на 49%, ліфтабудаўнічы завод — на 60%, «Магілёўтрансмаш» — на 33%, а завод «Сроммашына» выпусціў усяго 18,4% прадукцыі ад узроўню папярэдняга года. Знізжаўся выпуск тавараў народнага спажывання (за год на 12,4%). А ў студзені — верасні 1995 г. ён адставаў ад студзеня—верасня 1994 г. на 21,6%, або на адзін трыльён рублёў.

Нестабільнасць работы прадпрыемстваў прывяла да значнага зніжэння аб'ёму вытворчасці, які ў супаставімых цэнах склаў у 1995 г. толькі 65% ад узроўню 1990 г. На прадпрыемствах асела нерэалізаванай прадукцыі больш чым на 300 мільярдаў рублёў. Запазычанасць горада за энергарэсурсы склала 178 мільярдаў рублёў. Стала практычна нормай, што прадпрыемства не працуе па некалькі тыдняў і месяцаў, катастрафічна растуць страты рабочага часу, скарачаецца колькасць працаўнікоў. У 1995 г. страты рабочага часу з-за прастояў склалі 1,4 мільёна чалавекадзён. А колькасць беспрацоўных павялічылася ў тры і да канца года дасягнула 50 тысяч чалавек.

Зразумела, што ў сувязі з гэтым зніжаюцца даходы насельніцтва, а цэны на спажывецкія і прамысловыя тавары безупынна растуць, што выклікае ў людзей няўпэўненасць у заўтрашнім дні. З'явілася тэндэнцыя да ўзнікнення мноства захворванняў, скарачэння нараджальнасці і павелічэння смяротнасці. На здароўі гараджан не маглі не адбіцца аварыя на Чарнобыльскай АЭС, неспрыяльная экалогія.

У 1990-я гг. адбыліся прыкметныя змены ў развіцці грамадскіх рухаў і партый горада. У 1992 г. адрадзіла дзейнасць гарадская арганізацыя Партыі камуністаў Беларусі. Яшчэ ў студзені 1991 г. зарэгістравана гарадская арганізацыя Беларускага народнага фронту,



Удзельнікі мастацкай самадзейнасці з Магілёўскага культасветвучылішча.



Удзельнікі ансамбля «Равеснікі».

якая стала адной з заснавальніц газеты «Ратуша», часопіса «Магілёўская даўніна». Праблемы нацыянальна-культурнага адраджэння знайшлі адлюстраванне ў дзейнасці культурна-асветнага маладзёжнага аб'яднання «Машэка». Пытаннямі адраджэння роднай мовы непасрэдна займаецца Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны.

Сярод палітычных партый і арганізацый у нацыянальна-культурным жыцці горада найбольш актыўна ўдзельнічалі Беларуская сацыялістычная грамада і Аб'яднаная дэмакратычная партыя Беларусі. У 1992 г. (на 1992/93 навучальны год) кожная школа горада мела праграму па адраджэнні беларускай мовы і нацыянальнай культуры, складзеную ў адпаведнасці з патрабаваннямі Закона аб мовах і Дзяржаўнай праграмы развіцця беларускай мовы. Праграма прадугледжвала растлумачэнне закона сярод навучэнцаў, бацькоў і грамадскасці, пераканаўча паказвала неабходнасць вывучэння роднай мовы як важнейшай часткі культуры беларускага народа.

Сярод аб'ектыўных цяжкасцей, з якімі сутыкнуліся органы народнай адукацыі ў рабоце па выкананні Закона аб мовах, быў шматнацыянальны склад насельніцтва горада. Невялікі працэнт пераводу на беларускую мову навучання тлумачыцца ў значнай ступені тым, што школы размешчаны ў раёне буйных прамысловых прадпрыемстваў (ПА «Хімвалакно», КШТ і інш.), дзе большасць працаўнікоў выказала пажаданне вучыць дзяцей на рускай мове.

З мэтай паглыбленага азнаямлення навучэнцаў з культурай беларускага народа, яго традыцыямі, абрадамі ў школах горада праводзяцца тыдні і месячнікі нацыянальнай культуры, конкурсы чытачоў, малюнкаў, інсцэніраваных казак, паходы па мясцінах, звязаных з жыццём вядомых людзей Бацькаўшчыны. У шэрагу школ працуюць фальклорныя ансамблі: «Чабарок» (СШ № 5), «Крыніца» (СШ № 13), «Святкі» (СШ № 30), музычныя гасцёўні (СШ № 33, 28, 35), лялечны тэатр «Несцерка» (класічная гімназія).

У 1992 г. ў горадзе створаны фальклорны ансамбль песні і танца «Краляны» пры ДК тэкстыльшчыкаў, фальклорная група «Адраджэнне» пры дзіцячай школе мастацтваў, праводзяцца народныя святы, Дні незалежнасці рэспублікі і інш.

У тым жа годзе адкрыты новы самадзейны тэатр пры Доме культуры будаўнічага трэста № 12 пад кіраўніцтвам Заслужанага работніка культуры Рэспублікі Беларусь В.Д.Бараноўскага. Своеасаблівым святам культуры стаў і пленэр па скульптуры з дрэва, які праходзіў у верасні—кастрычніку і сабраў прадстаўнікоў з усёй рэспублікі.

Прыкметнай падзеяй у культурным жыцці Магілёва стала адкрыццё мемарыяльнай дошкі ў гонар выдатнага дзеяча ўсходніх славян, гісторыка і філосафа, асветніка і палітыка, архіепіскапа Беларускага Георгія Каніскага (1717—95). У яго доме, які з'яўляецца помнікам архітэктуры 18 ст., размясціўся музей гісторыі горада.

У верасні 1990 г. зарэгістравана Таварыства яўрэйскай культуры, якое арганізавала работу дабрачыннай і маладзёжнай секцый, камітэта па аздараўленні дзяцей, нядзельную школу і інш. Упершыню пасля пяцідзесяцігадовага перапынку ў 1992 г. ў Магілёве быў адчынены першы яўрэйскі агульнаадукацыйны клас Фондам адраджэння беларускай і яў-



Спаборніцтвы па валейболе на стадыёне «Спартак».

рэйскай культуры «Адраджэнне». Гэта ўсё стала магчыма дзякуючы актыўнай дзейнасці сакратара праўлення Таварыства яўрэйскай культуры па міжнародных справах Ф.Е.Гальпер, старшыні фонду «Адраджэнне» В.Г.Шалектара, дырэктара дзіцячай дзяржаўнай школы мастацтваў Н.А.Піваварavай і ўсіх тых, хто прымаў непасрэдны ўдзел у стварэнні гэтай унікальнай школы, дзе беларускія і яўрэйскія дзеці знаходзяцца з 8 да 18 гадзін, бо заняткі праходзяць у форме гульні. У беларускіх класах навучанне вядзецца на беларускай мове, у яўрэйскіх — на рускай з вывучэннем іўрыту.

У 1990-я гады ў Магілёве прыкметна ажывіўся фізкультурна-спартыўны рух. Гэтаму садзейнічала павышэнне арганізатарскай ролі спартыўных таварыстваў «Спартак», «Дынама», клубаў «Тарпеда», «Лакаматыў», «Днепр», а таксама пашырэнне спартыўнай базы. Зараз такія таварыствы і клубы аб'ядноўваюць каля 300 калектываў фізкультуры, у якіх пастаянна займаюцца больш за 20 тысяч чалавек. Мясцовыя ўлады стараюцца развіваць спартыўную базу, таму што існуючая ўжо не задавальняе гараджан.

У 1990—95 гг. у калектывах фізкультуры падрыхтавана 43 майстры спорту міжнароднага класа, 209 майстроў, 496 кандыдатаў у майстры спорту, 3662 спартсмены 1-га разраду. Ёсць у Магілёве свае чэмпіёны і прызёры рэспубліканскіх, сусветных спаборніцтваў і Алімпійскіх гульняў.

Напрыклад, чэмпіёнамі летніх і зімовых Алімпійскіх гульняў, чэмпіёнамі і прызёрамі СССР і міжнародных спаборніцтваў у роз-



Лёгкаатлетычны крос



Н.Ермаловіч (2-я злева).

ныя гады былі Р.Ачкіна (лыжны спорт), І.Мікалуцкі (плаванне), С.Баітава (гімнастыка), І.Зубарэнка (акадэмічнае веславанне), А.Рыжанкоў і Н.Рыжанкова (біятлон), А.Біндасаў і Л.Барысенка (радыёспорт), Н.Ермаловіч (лёгкая атлетыка), В.Марозаў (скачкі на батуце), А.Марфель (стральба з лука), С.Гарлуковіч (футбол) і шмат іншых спартсменаў, якія праславілі сваімі перамогамі родны горад. На радзіме міжнароднага гросмайстра па шахматах Льва Палугаеўскага вырас яшчэ адзін гросмайстар Аляксей Фёдараў, які стаў чэмпіёнам Беларусі. Далёка за межамі Магілёва вядомы мужчынскія футбольныя каманды «Днепр» і «Тарпеда» і жаночая «Надзея». Футбол у Магілёве карыстаецца вялікай папулярнасцю. Тут сістэматычна праводзяцца спаборніцтвы сярод каманд прамысловых прадпрыемстваў, школ, сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў. Спартыўныя таварыствы і клубы, органы народнай асветы дбаюць пра тое, каб выхаваць добрую змену цяперашняму пакаленню спартсменаў. У горадзе працуюць 20 дзіцячаюнацкіх спартыўных школ, у якіх больш за 200 кваліфікаваных штатных трэнераў прывіваюць дзецям любоў да спорту. У гэтых школах займаецца каля 8,5 тысяч хлапчукоў і дзяўчынак. Вызначаецца сярод іх спецыяльная спартыўная сярэдняя школа алімпійскага рэзерву.

У апошнія гады ў эканамічным і палітычным жыцці абласнога цэнтра адбываюцца прыкметныя змены: ствараюцца сумесныя з замежнымі фірмамі арганізацыі, ідзе продаж аб'ектаў камунальнай уласнасці і прыватызацыя кватэр у дамах дзяржаўнага і грамадскага жыллёвага фонду. На жнівень 1997 г., напрыклад, прададзены 74 аб'екты грамадскага харчавання, гандлёвага і бытавога абслугоўвання, што складае 40% ад іх агульнай колькасці.

У цэлым жа ў эканамічным развіцці горада ў 1997 г. стала назірацца тэндэнцыя росту. З 74 дзяржаўных прамысловых прадпрыемстваў павялічылі выпуск тавараў народнага спажывання больш за 90%, узрасла вытворчасць харчовых і нехарчовых тавараў, а таксама бытавога і гаспадарчага прызначэння. Аднак застаюцца яшчэ дзесяткі стратных прадпрыемстваў. У гарадскім бюро па працаўладкаванні насельніцтва ў 1997 г. стаяла на ўліку больш за 4 тысячы беспрацоўных (усяго ў народнай гаспадарцы было занята каля 140 тысяч рабочых і служачых).

У 1997 г. ў Магілёве смяротнасць перавышала нараджальнасць. На 100 зарэгістраваных шлюбаў прыпадала амаль 90 разводаў.

Значныя змены адбываліся і ў культурным жыцці. У апошнія гады стала традыцыйным правядзенне на Дняпры мерапрыемстваў міжнароднага значэння. Музычны фестываль «Залаты шлягер» збіраў зорак эстрады з далёкага і блізкага замежжа, конкурс песні стаў сапраўды грандыёзным святам і для гараджан, і для гасцей. Магілёў абраны і месцам правядзення міжнароднага свята духоўнай музыкі «Магутны Божа». У гэтым своеасаблівым святе хрысціян прымалі ўдзел лаўрэаты конкурсаў папярэдніх гадоў з Расіі, Украіны, Польшчы, ЗША, Галандыі, іншых краін. Адкрыўся Магілёўскі мастацкі музей,

карцінная галерэя народнага мастака Беларусі П.В.Масленікава. Заўсёды цікава, творча праводзіліся ў Магілёве міжнародныя пленэры па жывапісу, прысвечаныя знакамітаму мастаку, земляку В.Бялыніцкаму-Бірулю. У жніўні 1997 г. да гэтай значнай падзеі прымеркавалі міжнародны фестываль народнай творчасці Беларусі, Расіі, Украіны і Польшчы, на якім нашу рэспубліку прадстаўляў народны ансамбль «Магілёўцы». Таленавітыя майстры-жывапісцы і фальклорныя калектывы сустракаліся з магіляўчанамі на канцэртных пляцоўках, наведалі яны і сельскіх жыхароў.

Цікава і разнастайна праводзяцца тут Дні беларускага пісьменства і друку, Дні ведаў, Свята горада, іншыя мерапрыемствы.

Е.Краўчынскі, А.Леўскі, У.Салашэнка.

Гартаючы падшыўкі

ПА СТАРОНКАХ АБЛАСНОЙ ГАЗЕТЫ «ЗА РАДЗІМУ»

20.9.1944 г.

БУДАЎНІЦТВА ПОМНІКА ГЕРОЮ САВЕЦКАГА САЮЗА ГЕНЕРАЛ-МАЁРУ І.С.ЛАЗАРЭНКУ

На цэнтральнай плошчы будучай планіроўкі горада Магілёва (парк каля кінатэатра «Чырвоная Зорка») пачата будаўніцтва помніка Герою Савецкага Саюза генерал-маёру І.С.Лазарэнку, які загінуў у баях за вызваленне горада Магілёва.

Ужо выкапан катлаван і закладзен фундамент помніка. Будаўніцтва помніка вядзе аблбудтрэст. Тэрмін заканчэння — 24 верасня гэтага года. У гэты дзень адбудзецца перанос з г. Крычава і пахаванне цела І.С.Лазарэнкі і адкрыццё помніка гэтаму слаўнаму сыну Радзімы.

16.11.1944 г.

ВЫНІКІ ДРУЖНАЙ ПРАЦЫ

Вугал Ленінскай вуліцы і Камсамольскага сквера. У нядзелю 12 лістапада тут працавала 10 брыгад. У брыгадзе тав. Лукашына — адны старыкі. Яны збіралі лом, складвалі ў штабялі выбраную з абломкаў цэглу. За 4 гадзіны заданне было выканана на 200 працэнтаў.

Бліскучых поспехаў дабілася брыгада т. Поварава (Дзяржбанк), якая выканала заданне на 332 працэнты. Больш чым у 2 разы выканалі норму выпрацоўкі работнікі абласнога аддзела сацыяльнага забеспячэння, дзе брыгадзірам т. Куляшова. На 25 прац. перавыканала заданне брыгада т. Караля.

За 4 гадзіны работы ўсе брыгады сабралі 3,5 тоны жалезнага лому, разабралі і склалі ў штабялі 1400 штук цаглін і спланіравалі 560 квадратных метраў плошчы.

Прараб О.А.Ільін.

МАГІЛЁЎ СУСТРАКАЕ ВОІНАЎ-ПЕРАМОЖЦАЎ **23.7.1945 г.**

Магілёўская пасажырская станцыя святочна ўбрана. Яна ўпрыгожана чырвонымі сцягамі, партрэтамі і лозунгамі, жывымі кветкамі.

Сёння сюды прыбыў першы эшалон з воінамі старэйшых узростаў, дэмабілізаванымі з Чырвонай Арміі. Верныя сыны Беларусі, свята выканаўшы свой абавязак перад Радзімай, вяртаюцца да сваіх сем'яў, да мірнай працы. Пад гукі аркестра павольна падышоў да перона цягнік. Сотні людзей кінуліся да вагонаў. Сустракаючыя ўглядаюцца ў абветраныя, мужныя твары родных і знаёмых.

Якое слаўнае баявое жыццё кожнага з іх!..

Для абслугоўвання дэмабілізаваных воінаў на станцыі адкрыты буфет, цырульня, пакой адпачынку, агітпункт.

Л.Глінко.

14.1.1946 г.

ПАБУДАВАЛІ МАГАЗІН І РЭСТАРАН

Каштоўную ініцыятыву праявілі калектыў работнікаў ОРСа і рабочыя будаўнічага ўчастка № 2 ст. Магілёў. Агульнымі сіламі яны пабудавалі вялікі будынак пад універмаг, а таксама аднавілі будынак станцыйнага рэстарана.

11.4.1946 г.

ДЗЕТСАД САНАТОРНАГА ТЫПУ

У Магілёве па ініцыятыве аблана адкрыт дзетсад санаторнага тыпу для хворых або слабых здароўем дзяцей. Дзіцячаму саду адведзен адзін з лепшых будынкаў горада, з паравым атапленнем і спецыяльнымі ваннымі пакоямі. Тут маюцца абсталяваныя спальні, сталовая, пакой для гульняў.

11.7.1947 г.

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ МАГІЛЁВА ПЕРАВЫКАНАЛА ПАЎГАДАВЫ ПЛАН

Прамысловасць горада Магілёва — саюзная, рэспубліканская, мясцовая, арцелі прамысловай і інваліднай кааперацыі 25 чэрвеня завяршылі паўгадавую праграму. На 1 ліпеня паўгадавы план перавыканан.

Гормалаказавод першым у горадзе выканаў гадавы план на 106 працэнтаў, косцеапрацоўчы завод выканаў 11-месячны план. Трубаліцейны завод імя Мяснікова завяршыў сямімесячную праграму. Калектыў швейнай фабрыкі імя Валадарскага выканаў паўгадавую праграму больш чым на 120 працэнтаў.

Значна перавыканалі паўгадавыя планы завод «Строммашына», абутковая фабрыка «1 Мая», цагельны завод № 7.

ПА СТАРОНКАХ ІНШЫХ ГАЗЕТ

ПЕРШЫЯ ЛАКАМАБІЛІ

«Звязда», 16.5.1947 г.

У лютым 1946 года на руінах былога аўтарамонтнага завода пачалося будаўніцтва першага ў Беларусі лакамабільнага завода. Гаспадарчым спосабам пачалі аднаўляць галоўны корпус. Праз 7 месяцаў паўднёвая яго частка ўжо была гатова для ўстаноўкі абсталявання...

Выпуск лакамабіляў — справа новая не толькі для Магілёва, але для ўсёй рэспублікі. Да першамайскага свята мы выпусцілі першыя тры машыны. К канцу пяцігодкі прадпрыемства дасць краіне каля тысячы лакамабіляў у 20 і 75 конскіх сіл кожны.

В.Чаркасаў, галоўны інжынер завода.

МАЛАДОСЦЬ ВЕТЭРАНА

«Звязда», 24.7.1965 г.

Магілёўскаму заводу «Строммашына» — 50 гадоў.

У 1962 годзе прадпрыемства ўпершыню ў сусветнай практыцы перайшло на серыйную вытворчасць аўтаматызаванай лініі для вытворчасці шыферных лістоў.

На працягу толькі трох гадоў гэтымі лініямі аснашчаны ўсе шыферныя прадпрыемствы краіны.

ДАТЭРМІНОВА

«Магілёўская праўда», 12.9.1965 г.

Магілёўскі завод «Электрарухавік» датэрмінова выконвае заказы Балгарскай Народнай Рэспублікі па вырабу электрапрыбораў.

З пачатку сёлетняга года балгарскім сябрам адпраўлена іх 610 штук.

МАГІЛЁВУ 700 ГОД

«Советская Белоруссия», 17.9.1967 г.

Могилев, 16 сентября (БелТА). Древний город над Днепром в праздничном убранстве. В чуть тронутую позолоту аллей, улиц и площадей вплетаются яркие кумачевые флаги, транспоранты и панно, разноцветные гирлянды, юбилейные эмблемы.

Могилеву исполнилось 700 лет.

Летний театр. Сюда на торжественную юбилейную сессию городского Совета совместно с партийными, общественными организациями и представителями Советской Армии, посвященную 700-летию города, прибыли новаторы производства, работники культуры, просвещения и здравоохранения, многочисленные гости.

Открыл сессию председатель горисполкома тов. Мануйло. Приветствовали могилевчан многие гости.

ЛІФТАБУДАЎНІЧЫ — У СТРАІ

«Магілёўская праўда», 27.1.1971 г.

У сакавіку 1967 года на будаўнічую пляцоўку ў паўночна-ўсходняй частцы абласнога цэнтра прыйшла комплексная брыгада А.І.Аляксандрава з будупраўлення № 92.

— Вельмі цяжка было на першых парах. Абагрэцца не было дзе, — расказвае брыгадзір. — Толькі вецер ды мяцеліца завывалі навокал. Не хапала будаўнікоў.

Дырэктар новага прадпрыемства Васіль Іванавіч Іерын накіроўваў на будаўнічую пляцоўку прынятых на завод слесараў, токараў, фрэзероўшчыкаў. Такіх працаўнікоў спачатку было 20, а потым усё больш і больш...

Людзі працавалі ў дзве змены, а то і ў тры. Потым, не чакаючы заканчэння будаўніцтва цэха, эксплуатацыйнікі пачалі ўстанаўліваць абсталяванне, а неўзабаве прыступілі і да вырабу асобных вузлоў ліфта.

Вялікай радасцю для будаўнікоў і эксплуатацыйнікаў быў выпуск ліфта № 1...

Так ішло на працягу ўсяго будаўніцтва. Не паспеюць будаўнікі здаць памяшканне пад адзелку, а заводскія рабочыя ўжо цягнуць сюды металаапрацоўчыя станкі, наладжваюць абсталяванне...

І вось сёння мы ідзём па пралётах новага корпуса плошчай у 20 тысяч квадратных метраў. Роўнымі радамі выстраіліся станкі, аўтаматычныя лініі. Завод аснашчаны па апошняму слову тэхнікі...

Першая чарга Магілёўскага ліфтабудаўнічага завода — у страі дзеючых прадпрыемстваў.

Т.Булынка.

ИСПЫТАНИЕ НА ПРОЧНОСТЬ

«Советская Белоруссия», 11.10.1975 г.

Теперь это уже стало историей... А было... Помню как в первом цехе началась установка пневматических ткацких станков... Днем тогда в цехе хозяйничали строители, ночью мы, ткачи... Холодно... Работали в телогрейках и перчатках. Не было тогда столовой, довольствовались тем, что приносили из дома. Горячему чаю радовались.

Первым всегда трудно. Но работали мы старательно, упорно и с подъемом.

В моем комплексе тогда было четыре человека, обслуживали мы 24 станка... С января этого года лично я стал обслуживать 48 ткацких станков, девчата — по 16. Бригада за 9 месяцев дала сверх плана свыше 60 тысяч метров тканей.

А.Андреев, пом. мастера Могилевского комбината шелковых тканей.

УЗНАГАРОДА НА СЦЯГУ ГОРАДА

«Магілёўская праўда», 8.5.1980 г.

7 мая ў Палацы культуры хімікаў адбылося ўрачыстае паседжанне гарадскога камітэта Кампартыі Беларусі і гарадскога Савета працоўных дэпутатаў сумесна с прадстаўнікамі калектываў працоўных і воінаў мясцовага гарнізона, прысвечанае 35-й гадавіне Перамогі і ўручэнню гораду Магілёву высокай узнагароды — ордэна «Отечественной войны» I ступені, які ўручыў першы сакратар ЦК КПБ П.М.Машэраў.

— Магілёў грудзьмі закрыў шлях ворагу да сталіцы нашай Радзімы на далёкіх да яе подступах, — казаў у сваёй прамове Пётр Міронавіч...

ИЗ ВОСПОМИНАНИЙ А.АЛЕКСАНДРОВА

«Трудовая слава», 19.10.1993 г.

Наконец, 5 ноября 1968 года напряженный труд многих сотен строителей, монтажников, наладчиков и работников комбината и опытного цеха увенчался получением первого синтетического волокна. В эти жаркие дни я поставил свой личный рекорд — 41 час работы не выходя из цеха...

ИЗ АНГЛИЙСКОГО ЖУРНАЛА «ПАНОРАМА»

«Трудовая слава», 24.8.1993 г.

...Построенный на зеленом поле размером с Гайдпарк Могилевский комбинат является самым большим предприятием по производству синтетических волокон в Европе.

Для тех, кто поехал в Могилев, строительство и пуск огромного завода по выпуску волокна совместно с русскими инженерами и техниками факт, ставший источником величайшего удовлетворения...

МЕЖДУНАРОДНАЯ НАГРАДА

«Магілёўская праўда», 12.6.1993 г.

За высокие достижения в области выпуска, профессионализма и качества продукции объединение «Химволокно» названо Международным отборочным комитетом одним из победителей ежегодно проводимого «Первенства Европы Международной Золотой Звезды». По этому случаю предприятие награждено «Международной Золотой Звездой», что позволило ему войти в элиту фирм — мировых экспертов продукции, отмеченных этой наградой раньше.

Объединение сотрудничает ныне с 68-ю зарубежными фирмами.

Теперь оно получило право на использование символа награды для рекламации своей продукции.

ИЗ ПАРИЖА — С НАГРАДОЙ

«Магілёўскія ведамасці», 5.7.1994 г.

Директору завода «Строммашина» Юрию Кривенку несколько дней назад в штабе мирового «Клуба лидеров торговли» в Париже вручены грамота и приз «За высокую технологию и качество продукции». Такой чести в текущем году удостоено одно предприятие Беларуси. Заводу предоставлено право и выданы слайды для маркировки своей продукции «Знаком международного признания». Это вроде знака качества для предприятий всех стран.

Марку «Строммашины» уже знают во многих странах мира — свою продукцию завод поставляет более чем в 20 государств — Индонезию, Пакистан, Египет, Бразилию, Германию, Францию, Италию...

МЫ ЎПЕРАДЗЕ

«Звязда», 13.4.1995 г.

Вучоныя Магілёўскага інстытута фізікі Акадэміі навук Беларусі стварылі новую высокатэхналагічную вытворчасць ветравога шкла «трыплекс».

— Мы зараз гатовы канкураваць з заходнімі вытворцамі шкла, — заявіў памочнік дырэктара «Еўрастандарт» В.Сівуха, — бо не ўступім ім па якасці, а цэны ўдвая меншыя за сусветныя.

Вызначыліся працай

Многія магіляўчане, кожны ў свой час, унеслі прыкметны ўклад у развіццё горада, вобласці, краіны. Іх працоўныя дасягненні былі адзначаны высокімі ўзнагародамі і ганаровымі званнямі былых СССР, БССР. І хоць ўжо не існуе тая дзяржава, дэвальвіраваліся яе ўзнагароды і званні, як і само паняцце «сацыялістычная праца», тым не менш павага да людзей, якія за сваю сумленную і самаадданую працу былі ўдастоены іх, застаецца. Далей у кнізе прыводзяцца біяграфіі магіляўчан, адзначаных вышэйшымі ўзнагародамі і ганаровымі званнямі, і нарысы пра іх.



Л.В.Аўсеенка.

ГЕРОІ ПРАЦЫ

АЎСЕЕНКА Лідзія Васілеўна. Нарадзілася 10.1.1914 г. ў в. Казіміраўка Магілёўскага р-на (цяпер у межах Магілёва). У 1945—71 гг. звеннявая па вырошчванні лёну ў калгасе імя Валадарскага Магілёўскага р-на. Званне Героя прысвоена ў 1949 г. за поспехі ў павелічэнні вытворчасці льнотрасты і льнасемя.

АЎСЕЕНКА Пелагея Максімаўна. Нарадзілася 5.11.1915 г. ў в. Казіміраўка Магілёўскага р-на (цяпер у межах Магілёва). З 1946 г. звеннявая па вырошчванні лёну ў калгасе імя Кірава, з 1956 г. даярка, у 1960—68 гг.

брыгадзір паляводчай брыгады калгаса імя Валадарскага Магілёўскага р-на. З 1968 г. зноў звеннявая па вырошчванні лёну. Званне Героя прысвоена ў 1949 г. за поспехі ў павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак ільну. Памерла 31.1.1975 г.

СІНЯЕ СВЯТЛО

... Лідзія Васілеўна спынілася ля льнянога поля, на якім яшчэ спачывалі шэрыя цені летняй ночы, і міжволі залюбавалася нараджэннем раніцы.

...Амаль з-пад самых ног Лідзіі Васілеўны ўспырхнуў жаўрук... Вось ён на імгненне павіс над лесам і тут жа ўзмыў у вышыню. І пралілася на зямлю непаўторная песня нябеснага птаха На зямлю, дзе ярка цвіў лён, які назаўсёды ўвайшоў у яе жыццё, стаў яе лёсам, як і лёсам яе сяброўкі — Пелагеі Максімаўны. І зараз, пайшоўшы на заслужаны адпачынак, ёй хацелася зноў убачыць, як цвіце лён, як цёплы вецер гоніць па шырокім полі блакітныя хвалі. Ад усяго ўбачанага неяк святлей станавілася ў акрузе, а з плячэй скідвалася добрых 30—40 год.

Успомнілася... Старшыня калгаса Ф.М.Донда прапануе Лідзіі Васілеўне заняцца вырошчваннем ільну.

— Культура гэтая даходная. За кошт яе можна хутчэй адрадзіць разбураную вайной гаспадарку, — гаварыў ён. — Наогул, збірай звяно і за справу.

— Але як жа я адна?

— Не адна, — супакоіў Лідзію Васілеўну старшыня. — Другое звяно ўзначаліць твая сяброўка Пелагея Аўсеенка.

З Пелагеяй Максімаўнай Лідзія Васілеўна сябравала даўно. Яшчэ больш зрадніліся, калі апошняя атрымала пахавальную на мужа. Так яны і ішлі па жыцці разам, поплеч. Цяпер і справа ў іх была агульная...

Перад пасяўной яны закончылі пры МТС курсы льнаводаў.

— Памятайце, — настаўляў будучых ільнаводаў галоўны аграном МТС Садоўскі, — карміць трэба не глебу, а кожную расліну. Так вучыў яшчэ акадэмік Вільямс.

Пасля вучобы пачаліся клапатлівыя дні нарыхтоўкі ўгнаенняў. Вядома, галоўную надзею ўскладалі сяброўкі на попел. Пелагея Максімаўна абышла ўсе казіміраўскія дамы і кватэры. Звяртаючыся да гаспадынь, яна гаварыла:

— Бабачкі, навошта ж вы такое золата выкідваеце? Аддавайце яго нам, ільнаводам.

Лідзія Васілеўна дамовілася і з качагарамі лазні, і тыя збіралі попел.

З кожным днём клопатаў прыбаўлялася. Пасля растання снегу трэба было паклапаціцца аб захаванні ў глебе вільгаці, аб падрыхтоўцы да сяўбы насення... Калі адсеяліся, поля амаль не пакідалі. Разам з усходамі лёну паявілася і пустазелле, а потым на расліны напала льняная блошка. Жанчыны працавалі самааддана і не дарэмна...

Паглядзець на казіміраўскія льны прыязджалі з іншых гаспадарак. Нават самыя прыдзірлівыя спецыялісты не мелі ніякіх прэтэнзій да даўгунца.

— Добры лянок. Ураджай яго будзе высокі, — гаварылі яны.

... Але вось лён і паспеў. Праўда, васковай спеласці ён дасягнуў не на ўсім полі, а таму церабіць яго пачалі выбарачна, не марнуючы часу, узяліся за абмалот. Не цярпелася ўзважыць першае насенне. Вынік быў цудоўны: 6,6 цэнтнера з гектара як у першым, так і ў другім звяне.

Цяпер усіх хвалявалі сцелішчы, на якіх над ільносаломкай чаравалі летнія туманы і жнівеньскія росы. Дні ўпартай працы і тут не прапалі дарэмна. Парадаваў лён і валаконм — 8 цэнтнераў з гектара.

Лён, вырашчаны звеннямі Лідзіі Васілеўны і Пелагеі Максімаўны, даў калгасу нябачаны дагэтуль даход. Дзесяткі тысяч рублёў, атрыманыя за здадзены дзяржаве лён-даўгунец, былі выкарыстаны на грамадскае будаўніцтва, радыёфікацыю пасёлка... Калгас упэўнена рухаўся наперад, паспяхова развіваў сваю шматгаліновую гаспадарку...

У самаадданай працы і пастаянных клопатах ішоў год за годам, радуючы льнаводаў высокімі ўраджаямі, а калгас — вялікімі даходамі. Але самай шчаслівай і радаснай для звеннявых па льну з пасёлка Казіміраўка была вясна 1949 года. Лідзія Васілеўна ніколі не забудзе таго моманту, калі да яе прыбегла член яе звяна Ева Ракава:

— Ліда, любая, ты слухала мінут пятнаццаць назад радыё?

— Не. А што здарылася? Ты сама не свая.

— З Масквы указ перадавалі. Табе за лён прысвоена званне Героя. Табе і Пелагеі...

Лідзія Васілеўна стаіць ля краю льнянога палетка і глядзіць у далечыню, нібы бачыць там, за лесам, усё перажытае, усё пражытае... Непазнавальная родная Казіміраўка, якая стала гарадскім пасёлкам. А яе цягне, няспынна вабіць да сябе льняное поле. Шкада,

што ўжо няма з ёю побач сяброўкі-саперніцы — Пелагеі Максімаўны Аўсеенкі.

І.Пехцераў.

БАНДАРЭНКА Зінаіда Васілеўна. Нарадзілася ў 1937 г. ў в. Машанкі Магілёўскага р-на. З 1955 г. прадзільшчыца, з 1975 г. апаратчыца фармавання хімічнага валакна прадзільнага цэха завода штучнага валакна імя Куйбышава вытворчага аб'яднання «Хімвалакно». Ганаровы хімік СССР (1976). Званне Героя прысвоена ў 1981 г.

БЕЛАВУСАВА Ева Сільвестраўна. Нарадзілася ў 1925 г. ў в. Лабанаўка Чэрыкаўскага р-на Магілёўскай вобл. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. У 1948 г. скончыла курсы па падрыхтоўцы прадзільшчыкаў у Магілёве на заводзе штучнага валакна імя Куйбышава. У 1948—71 гг. прадзільшчыца Магілёўскага завода штучнага валакна. Дапамагла асвоіць прафесію прадзільшчыцы больш чым 20 маладым работніцам. Званне Героя прысвоена ў 1960 г. за поспехі ў працы і плённую грамадскую работу. Жыве ў Магілёве.

ДЗЕМЯНКОЎ Віктар Андрэевіч. Нарадзіўся 7.6.1927 г. ў Магілёве. Удзельнік партызанскага руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. З 1944 г. слесар, качагар, памочнік машыніста, машыніст паравознага дэпо ст. Магілёў. З 1957 г. машыніст, з 1965 г. машыніст-інструктар лакаматыўнага дэпо ст. Магілёў. Званне Героя прысвоена ў 1971 г. за поспехі ў выкананні плана перавозак і павышэнне эфектыўнасці выкарыстання механізаваных сродкаў чыгуначнага транспарту. Жыве ў Магілёве.

ПЕРШЫ КРОК

...Паравоз яшчэ не прайшоў пад выцягнутай рукой семафора, а дзяжурны дыспетчар таварных перавозак станцыі Магілёў ужо выклікаў па тэлефоне Вендараж:

— Як толькі падыдзе 16-ы — званіце! І выслабаніце для яго наступны перагон. Гэта не просьба — загад!

За поездам сачылі. Яму стваралі ўмовы.

А рэйс быў звычайны: Магілёў—Асіповічы... Незвычайнай была вага поезда: З тысячы 600 тон. Двайная, звышцяжкая. Правесці яго па трасе ўзяўся машыніст Магілёўскага лакаматыўнага дэпо Віктар Андрэевіч Дземянкоў.

Узяўся... Усё было наадварот. Калі машыніст прапанаваў магчымасць такой паездкі, яго пахвалілі за саму ініцыятыву — маўляў,



В.А.Дземянкоў.

малайчына, шукаеш рэзервы, але параілі пашукаць гэтыя рэзервы на іншым участку пуці. Інжынеры дэпо ў поўнай адпаведнасці з тэорыяй чыгункі на паперы даказалі: думаць пра двайную вагу поезда на ўчастку Магілёў—Асіповічы нерэальна. Аб'ектыўныя ўмовы — профіль чыгуначнага пуці, напрыклад, — не даюць, на жаль, магчымасці ажыццявіць такі дзёрзкі рэйс. Поезд недзе стане. Што тады? Расцягваць яго ў розныя бакі, спыніць рух не толькі таварных, але і пасажырскіх паяздоў? Хто скажа, на які час, хто апраўдае эксперымент... Так, няма сэнсу рызыкаваць.

Сэнсу няма — гэта разумеў і сам В.А.Дземянкоў. Калі поезд стане. А калі ўсё-такі не стане? Гэта ж такі крок уперад!

Віктар Андрэевіч паважаў тэорыю, верыў дэпоўскім інжынерам. Але... адмовіцца ад задуманага не мог. Такі ўжо ў яго характар. Звярнуўся да рэспубліканскіх кіраўнікоў чыгункі. Адказ быў той жа: рызыка не апраўдана, участак дарогі не дазваляе правесці такі эксперымент...

Аднойчы вечарам, узяўшы ў дачкі школьны сшытак, Віктар Андрэевіч доўга сядзеў над ім: штосьці чарціў, штосьці падлічваў, задумваўся, прыпамінаючы маршрут Магілёў—Асіповічы, па якім працягваў вадзіць звычайныя паязды. Раніцай са сваімі разлікамі ён прыйшоў у дэпо. Кіраўнікі, пазнаёміўшыся з разлікамі машыніста, пацяснулі плячыма, паківалі галовамі і...

Вендараж. Дыспетчар далажыў Магілёву:

— Усё ў парадку! 16-ы прайшоў выдатна, упэўнена. Перагон свабодны.

Гэты ўчастак пуці не вельмі турбаваў машыніста: дарога прамая і гарызантальная, і трывалая. Ён добра ведаў мясціны, па якіх пралёг чыгуначны пуць. Тут ён, трынаццацігадовы партызан, хадзіў на заданні, зазнаў,

што такое блакада фашысцкімі карнікамі партызанскай зоны...

Нясята. Дыспетчар далажыў Магілёву:

— 16-ы прайшоў перагон выдатна. Выйшаў на наступны.

Наступны быў нялёгкім: пад'ём і даволі круты паварот. Машыніст, здавалася, не адрываў позірку ад палатна чыгункі, але бачыў ён і ўсе прыборы ў кабіне паравоза. Стрэлкі большасці з іх ліхаманкава дрыжалі, што сведчыла аб адным: лакаматыў у напружанні. Яно перадалося і машыністу...

Шэсць год ішоў да сваёй прафесіі В.А.Дземянкоў. Па тых часах ён спасцігаў справу хутчэй за многіх таварышаў і сярэдніх, а дакладней, прынятых, тэрмінаў праходжання лесвічкі качагар—памочнік машыніста—машыніст. Так, пакрысе авалодваў навукай ваджэння паяздоў. Праўда, былі курсы, але і пасля іх трэба было пахадзіць у памочніках. А калі добры памочнік, то старэйшы таварыш не вельмі спяшаецца даць заключэнне аб нараджэнні новага калегі...

Ялізава. Дыспетчар далажыў Магілёву:

— Графік захоўваецца да мінуты. 16-ы ідзе ўпэўнена, прыгожа!

Машыніст добра разумеў, як многа робіць у гэтым рэйсе памочнік. Хацеў пахваліць, але вырашыў адкласці на потым, калі справа будзе зроблена. Раней часу В.А.Дземянкоў не меў прывычкі ні дакараць, ні хваліць. Таму словы і ацэнкі яго былі важкімі, аўтарытэтнымі. На рабоце гэта зразумела: вопыт яго, майстэрства, адданасць справе выклікалі ў начальства і рабочых дэпо павагу і давер.

...Асіповічы. Начальнік станцыі паведаміў Магілёву:

— 16-ы прыбыў, як кур'ерскі!.. Што?.. Вядома-вядома, за каго вы нас прымаеце? Кветкі мы падрыхтавалі яшчэ раніцай — хто ж сумняваўся: поезд жа вядзе Дземянкоў, а ён жа...

Сёння звышцяжкі састаў В.А.Дземянкова — звычайны рэйс добрага машыніста. Лепшыя вучні Віктара Андрэевіча водзяць таварнякі амаль удвая цяжэйшыя. Усё так. Але рэйс В.А.Дземянкова быў неабходны. Ён быў першы не толькі ў Магілёўскім аддзяленні чыгункі, але і ў Беларусі. А з першага кроку пачынаецца любы рух наперад. З руху наперад пачынаецца жыццё. Жыццё ж — гэта барацьба. Аднаго з пераможцаў гэтай барацьбы, В.А.Дземянкова, краіна ўвянчала самым высокім званнем — Героя Сацыялістычнай Працы.

Г.Суднік.

КАЦЯШ Гаўрыла Іванавіч. Нарадзіўся 7.4.1904 г. ў Магілёве. З 1919 г. на магілёўскім чыгуначным вузле Маскоўска-Беларуска-Балтыйскай чыгункі, з 1931 г. на кіруючых пасадах Віцебскай, потым Заходняй чыгунак, ва ўпраўленні шляхоў зносін Заходняга фронту, Галоўным упраўленні руху Міністэрства шляхоў зносін. У 1944—51 гг. начальнік Заходняй чыгункі, з 1951 г. начальнік Мінскай, з 1953 г. начальнік упраўлення Беларускай чыгункі. У 1969—72 гг. саветнік Камітэта арганізацыі супрацоўніцтва чыгунак у Варшаве. У 1972—74 гг. інспектар Міністэрства шляхоў зносін. Званне Героя прысвоена ў 1975 г. за поспехі у выкананні планаў і сацыялістычных абавязацельстваў. Дзяржаўная прэмія БССР (1980).

ПІНЧУК Ганна Мікалаеўна. Нарадзілася 13.3.1913 г. ў Магілёве. З 1952 г. памочнік майстра на Магілёўскім камбінаце штучнага валакна. Званне Героя прысвоена ў 1966 г. за паспяховае выкананне планавых заданняў па павелічэнні выпуску хімічнай прадукцыі.

НЕЗВЫЧАЙНЫ ЛЁС

...Першае маё знаёмства з памочнікам майстра Магілёўскага завода штучнага валакна імя Куйбышава Ганнай Мікалаеўнай Пінчук было завочным. З фатаграфіі саракапяцігадовай даўнасці глядзела кудысьці далёка ўперад задумлівая, белагаловая дзяўчынка — адна з тых няўрымслівых камсамолак, якія будавалі першынец вялікай хіміі ў рэспубліцы, першымі прыйшлі ў цэхі і сталі да станкоў, аднымі з першых заслужылі званне ўдарнікаў працы...

Цяжкае было дзяцінства ў Ані. Рана страціўшы бацькоў, яна жыла ў мнагадзетнай сям'і дзядзькі Андрэя і добра ведае, як і яе дванаццаць стрыечных братоў і сясцёр, чаго каштуе «фунт ліха». Яна не баялася ніякай працы і гатова была ўзяцца за любую справу, якую прапануе камсамол...

Багатым на падзеі для магіляўчан быў трыццаты год. Урачыстым і радасным у тым годзе быў Першамай. Па святочна ўпрыгожаных вуліцах горада ішлі калоны дэманстрантаў на Цішоўскую пустку. Там Аня з вялікай цікавасцю разглядала макет будучай шаўковай фабрыкі і тут жа сказала сабе: маё месца сярод будаўнікоў гэтага прадпрыемства!..

І на пустэчы пачалася работа. Тэхнікі было мала. Яе замянялі маладыя, дужыя рукі энтузіястаў. Рыдлёўкамі людзі капалі траншэі, катлаваны. Па гнуткіх дашчатых насці-

лах на тачках перавозілі пясок, цэглу і бетон... Штотыднёва маладыя будаўнікі бясплатна працавалі на адстаючых аб'ектах. Толькі фізічна загартаваныя, як Аня Пінчук, маладыя людзі маглі вытрываць такую нагрузку...

У гарачы жнівеньскі дзень у прадзільны цэх завезлі першыя станкі. Пачаўся мантаж абсталявання. Амаль штодзённа, як толькі з'яўлялася свабодная мінута, сюды прыбягала Аня з сяброўкамі. Дзяўчаты з вялікай цікавасцю назіралі за зборкай складаных агрэгатаў, з нецярпеннем чакалі з'яўлення першых шаўковых ніцяў...

У пярэдадзень свята Кастрычніка ў строй дзеючых уступіла першая чарга прадпрыемства. Кіраўніцтва фабрыкі заклікала моладзь авалодваць тэхнічнымі ведамі, асвойваць абсталяванне.

Адной з першых уключылася Аня ў справу авалодвання тэхнікай. Гэты пачын падхапіла моладзь усіх прадпрыемстваў Магілёва, а потым і рэспублікі.

У бурным патоку падзей, у напружаных працоўных клопатах ляцелі месяцы, гады. У краіне разгараўся стаханаўскі рух. Рабочыя спаборнічалі за ўздым прадукцыйнасці працы. Ганна Пінчук стала адной з першых стаханавак фабрыкі...

І грымнула вайна... Толькі праз некалькі год пасля Перамогі Ганна Пінчук з дзецьмі вярнулася з эвакуацыі ў родны Магілёў і хутка была запрошана ў аддзел кадраў завода штучнага валакна імя Куйбышава, а на другі дзень яна ўжо працавала матальшчыцай у першым прадзільным цэху.

У першае пасляваеннае пяцігоддзе Ганна Пінчук і многія іншыя прадзільшчыцы амаль удвая перавыконвалі свае вытворчыя заданні.

Перадавую работніцу з дваццацігадовым стажам вылучылі ў брыгадзіры. З першых жа дзён яе работы ў новай якасці калектыў ўключыўся ў спаборніцтва за ўкараненне ў вытворчасць перадавых тэхналагічных працэсаў, за паляпшэнне арганізацыі працы, за зніжэнне сабекошту прадукцыі. Было цяжка. Але зладжаны жаночы калектыў штомесячна станавіўся пераможцам або прызёрам спаборніцтва. Ганну Мікалаеўну Пінчук назначылі памочнікам майстра.

І на новай пасадзе Ганна Мікалаеўна засталася таленавітым арганізатарам калектыву, асабістым прыкладам клікала яго на пакарэнне новых вяршынь у асваенні сучаснай тэхналогіі, у павышэнні прадукцыйнасці працы. Яна актыўна ўдзельнічала ў руху рацыяналізатараў завода. Яе вынаходства — спецыяльныя ключы для прадзільных машын — дазволіла бабінажніцам перайсці на абслугоўванне некалькіх месцаў замест аднаго, што павялічвала іх прадукцыйнасць працы ў 5—6 разоў...



Г.М.Пінчук.



А.П.Старавойтаў.

Самаадданая праца Ганны Мікалаеўны была на вачах ва ўсяго калектыву завода, і таму ніхто не здзівіўся прысваенню ёй высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы.

— Заслужыла, што там казаць. . — гаварылі на заводзе. *В.Мыслявец.*

РАБІНОВІЧ Ісак Майсеевіч. Нарадзіўся ў 1886 г. ў Магілёве. Вучоны ў галіне будаўнічай механікі, член-карэспандэнт АН СССР (1946), генерал-маёр-інжынер. Аўтар прац па дынаміцы і трываласці збудаванняў. Званне Героя прысвоена ў 1966 г. за вялікі ўклад у распрацоўку будаўнічай тэхнікі. Памёр у 1977 г.

СТАРАВОЙТАЎ Аляксандр Паўлавіч. Нарадзіўся 18.8.1934 г. ў в. Лебедзеўка Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобласці. Скончыў ПТВ будаўнікоў, дзе набыў прафесію муляра. 8 гадоў працаваў мулярам на будоўлях Магілёва, якія тут вёў 12-ты будаўнічы трэст. У 1959 г. Аляксандр Паўлавіч стварыў комплексную брыгаду ў будпраўленні № 59 таго ж 12-га трэста.

Званне Героя прысвоена ў 1971 г. за высокія вытворчыя поспехі.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР (1966—70, 1977—79) і дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1971—75, 1980—84).

Заслужаны будаўнік БССР. Ганаровы грамадзянін г. Магілёва.

СЯРГЕЕЎ Ілья Васілевіч. Нарадзіўся 27.7.1909 г. ў Магілёве. З 1927 г. на гаспадарчай рабоце на Магілёўшчыне, у 1941—43



І.В.Сяргееў.

г. ва Ульянаўскай вобласці. У 1944—65 г. старшыня калгаса «Камінтэрн» Магілёўскага р-на. Званне Героя прысвоена ў 1958 г. за поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці. Памёр у 1992 г.

РАЗЛІК ДАЛЁКАГА ПРЫЦЭЛУ

Ілы Васілевічу Сяргееву мінула толькі 23 гады, калі ён, магілёўскі рабочы, выбраў нялёгкі шлях кіраўніка калектыўнай сельскай гаспадаркі. І ўпэўнена ішоў па гэтым шляху роўна 34 гады.

Не кожны асіліць такі шлях. Многія, вельмі многія сыходзілі з яго, не вытрымаўшы выпрабавання, не знайшоўшы ў сабе дастатковага запасу волі і жыццёвай загартоўкі. У Сяргеева воля была. І было жаданне змагацца за новае жыццё вёскі, таму што не мог мірыцца са старым. Ужо балюча яно ўдарыла па ім, калі падлеткам батрачыў у Пятровічах, выконваючы абавязкі пастуха, нянькі, падсобніка за кавалак хлеба, не дасыпаючы, не даядаючы...

Маладога, але бітага жыццём хлопца паслалі кіраваць калгасам у вёску Паплаўшчына, што ў Магілёўскім раёне. Вёсачка невялікая, бедная. Да прыезду Сяргеева ніхто там не мог толкам наладзіць арцельную справу. І з яго прыездам кола не адразу стала круглым. Вельмі многа было ў ім вострых вуглоў, якія не проста давялося абкатваць...

Паступова справа пайшла на лад, ды так адмыслова, што раённыя ўлады вырашылі паслаць Ілью Васілевіча ў суседні калгас «1 Мая», каб таксама паставіць яго на ногі. Ужо вельмі благое было становішча ў першамайцаў.

Два гады спатрэбілася Ілы Васілевічу, каб першамайцы паверылі ў свае сілы і наладзілі прадукцыйную працу.

Перадаўшы калгас «1 Мая» ў надзейныя рукі, Сяргееў вярнуўся ў сваю Паплаўшчыну...

Добрую школу гаспадарчай вывучкі прайшоў Ілья Васілевіч у гады вайны ў Куйбышаўскай вобласці, дзе яму даверылі кіраўніцтва буйным калгасам «Гігант». Ой, як яна спатрэбілася, тая вывучка, калі ў 1944 годзе ён вярнуўся ў родны Магілёў і быў выбраны старшынёй прыгараднага калгаса «Камінтэрн». У недалёкай перспектыве гаспадарка павінна была стаць карміцелькай Магілёва, які адраджаўся з попелу і руін. Для такой гаспадаркі патрабаваліся вельмі вопытная рука, дзелавы розум, ініцыятыва, спрыт. Пад апошнім часта маюць на ўвазе штосьці накшталт кампрамісу з сумленнем. Але Сяргееў укладваў у гэтае паняцце нешта іншае — нібы салдацкую кемлівасць у баі, калі даводзілася выходзіць з цяжкага становішча пры дапамозе падручных сродкаў.

А становішча склалася сапраўды цяжкае. У калгасе было ўсяго трое коней, ды і тыя хворыя — усю здаровую жывёлу фашысты пагналі з сабой; і амаль ніякага інвентару. Ішла яшчэ вайна, і на дапамогу калгасу нельга было спадзявацца. Праўда, праходзячы праз горад, воінскія часці тое-сёе спісвалі ў сваіх гаспадарках, бачачы бядотнае становішча калгаса, аддавалі яму. Такім чынам і паявіліся некалькі спісаных коней. Нейкая воінская часць памяняла пародзістых авечак на мясцовых, беспародных.

Даведаўся Ілья Васілевіч, што некалькі калгасных кароў былі ў сем'ях былых паліцаяў. Ён вярнуў іх на месца законнай «прапіскі», паклаўшы пачатак новай ферме буйной рагатай жывёлы.

...Прага гаспадарчай дзейнасці апанавала Сяргеева, калі калгас пачаў набіраць сілу. Паступова гаспадарка ператваралася ў шматгаліновую, таму што гораду патрэбны былі не толькі малако і мяса, а і гародніна, яблыкі, мёд, птушка, ды і ці мала яшчэ чаго магла нарадзіць ужо больш-менш дагледжаная зямля «Камінтэрна». Аж на ста гектарах раскінуўся выдатны калгасны сад, паявіліся качыная і трусагадоўчая фермы, агародныя плантацыі, пчальнік, ну і, само сабой, сталі гадаваць свіней, авечак, буйную рагатую жывёлу.

Славіўся калгас яшчэ і конефермай...

Разам з калгасам акрыялі і людзі. Ілья Васілевіч здолеў усяліць у іх упэўненасць у будучыні калгаса, а тое, што ён набіраў сілу, бачыў кожны.

— Менш як тры кілаграмы хлеба на працадзень у «Камінтэрне» не атрымлівалі, — не без гордасці гаварыў Сяргееў.

І яго гордасць можна зразумець, калі ўспомніць, што ў тыя гады ў многіх гаспадарках задавальняліся грамамі... Такія калгасы былі побач, і камінтэрнаўцы не хацелі цярпець адстаючых. Адну такую гаспадарку, якая кацілася ўніз, і вырашылі далучыць да свайго «Камінтэрна». Потым далучылі яшчэ тры. Вядома, нялёгка было «прымакам» прывыкаць да цвёрдых парадкаў, якія існавалі ў «Камінтэрне». Але і яны, нарэшце, адчулі, што іх новы старшыня — чалавек надзейны і настойлівы, свайго даб'ецца. І дабіўся. Былыя калгасы сталі брыгадамі, гаспадаркі іх мацнелі з дня ў дзень, і людзі адчулі радасць ад сапраўднай сельскай працы.

Гады праз чатыры камінтэрнаўцы далучылі яшчэ чатыры маламагутныя калгасы і таксама ўдыхнулі ў іх веру ў лепшую будучыню. Утварылася ўжо вялікая гаспадарка з дзесяці брыгад.

У 1955—56 гг. «Камінтэрн» быў шырока прадстаўлены на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, заваяваў там дыпломы I і II ступеняў. Урад узнагародзіў калгас ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. «Камінтэрн» стаў маяком не толькі ў вобласці, але і ў рэспубліцы. Сюды прыязджалі вучыцца працаваць прадстаўнікі народаў СССР, а таксама немцы, палякі, балгары...

І зараз ніхто не забывае, што аснову трываласці «Камінтэрна» заклаў адзін з першых яго арганізатараў, ветэран калгаснага будаўніцтва, Герой Сацыялістычнай Працы Ільля Васілевіч Сяргееў. *К.Губарэвіч.*

ЦІМАШЭНКА Пётр Паўлавіч. Нарадзіўся 18.1.1913 г. ў в. Глыбоцкае Гомельскай вобласці. Скончыўшы дзесяцігодку, у 1932 г. паступіў у Беларускі політэхнічны інстытут. Але скончыць яго не ўдалося: з двума курсамі будаўнічага факультэта давялося ўзводзіць прамысловае прадпрыемства. Да 1954 г., гэта амаль за 20 гадоў, ён асвоіў усе будаўнічыя прафесіі, кіраваў брыгадамі, быў майстрам... І вось Пятра Паўлавіча прызначаюць кіраўніком 78-га Магілёўскага будаўнічага трэста, які праз некаторы час быў пераўтвораны ў 12-ы. У 1965—77 гг. ён узначальваў 17-ы будаўнічы трэст, узводзіў буйнейшы ў Еўропе камбінат сінтэтычнага валакна «Лаўсанбуд». У 1978 г Пётр Паўлавіч прызначаны дырэктарам будаўнічай выстаўкі Дзяржбуда БССР. Заслужаны будаўнік БССР. Ганаровы грамадзянін г. Магілёва. Званне Героя прысвоена за поспехі ў будаўніцтве Магілёўскага камбіната сінтэтычнага валакна.

ШАТУХІНА Антаніна Уладзіміраўна. Нарадзілася ў 1936 г. ў в. Княжыцы Магілёўскага р-на. З 1966 г. працавала брыгадзірам муляраў будаўнічага ўпраўлення 65-га будтрэста № 17 «Лаўсанбуд» у Магілёве. Званне Героя прысвоена ў 1974 г. за поспехі ў будаўніцтве 1-й чаргі Магілёўскага камбіната сінтэтычнага валакна. Жыве ў Магілёве. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1975—80).

ДЗЕНІСЕНКА Ніна Іванаўна, нарадзілася ў 1941 г. ў Магілёве. Кавалер ордэна Працоўнай Славы 3-х ступеней, ткачыха стужкаткацкай фабрыкі імя 50-годдзя БССР. Узнагароджана за сістэматычнае перавыкананне планавых заданняў і асабістых абавязацельстваў.

УЗНАГАРОДЖАНЫ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

АГУРЦОЎ М.Ф., АЗАРАВА А.А., АНДРЭЕЎ М.А., АНЧУК С.Д., АЎТУШЭНКА П.Т., БАБЕНКА Е.П., БАЛАЗЕСА В.В., БАНДАРЭНКА З.В., БАРАДАЎКА Н.А., БУДЗІШЭЎСКІ А.Б., БЯЛОЎ Л.І., ВАНЮКОЎ П.Н., ВАРАБ'ЁЎ В.А., ВАСІЛЕЎСКАЯ Б.А., ВАСІЛЕЎСКІ В.І., ВАСЮКОВІЧ С.П., ВАШЧАНКА І.С., ГАВЕНКА В.Н., ГАЛЬКЕВІЧ В.І., ГАНЧАРОЎ В.Я., ГАНЧАРОЎ П.С., ГАРАНІН А.Н., ГІТКОВІЧ Л.В., ГЛАЗАЎ К.С., ГНЕСІНА Ц.Б., ГРАШЧАНКА М.Ф., ГРЫБАНОЎСКІ Г.М., ГРЫШЧАНКА С.К., ДВАРЭЦКІ А.А., ДЗЕМЯНКОВА Л.М., ДРАНЬКОЎ М.Р., ЕРАШЭНКА П.А., ЕРМАКОВА Е.Д., ЗАВІША Ф.Д., ЗАПАСКІН В.М., ЗАХАРЭВІЧ П.П., ЗЕГАРАЎ В.В., ЗУБАРЭНКА В.А., ЗУСІН В.М., ІЛЬН С.Т., КАЗЛОЎСКАЯ Е.Н., КАЛЕСНІКАЎ Д.Л., КАЛІСТРАТАВА В.І., КАРАВАЕВА В.І., КАРАВАЕВА Т.П., КАРАЛЁВА Н.П., КАРЗО Ю.Н., КАРПІНСКАЯ В.Н., КАСЦЕНІЧ Н.І., КАСЦЮКОЎ Г.Т., КАЧМАРОЎ В.К., КІТОВІЧ С.Д., КСЯНДЗОЎ С.І., КУЛАГІН Ф.І., КУЛІК Д.М., КУХАНАЎ Д.І., КУЯЎСКІ П.П., ЛАБЕЗНІКАЎ Н.С., ЛАЗАРАВА М.А., ЛІТВІНАЎ А.І., ЛІТВІНАЎ С.І., ЛУГАЎЦОЎ К.І., ЛУКАШОЎ Н.І., МАЛАХАЎ А.Н., МАРКОВІЧ М.С., МАРУШЭЎСКІ В.А., МАСАЛКОВА Р.В., МАСКАЛЁЎ С.П., МАСЛЕННІКАВА В.Е., МАТРОСАЎ Ф.Д.,

МЕНЬКІНА М.І., МЕХАНІКАЎ І.Д., НАЗАРАНКА А.Л., НІКАНАЎ А.М., ПАДАБЕД А.А., ПАДАЛЯН Ф.П., ПАНАСЮК Д.І., ПАЎЛАЎ М.А., ПАЧЭКІН К.М., ПАШКЕВІЧ Ф.Д., ПЫШКОЎ М.М., ПЯНЬКОЎСКІ В.А., ПЯТРОЎ А.А., РАБІННІКАЎ К.Ф., РАГАЎЦОЎ Д.Р., РАЙКОЎ Ф.Н., РЫБІНСКІ І.І., САВІЦКАЯ Р.І., САКАЛОЎ М.С., САНДЛЕР І.С., САНДЛЕР Н.Л., СВІРЫДАЎ Н.Т., СЕЛІВАНАВА Л.В., СЕРАБРОЎ В.І., СМІРНОЎ Ф.Н., СУДАКОЎ Б.В., СУШКЕВІЧ К.А., СЫРАМАЛОТАЎ В.І., СЯВЕРЫН В.К., СЯЛЕЦКАЯ Я.Ю., СЯМАШКА Р.С., СЯМЁНАЎ Л.Е., ТАРАКІН А.П., ТАРАСЕВІЧ В.А., ТКАЧЛАГІНЕЦ Г.А., ТОМАН М.А., ТРОІЦКІ А.А., ТУРАВЕЦ А.Г., УЛАДЗІМІРАЎ К.Г., УНУК А.А., УТКІН М.І., ФЕДАСЕЕВА Л.С., ХАЛАМЕЕЎ А.Ф., ХОТЧАНКА В.Л., ЦВЯРКУН В.Я., ЦВЯТКОЎ Н.І., ЦЕЛАБЁНАК В.М., ШАРЫПА З.І., ШАЎЧЭНКА В.І., ШУМЕЙКА І.Б., ШЫМКЕВІЧ З.А., ШЫРОКІ Г.М., ЯГОРАВА М.Ф., ЯФІМАЎ П.П.

Заслужаныя работнікі Беларусі

ЗАСЛУЖАНЫ АРТЫСТ

БУДКЕВІЧ Уладзімір Уладзіміравіч, ГАЛЬПЕРЫНА Юдзіф Самойлаўна, ГУСЕЎ Васіль Фёдаравіч, КАБАТНІКАВА Вера Рафаілаўна, МАЗУР Вікторыя Мікалаеўна, МАЦІСАВА Лізавета Парфёнаўна, РАДЗІЁНАЎ Мікалай Ільіч, РАЁЎСКІ Андрэй Пятровіч, ТРУХАНАЎ Юрый Уладзіміравіч, ФЯДЗЕЕВА Ніна Рыгораўна, ЦІЎНОЎ Алег Барысавіч, ЯВОРСКІ Станіслаў Іванавіч, ЯФРЭМЕНКА Міхаіл Фёдаравіч.

ЗАСЛУЖАНЫ БУДАЎНІК

БЕЛКА Мікалай Мітрафанавіч, ГАПЕЕНКА Ілья Цімафеевіч, ГАПОНАЎ Ігар Аляксандравіч, ГАРАВОЙ Васіль Кузьміч, ГАРЛАЧОЎ Уладзімір Іванавіч, ЗАБЕЛА Аляксей Пятровіч, СЕРАФІМОВІЧ Сцяпан Ігнатавіч, ХАМЯНКОЎ Аляксей Іванавіч, ЦВІРКУН Васіль Паўлавіч, ШПАРЧЭВА Зінаіда Пятроўна, ЮРКОЎ Іван Конанавіч.

ЗАСЛУЖАНЫ ВЫНАХОДНІК

ГІМЕЛЬФАРБ Натан Майсеевіч, КАЛЕСНІКАЎ Давід Лаўрэнцьевіч, ЛІШАНСКІ Рыгор Якаўлевіч, ЛУГАНЁЎ Фёдар Цімафеевіч, НЯКРАСАЎ Міхаіл Піліпавіч, ПАЖЫДАЕЎ Мікалай Іванавіч, ПЯТРОЎ Уладзімір Міхайлавіч, РОЗЕНБЕРГ Аляксандр Якаўлевіч.

ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ МАСТАЦТВА

БРАЦЕННІКАЎ Мікалай Данілавіч, ВОРАНАЎ Натан Майсеевіч, КУМЕЛЬСКІ Уладзімір Уладзіміравіч, ТУРАЎ Віктар Цімафеевіч.

ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ НАВУКІ І ТЭХНІКІ

АНІСОВІЧ Генадзь Анатольевіч, РАБІНОВІЧ Анатоль Мікалаевіч, РУБІНАЎ Анатоль Мікалаевіч.

ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

ЖЫТКОЎ Іван Васілевіч, САЗАНОВІЧ Валянцін Пятровіч.

ЗАСЛУЖАНЫ НАСТАЎНІК

АЗАРАВА Ала Анатольеўна, АЛЕЙНІКАВА Дзіна Канстанцінаўна, АЛЕНСКІ Пётр Львовіч, АЛЯКСЕЕНКА Галіна Іванаўна, АНДРУХІНА Людміла Георгіеўна, БАЗЫЛЁВА Марыя Іванаўна, БАЛАНТЭР Навум Самойлавіч, БЕРЛІН Барыс Афанасьевіч, БЯРЭЗІНА Яўгенія Пятроўна, ВІГУРА Яўгенія Іванаўна, ВОРАНАВА Алена Пятроўна, ВЯЛІЧКА Аляксандр Іванавіч, ГАРБАЦКАЯ Лізавета Паўлаўна, ГІТКОВІЧ Людміла Васілеўна, ЖАЛАЧКОВІЧ Ганна Лукінічна, ЗАЙЧУК Марыя Пятроўна, ІВАНОЎ Леанід Леанідавіч, КАВАЛЕНКА Любоў Іванаўна, КАЗЛОВА Аляксандра Васілеўна, КАЗЛОЎСКАЯ Алена Мікалаеўна, КАЛІСТРАТАЎ Міхаіл Мацвеевіч, КІТОВІЧ Софія Дзмітрыеўна, КРАСНЯНКОЎ Міхаіл Міхайлавіч, КУПЧЭНЯ Леаніда Канстанцінаўна, ЛАЗАРАВА Таццяна Аксёнаўна, ЛАПАНЬКОЎ Анатоль Рыгоравіч, ЛУКОЎНІКАВА Кацярына Сяргееўна, ЛЯЙХОВІЧ Соня Саламонаўна, МАКСІМЕНКА Яўген Фаміч, МУРАШКА Зоя Уладзіміраўна, МЯДЗВЕДЗЕВА Рахіль Сямёнаўна, МЯСНІКОЎ Міхаіл Піліпавіч, ПАДСІТКАЎ Міка-

лай Фролавіч, РЫБАКОВА Дора Лукінічна, САВЕЛЬЕВА Наталля Барысаўна, СКАВАРОДКІНА Галіна Іванаўна, СЛІЗСКІ Сцяпан Іванавіч, СТАРЫЧОНАК Мікалай Фёдаравіч, СЦЯПАНАЎ Уладзімір Мікалаевіч, ХОЛАД Вера Іванаўна, ЧЫСЦЯКОВА Варвара Георгіеўна, ШВАКАВА Вольга Цярэнцьеўна, ШКЛЯРЭЎСКАЯ Ксенія Аляксандраўна, ШКУДНОВА Клара Яфімаўна, ШАПЯЛЕВІЧ Вольга Васілеўна, ШАСІЦЕРЫКОВА Вера Дзмітрыеўна.

ЗАСЛУЖАНЫ МЕЛІЯРАТАР

ШАБЕКА Васа Фёдараўна.

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

ЛЕСЯЧКА Іван Васілевіч.

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ

АЎЛАСЕВІЧ Міхаіл Аляксандравіч, КУДРАШОЎ Яўген Паўлавіч, САЛАШЭНКА Уладзімір Іванавіч, ШЫЛКА Кірыла Паўлавіч.

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК ГАНДЛЮ

АФАНАСЕНКА Кацярына Ціханаўна, ГАЎРЫЛЕНКА Кацярына Якаўлеўна, ХРАБРАЯ Марыя Аўдзееўна.

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК КУЛЬТУРЫ

АЛЯКСЕЕНКА Аляксандр Карнеевіч, БЯНЬКО Аляксей Аляксеевіч, ГУРЭВІЧ Цімафей Міронавіч, ДАРАШКОЎ Міхаіл Рыгоравіч, ІВАНОЎ Леанід Леанідавіч, КАРПЕНКА Мікалай Сяргеевіч, КІРАКОЗАЎ Мамікон Георгіевіч, КРЫСКАВЕЦ Яўген Яўгенавіч, ЛУКОШКА Уладзімір Сяргеевіч, МОШЧАНКА Анатоль Апанасавіч, НІКІЦІН Мікалай Фёдаравіч, САЛДАТАЎ Міхаіл Мікалаевіч, ТУПІЦЫН Валерый Васілевіч, ТУРЫНА Клаўдзія Майсееўна, ЦІТАВЕЦ Васіль Яфімавіч, ШАЦАЎ Рувім Евелевіч.

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ

БАРАДЗІН Іван Васілевіч, КОТАЎ Мікалай Нікіфаравіч, ЛЫСЕНКА Міхаіл Рыгоравіч, СТРАЛЕЦКАЯ Святлана Іванаўна.

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК ПРАМЫСЛОВАСЦІ

КАРАЛЁВА Наталля Паўлаўна, ЛІТВІНЧУК Пётр Захаравіч, ПАЛЕЦКАЯ Софія Мікалаеўна, СІДАРАЎ Мікалай Андрэевіч.

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК ПРАФТЭХАДУКАЦЫІ

АРЭНЗ Васіль Фёдаравіч, БАРАНОЎСКІ Уладзімір Ігнатавіч, БУЛАШОЎ Аляксандр Дзянісавіч, ВАРАЖЭЙКА Валянціна Іванаўна, ВЕТАЧКІН Аляксандр Маркавіч, ВОСІПАВА Валянціна Іванаўна, ГАЛЫНСКІ Сяргей Цімафеевіч, ГУКАЎ Мікалай Фёдаравіч, ЗАЯЦ Іван Зыгмунтавіч, ЗУБАРАВА Лідзія Спірыдонаўна, ІРГЕР Давід Рыгоравіч, КАРПАВА Галіна Генадзеўна, КАЦУБ Анатоль Іванавіч, КІСЯЛЁЎ Міхаіл Дзямідавіч, КРАСАЎЦАЎ Мікалай Іванавіч, КРАЎЦОЎ Іван Рыгоравіч, ЛАРЫН Аркадзь Ягоравіч, ЛЬВОЎ Аляксандр Вісарыёнавіч, МЕЛЬНІКАЎ Мікалай Пятровіч, МІРАНОВІЧ Эдуард Сцяпанавіч, ПАГАРЭЛЫ Яўген Спірыдонавіч, РАМАНАЎ Міхаіл Іванавіч, РЫЖАНКОЎ Іван Аляксеевіч, СУХАБОКАЎ Генадзь Сцяпанавіч, ТАРАНАЎ Яўген Тарасавіч, ТУМАНАЎ Андрэй Пятровіч, ХАЛЬЧЫЦКІ Міхаіл Пятровіч, ШАГІНАВА Ганна Мікалаеўна.

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

РЭДКАЗУБАЎ Мікалай Іванавіч.

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК СФЕРЫ АБСЛУГОЎВАННЯ

ВОРАНАВА Аляксандра Іванаўна.

ЗАСЛУЖАНЫ РАЦЫЯНАЛІЗАТАР

АЛЯКСЕЕЎ Адам Свірыдавіч, ЗВІЗЖОЎ Дзмітрый Рыгоравіч, САВІЧ Уладзімір Уладзіміравіч, САМОХІН Віктар Васілевіч, СТОЛІН Рува Шаевіч, ЦІТОЎ Іван Васілевіч, ЮРЧАНКА Яўген Сафонавіч, ЯКІМАЎ Іван Цярэнцьевіч.

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК ТРАНСПАРТУ

ГАРАЎЦОЎ Канстанцін Мікалаевіч, ЕЛЬСКІ Васіль Канстанцінавіч, ЗУБОВІЧ Дзмітрый Рыгоравіч, ЛАКУСТАЎ Дзмітрый Пятровіч, НОВІКАЎ Генадзь Ільіч, ПЯТРОЎ Фёдар Андрэевіч, РЭЗНІКАЎ Міхаіл Сцяпанавіч, ЦЮРЫКАВА Ганна Фёдараўна.

ЗАСЛУЖАНЫ СУВЯЗІСТ

БУЛЫБЕНКА Ульян Аляксеевіч, ФІЛАТАЎ Рыгор Міхайлавіч, ФУРМАНАЎ Іван Паўлавіч, ШАЦКІ Георгій Дзмітрыевіч.

ЗАСЛУЖАНЫ ТРЭНЕР

БАЙДАЧНЫ Анатоль Мікалаевіч, БАС Міхаіл Ісакавіч, БЕКЕР Валянцін Рыгоравіч, БУТЭЛЬКІН Анатоль Сяргеевіч, БЫЧКОЎ Валерый Дзмітрыевіч, ВАСІН Аляксандр Мікалаевіч, ВУСВІК Мікалай Мікалаевіч, ГУРСКАЯ Эдзіта Эдуардаўна, ГУСАКОЎ Леанід Леанідавіч, ДАВЫДЗЕНКАЎ Уладзімір Паўлавіч, ДВОРНІКАЎ Сяргей Васілевіч, ЕРМАКОЎ Пётр Мікалаевіч, ЖУКАВЕЦ Людміла Іванаўна, ЖЫТКОЎ Іван Васілевіч, ЗІЛЬБЕРМАН Міхаіл Барысавіч, КАЗЛОЎ Яўген Васілевіч, КАРОТКІН Валянцін Данілавіч, КАТЛЯРОЎ Аляксей Міхайлавіч, КІСЯЛЁЎ Міхаіл Сямёнавіч, КІЦЭНКА Аляксандр Іванавіч, КРАЎЦОЎ Іван Рыгоравіч, КРУПЯНЬКОЎ Аркадзь Ільіч, КУЗЬМІН Уладзімір Пятровіч, ЛАБАЧОЎ Анатоль Лявонцьевіч, ЛЮБІМАЎ Барыс Дзмітрыевіч, МАРТЫНАЎ Уладзімір Пятровіч, МАРФЕЛЬ Анатоль Іванавіч, МЯДЗВЕДЗЕЎ Аляксей Канстанцінавіч, ПАДШЫВАЛЕНКА Мікалай Іванавіч, ПАНЧАНКА Уладзімір Цімафеевіч, ПАПОЎ Васіль Фёдаравіч, ПЕРАПЕЧКІН Анатоль Іванавіч, ПРАКОФ'ЕЎ Алег Мікалаевіч, ПРАЯВЕНКА Уладзімір Іванавіч, ПУЧКО Аляксандр Яўгенавіч, ПЯТРУША Фелікс Іванавіч, РАБІНОВІЧ Леў Міхайлавіч, РАМАНЕНКА Уладзімір Мікалаевіч, РЫСІН Альберт Майсеевіч, САВІЧ Уладзімір Дзмітрыевіч, СІЛКОЎ Валянцін Паўлавіч, СПІЦАРАЎ Барыс Майсеевіч, СТОЛІН Барыс Дзмітрыевіч, ТРАГУБАЎ Навум Анатольевіч, ТРАГУБАЎ Навум Нахмедавіч, ТУМЕСЯН Ніна Мікалаеўна, ТУРКОЎ Іван Антонавіч, ФЕШЧАНКА Любоў Аляксандраўна, ФЁДАРАЎ Генадзь Іванавіч, ХАРКЕВІЧ Галіна Анатолеўна, ЦЫПЛЯЦІН Уладзімір Пятровіч, ЧАЧОТКА Ефрасіння Іванаўна, ЧУКАНАВА Элеанора Самойлаўна, ЧАМЯРЫЧКА В.А., ЧАРАЎХІН Кірыла Васілевіч, ШАБУР Віталь Дзмітрыевіч, ШАЎЦОЎ Міхаіл Сяргеевіч, ШУБІН Юрый Міхайлавіч, ЯРОМІН Васіль Майсеевіч.

ЗАСЛУЖАНЫ ЎРАЧ

АДАМАВА Галіна Васілеўна, АЛЯКСЕЕВА Марыя Аляксандраўна, АФАНАСЬЕВА Надзея Георгіеўна, БАХАНОВІЧ Канстанцін Іванавіч, ГАНКІНА Рэвека Абрамаўна, ГАПЕЕНКА Таццяна Сяргееўна, ГУЦЬКО Надзея Андрэеўна, ДАРАШЭНКА Клаўдзія Міхаілаўна, ДЗЕМЯНКОВА Лідзія Міхайлаўна, ЕРМАЧЭНКА Міхаіл Фёдаравіч, ЗАБАРОНАК Ларыса Якаўлеўна, ІНДЫКТ Рыгор Пятровіч, КАЗЮРА Ганна Георгіеўна, ПЕЙСАХОВІЧ Марыя Ісакаўна, ПЛОТКІНА Фаіна Евелеўна, ТОЎБА Аляксандра Ісаеўна, ТРУСАВА Марыя Васілеўна, ФЁДАРАВА Таццяна Несцераўна, ЧМЕЛЬ Фрума Майсееўна, ШЫМКЕВІЧ Зінаіда Аляксандраўна.

ЗАСЛУЖАНЫ ШАФЁР

РОЗІН Марк Майсеевіч.

ЗАСЛУЖАНЫ ЭКАНАМІСТ

КЛУГМАН Зусман Савельевіч, ТАКМЯНІНАЎ Аляксандр Васілевіч.

ЗАСЛУЖАНЫ ЭНЕРГЕТЫК

ПАНКОЎ Віктар Паўлавіч.

ЗАСЛУЖАНЫ ЮРЫСТ

ДЗІЖЭНІН Ягор Пятровіч, КАМРУКОЎ Станіслаў Ігнатавіч.

Яны нарадзіліся ў Магілёве

АЎСЯННІКАЎ ГЕНАДЗЬ СЦЯПАНАВІЧ

Беларускі акцёр. Народны артыст Беларусі (1974), народны артыст СССР (1991). Нарадзіўся 19.2.1935 г. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1957). Працуе ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Я.Купалы. Самабытны талент акцёра, народны гумар, дакладнасць псіхалагічнай распрацоўкі характараў найбольш ярка выявіліся ў нацыянальным рэпертуары: Пустарэвіч («Паўлінка» Я.Купалы), Язэп Карыта («Ажаніцца — не журыцца» паводле Далецкіх і М.Чарота), Караўкін («Брама неўміручасці» К.Крапівы), Дубадзел («Людзі на

балоце» паводле І.Мележа), Цярэшка Калабок (сярэбраны медаль імя А.Папова 1973), дзед Цыбулька, Стары, Антон Бусько («Трыбунал», «Таблетку пад язык», «Святая прастата», «Пагарэльцы» А.Макаёнка), Кічкайла, Мурашка («Амністыя», «Мудрамер» М.Матукоўскага, Дзярж. прэмія Беларусі 1988), Кропля («Канстанцін Заслонаў» А.Маўзона), Кат святога судзілішча («Напісанае застаецца» А.Петрашкевіча), Брава-Жыватоўскі («Плач перапёлкі» паводле І.Чыгрынава). З іншых роляў: Турэмшчык («...Забыць Герастрата» Р.Горына), Казулін («Характары» В.Шукшына), Дзікой, Іншагародні («Навальніца» і «Апошняя ахвяра» А.Астроўскага), Бобчынскі («Рэвізор» М.Гогаля), Боцман («Аптымістычная трагедыя» У.Вішнеўскага) і інш. Здымаўся ў кінафільмах «Доўгія вёрсты вайны», «Апошняе лета дзяцінства», «Полымя», «Дзень вяртання» і інш., тэлевізійных спектаклях «Плач перапёлкі», «Тэатр купца Япішкіна», тэлевізійным фільме-спектаклі «Трыбунал», тэлефільме «Наваселле». Жыве ў Мінску.

БАІТАВА СВЯТЛАНА МІКАЛАЕЎНА

Беларуская спартсменка (спартыўная гімнастыка), заслужаны майстар спорту СССР (1988). Нарадзілася 3.9.1972 г. ў Магілёве. Скончыла Магілёўскае вучылішча алімпійскага рэзерву (1992). Алімпійская чэмпіёнка (1988, Сеул, камандны залік), чэмпіёнка свету (1989), сярэбраны прызёр чэмпіянату свету (1987), неаднаразовы ўладальнік Кубка кубкаў, чэмпіёнка СССР. З 1991 працуе ў школе Алімпійскага рэзерву ў Магілёве.

БРАЦЕННІКАЎ МІКАЛАЙ ДАНІЛАВІЧ

Беларускі скрыпач і педагог. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1975), прафесар (1981). Нарадзіўся ў 1922 г. Скончыў кансерваторыю ў Маскве (1950). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1950 г. выкладчык Беларускай кансерваторыі (у 1955—78 гг. загадчык кафедры струнных інструментаў, у 1959—63 гг. прарэктар, у 1978—81 гг. дэкан аркестравага факультэта). Вядзе выканальніцкую дзейнасць у асноўным як ансамбліст (у 1958—65 удзельнік струннага квартэта Беларускай філармоніі). Кіраўнік (да 1982 разам з В.Гольфельдам) ансамбля скрыпачоў кансерваторыі. Жыве ў Мінску.



Г.С.Аўсяннікаў.



Святлана Баітава.

БЯЛІНСКАЯ МАРЫЯ СЯРГЕЕЎНА

Беларуская актрыса, народная артыстка БССР (1953). Нарадзілася 22.7.1906 г. Скончыла Беларускую драматычную студыю ў Маскве (1926). Працавала ў Беларускім тэатры імя Я.Коласа (1926—64, у 1944 у складзе тэатральнай франтавой брыгады выязджала з канцэртамі на перадавую). У 1965—79 гг. у Беларускім тэатры імя Я.Купалы. Выканаўца роляў характарных гераінь. У сцэнічным мастацтве Бялінскай мяккі лірызм арганічна спалучаўся з узнёсласцю і драматызмам. З лепшых роляў — Марына («Вайна вайне» Я.Коласа), Таццяна Марыч («Над Бярозай-ракой» П.Глебкі), Глушачыха («Людзі на балоце» паводле І.Мележа), Насця, Рашэль, Поля, Шурка («На дне», «Васа Жалязнова», «Мяшчане», «Ягор Булычоў і іншыя» М.Горкага), Аксюша («Лес» А.Астроўскага), Марыя Антонаўна («Рэвізор» М.Гогаля), Марыя Аляксандраўна («Сям'я» І.Папова), Зіначка («У мяцеліцу» Л.Лявонава), Афелія («Гамлет» У.Шэкспіра), Жаніна («Забаўны выпадак» К.Гальдоні), маці Віктара («Гульня з кошкай» І.Эркеня) і інш. Здымалася ў тэлевізійных фільмах «Трывожнае шчасце» паводле І.Шамякіна, «Людзі на балоце» І.Мележа і інш. Памерла М.С.Бялінская 3.5.1990 г.

БЯРОЗКІН РЫГОР САЛАМОНАВІЧ

Беларускі літаратурны крытык. Нарадзіўся 3.7.1918 г. У 1936—38 гг. вучыўся ў Мінскім педінстытуце. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў у рэдакцыях літаратурных перыядычных выданняў. У 1970—75 гг. літаратурны супрацоўнік бюлетэня «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі». Друка-

ваўся з 1935 г. Р.С.Бярозкін даследаваў пераважна паэзію. Яго працам уласцівы спалучэнне праблемнасці з канкрэтным аналізам, эстэтычная патрабавальнасць, уменне раскрыць творчую індывідуальнасць паэта. Творчасць сучасных беларускіх літаратараў, праблемы паэтычнага майстэрства Р.С.Бярозкін аналізаваў у кнігах «Паэзія праўды» (1958; разглядаецца творчасць П.Броўкі, А.Куляшова, М.Танка, П.Панчанкі), «Спадарожніца часу» (1961), «Пімен Панчанка» (1968), «Постаці» (1971), «Аркадзь Куляшоў» (1978). У кнігах «Свет Купалы» (1965), «Чалавек на досвітку» (на рускай мове, 1970), «Звенні» (1976) даследаваў спадчыну Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, Цёткі, узаемадзеянне беларускай і рускай паэзіі. Памёр 1.12.1981 г.

ВАЛАСЕВІЧ ЭДУАРД СТАНІСЛАВАВІЧ

Беларускі паэт-байкапісец. Нарадзіўся 12.3.1918 г. У 1941 г. скончыў Магілёўскі пединстытут. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў ў Магілёўскім пединстытуце, абласной газеце «За Радзіму» (Магілёў), часопісах «Полымя» і «Вожык», Белдзяржфілармоніі. У 1970—74 гг. дырэктар Беларускага рэспубліканскага аддзялення Усесаюзнага агенцтва па аўтарскіх правах. Друкуецца з 1937 г. Першая кніга «Вершы і байкі» выйшла ў 1954 г. Э.С.Валасевіч выдаў зборнікі «Залатая рыбка» (1957), «Арліны суд» (1959), «Соль» (1962), «На вясёлай хвалі» (1967), «Туды і рак з кляшнёй...» (1970), «Сур'ёзна і з усмешкай» (1973), «Полюсы» (1977), «Кругавая парука» (1979) і інш. Байкі Э.С.Валасевіча вызначаюцца актуальнасцю тэматыкі, камізмам сітуацый, дасціпным народным гумарам. Ён піша таксама гумарыстычныя вершы, байкі і казкі для дзяцей («Камар-званар», 1959, «Дняпроўскія чарадзеі», 1963, «Горкі мёд», 1967, і інш.), аднаактовыя камедыі, скетчы («Свет клінам не сышоўся», 1958, «З хворай галавы на здаровую», 1961).

ВОРАНАЎ НАТАН МАЙСЕЕВІЧ

Беларускі жывапісец. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1966). Нарадзіўся ў 1916 г. Скончыў Віцебскае мастацкае вучылішча (1935), Інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна ў Ленінградзе (1948). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1965—78 гг. выкладчык Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Удзельнічаў у мастацкіх выстаўках з 1933 г. Працаваў у розных жанрах станковага жывапісу. Гістарычнай тэме прысвечаны яго карціны «Рэйд Каўпака» (1948), «Раніца ў кастрычніку. Мінск, 1917 год» (1957), «Зямля непакораная» (1974). Сучаснае жыццё адлюстраваў у палотнах «Завод жалезабетонных вырабаў» (1958), «Шахтабудаўнікі Салігорска» (1961) і інш. Стварыў партрэты кампазітара Я.Цікоцкага (1949), заслужанай артысткі Беларусі Т.Пастунінай (1956), групавы партрэт беларускіх фехтавальшчыц («Беларускія «мушкецёры», 1971) і інш., лірычныя і індустрыяльныя пейзажы «Разліў на Бярэзіне» (1958), «Вясна прыйшла» (1963), «Гомель. Порт» (1963), «Зацвіло» (1973), «Параф'янава. Дарога ў саўгасе» (1975), «Новы горад» (1977), нацюрморты і інш. Памёр 3.3.1978 г.

КАБЗАРЭЎСКІ ПАВЕЛ СЯМЁНАВІЧ

Рускі пісьменнік-перакладчык (сапраўднае імя Гардон Фавій Залманавіч). Нарадзіўся 14.8.1909 г. Адукацыю атрымаў у Магілёве. З 1925 г. жыў і працаваў у Ленінградзе. Пераклаў на рускую мову асобныя творы М.Багдановіча, Я.Купалы, Я.Коласа, З.Бядулі, К.Крапівы, М.Лынькова, М.Танка, П.Панчанкі, Э.Самуйлёнка, А.Звонака, І.Мележа, І.Шамякіна, Я.Скрыгана, Т.Хадкевіча, М.Ткачова, М.Калачынскага і інш., раманы «Сустрэнемся на барыкадах» П.Пестрака, «Праз гады» П.Галавача, «Вогненны азімут» А.Асіпенкі, «Світанне» А.Чарнышэвіча і інш. Яго пераклады дакладна перадаюць змест і думку, захоўваюць мастацкую форму, інтанацыі арыгінала. Склаў шэраг зборнікаў і анталогій беларускай літаратуры. Памёр 8.10.1970 г.

КАЛМАНОЎСКІ ЭДУАРД САВЕЛЬЕВІЧ

Рускі кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў Расійскай Федэрацыі (1974). Нарадзіўся ў 1923 г. Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1945). Аўтар папулярных песень «Я люблю цябе, жыццё» (1958), «Ці хочуць рускія вайны», лірычных песень «Мы вас пачакаем» (1963), «Бірусінка» (1963), «Вальс аб вальсе» (1964), «Жураўляня» (1965) і інш. Майстар тэатральнай музыкі, напісаў музычную казку «Беласнежка» (1966), музыку да камедыі У.Шэкспіра «Дванаццатая ноч» (1955) і да іншых спектакляў. Сярод твораў Э.С.Калманоўскага

канцэрт для альта з аркестрам (1945), 4 сюіты для сімфанічнага аркестра (1945, 1948, 1950, 1956), музыка да кінафільмаў, раманcы. Жыве ў Маскве.

ЛЕЎ ДАВІД НАТАНАВІЧ

Гісторык, даследчык палеаліту на тэрыторыі Сярэдняй Азіі. Нарадзіўся 2.5.1905 г. У 1931 г. скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Ленінградскага дзяржуніверсітэта. Працаваў у Музеі антрапалогіі і этнаграфіі АН СССР навуковым супрацоўнікам, з 1937 г. загадчык аддзела археалогіі Інстытута этнаграфіі АН СССР. У Вялікую Айчынную вайну у час блакады Ленінграда вучоны прымаў удзел у супрацьпаветранай абароне горада. У 1944 г. пераехаў у Самарканд, дзе ўзначаліў кафедру ўсеагульнай гісторыі ва універсітэце, якой кіраваў больш за 30 гадоў. Яму належыць адкрыццё ў 1947 г. пячоры Аман-Кутан, у якой жылі паляўнічыя каменнага веку, у 1951 г. адкрыў яшчэ адну такую пячору — Талік-Сай. Такім чынам, Д.Н.Леў унёс буйны ўклад у вывучэнне эпохі каменнага веку ў Сярэдняй Азіі. У 1966 г. апісаў першае сярод вядомых на тэрыторыі Самаркандскай вобласці пахаванне бронзавага веку, недалёка ад станцыі Мумінабад. Памёр 10.10.1969 г. ў Самаркандзе. *А.Людчык.*

МАНАСЗОН МОНАС ІСАКАВІЧ

Беларускі жывапісец. Нарадзіўся ў 1907 г. У 1929 г. скончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар тэматычных карцін «Сустрэча савецкіх танкістаў у Заходняй Беларусі» (1939), «Клятва танкіста» (1946), «Мінск адраджаецца» (1949), «Раніца ў заводскім раёне» (1959), «Першы дзень Савецкай Беларусі» (1967), «Першы з'езд РСДРП» (1970) і інш. Узнагароджаны ордэнам Знак Пашаны, медалямі. Памёр у 1980 г.

МІГАЙ СЯРГЕЙ ІВАНАВІЧ

Рускі спявак (барытон), педагог, народны артыст Расійскай Федэрацыі (1939). Нарадзіўся ў 1888 г. Скончыў музычнае вучылішча ў Адэсе (1911). У 1918—20 гг. вучыўся ў опернай студыі пад кіраўніцтвам К.С.Станіслаўскага (з 1919 г. пры Вялікім тэатры). У 1911—24 гг. саліст Вялікага тэатра ў Маскве, у 1924—27 гг. — Ленінградскага тэатра оперы і балета, у 1927—41 гг. выступаў у Маскве і Ленінградзе. У 1941—48 гг. саліст, кіраўнік і кансультант вакальнай групы Усесаюзнага радыёкамітэта. З 1948 г. выкладчык Маскоўскай кансерваторыі (з 1952 прафесар). Сярод лепшых партый: Анегін («Яўген Анегін» П.Чайкоўскага), Мізгір, Гразной («Снягурачка», «Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава), князь Ігар («Князь Ігар» А.Барадзіна), Дэман («Дэман» А.Рубінштэйна), Рыгалета, Жэрмон, Ды Луна («Рыгалета», «Травіята», «Трубадур» Дж.Вердзі) і інш. Удзельнічаў у рабоце Магілёўскага літаратурна-музычна-драматычнага гуртка ў 1905—14 гг. У 1920-я гады часта спяваў з Л.Собінавым. Аўтар мастацтвазнаўчых і метадычных прац. Сярод вучняў С.І.Мігая народныя артысты СССР Ю.Мазурок, А.Саўчанка. Памёр 8.12.1959 г.

РОЗІН АЛЯКСАНДР МАЙСЕЕВІЧ

Беларускі геолаг. Нарадзіўся ў 1881 г. Член-карэспандэнт АН БССР (1940). У 1908 г. скончыў горную акадэмію ў Германіі. У 1909—37 гг. праводзіў геалагічныя даследаванні на Беларусі па пошуку каляровых руд, вогнетрывалай гліны, кварцавых пяскоў, мелу, торфу, фасфарытаў, солі, нафты і інш. У 1927—31 гг. працаваў намеснікам начальніка Беларускага геолага-разведачнага трэста; у 1933—37 гг. — у Беларускім НДІ прамысловасці; у 1937—41 гг. — у Беларускім геалагічным упраўленні. З 1941 г. ў Куйбышаўскім геалагічным упраўленні. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР 1952 г. Памёр 10.4.1942 г.

РУБІНАЎ АНАТОЛЬ МІКАЛАЕВІЧ

Беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук (1973), прафесар (1980). Заслужаны дзеяч навукі рэспублікі (1980), акадэмік АН Беларусі (1991). Нарадзіўся ў 1939 г. Скончыў БДУ (1961). З 1961 г. ў Інстытуце фізікі АН Беларусі: з 1970 г. загадчык лабараторыі, з 1987 г. намеснік дырэктара па навуковай рабоце. Распрацаваў новыя метады вывучэння спектраскапіі ўзбуджаных станаў лазерных асяроддзяў. Тэарэтычна прадказаў і эксперыментальна адкрыў (у сааўтарстве) лазеры на растворах арганічных злучэнняў.



А.М.Рубінаў.



В.Ц.Тураў.

Выявіў і даследаваў уплыў флуктуацый мікраструктуры растворaў на іх спектральныя ўласцівасці, упершыню ўстанавіў залежнасць флуарэсцэнцыі растворaў ад частаты ўзбуджальнага святла (з'ява — батахромная люмінісцэнцыя). Прапанаваў новыя звышадчувальныя метады ўнутрырэзанатарнай лазернай спектраскапіі для аналізу рэчываў. Распрацаваў і даследаваў новы тып перабудаваных лазераў, заснаваных на выкарыстанні размеркаванай адваротнай сувязі. Развіў новыя метады звышхуткаснай лазернай спектраскапіі. Аўтар навуковых прац у галіне лазернай фізікі і лазернай спектраскапіі арганічных злучэнняў, заснаваў сваю навуковую школу (кандыдатаў і дактароў навук). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР 1972 г. Жыве ў Мінску.

РЫЖАНКОЎ АЛЕГ УЛАДЗІМІРАВІЧ

Беларускі спартсмен (біятлон), заслужаны майстар спорту Беларусі. Нарадзіўся 15.12.1967 г. У 1983 пачаў займацца спортам, стаў членам спартыўнага таварыства «Дынама». У 1985—87 гг. служыў у Савецкай Арміі. З 1987 г. ваеннаслужачы. Чэмпіён Еўропы (1995), двухразовы чэмпіён свету (1996 і 1997) па біятлону. Кавалер ордэна Айчыны III ступені. Жыве і працуе ў Магілёве.

СЯМКОЎСКІ (БРАНШТЭЙН) СЯМЁН ЮЛЬЕВІЧ

Савецкі вучоны. Нарадзіўся 15.3.1882 г. ў Магілёве. Скончыў Пецярбургскі універсітэт. У 1922—31 гг. загадчык кафедры Украінскага інстытута марксізму-ленінізму ў Харкаве, у 1934—36 гг. — Харкаўскага універсітэта. Адначасова быў старшынёй Камісіі філасофіі АН Украіны. З 1925 г. член-карэспандэнт, з 1929 г. акадэмік. У сакавіку 1936 г. рэпрэсіраваны, рэабілітаваны пасмяротна ў 1956 г. Навуковыя працы па гісторыі філасофіі і філасофскіх пытаннях прыродазнаўства.

ТУРАЎ ВІКТАР ЦІМАФЕЕВІЧ

Беларускі кінарэжысёр. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1975). Народны артыст Беларусі (1979). Народны артыст СССР (1986). Нарадзіўся ў 1936 г. Скончыў Усесаюзны дзяржаўны інстытут кінематаграфіі (1964). З 1959 г. на кінастудыі «Беларусьфільм». Творчую дзейнасць пачаў як рэжысёр дакументальных кінанарысаў «Наш Салігорск» і «Гомельскія танцоры» (1959); «Беларусь сацыялістычная» і «Слаўны шлях» (1960), ігравых навел «Камбуд» (1961, фільм «Апавяданні пра юнацтва»), «Зорка на спражцы» (1962, фільм «Маленькія летуценнікі»). Пакаленню, дзяцінства якога апалена вайной, прысвяціў фільмы «Праз могілкі» (1965), «Я родам з дзяцінства» (1967), «Вайна над стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой» (1970). Паэтычная інтанацыя, імкненне да разнастайнасці жанраў выявіліся ў экранізацыях «Жыццё і смерць дваранiна Чартапханава» (1972, тэлефільм паводле апавяданняў І.Тургенева), «Гора баяцца — шчасця не бачыць» (1973, паводле п'есы-казкі С.Маршака). Актуальныя праблемы вырашаў у фільмах «Час яе сыноў» (1976), «Уваскрэсная ноч» (1977, паводле п'есы А.Петрашкевіча «Трывога»), «Пункт адліку» (1980) і інш.

Этапнай работай стала экранізацыя «Палескай хронікі» паводле І.Мележа «Людзі на балоце» (1982, Дзяржаўная прэмія СССР 1984), «Подых навальніцы» (1983), «Меншы сярод братоў» (1985, паводле аповесці Г.Бакланава) і інш.

У 1976—81 гг. першы сакратар праўлення Саюза кінематаграфістаў Беларусі. Памёр 31.10.1996 г.

ШАБЕКА ВАСА ФЁДАРАЎНА

Беларускі вучоны ў галіне меліярацыі. Нарадзілася 3.9.1916 г. Доктар тэхнічных навук (1968), прафесар (1969). Заслужаны меліяратар (1968). У 1940 г. скончыла БПІ. З

1944 г. працавала ў Белпрампраекце, з 1946 г. ў Бел. НДІ меліярацыі і воднай гаспадаркі; з 1953 г. загадчык аддзела, лабараторыі гідралагічных і водагаспадарчых разлікаў. Навуковыя працы В.Ф.Шабекі прысвечаны праблемам рэгулявання воднага рэжыму, рацыянальнага выкарыстання водных рэсурсаў, удасканалення асушальна-ўвільгатняльных сістэм пры меліярацыі зямель.

ШЫЛОВІЧ ГЕОРГІЙ УЛАДЗІМІРАВІЧ

Беларускі пісьменнік. Нарадзіўся 7.1.1924 г. Скончыў у 1951 г. БДУ. Удзельнік Айчыннай вайны. Працаваў у газетах «Мінская праўда», «Зорька», у 1965—85 гг. у часопісе «Беларусь» (з 1973 адказны сакратар, з 1978 намеснік галоўнага рэдактара). Друкуецца з 1947 г. Піша для дзяцей і юнацтва пра школьныя справы, выхаванне. Аўтар зборнікаў нарысаў «Твая дарога» (1957), «Запіска на шыбе» (1960), апавяданняў «Піянерская адвага» (1962), «Праз полымя вайны» (1963), аповесцей «Школа ля крэпасці» (1962), «Туман ідзе па следу» (1963—64), «Сшытак у чорнай вокладцы» (1965), «Чарапаха без панцыра» (1966), «Святло далёкага Алькора» (1973), «Сустрэча з сонейкам, альбо Аповесць пра Пецьку-флібусцьера і некаторых яго сяброў» (1977), «Падарожжа сярод лета» (1983), сцэнарыяў дакументальных фільмаў «Родныя бярозы не спяць» (1965), «Зялёны патруль» (1966), «Трэба марыць» (1967) і інш. Яго творы перакладзены на рускую і іншыя мовы.

ЯЦЫНА ПЁТР ПЯТРОВІЧ

Савецкі скульптар. Нарадзіўся 6.1.1906 г. У 1928 г. скончыў Магілёўскую музычную школу, працаваў піяністам у Магілёўскім гарадскім тэатры. У 1933—36 гг. вучыўся ў студыі Усерасійскага кааператыўнага таварыства «Мастак». Да 1938 г. кіраваў скульптурным камбінатам у Курску. Адну з першых сваіх работ — бюст кампазітара Рымскага-Корсакава — падарыў Магілёўскаму музычнаму вучылішчу. У час Вялікай Айчыннай вайны на фронце: быў мінамётчыкам, камандзірам мінамётнага падраздзялення. З 1946 г. працаваў у сістэме Міністэрства культуры СССР у садружнасці з вядомымі скульптарамі І.Шадрам, В.Мухінай, М.Томскім і інш. Галоўнае месца ў творчасці П.П.Яцыны займаў вобраз Леніна. У Магілёве разам з бацькам П.Г.Яцынам стварыў помнік У.І.Леніну на Тэатральнай плошчы (разбураны ў гады Айчыннай вайны) і каля будынка завода штучнага валакна імя В.У.Куйбышава. Гарэльеф «Клянёмся табе, таварыш Ленін» (разам з Я.Вучэцічам і інш.) удастоены ў 1948 г. Дзяржаўнай прэміі СССР. Выкананы шэраг станковых партрэтаў Леніна (за адзін з іх у 1951 г. атрымаў Дзяржаўную прэмію СССР). Імем П.П.Яцыны названа вуліца ў Магілёве, на доме № 1 мемарыяльная дошка. Памёр 2.4.1964 г.

М.А.Ножнікаў.

Ганаровыя грамадзяне г. Магілёва

Званне Ганаровы грамадзянін г. Магілёва ўведзена 20 студзеня 1970 г. Гэтага звання ўдастоены:

ВЕЗІРАЎ Аслан Фархадавіч. Герой Савецкага Саюза (1945). Нарадзіўся ў 1910 г. ў в. Зюмюрхач, Азербайджан. У Вялікую Айчынную вайну камандаваў інжынерна-сапёрнай брыгадай, якая ўдзельнічала ў вызваленні Магілёва. Званне прысвоена ў 1986 г. за актыўны ўдзел у вызваленні Магілёва ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

КАЗЛОЎСКАЯ Алена Мікалаеўна. Заслужаная настаўніца Беларусі. Нарадзілася ў 1897 г. ў Мінску. У 1913—74 гг. працавала ў школах Магілёва. Званне прысвоена ў 1970 г.



А.Ф.Везіраў.



А.М.Казлоўская.



М.П.Каралёў.



І.К.Кірылаў.



І.Д.Краснаштанаў.



І.М.Макараў.

за вялікі ўклад у справу народнай адукацыі і работу па выхаванні маладога пакалення, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці г. Магілёва. Памерла ў 1978 г.

КАРАЛЁЎ Мікалай Піліпавіч. Адзін з арганізатараў падполля і партызанскага руху на Магілёўшчыне, генерал-маёр, Герой Савецкага Саюза (1944). Нарадзіўся ў 1906 г. ў в. Амінавічы Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл. З 1958 г. на савецкай рабоце ў Магілёве. Званне прысвоена ў 1970 г. за вялікі ўклад у перамогу савецкага народа над фашысцкай Германіяй і заслугі ў гаспадарчым і сацыяльным развіцці Магілёва. Памёр у 1972 г.

КАСТАНДАЎ Леанід Аркадзевіч. Савецкі дзяржаўны дзеяч. Нарадзіўся ў 1915 г. ў г. Керкі, Туркменія. З 1963 г. міністр СССР — старшыня Дзяржаўнага камітэта хімічнага і нафтавага машынабудавання, потым Дзяржаўнага камітэта хімічнай прамысловасці, з 1980 г. намеснік старшыні Савета Міністраў СССР. Званне прысвоена ў 1978 г. за вялікі асабісты ўклад у прамысловае і сацыяльнае развіццё Магілёва. Памёр у 1985 г.

КІРЫЛАЎ Іосіф Канстанцінавіч. Удзельнік вызвалення Магілёва. Генерал-маёр. Нарадзіўся ў 1905 г. ў в. Палтава Белгарадскай вобл., Расія. У Вялікую Айчынную вайну камандаваў 139-й стралковай дывізіяй, воіны якой адны з першых уварваліся ў горад. Званне прысвоена ў 1975 г. за актыўны ўдзел у вызваленні Магілёва ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у чэрвені 1944 г.

КРАСНАШТАНАЎ Іван Данілавіч. Удзельнік вызвалення Магілёва. Нарадзіўся ў 1900 г. ў в. Улькан Іркуцкай вобл., Расія. У Вялікую Айчынную вайну камандаваў 238-й стралковай дывізіяй, якая ўдзельнічала ў баях за вызваленне Магілёва. Званне прысвоена ў 1979 г. за асабісты актыўны ўдзел у баях за вызваленне Магілёва ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г. Памёр у 1983 г.

МАКАРАЎ Іван Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1903 г. ў в. Вязнікі Уладзімірскай вобл., Расія. З 1939 г. і да пачатку Вялікай Айчыннай вайны першы сакратар Магілёўскага абкома КП(б)Б. Многа зрабіў у справе арганізацыі абароны Магілёва, эвакуацыі яго жыхароў і прамысловага абсталявання ў тыл краіны. У 1943 г. зноў выбраны ў Магілёве на даваенную пасаду, потым 12 гадоў працаваў старшынёй беларускіх прафсаюзаў у Мінску. Званне прысвоена ў 1980 г. за вялікі асабісты ўклад у арганізацыю абароны Магілёва ў ліпені 1941 г. і заслугі ў гаспадарчым і культурным развіцці горада. Памёр у 1989 г.

МАКСІМЦОЎ Міхаіл Данілавіч. Удзельнік вызвалення Магілёва. Генерал-маёр. Нарадзіўся ў 1909 г. ў г. Росаш Варонежскай вобл., Расія. У Вялікую Айчынную вайну начальнік штаба інжынерных войск 2-га Беларускага фронту. Званне прысвоена ў 1980 г. за актыўны ўдзел у вызваленні Магілёва ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г. Жыве ў Кіеве.

НАВУМАЎ Аляксандр Фёдаравіч. Удзельнік вызвалення Магілёва. Генерал-маёр. Нарадзіўся ў 1897 г. ў г. Акмолінск, Казахстан. У Вялікую Айчынную вайну камандаваў 62-м стралковым корпусам, воіны якога ўдзельнічалі ў вызваленні Магілёва. Званне прысвоена ў 1975 г. Памёр у 1979 г.

РАЗУМАЎ Аляксандр Кірылавіч. Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення Магілёва (гл. ў артыкуле «Навечна ў памяці»).



М.Д.Максімцоў.



А.Ф.Навумаў.



М.Р.Хамула.



П.П.Цімашэнка.

СМІРНОЎ Дзмітрый Іванавіч. Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення Магілёва (гл. ў артыкуле «Навечна ў памяці»).

СТАРАВОЙТАЎ Аляксандр Паўлавіч. Заслужаны будаўнік Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы (1971). Нарадзіўся ў 1934 г. ў в. Лебядзёўка Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл. З 1951 г. муляр, з 1959 г. брыгадзір комплекснай брыгады будаўнічага ўпраўлення № 59 будтрэста № 12 Магілёва. Званне прысвоена ў 1978 г. за актыўны ўдзел у прамысловым і сацыяльна-культурным развіцці Магілёва.

ХАМУЛА Міхаіл Рыгоравіч. Удзельнік вызвалення Магілёва. Генерал-палкоўнік. Нарадзіўся ў 1919 г. ў в. Лучкоўка Чарнігаўскай вобл., Украіна. У Айчынную вайну камандаваў 878-м стралковым палком, воіны якога першымі ўварваліся ў Магілёў. Званне прысвоена ў 1982 г. за актыўны ўдзел у вызваленні Магілёва ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г.

ЦІМАШЭНКА Пётр Паўлавіч. Заслужаны будаўнік БССР, Герой Сацыялістычнай Працы (1974). Нарадзіўся ў 1913 г. ў в. Глыбоцкае Гомельскай вобл. У 1954—78 гг. кіраваў магілёўскімі будаўнічымі трэстамі № 78, 12 і 17 «Лаўсанбуд». Званне прысвоена ў 1975 г. за вялікія заслугі ў прамысловым і сацыяльным развіцці Магілёва.

Загінулі ў Афганістане

АСТАПАЎ Ігар Іванавіч, нарадзіўся 21.8.1963 г. ў г. Чавусы Магілёўскай вобл. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Магілёве. У 1985 г. скончыў Курганскае вышэйшае ваенна-палітычнае авіяцыйнае вучылішча. Служыў у Беларускай ваеннай акрузе. У кастрычніку 1987 г. накіраваны ў Афганістан. Старшы лейтэнант І.І.Астапаў загінуў 23.1.1988 г. Пахаваны ў Магілёве. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

АЎДЗЕЕЎ Васіль Аляксандравіч, нарадзіўся 11.7.1966 г. ў Магілёве. У 1983 г. скончыў Магілёўскую СШ № 2. У чэрвені 1985 г. прызваны ў Савецкую Армію. Радавы В.А.Аўдзееў быў цяжка паранены і памёр ад ран 16.3.1987 г. Пахаваны на Машэкаўскіх могілках у Магілёве. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

БАДЗЕРКА Васіль Алегавіч, нарадзіўся 18.7.1965 г. ў Магілёве. У 1980 г. скончыў 8 класаў Магілёўскай СШ № 30, у 1984 г. —



І.І.Астапаў.



В.А.Аўдзееў.



В.А.Бадзерка.



Л.В.Буглак.



В.У.Граньковў.



А.І.Громаў.



А.М.Зязюлін.



А.Л.Клінтухоў.

Магілёўскі будаўнічы тэхнікум. У кастрычніку 1984 г. прызваны ў Савецкую Армію. Пасля вучэбнай часці ў канцы студзеня 1985 г. накіраваны ў Афганістан. Радавы В.А.Бадзерка загінуў 25.6.1985 г. Пахаваны ў в. Прысна Магілёўскага р-на. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

БУГЛАК Леанід Віктаравіч, нарадзіўся 22.8.1962 г. ў Магілёве. У 1978 г. скончыў 9 класаў Магілёўскай СШ № 26, у 1982 г. — Магілёўскі політэхнічны тэхнікум. У сакавіку 1982 г. прызваны ў Савецкую Армію. З чэрвеня 1982 г. служыў у Афганістане ў г. Кундуз. Радавы Л.В.Булгак загінуў 22.7.1982 г. Пахаваны ў в. Кучын Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ГРАНЬКОЎ Віктар Уладзіміравіч, нарадзіўся 31.1.1969 г. ў в. Палетнікі Магілёўскага р-на. У 1986 г. скончыў Магілёўскую СШ № 23. У 1987 г. прызваны ў Савецкую Армію. Загінуў 18.1.1988 г. Пахаваны ў Магілёве. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ГРОМАЎ Аляксандр Іванавіч, нарадзіўся 25.4.1962 г. ў Магілёве. У 1977 г. скончыў 8 класаў Магілёўскай СШ № 27, у 1981 г. — Магілёўскае ПТВ № 54 будаўнікоў. Працаваў на металургічным заводзе грузчыкам-стропальшчыкам. Скончыў школу ДТСААФ. У сакавіку 1982 г. прызваны ў Савецкую Армію. Радавы А.І.Громаў загінуў 12.8.1982 г. Пахаваны ў в. Палыкавічы Магілёўскага р-на. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ЗЯЗЮЛІН Артур Мікалаевіч, нарадзіўся 28.5.1963 г. ў Магілёве. У 1977 г. скончыў 8 класаў Магілёўскай СШ № 2, у 1982 г. — Салігорскае ПТВ № 69. Працаваў электраслесарам на 4-м рудніку вытворчага аб'яднання «Беларускалій». У кастрычніку 1982 г. прызваны ў Савецкую Армію. Радавы А.М.Зязюлін загінуў 23.4.1984 г. Пахаваны ў в. Чыжэвічы Салігорскага р-на. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КЛІНТУХОЎ Аляксандр Леанідавіч, нарадзіўся 7.4.1962 г. ў в. Гарадзец Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл. У 1977 г. скончыў 8 класаў Магілёўскай СШ № 19, у 1980 г. Магілёўскае ПТВ № 4. У 1981 г. прызваны ў Савецкую Армію. Пры выкананні баявога задання малодшы сяржант А.Л.Клінтухоў быў цяжка паранены. Памёр 29.1.1982 г. Пахаваны ў Магілёве. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КУРБАЦКІ Віктар Аляксеевіч, нарадзіўся 7.12.1960 г. ў Магілёве. Пасля заканчэння Магілёўскай СШ № 20 вучыўся ў ПТВ № 1 г. Магілёва. У 1980 г. прызваны ў Савецкую Армію. Сяржант В.А.Курбацкі памёр ад ран 3.4.1982 г. Пахаваны на Палыкавіцкіх могілках у Магілёве. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

ЛАПО Міхаіл Пятровіч, нарадзіўся ў 1964 г. ў г. Караганда, Казахстан. У 1979 г. скончыў 8 класаў Магілёўскай СШ № 7, потым Магілёўскае ПТВ № 14. Служыў у Афганістане. Радавы М.П.Лапо захварэў і памёр 4.9.1983 г. Пахаваны ў в. Эсьмоны Бялыніцкага р-на Магілёўскай вобл.

ЛУСЦЯНКОЎ Сяргей Аляксандравіч, нарадзіўся 13.6.1966 г. ў в. Дубінка Магілёўскага р-на. У 1983 г. скончыў Магілёўскую СШ № 20. У красавіку 1985 г. прызваны ў Савецкую Армію. Радавы С.А.Лусцянкоў загінуў 10.12.1986 г. пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў в. Дубінка. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

МЕЛЬНІКАЎ Андрэй Аляксандравіч, нарадзіўся 11.4.1968 г. ў Магілёве. У 1983 г. скончыў 8 класаў Магілёўскай СШ № 28 і паступіў у Магілёўскае ПТВ № 1, якое скончыў у 1986 г. У кастрычніку 1986 г. прызваны ў Савецкую Армію. У красавіку 1987 г. накіраваны ў Афганістан. Радавы А.А.Мельнікаў гераічна загінуў 8.1.1988 г. Пахаваны ў Магілёве. За мужнасць і гераізм пасмяротна (1988) удастоены звання Героя Савецкага Саюза. Штогод у Магілёве праводзіцца турнір па барацьбе дзю-до памяці А.А.Мельнікава.



В.А.Курбацкі.



М.П.Лапо.



С.А.Лусцянкоў.



А.А.Мельнікаў.

ВЫШЫНЯ

Студзень 1988 г. Узброеныя фарміраванні маджахедаў спрабуюць знішчыць абсталяваныя на стратэгічна важных вышынях афганскія і савецкія блок-пасты, што ахоўвалі раён шашы Хордэз—Хост. Найбольш жорсткія баі ідуць за вышыню, абазначаную на карце лічбай 3234...

7 студзеня. 15 гадзін 30 мінут. Па вышыні, якую кантралююць байцы узвода старшага лейтэнанта В.Гагарына, выпушчана некалькі дзесяткаў рэактыўных снарадаў. Адначасова пачаўся абстрэл блок-паста з гранатамётаў, мінамётаў і артылерыйскіх гармат. Пад агнявым прыкрыццём, перабягаючы ад аднаго скальнага выступа да другога, буйны атрад душманаў падабраўся да савецкіх воінаў не больш чым на 200 метраў.

16 гадзін 10 мінут. Маджахеды адкрываюць масіраваны кулямётна-аўтаматны агонь, з двух бакоў пачынаюць атаку... Праз 50 мінут, кінуўшы паўтара дзесятка забітых і каля 30 раненых, атакуючыя ўцяклі на зыходныя пазіцыі.

17 гадзін 35 мінут. Новая атака маджахедаў. На гэты раз з іншага, нечаканага для абаронцаў паста. Але і яна была адбіта...

На пост зноў пасыпаліся снарады і міны. Узмацніўся кулямётны агонь. Было відавочна, што перад маджахедамі пастаўлена задача: чаго б гэта ні каштавала, захапіць стратэгічна важную вышыню і выбіць з яе савецкіх воінаў...

19 гадзін 10 мінут. Пачалася трэцяя, самая лютая атака. Ведучы агонь з ручных кулямётаў і аўтаматаў, не лічачыся са стратамі, маджахеды пайшлі на блок-пост у поўны рост. І зноў мужна і адважна змагаліся з ворагам гвардыі радавы Мельнікаў і гвардыі малодшы сяржант Аляксандраў... Не раз адважныя кулямётчыкі выклікалі на сябе магутны артылерыйска-мінамётны агонь...

З васьмі гадзін вечара і да трох гадзін ночы наступнага дня верталёты колеру жоўтых пяскоў пустыні транспартавалі ў бок Пакістана мноства забітых і параненых маджахедаў, зваротным рэйсам — зброю, боепрыпасы і свежыя сілы мяцежнікаў, якія зноў і зноў атакавалі пазіцыі блок-паста на вышыні 3234.



А.М.Новікаў.



А.М.Палякоў.



А.У.Стральцоў.



М.І.Шкутаў.



У.І.Яфрэмаў.

Апошняя, дванаццатая атака душманаў была самай жорсткай... Атакуючыя прарваліся на лінію абароны блок-паста. Вось некалькі душманаў кінуліся да кулямёта Мельнікава. Схапілі яго і... выбух звязкі гранат раскідаў іх у розныя бакі. У гэта імгненне завяршыў свой жыццёвы шлях салдат Андрэй Мельнікаў, якому толькі праз тры месяцы споўнілася б 20 гадоў. *М.Рудкоўскі.*

НОВІКАЎ Аляксандр Мікалаевіч, нарадзіўся 24.10.1957 г. ў Магілёве. Пасля Краснiцкай васьмігадовай школы паступіў у Магілёўскае ПТВ № 1, якое скончыў у 1975 г., працаваў слесарам. У лістападзе 1976 г. прызваны ў Савецкую Армію, пасля тэрміновай службы скончыў школу прапаршчыкаў. Добраахвотна пайшоў служыць у Афганістан. Загінуў 25.1.1982 г. Пахаваны ў в. Чарназёмаўка Магілёўскага р-на. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ПАЛЯКОЎ Аляксандр Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1963 г. ў в. Верамейкі Чэрыкаўскага р-на Магілёўскай вобл. У 1978 г. Аляксандр скончыў 8 класаў Магілёўскай СШ № 32, у 1981 г. — Магілёўскае ПТВ № 33 металістаў. У кастрычніку 1981 г. прызваны ў Савецкую Армію. Сяржант А.М.Палякоў загінуў у баі 6.9.1983 г. Пахаваны ў Магілёве. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу».

СТРАЛЬЦОЎ Аляксандр Уладзіміравіч, нарадзіўся 15.9.1965 г. ў Магілёве. Вучыўся ў Магілёўскай СШ № 29, скончыў Магілёўскае ПТВ № 70. Прызваны ў Савецкую Армію. Радавы А.У.Стральцоў загінуў 24.8.1984 г. Пахаваны ў Магілёве. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ШКУТАЎ Мікалай Іванавіч, нарадзіўся 4.4.1965 г. ў Магілёве. У 1979 г. скончыў 8 класаў Магілёўскай СШ № 8 і паступіў у Магілёўскае ПТВ № 36. У красавіку 1984 г. прызваны ў Савецкую Армію. Пасля вучэбнай часці накіраваны ў Афганістан. Радавы М.І.Шкутаў загінуў 4.11.1984 г. Пахаваны ў в. Сафіеўка Магілёўскага р-на. Узнагароджаны граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

ЯФРЭМАЎ Уладзімір Іванавіч, нарадзіўся 22.4.1964 г. ў с. Ульянаўскае Карагандзінскай вобл., Казахстан. Пасля сканчэння ў 1978 г. школы-інтэрната № 1 ў Магілёве працаваў слесарам у Магілёўскім таксапарку. У верасні 1983 г. прызваны ў Савецкую Армію. Санінструктар роты малодшы сяржант У.І.Яфрэмаў загінуў 24.5.1985 г. ў час бою, калі дапамагаў параненаму салдату. Пахаваны ў Магілёве. Пасмяротна ўзнагароджаны медалём «За адвагу».

У ЧАС СЛУЖБЫ Ў САВЕЦКАЙ АРМІІ ЗАГІНУЛІ:

ГУСАРЭВІЧ Ігар Уладзіміравіч, нарадзіўся ў 1961 г. Служыў на адным з караблёў Чырванасцяжнага Балтыйскага флоту. Загінуў 15.11.1981 г. пры выкананні службовых абавязкаў. Пахаваны ў в. Дасовічы Магілёўскага р-на.

ДРАЗДОЎ Аляксандр Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1962 г. Служыў у г. Ніжні Ноўгарад. Загінуў 10.10.1982 г. ад рук бандытаў пры нясенні каравульнай службы. Пахаваны ў Магілёве.



І.У.Гусарэвіч.



А.А.Драздоў.

МАТЭРЫЯЛЬНАЯ І ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА МАГІЛЁВА

Ад скамарохаў і батлейкі да сучаснага тэатра

25 верасня 1888 г. гасцінна адчыніў дзверы магілёўскі тэатр, будынак якога зараз упрыгожвае адзін са старажытных пляцаў горада. Але ён не быў першым у горадзе.

Са старажытнасці на Беларусі блізкім да тэатральнага мастацтва было рамяство скамарохаў. Не стаў выключэннем і Магілёў. Інвентар горада за 1604 г. сведчыць, што ў той час у ім налічвалася 13 скамарохаў. Слова «скамарох» сустракаецца ў актах Магілёўскага магістрата другой паловы 16 ст. Гэта сведчыць пра тое, што ў горадзе было добра вядома мастацтва скамарохаў.

Важную ролю ў фарміраванні і станаўленні нацыянальных тэатральных традыцый адыграла батлейка — беларускі народны тэатр лялек, узнікненне якога ў 16 ст. звязана са святам Каляд, з прапагандай царкоўнікамі хрысціянства (тэатралізаваліся царкоўныя абрады). Пра рэпертуар гэтых невялічкіх тэатраў можна меркаваць па іх галоўных удзельніках — ляльках, што захаваліся з 19 ст. У былым Дзяржаўным музеі этнаграфіі народаў СССР ёсць і магілёўскія экспанаты — Васіль з доўбняй, Адам і Ева, Цыган, Яўрэй, Чорт і іншыя. Дайшла да нас таксама цікавая двухпавярховая батлейка 19 ст. з Магілёва. Драматургія народнага тэатра вызначалася як рэлігійным, так і свецкім характарам. Батлейка была шырока распаўсюджана на Беларусі, у тым ліку і ў Магілёве. Крыніцы данеслі нам прозвішчы асобных батлеечнікаў — Вазіла і Бутомы.

Не менш важную ролю ў развіцці тэатральнага мастацтва на Беларусі ў 16—18 ст. адыгрываў школьны тэатр. Такія тэатры ўзнікалі пры духоўных навучальных установах. Ставіліся п'есы, напісаныя пераважна выкладчыкамі калегій, семінарый, акадэмій. Спектаклі ўяўлялі сабой пышнае відовішча з музыкай, спевамі, танцамі. Існаваў школьны тэатр і ў Магілёве. Дзейнічаў ён з канца 17 ст. пры езуіцкім калегіуме. З 1698 г. вядомы езуіцкі тэатр мімікі і паказу дыялогаў.

Захаваліся друкаваныя праграмы магілёўскага школьнага тэатра, якія адносяцца да 1722—32 гг. Цікавы і той факт, што ў 1772 г. ў сувязі з прыездам графа Францішка Асалінскага магілёўскія шкаляры выканалі панегірык, які называўся «Ганаровыя знакі — дзедавы сякеры Асалінскіх» і ўслаўляў аднаго з продкаў ганаровага госця. Падобныя панегірыкі неаднаразова выконваліся на сцэне школьнага тэатра.

У 1780 г. ў горадзе ўзведзены будынак тэатра Чарнышова (архітэктар Брынгозі), названы ў гонар тагачаснага расійскага намесніка ў нашым краі З.Р.Чарнышова, па загаду якога ён будаваўся. У Магілёве тады вялася падрыхтоўка да прыезду каранаваных асоб — імператрыцы Кацярыны II і аўстрыйскага імператара Франца Іосіфа II. Сюды з'ехалася ўсё дваранства Магілёўскай і Полацкай губерняў. З Пецярбурга была выпісана італьянская опера і прыдворная капэла, якія пачалі паказы ў тэатры. Сярод артыстаў

вызначалася тагачасная славутасць Баніфіна. Брынгозі пабудаваў для прадстаўленняў не толькі тэатр, але і вялікую бальную залу, дзе мясцовая знаць давала балы ў гонар імператрыцы. Усе гэтыя пабудовы знаходзіліся побач з губернатарскім домам.

Пасля ад'езду Кацярыны II у горадзе нейкі час існаваў аматарскі калектыў, які разам з тэатрам Чарнышова (трупа працавала ў 18 — 1-й палове 19 ст. ў рэзідэнцыі графа З.Р.Чарнышова ў Чачэрску) даваў прадстаўленні.

Былі ў Магілёве і прыватныя тэатры. Адзін з іх належаў вядомаму ў той час на Беларусі каталіцкаму біскупу С.І.Богушу-Сестранцэвічу. У 1788 г. ў гэтым тэатры была пастаўлена трагедыя ў пяці актах «Ора». Паводле звестак вядомага беларускага даследчыка А.І.Мальдзіса, С.Богуш-Сестранцэвіч напісаў і паставіў трагедыю «Гіцыя ў Таўрыдзе». Вядомым тэатральным крытыкам, аўтарам трагедыі «Уваскрэсенне мёртвых...» быў архіепіскап Г.Каніскі, які жыў у той час у Магілёве. У 1792—95 гг. ў горадзе выступала трупа, сфарміраваная А.Ш.Жукоўскім. У яе рэпертуары былі п'есы на польскай і рускай мовах.

Шмат гастроляў, асабліва рускіх тэатраў, было на працягу 19 ст. Выступалі артысты ў розных памяшканнях, здаралася, што і ў парку, на летняй сцэне. Напрыклад, у 1870 г. гастролі прыязджых труп праходзілі ў тэатральным памяшканні гарадскіх казармаў, у зімовы сезон 1871/72 гг. — у прыватным тэатральным памяшканні, якое належала Файніцкаму, у 1881/82, 1882/83, 1885/86 гг. — у мураваным будынку Я.Лур'е.

З перапіскі мясцовых улад і Віленскага губернатара Мураўёва за 1865 г. вядомы праект у Магілёве «рускага тэатра». У ім паведамлялася, што ў горадзе ёсць здольныя акцёры, якія маглі б скласці неблагую трупу, але для гэтага патрэбна не менш чым 3000 рублёў на яе ўтрыманне, а таксама на будынак. Пра апошні гаворыцца, што ён згарэў падчас пажару 1848 г. Адбудаваць яго браўся Моўша Ізазонт, але пры гэтым паставіў шэраг умоў: будынак павінен здавацца не менш як на 25 гадоў, арэндная плата складала 1000 рублёў у год. Былі і іншыя ўмовы. На жаль, з архіўных дакументаў невядома, чым скончылася гэта справа. Але ў адным з лістоў Мураўёў адзначае, што грошай на ўтрыманне тэатра ў 1865 г. няма, і ён не разумее, што значыць эпітэт «русский, придаваемый Могилевскому театру», бо тут жывуць усе рускія і таму іншага тэатра быць не можа.

Гораду патрэбен быў пастаянны тэатральны будынак. У пачатку 1880-х г. у губерні быў аб'яўлены збор сродкаў на ўзвядзенне тэатра. Заможныя людзі сустрэлі гэту прапанову прыхільна і падтрымалі ініцыятыву. Будаўніцтва пачалося ў 1886 г., калі была сабрана неабходная сума. Аўтарам праекта стаў епархіяльны архітэктар Пётр Камбураў, якому дапамагаў інжынер В.Міляноўскі. У плане будынак уяўляў сабой прамавугольны аб'ём, у цэнтры якога размяшчалася глядзельная зала на 500 месцаў. У аздобе інтэр'ера была выкарыстана разьба па дрэве (асабліва прыгожая — на губернатарскай ложы). Вонкавае аздабленне, як і інтэр'ера, мела эклектычны характар. Дзве вежачкі і балкон над уваходам, які абапіраўся на некалькі калон, упрыгожвалі фасад будынка. Пазней з тыльнага боку прыбудавалі балкон, на якім у выхадныя дні іграў аркестр. Тэатр быў пабудаваны ў псеўдарускім стылі. Урачыстае адкрыццё адбылося 25 верасня 1888 г. На сцэне ішла прэм'ера п'есы П.Нявежына «Друґая маладосць». Пра цікавасць мясцовай інтэлігенцыі да тэатральнага жыцця сведчыць і той факт, што з 1886 г. ў Магілёве існавала музычна-драматычнае таварыства.

У будынку тэатра ў 19 — пачатку 20 ст. давалі прадстаўленні рускія трупы Пецярбургскага літаратурна-мастацкага тэатра, Малога тэатра, кабарэ «Лятучая мыш», польскія трупы В.Ашпергера, К.Фядзецкага, Я.Хелмікоўскага і інш. Тут выступалі вядомыя акцёры В.Камісаржэўская, П.Арленаў, спевакі Ф.Шаляпін, Л.Собінаў. У 1914 г. ў горадзе гастралявала трупа рускіх акцёраў пад кіраўніцтвам У.Кумельскага, Н.Шэстава.

З.Яцкевіч.

Наш Драматычны

Магілёўскі абласны драматычны тэатр мае сваю гісторыю, насычаную многімі цікавымі і драматычнымі падзеямі. На жаль, не захавалася звестак пра дзейнасць тэатра ў перадваеннныя дзесяцігоддзі. Пасля вызвалення Магілёва ў 1944 г. ў тэатры пачала складвацца трупа акцёраў. Яна стала рэзервам кадраў для іншых тэатраў рэспублікі. У тым жа го-

дзе значная частка артыстаў, сярод якіх былі А.Кістаў, Дз.Арлоў, Г.Абуховіч, І.Рожба, Я.Карнавухаў, стала асновай трупы Рускага драматычнага тэатра імя Горкага (неўзабаве тэатр быў пераведзены ў Мінск). Частка акцёраў, якая засталася, улілася ў калектыў Гомельскага тэатра. З 1946 г. ў Магілёве працаваў драмтэатр, створаны на базе Гомельскага тэатра. У яго рэпертуары: «Гаспадыня гасцініцы» К.Гальдоні (рэжысёр С.Астравумаў), «Каму падпарадкоўваецца час» братоў Тур і Л.Шэйніна (рэжысёр М.Рэхальс), «Старыя сябры» Л.Малюгіна, «Апошнія» М.Горкага, «Позняе каханне» А.Астроўскага, «Рускае пытанне» К.Сіманава (рэжысёр М.Нікіцін) і шэраг іншых пастановак.

У тэатры працавалі заслужаныя артысты БССР М.Абрамаў, Е.Весніна (Едзіткіна), А.Качаткова, заслужаны работнік культуры С.Астравумаў.

У сакавіку 1949 г. тэатр быў расфарміраваны. І толькі 29.10.1954 г. ў горадзе на Дняпры зноў адкрыўся тэатр, створаны на базе пераведзенага сюды Пінскага абласнога драматычнага тэатра.

Узначальвалі Магілёўскі тэатр галоўныя рэжысёры В.Шутаў (1955—64), Б.Валадарскі (1964—70), У.Караткевіч (1970—75), Ю.Міроненка (1976—78), Я.Вялкаў (1978—81), В.Маслюк (1981—83). З канца 1950-х г. у тэатры ставіліся творы беларускіх аўтараў. Грамадскай значнасцю ўзнятых праблем і высокім мастацкім узроўнем, самабытнымі народнымі характарамі вызначаюцца лепшыя спектаклі. Пастаўлены гісторыка-рэвалюцыйная п'еса «Галоўная стаўка» К.Губарэвіча — пра станаўленне савецкай улады ў Магілёве; прысвечаная барацьбе магілёўскіх падпольшчыкаў у Айчынную вайну гераічная драма «Гэта было ў Магілёве» Я.Тарасава; гісторыка-фальклорны твор «Мурын бор» І.Ісачанкі; публіцыстычная драма «Трывога» А.Петрашкевіча; філасофская, высокага драматычнага гучання інсцэніроўка «Судны дзень» паводле аповесці В.Казько «Суд у Слабадзе» — пра знявечанае вайною дзяцінства. Арыгінальным прачытаннем класічнай п'есы Я.Купалы, абвостраным сацыяльным канфліктам, сакавітасцю сцэнічных фарбаў вылучаўся спектакль «Паўлінка». У рэпертуары тэатра: «Дні нашага нараджэння» І.Мележа, «Лявоніха на арбіце» і «Не сумуй, Верачка» («Верачка») А.Макаёнка, «Гандлярка і паэт» і «Сэрца на далоні» паводле І.Шамякіна, «Сотнікаў» паводле В.Быкава, «Даруй мне» К.Губарэвіча, «Пад адным небам» А.Маўзона, «Тры дні і тры ночы», «Амністыя» і «Апошняя інстанцыя» М.Матукоўскага, «Аперацыя «Мнагажэнец» А.Дзяленідзіка, «Выбух» М.Гарулёва і М.Алтухова, «Мала сказаць — кахаю» Л.Караічава. У канцы 1950-х — пачатку 1960-х г. тэатр паставіў на сваёй сцэне гісторыка-рэвалюцыйныя творы, значнае месца ў рэпертуары займалі п'есы К.Сіманава «Гісторыя аднаго кахання», А.Арбузава «Таня», А.Салынскага «Барабанщыца» і «Марыя», С.Алёшына «Усё застаецца людзям», В.Лаўрэнцьева «Шануй бацьку свайго», І.Штока «Ленінградскі праспект», інсцэніроўкі па творах М.Шолахава «Узнятая цаліна», В.Распуціна «Грошы для Марыі». Ставілася таксама руская і замежная класіка: «Гора ад розуму» А.Грыбаедава, «Ягор Булычоў і іншыя» і «Варвары» М.Горкага, «Тры сястры» А.Чэхава, «Жаніцьба Бальзамінава» А.Астроўскага, «Каварства і каханне» і «Марыя Сцюарт» Ф.Шылера, «Нора» Г.Ібсена; п'есы і інсцэніроўкі па творах тагачасных замежных аўтараў: «Замак Броўдзі» паводле А.Кроніна, «Арфей спускаецца ў пекла» Т.Уільямса, «Візіт дамы» («Візіт старой дамы») Ф.Дзюрэнмата і інш. Шмат п'ес пастаўлена для дзяцей і юнацтва: «Два клёны» і «Снежная каралева» Я.Шварца, «Вялікі чараўнік» В.Губарава, «Казка пра чатырох блізнят» П.Манчава, «Зайчык-зазнайчык» С.Міхалкова, «Пунсовая кветачка» паводле С.Аксакава, «Чортаў млын» Я.Дрды і І.Штока, «РВС» паводле А.Гайдара, «Твае шаснаццаць» Т.Ян, «Брэменскія музыканты» паводле братоў Грым і інш. У 1970-я гг. трупа папоўнілася маладымі акцёрамі, пашырыўся творчы дыяпазон калектыву, вялікая ўвага надавалася выразнасці сцэнаграфіі і музычнага афармлення, разнастайнасці выяўленчых сродкаў. Ажыццёўлены пастаноўкі «Клоп» У.Маякоўскага, «І смех і грэх» («Збянтэжаны Саўка» Л.Родзевіча і «Прымакі» Я.Купалы), «Каса марэ» І.Друцэ, «Інтэрв'ю ў Буэнас-Айрэсе» Г.Баравіка, «За ўсё добрае — смерць» Р.Ібрагімбекава, «Каханне, джаз і чорт» Ю.Грушаса.

У розны час у тэатры працавалі народны артыст СССР Я.Палосін, народны артыст Беларусі С.С.Бульчык, заслужаныя артысты Беларусі Ю.Гальперына, В.Гусеў, А.Данілоўіч, В.Кабатнікава, Г.Качаткова, Н.Караткевіч, З.Малчанава, А.Раеўскі (рэжысёр), А.Рудакоў, Ю.Труханаў, Н.Фядзяева,

С.Яворскі, А.Яфрэменка, заслужаная артыстка РСФСР Э.Міхайлава. Зараз тэатр узначальвае В.П.Курзалаў (галоўны рэжысёр і мастацкі кіраўнік). Галоўны мастак тэатра М.Волахаў. Цёпла прыняты гледачамі апошнія работы тэатра — «Нос» Н.Садур, «Старое танга» К.Гарастаса, пастаўленыя маладымі рэжысёрамі У.Шчэрбанем і М.Ласіцкім, «Тарцюф» Мальера і інш. Радуюць гледачоў сваім талентам народны артыст Расіі М.І.Радзівонаў, заслужаны артыст Расіі А.А.Палкін, заслужаныя артысты Беларусі Г.Я.Белацаркоўскі, С.Э.Кліменка, артысты Зоя Бурцава, Аляксандр П'янкін і многія іншыя.

Т.Дз.Арлова, Г.І.Сяўковіч.

***

Так, усё сказанае пра наш драматычны, здабыткі, радасці і пакуты яго творчых калектываў розных часоў адпавядаюць сапраўднасці. Мне застаецца толькі дапоўніць сказанае словамі аб тым, што будынак тэатра, які стаў помнікам архітэктуры, да радасці акцёраў і ўсіх магіляўчан, існуе, хаця многіх яго сучаснікаў напаткаў лёс куды больш сумны.

Тварэнне выдатнага архітэктара П.Камбурава існуе каля 110 гадоў. Тэрмін не такі ўжо і малы: і дрэва, і цэгла пачалі зношвацца. Апошнія 30—35 гадоў акцёры і гледачы з небяспекай паглядалі на столь і сцены глядзельнай залы: ці не звaліцца што на галаву? Будынак патрабаваў неадкладнай рэканструкцыі. Магілёўскім архітэктарам У.М.Кузняцовым быў зроблены добры праект яе ажыццяўлення, але... у Міністэрстве культуры БССР на гэтыя мэты не знаходзілася сродкаў, а ў мясцовых чыноўнікаў — жадання захаваць выдатны помнік дойлідства.

За тры гады да стогадовага юбілею тэатра Міністэрства культуры Беларусі выдзеліла Магілёву 7 мільёнаў рублёў на ўзвядзенне новага будынка тэатра. А што ж меркавалася зрабіць з помнікам архітэктуры, які мог служыць Мельпамене яшчэ сотні год? Узарваць, як узарвалі нямала збудаванняў многавекавой даўніны.

Але на абарону тэатра ўстала ўсё насельніцтва горада. І тэатр, хвала Усявышняму, будзе яшчэ доўга існаваць: да яго прыйшлі будаўнікі. Зараз будынак тэатра на рэстаўрацыі. Пройдзе пэўны час, і ў славуты помнік дойлідства на спектаклі, як заўжды, будзем хадзіць мы, нашы дзеці, унукі і праўнукі...

М.Волахаў.

ВОЛАХАЎ Марк Мікалаевіч. Нарадзіўся 10.9.1921 г. ў Маскве. Беларускі тэатральны мастак. У 1940 г. скончыў Маскоўскае мастацкае вучылішча. З 1957 г. мастак, з 1964 г. галоўны мастак Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра. Афарміў спектаклі: «Галоўная стаўка» К.Губарэвіча (1957), «Дзядзька Ваня» А.Чэхава (1960), «Гэта было ў Магілёве» Я.Тарасава (1964), «Паўлінка» Я.Купалы (1971), «Апошняя суніца ў жніўні» А.Дзялендзіка (1975), «Арфей спускаецца ў пекла» Т.Уільямса (1977), «Марыя Сцюарт» Ф.Шылера (1980), «Тутэйшыя» Я.Купалы (1982), «Судны дзень» В.Казько (1983), «Сівы бусел» В.Ткачова (1984), «Сабачае сэрца» паводле М.Булгакава (1988), «Каварства і каханне» Шылера (1992), «Рычард III» У.Шэкспіра (1995) і інш.

Крыху аб народнай творчасці

Магілёў ва ўсе часы славіўся народнай творчасцю. Цяпер у горадзе каля 250 самадзейных калектываў, створаных у школах, вучылішчах, інстытутах, пры палацах і дамах культуры розных прадпрыемстваў. У іх удзельнічаюць больш за 15 тысяч школьнікаў, студэнтаў, рабочых і служачых, творчай інтэлігенцыі. Аматары-магіляўчане захапляюцца тэатрам, музыкай і харэаграфіяй, выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным, фота- і кінамастацтвам.

За апошнія 30 гадоў 36 самадзейных калектываў Магілёва былі ўдастоены звання народных, 13 дзіцячых — звання ўзорных. Да іх з вялікай павагай адносяцца не толькі ў горадзе, але і за яго межамі і нават за межамі рэспублікі.

Сярод самадзейных калектываў, удастоеных ганаровых званняў, ёсць удзельнікі і дыпламанты абласных і рэспубліканскіх аглядаў і конкурсаў. Многія з іх выступаюць не толькі на сцэнах горада, але і ў райцэнтрах вобласці, іншых гарадах рэспублікі. Агіттэатр «Усмешка» Палаца культуры завода штучнага валакна імя Куйбышава, харавая капэла і аркестр народных інструментаў га-

радскога Дома культуры, напрыклад, выступалі ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, Мінску, Рызе, у Балгарыі, Польшчы і іншых гарадах і краінах.

Вялікай павагай у магіляўчан карыстаюцца і самадзейныя тэатры, якія існуюць ужо амаль 50 гадоў пры Доме культуры аддзялення чыгункі і Доме культуры аўтазавода імя С.М.Кірава. У рэпертуары гэтых тэатраў творы У.Шэкспіра, М.Горкага, А.Чэхава, Я.Купалы, Я.Коласа, К.Крапівы, сучасных аўтараў.

Заўсёды бываюць перапоўнены залы, калі з канцэртамі перад аднагодкамі выступае ансамбль песні і танца абласнога Палаца школьнікаў. Цяпер у Магілёве дзейнічаюць наступныя народныя і ўзорныя калектывы (даюцца з датай прысваення ганаровага звання): аб'яднаны хор народнай песні (1981) і тэатр «Усмешка» Палаца культуры завода штучнага валакна (1967), ансамбль песні і танца «Прасніца» Палаца культуры і тэхнікі вытворчага аб'яднання «Хімвалакно» (1978), ансамбль танца «Вянок» Палаца культуры завода штучнага валакна (1964), ансамбль танца «Вяснянка» Дома культуры аўтазавода (1969), ансамбль танца «Дружба» (1970) і хор ветэранаў Дома культуры швейнай фабрыкі імя В.Валадарскага (1990), ансамбль танца «Калінка» клуба завода «Строммашына» (1980), аркестр рускіх народных інструментаў гарадскога Дома культуры (1968), вакальны ансамбль «Равеснікі» Дома культуры чыгуначнікаў (1984), духавы аркестр Палаца культуры і тэхнікі вытворчага аб'яднання «Хімвалакно» (1978), жаночы хор педагагічнага вучылішча імя К.Дз.Ушынскага (1981), сімфанічны аркестр гарадскога Дома культуры (1965), тэатр Дома культуры аўтамабільнага завода імя С.М.Кірава (1967), тэатр Дома культуры чыгуначнікаў (1959), тэатр Палаца культуры завода штучнага валакна (1967), тэатр Палаца культуры і тэхнікі вытворчага аб'яднання «Хімвалакно» (1981), фотакінаклуб «Вясёлка» гарадскога Дома культуры (1976), хор народнай песні вучэбна-вытворчага прадпрыемства Беларускага таварыства сляпых (1982), хор народнай песні Дома культуры швейнай фабрыкі (1973), агітбрыгада «Факел» гарадскога Дома настаўнікаў (1990) і інш. Узорныя дзіцячыя калектывы: вакальна-інструментальны ансамбль «Вясёлыя ноткі» СШ № 5 (1981), агіттэатр «Юнацтва» (1980), ансамбль танца «Радасць» Палаца культуры завода штучнага валакна (1976), ансамбль гісторыка-бытавога танца «Менуэт» Палаца культуры і тэхнікі вытворчага аб'яднання «Хімвалакно» (1978), ансамбль танца «Вясёлка» Дома культуры аўтазавода (1979), духавы аркестр абласнога Палаца школьнікаў (1978), духавы аркестр (1979) і хор (1975) Дома культуры аўтазавода, хор Палаца культуры завода штучнага валакна (1978) і інш. *Н.Міхайлава.*

Пэндзаль і разец у надзейных руках

Многія мастакі-магіляўчане, якія маюць у асноўным прафесійную падрыхтоўку, умела валодаюць пэндзлем і разцом, актыўна ўдзельнічаюць у дзейнасці Саюза мастакоў Беларусі. Іх творы можна ўбачыць практычна на кожнай рэспубліканскай і, вядома, на абласных выстаўках, а таленавітыя работы жывапісцаў В.В.Шпартава, М.Е. і Г.Ф.Таболічаў і іншых нярэдка экспануюцца і за мяжой. Прыкметна расце майстэрства маладых мастакоў. Напрыклад, Г.Н.Конанаў і Г.В.Матусевіч у 1990 г. дэманстравалі свой талент на персанальных выстаўках. Далёка не кожны майстар пэндзля дазволіць сабе гэта.

Нельга не сказаць аб тым, што і магілёўскія скульптары В.Ф.Байцун, Н.І.Кавалёў, В.Л.Конанаў, С.А.Дамарацкі, В.П.Усцінаў і іншыя ўносяць важкі ўклад у стварэнне манументальнага летапісу горада. Жыхары і госці Магілёва прыхільна ўспрынялі паяўленне на фасадах будынкаў арыгінальных мемарыяльных дошак.

Працуе ў горадзе вялікая група мастакоў-графікаў: Н.І.Ліханенка, Ф.І.Кісялёў, Б.В.Камароў, Б.І.Пярвунінскіх, А.Н.Ціткоў, муж і жонка Юрковы. Яны вядомыя не толькі ў рэспубліцы і краіне, але і за мяжой, іх акварэлі атрымалі высокую ацэнку ў Польшчы, Балгарыі і Францыі. Глыбінёй філасофскага абагульнення з'яў жыцця, філігранай тэхнікай вызначаюцца акварэлі А.Н.Ціткова. Любоў да прыроды, да гісторыі беларускага народа і Магілёўшчыны пранізвае работы В.В.Камарова. Паспяхова асвойваецца і тэхніка каляровай гравюры, дзе першынство належыць Б.І.Пярвунінскіх і В.І.Юрковай.

Ёсць у Магілёве таленавітыя майстры кніжнай і прамысловай графікі, спецыялісты

дызайнерскіх распрацовак (А.Б.Суворaў, Г.Н.Карчэўскі), манументальнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (Ю.М.Несцярук, М.Я.Латушка, Л.П.Сівакова, А.В.Маляревіч і інш.). Іх работы ўпрыгожваюць інтэр'еры абласной бібліятэкі імя Леніна, Палаца шлюбаў, музычнай і многіх агульнаадукацыйных школ. Пры распрацоўцы інтэр'ераў будынкаў і збудаванняў майстры-мастакі заўсёды ставяць перад сабой галоўную задачу — увязаць усе віды выяўленчага мастацтва ў адзіную гарманічную кампазіцыю. Плённа працуюць у гэтым напрамку мастакі М.В.Несцярук, Г.Г.Аляксеева, Е.Б.Кубіч, В.В.Рабчанок. Аднак трэба прызнаць, што творчы патэнцыял майстроў пэндзля і разца выкарыстоўваецца недастаткова.

К.Аляксееў.

З літаратурнай спадчыны

Літаратурнае жыццё Магілёва прыкметна ажывілася ў пачатку 1920-х гадоў. У той час ствараліся шматлікія літаратурныя гурткі, аб'яднанні. У 1923 г. ў Мінску выдаваўся літаратурна-мастацкі часопіс «Маладняк», праз два гады філія маладнякоўцаў узнікла і ў Магілёве. Адзін з арганізатараў яе — выкладчык беларускай мовы і літаратуры Магілёўскага педтэхнікума, вядомы драматург Васіль Гарбацэвіч. Тут свае першыя крокі ў літаратуру рабілі навучэнцы педтэхнікума, а пазней вядомыя пісьменнікі Кастусь Губарэвіч, Юрка Лявонны і інш. Свае творы яны змяшчалі ў газеце «Соха и молот», яе літаратурным дадатку «Зарніцы», газеце «Магілёўскі селянін», літаратурным зборніку «Дняпроўскія ўсплёскі», а таксама ў рэспубліканскім перыядычным друку. Філія клапацілася аб творчай вучобе моладзі, прапагандзе роднай мовы, культуры, літаратуры, праводзіла літаратурна-мастацкія вечары, сустрэчы з вядомымі пісьменнікамі.

Але ў той час на Беларусі, як і ва ўсёй краіне, разгарнулася жорсткая барацьба літаратурных плыней. Казарменны сацыялізм набіраў сілу, камандна-адміністрацыйная сістэма імкнулася як мага тужэй зацугляць пісьменнікаў, пазбавіць іх уласных поглядаў, меркаванняў, падпарадкаваць генеральнай лініі партыі бальшавікоў. Знікалі пісьменніцкія аб'яднанні, усё большую сілу набіраў РАПП (Расійская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў), а ў нашай рэспубліцы адпаведна — Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў. У лістападзе 1928 г. літаратурная суполка ў Магілёве была аб'яўлена філіяй Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў, хоць практычна ў яе творчым накірунку прыкметных змен не назіралася. У 1929 г. філія выпусціла зборнік «Ранне», дзе былі змешчаны вершы тады яшчэ юнага паэта з в. Саматэвічы Касцюковіцкага раёна Аркадзя Куляшова. Пединстытут невыпадкова быў названы імем нашага земляка, народнага пісьменніка Беларусі. Гэта навучальная ўстанова стала кузняй не толькі педагагічных, але і пісьменніцкіх кадраў. Пасля стварэння Саюза пісьменнікаў СССР у 1934 г. Магілёў ператварыўся ў цэнтр літаратурнага жыцця. Літаратурную суполку ўзначаліў выкладчык інстытута Іван Васілевіч Гутараў, пазней вядомы літаратуразнавец і фальклярыст, член-карэспандэнт АН БССР. Пад яго кіраўніцтвам сваю сцяжыну ў літаратуру праклалі былыя студэнты пединстытута Васіль Матэвушаў (меў тады псеўданім Васіль Нёман), Дзмітрый Палітыка, Уладзімір Агіевіч. У 1935 г. пры ўдзеле літаб'яднання была напісана кніга «На Цішоўскай пустцы» — аб узвядзенні на ўскраіне Магілёва шаўковай фабрыкі (цяперашні завод штучнага валакна імя Куйбышава). Яна выйшла ў Беларускім дзяржаўным выдавецтве пад рэдакцыяй Платона Галавача і Васіля Каваля, загубленых у 1937 г. Перад самай вайной у абласной газеце «Камунар Магілёўшчыны» пачалі друкавацца студэнты пединстытута, будучыя вядомыя пісьменнікі Мікола Гарулёў, Пятро Шасцерыкоў, Эдуард Валасевіч.

У рэдакцыі «Камунара Магілёўшчыны» працаваў у той час малады паэт Уладзімір Рагуцкі. У 1940 г. Дзяржаўнае выдавецтва прыняло да друку яго першы вершаваны зборнік. Але пачалася вайна, рукапіс загінуў, як і сам Уладзімір Рагуцкі, які абараняў ад захопнікаў родную зямлю.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны літаб'яднанне «Прыдняпроўе» пры абласной газеце (тады называлася «За Радзіму») узначаліў яе адказны сакратар Мікола Ткачоў, які знаходзіў час і для працы над рукапісам свайго рамана «Згуртаванасць» пра партызанскі рух

на Магілёўшчыне, удзельнікам якога быў сам. Потым, калі працаваў у Мінску, Мікола Гаўрылавіч Ткачоў не парываў сувязі з землякамі, дбаў аб выхаванні тут літаратурнай змены.

Калі ён перайшоў на пасаду адказнага сакратара ў рэдакцыю часопіса «Полымя», літаб'яднанне ўзначаліў Васіль Матэвушаў — самабытны паэт, якога справядліва называлі песняром Прыдняпроўскага краю. За яго вершаванымі пейзажамі праглядвае душа сучасніка — руплівага гаспадара сваёй зямлі. Прырода як бы зліваецца з чалавекам, а лёс чалавека, народа неабыякавы паэту, бо ён і сам часцінка яго. Сіламі мясцовых пісьменнікаў былі выпушчаны літаратурна-мастацкія зборнікі «Літаратурны Магілёў» (кн. 1—2, 1949—50), «Дняпро» (1957), «Прыдняпроўе» (1958). У Магілёўскім абласным драматычным тэатры былі пастаўлены на роднай мове спектаклі паводле п'ес членаў літаб'яднання Івана Тарасава («Гэта было ў Магілёве») і Івана Ісачанкі («Мурын бор»). З літаб'яднання «Прыдняпроўе» пайшлі ў мастацкую літаратуру Сцяпан Гаўрусёў, Аляксей Пысін, Ігар Шклярэўскі, Анатоль Сербантовіч, Марыя Шаўчонак, Яўген Крупенька, Віктар Карамазаў, Святлана Марчанка, Васіль Карпечанка, Святлана Басуматрава і іншыя паэты і празаікі.

У красавіку 1960 г. ў Магілёве было створана першае ў рэспубліцы абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў БССР. Яго ўзначаліў Пятро Шасцерыкоў. Удзельнік Айчыннай вайны, пасля перамогі ён зноў вярнуўся на Магілёўшчыну, стаў працаваць журналістам. П.Шасцерыкоў напісаў аповесць «Камень за каменем» пра аднаўленне роднага горада, моладзі прысвечаны яго аповесці «На ўсё жыццё», «Сонечны прамень», школьнікам — «Звіні, званок!». У другім, дапоўненым, выданні кнігі «Салдатамі былі ўсе» занатаваны ўспаміны ўдзельнікаў абароны Магілёва пра цяжкае лета 1941-га, антыфашысцкае падполле і вызваленне горада ад гітлераўцаў.

З 1974 г. і да апошніх дзён жыцця сакратаром абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі быў вядомы паэт Аляксей Пысін. Ад кнігі да кнігі сталеў яго паэтычны голас. За зборнік «Твае далоні» (1967) Аляксей Васілевіч удастоены Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы. Галоўная тэма паэта — ваенныя будні, франтавыя дарогі, якімі ён прайшоў у салдацкім шынялі. Погляд у гераічнае мінулае і сённяшні дзень вачыма загубленых



Мемарыяльная дошка А.В.Пысіну.

баявых сяброў — крытэрый памяці кожнага яго твора. На доме № 35 па праспекце Міру ў Магілёве, дзе жыў А.Пысін, удзячныя землякі ўстанавілі мемарыяльную дошку з барэльефам паэта.

Значны ўклад у літаратуру ўнеслі таксама празаік Мікола Герасімаў, аўтар рамана «Вузлы», аповесцей «Дзе сыходзяцца берагі», «Агонь над Калічэўкай», «Заўтрашні дзень належыць табе» (усё на рускай мове); крытык-літаратуразнаўца, кандыдат філалагічных навук Алесь Макарэвіч — аўтар кніг «Сатыра Кандрата Крапівы», «Ад песень і думак народных», «Фальклорныя матывы ў драматургіі Янкі Купалы» і іншых літаратуразнаўчых твораў, вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў. Далёка за межамі Магілёва вядомы працы пісьменнікаў Аркадзя Кандрусевіча і Пятра Шасцерыкова, крытыка-літаратуразнаўца Якуба Усікава. На жаль, гэтых таленавітых людзей ужо няма побач з намі.

У Магілёве жывуць і працуюць члены абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі празаік Мікола Лук'янаў, паэты Аляксандр Мельнікаў, Васіль Карпечанка, крытык-літаратуразнаўца Мікола Луфераў. Разам з журналістамі вобласці пісьменнікі падрыхтавалі і выдалі зборнікі «Людзі Прыдняпроўя» (1961), «Справы іх золатам гараць» (1976, на рускай мове), нарысы пра Герояў Сацыялістычнай Працы, кнігі «Ад сэрца да сэрца» (1985, на рускай мове), пра дружбу працоўных Магілёўшчыны і Габраўскай акругі Балгарыі.

Магілёўскае аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі падтрымлівае творчыя сувязі з літаратарамі Улацлаўскага ваяводства (Польшча), Бранскай (Расія) і Ровенскай (Украіна) абласцей.

І.Аношкін.

Друк у Магілёве

Пачатак кнігадрукавання ў Магілёве звязаны з дзейнасцю Магілёўскай брацкай друкарні (1616—1773), дзе выдавалася павучальная літаратура на беларускай, грэчаскай, лацінскай і польскай мовах. Вядомыя кнігавыдаўцы ў 1630—40-я гг. — Спірыдон Собаль і Фёдар Грышановіч. З 1676 г. кнігі на беларускай і польскай мовах друкаваліся ў брацкай друкарні пры Богаяўленскім кляштары. Дзейнасць друкарні асабліва актывізавалася ў канцы 17 ст., калі яе ўзначаліў беларускі гравёр па медзі Максім Вашчанка. Друкаваліся кнігі царкоўнага і свецкага зместу (творы І.Галятоўскага, А.Стаўравецкага, І.Дамаскіна, Г.Каніскага і інш.). Выдадзеная Вашчанкам кніга «Акафісты і каноны» (1693) была аздоблена мноствам гравюр, а напісаная прадмова сведчыла пра яго асветніцкія і гуманістычныя погляды. Выданні мелі тытульныя лісты, застаўкі, буквіцы, канцоўкі, мініяцюры. На тытульным лісце кнігі «Жыція святых» Дзмітрыя Растоўскага (1702) змешчана свецкая ілюстрацыя: пейзаж Магілёва з сілуэтамі пабудоў грамадзянскага прызначэння. У 18 ст. друкарня Магілёўскага брацтва Богаяўлення была адзінай дзеючай друкарняй на Беларусі. У 18 ст. тут выдадзены 33 кнігі на старажытнаславянскай мове. У 1762 г. ў Магілёве надрукаваны «Псалтыр», які выдаў Пётр Мсціславец у Вільні ў 1576 г. У 1774—1844 гг. працавала Магілёўская кансісторская друкарня, дзе выкарыстоўваўся грамадзянскі шрыфт. У 1777 г. тут выйшла першая на Беларусі кніга на рускай мове грамадзянскага друку «Установы для ўпраўлення губерняй». За час існавання друкарні выдадзена 65 кніг пераважна свецкага характару, у тым ліку на лацінскай і польскай мовах «Пра паэтычнае майстэрства» Ф.Пракаповіча (1786). Нядоўгай была дзейнасць друкарні протаіерэя Міхаіла Стральбецкага, які выдаў «Часаслоў» (1797) і «Акафісты» (1798).

У 1818 г. ў Магілёве выйшаў з друку 3-і выпуск «Отечественного памятника» — першага на Беларусі часопіса. Ён быў падрыхтаваны Фердынандам Орля-Ашмянцам, выкладчыкам рымскай і польскай моў і літаратур Магілёўскай гімназіі.

Займалася выпускам кніг і ваенна-паходная друкарня Галоўнага штаба 1-й рускай арміі. Трэцяя частка ўсёй кніжнай прадукцыі, якая выдавалася ў 2-й палавіне 19 — пачатку 20 ст., належала Магілёўскай губернскай друкарні (1833—1917). Яе выданні вызначаліся тэматычнай разнастайнасцю. Гэта штогадовыя даведнікі, якія адлюстроўвалі адміністрацыйнае і гаспадарча-эканамічнае жыццё губерні, «Памятныя кніжкі Магілёўскай губерні» (1861—1916) і «Агляды Магілёўскай губерні» (1879—1915), «Спроба апісання Магілёўскай губерні...» пад рэдакцыяй А.С.Дамбавецкага (кн. 1—3, 1882—84), зборнікі артыкулаў «Магілёўская даўніна» пад рэдакцыяй Е.Р.Раманава (вып. 1—3, 1900—03), адрасы-календары, статыстычныя табліцы і справаздачы пра стан Магілёўскай губерні і яе асобных паветаў, літаратура па гісторыі, эканоміцы, сельскай гаспадарцы, кіраванні, праблемах асветы, мастацкая, у тым ліку на беларускай мове «Тарас на Парнасе і іншыя беларускія вершы» (1900, 1902).

У другой палавіне 19 ст. ў Магілёве з'явіліся прыватныя друкарні Х.Эліяшберга, Ш.Фрыдланда, Я.Падземскага і інш. У 1910 г. іх было 17. Друкарня Фрыдланда (1881—1917) выдала 109 кніг, сярод якіх масава-палітычныя, вытворчыя, навуковыя, вучэбныя, мастацкія, даведачныя. Некаторыя мелі праблемны характар, напрыклад «Чаго трэба жадаць для нашага грамадскага выхавання: Да пытання пра сучасны стан і паляпшэнне нашай школьна-вучэбнай і выхаваўчай справы» П.Барысоўскага (1895), «Дзе шукаць корань нашых эканамічна-гаспадарчых няшчасцяў...» Ф.К.Глінкі (1899) і інш. 111 кніг універсальнай тэматыкі ўбачылі свет у друкарні Падземскага (1886—1917): статыстычныя справаздачы паветаў Магілёўскай губерні, «Словы і прамовы Георгія Каніскага, архіепіскапа Магілёўскага» (1892), «Зборнік гімнастычных гульняў і забаў, якія прымяняюцца ў час урокаў гімнастыкі і перапынкаў у мужчынскіх навучальнах установах: Для хлопчыкаў і юнакоў» В.Канапасевіча (1895), «Земска-ўрачэбная арганізацыя Магілёўскай губерні і яе дзейнасць за 1905 год» К.Ю.Канановіча (1907), «Аб стане ў Магілёўскай губерні саматужнай прамысловасці і пра неабходнасць прыняцця мер да яе ўздыму» І.М.Мусерскага (1910), «1812 год. Напалеон у межах Магілёўскай губерні. Гістарычны нарыс» А.П.Лучыны (1912), «Народная асвета ў Магілёўскай губерні за 1912—13 навучальны год» (1913) і інш.

Да пачатку 20 ст. Магілёў стаў другім пасля Мінска кнігавыдавецкім цэнтрам Беларусі. За 1801—1917 гг. тут надрукавана каля 800 выданняў (больш за 1300 тамоў). У 1908 г. выйшлі 15 кніг, у 1911 г. — 51. Адкрыта 10 паліграфічных прадпрыемстваў: А.І.Шнэйдэра (за 1901—12 гг. надрукавана 6 назваў кніг), А.Г.Сыркіна (1904, 1), І.Б.Клаза і М.Л.Кагана (1910—17, 16), Ш.І.Іофе (1910, 1), Б.Рабіновіча (1911—17, 15), А.І.Шнэйдэра і Ш.З.Шайна (1912, 1), І.Б.Клаза (1913—17, 22), Акслера (1915, 2), Клаза, Кагана, Шнэйдэра (1915, 1), братоў Зусьманаў (1917, 2). У ведамасных і прыватных друкарнях выпускалася літаратура на рускай мове. На сумесных асновах выдаўцы Магілёва і іншых гарадоў выпускалі кнігі на польскай мове. Так, у Пецярбургу выдавец Б.Вольф, які меў кнігарню ў Магілёве, надрукаваў (месцам выдання пазначаны Магілёў і Пецярбург) творы Ю.Крашэўскага («Хата за вёскай», 1854, «Камедыянты» і «Палеская аповесць», 1855), У.Сыракомлі («Народжаны Ян Дзембаруг», 1854), Ю.Кажанеўскага («Пан Сталніковіч Валынскі», 1854), З.Кашкоўскага («Пабрацімы», 1854, «Унучаты» і «Гняздо Нячуноў», 1855); працы І.Фрэдра («Гісторыя польскага народа...», 1855, пераклад з лацінскай мовы і каментарыі Сыракомлі), І.Кітовіча і інш. У Вільні (і Магілёве) выдадзены «Народжаны Ян Дзембаруг» і «Пабрацімы» (1855, друкарня Я.Венхобера), «Нашы дзеці» А.Вільчынскага (1855, друкарня І.Сыркіна), у Варшаве (і Магілёве) — «Кніжныя дробязі» А.Вільчынскага (1850), «Дамашняя аповесць» К.Вуйціцкага (1853; друкарня І.Унгра), «Нататкі Барталамея Міхайлоўскага» Х.Жавускага (1857, друкарня «Штодзённая газета»). Пасля таго як былі падзелены выдавецкія і друкарскія функцыі, кнігавыдавецтва стала прыватным і казённым ведамасным. Самым буйным прыватным выдаўцом быў Ш.І.Іофе, які выпусціў дапаможнікі для вывучэння французскай і нямецкай моў («Поўны ключ да французскай хрэстаматыі» В.І.Люцальшваба, 1912—13, друкарня Рабіновіча). Іншыя прыватныя выдаўцы пачатку 20 ст. (Жаўлачкаў, Пясочанскі, Шэйн і іншыя) выпусцілі толькі па адной кнізе: «Уводзіны ў аналіз: Элементарная тэорыя комплексных велічынь» Л.К.Лахціна (1909, выдавец — студэнт І.М.Самойлаў) і «Падрабязна распрацаваная храналогія па старажытнай, сярэдняй і новай гісторыі» (1912, выдавец А.Г.Ліфшыц) у друкарні Падземскага, альманах «Магілёў за 1912 год (Артыкулы, нататкі і фельетоны)» (1913, выдаўцы І.М. і Б.Р.), «Магілёўскі альманах за 1913 год: Артыкулы, фельетоны і нататкі» (1914, выдавец І.М.) і «Да 25-годдзя магілёўскага тэатра, 1888—1913 гг.» Мірскага—Ісаева (1913, выдавец П.Г.Камбураў) у друкарні Рабіновіча. Сярод ведамасных — выдавецтвы Магілёўскага губернскага земства, губернскага статыстычнага камітэта, статыстычнага аддзялення земскай управы, Магілёўскага беларускага камітэта, Магілёўскага місіянерскага савета, гісторыка-статыстычнага камітэта пры Магілёўскай духоўнай семінарыі, таварыства «Пчаляр», перакладчыкаў, рэдакцыі «Могилевские епархиальные ведомости», «Вёска і земства», «Эксперт». З'явіліся кнігі праблемнага характару па пытаннях навукі і культуры, палітыкі, гаспадарчай дзейнасці. У пачатку 20 ст. ў горадзе існавала падпольная друкарня Магілёўскай арганізацыі РСДРП, якая выпускала агітацыйную нелегальную літаратуру, рэвалюцыйныя лістоўкі. З пачаткам 1-й сусветнай вайны выпуск кніг у Магілёве скараціўся.

У Магілёве друкаваліся, акрамя таго, перыядычныя выданні (газеты, часопісы), а таксама працы, справаздачы, пратаколы, даклады розных устаноў і грамадскіх арганізацый. Першая газета ў горадзе — «Могилевские губернские ведомости» — друкавалася ў 1838—1917 гг. у губернскай друкарні. У ёй змяшчаліся афіцыйныя матэрыялы ўрадавых і мясцовых губернскіх органаў, у неафіцыйнай частцы — артыкулы па краязнаўстве, гісторыі, фальклоры, этнаграфіі, звесткі пра культурнае жыццё горада і губерні. У 1883—1917 гг. выдаваліся «Могилевские епархиальные ведомости» з дадаткам — рэлігійна-маральным часопісам «Воскресенье». У пачатку 20 ст. выданні перыёдыкі значна актывізаваліся. У 1901 г. выйшлі 2 нумары «Могилевского листка объявлений» (рэдактар-выдавец А.Я.Сыркін). Газета «Могилевские губернские ведомости» мела дадаткі «Сельскохозяйственный листок» (у 1901 выйшлі 9 нумароў) і «Могилевский листок сельского хозяйства» (1902—05, рэдактары А.М.Каралько, Р.В.Кербель). Апрача афіцыйных друкаваліся грамадска-палітычныя і літаратурныя газеты: штодзённыя «Могилевский голос» (1906) і «Могилевский курьер» (1911, рэдактар-выдавец Л.М.Сасонкін), «Могилевский вестник» (1906—17, рэдактар-выдавец М.Каханоўіч) з дадаткам «Вестник земского хозяй-

ства Могилевской губернии» (1907—08, штотыднёва, рэдактар Пілін) і «Листок Коммерческого отдела Могилевского общества сельского хозяйства» (1908—09, штомесячна, рэдактар В.П.Макоўскі, рэдактар-выдавец І.С.Галынскі). Магілёўская губернская ўправа па справах земскай гаспадаркі акрамя дадаткаў выдавала штодзённыя газеты «Могилевская земская неделя» (1910, рэдактары В.А.Судзілоўскі, Н.Н.Бекман) і «Могилевская жизнь» (1917, выйшлі 104 нумары, рэдактары Ю.Ю.Бехлі, П.І.Калтаноўскі, В.В.Станевіч і інш.), «Вестник Могилевского земства» (1914—17, рэдактары В.І.Куніцын, В.Т.Гартынскі, І.М.Мусерскі), «Бюллетень» (Могилевского губернского земства) (1916—17). У 1910—11 гг. выходзіў штомесячны часопіс для настаўнікаў і дзеячаў народнай адукацыі «Белорусский учительский вестник» (рэдактар-выдавец Н.Е.Казлоў) і Таварыства ўзаемадапамогі настаўнікам народных вучылішчаў Магілёўскай губерні. Некалькі выданняў мела Таварыства сельскай гаспадаркі. У 1917 г. ў Магілёве друкаваліся штомесячныя «Циркуляры по Виленскому учебному округу».

У час 1-й сусветнай вайны ў Магілёве, дзе была размешчана Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага, дзейнічалі розныя палітычныя арганізацыі і партыі, таму было шмат выданняў розных арыентацый. Для бясплатнага распаўсюджвання ў войсках выдаваліся «Наш вестник» (1915—17) з штотыднёвым ілюстраваным літаратурным дадаткам; пры штабе галоўнакамандуючага арміямі Заходняга фронту — беспартыйны сацыялістычны орган «Свобода, равенство и братство» (красавік—ліпень 1917); газета «Живое слово» (сакавік—кастрычнік 1917), якая падтрымлівала палітыку Часовага ўрада; органы Стаўкі Часовага ўрада «Вестник главного комитета союза офицеров армии и флота» (май—верасень 1917) і «Бюллетень штаба Верховного главнокомандующего» (красавік—лістапад 1917). У час акупацыі Магілёва войскамі генерала Доўбар-Мусніцкага і кайзераўскай Германіі (з сакавіка па кастрычнік 1918) групай белагвардзейскіх афіцэраў выдавалася газета «Труд» (сакавік—жнівень 1918), кадэтамі — «Эхо» (з ліпеня 1918).

У лістападзе 1917 — сакавіку 1918 гг. выходзілі штодзённая бальшавіцкая газета «Революционная ставка» (орган ВРК пры Стаўцы, са снежня 1917 — орган ЦК дзеючых армій і флоту); у маі—верасні 1917 г. газета «Молот» (са студзеня 1918 называлася «Известия Могилевского Совета рабочих и солдатских депутатов», з № 11 «Известия Могилевского губернского исполнительного комитета Советов крестьянских, солдатских и рабочих депутатов»); у лістападзе—снежні 1918 г. — «Известия Могилевского губернского революционного комитета»; у лістападзе 1917 — лютым 1918 г. — «Известия Военно-революционного комитета Могилевской губернии»; у кастрычніку—снежні 1917 г. — «Бюллетень Могилевского исполнительного комитета Совета рабочих и солдатских депутатов».

У 1919—21 гг. Магілёўскае аддзяленне РОСТА выпускала свае насценныя газеты. У горадзе выходзілі газета «Красноармеец» (сакавік 1919 — май 1921, орган палітаддзела Рэўваенсавета 16-й арміі), аднадзённыя газеты «Неделя ребёнка» (лістапад—снежань 1920, выдавалася камісіяй па правядзенні тыдня дзіцяці), «Красный Октябрь» (7.11.1920, выдадзена палітаддзелам 42-й стралковай дывізіі) і «Красный май» [1.5.1921, Магілёўскім павятовым камітэтам РКП(б)], бюлетэнь «Работница и крестьянка» (у студзені 1921 тры нумары выдала арганізацыйнае бюро па скліканні 1-й Магілёўскай павятова-гарадской канферэнцыі работніц і сялянак), грамадска-палітычная і літаратурная газета «Соха и молот» [са студзеня 1919 па май 1925, орган Магілёўскага павятовага камітэта РКП(б), павятовага выканкома і прафбюро; у 1920—21 яна выдавала штотыднёвы лісток «Красная молодежь» Магілёўскага павятова-гарадскога камітэта камсамола»], «Профессиональный двухнедельник» (у 1921, орган павятовага бюро прафсаюзаў).

На прадпрыемствах горада ў 1930-я гады выдаваліся шматтыражныя газеты (у 1937 іх было 5). У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны ў Магілёве друкавалася рэспубліканская газета «Звязда». З красавіка 1942 г. магілёўская падпольная арганізацыя «Камітэт садзеяння Чырвонай Арміі» зрэдку выпускала малафарматную машынапісную газету «За Родину» (з восені 1942 «За Советскую Родину»). Выйшла каля 20 яе нумароў. Пасля вызвалення Магілёва ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пачала выдавацца газета «За Радзіму» (з 1956 «Магілёўская праўда»). Яна асвятляе грамадска-палітычнае, эканамічнае і культурнае жыццё вобласці, вядзе літаратурную старонку «Прыдняпроўе». Інфармацый-

на-рэкламным дадаткам да газеты «Магілёўская праўда» з'яўляецца з 1984 г. «Днепровская неделя».

На прадпрыемствах, у вытворчых аб'яднаннях выдаюцца шматтыражныя газеты «Знамя труда» трэста № 17 «Лаўсанбуд», «Трудовая слава» ВА «Хімвалакно» і «Новатор» камбіната шаўковых тканін.

З пачатку 1990-х гг. , калі Беларусь стала на шлях незалежнасці і дэмакратычнага развіцця, у Магілёве пачалі выходзіць газеты розных палітычных плыняў і напрамкаў: «Могилевские ведомости», орган Магілёўскага абласнога Савета народных дэпутатаў; «Веснік Магілёва», орган Магілёўскага гарадскога Савета народных дэпутатаў; «Атуша» — орган магілёўскай арганізацыі БНФ, магілёўскай філіі БСДГ; рэспубліканская непалітычная газета «Толока» (рэдактар-заснавальнік А.Сянчук); штотыднёвая журналісцкая газета «Метрополитен»; абласная грамадска-палітычная і аграпрамысловая штотыднёвая газета «Зямля і людзі»; магілёўская незалежная левая газета «За единство» (заснавальнік Б.Кліменка); даведачна-інфармацыйная гарадская газета «Вечерний Могилев»; рэспубліканская незалежная газета «Коммерсант Беларуси»; магілёўская абласная маладзёжная газета Магілёўскага абкома Саюза моладзі Беларусі «Центр-W».

З.Яцкевіч.

Традыцыі працягваюцца, або Кароткая гісторыя магілёўскіх музеяў

Магілёў — горад з багатай гісторыка-культурнай спадчынай, таму невыпадкова тут у 1867 г. адкрыўся першы дзяржаўны музей на Беларусі. Па традыцыі ў Магілёве не ўзводзілі для музеяў спецыяльныя будынкі, а выкарыстоўвалі для іх помнікі архітэктуры. Самы стары Магілёўскі музей размяшчаўся ў будынку (ён захаваўся і зараз; пл. Савецкая, 1), узведзены ў канцы 18 ст. па праекту магілёўскага губернскага архітэктара Івана Зэйдаля. Спачатку гэта быў двухпавярховы адміністрацыйны асабняк, да якога ў 1883 г. дабудавалі трэці паверх. Тут размяшчаліся лекарская ўправа, ніжні суд і архіў.

Музей знаходзіўся на ніжнім паверсе памяшканняў архіва разам з бібліятэкай. Пачатак першаму дзяржаўнаму музею быў пакладзены дзякуючы намаганням і клопату правадзейнага члена і сакратара губернскага статыстычнага камітэта Бібена. Спачатку ў ім было каля двухсот экспанатаў — старыя рэчы, знойдзеныя на тэрыторыі губерні. Музей трымаўся на энтузіязме і дабрачынных ахвяраваннях магіляўчан. Новыя сілы ў яго жыццё ўдыхнуў губернатар Аляксандр Дамбавецкі. Дзякуючы яму, а таксама кіраўніку музея А.А.Сыманоўскаму, пачалі прыводзіцца ў парадак матэрыялы і экспазіцыя. У 1879 г. праведзена рэарганізацыя музея, у выніку якой з'явіліся некалькі аддзелаў: гістарычны, этнаграфічны, геаграфічны. Тады ж пачаўся інтэнсіўны збор экспанатаў, што спрыяла ўсебаковаму вывучэнню Магілёва і губерні.

Сабраная калекцыя мясцовых сельскагаспадарчых і этнаграфічных прадметаў экспанавалася на Усерасійскай этналагічнай выставе ў Маскве, дзе атрымала высокую ацэнку спецыялістаў. Сам губернатар А.Дамбавецкі быў узнагароджаны залатым жэтонам, а А.Сыманоўскі — залатым медалём. Усё гэта спрыяла новым паступленням, сярод якіх былі звычайныя прылады працы для сельскай гаспадаркі, саматужнай і фабрычнай вытворчасці, а таксама рэчы, што мелі значную гісторыка-культурную і мастацкую каштоўнасць. Напрыклад, у 1881 г. ў гістарычны аддзел музея паступілі сані Напалеона, кінутыя падчас уцёкаў у 1812 г. ў Дуброўне ў маёнтку княгіні Любамірскай; фрагмент драўлянай аздобы будынка, дзе спыняўся Пётр I у Копысі, з надпісам; вялікае разное пазалочанае крэсла, абабітае каштоўнай парчой з выявай дзяржаўнага герба Расіі з вензелем Кацярыны II; грамата 1606 г. караля Жыгімонта III.

У апісанні і сістэматызацыі рэчаў, што паступалі ў музей, прымалі ўдзел вядомыя магілёўскія гісторыкі і краязнаўцы. У 90-х гг. 19 ст. былі выдадзены яго каталогі. Плённая праца такіх археолагаў, як Фурсаў, Чалоўскі, Раманаў і інш., паспрыяла пераўтварэнню ў 1893 г. гістарычнага аддзела ў гісторыка-археалагічны. Сярод археалагічных матэрыялаў вызначаліся кальчуга з Анялінскага кургана Быхаўскага раёна, калекцыі манет розных часоў і краін, старажытная зброя, памятныя медалі, сімвалічныя ключы ад Магі-

лёва, старажытныя друкаваныя і рукапісныя кнігі, атлас 1823 г. з планамі гарадоў Магілёўшчыны.

Для этнаграфічнага аддзела былі зроблены манекены жыхароў губерні ў нацыянальным адзенні. Тут экспанавалася таксама батлейка з Быхаўскага павета, багатая калекцыя дзіцячых цацак, мадэлі сялянскага двара, транспартныя сродкі і інш.

У геаграфічным аддзеле былі прадстаўлены ўзоры мясцовай глебы, гербарыі і інш. Усяго ў музеі налічвалася каля 1500 экспанатаў. Інтэнсіўныя археалагічныя даследаванні давалі такую колькасць экспанатаў, якая не магла змясціцца ў музеі. Выдатны археолаг і этнограф Е.Р.Раманаў выступіў з ініцыятывай стварыць новы царкоўна-археалагічны музей. Ён падае на імя тагачаснага Магілёўскага ўладыкі Яўгенія дакладную запіску ад 12 студзеня 1896 г. аб неабходнасці стварэння ў Магілёве епархіяльнага царкоўна-археалагічнага сховішча даўніны. Але хвароба і смерць уладыкі затрымалі справу. Зрушылася яна з месца толькі пасля прыбыцця новага ўладыкі Міхаіла, да якога Раманаў звярнуўся з той жа прапановай і знайшоў паразуменне. Прычым было вырашана адкрыць музей пры матэрыяльнай дапамозе Богаяўленскага брацтва.

Першае пасяджэнне камісіі па стварэнні Магілёўскага епархіяльнага царкоўна-археалагічнага музея адбылося 4 красавіка 1897 г. Былі абраны старшыня ўправы музеямі Е.Р.Раманаў, справавод А.А.Жудро, захавальнік святар М.В.Янушэўскі. 27 мая 1897 г. музей быў урачыста адкрыты. Спачатку ён размяшчаўся ў невялікім пакойчыку пры Васкрасенскай царкве, потым быў пераведзены ў будынкі былога кляштара бернардзінцаў. Экспазіцыйная плошча музея складала каля 140 м^2. Фонды яго рэгулярна папаўняліся. Так, у 1906 г. ў ім налічвалася 1287 экспанатаў, у 1909 г. — 1718, а ў 1919 г. — ужо больш за 6000. Гэта былі пераважна матэрыялы археалагічных раскопак. Прычым больш за ўсё экспанатаў для музея перадаў Е.Р.Раманаў, які ўзначальваў яго да 1906 г. Потым гэтую пасаду займаў П.Я.Строганаў, выкладчык царкоўнай гісторыі ў Магілёўскай духоўнай семінарыі.

У 1919 —33 гг. у Магілёве дзейнічаў Дзяржаўны гістарычны музей пралетарскай культуры. Ён размяшчаўся ў будынку былога пазямельнага банка. Па рашэнні губвыканкома 12 мая 1919 г. будынак быў перададзены аддзелу народнай адукацыі для адкрыцця ў ім музея і палаца пралетарскай культуры.

У перыяд з 1932 па 1937 г. у горадзе існаваў музей гісторыі рэлігіі і атэізму, які з'яўляўся філіялам абласнога краязнаўчага музея. Размяшчаўся ў былым Іосіфаўскім саборы. *З.Яцкевіч.*

***

У 1993 г. ў Магілёве дзейнічалі больш за 30 музеяў. Адны з іх дзяржаўныя, другія на грамадскіх асновах створаны на прадпрыемствах, у школах, розных дзяржаўных арганізацыях. Так, у абласным Палацы школьнікаў у 1975 г. быў адкрыты музей О.Ю.Шміта. Ён мае больш за 2 тысячы экспанатаў, сабраных юнымі следапытамі ў Кіеве, Адэсе, Маскве, у час сустрэч з сям'ёй Ота Юльевіча, удзельнікамі рэйса на параходзе «Чэлюскін» у 1933—34 гг. Ёсць тут рукапісы і неапублікаваныя пісьмы О.Ю.Шміта, яго фатаграфіі з аўтографамі і асабістыя рэчы, на стэндах флаг і макет лядовага лагера Шміта, які быў арганізаваны пасля гібелі «Чэлюскіна», фатаграфіі 7 лётчыкаў, што вывезлі чэлюскінцаў з лядовага лагера. У музеі дэманструецца дакументальны фільм пра О.Ю.Шміта.

Цікавыя экспанаты захоўваюцца ў музеях баявой славы і гісторыі школ у СШ № 1, 5, 9, 11, 15, 20, 22, 30, 34, 36 і інш., а таксама ў музеях гісторыі камсамола СШ № 23; клуба «Разведчык» імя Героя Савецкага Саюза Ані Марозавай у хіміка-тэхналагічным тэхнікуме; абароны Магілёва 1941 г. ў рабочым інтэрнаце вытворчага аб'яднання «Хімвалакно». Му-



У музеі О.Ю.Шміта.

зей гісторыі прадпрыемстваў і ўстаноў створаны пры заводзе «Строммашына», аўтазаводзе імя С.М.Кірава, вытворчым аб'яднанні «Хімвалакно», ТЭЦ № 1, чыгуначнай станцыі Магілёў, Доме санітарнай асветы, абласным інстытуце ўдасканалення настаўнікаў, педагагічным інстытуце імя А.А.Куляшова і інш. Вялікай папулярнасцю сярод работнікаў праваахоўных органаў і гараджан карыстаецца музей баявой і працоўнай славы пры абласным упраўленні МУС. Стэнды яго расказваюць пра подзвігі работнікаў міліцыі пры абароне горада ў ліпені 1941 г., на франтах вайны, пра супрацоўнікаў МУС, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў у мірны час.

Музеі, што працуюць на грамадскіх асновах, адыгрываюць важную ролю ў вывучэнні гісторыі краю, папулярызацыі помнікаў гісторыі, матэрыяльнай і духоўнай культуры народа. Але ўсё ж галоўную нагрузку нясуць на сабе дзяржаўныя музейныя ўстановы. Яны праводзяць не толькі прапагандысцкую, але і навукова-даследчую, культурна-асветную работу сярод насельніцтва.

Магілёўскі абласны краязнаўчы музей заснаваны на базе экспанатаў Магілёўскага царкоўна-археалагічнага музея і Магілёўскага музея. Адкрыты ён 31.3.1919 г. як губернскі музей, у 1938 г. перайменаваны ў Магілёўскі абласны краязнаўчы музей. Меў філіялы: музей гісторыі рэлігіі і атэізму (1935—41) і мемарыяльны музей Р.К.Арджанікідзе (1937—41). Аб'яднаўшы экспанаты і фонды двух сваіх папярэднікаў, музей шырока прапагандаваў палітычнае, эканамічнае, культурнае і рэлігійнае жыццё рэгіёна ў мінулым. Самымі цікавымі яго экспанатамі былі прадметы рэлігійнага культу: шытая шоўкам і золатам плашчаніца 1566 г., якая мела адносіны да дынастыі Раманавых, адзенне архіепіскапа Г.Каніскага, яго перапіска і інш. Вельмі багаты быў бібліятэчны фонд музея. Сярод рэлігійных кніг сустракаліся бібліятэчныя рэдкасці, якія існавалі толькі ў 5—6 экзэмплярах.

У пачатку 20-х гг. на хвалі нацыянальнага адраджэння і ўздыму краязнаўчага руху музей вёў вялікую работу па выхаванні ў землякоў патрыятызму. Аднак у канцы 20-х — пачатку 30-х гг. ён стаў ахвярай адваротнага працэсу. Яго супрацоўнікаў абвінавачвалі ў прапагандзе буржуазнага ладу, нацдэмаўскай контррэвалюцыі, рэлігійных забабонаў. Па загаду акружкома частка экспанатаў музея была перавезена ў Іосіфаўскі сабор для стварэння там атэістычнай экспазіцыі. Багатыя калекцыі экспанатаў былі такім чынам раз'яднаны. Адны з іх знаходзіліся ў непрыстасаваным памяшканні па Ленінскай вуліцы, другія засталіся ў кладоўцы-сейфе, дзе размяшчаўся раней музей. Да таго ж, у 1931 г. шмат каштоўнасцей было канфіскавана Усесаюзным аб'яднаннем па экспарту і прададзена за мяжу. Сярод іх — прадметы сусветнай культуры. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў музеі захоўваліся экспанаты вялікай культурна-гістарычнай каштоўнасці: крыж Ефрасінні Полацкай 1161 г., калекцыі беларускіх рукапісных кніг і грамат, зброі 10—14 ст., манет, абразоў 13—18 ст., фарфоравых вырабаў 14—18 ст., карціны І.Айвазоўскага, І.Рэпіна, В.Сярова і інш. У Вялікую Айчынную вайну музей быў разрабаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі, шмат найбольш каштоўных экспанатаў прапала бясследна, у тым ліку і святыня беларускага народа — крыж Ефрасінні Полацкай.

Пасля вайны давялося пачынаць усё нанава. Адноўлены музей у 1950 г. Першая невялікая экспазіцыя была разгорнута ў Доме Саветаў. Фонды музея папаўняліся кожны год. Зараз яны налічваюць звыш 100 тысяч экспанатаў. Музей мае 29 экспазіцыйных залаў (плошча экспазіцыі 2,1 тыс. м^2). Сярод экспанатаў — матэрыялы з археалагічных раскопак на тэрыторыі Магілёўшчыны (калекцыі манет і старажытных скарбаў, зброі 14—



Музей этнаграфіі.

19 ст., крыжоў 11—17 ст., у тым ліку каменных), дакументальныя матэрыялы пра ўдзел магіляўчан у рэвалюцыі 1905—07 гг., устанаўленне савецкай улады на Магілёўшчыне, партызанскі і падпольны рух у гады вайны, аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі і культуры ў краі. Зберагаюцца творы жывапісу 18 ст., работы сучасных беларускіх майстроў, у тым ліку разьба па дрэве В.Валкавога, габелены Л.Сіваковай, вырабы з керамікі, узоры беларускага народнага адзення, ткацтва, вышыўкі, этнаграфічная калекцыя 19 — пачатку 20 ст. Экспануюцца старадрукаваныя кнігі, творы беларускіх і рускіх пісьменнікаў і інш. Абласны музей мае філіялы — музей гісторыі бітвы пад Лясной (Слаўгарадскі раён), музей этнаграфіі і музей дзекабрыстаў.

Магілёўскі музей этнаграфіі адкрыты ў 1981 г. Мае дзве экспазіцыйныя залы (плошча экспазіцыі 100 м^2), 347 экспанатаў. У музеі сабраны прылады працы і побыту, адзення сялян Магілёўскай губерні 19 — пачатку 20 ст., узоры сучаснага дэкаратыўнапрыкладнога мастацтва і інш. Сярод іх прадметы інтэр'еру сялянскай хаты (стол, лавы, калыска, куфар, прасніца, абраз, ручнікі-набожнікі і інш.), планы вяночнага і пагоннага тыпаў двароў, прылады для земляробства (саха, барана, серп, каса, цэп, сявенька, сахор і інш.) і рыбалоўства (нерат, восці), пчалярскі інвентар (калода, сетка), інструменты і вырабы хатніх промыслаў: дрэваапрацоўкі (струг, скоблі, піла лучковая, нацягушы, цыркуль; біклага, дзяжа, карыта, конаўка, сальніца, талеркі і іншыя выдзеўбаныя вырабы), ткацтва (верацёны, грабяні, калаўрот, ручнікі), ганчарства (міскі, спарышы, кубак, гарлач, збаны, гляк і інш.), узоры традыцыйнага народнага мужчынскага і жаночага адзення, копыскай кафлі 17—20 ст., абразы 17—20 ст., драўляная скульптура і фрагменты іканастаса з Магілёўскага Станіславаўскага касцёла. У экспазіцыі шмат вырабаў з саломкі К.Г.Арцёменкі, габелены Л.П.Сіваковай, работы разьбяроў па дрэве Г.У.Данілавіча, У.Я.Ісачанкі, самадзейнага майстра Р.Я.Іванчанкі, вырабы навучэнцаў Бабруйскага мастацкага ПТВ № 15, прадукцыя Магілёўскай фабрыкі мастацкіх вырабаў.

У 1985 г. заснаваны Магілёўскі музей дзекабрыстаў. У яго фондах захоўваюцца сапраўдныя дакументы следства і суда над дзекабрыстамі, кнігі канца 17 — пачатку 19 ст., якія чыталі дзекабрысты, творы К.Ф.Рылеева і А.А.Бястужава, выдадзеныя ў 1925 г., поўны камплект альманаха «Полярная звезда» (1823—25), запіскі і мемуары дзекабрыстаў, успаміны і літаратура пра іх. Да 160-годдзя паўстання дзекабрыстаў (у 1985) была разгорнута экспазіцыя «Айчыны верныя сыны». Музей размешчаны ў перабудаваным былым калегіуме уніятаў. З 1820 г. тут была ваенна-афіцэрская школа. Пасля разгрому ў студзені 1826 г. паўстання Чарнігаўскага палка ў гэтым будынку ўтрымліваліся пад вартай члены тайных таварыстваў дзекабрыстаў С.І. і М.І.Мураўёвы-Апосталы, М.П.Бястужаў-Румін, В.К.Тызенгаўзен, В.Н.Салаўёў, А.А.Быстрыцкі, А.Е.Мазалеўскі, І.І.Сухінаў і інш. 1.2—30.3.1826 г. тут праходзілі пасяджэнні Магілёўскай ваенна-судовай камісіі па справе чарнігаўцаў і быў вынесены прысуд. З Магілёвам таксама звязана жыццё і дзейнасць членаў дзекабрысцкіх таварыстваў П.І.Калошына, М.М.Раеўскага, П.П.Цітова, В.А.Мусіна-Пушкіна.





Экспазіцыйныя залы ў мастацкім музеі В.К.Бялыніцкага-Бірулі.

Супрацоўнікі музея дзекабрыстаў вядуць работу па зборы новых дакументаў і матэрыялаў. Запланавана, што музей будзе мець 18 экспазіцыйных залаў агульнай плошчай 1068 м^2.

24.12.1982 г. ў Магілёве быў адкрыты філіял Дзяржаўнага мастацкага музея БССР — Мастацкі музей В.К.Бялыніцкага-Бірулі. Памяшканне, у якім ён размешчаны, пабудавана ў 18 ст. (па іншых звестках у 17 ст.) як жылы дом, у 1978 г. ён быў рэстаўрыраваны, мае рысы барока і класіцызму. У мемарыяльных залах музея захоўваюцца партрэты работы В.К.Бялыніцкага-Бірулі, асабістыя рэчы, дакументы, кнігі, фотаздымкі. У экспазіцыі больш за 100 твораў мастака — ад ранніх работ 1890-х гг. да больш позніх 1950-х гг. У залах музея перыядычна наладжваюцца мастацкія выставы.

З 1988 г. ў Магілёве ў будынку былога Пазямельна-сялянскага банка працуе карцінная галерэя. На яе базе створаны Магілёўскі абласны мастацкі музей. Тут экспануюцца творы з фондаў розных музеяў, арганізоўваюцца персанальныя выставы мастакоў, фотавыставы, паказваюцца работы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дзіцячай творчасці.

У верасні 1992 г. Магілёўскі гарвыканком прыняў рашэнне стварыць музей гісторыі горада. Пад яго перададзены помнік архітэктуры 18 ст. — архірэйскі палац. У музеі будуць захоўвацца шматлікія археалагічныя знаходкі, дакументы і побытавыя рэчы магіляўчан. У верасні 1993 г. грамадскі фонд адраджэння культурнай спадчыны г. Магілёва перадаў музею дзесяць абразоў канца 18—19 ст. беларускай школы жывапісу, сабраных А.П.Бадзічам з Хоцімска. Збор экспанатаў працягваецца.

Т.Палажэнцава.

Куды зніклі магілёўскія зборы?

У 1987 г. пры Беларускім фондзе культуры была створана камісія «Вяртанне», якая займаецца праблемамі пошуку і вяртання на Беларусь нацыянальных культурных і гістарычных каштоўнасцей, што ў розныя часы вывезены за межы рэспублікі. Сярод шматлікіх загінуўшых нацыянальных скарбаў адным з самых каштоўных з'яўляюцца экспанаты Магілёўскага абласнога дзяржаўнага гістарычнага музея, след якіх згубіўся ў 2-ю сусветную вайну. У ліку тых экспанатаў найунікальная рэліквія — крыж Ефрасінні Полацкай, месцазнаходжанне якога невядома па сённяшні дзень. Камісіі «Вяртанне» разам з Нацыянальным навукова-асветным цэнтрам імя Ф.Скарыны ўдалося сабраць шэраг дакументаў і матэрыялаў, якія дапамагаюць высветліць лёс некаторых страчаных беларускіх скарбаў. Далей прыводзяцца вытрымкі з гэтых матэрыялаў, якія апублікаваны ў зборніку «Вяртанне» (Мн., 1992).

З даклада старшыні камісіі «Вяртанне» А.І.Мальдзіса на пленуме праўлення Беларускага фонду культуры, прысвечаным праблемам вяртання беларускіх нацыянальных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі рэспублікі

29 красавіка 1992 г.

Сярод беларускіх скарбаў, след якіх згубіўся ў 2-ю сусветную вайну, на першым месцы я паставіў бы каштоўнасці, што да чэрвеня 1941 г. захоўваліся ў Магілёўскім абласным дзяржаўным гістарычным музеі. Найперш гэта — крыж Ефрасінні Полацкай, унікальная духоўная рэліквія. Але не толькі ён. У 1941 г. ў Магілёве зніклі дзесяткі калекцый. І шукаць іх трэба ў сукупнасці, таму што адна знаходка можа вывесці на след іншых.

Некалькі слоў пра гісторыю магілёўскіх збораў. Яны вядуць свой пачатак ад 1867 года, калі ў Магілёве адчыніў свае дзверы царкоўна-археалагічны музей. У ім было мноства абразоў, крыжоў, царкоўнага посуду, кніг у каштоўных вокладках, а таксама знаходкі розных археалагічных экспедыцый. У 1919 г. гэты музей быў ператвораны ў дзяржаўны; яму перадалі будынак былога земскага банка па вуліцы Міронава, 33. На першым і другім паверхах будынка месціліся пакоі-сейфы, куды і склалі найбольш каштоўныя прадметы царкоўнага ўжытку. У 1919 г. да іх далучыліся крыж Ефрасінні Полацкай, перавезены туды з Мінска (у ЗША захаваўся акт перадачы, які быў апублікаваны ў нью-йоркскіх «Запісах»), іншыя каштоўнасці (Магілёў тады рыхтаваўся стаць сталіцай Беларусі). У 1933 г. ў будынку па вул. Міронава, 33 размясціўся абком партыі, а музей перасялілі на Ленінскую вуліцу. Будынак там быў невялікі, таму размясцілі ў ім толькі экспазіцыю, прысвеча-

ную савецкаму перыяду. Усе ж асноўныя старажытныя каштоўнасці засталіся ў абкоме партыі — у адным або двух (яснасці пакуль што няма) пакоях-сейфах. Усе гэтыя рэаліі вельмі істотныя для далейшых пошукаў, бо ў некаторых публікацыях і дакументах адзін музейны будынак падмяняўся другім, а гэта заблытвала сляды.

Што ж знаходзілася ў пакоі (ці пакоях) у абкоме партыі? Даваенных апісанняў няма. Але перада мной ляжаць ксеракопіі актаў, складзеных адразу ж пасля вайны (ксеракопіі атрыманы нашай камісіяй дзякуючы Галоўнаму архіўнаму ўпраўленню). З іх вынікае, што крыж — толькі адна (хоць і найбольш важная) з каштоўнасцей, якія зніклі з Магілёва ў 1941 г. Сярод іх — залаты і сярэбраны ключы Магілёва, дзве сярэбраныя пячаткі горада, залатыя ўпрыгожанні і пліткі з выявамі, знойдзеныя пры раскопках старажытнай Пампеі, сярэбраная булава Сігізмунда III, мітра архібіскупа Георгія Каніскага, кубкі з выявамі Пятра I і Аляксея Міхайлавіча, залатыя і сярэбраныя крыжы, дарахавальніцы, кадзільніцы, прадметы яўрэйскага культу. У актах называюцца абразы Бялыніцкай (XV ст.), Брацкай (пачатак XVIII ст.), Спаскай (1670), Казанскай (копія, падараваная мясцовай царкве Аляксандрам II у 1867 г.), Іверскай Божай Маці, святых Мікалая, Пятра і Паўла, упрыгожаныя каштоўнымі камянямі карціны «Хрыстос», «Прыдворная кацярынінская дама», партрэты Паўла, Кацярыны, Канстанціна і Аляксандра У.Баравікоўскага, «Першы снег» І.Макоўскага, «Зіма на Украіне» І.Айвазоўскага, «Партрэт дачкі» І.Рэпіна, «Кавалер і дама ў садзе», «Парачка збірае вінаград», «Жанчына ля фантана», «Кавалер і дама на лёдавым катку» А.Вато і інш. Асобна ўказваюцца такія рарытэты, як крэмневы пісталет з залатой арабскай чаканкай, троннае крэсла, выраблена ў 1780 г. да прыезду ў Магілёў Кацярыны II, сані Напалеона, кінутыя ў час яго ўцёкаў праз Беларусь, кальчуга з Аналінскага кургана Быхаўскага павета, залатыя і сярэбраныя табакеркі, кішэнныя гадзіннікі, пярсцёнкі, жаночыя ўпрыгожанні, фарфоравыя статуэткі, мэбля і тканіны мясцовых майстроў. Зафіксаваны ў дакументах «Гістарычная бібліятэка» (1200 тамоў), збор «беларускіх рукапісных і старадрукаваных кніг» (175 адзінак захавання), а таксама 26 каралеўскіх грамат XVI—XVIII стст., падараваных Магілёву, грамата 1570 г. караля Стэфана Баторыя на магдэбургскае права таму ж гораду, яе пацвярджэнне 1767 г. грамата Аляксея Міхайлавіча 1654 г. жыхарам Магілёва і інш.

Урэшце, у магілёўскіх спісах ёсць сляды цэлых збораў: калекцыя манет усіх часоў і народаў X—XIX стст. да 6 кг вагой, у іх ліку да 10 штук візантыйскіх залатых манет, астатнія сярэбраныя; «Евангелле ў акладах работы беларускіх майстроў XVI—XVIII стст.» — каля 20 кніг; «прадметы з раскопак курганоў: бронзавыя і сярэбраныя ўпрыгожанні з каштоўнымі камянямі, кольцы, бранзалеты, пацеркі, фрагменты жалезнай зброі»; «этнаграфічная калекцыя беларускага адзення XVII—XIX стст.»; «калекцыя халоднай і агнястрэльнай зброі X—XIV стст.» — 280 адзінак; «калекцыя ўзораў мастацкай работы па дрэве беларускіх майстроў XIV—XVIII стст.»; «калекцыя мастацкіх фарфоравых вырабаў XIV—XVIII стст.» — 170 адзінак; «Вялікая палеанталагічная калекцыя», энтамалагічная і мінералагічная калекцыі і многае іншае.

І сярод усяго гэтага багацця пад нумарам дзесятым значыцца крыж Ефрасінні Полацкай, ацэнены ў 1944 г. ў шэсць мільёнаў рублёў (хаця ў сапраўднасці — крыж бясцэнны, бо як выказаць вартасць цудадзейных мошчаў, мініяцюрных выяў на эмалі або надпісаў, зробленых полацкім майстрам Лазарам Богшам у 1161 г.).

Куды ж усё гэта падзелася летам 1941 г., у час абароны Магілёва?

Раней адказ быў адназначны: зрабавана ці знішчана фашысцкімі захопнікамі. Так сказана ў акце ад 22 снежня 1944 г., у пазнейшых тлумачэннях былога дырэктара музея І.Мігуліна.

Пра крыж Ефрасінні Полацкай была, да прыкладу, распрацавана ледзь не фантастычная версія. Генадзь Ланейскі пісаў у «Голасе Радзімы» (14 мая 1981 г.), што нейкі оберлейтэнант выпадкова трапіў у будынак з надпісам «Музей», спусціўся ў «падвал былога зямельнага банка, які стаў музеем», пабачыў там у куфры з чорнага дрэва «залаты крыж», здагадаўся, што ён вельмі каштоўны. Выяўленыя багацці перадаў рэйху, а крыж прысвоіў сабе. Потым яго жонка прадала рэліквію за сто тысяч долараў. «А праз месяц у старога ювеліра за вялікую цану перакупіў крыж агент амерыканскага мільянера».

Гэта версія зацікавіла многіх: і прадстаўнікоў улад, і работнікаў музея, і мяне, грэшнага (пісаў пра тое ў кнізе «Таямніцы старажытных сховішчаў», выдадзенай у 1974 г.). Па словах супрацоўніка Эрмітажа, доктара

гістарычных навук Б.Сапунова, у 1960—70-я гады іншы супрацоўнік Эрмітажа, буйны спецыяліст па шкле Б.Шалкоўнікаў спрабаваў выявіць крыж у зборах Морганаў, але яго там запалохалі тым, што яму «павырываюць ногі». Не ўдалося Б.Шалкоўнікаву ўказаць месцазнаходжанне крыжа ў сваім артыкуле для амерыканскага часопіса «Джорнэл оф глас стадыз» (1966, т. VIII), дзе адпаведны абзац пра Морганаў быў зняты без аніякіх тлумачэнняў. Даведаўшыся пра ўсё гэта ад супрацоўнікаў Эрмітажа, у 1990 г., будучы дэлегатам на чарговай сесіі Генеральнай асамблеі ААН, я таксама спрабаваў знайсці нашу нацыянальную рэліквію нумар адзін у зборах Пірпонта Моргана. Але не ўдалося. Тады было аднесена туды афіцыйнае запытанне ад нашага Міністэрства замежных спраў. Калі П.К.Краўчанка ўручыў гэтае запытанне, атмасфера была напружаная, нервовая. Дырэктар фундацыі паабяцаў нам, што адкажа тыдні праз два. Але адказаў (і то пасля напамін) толькі праз два месяцы. Адказ быў даволі мудрагелісты: у фундацыі Пірпонта Моргана крыжа няма, але за прыватныя зборы ўсіх Морганаў ручацца нельга.

Паралельна з морганаўскай пашыралася ракфелераўская версія (у апошні час яна асабліва мусіруецца). Яе таксама правяралі, хоць і не на афіцыйным узроўні. Нарэшце, з'явілася і аўстралійская версія: маўляў, крыж трапіў у паўднёвае паўшар'е і захоўваецца там ці то ў банку, ці то ў царкве нашых суайчыннікаў. І адно, і другое мала праўдападобна. Прынамсі, беларуская эміграцыя пра гэта ведала б.

Аднак увесь час, калі я ды іншыя члены камісіі «Вяртанне» ішлі па «амерыканскаму» і «аўстралійскаму» слядах, нас не пакідала адчуванне, што, відаць, нехта або нешта нас збівае, несвядома ці свядома, з правільнага шляху, што публікацыі Г.Ланеўскага і іншых яго аднадумцаў заснаваны на вельмі хісткіх падставах. Мяркуйце самі. Магілёў — не Брэст, абараняўся ён доўга. Таму можна было многае вывезці — хаця б самае каштоўнае. Безумоўна, сёе-тое згарэла ў будынку музея па Ленінскай вуліцы, які быў падпалены пры адступленні нашымі ж войскамі (факт, зафіксаваны ва ўспамінах сведкаў). Але ж там, прыгадаем, знаходзіліся пераважна экспанаты па савецкім перыядзе. Што датычыцца крыжа і іншых старажытных каштоўнасцей, то захоўваліся яны ў будынку абкома, на якім шыльды «Музей» быць не магло. Недакладны Г.Ланеўскі і ў іншых рэаліях. Да прыкладу, пакой-сейф знаходзіўся не ў падвале, а браніраваныя дзверы яго, нібыта парэзаныя аўтагенам, цэлыя і да сённяшняга дня...

Дык што ж у сапраўднасці здарылася ў Магілёве летам 1941 г.? Па-новаму асэнсаваць усю тагачасную сітуацыю першым паспрабаваў магіляўчанін В.Юшкевіч. У артыкуле, апублікаваным ім у газеце «Советская Белоруссия» 28 верасня 1990 г. (гэты нумар прыйшоў у беларускае прадстаўніцтва пры ААН якраз вечарам таго ж дня, калі мы ўручылі запытанне ў фундацыі П.Моргана), гаворыцца, што, па словах старажылаў, у адзін з дзён, калі нямецкія танкі рваліся да Магілёва, у будынак абкома «ўвайшла група людзей у форме НКВД. Яны адамкнулі сейф, паклалі каштоўнасці ў мяхі і паехалі. След іх прапаў».

Зрэшты, след іх, няхай і не зусім дакладны, усё ж знайшоўся. У 39 нумары газеты «Веснік Магілёва» за мінулы год была апублікавана гутарка супрацоўніка рэдакцыі з жыхаром горада А.Кавалёвым. Той расказаў пра свайго суседа Карла Іванавіча (прозвішча яго забыў), які ў 1941 г. эвакуіраваў каштоўнасці з пакоя-сейфа на другім паверсе будынка абкома партыі ў адсутнасць І.Мігуліна, які мог пра ўсё і не ведаць. Салдаты ўпакавалі «залатыя чашы, кароны з камянямі, булавы, абразы з камянямі, кнігі ў сярэбраных вокладках», пагрузілі на грузавікі. А крыж Карл Іванавіч узяў з сабою ў кабіну... Адвезлі ўсё ў Маскву, здалі ў банк. «Пачалі складаць апісанне прадметаў. Раптам усе аслупянелі. У банк прыехаў Берыя і з ім мноства афіцэраў. Ён уважліва разглядаў прадметы і цокаў языком. Цэлы месяц ішло апісанне. Аказалася больш двух тысяч прадметаў». За вываз каштоўнасцей Карл Іванавіч атрымаў медаль, яго нібыта прымаў і частаваў сам Сталін. Але пра ўсю гісторыю загадана было маўчаць. І маўчаў Карл Іванавіч аж да смерці. Толькі аднойчы, аднак, падзяліўся патаемным з суседам...

А днямі мне пазваніў з Санкт-Пецярбурга прафесар Б.Сапуноў. Ён паведаміў, што ў Эрмітаж прыйшоў ліст з Беларусі пра тое, што нібыта каштоўнасці былі вывезены з Магілёва яшчэ... на пачатку 30-х гадоў. Іх тады скіравалі ў Ленінград, каб затым прадаць на міжнародным аўкцыёне. Версія цікавая і зусім верагодная, асабліва калі ўлічыць усю тагачасную атмасферу і высяленне самога музея

з яго ранейшага будынка... Але былыя работнікі музея, найперш вядомы краязнавец І.Філіповіч, сцвярджаюць, што крыж і іншыя старажытнасці знаходзіліся там аж да 1941 г. Расказ А.Кавалёва на старонках «Весніка Магілёва» І.Філіповіч лічыць найбольш праўдападобнай адгадкай усёй магілёўскай загадкі.

Значыць, сёння вельмі і вельмі істотна праверыць усе моманты маскоўскай версіі. Калі каштоўнасці прывезлі ў банк, то павінен існаваць акт іх прыёмкі. А значыць, трэба зрабіць адпаведнае афіцыйнае запытанне расійскім уладам. Калі вядомы адрас Карла Іванавіча ў Магілёве (вул. Бялінскага, 26), то можна ўстанавіць і яго прозвішча, удакладніць таксама, за што ён атрымаў медаль.

Зрэшты, маскоўскі след не выключае амерыканскага. Як піша мне І.Філіповіч, пра магілёўскія каштоўнасці Л.Берыя мог паведаміць І.Сталіну, а той — загадаць, каб яны былі «выкарыстаны на аплату Амерыцы паставак па ленд-лізу». Не выключана таксама, што крыж трапіў у ЗША нелегальным, спекулятыўным шляхам. Або застаўся ў зборах самога Берыі ці яго падручных.

Днямі амерыканскі след нечакана пацвердзіўся ў лісце з Балгарыі. Па нашай просьбе балгарскія беларусісты звязаліся з вядомай вяшчунняй (але не Вангай), і яна дала сваю, нечаканую для нас трактоўку ўсіх падзей. Гэту версію, у якой фігуруюць Вільнюс і Осла, яшчэ правяраць ды правяраць. Скажу толькі, што, на думку балгарскай прарочыцы, крыж урэшце трапіў у ЗША, у штат Індыянаполіс, да прыватнага калекцыянера, які жыве з зямельнай рэнты. Прозвішча яго блізкае да Морнс(?). Яму 57 гадоў. А крыж яму разам з калекцыяй завяшчаў бацька, які памёр летась на 86 годзе жыцця... Што да гэтага дадаць? Хіба толькі тое, што «Морнс» вельмі падобны да «Морган».

Адным словам, трэба ўважліва праверыць усе шляхі, па якіх маглі ў 1941 г. пайсці магілёўскія каштоўнасці — не толькі адзін крыж, а ўся іх сукупнасць. Бо іх страта — бадай, самая балючая наша духоўная страта ў апошнюю вайну.

Копия

АКТ 22/XII 1944 года

гор. Могилев

Мы, нижеподписавшиеся, комиссия в составе 3-х человек: Директора музея тов. Мигулина Ивана Сергеевича, учителя Могилевского педучилища тов. Авсеенкова Вячеслава Дмитриевича и инженера Мог. Обл. К-ры промбанка тов. Кроера(фа) Сергея Митрофановича с участием экспертов-свидетелей — художника г. Могилева тов. Пономарева Владимира Александровича составили настоящий акт об ущербе, причиненном немецко-фашистскими захватчиками и их сообщниками Могилевскому областному государственному историческому музею, находящемуся в г. Могилев по ул. Ленинской, сожженного и разграбленного немецкими оккупантами в 1941 г.

I. Стоимость уничтоженного, разрушенного, разграбленного и поврежденного имущества в денежном выражении.

— Здание культурно-бытового назначения 256 876 руб.

— Прочие виды имущества 60 000 000 руб.

— Всего 60 256 876 руб.

II. Перечень отдельных видов разрушенного, уничтоженного, расхищенного и поврежденного имущества:

1. Здание 2-этаж. каменн. (музей),
стоимость ущерба 256 876 руб.

III. Прочие виды имущества:

1. Археологическая коллекция каменных орудий и предметов материальной культуры, 5000 единиц, стоимость 2 000 000 руб.

2. Нумизматическая коллекция, 18 000 монет, стоим. 1 500 000 руб.

3. Собрание белорусских рукописных и старопечатных книг и грамот, 175 экз., стоим. 3 000 000 руб.

4. Коллекция холодного и огнестрельного оружия X—XIV века и других доспехов вооружения, 280 предметов, стоим. 1 000 000 руб.

5. Коллекция образов художественной работы по дереву белорусских мастеров XVI—XVIII вв., 120 предметов, стоим. 300 000 руб.

6. Коллекция художественного фарфора XVIII—XIX вв., 170 предметов, стоим. 50 000 руб.

7. Историческая библиотека, 120 томов, стоим. 500 000 руб.

8. Ризы, оклады и другая церковная и бытовая утварь XIV—XVIII вв. Работы местных мастеров, 1900 предметов, стоим. 10 000 000 руб.

9. Коллекция икон письма XIII—XVIII вв., работы белорусских мастеров, 150 экз., стоим. 5 000 000 руб.

10. Крест Ефросиньи Полоцкой. Работы византийских мастеров, 1 шт., стоим. 6 000 000 руб.

11. Золотой и серебряный ключи города Могилева ювелирной работы XVIII в., 2 шт., стоим. 1 000 000 руб.

12. «Екатерина святая» Боровиковского, живопись маслом, 1 шт., стоим. 6 000 000 руб

13. «Иосиф Обручник». Работа его же. 1 шт., стоим. 4 000 000 руб.

14. «Мария». Работа его же. 1 шт., стоим. 2 000 000 руб.

15. «Христос». Работа его же. 1 шт., стоим. 2 000 000 руб.

16. Портрет неизвестной дамы. Работа его же. 1 шт., стоим. 1 000 000 руб.

17. Портрет Зубова, работа Левицкого. 1 шт., стоим. 2 000 000 руб.

18. Этнографическая коллекция белорусской одежды XVII—XIX века, стоим. 1 500 000 руб.

Всего по настоящему акту 60 256 876 руб.

СПИСОК

разграбленных немецкими оккупантами культурно-исторических ценностей, хранившихся в Могилевском государственном историческом музее до Великой Отечественной войны.

1. Золотой и серебряный ключи гор. Могилева (фотоснимок прилагается).

2. Две серебряные печати гор. Могилева, данные ему с Магдебургским правом (фото прилагается).

3. Крест Ефросиньи Полоцкой, деревянный, обложенный золотом и украшенный драгоценными камнями и византийской перегородочной эмалью (фото прилагается).

4. Шейное ожерелье из 4-х витков полей золотой трубки (из раскопок Помпеи).

5. Шесть золотых блях-пластинок, размером до спичечной коробки, с примитивным тиснением символических предметов (из раскопок Помпеи).

6. Несколько золотых перстней с камеями (из раскопок Помпеи).

7. Булава Сигизмунда III серебряная.

8. Митра Георгия Конисского серебряная.

9. Нюрнбергская кружка серебряная.

10. Кремневый пистолет с золотой чеканкой арабских письменных знаков и орнаментов.

11. Большое серебряное граненое блюдо с тисненным изображением символических сцен, посвященных царю Алексею Михайловичу.

12. Два больших серебряных блюда с тисненным изображением батальных сцен средних веков.

13. Кубок большой серебряный с изображением Петра Первого.

14. Кубок с изображением царя Алексея Михайловича.

15. Несколько серебряных табакерок с художественной гравировкой.

16. Коллекция монет всех времен и народов до 6 кг весом, в числе которых до 10 штук было золотых — византийских, остальные серебряные.

17. Золотые карманные часы с художественной эмалевой отделкой 4 шт.

18. Много предметов серебряной, позолоченной церковной и костельной утвари — чаши, кресты, дарохранительницы; работы белорусских мастеров XVII и XVIII веков.

19. До 20 евангелий с окладами работы белорусских мастеров XVI—XVIII веков, из них одно, написанное от руки князем Олельковичем.

20. Несколько — до 15 небольших икон письма с ризами работы белорусских мастеров.

21. Две еврейские торы, поднесенные Николаю Второму.

22. Два серебряных наконечника для тор, украшенных большими гранеными изумрудами.

23. Много бытовых ювелирных изделий из серебра, как то: браслеты, серьги, кольца, ожерелья, цепочки, медальоны, пряжки, брошки, заколки, шкатулки, рюмки и т.д. Многие из них отделаны драгоценными камнями.

24. Кувшин большой серебряный с чернью, с рельефным изображением батальных сцен средних веков.

Примечание.

Список культурно-исторических ценностей составлен по памяти, так как документальный список был вывезен вместе с ценностями.

Опись может дополнить или уточнить бывший директор Могилевского музея тов. Винюков.

Второй экземпляр похищенной описи хранился в Минском государственном историческом музее.

Директор Могилевского музея
17 сентября 1947 года
гор. Могилев

З успамінаў былога дырэктара магілёўскага музея І.С.Мігуліна

...В 1919 году в Могилеве был создан государственный исторический музей, которому было предоставлено здание бывшего крестьянского банка по улице Миронова, 33. Этому музею были переданы все экспонаты церковно-археологического музея, но так как для экспозиции нового музея они были не нужны, их сложили на хранение в сейф бывшего крестьянского банка.

В 1929 году в этот сейф был положен на хранение крест Ефросиньи Полоцкой, который до этого времени находился в экспозиции Минского государственного музея. Там его дважды пытались похитить. И только после этого этот крест поместили в сейф Могилевского музея...

В 1933 году Могилевский областной музей был административно выселен с занимаемого им здания, в нем разместился обком партии, и только сейф, в котором хранились указанные ценности, оставался собственностью музея.

Музею было предоставлено небольшое здание на Ленинской улице, где разместилась экспозиция только одного советского периода.

На второй день Великой Отечественной войны недалеко от здания музея взорвалась немецкая авиабомба и взрывной волной было выбито несколько оконных стекол.

Опасаясь, что в случае последующих бомбардировок бомба попадет в здание музея, я решил ценные экспонаты вывезти за пределы города — в сельскую местность, в школу, где были знакомые учителя. Экспонаты сейфа я пока не имел в виду, так как работники обкома знали, какие ценности в нем хранятся и я за них пока не беспокоился.

Своего транспорта музей не имел, и я направился к военному коменданту города Воеводину с просьбой выделить автомашину. По дороге к коменданту я увидел на улице трупы, на груди одного из них была бумажка с надписью «дезертир», другого — «паникер».

Когда я обратился к коменданту, попросил выделить машину для эвакуации музея, комендант стукнул кулаком по столу и раздраженно крикнул: «Паникер!».

Меня как арестованного вывели из кабинета. В коридоре я встретил замполита, с которым я был хорошо знаком, так как по его направлениям часто выступал в воинских частях гарнизона с лекциями. Узнав о случившемся, он выругал меня, открыл дверь на улицу и выпустил.

От коменданта я пошел в обком партии.

По дороге, во дворе здания, около универмага, увидел много людей. Подойдя к знакомым, узнал, что здесь формируется народное ополчение. Ополченцев разделяли на группы. Тех, кто мог владеть оружием, направляли на линию обороны, другую группу — на строительство оборонных сооружений. Я попал в отряд слежения.

Нашу группу направили на северо-восточную окраину Могилева в район деревни Полыковичи и 8-го кирпичного завода. Там мы находились на казарменном положении и связи с городом не имели.

На девятый день своего дежурства я обнаружил в кустах запряженных лошадей, на их гривах были бирки со штампами мобилизации для нужд фронта. Меня обязали доставить этих лошадей в облвоенкомат.

Выполнив это поручение, я пошел в обком партии. Но в здание меня не впустили стоявшие при входе часовые. На мой вопрос: «Почему?» ответили: «Обком эвакуировался, в здании никого нет».

С первых дней школьных каникул моя семья в составе жены учительницы-еврейки, ее старой матери, моей матери и двоих малых детей находились на даче в Печерске (пригород Могилева). И я направился проведать их. Меня встретили со словами горечи и обидой: «Почему ты нас покинул? Что ты, не знаешь, как поступают немцы с евреями? Все давно уехали, и только мы остались одни». Я предложил им немедленно отправиться на вокзал. Что и сделали.

В первый эшелон с беженцами мы попасть не смогли. С большими трудностями удалось

забраться в следующий, который состоял из товарных вагонов.

Он долго простаивал на каждой станции, пропуская воинские эшелоны, и только на девятые сутки он прибыл на станцию Горький. На этой станции работала специальная комиссия, которая направляла людей в разные районы области. Мою семью направили на станцию Пижма, где была школа и завод, который уже работал на нужды фронта.

Устроив семью, я вернулся на станцию Горький с намерением возвратиться в Могилев, но это уже было невозможно, так как в сторону фронта пассажирские поезда не ходили, а за Могилев уже шли бои.

Возвратившись к семье, я первое время работал завклубом завода, а потом секретарем парторганизации этого военного завода и парторгом Горьковского обкома партии.

За этот период я был награжден медалью «За доблестный труд в годы Великой Отечественной войны».

В ноябре 1943 года меня вызвали в Москву — в ЦК КПБ, где мне предложили работать в аппарате ЦК. Я не дал на это согласия и попросил направить в освобожденные районы Могилевской области. Меня направили в гор. Кричев, где уже находился Могилевский обком партии и я стал работать лектором обкома.

В Могилев я прибыл на другой день его освобождения.

На Советской площади всех прибывших встречали знакомые, оставшиеся в оккупированном Могилеве, среди них был учитель Луковников, который до войны был членом музейного совета.

На вопросы о судьбе музея Луковников сказал, что здание музея по Ленинской улице было сожжено в последние дни обороны города согласно указу Сталина от 3-го июля «уничтожать все материальные и культурные ценности, которые остаются не вывезенными».

О судьбе ценностей, которые находились в сейфе здания обкома партии, Луковников сказал следующее, что немцы долгое время не обращали внимания на сейф и только после того, как через окно заметили блеск металла, они решили сейф вскрыть. Опасаясь, что сейф заминирован, они обязали вскрыть его советского военнопленного, который автогеном увеличил замочную скважину и сейф был открыт. При виде всего, что было в сейфе, военный комендант произнес: «все это принадлежит Германии» и дал указание составить опись всего, что было в сейфе, но немцы, как лютеране, плохо разбирались в предметах православного культа, поэтому в созданную комиссию пригласили Луковникова, который в то время работал в городской управе, когда опись была составлена, все вещи сейфа вложили в тару и увезли...

З пісьма гісторыка Б.В.Сапунова міністру замежных спраў Рэспублікі Беларусь П.К.Краўчанку

22 кастрычніка 1990 г.

Глубокоуважаемый Петр Кузьмич!

Все, что я знал о кресте Ефросиньи Полоцкой 1161 г., я рассказал доктору филологических наук А.В.Мальдису во время торжеств в Минске в честь 500-летия со дня рождения Ф.Скорины.

В 1969 г. на запрос Могилевского музея о кресте Ефросиньи, я отвечал, что по сведениям из неофициальных источников, крест находится в собрании Морганов; что он был ими куплен на аукционе после конца войны.

Крупнейший специалист по истории русского художественного стекла, ст. научный сотрудник Гос. Эрмитажа, покойный ныне, Б.А.Шелковников в 1966 г. издал в США статью о русском стекле.

В ней он писал о кресте Ефросиньи, на котором имелись эмалевые вставки. В тексте рукописи он отмечал, что по его сведениям крест находится в собрании Морганов. Из опубликованного текста статьи абзац о местонахождении креста исчез.

В начале 70-х годов, находясь в Штатах по приглашению сестры, Б.А.Шелковников решил уточнить вопрос о судьбе креста после 1945 г. Осмотреть собрание Морганов еще не удалось. После нескольких безуспешных попыток, лица из охраны резиденции сказали ему на чистом русском языке, чтоб он больше не появлялся, а то ему «повыдергивают ноги».

Кроме того, американские искусствоведы сказали, что если даже крест действительно находится в собрании Морганов, то требовать его возвращения бесполезно, так как истек срок давности.

По возвращении из Штатов Б.А.Шелковников подробно рассказывал мне о своих попытках увидеть крест. Вскоре он скончался, и этим сюжетом я больше не интересовался. Какие-либо новые публикации о судьбе креста мне не попадались.

Загадка крыжа Ефрасінні Полацкай

Аб крыжы Ефрасінні Полацкай шмат напісана ды яшчэ больш будзе напісана. Пошук згубленай у ваенным ліхалецці рэліквіі вядзецца ўжо амаль паўстагоддзя. Асаблівы інтарэс грамадскасці да беларускай святыні ўзнік на хвалі адраджэння. Распрацоўваліся розныя версіі, шматлікія напрамкі пошукаў. Але, як здаецца, тым пошукам не хапала настойлівасці і паслядоўнасці, яны мелі спантанны характар. Інтарэс то ўзнімаўся, то сціхаў. Надзея то нараджалася, то знікала.

У 1993 г. ў «Магілёўскай праўдзе» з'явілася публікацыя, сенсацыйная па сваёй сутнасці, але неяк «прагорнутая» і шырокай грамадскасцю, і рэспубліканскай прэсай, і навукоўцамі. Сенсацыйнасць публікацыі была ўжо ў тым, што пошукамі рэліквіі стала займацца... КДБ па Магілёўскай вобласці. Узначаліў той пошук супрацоўнік гэтага «сур'ёзнага» ведамства С.Багдановіч (сімвалічнае прозвішча), нататкі якога з невялікімі скарачэннямі разам з артыкулам газеты прапануюцца чытачу, які даведаецца яшчэ аб адной версіі пошуку.

Паводле «Магілёўскай праўды», 22 мая 1993 г.

Насупраць будынка былога Сялянскага банка ў г. Магілёве з'явілася драўляная выява Ефрасінні Полацкай. Рукі асветніцы быццам спрабуюць прытуліць да сябе крыж, падараваны беларускай зямлі Лазарам Богшам. Але ніяк не дацягнуцца да яго. Жаночы твар, поўны немай роспачы, звяртаецца да нас, здаецца, з пытаннем-дакорам: «Чаму ж вы, беларусы, не зберагліі нашу святыню?»

У ліпені 1941 года разам з іншымі шматлікімі каштоўнасцямі бясследна знікла адсюль нацыянальная рэліквія — крыж Ефрасінні Полацкай. Як ні дзіўна, але да сённяшняга часу ніхто не можа сказаць, куды падзявалася магілёўская калекцыя. Нават былы дырэктар краязнаўчага музея Іван Сяргеевіч Мігулін, які стаў апошнім сведкам знаходжання крыжа ў пакоі-сейфе.

Калі гітлераўцы падыходзілі да Магілёва, Іван Сяргеевіч запісаўся ў апалчэнне. Аднак трэба было ратаваць музейныя каштоўнасці. Прыйшоў да абкома (у той час ён размяшчаўся ў будынку па вул. Міронава), каб паклапаціцца аб вывазе змесціва сейфа, але вартавы яго не пусціў. Сказаў, што ўся маёмасць эвакуіравана. Мігулін падумаў, што крыж таксама адправіўся ў тыл. Таму разам з сям'ёй выехаў у Горкаўскую вобласць.

Пасля вызвалення Магілёва сустрэў свайго знаёмага Лукоўнікава. Той і паведаміў яму сумную гісторыю. У час акупацыі Лукоўнікаў працаваў у немцаў і быццам у пачатку восені сорак першага дапамагаў складаць спіс скарбаў сейфа. У гэтай справе ўдзельнічалі таксама настаўнікі Конюхаў і Скрыннікаў.

У хуткім часе Мігуліна выклікалі ва ўпраўленне НКУС. Галоўная тэма размовы з маёрам Маўчанавым была, дзе падзеліся музейныя каштоўнасці. Іван Сяргеевіч расказаў пра сустрэчу з Лукоўнікавым. Пасля яго больш не турбавалі. Такая вось гісторыя. Амаль слова ў слова паўтарыў яе і сёлета Мігулін супрацоўнікам КДБ Магілёўскай вобласці, якія вядуць пошук крыжа і каштоўнасцей ужо трэці год. З таго часу пытанняў у гэтай справе не зменшылася.

Германія прыклала руку?

У пошуку афіцыйных дакументаў аб знаходжанні крыжа Ефрасінні Полацкай у Магілёве (на іх аснове можна будзе ўзбудзіць крымінальную справу), сведкаў тых падзей значнае месца адводзіцца аналізу архіўных матэрыялаў УКДБ, крымінальным справам на былых фашысцкіх памагатых: раптам знойдзецца пацвярджэнне разрабавання каштоўнасцей немцамі? У гэтым сэнсе пэўную цікавасць уяўляюць крымінальныя справы па абвінавачванні Сташэўскага, Конюхава, Скрыннікава, Лукоўнікава і інш.

З пратаколу допыту Сташэўскага М.Я. — перакладчыка аддзела прапаганды нямецкай камендатуры: «...У лістападзе 1943 года гарадская камендатура прызначыла мяне адказным за эвакуацыю ў г. Беласток кніг Магілёўскай бібліятэкі... Было адабрана і запакавана 300 скрынь, прыблізна 40 тысяч кніг, якія былі пагружаны ў 4 вагоны і накіраваны ў Беласток». У абвінавачанні па гэтай справе гаворыцца, што кнігі Сташэўскі адправіў па заданні нямецкай арганізацыі «Штаб Розенберга», якая займалася вывазам музейных, бібліятэчных і іншых гістарычных каштоўнасцей.

А вось паказанні былога жыхара Магілёўскага раёна Базыленкі К.П.: «...Усе кнігі ў 1941 годзе некалькі разоў правяраліся, вы-

бракоўваліся, знішчаліся або раскрадаліся правяраючымі...»

Як бачна, гаворка ідзе пра вываз акупантамі бібліятэкі і гарадскога архіва. Іншых звестак, у тым ліку і пра захоп немцамі скарба з пакоя-сейфа музея, атрымаць не ўдалося, хоць прагледжана ўжо больш за 80 крымінальных спраў. Можа прыведзены факт вывазу бібліятэкі паслужыў асновай той версіі, што фашысты разрабавалі музейныя каштоўнасці?

На думку былой галоўнай захавальніцы музея Ніны Філімонаўны Мяснікавай, вываз каштоўнасцей фашыстамі не мог застацца тайнай 3—4 чалавек, тым больш, калі ў гэтай «аперацыі», як сцвярджаецца, удзельнічалі нашы суайчыннікі. У час акупацыі Мяснікава жыла непадалёк ад былога абкома, сустракалася з некаторымі краязнаўцамі. Ніколі не чула пра разрабаванне каштоўнасцей музея фашыстамі. Гэта, вядома, яшчэ не падстава для высноў. Але наўрад крыж стаў прыналежнасцю Германіі.

Ці быў задаволены Берыя?

Такімі каштоўнасцямі, як крыж, у час эвакуацыі павінны былі займацца супрацоўнікі НКУС. І хоць Мігулін сцвярджаў, што яны не ведалі пра скарб, трэба думаць, што нацыянальная рэліквія не магла застацца без увагі кіраўніцтва вобласці і НКУС. Аб гэтым сведчыць і акт перадачы крыжа Ефрасінні Полацкай з Мінскага дзяржаўнага музея ў Магілёўскі, які апісаны ў кнізе У.Арлова «Ефрасіння Полацкая». Там гаворыцца, што супрацоўнік аддзела фельд'егерскай сувязі паўнамоцнага прадстаўніцтва АГПУ па Беларускай ваеннай акрузе Лугаўцоў атрымаў ад начальства даверанасць «...на право получения ценностей из государственного музея для отправки таковых в гор. Могилев». 29 лістапада 1929 года датаваны акт аб перадачы крыжа ў рукі Лугаўцова.

Напэўна, вяліся пратаколы допыту Мігуліна маёрам Малчанавым па справе аб знікненні каштоўнасцей музея. Толькі звестак у архіве КДБ не захавалася. Прайшло ўжо шмат часу, і дакументы, калі такія існавалі, былі знішчаны са сканчэннем тэрміну захавання.

А на запыт сваіх маскоўскіх калег супрацоўнікі КДБ атрымалі такі адказ: «Цэнтральны аператыўны архіў Міністэрства бяспекі Расійскай Федэрацыі даных аб тым, што каштоўнасці з Магілёўскага дзяржаўнага музея былі забраны супрацоўнікамі НКУС у 1941 годзе, не мае». Адмоўныя адказы атрыманы таксама з Дзяржаўнага гістарычнага музея, прэзідыума Акадэміі навук, камітэта каштоўных металаў і каштоўных камянёў, Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, Цэнтральнага расійскага банка.

«Я разлічваў, што каштоўнасці эвакуіраваны...»

Гэта словы І.С.Мігуліна. Сапраўды, абсурдна было думаць, што супрацоўнікі абкома, якія эвакуіравалі ўжо маёмасць да апошняй зашчапкі, пра пакой-сейф забыліся. Што там захоўвалася, яны добра ведалі, бо не раз прыходзілі да Мігуліна паглядзець на цудоўныя прадметы мінулага. Калі верыць аднаму з пасяджэнняў абкома 1945 года, дзе разглядалася персанальная справа камуніста Мігуліна, то выходзіць, што так яно і атрымалася. Тады Івану Сяргеевічу за «...непрыняцце мер па эвакуацыі залатых каштоўнасцей музея ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны..., за халатныя адносіны да ўліку і захавання матэрыяльных каштоўнасцей музея...» была аб'яўлена строгая вымова з занясеннем ва ўліковую картку. Да таго ж у былым партархіве не захавалася ніякіх афіцыйных дакументаў пра знаходжанне крыжа і каштоўнасцей у Магілёве і канкрэтна ў пакоі-сейфе, іх далейшым лёсе. Адсутнічаюць і пратаколы пасяджэнняў абкома па пытаннях эвакуацыі.

Вываз каштоўнасцей разам з маёмасцю абкома, магчыма, усё ж адбыўся. Вядома, што архівы знаходзіліся ў той час вайны ў Саратаве і Уфе. Можа, гэта і ёсць «усходні» варыянт падарожжа крыжа Ефрасінні Полацкай, аб якім шмат расказвалася ўжо ў прэсе.

Крыж у Магілёве

Гэта ужо занадта, скажа чытач. Але ў ходзе пошуку, як ні дзіўна, давялося чуць версію, што наша нацыянальная рэліквія знаходзіцца недзе на Магілёўшчыне або зусім не пакідала межаў абласнога цэнтра. Група супрацоўнікаў НКУС пачала вывозіць каштоўнасці, калі варожае кальцо замкнулася пад Чавусамі. Разумеючы, што прарвацца са скарбам не ўдасца, чэкісты закапалі яго дзесьці ў гэтым раёне, а самі разышліся, каб па адным прайсці лінію фронту.

Яшчэ па адной версіі, калі ў горад уступілі фашысты, крыж і іншыя рэлігійныя каштоўнасці музея былі перададзены на захаванне

аднаму з царкоўных святароў, след якога дзесьці згубіўся.

Адкуль нараджаюцца такія чуткі? Напэўна ад таго, што каштоўнасці Магілёўскага музея, у тым ліку і крыж Ефрасінні Полацкай, не аб'явіліся дагэтуль ні ў адной асабістай ці дзяржаўнай калекцыі. Але пошук працягваецца.

Пошук працягваецца

І вось на пытанні журналіста газеты «Рэспубліка» Т.Абакумоўскай адказвае С.У.Багдановіч.

— Вы завяршаеце свае нататкі абнадзейлівымі словамі — пошук працягваецца. Дык ці працягваецца?

— Больш таго, можна сказаць, ён выйшаў на больш грунтоўны ўзровень. Па-першае, мы будзем вельмі ўдзячны Пракуратуры Рэспублікі Беларусь, калі яна знойдзе падставу для таго, каб узбудзіць крымінальную справу па факту знікнення нацыянальных рэліквій, што ў сваю чаргу дае магчымасць, а гэта вельмі важна, звярнуцца з заяўкай на пошук у Інтэрпол. Прыемна, што нас падтрымаў дырэктар нацыянальнага цэнтральнага бюро Інтэрпола Пётр Скаржэўскі і яго супрацоўнікі, якія з вялікай зацікаўленасцю аднесліся да праблемы. У сувязі з гэтым мне хацелася б звярнуць увагу на тое, што аўтары некаторых публікацый аб пошуку крыжа вельмі вольна абыходзяцца з фактамі. Напрыклад, яшчэ ў 1993 годзе ў адным артыкуле сцвярджалася, што Інтэрпол даўно актыўна вядзе пошук, у другім аўтар спасылаўся на архіўныя дакументы, якіх увогуле не існуе. Падобнае дапускаецца ў мастацкіх творах, але тады, калі кожны дакумент ці яго адсутнасць можа карэнным чынам паўплываць на лёс справы, гэта проста недапушчальна.

На нашу думку, нарэшце, трэба мець у дзяржаве, як у большасці цывілізаваных дзяржаў, адпаведную структуру, якая б на афіцыйным узроўні займалася праблемамі пошуку і вяртання нацыянальных каштоўнасцей. Беларусь, як, можа, ніякая іншая дзяржава, пацярпела, была абрабавана ў час вайны і ў мірныя часы, і яна ж адна з нямногіх не мае дзяржаўнага органа, які б на адпаведным узроўні займаўся вяртаннем згубленых нацыянальных рэліквій, раскіданых па ўсяму свету.

— Не так даўно, Сяргей Уладзіміравіч, я мела магчымасць прысутнічаць на прэзентацыі зборніка «Вяртанне», другога па ліку, выдадзенага клопатамі і энтузіязмам навуковай грамадскасці. У прадмове Іван Чыгрынаў, былы старшыня праўлення Беларускага фонду культуры, які нядаўна назаўсёды пакінуў нас, піша, што знаёмства з матэрыяламі зборнікаў дае кожнаму з нас высокае пачуццё годнасці за геній яе лепшых прадстаўнікоў, якія нават у жорсткіх гістарычных умовах займелі такія вялікія, сусветнага ўзроўню, культурныя здабыткі. Сказана вельмі трапна. Але ў мяне, як, відаць, і ў вас, пасля знаёмства з матэрыяламі кнігі побач з пачуццём гордасці абвастрылася і іншае пачуццё — горычы. Горычы за тое, што ў дзяржаўным спісе багацняў, якія належаць нашаму народу, спрэс значыцца — не вернута. Не вернута, не вернута, не вернута... І не будзе вернута, пакуль справа не паставіцца на дзяржаўную аснову.

— Мне здаецца вельмі мэтазгодным узняць гэтае пытанне на ўзровень Вярхоўнага Савета. Можа, новыя парламентарыі будуць клапаціцца аб нацыянальнай спадчыне на справах, а не словах. Стварэнне дзяржаўнай структуры па прыкладу, скажам, украінскай дало б магчымасць больш дэталёва вывучаць замежныя архівы, прыцягнуць кансультантаў з сусветным аўтарытэтам. Такія паслугі прапаноўваліся, але іх няма чым аплаціць, да таго ж неабходны больш высокі афіцыйны статус, каб весці падобныя перамовы, заключаць адпаведныя дагаворы і г.д.

— І ўсё ж, як прасунуўся пошук за гэтыя гады і ці скрануўся наогул?

— Безумоўна. Адкрылася шмат новых дэталяў, мы знайшлі і апыталі многіх сведкаў, якія мелі, няхай ускосныя, адносіны да тых падзей. Напрыклад, былы сакратар Магілёўскага гаркома камсамола, які быў астаўлены ў падполлі, Павел Фаміч Валожын перадаў нам дзённікавыя запісы, дзе дзень за днём апісаны падзеі пачатку вайны. Складваецца вельмі праўдзівая карціна абставін, якія суправаджалі эвакуацыю. Яе дапаўняюць сведчанні былога сакратара ЦК Кампартыі Беларусі Мікалая Яфрэмавіча Аўхімовіча. Гэта дае магчымасць па днях і па гадзінах аднавіць панараму магілёўскай эпапеі. Мы дакладна ўстанавілі, што да першых дзён ліпеня эвакуацыі людзей і матэрыяльных каштоўнасцей з Магілёва не было, бо нават думка аб эвакуацыі лічылася панікёрствам...

Апытанне сведак дае магчымасць сцвярджаць, што да 11 ліпеня каштоўнасці былі ў Магілёве. Верагодна, што іх вывезлі паміж 11-м і 22-м ліпеня. Уся маёмасць перапраўля-

лася праз Лёзна—Рослаўль—Гомель, адтуль у глыбіню Расіі. Была вялікая паніка, былі бясконцыя бамбёжкі. Можа калекцыю з сейфа схавалі дзе-небудзь па дарозе? Ва ўсякім разе, на запыты ў расійскія архівы нам адказваюць: дакументаў з перапісам магілёўскай калекцыі няма. Праведзены пошук дае магчымасць спыніцца на дзвюх версіях: вываз каштоўнасцей у Расію ў час эвакуацыі, другая — рабаванне калекцыі да ўваходу фашыстаў у Магілёў.

— А «заходні» след, аб якім так многа гаварылася, выключаеце?

— Зусім не. З найбольшай верагоднасцю можна сцвярджаць, што каштоўнасці з Магілёва былі вывезены на ўсход. Але чаму ж цягам часу яны самымі фантастычнымі шляхамі не маглі перамясціцца на захад? Ды што на захад! Па ўсім свеце! Вось толькі тады, калі Інтэрпол пасля грунтоўнага пошуку зацвердзіць, што ў замежных калекцыях гэтых рэчаў адшукаць не ўдалося, можна з максімальнай верагоднасцю выключыць такую версію.

— Дык надзея ёсць?

— А ці можна без яе жыць і працаваць? Надзея ёсць, і мы будзем далей весці росшук. Таму, карыстаючыся выпадкам, хацеў бы праз вашу паважаную газету звярнуцца да людзей, якія мелі дачыненне да падзей абароны Магілёва, з просьбай дапамагчы ў росшуку нацыянальнай святыні. Адгукніцеся, тыя, хто ўдзельнічаў у эвакуацыі людзей, маёмасці, былыя работнікі абкома, краяведы. Звяртайцеся ва ўпраўленне КДБ па Магілёўскай вобласці ці ў Камітэт дзяржбяспекі ў Мінску.

Я ўпэўнены, што ўсім нам, беларусам, неабыякавы лёс нашых святынь, таму і шукаць іх павінны разам. Гісторыя не даруе нам, калі крыж Ефрасінні Полацкай не будзе знойдзены, не будзе з намі. Як не даруе і таму, хто выкраў нацыянальную святыню, бо нездарма на пазалочанай пласціне крыжа накрэслена: «Кто же дерзнет творить власть над ним, будет проклят».

На стагоддзі ў памяці народнай

Спыніць можна імгненне, а не час. Яго бег няўмольны, і з гэтым нічога зрабіць нельга. Але вельмі многае можна зрабіць, каб на стагоддзі запомніць не прыдуманыя, а рэальныя падзеі далёкага і блізкага мінулага, гісторыю жыцця і творчыя дасягненні пакаленняў, подзвігі воінаў і мірных працаўнікоў, здзейсненыя на карысць свайго народа, на карысць Радзімы.

Размова ідзе пра помнікі. Вядома, што яны ўзводзяцца не толькі дзеля памяці пра тых, каго ўжо няма, пра тыя гістарычныя і гераічныя падзеі, якія пакрыліся пылам даўніны, і не толькі для старых-ветэранаў. Помнікі патрэбны людзям, каб дакрануўшыся сэрцам да вялікіх спраў суайчыннікаў, яны, асабліва маладыя, лепш пазнавалі сябе і правільна выбіралі дарогі жыцця.

У бронзе, граніце і мармуры

У Магілёве ёсць мемарыяльныя комплексы, шмат манументаў, абеліскаў, мемарыяльных знакаў і дошак на жылых дамах і адміністрацыйных будынках, прозвішчаў, навечна прапісаных у назвах гарадскіх плошчаў, праспектаў, вуліц і завулкаў. У іх — удзячная памяць нашчадкаў аб гераічным мінулым краіны і горада, у іх — бязмерная горыч страт і бязмежная любоў да Айчыны, да тых, хто загінуў за гонар і свабоду, хто славіў горад і ствараў яго гісторыю, клікаў землякоў да святла, на подзвіг.

Мемарыяльныя комплексы, манументы, бюсты, абеліскі

Двойчы праездам пабываў у Магілёве вялікі рускі паэт А.С.Пушкін. Сустракаўся са сваімі сябрамі-дзекабрыстамі, якія служылі ў 1-й арміі. Цяпер на абочыне былога Чарнігаўскага тракта (зараз Пушкінскі праспект), па якім паштовая карэта везла паэта на поўдзень, у выгнанне, у зеляніне сквера кожнаму прахожаму кідаецца ў вочы высокі бялюткі п'едэстал, на якім горда стаіць, узіраючыся ў далёкую будучыню, Аляксандр Сяргеевіч Пушкін.

Ва ўсе часы ў грамадстве былі свае ідэалы і свае лідэры, ушанаванне памяці якіх станавілася нібы сімвалам эпохі. Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што ў Магілёве ўзведзены 9 помнікаў і створаны два кампазіцыйныя рэльефы Уладзіміра Ільіча Леніна. Яны ўстаноўлены: на плошчы перад Домам Саветаў, у скверы гімназіі (былая СШ № 3, па вул. Ленінскай), на вул. Індустрыяльнай (металургічны завод), каля гарадской карціннай галерэі (вул. Міронава), каля Дома культуры завода імя Кірава, на тэрыторыі завода «Стромаўталінія» (вул. Першамайская), каля адміністрацыйнага будынка завода штучнага валакна імя Куйбышава (вул. Чэлюскін-

ПОМНІКІ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ г. МАГІЛЁВА



цаў), на тэрыторыі СШ № 7 (вул. Аўтазаводская), каля камбіната хлебапрадуктаў (вул. Будаўнікоў). Кампазіцыйныя рэльефы знаходзяцца ў будынках абласной бібліятэкі імя Леніна (вул. Дзяржынскага) і Дома юстыцыі (вул. Першамайская).

Бронзавыя бюсты на высокіх п'едэсталах — гэта знак павагі магіляўчан да:

Сяргея Міронавіча Кірава (вул. Аўтазаводская), Аляксандра Фёдаравіча Мяснікова (металургічны завод), Аляксея Максімавіча Горкага (сквер на Замкавай гары), Іосіфа Іракліевіча Гусакоўскага (вул. Першамайская).

У горадзе шмат помнікаў і памятных знакаў, прысвечаных героям і ахвярам Вялікай Айчыннай вайны. Створаны яны дзеля таго, каб наша памяць захавала для будучых пакаленняў трагічныя падзеі мінулай вайны і прозвішчы людзей, якія мелі непасрэдныя адносіны да таго, што адбывалася ў Магілёве.

Савецкая плошча атрымала назву ў лістападзе 1917 г., пасля шматтысячнага мітынгу, на якім было абнародавана рашэнне Савета рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў пра абвяшчэнне савецкай улады на тэрыторыі Магілёўскай губерні. У гонар гэтай гістарычнай падзеі магіляўчане пабудавалі тут **мемарыяльны комплекс «Барацьбітам за Савецкую ўладу»**. Бронзавыя барэльефы расказваюць пра барацьбу і працу магіляўчан з моманту абвяшчэння савецкай улады да 1980-х гадоў. Вянчае шматкампазіцыйнае збудаванне манумент Маці-перамогі.

Арганічна ўпісваецца ў мемарыяльны комплекс гранітнае надмагілле на **брацкай магіле загінуўшых герояў грамадзянскай вайны**.

Памятны знак і адноўленая зямлянка штаба Заходняга фронту, дзе 1—2 ліпеня 1941 г. праходзіла нарада камандавання фронту, 13-й арміі, 61-га стралковага корпуса, 172-й стралковай дывізіі з удзелам Маршалаў Савецкага Саюза К.Я.Варашылава і Б.М.Шапашнікава, першага сакратара ЦК КП(б)Б, члена ваеннага Савета фронту П.К.Панамарэнкі і першага сакратара Магілёўскага абкома КП(б)Б І.Н.Макарава. На нарадзе абмяркоўваліся пытанні абароны Магілёва, разгортвання партызанскага і падпольнага руху ў тыле ворага (лес непадалёку ад завода імя Кірава).

Мемарыяльны комплекс на Буйніцкім полі (Бабруйская шаша), прысвечаны памяці воінаў 172-й дывізіі, 394-га стралковага палка 110-й дывізіі, народных апалчэнцаў, якія загінулі ў абарончых баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў ліпені 1941 г. У комплекс уваходзяць: мемарыяльная капліца, мармуровы знак, прысвечаны воінам 388-га стралковага, 340-га артылерыйскага палкоў і народным апалчэнцам, якія гераічна змагаліся з ворагам з 10 па 26 ліпеня 1941 г.; **абеліск на брацкай магіле** воінаў 388-га стралковага, 340-га артылерыйскага палкоў і народных апалчэнцаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі 12—13 ліпеня 1941 г. (Буйніцкае поле, чыгуначны пераезд); **абеліск на магіле невядомага чырвонаармейца** 172-й дывізіі, які загінуў пры абароне Магілёва (раён аўтарэмзавода); **мемарыяльны знак**, прысвечаны памяці выдатнага савецкага пісьменніка Канстанціна Сіманава, які 12—14 ліпеня 1941 г. наведаў падраздзяленні 388-га стралковага і 340-га артылерыйскага палкоў, а потым пра іх гераізм і мужнасць расказаў у газеце «Известия». Па жаданні пісьменніка на Буйніцкім полі развеяны яго прах.

Абеліск на брацкай магіле воінаў 172-й стралковай дывізіі і 394-га стралковага палка 110-й стралковай дывізіі, якія загінулі пры абароне Магілёва ў ліпені 1941 г. (Машэкаўскія могілкі, Нацыянальны спуск).

Абеліск на брацкай магіле воінаў 172-й стралковай дывізіі і 394-га палка 110-й стралковай дывізіі, якія загінулі пры абароне Магілёва ў ліпені 1941 г. (Машэкаўскія могілкі).

Помнік, прысвечаны камандзірам і радавым з батальёна міліцыі, якія загінулі пры абароне Магілёва (Шклоўская шаша, в. Гаі).

Абеліск на брацкай магіле народных апалчэнцаў, якія загінулі пры абароне Магілёва ў ліпені 1941 г. (вул. Лазарэнкі).

Помнік вызваліцелям Магілёва — танк Т-34, устаноўлены на п'едэстале, на якім умацавана мармуровая дошка са словамі ўдзячнасці гараджан арміі-вызваліцельніцы (вул. Якубоўскага).

Скульптурная кампазіцыя, прысвечаная гераічнаму подзвігу савецкіх сапёраў і артылерыстаў, якія сталі на шляху адступлення працаўніка. Яны загінулі, але ворага з акружанага Магілёва не выпусцілі (Пячэрскі лесапарк).

Помнік на брацкіх могілках, дзе пахаваны звыш 300 савецкіх салдат і афіцэраў, у тым ліку 5 Герояў Савецкага Саюза — М.К.Буянаў, М.А.Замулаеў, А.М.Касаеў,

В.І.Панкоў і М.В.Рамашка, якія загінулі пры абароне і вызваленні Магілёва, у партызанскіх баях (вул. Лазарэнкі).

Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў 238-й стралковай дывізіі 121-га стралковага корпуса, 389-й стралковай дывізіі 62-га стралковага корпуса, якія загінулі пры вызваленні Магілёва ў чэрвені 1944 г. (пр. Шміта).

Абеліск на брацкай магіле савецкіх воінаў 110-й і 139-й стралковых дывізій, якія загінулі пры вызваленні Магілёва ў чэрвені 1944 г. (вул. Аўтазаводская).

Помнік на магіле Героя Савецкага Саюза генерал-маёра І.С.Лазарэнкі (вул. Першамайская).

Абеліск на брацкай магіле воінаў 49-й арміі, якія загінулі пры вызваленні Магілёва ў чэрвені 1944 г. (Машэкаўскія могілкі, Нацыянальны спуск).

Помнік на брацкай магіле салдат і афіцэраў 238-й і 324-й стралковых дывізій, якія загінулі пры вызваленні Магілёва ў чэрвені 1944 г. (Машэкаўскія могілкі).



Помнік на брацкіх могілках савецкіх воінаў.

Помнік на брацкай магіле савецкіх лётчыкаў з 210-га авіяпалка, якія загінулі пры выкананні баявога задання (Успенскія могілкі).

Абеліск на брацкай магіле воінаў 238-й стралковай дывізіі, якія загінулі пры вызваленні Магілёва ў чэрвені 1944 г. (Карабанаўскія могілкі).

Абеліск на брацкіх могілках савецкіх воінаў, якія памерлі ў шпіталі ад ран, атрыманых у баях за вызваленне Магілёва ад акупантаў (вул. Лазарэнкі).

Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў, якія загінулі пры вызваленні Магілёва ад нямецка-фашысцкіх акупантаў (пас. Бароўка).

Помнік 270 героям-землякам, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны ў 1941—45 гг. (пас. Казіміраўка).

Абеліск на брацкай магіле мірных грамадзян горада, расстраляных гітлераўцамі па падазрэнні ў антыфашысцкай дзейнасці і парушэнні загадаў акупацыйных улад (Машэкаўскія могілкі).

Абеліск на брацкай магіле мірных савецкіх грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці, расстраляных гітлераўцамі ў 1942 г. (за 1 км ад шашы Магілёў — Орша, на поўнач ад аўтазавода імя Кірава).

Мемарыяльны комплекс на могілках савецкіх ваеннапалонных, знішчаных гітлераўскімі катамі (каля 70 тыс. чалавек) у лагеры смерці (пр. Шміта).

Мемарыяльныя памятныя знакі

У нашага народа існуе добрая традыцыя адзначаць памятнымі знакамі з каменю, граніту, бетону адметныя даты, знамянальныя падзеі ў жыцці Айчыны і выдатных землякоў. І такія знакі памяці можна ўбачыць на вуліцах Магілёва.

Гранітнай плітой адзначана гарадзішча «Змяёўка», адкрытае ў свой час археолагамі і аднесенае імі да 2-га стагоддзя н.э. (пр. Міру).

Гранітным абеліскам адзначана месца размяшчэння камандnага пункта 121-га стралковага корпуса, адкуль у чэрвені 1944 г. ажыццяўлялася кіраўніцтва фарсіраваннем Дняпра і штурмам Магілёва (пр. Дзімітрава).

Камень-валун магіляўчане прывезлі ў горад і ўстанавілі на рагу аднаго з цэнтральных сквераў у дні святкавання 40-годдзя Перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй і

назвалі гэты сквер імем Перамогі (бульвар Леніна — вул. Міронава).

На бетонным памятным абеліску золатам гараць словы, што гэты знак устаноўлены ўдзельнікам 6-га паходу беларускай моладзі па месцах баявой і працоўнай славы сваіх дзядоў і бацькоў (пр. Міру).

Памятная мемарыяльная пліта ўстаноўлена ў гонар французскага горада-пабраціма Вілербана (вул. Першамайская — вул. Міронава).

Алея Герояў, дзе на драўляных падстаўках, упрыгожаных Залатымі зоркамі, замацаваны партрэты 108 Герояў Савецкага Саюза Магілёўшчыны (вул. Першамайская).

Мемарыяльныя дошкі

Яны ўвекавечылі памяць выдатных землякоў-магіляўчан і суайчыннікаў, якія вызначыліся ў баях за Радзіму, на вякі засведчылі на мармуры або метале важнейшыя падзеі ў гісторыі горада.

Прысвечаныя гісторыка-рэвалюцыйным падзеям: **У гонар дзекабрыстаў** С.І.Мураўёва-Апостала, М.П.Бястужава-Руміна (вул. Першамайская, 8); **на доме № 22 па Ленінскай вуліцы**, дзе ў 1912—14 гг. размяшчалася падпольная бібліятэка магілёўскай групы «праўдзістаў»; **на Доме культуры будтрэста № 12 па вул. Ленінскай, 1** у памяць аб губернскім з'ездзе Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў; **па вул. Ленінскай, 11а,** дзе ў 1918 г. размяшчалася Магілёўская губернская надзвычайная камісія; **на будынку трэста і гарадскога Дома культуры** (вул. Першамайская, 7 і 34), дзе 14 ліпеня 1919 г. выступаў старшыня ВЦВК М.І.Калінін.

Прысвечаныя **дзяржаўным і партыйным дзеячам, удзельнікам грамадзянскай вайны, вучоным, военачальнікам, дзеячам літаратуры і мастацтва**: **Р.К.Арджанікідзе**, у памяць аб яго знаходжанні ў Магілёве ў якасці члена рэўкома 16-й арміі (пл. Савецкая, 1); **М.В.Басіну**, памяці бакінскага камісара, які ў юнацтве вучыўся ў Магілёве (вул. Пляханава, 11/12); **М.В.Крыленку**, у гонар першага савецкага Вярхоўнага галоўнакамандуючага (вул. Крыленкі, 2); **Дз.К.Міронаву**, удзельніку барацьбы за ўстанаўленне савецкай улады на Магілёўшчыне (вул. Міронава, 27); **М.Дз.Бонч-Бруевічу**, памяці генерала, былога ваеннага каменданта горада і члена гарадскога Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў (вул. Бонч-Бруевіча, 2); **А.М.Лепяшынскаму**, прафесійнаму рэвалюцыянеру, саратніку У.І.Леніна (вул. Лепяшынскага, 14); **П.М.Лепяшынскаму і О.Ю.Шміту**, былым вучням Магілёўскай гарадской мужчынскай гімназіі (вул. Ленінская, 41); **О.Ю.Шміту**, земляку, буйному вучонаму, Герою Савецкага Саюза (пр. Шміта, 6); **М.П.Вішнявецкаму**, земляку, удзельніку грамадзянскай вайны (вул. Вішнявецкага, 9); **П.А.Залуцкаму**, удзельніку грамадзянскай вайны (вул. Залуцкага, 1); **І.І.Якубоўскаму**, памяці земляка, Маршала Савецкага Саюза, двойчы Героя Савецкага Саюза (вул. Якубоўскага, 33); **К.П.Арлоўскаму**, у гонар земляка, Героя Савецкага Саюза і Героя Сацыялістычнай Працы (вул. Арлоўскага, 4); **М.Ф.Рабчэўскаму**, былому вучню, Герою Савецкага Саюза (вул. К.Маркса, 13, на будынку медвучылішча); **Г.Дзімітрову**, дзеячу балгарскага і міжнароднага камуністычнага руху (пр. Дзімітрова, 33); **Ф.А.Сурганаву**, партыйнаму і дзяржаўнаму дзеячу Беларусі (вул. Сурганава, 9); **М.К.Кураку**, земляку, буйному вучонаму-металургу (вул. Куракі, 8); **П.П.Яцыну**, земляку, вядомаму скульптару (вул. Яцыны, 8); **М.П.Каралёву**, земляку, Герою Савецкага Саюза (вул. Першамайская, 67); **А.В.Пысіну**, земляку, беларускаму паэту (пр. Міру, 35 а).

Прысвечаныя абароне Магілёва ў ліпені 1941 г., удзельнікам гарадскога партыйна-камсамольскага падполля, вызваленню горада ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, землякам, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны: на будынку галоўнага корпуса машынабудаўнічага інстытута, дзе ў першы дзень вайны быў сфарміраваны знішчальны батальён пад камандаваннем начальніка школы міліцыі М.І.Калугіна (бульвар Леніна, 5); **на будынку сярэдняй школы № 11**, дзе ў час абароны Магілёва размяшчаўся штаб 172-й стралковай дывізіі (вул. Мянжынскага, 14); **на будынках Дома культуры будаўнікоў і гарадской бальніцы**, у памяць аб жорсткіх баях воінаў 172-й стралковай дывізіі і народных апалчэнцаў (вул. Ленінская, 1 і вул. Боткіна, 2); **памяці генерал-маёра**, камандзіра 172-й стралковай дывізіі **М.Ц.Раманава** (вул. Раманава, 2); **памяці камандзіра 388-га стралковага палка 172-й дывізіі С.Ф.Куцепава** (вул. Куцепава, 1); **памяці камандзіра батальёна міліцыі К.Р.Уладзімірава**, які гераічна загінуў пры абароне горада (вул. Грышына, 2); **памяці арганізатараў і кіраўнікоў падпольных груп на чыгуначным вузле** ст. Магілёў (Прывак-

зальная плошча, на будынку чыгуначных білетных кас); **памяці антыфашысцкай падпольнай групы** на гарадскім хлебазаводзе, арганізатарам і кіраўніком якой быў М.М.Еўціхееў (вул. Першамайская, 27); **у гонар падпольнай групы «Непакораныя»**, якая дзейнічала ў шпіталі (вул. Камсамольская, 12); на адміністрацыйным будынку гарадской бальніцы, **памяці падпольнай антыфашысцкай групы**, якой кіраваў урач М.П.Куўшынаў, і **памяці ваенурачоў У.П.Кузняцова, А.І.Парына і Ф.І.Пашаніна**, якія былі публічна пакараны ў лістападзе 1941 г. за антыфашысцкую дзейнасць (вул. Боткіна, 2); **памяці вучаніцы СШ № 1**, актыўнай удзельніцы антыфашысцкага падполля **Тані Карпінскай**, па-зверску закатаванай фашыстамі разам з маці (вул. Першамайская, 24); **памяці дэпутатаў абласнога Савета**, якія не вярнуліся з вайны (пл. Леніна); **памяці работнікаў міліцыі**, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі (вул. К.Маркса, 25); **памяці рабочых і служачых аўтазавода імя Кірава**, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў антыфашысцкім падполлі (Віцебскі праспект); **памяці студэнтаў і выкладчыкаў пединстытута**, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны (вул. Касманаўтаў, 1); **памяці журналістаў газеты «Магілёўская праўда»**, якія загінулі ў баях за свабоду і незалежнасць Радзімы (вул. Першамайская, 77); **памяці былых вучняў СШ № 1**, што загінулі за незалежнасць Радзімы (вул. Першамайская, 24); **памяці інжынераў завода імя Куйбышава І.В.Бубнова і М.А.Канавалава**, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі (вул. Чэлюскінцаў, 101); **памяці генерал-маёра, Героя Савецкага Саюза І.С.Лазарэнкі**, які загінуў пры вызваленні Магілёва (вул. Лазарэнкі, 2/12); **памяці Героя Савецкага Саюза М.І.Яшына**, які адным з першых фарсіраваў Дняпро (Дняпроўскі мост); **памяці Героя Савецкага Саюза М.К.Буянава**, які загінуў пры вызваленні Магілёва (зав. Буянава, 3); **памяці Героя Савецкага Саюза М.Р.Рамашкі**, які загінуў пры вызваленні Магілёўшчыны (вул. Рамашкі, 1); **памяці генерал-лейтэнанта І.В.Болдзіна**, камандзіра 50-й арміі, якая вызначылася пры вызваленні Магілёва (вул. Болдзіна, 11); **памяці генерал-лейтэнанта І.Ц.Грышына**, камандзіра 49-й арміі, якая вызначылася пры вызваленні Магілёва (вул. Грышына, 3); **памяці соцень мірных грамадзян**, загубленых гітлераўцамі ў перасыльным лагеры (вул. Першамайская, 77); на адміністрацыйным будынку завода «Строммашына».

З гісторыі назваў вуліц

Да пачатку 20 ст. ў Магілёве было не надта многа вуліц і плошчаў. Многія з іх па тых ці іншых прычынах перайменоўваліся, некаторыя па некалькі разоў. Як жа называліся яны да перайменавання?

Плошча У.І.Леніна — гэта былая Базарная, Цэнтральная, Дома Саветаў; **плошча Г.К.Арджанікідзе** — Касцерня; **плошча Савецкая** — Гандлёвая, Губернатарская, Перамогі; **плошча Тэатральная** — Рэвалюцыі; **вуліца Астроўскага** — Байніцкая; **вул. Болдзіна** — завулак Мураўёўскі, Семінарскі; **вул. Будзённага** — завулак Шклоўскі, вул. Суворaўская; **завулак Віцебскі** — Аршанская шаша; **вул. Гагарына** — вул. Лагерная; **вул. Грышына** — вул. Артылерыйская, Чэлябінская; **вул. Вялікая Грамадзянская** — вул. Вялікая Машэкаўская; **праспект Дзімітрова** — Аршанская шаша, Віцебскі праспект; **вул. Заводская** — вул. Папінская; **вул. Карпінскага** — вул. Гваздоўская; **вул. Т.Карпінскай** — завулак Кулічаў; **завулак Камісар'яцкі** — завулак Гарохаў, Пішчыкаў; **вул. Камсамольская** — вул. Дваранская; **Камсамольскі сквер** — Шклоўскі базар; **вул. Каралёва** — вул. Дняпроўская; **вул. Касманаўтаў** — вул. Какінакі; **вул. Вал Чырвонай Зоркі** — вул. Архірэйскі Вал; **вул. Крупскай** — Палыкаўская шаша; **вул. Крыленкі** — завулак Магільны, Клубны; **вул. Лазарэнкі** — вул. Велікакняская, Віленская; **вул. Леванеўскага** — вул. Малое Завалле; **вул. Ленінская** — вул. Ветраная, Вялікая Садовая, Інжынерная; **вул. Лепяшынскага** — вул. Каляева, 2-я Суворaўская; **вул. К.Лібкнехта** — вул. Паштовая, завулак Пажарны; **вул. К.Маркса** — вул. Зялёная; **вул. Мянжынскага** — вул. Вялікае Завалле; **вул. Мігая** — завулак Лютэранскі; **праспект Міру** — вул. Ладзькоўская, Конназаводская, Міру; **вул. Міронава** — вул. Афіцэрская; **вул. Першамайская** — вул. Шклоўская, пр.

Дняпроўскі, вул. Крупскай; **вул. Піянерская** — вул. Малая Садовая; **вул. Пляханава** — вул. Глеба-Барысаўская; **пр. Пушкіна** — вул. Новачарнігаўская; **вул. Раманава** — вул. Чырвонай кавалерыі; **вул. Сурганава** — Пячэрская шаша; **вул. Цімірazeўская** — завулак Варанцоўскі; **вул. Чэлюскінцаў** — Быхаўская шаша; **вул. Язерскай** — вул. Базарная; **вул. Яцыны** — завулак Краснапольскі.

Помнікі археалогіі

Замчышча. На мысе высокага правага берага Дняпра, паблізу р. Дубровенка (цяпер тэрыторыя парку імя Горкага). Дзядзінец былога замка чатырохвугольнай формы, плошчай больш за 1 га.

Пелагееўскае гарадзішча. Ва ўрочышчы Змяёўка на правым беразе р. Дубровенка каля моста на пр. Міру. Вядома з 1873 г. Абследаваў у пачатку 20 ст. Е.Р.Раманаў.

Стаянка эпохі мезаліту. За 0,5 км на поўнач ад чыгуначнага моста цераз Дняпро, на першай надпоймавай тэрасе. Выявіў у 1897 г. Е.Р.Раманаў.

Помнікі дойлідства далёкай і блізкай мінуўшчыны

Абласнога драматычнага тэатра будынак, помнік архітэктуры псеўдарускага стылю. Узведзены ў 1886—88 гг. Вул. Першамайская, 7.

Акруговага суда будынак, помнік архітэктуры класіцызму. Узведзены пасля 1778 г. Пл. Савецкая, 1.

Архіепіскапскі палац, помнік архітэктуры класіцызму. Узведзены ў канцы 18 ст. Вуліца Ленінская, 25.

Архірэйскі палац, помнік архітэктуры позняга барока. Узведзены ў 1762—85 гг. Вул. Ленінская, 11 а.

Банка будынак, помнік архітэктуры эклектыкі. Узведзены ў 1904—06 гг. Вул. Ленінская, 50.

Барысаглебскія цэрквы, помнікі архітэктуры 19 ст. Комплекс складаецца з двух цагляных будынкаў. Першы ўзведзены ў 17 ст., як жылы дом, у 19 ст. перабудаваны пад царкву. Другая царква ўзведзена ў 1869 г. Помнік архітэктуры эклектыкі. Завулак Брусава, 2.

Гарадской управы будынак, помнік архітэктуры эклектыкі. Узведзены ў 2-й палове 19 ст., мае рысы стыляў позняга класіцызму і псеўдарускага. Вул. Ленінская, 1.

Дваранскага сходу будынак, помнік грамадзянскай архітэктуры з элементамі стылю мадэрн. Узведзены ў 2-й палове 19 ст. Вул. Першамайская, 34.

Дом Саветаў. Уваходзіць у архітэктурны ансамбль, пл. Леніна, пабудаваны ў 1938—40 гг.

Жаночага епархіяльнага вучылішча будынак, помнік архітэктуры эклектыкі. Узведзены ў 1889—92 гг. Вул. Вароўскага, 29.

Жаночай гімназіі будынак, помнік архітэктуры позняга класіцызму. Узведзены ў 1875 г. Вул. Першамайская, 24.

Жылыя дамы, помнікі жыллёвай архітэктуры 18—20 ст. Дамы (вул. Ленінская, 3, 5/1, 5/2) узведзены ў 19 ст. ў стылі эклектыкі. Дом (вул. Ленінская, 3а) узведзены ў канцы 18 — пач. 19 ст. ў стылі класіцызму. Дом (вул. Ленінская, 7) узведзены ў 1790 г. у стылі класіцызму. Дамы (вул. Ленінская, 6, 8, 10) узведзены ў 2-й палове 19 ст., прыклад гарадскога шматкватэрнага жылля. Дом (вул. Ленінская, 37) узведзены ў 18 ст. ў стылі барока. Дом (вул. Ленінская, 40) узведзены ў пачатку 20 ст. ў стылі эклектыкі.

Касцёл кармелітаў, Станіславаўскі касцёл, помнік архітэктуры стылю барока. Узведзены ў 1750-я гг. Вул. Камсамольская, 4.

Крэдытнага таварыства будынак, помнік архітэктуры пач. 20 ст. ў стылі мадэрн. Вул. Ленінская, 36.

Мемарыяльная арка. Узведзена ў 1780 г. Вул. Першамайская, у скверы імя І.С.Лазарэнкі.

Мікалаеўскай царквы комплекс, помнік архітэктуры барока. Складаецца з шэрагу мураваных пабудоў: Мікалаеўскай (1669—72) і Ануфрыеўскай (1798) цэркваў, жылога дома (шпіталь, 17 ст.), званіцы (17—18 ст.), ага-

роджы з уязной брамай (17—18 ст.). Вул. 1-й Волі.

Мужчынскай гімназіі будынак, помнік архітэктуры класіцызму. Пабудаваны ў 1789 г. як народнае вучылішча, з 1809 г. мужчынская гімназія. Вул. Ленінская, 41.

Настаўніцкага інстытута будынак, помнік архітэктуры эклектыкі. Узведзены ў 1848—53 гг., спалучае рысы стыляў позняга класіцызму, псеўдарускага і мадэрн. Вул. Ленінская, 35.

Пазямельна-сялянскага банка будынак, помнік архітэктуры пачатку 20 ст. Узведзены ў 1903—14 гг. Мае рысы стыляў мадэрн, псеўдарускага і позняга класіцызму. Вул. Міронава, 33.

Рамеснага вучылішча будынак, помнік архітэктуры эклектыкі. Узведзены ў 1903 г. На скрыжаванні вуліц Вароўскага і Пляханава, 11/23.

Рэальнага вучылішча будынак, помнік архітэктуры позняга класіцызму. Узведзены ў 1885 г. На рагу вуліц Піянерскай і Камсамольскай.

Чыгуначнага вакзала будынак, помнік архітэктуры позняга класіцызму. Пабудаваны ў 1902 г. На Прывакзальнай плошчы.

Імёны, якія засталіся ў гісторыі Магілёва

Горад на Дняпры наведвалі многія вядомыя дзяржаўныя дзеячы, прадстаўнікі навукі і культуры. Іх прыводзілі сюды службовыя абавязкі, творчыя інтарэсы.

Пасля вайны ў Магілёве жыў і працаваў у абласной газеце «За Радзіму» беларускі савецкі пісьменнік Мікалай Гаўрылавіч Ткачоў.

Савецкі акцёр Яўген Максімавіч Палосін у 1945—48 гг. працаваў у Магілёўскім драматычным тэатры. Тут ён стварыў такія каларытныя вобразы, як Бальзамінаў («Жаніцьба Бальзамінава» А.Астроўскага), Косме («Дама-невідзімка» П.Кальдэрона), Кропля («Канстанцін Заслонаў» А.Маўзона) і інш.

Беларускі архітэктар Георгій Міхайлавіч Бенядзіктаў у 1965—72 гг. часта наведваў Магілёў, працаваў над праектам і ажыццяўляў архітэктурны нагляд за будаўніцтвам гасцініцы «Магілёў».

Неаднаразова прыязджаў у Магілёў і вёў тут раскопкі старажытных паселішчаў вядомы беларускі археолаг, прафесар, доктар гістарычных навук, грамадскі дзеяч Міхась Аляксандравіч Ткачоў.

У Магілёве пахаваны беларускі паэт Аляксей Пысін. На доме, дзе ён жыў, устаноўлена мемарыяльная дошка.

Часта бывалі ў Магілёве Я.Купала, Я.Колас, П.Броўка, Я.Брыль, Г.Бураўкін, А.Вялюгін, К.Губарэвіч, М.Зарэцкі, А.Зарыцкі, А.Куляшоў, І.Новікаў, П.Кавалёў, І.Чыгрынаў, І.Шамякін і многія іншыя беларускія пісьменнікі. Яны ўдзельнічалі ў Днях беларускай літаратуры, сходах пісьменнікаў вобласці, семінарах з моладдзю, сустракаліся з працоўнымі горада.

Радавымі каранямі звязаны з Магілёвам беларускі пісьменнік Георгій Уладзіміравіч Шыловіч, які не парывае сувязей з радзімай сваіх продкаў.

Дзяржаўныя справы прыводзілі ў горад на Дняпры многіх відных дзеячаў СССР і БССР, сярод якіх былі А.М.Касыгін, В.І.Казлоў, П.К.Панамарэнка, М.С.Патолічаў, К.Т.Мазураў, С.В.Прытыцкі, П.М.Машэраў, Ц.Я.Кісялёў, Ф.А.Сурганаў.

ЗМЕСТ

Да чытача 17

Зямля нашых продкаў 19

Найстаражытнейшыя звесткі пра Магілёў 24

Крывічы ці дрыгавічы? (25). Аб чым сведчаць раскопкі вуліцы Няфёдаўскай (26). Лучын або Магілёў? (26). Сярэдневяковы Магілёў (28). Легенды і паданні пра Магілёў (30). Магілёў. Чаму так названы горад? (32).

У складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай 33

Дакументы сведчаць (40). Звесткі пра Магілёў у Баркулабаўскай хроніцы (41). Магілёўская эканомія (45). Дакументы сведчаць (45). Магдэбургскае права. Што змянілася ў жыцці гараджан? (47). Звесткі пра побыт магіляўчан у 16 стагоддзі (48). Гарадскія паўстанні 1606—10 гг. (49). Дакументы сведчаць (51). Магілёўская хроніка і яе аўтары (62). З Магілёўскай хронікі (65). Магілёўская школа іканапісу (75). Магілёўская школа гравюры (76).

Назаўсёды ў памяці землякоў 80

Іяўлевіч (Яўлевіч) Ігнацій (80). Іяўлевіч Фама (80). Спірыдон Собаль (80). Георгій Каніскі (83). Магілёўская епархія (86). Магілёўскія епіскапы (87). За веравызнанне змагаліся (89). Яўрэі ў Магілёве (90).

У складзе Расійскай імперыі 91

Дакументы сведчаць (96). Нашы продкі ў палку Магілёўскім (98). Аб магілёўскай управе Паўночнага таварыства дзекабрыстаў (99). Браты Юшнеўскія (101). Сяргей Ясенін у Магілёве (102). Магілёў сустракае каранаваных асоб (102). Пушкін у Магілёве (104). Імёны, якія засталіся ў гісторыі Магілёва (105). Станіслаў Іванавіч Богуш-Сестранцэвіч (107). Летапісец ігумен Арэст (107). Пётр Георгіевіч Камбураў (108). Аляксандр Дамбавецкі (108). Магілёў — прыгожы горад, магілёўцы — працавіты народ (110). Занятие и промышленность жителей гор. Могилева (112). З побыту гараджан (114). Дакументы сведчаць (118). Сады і паркі Магілёва (122). Магілёўскія масты (123). Магілёўскае піва (125).

Назаўсёды ў памяці землякоў 126

Кандрат Іванавіч Грум-Гржымайла (126). Леў Казіміравіч Нагумовіч (127). Феліцыян Васілевіч Рымкевіч (127). Фёдар Спірыдонавіч Шымкевіч (127). Еўдакім Раманавіч Раманаў (127). Мацвей Васілевіч Фурсаў (127). Павел Васілевіч Шэйн

(128). Доктар Русель (129). Яўгенія Канстанцінаўна Судзілоўская (129). Рыгор Пракопавіч Ісаеў (130). Антон Афодзьевіч Васюцінскі (130). Леанід Ісакавіч Мандэльштам (130). Рувім Ісаевіч Фраерман (130). Вячаслаў Гарноўскі (130). Вацлаў Пятровіч Федаровіч (131).

Архітэктурная спадчына Магілёва 131

Помнікі горадабудаўніцтва ў сучасным Магілёве (131). Помнікі архітэктуры 17 — сярэдзіны 18 стагоддзя (135). Помнікі архітэктуры канца 18 — сярэдзіны 19 стагоддзя (139). Помнікі архітэктуры канца 19 — пачатку 20 стагоддзя (144).

З гісторыі прамысловасці Магілёва 150

Магілёў не абмінуў уздым рабочага класа 152

Дакументы сведчаць (156). Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага (157). Кацярына Васільчыкава расказвае (163).

На крутым павароце гісторыі 165

Стаўка ў Магілёве (173). Ставка Верховного Главнокомандующего (173). Царская семья в Могилеве (173). Представители союзных держав в Ставке (173). Начало революции в Ставке и отречение Николая II (174). Большевики в Ставке (174). Дакументы сведчаць (175). Магіляўчане, якія змагаліся за савецкую ўладу ў грамадзянскай вайне (182). У рытме першых пяцігодак (184). Горад майго дзяцінства (192). Газеты паведамлялі (192). Вернутыя імёны (197).

Назаўсёды ў памяці землякоў 216

Павел Барысавіч Аксельрод (216). Мікалай Пятровіч Вішнявецкі (217). Надзея Давыдаўна Вольпін (217). Уладзімір Піліпавіч Горын-Галкін (217). Мікалай Мікалаевіч Красцінскі (217). Саламон Якаўлевіч Лур'е (218). Восіп Маркавіч Нядзведскі (218). Ота Юльевіч Шміт (219). Імёны, якія засталіся ў гісторыі Магілёва (220). Воіны-землякі, якія загінулі ў савецка-фінляндскую вайну 1939—40 гг. і ў час ваенных канфліктаў на Далёкім Усходзе (220).

Ішла вайна народная 222

Абарона Магілёва 1941 г. (223). Магілёўскае народнае апалчэнне 1941 г. (224). Дваццаць тры дні стаялі насмерць (225). У адным страі (230). Сведчыць вораг (233). Дакументы сведчаць (234). Магілёўскае патрыятычнае падполле (238). Іх ведалі нямногія (243). У дні акупацыі (245). Іх прымусова вывезлі ў Германію (251). Нас не лічылі за людзей (251). Азарыцкія вязні (253). Дакументы сведчаць (255). Вызваленне (257). Як акупанты ўтрымлівалі Магілёў (257). Магілёўская аперацыя 1944 г. (260). Прайшлі чорныя дні (264). Навечна ў памяці (264). Пасля вызвалення (274). Героі Савецкага Саюза — ураджэнцы Магілёва, якія вызначыліся ў баях за Радзіму (275). Яфім Ізрайлевіч Злацін (275). Леанід Дзмітрыевіч Лорчанка (276). Міхаіл Васілевіч Лусто (277). Яфім Львовіч Мінкін (278). Магіляўчане на франтах Вялікай Айчыннай (278). Анатоль Мікалаевіч Гаранін (278). Мікалай Сільвестравіч Лабезнікаў (279). Валянцін Антонавіч Пянькоўскі (279). Васіль Міхайлавіч Фралоў (279). Мікалай Іванавіч Цвяткоў (279). Пётр Мікалаевіч Чарнышоў (279). Максім Васілевіч Шпак (279). Крутыя дарогі вайны прайшлі праз Магілёў (281). Удзельнікі антыфашысцкага падполля, партызанскага руху, якія загінулі ці прапалі без вестак, і мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору (283). Змагаліся ўсёй сям'ёй (290). Знішчаныя мірныя жыхары,

імёны якіх былі названы здраднікамі-паліцэйскімі і сведкамі на судовых пасяджэннях ваеннага трыбунала БССР у 1946 г. (295). Я помню (302). Я прайшоў праз пакуты гета і канцлагераў (302). Воины 172-й стрелковой дивизии, погибшие при обороне Могилева в бою 12 июля 1941 г. и похороненные возле д. Тишовка (303). Воины Красной Армии, погибшие в боях за освобождение Могилева и похороненные на территории города (304). Воіны-землякі, якія загінулі і прапалі без вестак у другую сусветную вайну (309).

У мірнай працы 418

Гартаючы падшыўкі (436). Вызначыліся працай (439). Заслужаныя работнікі Беларусі (446). Яны нарадзіліся ў Магілёве (448). Ганаровыя грамадзяне г. Магілёва (453). Загінулі ў Афганістане (455). Матэрыяльная і духоўная спадчына Магілёва (459). Ад скамарохаў і батлейкі да сучаснага тэатра (459). Наш Драматычны (460). Крыху аб народнай творчасці (462). Пэндзаль і разец у надзейных руках (463). З літаратурнай спадчыны (464). Друк у Магілёве (466). Традыцыі працягваюцца, або Кароткая гісторыя магілёўскіх музеяў (469). Куды зніклі магілёўскія зборы? (473). Загадка крыжа Ефрасінні Полацкай (480). На стагоддзі ў памяці народнай (483). З гісторыі назваў вуліц (488). Помнікі археалогіі (489). Помнікі дойлідства далёкай і блізкай мінуўшчыны (489). Імёны, якія засталіся ў гісторыі Магілёва (490).



СУПРАЦОЎНІКІ РЭДАКЦЫЙ І СЛУЖБАЎ ВЫДАВЕЦТВА, ЯКІЯ ПРАЦАВАЛІ НАД КНІГАЙ

Група картаграфіі: навуковы рэдактар Т.У.Кавалеўская

Рэдакцыя фотаздымак і фотаілюстрацый: загадчык рэдакцыі Г.М.Бажанкоў, фотакарэспандэнты А.П.Дрыбас, В.У.Харчанка, фатографы С.А.Жукавень, І.У.Каваленка

Літаратурнае рэдагаванне: М.І.Аўхімовіч, Т.П.Панчанка

Фота: з фондаў Магілёўскага абласнога дзяржаўнага архіва, Абласнога краязнаўчага музея, архіва БелЭн, асабістых архіваў

ПРАДСТАЎНІКІ ГРАМАДСКАСЦІ г. МАГІЛЁВА, ЯКІЯ АКТЫЎНА ДАПАМАГАЛІ Ў СТВАРЭННІ КНІГІ «ПАМЯЦЬ»

К.Аляксееў, І.Аношкін, М.Астрава, С.Багдановіч, І.Барбарчык, Л.Батура, Л.Бурдзіна, У.Бурдзін, В.Бярбега, П.Валожын, А.Вараб'ёва, А.Вітэр, У.Гардзееў, Е.Готвальд, М.Грашчанка, Л.Грыгор'ева, У.Ерамееў, А.Жаваранкава, А.Жарыкава, А.Жывапісцава, У.Іваноў, У.Кадзет, В.Кажамякін, Н.Капцова, В.Капыщін, В.Каржанеўскі, А.Косціна, Б.Крукоўскі, Н.Кузняцова, А.Кузняцоў, М.Леаненка, К.Мацярынка, Н.Міхайлава, А.Мысаў, Я.Новікаў, М.Ножнікаў, Дз.Падбярэзскі, В.Пяткоў, І.Радзіцкі, В.Самцоў, Б.Сідарэнка, І.Скварцоў, С.Сталярова, Г.Суднік, С.Трацэўскі, М.Трыбуль, П.Чыстап'янаў, У.Чэпікаў, Дз.Чэшка, М.Шульман, А.Ярохін, З.Яцкевіч і інш.

Даведачнае выданне

ПАМЯЦЬ

Гісторыка-дакументальная хроніка Магілёва

Мастацкі рэдактар
І.В. Каранкевіч

Тэхнічныя рэдактары:
М.І. Грыневіч,
Н.М. Шэвель

Карэктары:
В.І. Багдановіч,
А.М. Барысава,
Л.С. Зіза,
А.В. Семенчукова,
Т.С. Сівянок,
Т.П. Шыпінская

Падрыхтоўка арыгінал-макета:
С.А. Макаёнак
(загадчык рэдакцыі камп'ютэрнай падрыхтоўкі рукапісаў),
Г.А. Гурбо

Камп'ютэрны набор:
С.А. Быткоўская,
І.У. Грыцэль,
А.У. Гурыновіч

Падпісана да друку з арыгінал-макета 15.11.97. Фармат 70 × 100 1/16. Папера афсетная. Гарнітура Кудрашэўская. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 40,3. Ум. фарб.-адб. 41,6. Ул.-выд. арк. 51,65. Тыраж 5000 экз. Заказ 198.

Дзяржаўнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 10. Рэспубліка Беларусь, 220072, г. Мінск, вул. Ф.Скарыны, 15а.

Мінская фабрыка каляровага друку. Рэспубліка Беларусь, 220024, г. Мінск, вул. Каржанеўскага, 20.

Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва / Беларус. Энцыкл.: Г.П.Пашкоў
П 15 (гал. рэд.) і інш.; Маст. Э.Э.Жакевіч. — Мн.: БелЭн, 1998. — 496 с. іл.

ISBN 985-11-0104-4.

У кнізе асветлены падзеі і факты гісторыі Магілёва са старажытных часоў да нашых дзён. У хроніку ўключаны гісторыка-эканамічныя і біяграфічныя нарысы, артыкулы пра выдатных людзей горада, знакамітых землякоў, выкарыстаны дакументы і матэрыялы з дзяржаўных і асабістых архіваў, музеяў, газетныя публікацыі, успаміны.

Асаблівая ўвага аддадзена ўвекавечанню памяці загінуўшых у Вялікую Айчынную вайну воінаў-землякоў і воінаў Чырвонай Арміі, партызан, падпольшчыкаў, мірных жыхароў — ахвяр фашысцкага тэрору, якія пахаваны на тэрыторыі горада. Прыведзены таксама звесткі пра жыхароў горада, якія сталі ахвярамі палітычных рэпрэсій.

Кніга будзе цікавая не толькі жыхарам Магілёва, але ўсім, хто цікавіцца гісторыяй нашай краіны.

П **9470620000 — 001** / **М 318 (03) — 98** **6 — 97**

ББК 63.3 (4 Бен)